Кніжка гэтая ў памяць аб маёй роднай вёсачцы Хадатавічы, дзе нарадзіўся і ўстаў на ногі, аб тым, як жылі нашы людзі, пакуль гаварылі на роднай мове і былі тутэйшымі, самавітымі і сваімі паміж сваіх. Хай то будзе мая падзяка ім за шчаслівае мілаванне побач з імі, ліцвінамі-беларусамі, у найлепшыя юначыя дзянёчкі.

Мо, напісанае тут стане яшчэ адным лісточкам на дрэве нашай гісторыі, адорыць шчымлівым успамінам тых, хто адчуе нястрымную позву свайго сэрца азірнуцца, ці здалёку, ці зблізку, на карані свае, на дзядзінец сваёй мінуўшчыны.

Усялякае будзе. Адно несумненна. Не ўявіць ні нам, ні тым, хто будзе пасля нас, векаванне людзей нашых на роднай зямельцы без вясковых хат, без сялянскай долі.

Бацькам сваім, сялянам-беларусам
Драгаўцу Мікалаю Васільевічу
і Драгавец Зінаідзе Антонаўне, прысвячаю.







Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе ня маю сілы!
Ня раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю…

З паэмы «Новая Зямля»
Якуб Колас



Вось як цяпер, перада мною
Ўстае куточак той прыгожа,
Крынічкі вузенькае ложа
І елка ў пары з хваіною,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладыя ў час каханьня,
Ў апошні вечар раставаньня…

З паэмы «Новая Зямля»
Якуб Колас





І бачу лес я каля хаты,
Дзе колісь весела дзяўчаты
Сьпявалі песьні дружным хорам,
З работы йдучы позна борам…

З паэмы «Новая Зямля»
Якуб Колас





А хвоі, елкі векавыя
Пад зыкі песень маладыя
Маўчком стаялі ў нейкай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Няслось вячэрнее маленьне
Ўгару, сьвятое аддаленьне…

З паэмы «Новая Зямля»
Якуб Колас







Здымкі вёскі Хадатавічы з квадракоптара зроблены Алегам Раздзілоўскім

Васіль Драгавец

Запозненае прызнанне

Біяграфічны сповед

Мінск
«Беларуская навука»
2018

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
Д72

Драгавец, В. М.
Д72 Запозненае прызнанне: біяграфічны сповед / Васіль Драгавец. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 411 с.
ISBN 978-985-08-2105-8.

Аўтар нетрадыцыйна і па-мастацку захапляльна расказвае пра гісторыю сваёй малой радзімы – вёскі Хадатавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Кніга дазваляе з вяршынь часу зазірнуць у вясковы побыт, адчуць жывое дыханне тых падзей і адышоўшых дзён. Тэкст багата ілюстраваны аўтарскімі фотаздымкамі, сямейнымі дакументамі. На некаторых старонках скарыстаны ілюстрацыі з інтэрнэта.

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44

ISBN 978-985-08-2105-8

© Драгавец В. М., 2017
© Афармленне. РУП "Выдавецкі дом "Беларуская навука", 2017

Пра малую радзіму – з вялікай пашанай



У кожнага з нас ёсць месца нашага маленства. Ёсць той куточак, які наймілейшы, найлепшы, які самы-самы... Бо там наша пупавіна закапаная. Там нашы ножкі ўпершыню адчулі цёплы дотык да зямлі. Зямліцы. Да роднай зямелькі. Маці-зямелькі. І менавіта яна, як і кожная маці, дала кожнаму з нас без выключэння сваё бласлаўленне на наш жыццёвы шлях. Доўгі ці кароткі, дабрадзейны ці складаны, насычаны добрымі справамі ці пазначаны змаганнем за месца пад сонцам – як каму на раду напісана. Так казалі на маёй роднай Нясвіжчыне і на яе зусім маленькім нават па беларускіх мерках куточку – на хутары Язавец, дзе я нарадзіўся.

Так, у кожнага з нас ёсць тое запаветнае і пашаноўнае месцейка, якое здаўна называецца малой радзімай. Праўда, да мяне доўгі час не даходзіла, чаму самае дарагое і памятнае мае назоў «малая». І толькі з гадамі пачынаю разумець, што «малая» ніякім чынам не азначае памер, бо вядома ж

нам, што і ў малюпасенькай кропельцы адлюстроўваецца вялікае сонца, люструецца ўвесь свет з ягонай непаўторнай і найбагатай размаітасцю. А «малая», бо з часам мы ўсё больш грунтоўна і яскрава ўсведамляем, што ёсць у нас, аказваецца, і вялікая, але гэтаксама дарагая і непаўторная Радзіма. А пасля да нашай свядомасці даходзіць, што і паза межамі нашай любай Радзімы людзі цікавыя жывуць — свет жа такі вялікі і неабдымны. І ўсё гэта — наша Зямля. Наша. А за яе межамі, аказваецца, існуе яшчэ цэлы сусвет, якога мы мо і за ўсё наша жыццё ні разу не ўбачым, ды гэта ніякім чынам не азначае, што ён горшы, хоць і неспазнаны.

Але — усё пачынаецца з нашай малой радзімы. З нашага маленства. З роднага слова. З мамінай песні. З акрайчыка свежаспечанага хлеба. З кубка свежага малака. З усяго таго, што для кожнага з нас насіла паняцце «першы, першае». А першае, як вядома, самае дарагое, самае памятнае, самае незабыўнае, бо — самае-самае... Яно ёсць у кожнага. Але ці памятаюць пра яго ўсе? Ці памятаюць ўсё?

І як хораша, што ў нас з'яўляецца ўсё больш апантаных і неабыякавых людзей, якія запаўняюць гэтыя лакуны, гэтыя прагалы сваім бачаннем сваёй уласнай гісторыі. Гісторыі сваёй роднай мясцінкі. Свайго роду. Сваёй вёсачкі. Гэта вельмі добрае і карыснае памкненне. Гэта тое, чаго не сорамна прысабечыць, зрабіць сваім, каб пасля шчодра падзяліцца з іншымі. Бо не бывае гісторыя нацыі безаблічнай, безасабовай. Гісторыя кожнай пядзі зямлі, ачалавечаная гісторыя, дзе дзейнымі асобамі з'яўляюцца людзі, гісторыя кожнага паселішча, кожнага роду — гэта і ёсць гісторыя нашай беларускай зямлі. Наша беларуская гісторыя.

І калі б кожны з нас захацеў і здолеў увасобіць яе ў напісаныя радкі так, як зрабіў гэта адзін з рупліўцаў на гэтай усё яшчэ малаўзаранай ніўцы Васіль Драгавец, ой як хораша было б і карысна. Я маю на ўвазе кнігу Драгаўца «Запозненае прызнанне». Ужо адна назва гаворыць сама за сябе. Не, не толькі за сябе, а і за нас. Бо мы — такія

талерантна-памяркоўна-няспешныя, што можам і за ўсё сваё жыццё не зразумець, якімі не толькі справамі, але і словамі неабходна аддзячыць роднаму краю, роднай зямліцы, родным людзям, землякам-аднавяскоўцам. А калі не падзячыць, то хоць бы згадаць іхняе жыццё, без якога не было б і нашай доўгай дарогі з роднай хаціны да нашага дома, беларускага дома. Альбо, няхай сабе, да нашай роднай беларускай хацінкі. А мо, каб такое сталася, проста, як пісаў народны паэт Рыгор Барадулін, «трэба дома бываць часцей»? Трэба не забывацца, не выракацца, не быць ганарыстым і безуважным да свайго, роднага, да незабыўна-памятнага судакранання з роднай зямелькай, да першага кроку па ёй.

Гэтыя мае доўгія разважанні ўсяго з адной нагоды — сказаць шчырае і праўдзівае слова падзякі Васілю Драгаўцу за ягонае пераадоленне сябе: гэта ж якія трэба прыкласці намаганні, які здзейсніць над сабой прымус, каб узяцца за пяро (праўда, цяпер ужо сесці за камп'ютар) і расказаць людзям пра сябе, пра свой род, пра сваю вёску, сваякоў, аднасяльчан, зрэшты, пра нас з вамі (ды не ў адным артыкуле, а ў цэлай аб'ёмнай кнізе). А што да мяне, то дакладна і пра мяне. Бо таму, што мы землякі. Што часта хадзілі па адных і тых жа сцежках. Што гісторыю роднай Нясвіжчыны і блізкай да яе Клеччыны спазнавалі па адных і тых жа падзеях і творцах гэтых падзей. Што дыхалі адным і тым жа вясковым павецтрам. Што набіраліся моцы і сілы на неабдымных хутарскіх прасторах, дзе напраўду панавала сіла і моц яе вялікасці матухны-прыроды. Прызнаюся, на палях кнігі шмат маіх паметак кшталту: о-о, дак гэтак сама было і на маім хутары, о, дакладна гэтак жа і я захапляўся фатаграфічнай справай і нават здымкі рабіў дакладна так. Ды і па школьную навуку-прамудрасць нам даводзілася хадзіць за шмат кіламетраў: за тры — пяць.

Але вось з-за сваіх звычак адкладваць на пасля не здолеў я ўзяцца за сваё родапісанне, а Васіль зрабіў гэта. І зрабіў сапраўды ўдала, прыгожа, шчыра і даверліва, як толькі можа родны сын вышаптаць падзячныя словы сваім бацькам, тым дрэвам, якія баілі казкі-наказы, тым палявым

кветкам-валошкам, што цешылі вока і шліфавалі густ, той кудасе-завірусе, якая без спагады выпрабоўвала характар, таму жыццядайнаму сонейку, якое не стамлялася і дагэтуль не перастае лашчыць і пеставаць зямных рупліўцаў. А яшчэ надзвычай важна, што Васіль знайшоў менавіта той тон гаворкі, які выклікае давер, які ўцягвае цябе ў дзеянне, што адбываецца на старонках кнігі. І ты хоць-кі-няхоцькі становішся саўдзельнікам усяго, што дзеелася ў тадышнім жыцці і што ажыўляе аўтар радок за радком.

Чытаў, разважаў, думаў і так рупіла часам сесці за кросны, каб у няспынным руху чаўнака ўбачыць майстравіты клопат і маёй мамы, узяць у рукі касу і адчуць непаўторны перадсвітальны водар свежаскошанай травы, альбо, патрымаўшы разак, зноў акунуцца ў цягавітую і вельмі ж цяжкую сялянскую справу, калі ў глыбокім балоце рэзалі на зіму торф.

Таму, прызнаюся, у мяне было некалькі недаспаных начэй, калі разам з аўтарам хадзіў-блукаў-падарожнічаў па палях-лясах-балотах, па любімых ім сцежках-дарожках і маёй роднай Нясвіжчыны, па тых вёсках, якія згадвае Васіль, якія добра ведалі і мае бацькі. Не выключаю, што пуцявіны Драгаўцоў і Бутэвічаў перасякаліся.

Чытаю другаўцоў тэкст, сёе-тое выпісваю і лаўлю сябе на думцы: якія каларытныя, якія значныя і сэнсава ёмкія назвы нашых вёсак. Нашых — Драгаўца і маіх. Хадатавічы. Аношкі. Казлы. Малаеды. Коханавічы. Грыцькавічы. Жанкавічы. Доўкінды. Каменка. Панюцічы. Малева. Карцэвічы. Сынгалы. Міцькавічы. Гусакі. Сноў. Даматканавічы. Арда. Жылічы… У іх, у гэтых назвах, і наша гісторыя, і людскія лёсы, і перыпетыі змаганняў, і барацьба, і радасць, і прымус — усё тое, што адбывалася з нашай зямлёй і яе насельнікамі.

Дарэчы, мне прыйшлося даспадобы другое, вясковае прозвішча Драгаўцоў — Другаўцы. Вядома ж, другаўцы, бо хіба не найлепшы для чалавека чалавек — друг? Так, дарэчы, менавіта «друг, дружыць» казалі і на маім хутары, і ў маёй вёсцы Баяры. Зрэшты, такіх мясцовых слоўцаў у Васіля

нямала. І гэта, падаецца мне, вельмі добра, бо захаваны, засведчаны яшчэ адзін найкарысны скарб, які, нажаль, усё больш знікае, адыходзіць у нябыт — наша родная (тая, што менавіта ад нашага нараджэння з ёй) мова. Дыялектная, але такая жывая і натуральна-дакладная, свойская, бо народная, мова.

Добра, што пільнае вока Драгаўца здолела засведчыць тыя, здавалася б, драбязінкі, якія часам ярчэй за цэлы мацярык сведчаць пра характар, звычкі, паводзіны, уклад жыцця беларусаў-землякоў. Гэтае бачанне датычыць як агульнавясковых традыцый, так і асабістай адметнасці бацькоў, родзічаў, іншых людзей, якія пусцілі Васіля не толькі ў сваю хату, на свой надворак, але і ў сваё асабістае жыццё. Таму і атрымліваюцца гэтыя апісанні не толькі дакладнымі, праўдзівымі, але і даверліва-спавядальнымі, часам вельмі ж шчымліва чуллівымі. А многае са сказанага ўдала дапоўнена здымкамі. Даўнімі, гістарычнымі, сённяшнімі — пра людзей, пра вёску і вясковы побыт, пра чароўную непаўторнасць прыроды.

І ўсё гэта — у адной толькі кнізе «Запозненае прызнанне». Захварэй і ты, шаноўны чытач, гэткім шчырым прызнаннем, хай сабе і запозненым, і ўсе мы разам пабагацеем, падабрэем, падужэем.

Анатоль БУТЭВІЧ,
пісьменнік,
ганаровы грамадзянін
горада Нясвіжа



Думкі


ў калядную
ноч

Думкі ў калядную ноч

ЗАМЕСТ УСТУПУ

Празрыстая ноч за вакном. Чарнява-сіні купал неба зіхаціць зорачкамі, сярпасты месячык нетаропка плыве над сцішанай зямлёй. Срэбны вэлюм захіснуў неабсяжную прастору. Здаецца, гэта ён, месячык, з нябачнага гарлачыка распалаводзіў над палямі і рэкамі, снежнымі дахамі і вуліцамі гэтую срэбную замілаванасць, гэтую казачную заспакоенасць. Ноч, калі нарадзіўся Гасподзь Бог. Якія цудоўныя вобразы, якую неверагодную прыгажосць, які прастор для думак даруе прырода чалавеку! Нібыта просіць, запрашае: гляньце ж, паглядзіце на гэтае харство, раздумайцеся над сваім жыццём...

Не ведаю чаму, але якраз у гэтую калядную ноч, з шостага на сёмага студзеня 2010 года, мне захацелася ўзяцца



за справу, аб якой думалася і да якой даўно кіраваліся мае памкненні. За немалыя свае гады давялося нешта пабачыць на гэтым свеце, пабываць у многіх мясцінах, пазнаёміцца з рознымі культурамі, адчуць адносіны ў людскім асяроддзі. І чым болей бачу, чым болей спазнаю і разумею, тым часцей кідаюся позіркам у сваё маленства, у нашу вёсачку Хадатавічы, што на Нясвіжчыне, у сваю хату. Ды па-новаму пранікаюся тым жыццём, тымі стасункамі паміж нашымі вясковымі людзьмі, адносінамі ў сям'і паміж бацькамі, пасярод радні. І ў роздуме прыходжу да высновы, што азначаны яны ўнікальным каларытам, які ўжо ніколі не паўторыцца, як не паўторацца тыя словы, тыя размовы, тыя падзеі.



Вёскі паміраюць, сыходзяць у нябыт

Памруць апошнія вяскоўцы – і ці застанецца хоць слоўца пра тое, адышоўшае ў нябыт жыццё, так непадобнае на сённяшні дзень і яшчэ больш адрознае ад жыцця будучага. Не аднойчы, углядаючыся ў магільныя пліты, пад якімі ляжаць і дзед і прадзед, засмучана ўзгадваў, што не засталося ад іх ніводнага лісточка ўспамінаў, ніводнага напісанага радка. Адным словам, нічога, каб хоць на імгненне ўявіць сабе іх думкі і клопаты, засмучэнні і радасці. Прачытаў бы зараз і мо лепей пазнаў сябе, свае сумненні, мо лягчэй рабіў выбар у тых ці іншых абставінах.

На нашых вачах вёскі паміраюць, сыходзяць у нябыт, як і тое многае на гэтым свеце, што сышло, растварылася ў сваім часе. Такі выбар несупыннага зямнога руху. Але ж праз вёску нашы продкі паядналіся з зямлёю, выжылі ў стагоддзях, адтачылі найлепшыя свае чалавечыя якасці. Было ў тым жыцці нешта такое, што спрыяла чалавечай існасці. Хочацца яго расхіснуць, гэта «нешта», агледзець больш пільна, занатаваць для гісторыі.

Калі жывеш у сваім часе, то звычайна не спераживаешся думкай аб яго адметнасці ці гістарычнай вартасці. Прайшоў сабе дзень, ну і прайшоў – усё, як звычайна, нічога асаблівага. Недзе ваююць, узарвалася бомба, аслабеў рубель, падняўся долар, прайшлі выбары, падаражалі газ і электрычнасць...

Вартасць часу пазнаецца праз гады. Штодзённыя нашы клопаты, сустрэчы, размовы, думкі, уражанні, што здаюцца будзённай невыразнай мітуснёй, паўстаюць у зусім іншым адценні, у іншым знакавым выразе, калі аздобяцца часам, аддаляцца, пакрыюцца смугою адлегласці, якая ўсё імклівей раскручваецца за нашымі спінамі. Адтуль, здаля, азіраючыся на перажытыя дні, нечакана разумееш, што самае цікавае ў мінулым якраз тое, на што амаль не звяртаў некалі ўвагі. Ці хіба ж задаваліся мы калі пытаннем пасярод нашага вясковага калавароту, чаму, напрыклад, у таго ці іншага чалавека такое прозвішча, ці адкуль ён родам, кім былі яго бацькі і чаму ён вясёлы і працавіты, альбо, наадварот, хітраман ды казачнік; чаму з адным не можаш нагаварыцца, а другому наогул не ведаеш, пра што казаць...

З гадамі прыходзіць разуменне, што і прозвішча, і выраз твару, і паводзіны, і характар з'яўляюцца не самі па сабе. За імі цягнецца калейка перавязаных паміж сабою



Недзе там, далёка, родная вёсачка Хадатавічы

пакаленняў ды доўгая-перадоўгая аповесць збірання свайго, адрознага ад іншых, вобразу.

Гісторыя таксама, як і чалавек, становіцца іншай, жывой, напоўненай токамі, калі яна аздабляецца адмецінамі і рэаліямі, тымі самымі словамі, сутыкненнямі, адчуваннямі, якія меліся ў сваім часе. Адна справа ведаць аб тым, што 17 верасня 1939 года ў Заходнюю Беларусь прыйшло савецкае вызваленне ад польскай акупацыі, як вучыліся некалі мы, студэнты БДУ імя Леніна, па падручніку слыннага ўніверсітэцкага гісторыка Абэцэдарскага, і зусім іншая – даведацца пра тое ж «вызваленне» інакш, праз вобраз, дэталь, адметнасць убачанага і перажытага.

«Салдаты то рускія былі зусім худыя, ды й бяз ботаў, анучамі ногі абматаныя. Коні, як аглоблі, такія худэзныя, замест пастромкаў вяроўкі... І замуленыя, то ня дай Божа! А потым яны пачалі людзей забіраць...»

Пасля такога сведчання, якое, дарэчы, мне давялося чуць ад жывых сведкаў, пафас палітычнага факта набывае іншы сэнс. Я, праўда, не збіраюся звяртацца да палітычнага ці гістарычнага аналізу свайго часу. Бо калі палітыка ці гісторыя, то гэта абавязкова свае і чужыя, адны лепшыя, другія горшыя, адны «за», другія «супраць». У жыцці не так. І з таго, і з другога боку будуць лепшыя і горшыя, добрыя і нядобрыя, тыя, хто «за», і тыя, хто «супраць». Таму самым пераканаўчым сведчаннем часу будзе сам той час у сваіх шматлікіх, незлічоных праявах. Мая мэта – якраз засведчыць

мо хоць самы маленечкі яго кавалак, калі светла і бесклапотна жылося побач з маладымі бацькам і матуляй, бабай і дзедам, дый са сваім прыязным вясковым людам.

Здаецца, лепей, як тады, дык і не было ніколі... Мо з гэтай самай нагоды хочацца прыпомніць тыя цудоўныя дзянькі, той дараваны Богам час маленства ды пакінуць хоць якія ўражанні ад перажытага. Дакладней, ад перажытага ў тых мясцінах, дзе давялося нарадзіцца, вучыцца, пазнаваць свет.

Упэўнены я і ў тым, што чым больш чалавечых сведчанняў захаваецца аб сваім часе, тым больш жывым і непаўторным з'явіцца ён перад прыхільнікамі мінулага. Тым больш зразумелай стане тая ж самая яго палітычная і гістарычная вартасць.

А яшчэ хочацца пакінуць дзецям сведчанне жыцця, якога ніколі болей не будзе, якое растварылася назаўсёды ў гістарычным космасе. То быў час, калі існаванне вясковых людзей вызначалася натуральнасцю, а вытокамі чалавечых паводзін была зыходзячая ад зямлі існасць. Светаразуменне, сэнс жыцця, адносіны між сабою людзі ладзілі ад прыроды: бязлітасны, як воўк, ці хітры, як ліса, глухі, як пень, ці ўпарты, як баран, худы, як жэрдка, ці тонкі, як націнa,—дакладна, проста, без аніякага другаснага сэнсу. Сэнс, увогуле, быў адзін – зямля-зямелька! На ёй нараджаліся і паміралі, карміліся і весяліліся, цешыліся і смуткавалі, аб ёй марылі і яе пракліналі. Продкі нашыя, вясковыя людзі, бацькі і прадзеды, і самі былі што тая наша беларуская зямля: непаўторнымі ў выразе, даверлівымі ў словах, адкрытымі ў пачуццях. Дзеці зямлі, натуральныя людзі... Яны не гасцявалі на панскіх балях і дыпламатычных прыёмах, не шпацыравалі з парасонамі пад ліпамі, а штодня «гасцявалі» на полі і на сенажаці, у хляве каля скаціны і на таку са снапамі, альбо «шпацыравалі» з вінтоўкай ці аўтаматам перад нямецкімі кулямётамі.

Ва ўсе эпохі сялянамі карысталіся, патрабавалі дзяклo і чынш, гвалты і зборы, мёд і ніткі, курэй і гусей. Яны і сёння такія далёкія ад «откатов» і «переделов», «корпоративов» і «рейдеров», ад «шестисотых» і «восьмисотых»... Яны – ніжэйшая прыступка чалавечай іерархіі і адначасова яе недасягальны, чысты і высокі маяк.

У пахіленых хатках, без пенсій і бальніц яны не згінулі ў навальніцах і завірухах, выжылі пад уладным прыгнётам,

выстаялі ў часы варожых навал. Ды прымалі гасцей, спраўлялі вяселлі, рабілі адправіны ў армію, любілі святы і жарты...

Іх жыццё не параўнаць з нашым. Ім ніхто не праводзіў у хаты ваду і электрычнасць, яны не ведалі машын і багатых крамаў. Ведалі, што толькі ў адным іх паратунак – у дзецях. Радзіць і паставіць на ногі. Не аднаго, ні двух, а троечацвёра... Лічылі за шчасце, што Бог паслаў дзіцятка... Бо дзіцятка – гэта незгасальная свечачка, гэта новы дзень. Гэта перамога над самымі цяжкімі іспытамі.

Дык можа, узіраючыся ў іх жыццё, нешта перагледзім і мы ў сваім мысленні, адкрыем для сябе новы сэнс у сваіх днях на зямлі, навучымся вытрымцы ды супакаенню ў клопатах. Гэтак жа, як, аглядаючыся на нас, мо, павучацца чаму людзі будучых стагоддзяў, якія будуць замест Турцыі і Егіпта лётаць у вандроўкі на Марс і на Месяц...

Калі абуджаюся гэткімі думкамі, то нечакана адкрываю для сябе, што і сам я, і мае маладыя паплечнікі, народжаныя пад саламянымі стрэхамі і стаўшыя ў тых 60–70-х гадах амаль да аднаго гарадскімі жыхарамі, усе мы – пераломнае пакаленне. На нас, на нашым жыцці перарвалася сялянская лінія. Малымі, мы засталі прыход на вёску першых электрычных лямпачак, а ў дарослым узросце сутыкнуліся з інтэрнэтам і скайпам. Нашы ўспаміны пра вясковае жыццё дзівяць моладзь і здаюцца ім далячэзным мінулым. Але наша памяць гэта наша багацце. Мы апошнія сведкі жыцця, што запаведаў чалавеку Гасподзь Бог, адпускаючы яго ў зямную рэчаіснасць. Нам пашчасціла ў вобразе бацькоў, прадзедаў, суседзяў і блізкіх сутыкнуцца з людзьмі, што не ў крамах, а ў полі, з сошкай ды плугам, «в поте лица своего» здабывалі хлеб свой надзённы. Дык ці даруеш сабе, што не ўзяўся за пяро, не пакінуў для будучага хоць якія адмецінкі таго незабыўнага натуральнага часу.

Не абы якой здаецца мне і патрэба сабраць хоць якія вясціначкі пра сваю сямейную генеалогію. Прыпомніць тых, што доўжылі наш род, стаялі перад намі на векавых шляхах – аб нашых продках. Аб тым, якімі яны былі, нашы продкі, адкуль узяліся, як выжылі, вытрывалі нялёгкае змаганне за сябе. Мо гэта стане падмогай дзецям і іх прадаўжальнікам у тым, каб адчуць сваю адметнасць на зямлі, сваю беларускасць сярод чалавечага калавароту, выстаяць перад нягодамі, што чакаюць кожнага на жыццёвых пуцявінах.



Адзінока табе, мама, у неабсяжнай начной прасторы...

З гэткімі думкамі і памкненнямі рабілася кніжка. Рабілася з вялікімі перапынкамі, апраўданымі і не зусім апраўданымі, з сумненнямі і пытаннямі, з вяртаннямі ў пачатак і перапісваннем, з удакладненнямі і знаходкамі. Ды неяк зрабілася...

...Але ж якая марозная ноч! Быў непаразумелы снежань з дажджом і макратою, ды спраўдзілася даўняе: зіма і маразы прыходзяць на Каляды. Углядаюся ў празрыстую срэбную неабсяжнасць за шыбамі. Застылая цішыня. Абсалютны спакой. За гарадскімі дахамі святлее палоска неба, шырэй расхінаецца над снежнай прасторай. Радасць вялікай навіны сыходзіць на казачную зямную цвярдыню: гэтай ноччу нарадзіўся чалавечы збавіцель, сын Божы Ісус Хрыстос...

...Далёка за снягамі, у чужой Германіі, мо бачыцца цудоўны сон старэйшай дачцы Машы. Праз сцяну ад майго пакойчыка салодка спяць малодшая дачка Надзейка і жонка Галіна. За далечынёю, больш чым за сотню кіламетраў адсюль, ад сталічнага Мінску, на нясвіжска-радзівілаўскай зямлі суцішылася і туліцца долу пад купалам каляднай марознай ночы мая родная вёсачка Хадатавічы. Там сумна цямнеюць пахіленыя хаты, не скрыпнуць анідзе дзверы, не пачуецца, як бывала, звонкае дзіцячае многагалоссе, дзявочы смех ці людскі говар. Глуш, цемра і стылая адзінота. Там маці. Адна. У роднай хатцы. Не хоча з яе анікуды: ні да сыноў, ні да братоў...

...Мо холадна табе, мама, у калядную ноч?! Хутка выстывае старая, зробленая пасля вайны з дзедавага гумна наша хата. І бацькі няма разам з табою, мама. Спіць ён на вясковым

пагосце, не прыходзіць дадому ўжо трэці год. Як ты там адна, у гэтай неабсяжнай начной прасторы?

Праз тры дні я прыеду да цябе, на твае восемдзесят два. «Калі ты нарадзілася, мама?» – пытаўся некалі. І ты казала: «На трэці дзень пасля Каляд, сынок. Так мне матка мая гаварыла... Але прабегла ўсё...»

Сапраўды, прабегла ўсё. Толькі памяць яшчэ трымае ў сваіх глыбінях адбіткі нашага былога жыцця...

Вёска




ХАДАТАВІЧЫ

Вёска

У нашай хатцы ў добры мароз наскрозь прамярзаюць шыбы ў маленькіх ваконцах. Ды не проста пакрываюцца марозным інеем, а нібыта які разумнік размаляваў іх цудоўным алоўкам – вытыкаюцца на шкле розныя ўзоры: ці то сарваныя з дрэва лісточкі, ці яловыя галінкі, ці снежныя мроіны... Прыгледзішся, чаго толькі не ўбачыш! Але запылае на золку ў печы агонь, паплыве па хаце цяпло і заплачуць слязьмі, адтаюць пасля пранізлівай ночы шыбы, знікнуць цудоўныя малюнкі. Шкада трохі іх – ды каб не было большага гора! Прыцісне вечарам холад, і зноўку праступяць на шкле непаўторныя творы яго вялікасці Дзеда Мароза.

Гарадскія дзеці не ведаюць такіх цудаў. Вокны зараз іншыя, не прамярзаюць. Мо і шкада, што не ведаюць. А тады, у калядную ноч, самае цікавае пачыналася з вакон. Пакуль на калядаванне выберуцца вясковыя жанчыны-жартаўніцы ды мужчыны пабайчэй, мы, дзеці, не знаходзілі сабе спакою, кучкамі шугалі ад хаты к хаце, поўнячы то адну, то другую вясёлую хеўру. Каб папоўніць свой калаўрот ды выцягнуць з цёплай хаты на вуліцу паплечніка, у будынак не заходзілі – няма часу тлумачыць нешта дарослым. Рабілася ўсё проста. Прыхіснешся да марознай шыбы губамі, раздзьмухаеш цёплым паветрам шкло, і вось на ім, як круглякі ад акуляраў, вытаялі чысцюткія празрыстыя плямы – добра відаць, што робіцца ў хаце. Стук-стук па шыбе. Адтуль крык:

– Во, ужэ ўсе хлопцы сабраліся, а вы мяне дома дзержыця! Усё, я пайшоў...

Бацькі, вядома, у такіх абставінах зрабіць нічога не могуць – іх жвавы сынок толькі мільгане пятамі, вылятаючы з хаты да жаданага гурта.

Ды падыходзіць галоўная дзея. Ужо сышліся ў каго на хаце дарослыя калядоўнікі. Завадатарам, як склалася, Зіна Твароўская, удава забітага на вайне мужыка, маці траіх дзяцей. Высокая і худая, са шчарбатым ротам, заўжды ў кірзавых ботах

і фуфайцы, але вясёлая, з гарэзлівымі агеньчыкамі ў вачах жанчына. Напінае на сябе вывернуты аўчынаю наверх кажух, падпяразвае яго вяроўкаю, на галаву які-небудзь воўчы каптур, вочы падмалёўвае чорным вугольчыкам з печкі, бярэ ў рукі сукаватую палку... Падобным чынам меркаваліся да яе яшчэ дзве ці тры спакусніцы-жанчыны, пераадзяваўся хто з мужчын. Пачыналіся незабыўныя калядныя забавы.

Віруючы гурт, аздоблены рухам, звонам, жартамі і смехамі, рушыў па вуліцы, заварочваючы то ў адзін, то ў другі двор. Стукаліся ў дзверы. Хеўра заціхала, чакаючы кульмінацыі. Гаспадар ці хто з дому прычынялі дзверы на ганак і ледзь не траціліся мову ад выгляду неспадзяваных прышэльцаў:

– Каб вас бягунка пабрала! Эта ж трэба, так напалохалі...

Распачыналася размова, падобная да тэатральнай дзеі: мы вось здалёку, з лесу прыйшлі, а ці можна ў гаспадара пераначаваць, а ці запросіць ён у хату, а ці пачастуе з нагоды Каляд, мо налье чарачку, а мо і цукерак дзецям дасць, не пашкадуе...

Цукерак у тыя часы асабліва не перападала, а з ежы і выпіўкі што-небудзь абавязкова даставалася, бо калядніка ў нельга не пачаставаць. Малыя спявалі калядныя песні, нешта танчылі, жартавалі, палохалі ў цемры якіх небаракаў. Весела і цікава было да ўпаду. Назаўтра заходзіліся ад смеху, прыпамінаючы калядную ноч, жарты, прыгоды ды іншыя неспадзеўкі.

Нібы ў калысцы, паміж лесам і пагоркам, умясцілася наша вёсачка



Але тое было пасля, а каляднай раніцай я прачынаўся ад смачных пахаў з кухні. Бацька ў белай кашулі стаяў перад люстэркам з намыленымі шчокамі, раз-пораз правіў сваю трафейную нямецкую брытву аб шырокую салдацкую скураную папругу. Брытва здатная, паблісквае цьмяным стальным лязом, тронкі пакрыты жаўтавата-белымі, слановай касці, планачкамі, па канцах аздоблены фашысцкай свастыкай. Відаць, належала важнай асобе. Любімай маёй справай было дабрацца да брытвы, калі бацька на рабоце, і вастрыць ёю алоўкі. Бацька брытву бярог, гневаўся на мяне, што псую дарагую рэч. Вось і зараз ён кажа маці:

– Затупіў хлопяц зноў брытву... Як палена стала... От дастычны, не ўберагчы...

Я чую бацькаў голас, чую, як патрэскваюць у печы дровы. Адкрываю вочы. Чырвона-залацістыя промні зыркага марознага сонца прабіваюцца праз маленькія акенцы нашай хаткі. Ад печы ідзе гаючая цеплыня. Бацькі не бягуць на работу, ніхто не грукоча вёдрамі і не стукае дзвярыма. Спакойна, утульна ў хаце. Да асалоды, да замілавання пранізліва пахне хлебам і пірагамі, што падыходзяць у выпаленым прыпеку. Мяўкае за дзвярыма кошка, просіцца ў цёплы дом. Маці пытаецца ў бацькі:

– Калі эта, Коля, хлопяц прышоў учора?! Ты чуў ці не? Мусіць, гойсалі недзе ўсю ноч. Будзі ты яго, хай устае, я на стол накрываю. Памаліцца трэба.

Бацька падыходзіць да ложка, бачыць мае адкрытыя вочы, гаворыць:

– Так ён ня спіць ужэ, прачнуўся...

Потым звяртаецца да мяне.

– Уставай, Вася, будзем снедаць разам. Свята сёння вялікае...

Я саскокваю з ложка, бягу на кухню, набіраю з вядра на восілцы кубак халоднай, нядаўна з калодзежа, вады. Паліваю на рукі, твар, шыю, вушы, пырскаю сабе ў вочы, чышчу зубы.

– Давай палью табе, складвай рукі,– кажа бацька.

– Ня трэба, я сам...

У вясковай хаце мыліся не па-гарадскому. Ні кранаў, ні ракавін мы не бачылі. Вядро калодзежнай вады падвешана за восілку каля печы на жалезным пруце, што прыбіты ў бэльку вялікім цвіком. Вось і ўся цывілізацыя. Бацька

чэрпаў кубкам ваду з вядра, набіраў яе ў рот так, што раздуваліся шчокі, складваў далоні кошычкам і з роту ручайком, патроху выпускаў ваду ў гэты кошычак, абмываючы твар, шыю, грудзі. Ці то на фронце ў акопах ён налаўчыўся ад каго так рабіць, ці то была даўняя сямейная завядзёнка, я не ведаю, але, як і бацька, я таксама прызвычаіўся да такога мыцця. Напачатку толькі кошык з далоняў атрымліваўся ў мяне дзіравым. Ды настроіўся. І дагэтуль часам на лецішчы дэманструю дзецям дзеля забавы такі незвычайны спосаб абмывання.



«Станем, памолімся на ікону…» Гэты абразок усё жыццё аберагаў нашу сям'ю

...Усе памыліся, адзеліся ў чыстае. Стол устаўлены лепшымі прысмакамі, што прыгатавала маці. Пад ручніком астывае залацісты пірог. Купкай на талерцы жаўцее курыца ці качка, у місцы гусціцца смятана ад сваёй кароўкі, яшчэ ў адной – каўбаса і паляндвіца, прыхаваныя да свята. Важкім стажком падняліся бялюткія аладкі, каля іх засалоджаная макавая поліўка...

– Станем, памолімся на ікону...– кажа маці.

Мы становімся ўчатырох у рад: бацькі і я, ім па пояс, малы Толя, брат, я трымаю яго за руку, засяроджваемся. Бацька хрысціцца першы, потым маці. Вучыць нас, як хрысціцца і глядзець на ікону. Іконка невялічкая, у блішчастым акладзе, на покуці, вышэй нас, абраная свежымі, вышытымі ільнянымі ручнікамі. З іконкі пільна пазірае на мяне Маці Божая з маленькім дзіцем на руках. Бацька кажа непаразумелыя словы: «Отчэ наш, іжэ есі на небясах... Дай нам хлеб наш... Да свяціцца імя тваё...» Наша хатка поўніцца сонейкам, і мне здаецца, што ў вачах Багародзіцы на іконцы вялікае задавальненне за нас усіх...

«ХАДАТАВІЧЫ – вёска ў Казлоўскім сельсавеце. Вядома з XVI стагоддзя. У 1552–1555 гг. Хадатавічы – сяло Клецкага павета Навагрудскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. Уладанне каралевы Боны. Сяло налічвала звыш 13 валок зямлі (*валока – прыкладна 24,6 га*)***, з якіх на цяглай службе лічылася 6 валок 15 маргоў зямлі, а па чыншу – 5 валок 8 маргоў. Сярод жыхароў сяла былі Іванавічы, Сцепановічы, Багдановічы, Хадановічы...»***



Могілкі відаць адусюль

Гэта вытрымка з архіўнай спраўкі пра гісторыю нашых Хадатавічаў. І калі жыў з бацькамі, і пазней, калі з'ехаў з вёскі ў сталічны Мінск, не раз думалася, асабліва ў прыезды дадому, як удала продкі нашыя выбралі некалі месца пад жытло. Вёсачка, нібы ў калысцы, затаілася пасярод пагоркаў ды нізінак. Калі глядзець на яе ад сонца, то з правага боку,



Хадатавічы, Малаеды, Гусакі, Коханавічы, Даматканавічы – мае каардынаты



Дуб Якуб. Пад ім тапталі сцежачкі ды любаваліся яго раскідзістай шапкаю бацькі і прадзеды. Фота Віктара Альшэўскага, 2004 г.

за Грудзінавай хатай, вясковая вуліца крута ўздымаецца на пясчаны ўзгорак і знікае ў цёмным лесе. Гэты ўзгорак расцягнуўся вакол вёскі, як падкова, ажно да самога небасхілу. А там, дзе дарога западае ў цёмны лес, ён самы высокі. Там вясковыя могілкі. Яны відаць адусюль і раніцай, і днём, і ўвечары. Што б ні рабіў хто з вяскоўцаў, куды б ні ішоў, ні ехаў, ніяк не абміне позіркам могілкі. А кінецца туды вачыма, то падумае пра родных і блізкіх, суцешыцца ў роспачы ды адзіноце, а мо, наадварот, – зажаліцца, зальецца горкімі слязінкамі...

А яшчэ могілкі для нас, дзяцей, нібы геаграфічны досвед. Неабсяжная прастора расхінаецца перад вачыма. Убок Нясвіжа віднеюцца Гусакі, нашы суседзі – вунь веерам разбегліся пасярод іржышча іх пафарбаваныя хаты з прысадамі. Справа, ніжэй, Міцькавічы, хаты радочкамі. Калі прама, на поўнач, то былыя Якубавічы. Тут ужо не адвесці вока. Бо Якубавічы, хоць зараз там ніводнай жылой будыніны, гэта перш-наперш дуб Якуб. Колькі яму гадоў – то адны

здагадкі, кажуць, пад трыста. Пад дубам тапталі сцежачкі ды любаваліся яго раскідзістай шапкаю мае бацькі і прадзеды, узіраліся і мы, малымі, у яго магутныя галіны ды шапатлівую лістоту. Хадзіла чутка, што спачываў пад яго шырокаю кронаю сам Напалеон, ідучы на Маскву. Неяк я паказваў дуб Якуб сябрам, дык увасьмярых мы ледзьве абхапілі яго шурпаты магутны ствол.

Вышэй, за дубам, віднеюцца выбеленыя вапнай будыніны калгасных фермаў. Далей відаць толькі абрысы – наша Казлоўская школа, сама вёска Казлы, потым Аношкі, дзе старшыня, кантора, клуб. За Аношкамі дарога на Сноў, на Баранавічы. У Снове – дзядзька Тонік, у Баранавічах – Вечык. Далей за Гарадзеяй – шаша з усходу на захад, з Масквы да Брэсця, так называлі ў нас Брэст. Гэта ўжо зусім далёкі свет, дзе іншае жыццё, гарадскія людзі, электрычныя лямпачкі, брукаваныя сцежкі, нейкія бульвары і тралейбусы, каўбасы і начальства на легкавушках...

Павернеш галаву трохі лявей – Малаеды, там баба Волька і дзед Антось, яшчэ ўбок – Коханавічы, Жылічы і Арда, там таксама радня. За Жылічамі хаваецца сонца ўлетку. Арду не відаць, яна за пагоркамі і за краем леса.

Зноўку, ужо з другога боку, вяртаюся позіркам на могілкі. Яны ва ўсе гады для нашых хадатаўскіх людзей, як сімвал пачатку і канца, прасторы і часу. За могілкамі, на зваротным баку – круты схіл, невялічкі сасоннік і адразу трохі жахлівы прыцемак ад высачэзных ялін. Дарога прападае ў гушчары, перамыкаецца вялізнымі лужынамі, гразкімі каляінамі, патыхае халоднай непрыемнай макротай і слізговіцай. Але



Далей, за Аношкамі, дарога на Сноў і Баранавічы, Нясвіж і Мінск. Гэта далёкі свет, дзе зусім іншае жыццё

праз колькі хвілін раптам разбяжыцца змрок, засвятлее неба і акрэсляцца ўдалечыні раскіданыя на пагорках пабудовы. То Даматканавічы – блізкая і добра вядомая хадатаўцам вёска-суседка. Пасля вайны нас раздзялілі: мы ў Нясвіжскім, а яны, даматканаўцы, у Клецкім раёнах. А былі некалі, як сведчаць архівы, адзіным Клецкім паветам.

Вокнамі нашыя хаты ставіліся ў бок да лесу, на поўдзень, туды, дзе Даматканавічы. Адтуль, з-за лесу, ад левага яго ўскраю штодня выхінаецца сонца на ранку, птушкі ў балоце сустракаюць яго радаснай балбатнёй ды посвістам. Праз лес праходзіць граніца двух раёнаў. Сам Клецк, старажытны і знакаміты, усяго ў кіламетрах дзесяці ад нашых Хадатавічаў. Ёсць у тым боку наша радня па бабе Наташы. Напрасткі нам бліжэй да Клецка, чым да Нясвіжа. Гуртам на роварах па лясной сцежцы, праз Даматканавічы на Лукаўцы, дзе чыгуначная станцыя, а там і Клецк. Вялікі і незнаёмы, з багатымі крамамі і дзіўнымі назвамі «універмаг», «гастраном». З марожаным і цукеркамі, з нячутымі дагэтуль і таму запамінальнымі на ўсё жыццё пахамі сшыткаў, алоўкаў, кніг у «Канцылярскіх таварах». Купіць, што трэба, пакаштаваць марожанага – і дадому. Ды так прабрацца, асабліва ў Даматканавічах, непрыкметна, каб не нарвацца на мясцовую хлапечую хеўру, бо могуць пераняць, будуць чапляцца, можа ўтварыцца бойка і дадому вернешся пашматаны. Самае крыўднае, што адбяруць каштоўнае гарадское прыдбанне...

Ніяк не ўявіць нашы Хадатавічы без балота, што пачыналася за платамі гаспадарак ды круглым люстэркам уляглося ад вёскі ў бок лесу. Вясною, у разводдзе, балота станавілася возерам, залівала палі, нашы соткі за хлявом. Талаю вадою пакрываліся паплавы і пашы. Праз тыдзень-другі вада сыходзіла і немаведама адкуль падымаліся сцяною багатыя травы, густа зацвіталі кветкі, а над імі цвірчэлі ў лагодным небе жаўрукі. Улетку на золку ды абедам мы стаялі каля балотных канаваў з вудамі і цягалі карасёў; вечарамі, апантаныя ад гульняў і забаў, не маглі накрычацца ды нагукацца, стараючыся перасіліць магутнае, неабсяжна-бясконцае жабіна кваканне. Узімку балота пакрывалася ледзяною падлогаю, на якой да цямна забаўляліся пасля ўрокаў нашы вясёлыя дзіцячыя кучкі.

У канцы сяла было яшчэ адно балота, людзі казалі, што вельмі старое, каля Івана Пятрушчыкавага. Называлі яго



Мох, балота каля Маланкі, падобнае на пацеркі. Здымак 1979 г.

Круглавам. Мо таму, што было круглым па свайму зямному малюнку. Недзе ў чэрвені, адсеяўшыся па вясне, туды збіралася ўся вёска, каб накапаць торфу на зіму. Незабыўнае відовішча і незабыўная сама па сабе дзея. Я раскажу аб ёй пазней.

Ды яшчэ не ўсё пра балоты. За вясковымі паплавамі ў лесе схавалася таксама балотца, падобнае на пацерку, перавітае парослымі выспачкамі ды вастраўкамі. Не ведаю чаму, але вада ў ім адбівалася сінявата-чарнявымі водбліскамі, накшталт зыркай бліскучай сталі. Балота называлі Мох, бо вакол імхі, ці балота за Маланкаю – там, ля балота, у пахіленай хатцы жыла гаротная жанчына па вясковай мянушцы Маланка. Толькі яно адно і засталося дагэтуль – Маланчына балота. Вясковае асушылі на пачатку гарбачоўскай перабудовы, каб павялічыць плошчы пасяўнога кліна, а старое, што каля Івана, перасохла само па сабе: з усіх бакоў перарэзалі яму вытокі і ручаіны, як чалавеку вены і артэрыі. Аказалася, што ўсе балотныя мясціны звязаны паміж сабою, дзяліліся вадою напрадвесні, перацякалі ручаямі ў большыя рэкі і рачулкі. Я і сам толькі зараз, на старых картах, скмеціў, што канаўка за Грудзінавым плотам некалі была танюсенькай рачулкай Дунайкай (афіцыйна Дунай), запляталася нітачкай з-пад нашага балота да Малева, адтуль у больш вядомую Ушу і далей на поўнач, у Нёман, у Балтыйскае мора.

Рэчкі тут, на нашых землях, дзяліліся па водастоку. Недалёкая ад нас Лань ужо кіравалася на поўдзень, у Прыпяць і Днепр. Ды парвалі падчас меліярацыі гэтыя Дунайкі-капіляры па-жывому, змагаючыся за вялікія ўраджаі і высокія дасягненні. Павысыхалі невялічкія азярыны, што акружалі вёску з заходняга і паўночнага бакоў. Адны

жэрдкі, нібы шкілеты, засталіся ад стромкіх ялін у Цыгане, так зваўся лясок з круглым, як міска, возеркам паміж Коханавічамі і Жылічамі; знікла балота перад Малаедамі за Высокаўскім лесам у нізіне, перад дзедавай сядзібай...

А ў той час, калі не дайшло яшчэ да здзекаў над зямлёю, сяло наша ўдала хавалася паміж балот і ўзгоркаў. З поўдня прыкрыта шчыльнаю і працяглаю, канца не відаць, палосою леса, з поўначы – разложыстым узвышшам. Таму, якія б страшэнныя ні наляталі буры ці навальніцы, а хаты не шкодзіліся. Усюды быў рух, кіпела праца, гаманілі людзі. Вядома ж, не да любавання зямною красою селяніну, а ўсё ж калі-нікалі збяруцца, бывала, у нядзельку пагаварыць мужчыны, дый скажуць: «А што?! Добраё место некалі выбралі пад сяло людзі...»

Ніхто з вясковых нічога не ведаў пра мінулае. На пытанні пра колішняе жыццё адказ заўжды быў адзін: «Цяжка жылося...» Самымі свежымі ўспамінамі былі канец радзівілаўскіх часоў, польскае ўладанне, прыход бальшавікоў у 1939-м, нямецкая акупацыя ў вайну, «парцізаншчына», загон у калгасы. Аб гэтым гаварылі і прыпаміналі часта, бо самі былі сведкамі тых падзей. Каралева Бона, уладарніца сяла ў далёкай мінуўшчыне, не пакінула аніякага следу ў свядомасці простага люду. Забыліся пра той час. Бо колькі пакаленняў перавярнулася, колькі вады перацякло ў балотах! Ды яшчэ бязглуздзіцы колькі нарабілася за гісторыю! Пры «саветах», як называлі бальшавіцкую ўладу, пабурылі фальваркі і маёнткі, цэрквы і касцёлы, трактарамі парастрасалі і парэзалі старажытныя курганы – жывыя кнігі нашай гісторыі. Пра курганы хочацца сказаць асобна.

Пасля вайны мы, хадатаўскія дзеці, хадзілі ў пачатковую школу ў Якубавічы. Так называлася мясціна з некалькіх хат недалёка ад дуба Якуба. Хатак аніякіх не захавалася на тым месцы – адзін дуб Якуб, помнік рэспубліканскай каштоўнасці, стаіць там дагэтуль. Школка наша заснавалася ў колішняй сядзібе пана Смоліча. Вялікі драўляны дом, абапал калідора два прасторныя пакоі, дзе мясціліся класы. І захапляльнае відовішча навокал. На правы бок ад дома – бярозавы гай, на левы – арэхавы падлесак і прыгожы сад, пасаджаны панам пры паляках. А ў наваколлі гарошынамі раскінуліся добра бачныя старажытныя курганы, бо панскі дом стаяў на падвыссі. За арэхавым ляском перад Гусакамі, за бярозавым гаем перад Малаедамі і Коханавічамі чарнелі, уразаючыся ў небасхіл,



Тут, каля Высокай, была цэлая чарада курганоў

земляныя насыпы — сховішчы даўніх падзей на нашай зямлі. Па дарозе з Хадатавічаў у Малаеды і Коханавічы, на ўзгорку, у невялікім лясочку, што звалі Высокая, мелася іх цэлая чарада. Каля вёскі Гусакі таксама шмат, каля Міцькавічаў і Грыцькавічаў таксама... Куды ні кінеш вокам, амаль ля кожнага паселішча маўклівымі сведкамі мінуўшчыны высіліся загадкавыя земляныя насыпы.

Дзе ж яны падзеліся?! Панішчылі людзі. У Высокай на курганах корпаліся з лапатамі дарослыя і мы, дзеці, бо не было строгасці і аніякай аховы. Хадзілі чуткі, што там скарбы, мо і золата. Чуткі гэтыя то заціхалі, то падымаліся. І заўжды знаходзіліся ахвотнікі шукаць багацці, рушыць памяць гісторыі. Золата не знаходзілі, скарбаў таксама. А што знаходзілі? На такое запытанне гаварылі: ат, гаршкі нейкія старыя пабітыя ды косці конскія ці чалавечыя. Коля Якубчыкаў, старэйшы за мяне на гадоў сем-восем хлопец, казаў, што адкапалі ў кургане таблічку з волава, з літарамі на ёй. Прынеслі дадому, кінулі ў печку паглядзець ці расплавіцца. Расплавілася адразу...

Бацька бачыў раскапаны курган каля Міцькавічаў, вялікі і высокі. Казаў, што зямля там чорная, тлустая, касцей чалавечых шмат. Відаць, салдаты паляглі, мо шведы ці рускія. Ад старых людзей ішла гаворка, што іх тут многа пабілі...

Аднак дзіўна. Курганы прастаялі стагоддзі, і ніхто нават у самыя страшэнныя гістарычныя ператрусы не спакусіўся на іх, а прыйшла савецкая ўлада, зямлю аддалі калгасам і курганы зруйнавалі ў лічаныя гады. У той жа Высокай, што не дакапалі дзетвара і дарослыя, данішчыў калгас. Зрабілі



Да нашых дзён захаваліся курганы каля вёскі Аношкі

пасярод курганоў авечую ферму, перакалашмацілі зямлю. Потым перасталі трымаць авечак, бо нібыта ваўкі абнадзіліся, а хутчэй дык людзі не праміналі дзіркі ў плоце. На пакінутых пабудовах паправальваліся стрэхі, пакруціліся сцены без дагляду. Так і бурэлі яны дзесяцігоддзямі на самой гісторыі, на памяці нашай. Нарэшце гэты раздрай прыбралі, а курганныя насыпы парэзалі бульдозерамі і зраўнялі з зямлёю. Зрабілі палігон для арганікі з жывёлагадоўчых фермаў. Як жа інакш, не знайшлося, бачыце, другога месца ў калгаса, куды гной з фермаў звозіць, акрамя курганных засновак?! І там, дзе былі меціны перамог ці жалю продкаў нашых, высяцца насыпы з гною і саломы. Таксама помнікі, але нашага невуцтва. Такія мы людзі, што тут яшчэ скажаш...

А месца гэтае, Высокая, не простае, адметнае. Маюцца пэўныя гістарычныя звесткі, што некалі на лясным ўзгорку адбылася моцная бойка з татарамі. Было тое ў жніўні 1506 года, калі татарская армія крымскага хана Менглі-Гірэя на чале з яго сынамі ўчыніла чарговы напад на Вялікае княства Літоўскае. Татары падыйшлі да Навагрудка, асадзілі Слуцак, палілі і рабавалі паселішчы, забіралі людзей у палон. Літоўскае войска выйшла супраць ворага з Ліды ў кірунку Клецка, дзе стаялі асноўныя







Памятны знак на месцы разгрому татарскіх войск пад Клецкам у 1506 г.

сілы татар, пераймаючы іх групоўкі на сваім шляху. Татараў пабілі за Ішкальдзю, а таксама на рацэ Уша каля вёскі Круты Бераг. Сутычкі з імі былі і ў нашых мясцінах. Дарэчы, на начлег войска прыпынілася ў вёсцы Ліпа перад Малевам. Там адбылася важная і адначасова трывожная падзея. Камандуючы, маршалак Станіслаў Кішка, занямог. Замест яго гетманам на бітву абралі маршалка Міхаіла Глінскага, 36-гадовага князя, які ўшчэнт разбіў татар на рацэ Лань пад Клецкам. Палонныя татары з цягам часу рассяліліся па наваколлі, заснавалі сваё паселішча і каля нашых Хадатавіч. Людзі празвалі яго Ардою. Гэтак вёска Арда ўвашла і ў афіцыйныя дакументы.

Вучоны-археолаг з Мінску У.С. Астапаў у 1952 годзе налічыў каля Хадатавічаў сем курганоў, а ў 1977 г. іх засталося толькі два. Аб гэтым пішацца ў гісторыка-дакументальным выданні «Памяць», прысвечаным Нясвіжскаму раёну. Між тым археалагічныя раскопкі, праведзеныя даследчыкамі, пацвярджалі гістарычную каштоўнасць курганных насыпаў. Вялікае селішча XVII-XVIII стагоддзяў было адкрыта каля вёскі Коханавічы, што суседнічае з Хадатавічамі. Там знойдзена ганчарная кераміка, іншыя цікавыя рэчы. Каля Мацылёўшчыны, суседняй вёскі ў бок Клецка, археолагі адкрылі буйны курганны могільнік дрыгавічоў. Ён налічваў шэсцьдзясят два насыпы вышынёю да двух метраў.

Ад дрыгавічоў і цягнецца гісторыя нашых продкаў. Яны ўтварылі першыя пасяленні, заклалі пачаткі дзяржаўных высноў, вучыліся супольна бараніць сваю зямлю. Іх паселішчы захоплівалі менскі князь Глеб, чарнігаўскі і тураўскі князі. Яны пастаянна пакутавалі ад ворагаў, пакуль нарэшце

не ўтварылася Вялікае княства Літоўскае. То было сведчанне сталага розуму і магутнай волі тагачаснага люду і яго павадыроў. Але бацькі і прадзеды нашыя, простыя сяляне з Хадатавічаў, нічога толкам пра гэтую даўніну не ведалі. Хоць і не сказаць, што не цікавіла яна іх. Але ж якіх-небудзь адметных паданняў пра гісторыю сваёй зямлі не чуваць было ў гаворках. На афіцыйным узроўні, з боку ўлады, школьнікам ды студэнтам укладвалі ў галовы адно – гісторыя Беларусі толькі і пачалася з Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года; аб тым жа трубілі сродкі прапаганды, радыё ды газеты. Разбірацца ў сваім мінулым ці сядзець у бібліятэках, перабіраць архівы – не селяніну.

Жыццё бедалагі-селяніна падпарадкоўвалася аднаму закону: выжыць, вытрываць, выстаяць! Не пагінуць з голаду, не скалець у лютую зіму, падняць на ногі дзяцей, перацярпець варожую навалу. Адзіная прыяцелька ў селяніна ва ўсе часы і ва ўсіх яго бедах – зямелька родная. Хоць кавалачак, хоць палоска, а выратуе, не дасць марна згінуць. Таму не разгіналіся на ёй з рання да ночы. Усё астатняе не мела для селяніна значнага сэнсу. Кожная хвіля, кожная гадзіна павінны быць аддадзены нястомнай працы. Такі закон, пакінуты продкамі. Хто яго парушаў, той не мог разлічваць на міласціну ні людскую, ні божую.



Галоўнае управаленне юстыцыі
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта

Установа «Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці»

вул. Казлова, 26, 220037, г. Мінск
тэл. 294 11 02, факс 294 14 26
р/р № 3604631680006
Філіял № 527 «Белжелдор»
АСБ «Беларусбанк» г. Мінска, код 254
АКПА 03495108 УНП 600013477

21.01.2009 № 15
На № заявл. ад 13.01.2009

Главное управление юстиции
Минского областного
исполнительного комитета

Учреждение «Государственный архив Минской области»

ул. Козлова, 26, 220037, г. Минск
тел. 294 11 02, факс 294 14 26
р/с № 3604631680006
Филиал № 527 «Белжелдор»
АСБ «Беларусбанк» г. Минска, код 254
ОКПО 03495108 УНП 600013477

Департамент по архивам и
делопроизводству Министерства
юстиции Республики Беларусь

ул. Коллекторная, д. 10
220004, г. Минск

АРХИВНАЯ СПРАВКА

В документах архивного фонда «Исполком Несвижского районного Совета депутатов трудящихся» в списках сельсоветов и населенных пунктов по Несвижскому району за 1940 год и на 1 января 1947 года значится д. Молоеды в составе Козловского сельсовета (количество населения – 315 человек, 129 дворов, 73 хозяйства; из них все единоличные) и д. Ходатовичи в составе Быховщинского сельсовета (количество населения – 324, 58 дворов, 77 хозяйств; из них все единоличные).

Основание: Ф.1563. Оп. 1. Д.2. Л.31,34; Д.18. Л.9,13.

Сведений об истории населенных пунктов, происхождении названий деревень, фамилий жителей д. Молоеды и Ходатовичи в архиве не имеется. По этому вопросу рекомендуем заявителю обратиться в Национальный исторический архив (220002, ул. Кропоткина, д. 55, г. Минск) и НМУ «Зональный госархив в г. Барановичи» (225320, ул. Лисина, д. 12, г. Барановичи).

Дополнительно сообщаем, что Козловский и Быховщинский сельсоветы были образованы 12.10.1940 года в составе Барановичской области (с 08.01.1954 – Минской области).

Директор архива Е.В.Кушнова

Зав.отделом использования
и публикации документов Л.Э.Ковалевская

5 Ковалевская 2941426
ЕВ 21.01.2009 запросы

Департамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
Уваходны № 01 2009 г.
23



Блуканні па дрэву

Блуканні па дрэву

Пераводзілі дух сяляне, як самі казалі, ці супакойвалі душу мо толькі ў размовах ды стрэчах паміж сабой. То цікавая адметнасць часу. Зараз інакш, людзі несупынна бягуць і спяшаюцца; пры сустрэчах нават з блізкімі ці добра знаёмымі размова пачынаецца і канчаецца двума сказамі: «Ну, як справы? – Ды так, нічога, памаленьку... Трымаемся». І ўсё! Далей не ведаюць, пра што казаць.

Раней не так. Нягледзячы на чараду клопатаў, любілі людзі пагаварыць. Удзень то не вельмі, бо кожная хвіля дарагая, а надвячоркам дык і мужчыны пастаяць па-суседскі, і жанчыны адна да другой падыдуць, прысядуць на лавачку каля плоту, каб словам перакінуцца. Лепшым часам для гаворак былі нядзельныя дні, а калі набягалі восень з зімою, рана змяркалася, то працяглыя доўгія вечарыны. Купкаваліся жанчыны і мужчыны хто як: і па радні, і па суседству, а то і без аніякага правіла – ідуць да таго, да каго сэрца падказвае...

Па няпісанаму распарадку гамонка зачыналася з апошніх гаспадарскіх навін: карова ў хляве брыкаецца – вядро перакуліла з вадою; салома канчаецца – трэба ў «прадсядацеля прасіць, каб выпісаў»; певень акрывавіўся – біўся з Любіным, суседскім... Але павольна навіны сыходзяць, бяседа прыціхае і непрыкметна паварочваецца ў другі бок, пра мінулае жыццё-быццё...

– А помніш, Зіна, як некалі бацькі душыліся на льне...

– Ой-ёй-ёй! Як наша маці страдала! Некія яшчэ з ільну дрэбы рабілі... Цяжка жылі... Ня дай Госпадзі!

– Цяпер во туфлі два разы адзела, запэцкала, не панаравіліся – вон іх на сметнік... Давай ужэ купляць новыя... От раней бацька выцягнуў бы пугаю за гэта...

– Гаспадар першы за стол садзіўся... Папробуй адно вазьміся першым за ложку! Так па руццэ палучыш ад маткі...

Пра сваю генеалогію, пра карані роду свайго ведалі няшмат. З радні ўпаміналі тых, каго памяталі. Да сваёй гісторыі сяляне адносіліся гэтак жа, як і да самога жыцця: пражыў чалавек свае гады на свеце і памёр. Так і мінулае: было ды зляцела. Ніякіх запісаў, фотаздымкаў ці малюнкаў не было ў сялян. Калі што і вялося з даўніны, то толькі ў вусным пераказе. Ад дзядоў ды бабуль. Таму мае першыя блуканні па генеалагічнаму дрэву пачаліся з простага. Я пытаўся малым у бацькі: адкуль у нас такая фамілія? Слова «прозвішча» не ўжывалася, усе гаварылі «фамілія».

– Старыя людзі раней казалі, што фамілья наша пайшла са шведаў, ці што... Бо яна тут рэдкая, ні ў кога такой няма. Калі пачуеш дзе такую, то эта чалавек з нашага роду. Юзік Сцяпанчыкаў пад чаркай нек казаў мне: «Другавец! Ты са швэдаў... Ведаем, гаварылі раней, хто ты. Са шведаў ты!».

Трымценне «швэдскага кораня» абуджала ў маёй галаве роздум аб мінулым продкаў. Цікава ўсё-такі ведаць, адкуль карані цягнуцца, якая гісторыя роднай сям'і. Неабходнасць, а дакладней патрэба такога ведання ўзнікае з гадамі, калі невядома з якіх клетачак розуму спакваля, ды ўсё званчэй і званчэй гучаць позвы азірнуцца, агледзецца, пачуць галасы свайго роду. Становіцца абсалютна зразумелым, што без ведання гэтых каранёў немагчыма спазнаць сябе: хто ты, адкуль ты і на што здатны? Ці як у полі вецер, бязродны і непрытульны, ці самавіты, моцна перавязаны са сваёю зямлёю чалавек...



Вялікая княгіня літоўская Бона Сфорца. 1518–1548 гг.

У некаторых дакументах, нават у метрыцы аб маім нараджэнні, выпісанай бацькам у Быхаўшчынскім сельсавеце, яго прозвішча

ўжыта трохі інакш – ***Другавец***. Была і руская транскрыпцыя – ***Дроговец***. Мы з братам, Анатолем Мікалаевічам, і нашыя дзеці пастаянна прытрымліваемся і пішамся ўсюды ***Драгавец*** (***Драговец*** па-руску), ***Драгаўца***, ***Драгаўцу***.

Што азначае гэты гучны і непаўторны перабор галосных і зычных гукаў – Другавец, Драгавец... Які сакрэт схаваны пад гэтым шыфрам-сугуччам? Дрыгва, дрыга, дрыгавіч, другавіч...

Пра шведаў ішлі гаворкі ў нашым краі: што ў курганах пахаваны шведскія салдаты, што былі яны тут. Мо такое здарылася пасля Палтаўскай бітвы, дзе Пётр Першы разграміў Карла Дванаццатага і яго армію. Мо адступаючы, а шляхі шведскай арміі пралягалі праз нясвіжскія і клецкія землі на Палтаву і назад, пасля Палтавы, застаўся тут які паранены салдат ды прыжыўся на вякі. Думалася, калі Палтаўская бітва адбылася ў 1713 годзе, то амаль трыста гадоў цягнуцца з мінулага ў дзень сённяшні моцныя генеалагічныя галіны, захавалася непаўторнае прозвішча. Яно сапраўды рэдкае, анідзе мне болей не страчалася.

Слухаючы бацькаў сповед пра нашыя, невядома адкуль узятыя шведскія карані, маці пацяшалася:

– Ой, хто тут што знаў! Швэды, швэды, смех адзін... Рэйдзяць усялякае... Рабіць няма чаго...

Бацька не пагаджаўся з ёю і гаварыў у адказ:

– Не, Зіна, людзі абы што выдумляць не стануць. Было, відаць, нешта...

– От, што пра гэто гаварыць! Гадуйце, хлопчыкі, дзяцей і не тлуміце сабе галаву...

– Не, Зіна, не кажы... Парода – дзела сур'ёзнаё...

Пародзе чалавечай бацька, а так, мабыць, думалі і тыя з нашага роду, што жылі за многа гадоў да нас, прыдаваў вялікую значнасць. «Парода ў іх такая – гарачыя, як кіпяток, і ўпартыя, што бараны...» – казаў ён бывала на каго-небудзь з вёскі. Ці яшчэ: «Глянь, адна парода: і стары некалі злодзей быў, і малады зараз...», «Не, парода сваё возьме, яе не пераб'еш...»

Нашым родам бацька ганарыўся, бо на сяле ведалі, што Другаўцовы ніколі не падмануць, не пакрыўдзяць, не палезуць першымі ў бойку, не будуць валяцца п'янымі на вуліцы, не маюць аніякіх хітрыкаў у адносінах з людзьмі і аніякай сквапнасці. Гэта род памяркоўны, адкрыты і прыветны да людзей.

Маці часта прыпамінала, як пасля вайны, калі бацька вярнуўся з фронта, яны, маладыя, пастрачаліся на вясковым гулянні, і ён правёў яе дадому. Упоначы зайшоў у хату, загаварыў, то матка, баба Волька, адразу пазнала яго па голасу. Потым выказалася:

– Эта ж, відаць, Васіля Андрэяваго сын. Я па разгавору пазнала – гаворыць падобно на Васіля... З ім ты дружы, калі будзе да цябе хадзіць... Яны харошыя людзі...

Адкуль, з якіх гістарычных вытокаў звіліся і выйшлі гэтыя «харошыя людзі»? Ці засталося што на зямлі ад іх, хоць якія карані і карэньчыкі? Пашукаем!

...Якая значная для грамадства ўстанова – дзяржаўны архіў! Нягледзячы на бясконцыя ліхаманкі, што траслі беларускую зямлю, усё-ткі ўдалося зберагчы шмат чаго з сведчанняў мінулага часу. Трэба да долу пакланіцца людзям, якія захавалі гэтыя скарбы ад пажараў, бомбаў, варожага захопу, утаптання ў гразь. Бо дзякуючы ім, невядомым і самаадданым, сталі здабыткам нашай сям'і ніколі раней нячутыя звесткі пра свае вытокі...

Аказалася, што прозвішча ***Другавец*** мае свой гістарычны афіцыйны пачатак. ***Упершыню ўпамінаецца ў архіўных матэрыялах 16 красавіка 1697 года пры састаўленні інвентарнай ведамасці памесцяў Рыбаўскай воласці Клецкай ардынацыі.*** Праводзілася інвентарызацыя ў сувязі з перадачай гэтай Рыбаўскай воласці ў арэнду навагрудскаму падсудку Яну Вольскаму. Падсудкам называўся памочнік суддзі.

У ведамасці значыцца, што вёска Хадатавічы мае 24 валокі зямлі. Гэта ў пераводзе на сучасныя паняцці трохі больш чым 590 гектараў. Пералічваліся таксама прозвішчы жыхароў. Пад нумарам два запісаны ***Ян Другавец***, мае чвэрць прыёмнай валокі; пад нумарам восем таксама Ян Другавец, але з прыпіскай «маскаль», мае аднаго сына, аднаго вала, аднаго каня, чвэрць прыёмнай валокі; і, нарэшце, пад нумарам дзесяць Яська Другавец, відаць, іх бацька, бо ён значна багацейшы: меў двух валоў, аднаго каня, яшчэ дваровага вала, палову цяглай (*адраблялася паншчынай*) валокі і чвэрць прыёмнай (*сплачвалася грашыма*) валокі.

Вёска на гэты момант належала Радзівілам. Часы ўладання каралевы Боны мінуліся разам з перадзелам Вялікага княства Літоўскага. Мінуўся і той самы «залаты век» у гісторыі Літоўскай дзяржавы, што спарадзіла сваімі разумнымі

рэформамі і асветніцкай дзейнасцю гэтая нястомная і таленавітая каралеўна. Мо дзякуючы яе здабыткам, пражылі продкі больш чым дзесяцігадовую інтэрвенцыю нашага краю (1654-1667 гг.) маскоўскім царом Аляксеем Міхайлавічам (Цішайшым). У час гэтай навалы Клецкая ардынацыя князя Міхала Караля Радзівіла падверглася спусташальнаму нападу маскоўскага войска пад камандаваннем ваяводы Трубяцкога. Клецк пасля мужнай абароны быў захоплены значна пераўзыходзячымі сіламі маскавітаў, спалены дашчэнту, жыхары перабіты, каштоўная маёмасць вывезена. Не магла гэткая бяда абыйсці хадатаўскіх людзей, а з імі Другаўцоў і іх гаспадаркі. Але выжылі! На той час вёска «перапісалася» ад аднаго радзівілаўскага маёнтка Малева, да якога была прылучана з 1605 года (*зараз Малева – сяло на паўдарозе да Нясвіжа*), да другога – маёнтка Рыбаўшчына Клецкага павета.

Дзе быў той маёнтак – невядома. Зацерліся яго адмеціны ў гісторыі. Бацька ўпамінаў Грыбаўшчыну, недалёкую вёску на клецкіх землях. Відаць, у даўніне яна і была той самай Рыбаўшчынай. Бо ў архіўных выпісках, калі гаворка ідзе пра больш познія часы (напрыклад, рэестр выплаты дзякла, дані і чыншу сялянамі вескі Хадатавічы за 1797 год) гаворыцца ўжо аб Грыбаўскай воласці Клецкай ардынацыі Радзівілаў. І ў далейшым у дакументах пастаянна згадваецца такая назва.

Вядома, што на гістарычным абсягу мяняліся назвы, сугуччы, вымаўленне тых ці іншых мясцін. Але вёсачка наша Хадатавічы якой была ў даўніне, такой і захавалася ў сваёй назве. Паміж сабою яшчэ казалі Хаттавічы.

«Садкуль ты, дзядзька? – Так з Хаттавіч, вунь што каля лесу даматканаўскага...»

Я пакуль не знайшоў часу, каб разабрацца ў тапаніміцы гэтага здатнага слоўца. Зараз у плыні майго споведу, мо, першасным па важкасці выступае тое, што яшчэ да шведскага надыходу ў літоўскія землі падчас Паўночнай вайны мелася ў Літве вёска Хадатавічы і сярод яе жыхароў былі людзі пад прозвішчам Другавец. Азначае гэта, калі праводзіць прамую аналогію, што яны, Другаўцы, былі тутэйшымі людзьмі задоўга да шведаў, і калі і маюць да іх, да Палтавы, ці да параненых шведскіх салдат Карла Дванаццатага, якое дачыненне, то па іншай злучцы.

Значыцца, трэба шукаць іншыя звязкі. Варта звярнуць увагу на слова «маскаль», якім пазначаны ў архіўнай выпісцы Ян Другавец, восьмы нумар. Такое вызначэнне дае падставу меркаваць, што мог існаваць яшчэ адзін выток радавой гісторыі. То быў канец сямнаццатага стагоддзя. Перад тым землямі Клецкай ардынацыі кіраваў энергічны і гаспадарлівы Міхал Караль Радзівіл. Пры ім актыўна заахвочвалася перасяленне ў ардынацыю майстроў, рамеснікаў, цеслярoў, працавітых людзей з іншых земляў, і з маскоўскіх таксама. Такая ж практыка мелася і ў часы ўладання каралевы Боны Сфорцы. Яна праславілася разумнымі рэформамі землекарыстання, добра ставілася да запрашэння іншаземцаў у свае землі. Мог і такім чынам аказацца хто-небудзь з умелых ды спраўных «маскалёў» сярод жыхароў вёскі. Мо быў Іван, а стаў Ян. Нельга выключаць і тое, што сярод гэтых прышлых людзей былі якія-небудзь шведскія варагі, што даплылі, дайшлі, спатрэбіліся на той час у літоўскіх землях.

Але гэта зноў-такі не больш чым здагадкі. Бо як ні круці, як ні выстройвай сюжэт, а не абыходзіцца без супярэчанняў. Чаму маскалём у інвентарнай ведамасці запісаны толькі Ян Другавец пад нумарам восьмым, а Ян Другавец пад нумарам другім не мае такога вызначэння? Таксама, як і Яська Другавец,—аніякі не маскаль. Такі ж, як іншыя сяляне. Мо слова «маскаль» мела не такі сэнс, чым зараз. Вядома, што так называлі рускіх салдат у нашых мясцінах у тыя часы. Мо які рускі вайсковец застаўся паранены пры спраўнай якой кабеце...



Гэтыя сосны перад Нясвіжам памятаюць самога Радзівіла. 2016 г.

А вось яшчэ адна спадзяванка ў маіх генеалагічных вопытах. Мой даўнішні сябра, дасціпны і цікаўны чалавек Аляксандр Яраш, ужо колькі гадоў як масквіч, даслаў па электроннай пошце спасылку на дазнаныя ім гістарычныя факты аб суіснаванні на Усходзе ў XI-XII стагоддзях некалькіх богамільскіх цэркваў, якія дзеляцца па свайму зместу на цэрквы драгавіцкага (грэкаязычнага) і балгарскага (славянаязычнага) уплыву. Славянскае племя дрыгавічы, ад якога, па думцы даследчыкаў, пайшла назва Драгавіцкай царквы, аказваецца, мясцілася ва ўсходняй Македоніі, на захад ад грэчаскіх Салонік. А прыйшлі туды дрыгавічы з усходу, з цяперашніх беларускіх зямель, часткай аддзяліўшыся ад свайго асноўнага гурту і скіраваўшыся далей на поўдзень. І самі дрыгавічы, і Драгавіцкая царква, па версіі даследчыка А.М. Трубачова, маюць адзіны тапанімічны корань, вядомы толькі ўсходне-славянскім мовам і ўтвораны ад беларускай назвы балота – «дрыгва». Слова гэтае не засведчана на той час у лексіцы ні заходніх, ні паўднёвых славян. Ад яго і назва племені, і пайшоўшыя далей вызначэнні. Дрыгва – дрыгавічы, драгавіцкая, драгавец... Выходзіць, ад дрыгавічоў цягнуцца шматлікія пражылкі ў тапаніміцы многіх слоў на паўднёва-славянскіх землях.

Не магу не пагадзіцца ў нечым з такімі высновамі. Бо не аднойчы падчас сваіх вандровак звяртаў увагу на такое падабенства. У Заходніх Карпатах, напрыклад, маюцца прозвішчы Драхавец, Драгавец; у Балгарыі (раён Плоўдзіва) існуе, праўда, толькі ў зруйнаваннях, старажытны горад-крэпасць (град) Драговец, заснаваны яшчэ падчас Рымскага ўладання; у паўднёва-заходняй Чэхіі сустракаюцца тапанімічна



Над возерам у Радзівілаўскім парку. 2013 г.

блізкія назвы, напрыклад, у Карлавых Варах ёсць раён пад назвай Драховіца, вуліца Драговецкая і т.д.

Ды, як аказалася, і на нашых хадатаўскіх могілках згледзелі мы з братам пры больш шчыльным аглядзе радавой мясціны пад лістотай і ігліцай яшчэ адну магілу. Па нашых меркаваннях то, магчыма, маці прадзеда нашага Андрэя Андрэевіча – Марыя Фёдараўна Драгавецкая з Лабажэвічаў.



Драгавец, Драгавецкая і іншыя гістарычныя варыяцыі...

Такім чынам, калі прытрымлівацца версіі аб паходжанні нашага прозвішча ад слоў «дрыгва», «дрыгавічы», то гэта будзе толькі яшчэ адзін доказ яго гістарычнай прыналежнасці да нашай зямлі і да вытокаў нашай нацыянальнай этнічнасці. Дарэчы, сам я больш схіляюся якраз да такога тлумачэння.

Ды што гадаць?! Дарэмная справа. Праўду маюць толькі дакументы. Калі што знойдзецца ў архівах, то і стануць больш зразумелымі вытокі. Адно бясспрэчна: карані нашага роду па бацькавай (гэтак жа, як і па матчынай) руцэ маюць дакументальна пацверджаную генеалогію з часоў Вялікага княства Літоўскага. Бо калі напрыканцы сямнаццатага стагоддзя сяляне вёскі Хадатавічы, Другаўцы, мелі сваю зямлю і гаспадарку ў літоўскай дзяржаве, то азначаць гэта можа толькі адно – што людзі яны былі тутэйшыя, невыпадковыя і прызнаныя законам.

Пачынаючы з 16 красавіка 1697 года, у фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі маюцца сведчанні далейшага лёсу Другаўцоў. Пройдземся па прыступках гэтай фамільнай лесвіцы, што ўецца і бяжыць праз гады ды стагоддзі.

Ад Яські і Яна Другаўцоў наступны ўпамінак здаўся ў архівах толькі ў 1797 годзе. Лічы сто гадоў мінулася! Сярод падуладных князю Радзівілу людзей аказаліся ***Амель*** і ***Сцяпан Другаўцы***. Княжаская канцылярыя засведчыла іх як спраўных і працавітых. Яны плацілі свайму ўладару падаткі. Сцяпан за адну валоку зямлі аддаваў з двара дзякло, гэта значыць ураджай зерня: дзве асьміны жыта і дзве асьміны аўса (*асьміна – 28,7 кг*). Таксама дань – чвэрць гусака, адну курыцу, пяць яек, адзін маток пражы; плаціў і чынш (*грашовы падатак*) – 8 злотых 12 грошаў.



Нясвіжскі замак на малюнку Напалеона Орды. Прыкладна 1860–1870 г.

Сцяпан памёр у 1803 годзе, маючы 68 гадоў. Ад яго застаўся сын ***Ігнат***. Ігнат, відаць, таксама быў талковы гаспадар. Згодна архіўнай ведамасці сялянскай жывёлы па Грыбаўскай воласці ад 5 ліпеня 1812 года, ён меў аднаго рабочага каня і аднаго маладога, чатырох валоў: аднаго на двары, двух у расійскім абозе і аднаго ялавічнага – мабыць, старога, дзеля перавозак. Была яшчэ карова з цялём, бык, сямёра старых і восем маладых авечак, дзве свінні. Прыстойная гаспадарка, што трэба! Па сённяшніх мерках, дык Ігната спаўна можна залічыць у сярэдні клас: на двары амаль што «Хонда» ды «Мазда»... Але, відаць, нясоладка яму даводзілася. Валоў у абоз запатрабавалі... Падобна, што не абышла ваенная навала – прашугавалі праз яго гаспадарскі двор і французы, і рускія. Мо з гэтай турботы Ігнат памёр рана, у 42 гады, у 1814 годзе. Ад яго пайшлі дзеці: ***Раман***, ***Томаш*** і дачка ***Фядора***. Раман ажаніўся на ***Алесі*** праз два гады пасля смерці бацькі, калі яму споўніўся дваццаць адзін. Томаш, які быў маладзейшы за брата на чатыры гады, узяў у жонкі ***Лявосю***.

Архіўная інвентарная ведамасць фальварка Грыбаўшчына за 1835-1840 гады сведчыць, што яны мелі ў Хадатавічах цяглы пляц пад восьмым нумарам. Цяглы – значыцца абкладзены цяглом (павіннасцю, паншчынай, па-сучаснаму падаткамі, якія адраблялiся рознымі работамі) перад уласнікам альбо дзяржавай. Можна меркаваць, што пляц застаўся ад бацькі

Ігната. На пляцы мелася наступная маёмасць: хата добрая, гумно і хлеў старыя. У сямействе трое мужчын і чацвёра жанчын. Работнікаў – толькі чацвёра. Яшчэ была скаціна: адзін конь рабочы, два валы ўласных, адна карова, адзін бык, пяць авечак, адна свіння. Зямлі мелася: аседлай – палова валокі, прыёмнай – таксама палова валокі. Выконвалі павіннасці тры дні ў нядзелю, яшчэ гвалты (*відаць, абавязковыя павіннасці, «па прымусу», з рабочай жывёлай*): ворыва – шэсць дзён, пешыя – трыццаць два дні; дзякла здавалі дзве асьміны жыта і дзве асьміны аўса, плацілі за медычны камітэт 22 з паловай капейкі, а таксама чынш – адзін рубель 26 капеек срэбрам.

Пералічваюцца пражываючыя на пляцы людзі. ***Раман Ігнатаў Другавец***, 45 гадоў, жонка ***Алена*** 42 гады (*то, відаць,* перайначылі *беларускае Алеся ў рускі варыянт Алена*), сын ***Янка*** – 17, дачка ***Антоля*** – 4, брат ***Томаш*** – 42, яго жонка ***Лявося*** – 40.

Землі ардынацыі (суверэннага ўласніцкага землеўладання) у гэты час знаходзіліся пад Расійскай імперыяй і былі заложаны Радзівіламі каштэляну (*высокі чын, у былыя часы так звалі наглядальніка замка, пазней – кіраўніка справамі ваяводства, намесніка ваяводы*) Абуховічу, ад імя якога імі ўладала яго спадчынніца (*пераемніца, наследніца*) Соф'я Міхайлава, нараджоная Абуховіч, а ў замужніцтве – графіня Чапская. На гэты час у сяле пражывалі сяляне па прозвішчах ***Пільневіч***, ***Кіпець***, ***Палуянчык,*** дзясятнік (*накшталт брыгадзіра па-сучаснаму*), ***Каўшэль***, ***Сідар***, ***Гадун***, ***Лабажэвіч***, ***Надзен***, ***Тарабура***, ***Ласоўскі*** і інш. Войтам (*старастай*) быў ***Сцяпан Мікалаевіч Агеевіч***. Мелася ў Хадатавічах карчма (*заезны дом, дзе можна закусіць, выпіць, застацца на начлег*), што сведчыць аб вандруючых праз вёску людзях. Карчма, як пішацца ў архіўнай даведцы, была драўляная, старая, патрабавала пераробкі. Страха саламяная, крытая дранічай. З памяшканняў у карчме мелася станцыя з каморай, у якой печ «крестовая» гліняная, вокнаў чатыры з дробным шклом, падлогі няма. Паблізу маюцца гумно і хлеў, таксама драўляныя, старыя. Арандатар – ***Лейба Аўсеевіч***.

Па пераліку маёмасці відаць, што Раман і Томаш жылі бядней за бацьку: дзве сям'і ў адной хаце, дый жывёлы мелі не ў дастатку. Галоўнае ж – зямля. Яе таксама няшмат, а братам, то першая справа селяніна, раздзяліцца трэба паміж сабою, свае гаспадаркі займець. На гэтым усё пераплятаецца і круціцца ў сялянскім побыце. Тут важнейшая задума гаспадара, напруга яго рук і сэрца.

Справіліся з тым Раман і Томаш. У інвентарнай ведамасці фальварка (*панская гаспадарка з неабходнымі пабудовамі; трымалася на паншчыне, дармовай сялянскай працы падчас прыгоннага права*) Грыбаўшчына за 1841 год значыцца, што Раман Ігнатаў Другавец мае пляц нумар шэсць, новую хату, аднаго каня, двух валоў уласных, шэсць авечак. Зямлі – паўвалокі аседлай, паўвалокі прыёмнай. Сын Янка займеў жонку Зосю, а дачка Антоля значыцца ў ведамасці як калека. То нядобрая для сям'і сітуацыя. Бачна, што не ўсё складвалася ў жыцці Рамана. І памёр ён рана – у 55 гадоў, у 1845 годзе. Мо таму прычынай стала непамерная стараннасць ды праца на прыдбанне сваёй гаспадаркі.

«Спрындзішся на гэтуй зямлі, пакуль на ногі ўстанеш», – казалі некалі старыя на вёсцы.

Брат, Томаш Ігнатаў Другавец, застаўся на восьмым пляцы. Хата старая, гумно добрае, хлеў стары. Зямлі столькі ж, як і ў брата, адна валока. Адзін конь, тры авечкі. Небагата, але і не бедна. Адно кепска: як з адным канём цэлую валоку абрабіць? Ды што зробіш – трэба жыць. Тым больш, што сын расце ў Томаша – Базыль, чатыры гады.

Далей бягуць гады. Па рэвізскай казцы за 1858 год (*так называліся на той час перапісы*) сялян вёскі Хадатавічы Слуцкага павета (*назва адміністрацыйна-тэрытарыяльнай акругі, накшталт раёна па-сучаснаму*), прыналежных да памесця Грыбаўшчына Клецкай ардынацыі памешчыка, генерал-ад'ютанта Яго Імператарскай Вялікасці, князя Льва Людвігавіча Радзівіла, пад сёмым нумарам значыцца ***Янка Раманаў Другавец***, 41 год; яго жонка ***Зося Іванава*** – 42, сыны: ***Андрэй*** – 14, ***Антось*** – 12; дачка ***Аўдоцця*** – 4 гады. У гэтым спісе і ***Томаш Ігнатаў Другавец*** – 58 год, жонка ***Лявося Дземянова*** – 58, сын ***Базыль*** – 20.

Маецца ў архіве Устаўная грамата (дакумент аб узаемаадносінах памешчыка і сялян на яго ўласніцкіх землях) памесця Грыбаўшчына Слуцкага павета князя Л.Л. Радзівіла ад 1862 года. Да граматы прыкладзены пайменны спіс сялян, у тым ліку і вёскі Хадатавічы. Цікавы ён тым, што пералічваецца зямельная ўласнасць сялянскіх гаспадарак. Сярод іншых – ***Янка Другавец***, нумар тры: зямлі дваровай першага разраду 600 сажаняў (*адзін сажань прыблізна 4,55 м. кв., значыцца, каля 27 сотак*), ворыўнай – 8 дзесяцін 1800 сажаняў (каля 9 гектараў), сенакоснай – адна дзесяціна. Усяго 10 дзесяцін. Дзесяціна складае 1,09 гектара. Такім чынам, у Янкі было

трохі больш, чым дзесяць гектараў. Гэта не бедны, але і не багаты гаспадар. Серадняк, назвалі б яго бальшавікі і выслалі куды Макар цялят не ганяў...

Пералічваюцца ў грамаце павіннасці Янкавай сям'і. Іх было шмат. Нават цяжка разабрацца, не ведаючы добра іх прызначэння. Прыгоны (*праца на ўладара зямлі, памешчыка ці пана*) мужчынскія – аж 162 дні ў год, згоны жаночыя і мужчынскія – па 10 у год, летнія здзельныя з выпражжу мужчынскія – 88, пешыя – 5, жаночыя – 6, здзельныя зімнія мужчынскія з выпражжу 57, пешыя – 4, жаночыя – 3 дні. Плацілі грашовую павіннасць 48 з паловай капеек, а таксама пастаянны аброк – 24 рублі і 9 з паловай капеек у год.

Выплаты павінны быць зроблены да дня Святога Марціна (вялікае свята па календару лацінскай царквы, урачыста адзначаецца і зараз 11 лістапада ў краінах Еўропы, накшталт сучасных нашых Дажынак). Каб справіцца з такімі павіннасцямі і падаткамі ды яшчэ сябе пратрымаць, не разагнешся ні на хвіліну. Дзівіцца трэба, як яны спраўляліся?! Мо толькі за лік таго, што людзей было ў хаце. Таму на дзяцей не скупіліся, нараджалі паболей, каб лішнія рукі займець.

Маецца ў спісе сялян ***Томаш Ігнатаў Другавец*** пад пятым нумарам. Зямлі ў яго столькі ж, як і ў Янкі, павіннасці таксама аднолькавыя.

Знайшоўся ў архіўных папках яшчэ адзін прыкметны дакумент: пратакол паверачнай камісіі Слуцкага павета ад 31 жніўня 1864 года аб зверцы размеру грашовых павіннасцяў сялян вёсак Якшыцы і Хадатавічы. Відаць, не вытрывалі бедалагі, рашылі скардзіцца на непасільныя аблогі свайго ўладара, князя Льва Людвігавіча Радзівіла. Была камісія з павета, якая пасля строгіх выверак падтрымала сялян і пераацаніла ў іх карысць штогадовы выкупны плацёж за дзесяціну зямлі.

«Сяляне засталіся ацэнкаю камісіі і дзеяннямі яе задаволеныя... Павераны ад памешчыка аб'явіў незадаволенасць нізкай ацэнкай...»

Пратакол падпісалі павераны ад памешчыка Карл Бржастоўскі, а за сялян Якшыцкага і Хадатаўскага сельскіх таварыстваў іх упаўнаважаныя – Іосіф Андрэеў Ленкавец і ***Іван Раманаў Другавец***. За іх распісаўся па іх асабістай просьбе клецкі валасны пісар В. Бржазоўскі, бо яны самі былі непісьменнымі. Так значыцца ў архіўнай выпісцы.

Гэтая гісторыя мела свой працяг. Праз два гады пасля паверкі сяляне рашыліся выкупіць у памешчыка зямлю: дваровую, ворыўную і сенакосную (*пасля адмены прыгонніцтва ў 1861 г. сялянам было дазволена выкупляць зямлю ў памешчыкаў. Рабілася гэта так: каля 25 працэнтаў кошту патрэбна было сялянам сплаціць памешчыку адразу; астатнюю суму яму сплочвала дзяржава, з якой пасля на працягу 49 гадоў сяляне павінны былі плаціць з разліку ад 4 да 5 працэнтаў гадавых. Гэтая працэдура вельмі нагадвае шырока вядомую сёння форму лізінга ў крэдытаванні*). Сярод сялян-гаспадароў, што дамагліся выкупу, былі ***Іван*** (***Янка***) ***Раманаў Другавец*** і ***Фама*** (***Томаш***) ***Ігнатаў Друговец***, яго дзядзька.

Тут варта звярнуць увагу на некаторыя акалічнасці. Янка Другавец (Іван – гэта ўжо расійскі варыянт) быў абраны сялянамі-гаспадарамі з Хадатавічаў сваім упаўнаважаным на перамовы з паверачнай камісіяй і падпісанне пратакола. Такое магло быць даверана толькі разумнаму і надзейнаму чалавеку. Хто чаго значыць на зямлі, вясковыя людзі добра ведаюць. З пакаленняў аб кожным ідзе свая слава. Калі даверылі, то паважалі ўсім сялом. Ды тое яшчэ не ўсё. На сяле свая градацыя. Ёсць гультаі, п'яніцы, небаракі, бяднейшыя сяляне – батракі. Іх нават не ўносілі ў спісы. А ёсць гаспадары. Як бы вышэйшы знак якасці. Бо калі гаспадар, то, значыцца, змог дамагчыся зямлі, маёмасці, займець жывёліну, да толку весці справу. На такіх зямля стаяла і дзяржава трымалася. І Янка, і Томаш былі ў спісе сялян-гаспадароў.



Цікава, што сяляне дамагліся сваёй мэты. Спачатку іх падтрымала паверачная камісія і знізіла кошт зямлі, а таксама памеры падаткаў на яе, а потым, у 1866 годзе, яны рашыліся на выкуп і сталі самастойнымі гаспадарамі. Атрымліваецца, што не так ужо і кепска адносілася да сялян тагачасная расійская ўлада.

Прычына тут, мабыць, іншая. Жыццё сялян не было памазана мёдам (а ці было яно

ўвогуле калі памазана тым мёдам?!). Адзін спіс павіннасцяў, якімі абложаны сем'і Янкі і Томаша, сведчыць, што свету Божага яны не бачылі за гэтымі адробкамі ды падаткамі. Але была рэформа ў сувязі з адменай прыгонніцкага права ў Расіі, уводзілася практыка выкупу зямлі ў памешчыкаў. Гэта адно, а другое, што ў 1863-1864 гадах успыхнула вядомае паўстанне на беларускіх землях на чале з 26-гадовым Кастусём Каліноўскім. Паўстанне разгромілі, Каліноўскага павесілі на віленскай плошчы. Ды ўсё ж, відаць, былі зроблены нейкія высновы з гэтых падзей. Рашылі мякчэй абыходзіцца з людзьмі, дазволілі змяншэнне падаткаў, актыўней заахвочвалі сялян на выкупы зямлі.



Надзейка, малодшая дачка, ля магілы нашага прадзеда Андрэя Андрэевіча Драгаўца. 2006 г.

Вернемся да нашай генеалагічнай ніткі. Пасля 1866 года Янка Раманаў Другавец не сустракаецца на старонках архіўных дакументаў. Мірскі (*судовы*) прыгавор сялян-уласнікаў вёскі Хадатавічы аб выбранні ўпаўнаважаных для атрымання ў Мінскім губернатарстве граматы на надзельную зямлю 10 студзеня 1904 года падпісаў ***Андрэй Другавец***. Па ўсім відаць, што гэта сын Янкі. Сталы, 60-гадовы чалавек, гаспадар. На жаль, пра яго больш нічога невядома. Падрабязных спісаў, накшталт рэвізскай казкі, у тыя часы не вялося. Аднак падзеі гэтыя не такія ўжо даўнія, і ёсць даволі дакладныя падставы, каб прасачыць далейшую лінію.

На вясковых хадатаўскіх могілках добра захавалася магіла майго прадзеда ***Андрэя Андрэевіча Драгаўца***. На гранітнай магільнай пліце значыцца: жыў 60 гадоў, памёр 16 мая 1929 года. Выходзіць, нарадзіўся ў 1869-м. Маюцца падставы меркаваць, што ён і быў сынам таго самага Андрэя, які падпісаў мірскі прыгавор сялян. Ад яго, Андрэя Андрэевіча, пайшлі сыны ***Васіль (мой дзед) і Сяргей, дочкі: Анця, Ганна, Стэпка і Волька.***

Так развівалася гісторыя сям'і да нашага часу па бацькавай руцэ. Не магу сцвярджаць, што маё даследаванне мае

абсалютную дакладнасць. Вядома ж, не. Бо Другаўцовых у Хадатавічах было даволі. Знаходжу звесткі ў архіўных спраўках, і гэта не даўніна, а перадваенны час, 30-40-я гады, пра Соф'ю Васільеўну Другавец, Мікалая Якаўлевіча і Міхаіла Якаўлевіча Другавец, пра Антаніну Андрэеўну Друговец, Адама Антонавіча і Марыю Адамаўну Другавец. Некаторых памятаю, ведаю, што даводзіліся раднёю, а сказаць якой – не магу. Ніхто не вёў сямейных альбомаў ці запісаў, а што гаварылася пра радню, пра тое, хто каму як даводзіцца, то быллём парасло...

Па матчынай лініі таксама знайшліся цікавыя гістарычныя звесткі. Маці наша, ***Зінаіда Антонаўна***, мела ў дзявоцтве прозвішча ***Шарапа***. Яна нарадзілася ў суседняй вёсцы ***Малаеды 9 студзеня 1928 года***. Бацька яе, ***Антон Паўлавіч Шарапа***, і маці, ***Вольга Трафімаўна Пасацкая***, былі простымі сялянамі, жылі на сваім хутары ў прыгожым месцы, мелі невялічкі кусок зямлі, з якога карміліся аж да 1953 года, пакуль не пагналі іх пад прымусам у калгас.

Першыя афіцыйныя ўпаміны пра папярэднікаў роду Пасацкіх зыходзяць да 1811 года. Па перапісу сялян вёскі Аношкі Навагрудскага павета Мінскай губерніі, прыналежнай да памесця Наруцавічы памешчыка Міхаіла Осіпава сына Абуховіча, маюцца Лявон Сямёнаў Пасатцкі, яго сын Марцін. Пасля ў розныя перыяды ўпамінаюцца Мацвей Лявонаў Пасацкі, Франц, Лукаш, Мікалай, Марцін, Фадзей, Базыль, Стась, Фама, Ігнат. Жаночыя імёны ў родзе Пасацкіх таксама цікавыя і каларытныя: Марцэся, Тэрэса, Юстына, Разаля, Караліна, Дарота, Віктося, Антоля. Паказальна, што



Спрадвеку мы тут, на роднай зямельцы

з пераходам пад расійскую юрысдыкцыю яны паступова мяняюцца. З літоўскіх становяцца больш рускімі: Іван, Сцяпан, Максім, Васіль, Варвара, Волька, Аляксандра, Гануля.

У часы расійскага ўладання вёска Малаеды і суседнія з ёю Грыцы, Аношкі, Каменка, Казлы, Сангалы, Кміты належалі да памесця Наруцавічы Навагрудскага павета графа Ігнація Карлавіча Чапскага. Граф Чапскі ажаніўся на Соф'і Абуховіч і атрымаў у пасаг мясцовыя землі. Адметна, што сяляне гэтых вёсак былі бяднейшымі за радзівілаўскіх. Мелі меней зямлі, дый раскідана яна па акрузе рознымі кавалкамі, перавіта вузкімі палоскамі. Акрамя звыклых павіннасцяў, адпраўлялі сыноў у рэкруты (*у салдаты, на вайсковую службу*). З тысячы душ пяцёра рэкрутаў – такі быў загад Яго Імператарскай Вялікасці. Франц Пасацкі з Аношак аддаў у рэкруты сына Мікалая, 24 гады, росту два аршыны (*аршын – 71,1 см*), чатыры з дзвюма восьмымі вяршка (*вяршок – прыкладна 4,4 см*). Хлопец быў па сённяшніх мерках малаваты ростам, каля 160-ці з хвосцікам сантыметраў...

Падводзячы вынікі гэтага экскурса ў гісторыю сямейнай генеалогіі, можна засведчыць, што на зямлі беларускай пачынальнікі нашага роду па бацькоўскай і па мацярынскай лініях з'яўляюцца карэннымі жыхарамі. Яны спазналі ўсе гістарычныя перапетусы, выпаўшыя на долю роднага краю з часоў Вялікага княства Літоўскага, перажылі напады і разбурэнні, выжылі, выстаялі, былі гаспадарамі, захавалі сваю непаўторную мову, заўжды людзьмі заставаліся.



Хутары



Хутары

Вымаўляю гэтае слова і чую, як поўняцца замілаваннем ды лёгкай смугою мае думкі. Дзве хутарскія мясціны ў суседніх вёсачках Хадатавічы і Малаеды, адкуль родам бацька і маці, сышліся ў маім сэрцы незгасальнай знічкай, якая колькі ўжо гадоў свеціцца ў думках і цешыць душу. Ад яе зыркага агеньчыка сыходзяць хвалі гаючага цяпла малечых дзён, што прабеглі сярод блізкіх і дарагіх людзей. На хутарах прайшло маё маленства. Да гэтых хутарскіх мясцін цягнуліся мае шляхі-дарогі, пакуль жылі там родныя. Цягнуцца і зараз, хай няма ўжо ні каменьчыка на тых мясцінах, дзе стаялі пабудовы, адно поле на ўзгорках, да самага небасхілу, так, што, здаецца, ніколі тут не жылі людзі. Але жылі, сеялі, аралі, расцілі дзяцей, спраўлялі вяселлі і радзіны. Гэта не тая гісторыя, што адкрываецца праз архіўныя пажоўклыя лісты, гэта дзея жыцця, якую я бачыў і спасцігаў сваім малечым розумам. І якую зараз, праз гады, спасцігаю зусім інакш, у іншым сэнсе, бо стаў бацькам, адчуў імгненнасць і беззваротнасць мінулых дзён. Тут не столькі хроніка часу, колькі хроніка адбіткаў дзіцячай памяці аб тагачасным вясковым жыцці.



Кросны

Хадатавічы. Дзед Васіль

Невялічкі ўзгорак каля лесу, метраў мо сто. Ад яго акуратная і раўнюткая сцежка, прама ў елкі ды хвойкі, бярэзіны ды алешыны. На ўзгорку хата, плот вакол двара, пасярэдзіне праём, прыкрыты загарадкай з жэрдак, каб заехалі падводы ці зайшлі ў хлеў карова з цялушкай і авечкі, наўскасяк гумно. Збоку, пад плотам, калодзеж, прыкрыты густою рабінаю; далей невялічкі садок, абапал ад яго соткі, за якімі бяжыць у бок дзядзькі Сяргея пахілая сцяжынка. А там, за дзядзькавай сядзібай, шырокая дарога на вёску, дзе грамадою тоўпяцца хаты і хлявы, разлілося балота, дзе людна і цікава.

А тут хутар бабы Наташы. Бацькавы мясціны. Тут я, малы, бегаю па двары за курамі, торкаю дубцом сонную свінню, гуляю з сабачанём, пужаю варон і сарок. Тут мне і цікава, і сумна. У хаце адзін дзед Петрык. Ён у камізэльцы паціху дыбае вакол шырокага стала, на шыі вісіць «санціметар». Размячае аўчыну, рэжа яе на кавалкі вялікімі і вострымі нажніцамі. Аглядае іх нетаропкім позіркам, перакладвае, мяркуючы на будучы кажух, потым пераносіць да швейнай машыны і стракоча то гулка, то паціху. Ён не ходзіць на працу, шые дома людзям кажухі, а калі-нікалі яшчэ такія лёгкія, з сукна, валёнкі з падкладкай на ваце ці камізэлькі.



Дзед Васіль – салдат царскай арміі. Прыкладна 1916–1917 гг.

Але больш кажухі. Петрык асабліва не любіць, каб я тут круціўся каля яго. Бо ўсюды, на дашчатай падлозе, на лавах, ляжаць кускі аўчыны, і я магу іх збэрсаць. Баба Наташа грыміць чыгункамі ў пярэднім пакоі, дзе печ, падлога з гліны, куфар у кутку, што застаўся ад дзеда Васіля, стол для яды. За дзвярыма – цёмная каморка, выхад у сенцы, з іх – на двор.

Мяне цягне ў каморку. Там, пад дашчатымі паліцамі, нерухома сядзіць на сене ў старой пляцёнцы курыца. Яна не пудзіцца, нават калі падыходжу блізка. Толькі пачынае кудахтаць і круціць галавою з чырванаватым грэбенем. Я не разумею, чаму на надворку нават і блізка не падыйду да курыцы – адразу ўцячэ, а тут нерухома сядзіць, не баіцца. Баба чуе кудахтанне, крычыць мне: не пужай, а то зляціць з яец, куранят не будзе...

Маці недзе на полі каля бульбяніка, бацька прыедзе пад вечар на ровары, а мо пехатою прыйдзе з Нясвіжа. Там ён знайшоў работу і часта не начуе на хутары.

Я выходжу на двор, баўлю час, ганяючыся за парасём, пакуль баба Наташа зноў мяне не прыпыніць. Потым ціха вяртаюся да курыцы ў прыцямнелую камору. Стаю перад ёю і думаю, адкуль жа возьмуцца тыя кураняты. Залажу пад паліцы, прысаджваюся каля пляцёнкі. Слухаю, як зусім па-іншаму чуюцца ў каморцы дваровыя гукі. Зарыкала карова – прыгналі з пашы на абед; забразгатала аб ланцуг вядро ў калодзежы – баба дастае ваду; задзынкала малако ў дайніцы – пачала даіць; пранізліва запішчаў кот – патрапіў бабе пад ногі, мяўкаючы і выпрошваючы свежага малака... «От гадасць, няймецца табе, пайшоў вон!» – злуецца спалоханая баба Наташа.

Мне ў каморцы ўтульна і добра. Ніхто не ведае, дзе я, а я, наадварот, ведаю пра ўсіх, дзе яны... Вочы млеюць і пакрысе закрываюцца, я засынаю салодкім сном і, здаецца, бачу хмаркі на сінім небе, потым зоркі і месячык. Аднекуль

здалёк голас маці, гоман на двары. Ці то нават бацькаў голас чуецца мне. Потым галасы становяцца гучней і трывожней, мяне штурхаюць, бяруць за рукі. Казка канчаецца, праходзіць сон...

– Бачыш, дзе ён, а мы тут свет перавярнулі! Увесь двор абмацалі, – упякае мяне баба Наташа. Твар яе расчырванелы. – Дзякуй Богу, што знайшоўся хлопяц... Ажно ў сэрцы закалола...

Падыходзяць бацька з маці. Я нічога не разумею. Бачу толькі, што на двары прыцемкі. Дзіўна – нядаўна ж было сонейка! Бацька бярэ мяне на рукі, маці чамусьці кажа:

– От, шныпарка малая! Эта ж куды залез! Толькі спусці яго з вачэй, то ні знойдзяш – такі дастычны... Падумаць адно, пад курыцу – і спіць сабе, а мы тут места ні находзім...

Гэта, бадай, адзінае, што засталося ў маёй памяці з нашага сумеснага жыцця з бабай Наташай на яе хутары. Баба Наташа, ***Драгавец Наталля Лявонцьеўна***, была родам з суседняй клецкай вёскі Быхаўшчына. То кіламетраў з пяць у бок Клецка, за нашым лесам. У размовах звычайна казалі Бухаўшчына. Бабуля ў дзявоцтве мела бацькоўскае прозвішча Бельская. Пайшла замуж у Хадатавічы за Драгаўца Васіля Андрэевіча, майго дзеда. Было тое недзе ў 1922-1923 гадах. Бо мой бацька, ***Драгавец Мікалай Васільевіч, нарадзіўся 25 верасня 1925 года***, а перад ім была яшчэ старэйшая сястра Таня ды памерла ў маленстве.

На гэтым хутары, на зямлі, што выдзеліў дзеду Васілю яго бацька Андрэй Андрэевіч, спачаліся і мае першыя крокі. Маладыя баба Наташа і дзед Васіль жылі спачатку разам з дзедавым братам Сяргеем, у адной хаце. На сваім пляцы ў першыя гады справілі толькі гумно. Хату ставіў другі мужык бабы Наташы Петрык Пятрушчыкаў, так яго звалі па-вясковаму, а па пашпарту Гадун Пётр Іосіфавіч. За яго яна пайшла замуж пасля смерці дзеда Васіля. Петрыка я і памятаю малым, як старэйшага мужчыну на хутары. Было мне тады гадоў чатыры-пяць.

А дзеда, Васіля Андрэевіча, ведаю толькі па адной-двум фотакарткам. Адна маленькая, мо пяць на пяць сантыметраў, другая трохі большая – ён у форме салдата царскай арміі на фронце, недзе пад Баранавічамі, бо быў мабілізаваны на вайну з немцамі, відаць, у 1916 ці 17-м годзе.

Дзед Васіль памёр з тыфу, маладым і спраўным, памёр заўчасна. Па ўспамінах ён быў чалавек вельмі добры



Дзед Васіль (уверсе, другі злева) на фронце з салдатамі

да людзей і да сваёй сям'і. Моцна кахаў жонку, цешыўся з сына. Маленькі Коля, наш бацька, запамятаў два ці тры вобразы жывога таты.

– Адзін раз ён брыўся, намыліў шчокі белай пенай, як дзед Мароз,– расказваў ён мне пра дзеда.– Схапіў мяне за каўнер, ды да сябе цягне, хоча прыціснуць да шчакі і смяецца, а я вырываюся, перапуджаны... Дык ён кажа: ня бойся, Колік, то ж я, бацька, а ня дзед Мароз...

– Другі случай быў такі. Я малым круціўся каля вярстака, ён рабіў, заняты быў, не прыглядаўся на мяне. Маці праганяла, каб ня шкодзіў, а я ўсё роўна там кручуся.

Дзед Васіль пасля акопаў. 1917–1920 гг.



– Ухапіў неўпрыкмет яго аршын, такі з дзеравянных планачак сталярскі мэтар, круціў яго туды-сюды, пакуль не зламаў. А за Польшчай інструмэнт дорага каштаваў. Бацька ўгледзеў, забраў зламаны аршын ды ім мяне па мяккаму месцу пацягнуў. Кажа, каб ня шкодзіў боляй...

Вось і ўсё, што засталося ў яго памяці. Маленькім хлапчуком быў, калі развітаўся назаўжды з бацькам. Нечаканая смерць забрала маладога дзеда Васіля, яму споўнілася толькі трыццаць, а сям'ю зрабіла сіратамі. На пачатку трыццатых гадоў на беларускіх землях лютаваў тыф, ад якога людзі не мелі ніякага ратавання, акрамя смерці. Тыф касіў пад корань цэлыя сем'і, сіратамі заставаліся немаўляты і падлеткі. Не абышла бяда і нашых продкаў. Родная сястра дзеда Васіля Ганна ў суседніх

Малаедах захварэла тыфам. Ён даражыў ёю, моцна перажываў і шкадаваў. Таму, калі яна памерла, сам паклаў яе ў труну і панёс на могілкі. А праз колькі дзён захварэў тыфам і хутка памёр, пакінуўшы малых — пяцігадовага сына Колю і ўсяго гадавалую дачку Ядзю. Так яны засталіся адныя, без бацькі.

Застацца без гаспадара на зямлі — большага гора не прыдумаць. На мужчыне стаяла гаспадарка і перш-наперш цяжкая хлебаробская праца. Узараць зямлю, пасеяць жыта, сабраць ураджай, абмалаціць снапы, накасіць сена на зіму карове, управіцца з канём ды жывёламі, падправіць плугі і жняярку — усё гэта і многае іншае пад сілу мужчыне, здароваму і клапатліваму. Без мужчыны — гора, голад і пакуты. Такая бяда спасцігла бабу Наташу.

— За Васілём, казалі на сяле, Наташа гора ня знала. Ён яе на руках насіў, — так гаварыла наша маці пра дзеда Васіля.

— Баба Волька нек расказвала, што яны разам былі недзе ў гасцях, і Наташа нешта закапрызнічала за сталом, то Васіль стаяў над ею ўвесь вечар, ажно тросся каля яе...

Пры маім маленстве, калі сяло гудзела людзьмі як вулей пчоламі, яшчэ заставаліся жывымі колькі чалавек, што памяталі дзеда Васіля. І заўжды пры ўспамінах гаварылі аб ім з асаблівай павагай: што Васіль Андрэеў чалавек быў акуратны, спагадлівы і вельмі прыстойны. А яшчэ славіўся як умелы сталяр. Рабіў прасніцы, верацёны, лавы і сталы, нават кросны.

Кросны – справа для дыхтоўнага майстра



Кросны дзедавай работы, што адышлі ў пасаг цётцы Ядзі, захаваліся. Мы з братамі адшукалі іх на гарышчы ў цётчынай хаце і паставілі на маім лецішчы. Штораз, бываючы там, углядаюся ў дзедаву працу. Шырокія ліпавыя плахі на чатырох вуглах, сасновы кругляш для палатна, грэбень з касцянымі планкамі, лодачка-бягунок, унізе, пад нагамі, панажы, шырокія



Сям'я Івана Іванавіча і Сцепаніды Антонаўны Ляпешка. Сыны Мікалай і Анатоль. 1968-1969 гг.

і даўгаватыя педалі, нібыта лыжы... Усё пераплецена вяроўкамі-цягамі, злучана планачкамі, сціснута клінамі.

Колькі ж умельства, напругі і кемлівасці спазычылася дзеду Васілю, каб іх змайстраваць! Бо кросны гэта не для прастака, гэта выраб дыхтоўнага майстра. Яны ў сялянскай хаце што тая маленькая фабрыка па вырабу тканіны. Прыбяруцца жанчыны зімовым ранкам з работамі – ды за кросны. Павольна, дзень да дня, накручваюцца на вал-кругляш цвяцістыя сукняныя пакрывалы ці ільняное пруткае палатно. Ляскоча цэўка, стукацяць панажы. Ды не ў кожнай хаце такія фабрыкі. Дарагая рэч на той час.

Помніцца, як спраўна ўвіхалася за кроснамі цётка Ядзя, бацькава родная сястра. Не адвесці вачэй: то лоўка шугане плыткую лодачку-шпульку, чаўнок з цэўкай, налева, то, наадварот, направа; то перабірае нагамі па дошках-клавішах; то моцна грукоча рабрыстым бёрда, падбіваючы пераплеценыя ніткі...

Казалі яшчэ пра дзеда, што любы і прыязны ён быў да сваёй радні. А радня здатная – чатыры сястрыцы і брат. Што з імі, дзе ды як яны прытуліліся?

Ганна, што заўчасна памерла з тыфу, была замужам за ***Антосем Пасацкім***, родным братам бабы Волькі (аб ім яшчэ будзе гаворка) у Малаедах. Ад іхняга шлюбу засталося чацвёра дзяцей: ***Вася Пасацкі***, жыў там жа, у Малаедах; цётка ***Стэпка***, была замужам за Іванам Ляпешкам, жылі ў Нясвіжы; дзядзька ***Анцік***, жыў у Баранавічах, і ***Зоня***, яе не помнілі, бо заўчасна згінула ад «падучкі», падучай хваробы. Усіх, акрамя, вядома, Зоні, я добра ведаў, бо часта бачыліся і наведваліся.

Слуцкая брама ў Нясвіжы



Мо бліжэй за іншых склаліся стасункі з цёткай ***Стэпкай і Іванам Іванавічам Ляпешкамі***. Страчаліся, гасцявалі, не праміналі – заходзілі, бываючы ў нясвіжскіх крамах ці на базары. Не было выпадку, каб яны не накрылі



З бацькам на магіле дзеда Васіля. 2002 г.

стол, не пачаставалі мяне гарадскімі прысмакамі. Блізкімі таварышамі мне сталі іх сыны, Анатоль і Мікалай, будучыя афіцэры. Іван Іванавіч, бацька і гаспадар, быў здатным сталяром, вельмі каларытным, гаваркім чалавекам. Дагэтуль я часцяком у розных жыццёвых выпадках карыстаюся яго знакамітым выразам: «Кажы добра й будзе добра!».

Усялякі раз па дарозе дадому ў свае Хадатавічы хочацца мне зазірнуць на «Ново место», так казалі некалі на гэтыя пабудовы ў Нясвіжы, за Слуцкай брамай, на ўзгорку, дзе стаіць дагледжаны дом, жывуць прыязныя нам сын Івана Іванавіча Мікалай з абаяльнай Нінай, жонкай. Старэйшы, Толя, быў высокім афіцэрам Генштаба, зараз з сям'ёй жыве ў Маскве.

Цікава, што родныя па малаедаўскай Ганне прыходзіліся дваюраднымі і бацьку, і маёй маці. Бо Ганна была роднай цёткай бацьку, а Антось, яе мужык, родным дзядзькам маці. Калі пра Ганну я толькі чуў пераказы ў размовах, то другую родную сястру дзеда Васіля, цётку Вольку Грудзінаву, я хоць і не вельмі добра, але памятаю з дзяцінства, бо Грудзінавы жылі на ўскрайку сяла, перад могілкамі, куды я выганяў у статак нашу карову. Цётка была ўжо хворая, распаўнелая, часта сядзела ля адкрытага акна і пазірала на вуліцу. Заўжды вельмі ўважліва і дасціпна прыглядалася да мяне, малога пастушка, калі я бег за статкам. «Так эта Вася, Колеў сын?!» — пыталася яна ў каго на вуліцы ці на надворку і з дабрынёй кідала позірк у мой бок, аглядаючы з ног да галавы. ***Грудзіна Вольга Андрэеўна***, сястра дзеда Васіля, нарадзілася ў 1903 годзе, а памерла ў 1985-м. Зараз у той хаце дажывае свой век



На нашым вяселлі. Прыгажуня з Салаўёў

бацькава стрыечная сястра ***Зоня***, адзінокая і састарэлая, бо не сталася дзяцей. Яшчэ дзве сястры жывуць, ***Маня*** – у Нясвіжы, ***Валя*** – у вёсцы Хрыпкава, кіламетраў з пяць ад Хадатавічаў, таксама пажылыя.

Мо лепей і бліжэй за ўсіх ведаў я дзядзьку ***Сяргея***, роднага брата дзеда Васіля. Ён, як нарадзіўся, так і пражыў з сям'ёй у Хадатавічах усе свае гады. Спачатку на хутары, з паўкіламетра ад бабы Наташы, а потым заставілі дзеда з абжытага пляца, дзе мясціліся прыгожы садок, невялічкая сажалка, поплаў для выгулу птушкі, хлеў, гумно, хаціна – усё спрацавана і аздоблена ягонымі рукамі – перабірацца на голы дзядзінец у вёску. Сяргей і Мар'я, яго жонка, выгадавалі чацвёра дзяцей: дачок ***Сашу***, ***Маню***, ***Фаню***, сына ***Толю***.

Былі яшчэ сёстры ў дзеда Васіля. ***Стэпка*** замужам у Салаўях, вёска ў суседнім Клецкім раёне. Яе дзеці: ***Васіль*** з Грыцькавічаў, прыязджаў на бацькава пахаванне летам 2006 года; ***Маня***, ***Волька*** і ***Таня***. Я іх зусім не ведаю. Толькі на маё вяселле ў 1977 годзе па запрашэнню бацькоў прыехала з Салаўёў Стэпчына дачка Таня. Прыгожая і прыемная жанчына, працавала там у краме. З ёю была дачка, студэнтка Мінскага медыцынскага інстытута, прыгажуня – мая, атрымліваецца, траюрадная сястра. Пасля таго не бачыліся.

Яшчэ ***Анця***, дзедава сястра, жыла ў Хадатавічах. Ад яе пайшоў і пабудаваўся недалёка ад нас ***Міша Каўшэль*** ці ***Міша Анцін***, як яго называлі на сяле; у Казлах замужам за Марулевічам жыла ***Саша***, Анціна дачка, і была яшчэ ***Фаня***, пайшла замуж у Хрыпкава, вёска каля Міцькавічаў.

Такі вось ланцужок, ды не маленькі, нашай радні па дзеду Васілю. Калі падлічыць, дык траюрадных у нас з братам сясцёр і братоў, ого, колькі! Але ж пра некаторых не ведаем нават, дзе яны жывуць і чым займаюцца. Так складваецца па жыцці. Разрастаюцца галінкі з дрэва, вяжуцца новыя суквецці, падымаюцца новыя парасткі.



Няма ні каменьчыка там, дзе стаялі пабудовы

Баба Наташа. Петрык

Памятаю, як мы з'язджалі з бабінага хутара ў сваю адбудаваную хату, у вёску. Дзядзька Вечык, родны матчын брат, прыслаў грузавік. Для мяне, малога, то было дзіва дзіўнае – незабыўнае. Кабіна, мноства незнаёмых рычагоў, педаляў, ручак; непаўторныя пахі з мешаніны бензіну, скураных сядзенняў, цыгарэтнага дыму, чалавечага поту. Я і зараз беспамылкова пазнаю гэты пах у любым грузавіку. Ды, праўда, зараз кабіны так не пахнуць. Усё ў пластмасе.

А тады бацька і маці пасадзілі мяне каля шафёра, самі пагрузілі ў кузаў невялічкі скарб, што выдзеліла ім баба Наташа і што прыдбалі самі за гэтыя некалькі сямейных гадоў. У памяці нават гучная гамонка наконт крэслаў, якія бацька вынес з бабінай хаты. Ці то баба прасіла, каб ён іх не забіраў, а бацька не згаджаўся, бо крэслы прывёз дзядзька Вечык, як яны пажаніліся. Так ці інакш, але падзел адбыўся. Справа гэта заўжды нялёгкая і можа надоўга сапсаваць адносіны паміж раднёй. Тым больш, што галота пасля вайны была неймаверная. Але калі пачалі садзіцца, бацька наверх, мы з маці да шафёра ў кабіну, баба Наташа заплакала. Зажалілася яе сэрца.

Пра жыццё на хутары маці ўспамінала нялепш. Баба Наташа была гарачаватая характарам. «Успыльчывая», – казалі бацькі. Гэтая асаблівасць яе характару нядобра адбівалася на сямейным суіснаванні.

– Парадку ў іх ня было,– не раз з прыкрасцю гаварыла маці, прыпамінаючы свае першыя замужнія гады.– Петрык падчыняўся матцы, здароўем слабы, які з яго гаспадар?! Ня было толку... Наташа ўсё недавольная, нярвовая. Мяне на самую цяжкую работу, дажа калі табою бярэмянна, пасылала...

– Адзін раз пасварылася. Дык выправіла ў прымаразак начаваць у гумно з хаты. Нешта ёй закруціло ў галаве. Бацька ў Нясвіжы, я адна там аставалася. Эта што за людзі такія былі, каб бярэмянную дзеўчыну ў гумно адправіць?..

Калі мы аддзяліліся, пераехалі ў сваю хату, што з дзедавага гумна паставіў на вясковым пляцы бацька, то і адносіны сталі лепшымі. Як раней, так і цяпер: свякроў і нявестка не павінны разам таўчыся ў хаце, бо не абыдуцца без папрокаў. Баба Наташа ці не штодня наведвалася з хутара на вёску да Ядзі, дачкі, не абмінала і нас, прысаджваючыся на кухні на зэдлік, што быў умураваны ў збітую з гліны нашу печ. Ніколі маці не выказала хоць які папрок ёй за мінулае, ніколі не было, каб не запрасіла за стол паесці «рэдкаго» (*так называлі па-вясковаму тое, што гатавалі на першае: суп, боршч, бульён*) ці смажанага са скваркай (*пад скваркай разумелася не толькі спражанае сала, але і кавалак мяса, ці птушыная костка*). Гаварылі аб справах на гаспадарцы, аб вясковых ці калгасных навінах. А навіны не радавалі.



Баба Наташа са мной маленькім на хадатаўскім хутары. Прыблізна 1952–1953 гг.

На канцы 50-х – пачатку 60-х гадоў, выконваючы чарговую бязглуздзіцу тагачаснага савецкага кіраўніка Мікіты Хрушчова, хутары пачалі рушыць, жорстка, нават сілай прымушаючы сялян перасяляцца ў вёскі. Што значыць перасяляцца? То сапраўдная трагедыя. Ні капейкі на гэта не давалі. Бяры селянін сякеру, разбірай сваю хату, гумно, хлеў і перацягвай на параконцы на новы пляц. Але ж там трэба зрабіць падмурак, выкапаць пограб, калодзеж, абгарадзіцца плотам, паставіць хлеў... Бяда! Адкуль узяць сілы, людзей, дзе знайсці грошы?

Прыйшлося разбіраць і бабіну хату. Прымус мясцовых начальнікаў

быў непахісны. Бацька разам з Колем Ядзіным, мужам сястры, пад галашэнне і жаночы плач пачалі бурыць пабудовы і перавозіць хутар на голую пустэчу ў вёску. Абжытае месца, калі разабралі хату, стала няўтульным і жаласлівым. Праз год трактарамі выдзерлі прыгожы сад, засыпалі калодзеж – ад былога жытла не засталося і следу.



Калодзеж – як у вёсцы...

Баба Наташа цяжка прывыкала да новага месца, не кажучы аб тым, колькі гэта каштавала ёй сілы, душэўнай мукі і здароўя. Перасяліўшыся, яна стала часцей бываць у нас, жалячыся на розныя няўдобіцы вясковага існавання. І зямля бедная, няўгноеная, і абрабіць яе няма сілы, і сенакосу не даюць...

Яно так і было. Доля сялянская ніколі не была завіднай. І пад Расіяй, і пад палякамі, і пад немцамі аб адным толькі думалася: як выжыць, як пракарміцца, як вытрываць. Бо не родзіць зямля, душыць падаткамі ўлада; у вайну партызаны забяруць апошняе, альбо немцы падпаляць хату за тое, што заходзілі партызаны... А яны, партызаны, не пыталіся, заходзіць ці не заходзіць...

Пры бальшавіках, як называлі на вёсцы савецкі строй, сілай загналі ў калгасы, адабралі зямлю, жывёлу, усталявалі жорсткае працоўнае рабства, лічы, што без аніякай аплаты, за сімвалічныя пяць капеек. Аблажылі падаткамі кожную курыцу на двары і яблынку ў садзе. Сагналі людзей з хутароў. Аб пенсіях нават і не чулі.

Я дзіўлюся часам: як, наогул, яны выжылі і выстаялі ў пекле вайны, у сталінскім рабстве, у хрушчоўскай бязглуздзіцы? Дзяржава ніколі не песціла беларускага селяніна, яна ніколі не была яму сваёй, роднай. Часцей за ўсё была мачахай, злоснай і нядобрай, як у тыя тлумныя паслярэвалюцыйныя часы. Таму і не дзіва, што не трывалі такога жыцця, рана адыходзілі на той свет людзі. Помнікі на могілках сведчаць: памёр у пяцьдзясят, у пяцьдзясят пяць, калі пражыў шасцігадовы дзясятак, то добра...

Патрацілася нервамі і здароўем праз тыя ліхаманкавыя гады і баба Наташа. Толькі ўявіць, чаго ёй каштавала застацца адной з малымі дзецьмі на руках пасля смерці гаспадара! Гібельны лёс чакаў наперадзе такую жанчыну. «Уратавалася», як казалі,



Каля адрынкі (дзверы ў хлеў ці гумно), што зрабіў дзед Васіль. 2002 г.

што за Петрыка пайшла замуж. Гэта сапраўды было выратаваннем для яе і для дзяцей – Ядзі і Колі. Хоць з гаркатою, не раўняць, што пры родным бацьку, але выжылі, ператрывалі вайну, калгасную галадуху, падняліся на свае ногі.

Сэрцам і душою баба Наташа была спагадлівым чалавекам. Я добра памятаю яе ў бальнічнай палаце. Мяне давязлі да дактароў у Нясвіж, калі апендыцыт пераходзіў у агульную інфекцыю. Жыццё вырашалі хвіліны. Збярог мяне ад магілы хірург нясвіжскай райбальніцы Мікалай Мікалаевіч Падгайскі. Яшчэ ў машыне, перад Нясвіжам, я страціў прытомнасць, нічога не памятаў, а калі праз дзень адкрыў вочы, то ўразіўся, што вакол белыя сцены, а на столачку каля майго ложка сядзіць баба Наташа. Два тыдні яна начавала ў бальнічнай палаце, але дагледзела мяне, шасцігадовага ўнука, пасля вяртання з таго свету. Ні бацька, ні маці не маглі адлучыцца з гаспадаркі і ад работы ў калгасе. Пагадзілася быць са мною ў тыя цяжкія хвіліны баба Наташа.

...І зараз бачу перад вачыма яе вобраз. Бачу, як яна ідзе да нас. Сагнутая, з палачкай, але шпарка рушыць па вясковай вуліцы, перавязаная на галаве цёплаю хусткай, у чорнай фуфайцы, рукавіцах і валёнках. Часта дыхае, заходзячы ў хату, бо калоціцца сэрца. Мне заўжды станавілася шкада бабу Наташу. Было відаць, як цяжка ёй даецца жыццё. Мучылі арытмія і задышка. Пакрысе сталі дрыжаць рукі. Часта яна магла разнервавацца і заплакаць з-за якой дробязі. Здавалася, няма нічога кепскага, каб нервавацца і перажываць, а яна ўсё роўна заклапочаная і напружаная. Цяпер, праз гады, я разумею, што баба Наташа, бываючы ў нашай хаце, вінавацілася перад бацькам і маці за мінулае, за тыя прыкрыя недарэчнасці ў адносінах падчас сумесных дзён на хутары.

А была яна ўжо немаладая. Ды яшчэ заўчасна, восенню, 6 лістапада 1966 года, памёр і другі мужык, Петрык. Не вытрываў, не перажыў пераезду з хутара. Пачала адольваць хвароба. Ён даўно мучыўся пякоткай страўніка. Мне было трынаццаць, пайшоў у пяты клас. Дзеду Петрыку ішоў шэсцьдзясят трэці – не стары яшчэ мужчына. Перад тым бацька адвёз яго ў Даматканавічы. Там мясціўся фельчарска-акушэрскі пункт

і было некалькі ложкаў для хворых. Бацька трохі ведаў тамашняга доктара Страцкевіча. Але не памагло. Хвароба была даўняя. Яшчэ на хутары я наглядаў, як Петрык часта падыходзіць да куфэрка, дастае белы парашок, размешвае з вадою і выпівае. Мяне дзівіла, што парашок шыпіць у вадзе, выпускаючы процьму бурбалак. Так шыпела сода, якой ён ратаваўся ад пякоткі, ці язвы па-руску.



Куфар дзедавай работы

Петрык умеў добра шыць кажухі. А гэта справа на вёсцы цанілася. Кажух узімку для селяніна – найпершая адзежа. Зімы ў той час стаялі марозныя, завейныя. У ватоўцы перакалоцішся з холаду. А добрых шаўцоў няшмат. Да Петрыка людзі займалі чаргу, няслі аўчыны і з суседніх вёсак: Арды, Жылічаў, Даматканавічаў. Яго прафесійны інструмент – нямецкая швейная машынка «Зінгер» – брала тоўстую аўчыну. Кажухі выходзілі ў Петрыка акуратныя, да спадобы людзям. Таму і гонар ён меў. Грошы зарабляў неблагія. Лічыўся завідным кавалерам. Так на сяле называлі сталых хлопцаў-халасцякоў. Калі ўзяў у жонкі бабу Наташу пасля смерці Васіля, то купіў пляц на хутары, паставіў там новую хату. Дзівіліся людзі: глянь, Петрык Наташу ўзяў з двума дзецьмі... На сяле такое здаралася рэдка. Жанчына з дзецьмі, удава – прапашчая лёсам; не кожны мужчына рашыцца карміць не сваіх...



Дзед Петрык шыў кажухі. То хлопцы любілі ў іх пафарсіць...

Калі шчыра гаварыць, то дзед Петрык быў па вясковай прыкмеце чалавек «нелядакі», значыцца, не сварлівы, не злы. Крыху занудны, па матчыных словах, «фанабэрысты», але да бабы Наташы прыязны, да дзяцей прыёмных таксама. Бо са сваімі

не зладзілася. Як я дазнаўся праз архіўную даведку, неяк дома аб тым і не гаварылася, у бабы Наташы з Петрыкам нарадзіўся сын Аляксандр. 9 чэрвеня 1932 года яго пахрысцілі ў царкве ў вёсцы Малева ў прысутнасці хросных Мікалая Якаўлевіча і Яўгеніі Мікалаеўны Другавец. Але хлопчык неўзабаве памёр. Слабенькі аказаўся здароўем. Сам Петрык таксама быў слабы сілаю, хваравіты, гаспадаркаю не мог займацца. Ды меў іншую здатнасць: майстар, шавец – не той статус, каб каля свіней хадзіць. Араць, сеяць ды гной цягаць на прыватніцкую зямлю давялося вучыцца маладзенькаму яшчэ Колю, нашаму бацьку.

Мінуўся немалы час ад тых падзей. Баба Наташа і Петрык пахаваны на вясковых могілках адзін каля аднаго. У іх на помніку адно прозвішча – Гадун Наталля Лявонцьеўна і Гадун Пётр Іосіфавіч. Дзед Васіль ляжыць ад іх трохі вышэй, метраў праз трыццаць. Збоку магіла яго бацькі, нашага прадзеда Драгаўца Андрэя Андрэевіча. Тут, на могілках, яны ўсе блізкія і навечна паяднаныя.

Баба Наташа памерла 7 ліпеня 1982 года. Было ёй пад восемдзесят гадоў. Я ўжо дасягнуў пасады першага сакратара Мінскага гарадскога камітэта камсамола. Тыдні за два да смерці прыехаў на вёску. Маці кажа: моцна хворая баба Наташа, ты пайдзі да яе. Мы пайшлі з бацькам да цёткі Ядзі, дзе ляжала немагушчая бабуля. Я спрабаваў яе супакоіць, разважыць, але яна ўсё ведала лепей за мяне. «Не, дзеткі, я не пражыву доўга. Слабая зусім...». Так і выйшла. Мо праз тыдзень ці два баба развіталася з намі. Ішоў дождж, была восень. На пахаванне прывезлі маладога бацюшку. Пасля могілак мы стаялі з ім каля Грудзінавага плоту і разважалі пра зямное жыццё...





Магілы бабы Наташы і Петрыка на хадатаўскіх могілках

Бабу задушыў валляк, так на вёсцы казалі пра запаленне шчытападобнай залозы, ці па-навуковаму гіпертэрыёз. Праз некалькі гадоў такая ж хвароба напаткае бацьку, маці, мяне, цётку Ядзю, яшчэ многіх вясковых людзей. Прычынай, відаць, тое, што вада ў нашых калодзежах не мае патрэбнай колькасці ёду. Яна сапраўды іншая нават на смак. Чай з яе атрымліваецца, нібыта з мыла звараны. Ды гэта тэма асобнай размовы. А тады, на могілках, я ўпершыню пацалаваў бабу Наташу ў халодныя губы. Пры жыцці не прыйшлося. А кепска. І шкада таго. Мо пра тое думаў і бацька, калі, развітваючыся назаўсёды, казаў перад труною: «Даруй мне, маці, за ўсё...»

З родных у бабы Наташы былі ***сястра Марыля*** і ***брат Аляксандр***. Ён не вярнуўся з фронта, згінуў на вайне. Марыля жыла пад Клецкам. Муж яе, ***Бацьвінка***, працаваў на вадакачцы, на чыгуначнай станцыі ў Лукаўцах. Яна не раз, як казала маці, ушчувала бабу Наташу за сваркі, калі бацька і маці жылі на хутары ў Хадатавічах. Цётку Марылю яны паважалі. Цётка цяжка хварэла. Я бачыў яе толькі аднойчы, калі прыехала яна на хутар пагасцяваць да бабы Наташы, да сястры сваёй. Здаецца, тое было на Каляды. Добра адкормлены конь чмыхаў белаватым парам; здатныя санкі запакаваны пахучым сенам і пакрыты квацістай саматканай дзяружкай; цётка Марыля, поўная целам, бадзёрая і прыязная, з боханамі жаўтаватых пірагоў, з пакункамі і карзінамі...

Ад Марылі пайшоў сын, бацькаў дваюрадны брат Валодзя Бацьвінка, які неспадзявана памёр. Я добра ведаў яго дзяцей Галю і Юру, маіх траюрадных. Ды Юра памёр маладым, а Галя скончыла педагагічны інстытут, замужам на Магілёўшчыне.

У бабінага брата Аляксандра яшчэ да вайны радзіліся ***Маня*** і ***Ніна***. Маня жыла ў Ардзе, да нас амаль не прыходзіла, а Ніна ў Жылічах (вёскі Клецкага раёна) і была замужам за ***Лёдзем Казарыным***. Такое не характэрнае і рэдкае для нашых мясцін імя – Лёдзя. Так звычайна звалі, на польскі манер, жанчын. А тут мужчына, вядомы ў калгасе трактарыст, дасціпны чалавек. Лёдзя з Нінай часцяком на матацыкле, звычайна пад вечар, наведваліся да нас у Хадатавічы. Ён поўны, мажны, з кучаравымі валасамі і вельмі цікавы ў размове. Расказваў пра свае справы ці пытаўся пра наша жыццё, то нібыта артыст у тэатры: голас то заміраў, то ўзвышаўся, іграў мноствам тэмбраў, сугуччаў, пераліваў – заслухаешся... Цётка Ніна штораз яго прыпыняла: то сціхні ты ўжэ...



Дарога на малаедаўскі хутар улетку

Малаеды. Баба Волька

Напрасткі ад Хадатавічаў да Малаедаў, матчынай вёскі-калыскі, кіламетры са тры. А да дзедавага хутара і таго меней, бо хутар на пагорку, з паўкіламетра ад самой вёскі ў наш хадатаўскі бок. З маці мы хадзілі да бабы ў Малаеды праз Любін двор, што цераз вуліцу, насупраць нашай хаты. Далей полем да Высокай, лясок каля курганоў, потым уніз да перасохлага балота. Пераходзілі па кладачцы невялічкі ручаёк. За зялёнай чупрынай травы пачыналася дзедава зямля. Было яе няшмат, гектараў каля пяці ворыва і гектар сенакосу. І была яна даўно калгаснай. Ды маці заўжды называла яе дзедавай, нашай зямлёй.

...Па сцяжынцы метраў сто на пагорак і вось ён, дзедаў садок са стракатым дываном ружовых галовак канюшыны. Збоку роўныя палоскі бульбы, за імі лапушацца буракі. Падыходзім да веснічак, адчыняем. За імі вытаптаная шырокая сцежка ў хлеў, далей у хату, а калі прама, то на зваротны бок пляцу, да сажалкі з высокімі вязамі, хмызняком і шырокім аблогам залацістай пшаніцы. А ніжэй, за пшаніцай, акуратным радком прыляпіліся адна да другой вясковыя хаты. Гэта сама вёска Малаеды. Яна аздоблена невялічкімі пагоркамі і нізінамі, урэзанымі ў небасхіл хутарскімі пабудовамі, разложыстымі вольнымі дрэвамі, лугавымі праталінамі.

Малаеды... Гучная ды адметная назва. Тут і заглыбляцца не трэба ў тапаніміку. І так усё зразумела. Ма-ла-еды, мала яды... Мала ядуць там людзі. А чаму яны мала ядуць? Бо яды, відаць, нестае ім удосталь, таму і мала ядуць, таму і празвалі іх малаедамі. Гэта не навуковы дослед, а толькі маё, самае найпершае і самае простае тлумачэнне вясковай назвы. Ды, здаецца, мо так яно і было. Бо вельмі ўжо беднымі ды гаротнымі здаваліся мне, малому, тутэйшыя малаедаўскія людзі.

Пляц, што выбралі для забудовы дзед Антось і баба Волька, размясціўся на ўзгорку паміж дзвюх вёсак: Малаедаў і Коханавічаў. Направа – малаедаўскія хаткі, налева – збіліся гуртам коханаўскія пабудовы. Але Смаляковых хутар (Антось Смалякоў – так за вочы называлі дзеда) лічыўся малаедаўскім. Месца, на якім ён стаяў, навідавоку адусюль. Дзіўная прыгажосць. Палогі ўзгорак, заліты цёплым сонечным святлом, празрыстыя далягляды і неабсяжны прастор – такі, што святлее галава, спакайнеюць душа і сэрца. Прастора здаецца ўвасобленай рэальнасцю, нібыта кранаеш яе рукамі. А дзедаў пляц – садзік, сажалка, пратаптаныя сцяжынкі, што разбягаюцца, як галінкі на дрэве ў розныя бакі, – бачацца мне зараз, праз гады, тым самым нулявым пунктам, з якога пачаўся адлік маіх жыццёвых шляхоў.

Вось там, за нізінкай, адкуль раніцай узнімаецца сонца, наша Казлоўская сярэдняя школа, цэнтральная сядзіба нашага калгаса «Дружба» – кантора, клуб, аўтобусны прыпынак, дарога на Нясвіж, Гарадзею, Стаўбцы, Дзяржынск, Мінск...

Гэтыя назвы – мае пажыццёвыя каардынаты. Але ж дзедаў хутар прыкметней за іншых. І па сённяшні дзень чую пад нагамі яго моц і праўду. Яны даюць мне права быць тут, лічыць гэты край сваёй гістарычнай спадчынай. Радзіма тут наша.

Мы тут народжаны, перамешаны ў стагоддзях з гэтай зямлёй. Мы яе жывыя сімвалы, пэўныя фігуры, знакі. Мы яе дзеці і яе гаспадары па самаму вялікаму праву Божага промыслу. Як маці і дачка, як бацька і сын, як адна сям'я. Тысячамі нябачных павуцінак перавязаны мы з мінулым, з думамі і наканаваннямі продкаў. Мо ў тым, што не раздзяліць нас, зямлю і людзей, ёсць трываласць кожнага з нас як чалавека і народа нашага як нацыі непаўторнай і адметнай.

Такімі думкамі бруяцца ў маёй, далёка ўжо не юначай галаве згадкі аб тым часе, калі стаяў малаедаўскі хутар і жывы дзед Антось збіваў грушы з высокай цукроўкі каля калодзежа,



Празрыстыя далягляды, неабсяжны прастор

каб пачаставаць мяне, свайго малога ўнука; калі баба Волька, жывая і недасягальная ў сваёй шчырасці, гаманіла пра карову і свіней, пра сена і картоплю, ладзячы на стол няхітрыя сялянскія прысмакі, бо як жа не сустрэць дачушку Зіну і зяця Колю, унукаў Ваську, Толіка...

На хутары нарадзілася наша маці, яе малодшыя браты Лёнік і Антон, сястра Маня, старэйшы брат Вечык. Там пражылі да скону дзён сваіх баба Волька і дзед Антось. Хоць і няма ўжо ні дрэўца на тым месцы, хоць і пагорак, здаецца, паніжэў за шматлікія гады расстання, але ж засалодзіцца, заб'ецца ўвішна сэрца пры позірку з-пад бальшака на адзінокі клёнік пасярод чыстага поля. Бо там, за клёнікам, «устае куточак той прыгожы...»

...Баба Волька прыкмеціла нас з картапляніка, разагнулася, паправіла хусцінку на галаве, адкінула ў бок зелле.

– Унучак да мяне прышоў, Васька, от добра,– кажа яна, ідучы нам насустрач. Вочы свецяцца дабрынёй, губы ласкава ўсміхаюцца.

– Дальбог, чакала вас сёння, думала, мо прыйдзяце зранку. Свіням дала, трохі падветрыло і палезла ў картоплі, бо зелле душыць,– паварочваючыся да маці, гаворыць баба Волька.

– Зранку я тожа на грады пашла, палола, зарастаюць. А за калхозам свету ні бачыш, сваё гібее,– адказвае маці.

Баба Волька глядзіць на мяне з прыветнай усмешкай, добрымі пранікнёнымі вачыма. І так ва ўсе мае гады: у маленстве, у школьны час, у студэнцкія леты, і на вяселлі, і ў наступныя сустрэчы: «Васька, унучак прыехаў...». Азіраючыся



Баба Волька: дабрыня і спагада. І так ва ўсе мае гады... Здымак 1983 г.

зараз на той час, шкадую аб адным – рэдка бачыўся з бабуляй, рэдка прыязджаў да яе. Мітусня паўсядзённых спраў тлуміла галоўнае, а маладой галаве не хапала розуму, каб спасцігнуць гэты самападман.

Дзеля ўсіх людзей, ведаўшых бабу Вольку, заўжды прыязнымі былі яе шчырасць, дабрыня і прыветнасць. Да бабы прыходзілі пагаварыць, пажаліцца на цяжкі лёс, пазычыць грошай ці папрасіць чарку гарэлкі. Адным словам, адвясці душу. Нікога яна не адхіснула, усім была рада, спачувала і старалася памагчы. Асабліва любіла частаваць свайго зяця, нашага бацьку. Ды і ён любіў заехаць да яе, да сваёй цешчы. Баба Волька з радасцю сустракала яго на хутары, бо ён ніколі не заязджаў госцем, а браўся за якую мужчынскую справу. Паважала зяця за прыстойнасць, вернасць жонцы і дзецям, працавітасць.

Бацька не вельмі быў ахвочы да гарэлкі, але, як і ўсе франтавікі, мог прапусціць чарку-другую, асабліва пасля ўпартай работы. Маці глядзела на гэта спакойна, бо лічыла такое абсалютна нармальным для сталага і недурнога мужчыны. Але адзін раз, узімку, выйшла прамашка. Баба пачаставала бацьку не сваёй самагонкай. А тая аказалася цукровай, дурной і шкоднай. Бацька выбраўся дадому, дайшоў да ляска пад Высокай і стала яму мутарна: галава набрыняла, зямля і неба закруціліся, завярцеліся. Ён паваліўся на снег, не змог падняцца, заснуў. Быць бядзе, каб не натыркнулася на яго знаёмая даярка, што ішла з Малаедаў на ферму. Яна раскатурхала бацьку, падняла са снегу, давяла дадому. Усялякае было ў гэтым жыцці...

Да бабы на хутар мы хадзілі пешшу, дабіраліся на раварах, а калі трохі абжыліся, купілі матацыкл з каляскай, то ездзілі ўсёй сям'ёй. У буднія дні – надвячоркамі, каб памагчы па гаспадарцы; нядзелямі ці ў святы – днём, каб прывезці падарункі,

пасядзець, нагаварыцца. Заўжды ў яе меліся прыхаваныя каўбаса ці падсушанае мяса, бутэлечка віна ці гарэлкі – хоць і прыпаміналі бацькаву прыгоду з цукроўкай. А жыла баба ўжо адна, без дзеда, аднак магла прывеціць і родных і чужых людзей, гасцінна сустракала кожнага, хто пераступіць парог.

...У вайну на хутар поначы завіталі незнаёмыя людзі, пастукаліся ў вакно. Двое мужчын і жанчына. Папрасіліся пераначаваць, сказалі, што ўцяклі ад немцаў з лагера, ажно з-пад Мінска.

– Што рабіць, Волька? – пытаўся дзед.

– Трэба пусціць, Антось, шкада людзей...

– А хто ведае, што эта за людзі, чаго яны хочуць?

– Не, трэба пусціць...

– А дзе ты іх паложыш – вунь чацвёра ляжаць, ступіць няма куды!

– Нічога, Антось, у каморцы паложым...

Прыкладна такі дыялог адбыўся ў тую ноч паміж дзедам і бабай. Іх размову пачула пасярод ночы дачушка Зіна, наша маці. Аб тым яна часта ўспамінала. Асабліва пра тое, колькі перажылі пасля той ночы страху. Прышэльцаў палажылі ў каморцы на сяннікаx з саломы, раніцай паклікалі за стол паесці звараной бульбы. Што адбылося далей, я хачу перадаць матчынымі словамі:

– І тут мы ўгледзялі на іх адзежы, на спінах, жоўтыя звёзды. Я хоць і малая была, а помню бацька ажно збялеў, выйшаў у сені, кажа бабе: эта ж, відаць, камуністы беглыя. Заб'юць нас немцы, як дазнаюцца пра іх.

– Адно ж тыя людзі, акуратныя такія, культурна так гавораць: вы, хазяін, ня бойцеся, мы вам нічога кепскага ня зробім. Мы яўрэі, з лагера ўцяклі, пераадзецца няма ва што. Мы пабудзем трохі ў вас, перадыхнём ды пойдзем далей, дзе немцаў няма...

– А назаўтра ў сяло немцы наляцелі, мусіць, іх шукалі, на матацыклах. Ой, як страшна ж было! На суседскі хутар заехалі, чутно гергечуць па-свойму: юда, юда, юда... То мы ні жывыя, ні мёртвыя. Калі к нам прыдуць – канец будзе! Бацька ня ведаў, што й рабіць. А баба кажа гэтым людзям: вы хавайцеся ў пшаніцу...

А во, праз мінуту й немцы на дварэ! Пытаюцца, юда был... То бацька стаў белы, як палатно. А маці: не, пан, не, ня было, не... Бог даў, абыйшлося, а то пабілі б нас усіх тады...

– Яны пражылі ў нас мо больш за два месяцы. Днём ня

выходзілі з хаты, бярэгліся чыйго вока. Матка нашла ім адзежу другую, у саміх нічога ня было, але знайшла нешта для іх; дала сала, хлеба, і яны пайшлі. То дзякавалі, дзякавалі нас...

– Я пасля вайны да іх у Мінск ездзіла. Так ужэ яны мяне страчалі добра. І Мінск паказвалі, і ў парыкмахерскую вадзілі завіўку зрабіць...



«Дрэвы памятаюць». Малюнак Надзі Драгавец на рэспубліканскай выставе «Халакост вачыма мастака». 2000 г.

Сувязі з той яўрэйскай сям'ёй перарваліся. Ніхто не запісаў ні прозвішчаў, ні імён тых людзей. Я часта прыпамінаю гэты эпізод і думаю: якія ж пранікнёныя сэрцы былі ў бабы і дзеда, каб маючы ў хаце чатырох малалетніх дзяцей, прыюціць зусім незнаёмых людзей, уцекачоў з лагера смерці, адмечаных жоўтымі адбіткамі, паставіць пад смяротную пагрозу сябе, дзяцей, блізкіх. Адзін неасцярожны крок, чый-небудзь выпадковы позірк з-за вугла, нечаканая сустрэча і ўсё – канец!

Думаецца яшчэ і такое. Сёння няма вайны і трасухі, не параўнацца з тым часам, а паспрабуйце папрасіцеся да каго на начлег! Не адчыняць не тое што дзверы, а выклічуць адразу міліцыю. І можа, правільна зробяць, бо людзі ў нас зараз не чакаюць дабра адзін ад другога, часта адзінокія ў роспачы і бядзе. Свет змяніўся, у ім скончыліся людскія адносіны. Хоць я далёкі ад думкі, што раней беларусы толькі і марылі, як зрабіць добрую справу суседу. Гэта зусім не так. Аднак былі і такія людзі, як нашыя дзед і баба – ***Шарапа Антон Антонавіч*** і ***Пасацкая Вольга Трафімаўна***. Яны, дарэчы, ва ўсе мае з імі сумесныя гады аніразу пра гэта не гаварылі і не ўспаміналі. Бо лічылі гэта, я ўпэўнены ў тым, абсалютна адэкватным чалавечым крокам. Як жа не памагчы чалавеку, калі яму кепска?! Тут і гаварыць няма пра што...

І вайна, і жыццё пад палякамі, і калгасны побыт спаўна адбіліся горам ды мучэннямі малаедаўскаму хутару. Ад успамінаў толькі можна «розумам тронуцца», як гаворыць маці, не кажучы ўжо пра тое, як на самой справе было перажыць сцюдзёны час.

– Але матка наша от харакцяр мела інцярэсны. Нек ніколі не ўнывала. Што б там ні было, а яна нек заўсюды ў настроі...

Сапраўды, якія б трагічныя моманты не падсцерагалі сям'ю ў той час і пасля, баба Волька, бабуля наша дарагая, ніколі не журылася, не паддавалася самоце. І гэта не было выпадковасцю ці лёгкім напускным флёрам, саматужным прыкрыццём роспачы. Не, гэта зыходзіла з недасягальнай гармоніі яе душы з навакольным светам. Гармонія ж гэта ў сваю чаргу апіралася на глыбінныя каштоўнасці чалавечай існасці, на сваё, праз працу рук, разуменне сутнасці жыцця.

Дзіўна па сённяшніх мерках, бо і я, і мае дзеці, і жонка Галя, здараецца, у намнога прасцейшых абставінах паддаёмся непатрэбнаму смутку ці роспачы. А хіба ж зраўняцца нашы цяжкасці з тымі, што давялося перажыць ім! Адна вайна чаго каштавала! Эпізод з прытулкам яўрэйскай сям'і — толькі чарговы адбітак з тых бясконцых трывожных начэй і дзён. Цярпелі ад немцаў і ад сваіх. Начамі на хутар пастаянна наведваліся так званыя «народныя мсціўцы», часта, па сутнасці, бандыты, бо хто толькі пад партызан ні падстройваўся! Забіралі картоплю, муку, парасят з хлява; аднойчы да смерці збілі дзеда — ім здалося, што ён кепска пакарміў іх коней. Днём наляталі немцы ці паліцаі, шукалі дзяўчат для адпраўкі ў Германію, дзеда хапалі на прымусовыя работы...

Але баба Волька валодала рэдкім талентам мужна і спакойна пераносіць цяжкія ўдары лёсу. І пры гэтым не скамянець ад гора, не адхіснуцца ад людзей, не страціць усмешку на твары, не патушыць агеньчык у вачах. Рана памёр з раку страўніка дзед. Не адолеў нават шосты дзясятак. Баба



Баба Волька на нашым з Галяй вяселлі. Злева ад яе Аляксандр Спірыдонаў. За імі дзядька Антон з Марыяй. Справа Галя са мной і Валодзя Янчук. в. Хадатавічы, верасень 1977 г.



Доктар Фаіна Арсеньеўна Булат (справа)

засталася адна на хутары. Абрабляла зямлю, бегала ў калгас, трымала карову і свіней, здавала яблыкі нарыхтоўшчыкам, каб зарабіць на хлеб. Зімовымі вечарамі пры запальнічцы прала кудзелю, рабіла на кроснах прыгожыя пакрывалы.

– Як яна толькі спраўлялася?! – не раз казала маці. – Столькі дзяцей, эта парцізаншчына! Потым зямлю і ўсё астальное ў калхоз адабралі. А ніколі ж мы ні галадалі, нек умела сэканоміць, зберагчы, заўсюды на стале яда была.

– І разумная. Няграматная, ня вучылася, а як на базар у Сноў паедуць, то лепш за усіх пасчытае і грошы, і колькі япрук важыць...

– А як школа пачалася, то пашыла мне зрэбную торбачку для кніжак, а дзед лапці новыя сплёў... З Хаттавіч хадзіла са мною вучыцца Фаня Ніны Янкавай, доктарам потым стала. Мы дружылі з ею. Дык мяцеліца пачнецца ці маразы, то маці заўсюды яе пакідала начаваць у нас, бо ёй далёко дадому...

Фаіна Арсеньеўна Булат скончыла медыцынскі інстытут, доўгі час працавала загадчыцай радзільнага аддзялення, галоўным акушэрам-гінеколагам Нясвіжскай райбальніцы. Выдатны спецыяліст, чалавек спачувальны і добразычлівы, яна займела шырокую вядомасць і павагу сярод людзей. Дагэтуль яе імя ўпамінаюць з цеплынёй і ўдзячнасцю многія жанчыны. А сама Фаіна Арсеньеўна пры стрэчах часта добрым словам азывалася пра нашу бабулю.

Хударлявая, у фуфайцы і доўгай спадніцы, у гумавых ботах, прыгнутая долу цяжкай бясконцай працай, але з адкрытым і прыветным тварам – такой баба Волька засталася ў маёй малечай памяці. Нястомная працаўніца, разумніца ва ўсіх справах, заўжды ў настроі, з добрай усмешкай на твары. Каля яе было весялей, бадзёрай на сэрцы, не так маркотна ад беспрасветнага сялянскага побыту.

З родных у бабы меліся старэйшыя брат і дзве сястры. Адна, ***Зося***, была замужам у Супрунавічах (недалёкая вёска ў бок Снова), мела дзіця. Але яны памерлі з тыфу напачатку дваццатых гадоў.

Анэта, другая сястра, пайшла замуж за малаедаўскага хлопца. Яны выехалі на заробкі ў Расію. Прыжыліся на чыгуначнай станцыі Заходняя Дзвіна. Назва гэтай расійскай мясціны была на маім слыху ці не ўсе гады, бо маці часта гаварыла пра цётку Анэту.

– Да толку яна была, відная такая і разумная. Прысылала нам адзежу адтуль, а мы ім сала слалі ў Западную Дзвіну.

– Помню прыехала да нас у трыццаць дзявятым, як саветы прышлі. Бацька, на кані стрэў яе на станцыі ў Пагарэльцах, то адзета была так далікатно. Ні то што мы – ў лахманах... Мы з ею ў Наруцавічы ў парк на міцінг хадзілі тады, як саветы прышлі...

Двое сыноў цёткі Анэты пагінулі ў вайну з немцамі. Абодва ваенныя лётчыкі, сталінскія сокалы, згарэлі жывымі. Уявіць толькі гэта, і сэрца зойдзецца ад смутку, а як перажыць такое маці?! Мо ратавалася цётка Анэта дачкамі, бо акрамя сыноў былі ў яе Валя, Зоя, Нюра і Зіна. Па маладосці калі-нікалі сустракаліся з імі, прыязджалі нават да нас у Хадатавічы, а дзе хто зараз – невядома. З гадамі пераціраюцца роднасныя ланцужкі, страчваюцца самыя блізкія сувязі, на іх месцы прарастаюць галінкі новага бясконцага дрэва жыцця.

Старэйшы брат бабы Волькі ***Антось Пасацкі*** пражыў жыццё ў Малаедах. Пра яго хочацца расказаць паболей. Прыкметны, незвычайны чалавек. Хата дзядзькі Антося стаяла на ўскрайку сяла, на прыгорку, пакрытая белаю бляхаю, што адразу выдзяляла яе сярод іншых. Я памятаю яго, дзядзьку Баровіка. Лысаваты, з дасціпнымі пранікнёнымі вачыма, каржакаваты. Здаўна цягнулася за ім і за яго сям'ёй, акрамя прозвішча, вясковая позва Баровікі. Пра бабу таксама за вочы казалі Волька Баровікава. Маці не ведала, адкуль такое пачалося. Але ў архіўнай даведцы дакладна значыцца, што Пасацкія і Баровікі пераплялiся каля 1850 года. Значыцца, адтуль, ад прадзедаў, цягнулася, не страцілася гэтае неафіцыйнае прозвішча. Такія з'явы на вёсках не былі рэдкасцю. За многімі сем'ямі меліся неафіцыйныя гістарычныя мянушкі.

Дзядзька Антось падлеткам стаў на чале гаспадаркі. Бацькі заўчасна памерлі з тыфу. Пры ім засталіся малалетнія сёстры. І ён, па сутнасці, хлапчук, паказаў сябе смелым, спраўным гаспадаром. Матчын родны брат Лёнік расказваў



Баба Волька маладая. Здымак з помніка на наруцаўскіх могілках каля вёскі Аношкі

пачутую ад бабы Волькі гісторыю, як нейкі злыдзень штораз запускаў коней на патраву ў яго сірочыя сенажаці. Даведзены да адчаю хлопчык пасёк іх пугаю да крыві. Гэта ўразіла нават таго нягодніка, і патравы скончыліся.

Малады гаспадар падняў сясцёр, аддаў іх замуж. Быў паранены ў царскую вайну з немцамі. Атрымліваў за гэта ад рускага цара пенсію, даволі значныя грошы, на якія купіў зямлю, стаў паважаным, заможным чалавекам.

– Добры і разумны, – казала маці пра дзядзьку. – А як бабу нашу, сястру сваю, любіў. Адзін раз мяцеліца хутар замяла, дык ён ад сяла сцежку пратаптаў, бо баяўся, што баба будзе йсці да яго ды ёй цяжка будзе...

– Ніколі не прыйшоў да нас на хутар, каб што не прынёс нам. Ці цукерку, ці яблыко, але прынясе...

Пры паляках дзядзьку Антося выбралі солтысам, накшталт старасты, пасля – войтам, гэта яшчэ вышэй. Ён арганізаваў пачатковую школу ў Малаедах, вучыў сялянскіх дзяцей. Пры немцах зноў назначылі старастам, бо ўмеў трохі па-нямецку, навучыўся на германскім фронце. І калі налятралі ў сяло браць маладых на работы ў Германію, то дзядзька Антось многіх папярэджваў, ратаваў ад аблавы. Пагаворыць з афіцэрамі, яны і едуць далей. Перасцерагаў аб немцах партызан, меў сувязі з камандзірамі атрадаў. Але калі прыйшлі савецкія, то дзядзьку засудзілі за супрацоўніцтва з акупантамі і адправілі ў сібірскі лагер. Вярнуўся пасля смерці Сталіна, зноў наладзіў гаспадарку, памагаў бабе Вольцы, калі засталася адна. Хоць і свая сям'я ў яго была немалая.

З сям'ёй у дзядзькі Антося атрымалася цікава. Яго першай жонкай была родная сястра дзеда Васіля Драгаўца з Хадатавічаў – Ганна. Я ўжо ўпамінаў аб тым у папярэднім раздзеле. Гэта яна захварэла тыфам, яе хадзіў хаваць дзед Васіль. Ад гэтага шлюбу ў Антося Пасацкага нарадзілася

чацвёра дзяцей, якія прыходзіліся нам, па матчыным вызначэнні, роднымі «з дзвюх рук». Пра іх я таксама расказваў.

Я малым доўга не разумеў, што ў нас за радня такая — «з дзвюх рук». Блытаўся ў гэтым сваяцтве. Маці, бывала, казала: «З Васям Пасацкім мы дваюрадныя і па мне, і па бацьку...» Так усё пераплялося, як сышліся бацька і маці, пажаніліся.

У другім шлюбе ў дзядзькі Антося нарадзіліся яшчэ дзеці. З усімі мы радніліся, добра ведалі.

Дзядзька Антось Пасацкі застаецца ў памяці нашага роду светлым і разумным чалавекам. Пахаваны ён разам з жонкаю недалёка ад дзеда Антося і бабы Волькі на наруцаўскіх могілках, дзе шумеў некалі адмысловы еўрапейскі парк графа Чапскага. Там часта мы праходзімся з братам, углядаемся ў магільныя пліты, у фотаздымкі на помніках. І баба Волька на помніку маладая, з ясным, адкрытым тварам. Углядаемся, пазнаём нешта матчынае, нашае, нашых дачок у яе абрысах. «Яна цябе так любіла, сынок», — казала мне на бабіным пахаванні маці. Было гэта пахмурнелай восенню 1991 года.



Тая ж самая дарога на малаедаўскі хутар узімку. Але адна ва ўсе дні

Дзед Антось. Смалякі

Мне падабалася бываць у Малаедах ва ўсе мае малечыя гады. Помніцца непаўторны, асаблівы пах дзедавай хаты. Увогуле, за жыццё я прыкмеціў, што кожная сям'я мае свае адметныя пахі. Гэткімі ж пахамі адрозніваюцца і пабудовы, у якіх жывуць тыя ці іншыя сямейныя суполкі. Нават зараз, седзячы за камп'ютарам, адчуваю пахі дзедавай хаціны. Толькі падумалася аб тым, і з'явіліся, прыляцелі аднекуль гэтыя салодкія, непадобныя ні на што водары. А разам з імі наплылі, нібы ў кінастужцы, адна за другой замалёўкі далёкага часу.

...Зіма. Надворак, поле, сад – усё засыпана снегам. Дзед на кані прывёз нас з матуляй на малаедаўскі хутар. Мы сядзім у шырокіх санях, на пахучым сене, пакрытым саматканай квяцістай дзяружкай. Заязджаем на двор. Пад ногі, радасна скуголячы, клубком кідаецца сабачанё. На ганак выходзіць бабуля, пачынаецца гоман. Я дзіўлюся на вялікі камень, што ляжыць каля плоту насупраць калодзежа. Яго адпраталі ад снега, бо бралі зранку ваду. Ён не проста вялікі, а велічэзны, такіх я ніколі яшчэ не страчаў. Перад дзвярыма ў хату – яшчэ адзін, такіх жа неверагодных памераў, але плоскі, падобны на стол. Дзед палажыў яго замест ганку.

...Той валун каля калодзежа, што запаў мне ў вочы на дзедавым пляцы, адзінае, што засталося ад хутара сёння. Ён непрытульна ляжыць пасярод пустога калгаснага поля...

Мне трымціць залезці ў дзедаў патэфон. Адкуль узялося ў хаце гэтае тэхнічнае аўдыяцуда, я не ведаю. Дзед толькі ў святы ці пры гасцях дазваляў яго адкрываць і карыстацца. Але з нагоды нашага прыезду ці, мо, каб пазабавіць мяне, малога, паставіў патэфон на стол, накруціў блішчастаю ручкаю пружыну, акуратна апусціў галоўку з іголкай на чорную бліскучую пласцінку, якая закружылася. Праз хрыпоты і шум палілася песня, прыгожая і незвычайная. Дарослыя пастаялі, паслухалі і пайшлі па справах: маці з бабай гатаваць ежу на кухню, дзед на надворак, зняўшы перад тым галоўку з пласцінкі. Патэфон застаўся на стале. Я не магу стрымацца. Адкрываю, спора кручу ручку і чую, як нешта трэснула ўнутры. Ручка бязвольна апусцілася. Лопнула пружына. Я прыкрываю вечка, стаўлю патэфон назад, а сам хаваюся пад ложак, бо разумею, што зрабіў вялікую шкоду...

...Позняя восень. Гразка і холадна. Забіраюць у салдаты дзядзьку Лёніка, малодшага матчынага брата. Ладзяцца праводзіны ў бабінай хаце. Я з дзецьмі на печы. Зверху, нам добра ўсё відаць. Не спускаем вачэй з шумлівага відовішча. Стаіць гоман, многа людзей, грае гармонік. Моцна накурана. Баба Волька, маці і жанчыны з радні снуюць з талеркамі ды чыгункамі праз дзверы на кухню. Я дзіўлюся, як гэта яны там, за сталамі, нешта гавораць, ківаюць галовамі,



Могілкі ў Наруцавічах. Апошні прытулак малаедаўскай радні



Дзед Антось маладзенькі. З помніка на наруцаўскіх могілках

смяюцца, пыхкаюць дымам, бо пачуць і разабраць хоць слоўца ў гэтым тлуме ніяк нельга, як я ні намагаюся...

...Мы ўжо пераехалі ў вёску, у сваю хату. Раненька да нас прыйшоў дзед Антось. Былі яшчэ мужчыны. Капалі пограб, бо восенню не будзе куды сыпаць бульбу. Маці карміла іх абедам. Дзед нетаропка і моўчкі еў. Падняўся першы, за ім мужчыны, і зноў за лапаты. Да позняга вечара выкідалі з ямы зямлю. Калі ж яны спыняцца, думаў я...

...Я вяртаюся з Баранавічаў ад матчынага стрыечнага брата, дзядзькі Анціка. Яны пасадзілі мяне на аўтобус да Снова. Адтуль іду пяшком да Малаедаў, потым кіруюся на хутар, да дзеда з бабай. Пабуду там трохі, перадыхну і пайду далей, дадому, у Хадатавічы. Мне гадоў восем. Я ўпарты і смелы, як кажа на мяне маці. Дзед ляжыць у пасцелі, хоць і летні дзень на вуліцы. Ён худы і жоўты. Моцна хворы. Прысаджвае мяне на ложак, распытвае, дзе быў. Потым кажа: «Ты, унучак, глядзі, памагай маме...» Гэта была наша апошняя з ім размова і яго апошнія, звернутыя да мяне словы. Усё жыццё я стараюся рабіць так, як наказваў перад смерцю дзед Антось...

...Маці жне картаплянік. Горача. Сонца паліць з усяе моцы. Расчырванелы высокі мужчына на ровары шпарка заязджае к нам на двор. Я пазнаю ў ім бабінага суседа Дэмуха. Гэтыя Дэмухі, ён і жонка, раз ад разу гучна, на ўсю вёску, то сварацца, то б'юцца, то мірацца, бегаючы да бабы. Але зараз Дэмух не такі, як звычайна. Ледзь прыставіў ровар да плоту, закрычаў: «Зіна, бацька памёр! Матка прыслала наказаць...» Маці скамянела з сярпом у руках. У роспачы загаласіла: «Божачкі, што ж гэта нарабілася?!»

...Дзед памёр напрыканцы лета 1962 года. А нарадзіўся ён у 1895-м. Я ўпершыню так блізка бачу нябожчыка. Труна пасярод хаты, вянкі, кветкі, шмат людзей. Сонечны дзень.



Дзед Антось у бальніцы. Апошняе фота. Вясна 1962 г.

Дзеда выносяць на вуліцу. Галосяць бабуля, маці, сястра Маня. А дзед засмучана-засяроджаны, як і пры жыцці, ляжыць у труне. Гуртам за труною рухаемся ў бок Наруцавічаў, да зелянеючага гаю, што застаўся ад пасаджанага некалі графам Чапскім еўрапейскага парку. Перад пабураным графскім палацам – вясковыя могілкі. Пазней там, каля дзеда, пахаваюць і бабу Вольку. Чаму людзі паміраюць, задалося тады мне пытанне, на якое дагэтуль шукаю пэўнага адказу...

Дзед Антось застаўся ў памяці родных неймаверным працаўніком, чалавекам сціплым на словы і акуратным у жыцці, патрабавальным да сябе і да родных.

– Як ужэ трудзяшчы быў, то пашукаць – не найсці такога, – выказвалася ў нашых размовах маці. – А шчодры, шчодры... Ідзе ў гумно малаціць снапэ, то боты абвяжа анучамі, каб ня порціліся. Такі эканомны...

– Лапці плёў, і я насіла яшчэ іх, помню тое... У школу ў лапціках хадзіла... От, каб цяпер так пажылі, як мы некалі...

Дзеду даволі дасталося гора на яго хоць і не вельмі доўгім веку. Маладзенькім забралі ў царскую армію на вайну з немцамі. Гібеў у акопах, хадзіў нават у штыкавую атаку. Дарэчы, было гэта каля суседняй вёскі Жанкавічы. Маладых салдат з мясцовых хлопцаў далёка не пасылалі, фронт стаяў паміж вёсак. Пераадзелі – і ў акопы. Баба Волька памятала, як іх, дзяўчатак, царскія салдаты частавалі цукрам, разбіваючы на кавалкі вялікія і круглыя, сінявата-белыя галоўкі.

Потым памянялася ўлада. Польская акупацыя. Ставілі хату, куплялі зямлю, бераглі кожны злот.

Зноўку вайна. Немцы ганялі на шашу Сноў – Нясвіж масціць каменні. Разагнешся на хвіліну, адразу атрымаеш гумавай палкай па спіне. Не было спакою і начамі. Штораз наведваліся начныя госці – партызаны. Пра некаторых казалі не партызаны, а куфэрнікі, бо для іх найпершая

справа – залезці ў куфар, забраць сала ці палатно. Тым, што на конях, – давай муку, бульбу, авёс. Чуць што – пісталет пад нос ці прыкладам па галаве. Наводзіў страх нейкі Кузняцоў, па сутнасці, бандыт з акружэнцаў, нібыта партызан, мсцівец. Неяк наскочылі ўначы на хутар, паднялі дзеда, скамандавалі: «Кармі коней!», а самі па вёсцы.

– То потым збілі бацьку на горкі яблык, места жывого ні было... Эта ж ім паказаласё, што ён даў прагорклы авёс, бо коні ні даелі, у торбах застаўся. А бацька ж па шчырасці карміў, ні падманваў... Каб ён спрындзіўся, эты Кузняцоў, такая гадасць, бандзіт... Колькі людзей яны тут перабілі адно...

Так пра бацькавы нягоды гаварыла маці.

Прыйшлі савецкія – забралі ў абоз, кінулі пад Баранавічы на прымусовыя работы. Цягаў на кані бярвенні з лесу – ваенныя рабілі там свой аэрадром.

Па вайне – пад прымусам уступай у калгас і аддай нажытую маёмасць. Гэта было цяжэй і за немцаў, і за палякаў, і за партызан. Дзеду, патомнаму селяніну, расстацца з зямлёй, што дасталася крывёю і потам, якую са слязьмі на вачах дзялілі паміж братамі і сёстрамі, ды яшчэ аддаць абібокам карову, каня, вупраж – усё роўна, што расстацца з рукамі і нагамі.

«Па вокны зямлю абрэзалі, недавяркі, – казаў дзед па матчыных успамінах. – Галадуха была адна ў этым калхозе, нічога не давалі, а ўсё забралі».

Але ж сцярпелася і гэта. Праўда, не без наступстваў. Заўчасная дзедава смерць не абышлася без перажытага ператрусу.

Дзед не любіў лішніх размоў, пустой балбатні; тварам заўсёды строгі і сур'ёзны. Хударлявы, акуратна пабрыты, з вусамі. Адмыслова разумеў звычкі птушак і звяроў. Лоўка лавіў на петлі зайцаў, ставіў пасткі на лісаў і тхароў. І браў іх нямала. «Жыд да яго прыязджаў і купляў шкуркі тхарыныя. Добра плаціў за іх, мо пяць злотых».

Гаспадарку вёў да толку, парадак трымаў і ў полі, і ў хляве, і ў свірне. Чарку гарэлкі мог выпіць толькі на Вялікдзень ды Каляды. На гэтыя вялікія святы наведваўся хто з братоў ці родных. Садзіліся за стол, добра елі, трошкі выпівалі. Пасля абыходзілі пасевы, аглядалі жывёліну ў хляве. Зноў прысядалі за стол, выпівалі па маленькай чарачцы, вялі нетаропкую размову.

Уставаў рана. Маці казала – у чатыры ці ў палове пятай раніцы. Браўся адразу за работу. Потым, калі баба напякала што ў печы, гадзін каля васьмі, прыходзіў з надворка на снеданне. Трохі спачываў – і зноў за працу.

Што дзед Антось быў адмысловы гаспадар, я добра разумею зараз. Бо ў маленстве рэчы ўспрымаюцца непасрэдна, без філасофскіх акалічнасцяў. Дзедаў жа хутар, як ён мне ўяўляецца сёння, меў поўны набор эстэтычна-гаспадарчых каларытаў. Хата, хлеў, гумно, сенажаць, поле пад жыта, буракі і бульбу, пад агарод. Наперадзе – прыгожы лужок, сажалка, абсаджаная высокімі вербамі і вязамі. Улетку вечарамі там грымеў нястомны жабін хор, раніцамі гучна плёскаліся карасі ды плоткі. Пасядзець каля сажалкі, паслухаць птушыныя спевы ці наглядзецца зоркамі альбо месячыкам у яе круглым люстэрку, нагуляцца ў хованкі паміж дрэвамі і хмызняком – было незабыўнай дзіцячай асалодай пры жывых дзеду і бабе. Сажалку выкапаў дзед, абсадзіў яе дрэвамі, запусціў рыбу. Як там было прыгожа і хораша! Незнаёмыя з кнігамі і мастацтвам, але светлыя душою, дзеці матухны-зямлі, нашы продкі вельмі тонка адчувалі і цанілі сапраўдную, непадробную зямную прыгажосць.

Ад дзеда Антося і бабы Волькі засталіся чыгунны прысак на вуголлях...

Ад дзеда Антося і бабы Волькі ў нас засталіся чыгунны прысак на вуголлях і саматканае пакрывала, якім на святы засцілалі яны свой ложак. Фарбы і кветкі на пакрывале дагэтуль свецяцца зыркімі колерамі, і я шораз здзіўлена імі любуюся. Якія яны непаўторныя ў сваім абрысе!



Так атрымалася, што вельмі мала давялося мне бачыць дзеда і быць з ім разам. Брату Анатолю, маім стрыечным братам наогул не прыйшлося з ім стрэцца. Але ўсе мы былі са Смаляковых. Так у вёсцы называлі дзеда Антося, хоць прозвішча ён насіў Шарапа. Ды паходзіў па маці сваёй ***з роду Смолкаў з вёскі Панюцічы***, што перад Сновам, на шашы ад Нясвіжа, хоць сам нарадзіўся ў Малаедах. Ды ўсё роўна казалі ***Антось Смалякоў***.



...і саматканае пакрывала, якім на святы засцілалі ложак

І на маці ў Хадатавічах гаварылі – Зіна Смалякова, а ў злосці Смалянка ці Смалянчыха. На мяне казалі за вочы Вася Смалянчын.

На сяле доўга не памірае прыналежнасць да роду, да народы, як любіў выказацца бацька. Гэта найлепшая характарыстыка чалавека. Адкуль, з якога ён роду? А, з гэтых?! То яны людзі гарачыя, сварыцца любяць... З імі цяжка будзе жыць... Вось і адказ на ўсе пытанні.

Дзед Антось меў братоў – ***Міхася***, ***Васіля***, ***Рыгора*** і ***Уладзіка***. Міхась, прыгожы і статны, даслужыўся ў царскай арміі да афіцэрскага чыну. Пасля фронту пайшоў у прымакі ў суседнія Коханавічы. Ды пачаў прыкладвацца да бутэлькі, асабліва пасля рэвалюцыі, калі бальшавікі абрэзалі царскія выплаты, зрабілі лепшых найгоршымі. Дзед ушчуваў яго, але дарэмна. Так і памёр заўчасна з гарэлкі, замёрз недзе каля скірды п'яным.

Яго дачка ***Гэля*** вышла замуж за ***Колю Царука*** ў Даматканавічы і часта ў нядзелю ці пасярод тыдня, наведвалася цераз лес да нас, пагаварыць з маці, сваёй стрыечнай сястрою. Прыгожая і здатная жанчына. Гаворка лілася з яе, як звонкі струменьчык з меднага глячыка. Жылося ёй нялёгка. Мужыка Колю, калгаснага трактарыста, пасадзілі за нейкі тлум у турму; яна з чатырма дзецьмі змагалася за існаванне.



Магіла дзеда Антося і бабы Волькі

Апошні раз я бачыўся з цёткай Гэляй на бацькавым пахаванні. І зараз яшчэ яна калі-нікалі наведваецца да маці пагаманіць пра жыццё. Але ўсё радзей – баляць ногі. Неяк прыязджалі з Мікалаем на кані. Ды і тое мінулася. Не можа сама, то выпраўляе свайго Царука пехатою ў Хадатавічы: «Трэба заслаць Зіне што-небудзь...» Дыбае паціху напрасткі праз лес яе Коля, нясе падарунак, гусака ці свіную дзялянку. Робіць ён гэта з ахвотай, бо ведае, што Зіна пачастуе, усадзіць за стол, пагамоніць з ім. Дый на зваротны шлях дасць бутэлечку якога вінца, то і шлях гэты з вінцом будзе адною асалодай. Я з цеплынёй узгадваю цётку Гэлю – мужную і дасціпную жанчыну, якая вытрымала цяжкія ўдары лёсу, не разгубілася, засталася бадзёрай, прыязнай да людзей.

Рыгоравы сыны ***Юлік***, ***Вася*** і ***Аркадзь*** аселі ў Снове. Быў яшчэ ***Іван***, пагінуў на вайне ў Берліне, за дзень да Перамогі. Гарадскі пасёлак Сноў вядомы паўсюдна як цэнтральная сядзіба славутага раней калгаса імя Калініна, а зараз такога ж слыннага агракамбіната «Сноў». За сноўскімі каўбасамі ды прысмакамі чэргі ў кожнай краме. Там, у Снове, наша радня – людзі вядомыя і працавітыя. Васіль Шарапа быў умелы токар, знатны на ўвесь раён. Не раз аб ім друкаваліся пахвальныя артыкулы з фотакарткамі ў раённай газеце «Чырвоны сцяг». Карысталіся павагай сярод людзей і яго браты. Іх справу доўжаць сыны ды ўнукі.

Уладзік, трэці дзедаў брат, перабраўся ў Нясвіж. Меў дзяцей ад двух жонак. Сыны служылі на моры, там і падаліся ў рыбакі. Забралі з сабою сястру ***Марцэлю***. Па чутках, зараз жывуць у Клайпедзе. З імі сувязі няцесныя.

Жыццё параскідала радню, перамяшала яе паміж людзей. Штодзень несупынна круціцца млын часу, меле і меле секунды, хвілі, гадзіны, дні... Як бы хацелася пагаварыць, стрэцца з бацькам, з дзядамі і бабулямі. Ды тое немагчыма. Бачыцца і гаварыць трэба пры жыцці. А зараз толькі памяць настойліва вяртае мяне да іх, бо жывуць у сэрцы іх токі, іх позвы, іх думкі.




Адмеціны

Адмеціны

Паблукаў я па сцежачках свайго радовішча, паўспамінаў радню, бабуль з дзядулямі – настала чарга зазірнуць у родную хатку, вярнуцца ў ласкавы прытулак да бацькі і маці. Мінаюцца гады за гадамі, усё далей адыходзіць у нябыт той цудоўны кавалачак жыцця з бацькамі, у сваёй хатцы, пры здароўі ды радасці. Наступіць момант, не такі ён далёкі, сыдзем мы, тыя, хто нарадзіўся ў вясковых хатах, і час гэты канчаткова растворыцца ў касмічнай знічы. Растворыцца, знікне, не пакіне і следу… Адно застанецца – напісанае аб ім ды захаванае ў вобразах, зазнятае на фотакартках. Прамільгнуць гады за гадамі, дзесяцігоддзі за дзесяцігоддзямі, то мо і закарціць каму з нашчадкаў зазірнуць у наш час, даведацца што пра нас – як жылі, аб чым думалі, чаго дамагаліся. Нешта знойдзецца ў архівах, на пажоўклых старонках газет, у сямейных альбомах і на флэшках, калі захаваюцца, а каму, мо, патрапяць у рукі і гэтыя нататкі пра тое нашае жыццё.

Мо будуць і тыя з нашага роду, што захочуць ведаць не толькі пра час, якога няма, але і пра сваіх, адышоўшых у нябыт продкаў, што жылі ў шасцідзясятыя ці сямідзясятыя гады XX стагоддзя. Якімі яны былі, што мелі на стале, чым поўніліся іх дні і ночы, што было ў іх сэрцах? Таму і спрабую зараз, хоць у абрысах, расказаць пра гэта.



Дзень. Ад раніцы да вечара

Самай значнай падзеяй у сям'і стала пабудова свайго жытла і пераезд з хутара на вёску. Бацьку выпусцілі з арміі толькі ў 1947 годзе. На яго навалілася гаспадарка. Айчым, Петрык, да спраў гаспадарчых няздольны, слабы здароўем, карпее за швейнай машынкай; маці, баба Наташа, таксама далася сілаю за вайну ды за свае жыццёвыя ператрусы. Гады са два ён мучыўся на прыватніцкіх палосках, цягаў гной, араў, сеяў і разумеў, што гэта тупік. Пасля вайны ў франтавікоў, пабыўшых у Еўропе ды Германіі, розум стаў іншы. Так і бацька, як ён сам прыпамінаў:

– Важу гной на поле. Адзін, помачы няма. А пачну араць – мучаюся з канём; зямля – адна няўдобіца. Няўжо, думаю, так і будзе да старасці? Недзе ж і па-другому людзі жывуць...

Ды «памагла» калектывізацыя, якая пачалася на заходніх землях у канцы саракавых, пачатку пяцідзясятых гадоў. Вядома, у кожнай бядзе ёсць пачатак новага ліха. У калгас, у калектыўную ўласнасць забралі зямлю, каня, вупраж, плугі, бароны... Заробку аніякага. Хочаш жыві, хочаш памірай – начальству ўсё роўна. А тут сям'я, маленькі сынок Вася. Трэба неяк ратавацца, ды дзе шукаць той паратунак? Бацька праз франтавых знаёмых дамогся работы ў друкарні МТС (*машына-трактарная станцыя*). Такія станцыі стваралі ў раёнах для



Друкарня «Чырвонага сцяга». Бацька (злева) і дзяўчаты-наборшчыцы. 1952–1953 гг.

ўтрымання тэхнікі, у асноўным трактароў. Тагачасныя калгасы сваёй тэхнікі не мелі, для дапамогі ім былі прызначаны МТСы. Гэта накшталт сучасных тэхнічных цэнтраў. Але з ідэалагічнай прыпраўкай. Пры станцыях меліся палітычныя аддзелы, правобразы будучых райкамаў ды выканкамаў. Выдавалася газета, орган МТС «Чырвоны сцяг», была друкарня. Вось туды прынялі бацьку друкаром.

Ён уставаў рана і ці роварам, ці пехатою дабіраўся з хадатаўскага хутара напрасткі праз Гусакі, Карцэвічы, Аліхоўку, Альбу да Нясвіжа, кіламетраў дванаццаць-трынаццаць, і столькі ж назад. Зараз пры нашай аўтааздобленасці цяжка нават уявіць такое. Як гэта: кожны дзень палявымі сцежкамі столькі ісці, бегчы ці ехаць на ровары на працу?!

Але выбіраць не прыходзілася – бацька радаваўся, што была работа, быў заробак. Калі замятала дарогі ці наступала восеньская гразюка, ён заставаўся начаваць у Нясвіжы і некалькі дзён не прыязджаў на хутар. Так прайшоў год ці паўтара. Сітуацыя, аднак, заходзіла ў тупік. Маці журылася са мною ў адзіноце на хутары, не вельмі ладзілася са свякроўю, бабай Наташай; бацьку даставала дарога і маркота за пакінутую сям'ю. Выхад адзін – будаваць хату. Інакш сям'я разваліцца. Маці ўжо прасілася ў сваіх бацькоў, каб забралі яе з Хадатавічаў у Малаеды.

Пляц бацька ўзяў амаль што на тым месцы, дзе некалі стаяла хата дзеда Андрэя. За гэта прыйшлося пазмагацца, бо на ўчастак прэтэндавала суседка Домка Базылёва. Мужык пагінуў на вайне, яна засталася з трыма сынамі і хацела, каб ўсе пабудаваліся разам, праз дарогу ад яе хаты. Бацька таксама меў рацыю, бо то было дзедава лецішча, можна сказаць, радавое месца. Ён без усялякага сумневу

атрымаў дазвол і распачаў будоўлю. У адносінах з Домкай засталася нацягнутасць, але пакрысе яна прайшла. Сама Домка не такая злапамятлівая, а вось сын яе сярэдні Росцік, які пасяліўся каля нас, трымаў на бацьку гэтую жабу да апошніх дзён. Жылі мы побач, без аніякіх спрэчак, дзеці ведалі адны другіх, жонка Росцікава Анюта – прыемная жанчына. Аднак сам ён, напіўшыся гарэлкі, мог калі-нікалі што сказаць не вельмі прыемнае пра бацьку за вочы. Пераживалося.

Было там, на новым пляцы, хораша. За соткамі ўнізе, як люстэрка, круглае, парослае купінамі балота. Па вясне там распачыналіся канцэрты «філарманічнага аркестра», гучалі самыя неверагодныя інструменты і дзіўныя гармоніі: квакалі жабы, плёскаліся карасі, на розныя лады пераклікаліся і свісталі крыламі птушкі, кракалі качкі. «Кірпатых жабаў гучны хор будзіў юначае натхненне...» – злажыліся калісь у мяне дзеля забавы такія радкі. Сапраўды, не сядзелася дома, калі расцінаўся над белымі духмянымі яблынямі скрозь разлітую вечаровую цяплынь магутны канцэрт з балота.

Далей за соткамі і балотам – поплаў, а за ім лес. Цуда вялікае: ягады, грыбы, птушкі, непаўторныя адценні колераў і гукаў. Напрадвесні – цэлыя разлогі да апантанасці пахучых, віруючых сэрца і мроі буйных белых падснежнікаў, невялічкія праталіны-азярынкі з хрусталёва-брыльянтавай чысцюткай вадзічкай, лясное балоцейка з лілеямі і лахачамі – Мох...

Бацькам, аднак, не да любавання ваколіцамі. Будавацца – гэта толькі сказаць лёгка, а на самай справе – гора, бяда.



За соткамі ўнізе, як люстэрка, круглае балота. 1966–1967 гг.

Хату зрабілі з дзедавага гумна



Пасляваенная нястача: ні цэменту, ні цэглы, ні лесу, ні транспарту. Як і з чаго будаваць хату? Грошай няма, пазык дзяржаўных таксама. Амаль па Твардоўскаму: пайшоў салдат у шырока поле...

Дамовіліся, што баба Наташа аддасць на будоўлю гумно з хутара. Гумно ставіў яшчэ дзед Васіль, і бацька па праву прэтэндаваў на сваю вотчыну. Гэта адзінае, што дасталося яму ў спадчыну. Усё яго багацце. З гумна і ставілі зруб. Адно на першыя вянкі бацька дамогся свежых бярвенняў. Засталося і на хлеў: бэлькі, кроквы, шулы дый сцены дагэтуль там стаяць дзедавыя. З дошкамі і цвікамі памог матчын брат дзядзька Вечык. Баба Волька прадала парасят на сноўскім базары і купіла чатыры мяшкі цэменту. З горам папалам іх хапіла на падмурак. Бацька, каб сэканоміць, навазіў камянёў з поля. Самы вялікі камень заклаў пад правы ніжэйшы вугал, што вытыркаўся на надворак. І па сённяшні дзень на ім трымаецца хата, хоць пад другімі сценамі падмуроўка патрэскалася.

...Ясны летні дзень на пачатку чэрвеня. У цеплыні залаціцца чатырохкутнік свежарастучага зруба, двор завалены старымі дошкамі, ламаўём, пяском і зямлёю. На сцяне хаты, што ад вуліцы, увіхаецца з сякераю цясляр. Ён з Даматканавічаў, для мяне амаль што з Амерыкі, і мянушка ў яго незвычайная – Дрэндало. І сам ён непадобны да нашых вясковых. Худы, вялікі тварам, з шырокім ротам, рэдкімі пачарнелымі зубамі, гаворыць хрыплым гучным голасам. У перапынках, калі злазіць са сцяны, ці пасля абеда, дастае з кішэні пацёртую

газету, адрывае з яе прамавугольную старонку, складвае раўчуком і засыпае з торбачкі буйнае тытунёвае крышэнне.

Дрэндало – добры майстар і добры чалавек.

– Гарушчы-гарушчы... Пяцёра дзяцей, а бедныя, – казала пра яго маці. – Што ні пастаўлю, то з'есць...

Ні раніцай, ні ў абед, ні перад снеданнем Дрэндало ніколі не пачынаў яду ці работу без шклянкі гарэлкі. Піў гарэлку з асалодай, нетаропка. Я, малы, глядзеў на яго знізу і дзівіўся, што гарэлка так булькае ў роце, і разам з бульканнем туды-сюды, порстка і пругка ходзіць на яго жылістай шыі востры гарляк.

Без гарэлкі, як я зразумеў пазней, тады на сяле не зачыналася ніводная справа. Ды ў крамах яе не куплялі – грошай няма. Гналі сваю, самаробную, жытнёвую, а потым дык усялякую. І дрэнную, як казалі, сахарную, з цукровых бураковў, і ці не смяротную нават з курынага памёту. Маці ж рабіла толькі жытнюю...

У рабоце Дрэндало не меў перапынкаў. Прыкусіўшы самагонку, адразу на зруб, на сцяну – да наступнай яды стукаціць сякерай. Хата расла, бацька толькі паспяваў падвозіць ды падносіць.

...Падышлі мужчыны, разам бяруцца за бэлькі. Яны цяжкія і доўгія. Трэба закінуць іх на вышыню, на сцены. Пакуль Дрэндало мацуе чарговую бэльку на сцяне, мужчыны перакурваюць. Маці прынясла з лесу два мяшкі моху. Штодзень, ухадзіўшыся, яна бяжыць на лясное балота рваць мох, якога патрэбна шмат. Я пералажу праз накіданыя дошкі, нага саслізгвае ўніз на ламаўё, чую, як пранізліва запякло каля пяткі. Ад болю і сполаху закрычаў. Бацька падхоплівае мяне на рукі, маці здымае з ног сандалікі. Там, дзе запякло, кроў.

– Наступіў на цвік, – кажа бацька. – От, дастычны, усюды ўлезе! Бачыш, якую бяду нарабіў!

Ён у роспачы круціць галавою, нібы шукаючы дзе спагады.

– Коля, ты паглядзі, насквозь не прабіў ногу? – пытае Дрэндало. – Калі цвік ня вышаў, то нічога, зажыве. Хай пасцыць на рану, потым заматайце анучаю. Пройдзе. Зажыве, праз дзень скакаць будзя...

З падтрымкай дарослых я раблю тое, што параіў Дрэндало. Мне сорамна, пісяць зусім не хочацца, але напалоханы, я напружваюся, і ўрэшце ўсё атрымліваецца. Цёплая струйка



Басаногае дзяцінства. 1959–1960 гг. Фатаграфаваў і зрабіў здымак Коля Чарнабаеў

абмывае параненую ступню. Дэзынфекцыя адбылася. Маці чыстаю анучаю перавязвае нагу, мяне адпраўляюць з будоўлі на хутар: бацька на ровары адвозіць да бабы Наташы. Нага пабольвае, на сэрцы ядобра, бо там, на новым пляцы, дзе будуецца хата, цікава і весела...

Нарэшце падышла восень. Бацька на канюшні запрог у падводу каня і паехаў на могілкі капаць гліну – там пясчаныя выспы. Так запарадкаваў стары Дзямян, вясковы пячнік. Печ у доме – галава. Ад яе, ад печы, жыццё – цяпло, яда, прытулак. А яшчэ печ – цэнтр дамашняга інтэр'ера. Яе бялілі, аздаблялі малюнкамі, упрыгожвалі перад святамі. Рабілі печы на вёсцы з гліны, бо цэглы нідзе не прадавалі сялянам, толькі на дзяржаўныя аб'екты размяркоўвалі, таму пра збудоўку печы гаварылі «не рабіць», а «біць з гліны». Работка не для слабачкоў. Гліну мяшалі з пяском, бывала з саломай, ставілі апалубку, укладвалі, трамбуючы, рад за радам. Потым сушылі, загладжвалі шчыліны, фарбавалі вапнаю, аздаблялі. Такая печ выходзіла важкай, ёмістай. Цеплыня ад яе трымалася добрых дні са два, а то і тры пасля прапалу.

Але валтузня з печчу няпростая. Работа адно што цяжкая, дык і ў макраце. Дзямян, высокі мужчына з доўгім худым белым тварам, адвіслай ніжняй губой і вялікімі рукамі, падпярэзаны фартухам, чэрпае гліну жменяю з бочкі, далонямі расцірае па сцяне. Абутак, рукавы адзежы і ягоны лапсярдак мокрыя, блішчастыя ад гліны, але ён да таго не прыглядаецца, толькі раз за разам, нібы калодзежны журавель, уніз-уверх, то апускае, то падымае галаву, дастаючы гліну са скрыні...

Ледзьве з вуліцы ахуталі хацінку, так адразу ўхапіліся за хлявушок, страху пакрылі саломаю. На хаце страху

зрабілі з дранкі – такія невялічкія прамавугольныя дошчачкі з асіны. Іх прыбівалі адну над другой маленькімі цвічкамі. Падлогу рабілі з дошак ужо пад прымаразкі. Паслалі адно толькі ў чыстай палавіне – так называлі ў вёсцы сучасную гасцёўню. Там, на покуці, павесілі пакрытыя вышытымі ручнікамі абразы Маці Божай і Госпада нашага Ісуса Хрыста. Паставілі шафу – шкафчык па-сучаснаму – для адзення; яго набытак стаў падзеяй для сям'і, бо шафа лічылася знакам дастатку. Яшчэ былі дзве лавы, драўляны дашчаты ложак, салдацкая табурэтка і два крэслы, якія прыдбаў для нас дзядзька Вечык.

На кухні падлогу збілі з гліны. Так, як і ў іншых хатах на вёсцы. Гліну палажылі роўным слоем, сантыметраў дзесяць, утапталі ды прыгладзілі. Сцены пабялілі вапнаю. Вясковы сталяр Дзюбік зрабіў лаву і ўслон. Сенцы вымасцілі аполкамі, паставілі там дзве ці тры бочкі для сховы зерня і сала з мясам. Баба Волька і дзед Антось далі цялушку. Дзядзька Вечык прывёз пару парасят. Бацька недзе каля Клецка прыдбаў шчэпы, пасадзіў садок. З лесу прынёс дзве дзічкі. Адну прыкапаў на двары перад хлявом, другую – на ўскрайку пляцу, ад балота, на Росцікавай мяжы...

Калі яны з маці ўставалі ранкам, я не ведаў. Толькі засвятлее трохі за лесам – ужо на нагах. Часам чулася скрозь дрымоту: «Глянь, Коля, развідняцца пачало, а мы ні ўсталі



Шафа ў хаце – знак дастатку

яшчэ...» З вясны падхопліваліся ў палове пятай. Зімою на гадзіну пазней, бо дзень карацеў, сонца падымалася не так, як летам.

З раніцы пачыналася віхурная бягунка, чарада сялянскіх клопатаў, бясконцая праца. Падхапіўшыся, маці бегла да печы запаліць дровы, што залажыла яшчэ з вечара. Пакуль паліцца печ, трэба падаіць карову, працадзіць малако ў банку (*бляшаны цыліндр сантыметраў дваццаць у папярэчніку з кранікам і шкляным вакенцам, каб відаць, дзе граніца паміж адстоеным малаком і салодкай смятанкай, вяршкамі*). Калі прагарае дровы, зладзіць і паставіць у печ чыгуны з буракамі, бульбаю для свіней, каровы, цяляці. Такім жа чынам, не марудзячы, хуценька сабраць меньшыя чыгункі для сям'і. Вялося, што на снеданне дык абавязкова бульбяны камяк са шкварачкамі, скібай чорнага хлеба і кубкам кіслага малака (*прастаквашы па-гарадскому*). Часцяком яешня на спражаным сале, яшчэ зацірка, прыпраўленая свежанькім ранішнім малачком. Для заціркі наляпіць з мукі пругкія камячыкі, адварыць у вадзе, даць выстаяцца на гарачым прысаку. На камяк дык «начысціць картоплі», паставіць у печ, пасля зліць кіпень, патаўчы бульбу таўкачыкам, заліць спражанымі шкварачкамі з цыбуляю (яны, дробна парэзаныя, шыпяць на скаварадзе, пакуль варыцца бульба). Вылажыць усё з чыгунка горачкаю на патэльню, прыгладзіць, падраўняць і зноў паставіць на прысак у печ, каб камяк падрумяніўся, прытаміўся. Тады ён смачны.

За гэты час паспелі ў кіпені вялікія чыгуны. Вілкамі выцягнуць з печы, зліць ваду, высыпаць звараную бульбу і буракі ў вёдры. Дабавіць мукі, таксама што з астаткаў учарашняй ежы, секачом усё здрабніць, перасекчы, заліць астыўшым кіпятком і малочным адстоем.

Для малых парасят і цяляці — асобная ежа. Заварыць ільняное семя, прыправіць бульбачкай, толькі пратоўчанай, разбавіць свежанькім, з ранішняй дойкі, малачком. А бывала, што і з соскі кармілі малых, каб выжылі: то малозіва ў каровы няма, то мала яго. Весела ды лёгка, як па маслу, не кацілася ніколі сялянская гаспадарка.

Заглядвае ў хату бацька.

— Нясі, Коля, вёдра свіням. Во гэтыя, а этае вядро карове. Цяляці зварыла семя, зараз дабаўлю малака і картоплю

патаўку. Вернешся – занясеш ім, а то свет перавернуць, на плот лезуць і равуць – позна кормім сёння...

Пакуль маці ўвіхалася каля печы, бацька напаіў карову, выгнаў да чарады. Пачысціў стойла, выкінуў гной ад свіней. Прынёс у хату вады з калодзежа. Касою паабкошваў узмежкі і сабраў травы ў мяшок карове нанач. Падкінуў крапівы свінням у загарадку. Вывеў на ланцужку за соткі, на поплаў перад балотам, цяля. Яшчэ яму трэба занесці ў вёдрах яду свінням, выліць у карыта, пазней – напой цяляці на пашу, набраць вады ў хату і паснедаць.

Я прачынаўся каля сямі гадзін. З кухні несліся духмяныя смачныя пахі, свяціліся ў вокнах залаціста-ружаватыя праменьчыкі ранішняга сонейка. На двор, за хлеў, ва ўборную. Свежачок абдае твар, бадзёрыць дух, праганяе сон. Назад у хату, на кухню, да вядра з калодзежнаю вадой. Чэрпаю яе кубкам, тыркаю туды зубную шчотку, каб намачыць, засоўваю яе ў бялюткі парашок (пасты не прадаваліся, ды іх яшчэ і не было), энергічна праходжуся па зубах злева-направа, зверху-уніз і наадварот. Потым, калі рот ужо чысты, выпаласканы, набраць як мага больш вады за шчокі, так, што яны становяцца, як мячыкі, і выпускаць яе, патроху цэдзячы, у згорнутыя конусам далоні. І на твар яе, на вушы, на шыю, на локці, за плечы...

Вада не патрапляе ў тазік, плешчацца па падлозе. Маці прыглядаецца на мае практыкаванні, кажа бацьку: «От любіць хлопец гэтыя ўмыванні...» Улетку свае ранішнія памыўкі я з асалодай спраўляю перад умывальнікам каля плоту.

Пакуль я мыюся, бацька і маці прыканчваюць сняданак. На сканчэнне сёння макароны. Над сталом гойдаюцца лёгкія аблачынкі ад дастанага з печы, гарачага, як агонь, чыгунка. Маці раскладвае звараныя макароны па місках і залівае яшчэ цёплым свежым малаком, што пакінула з ранішняй дойкі. Праз хвілін пяць, адзеўшыся, да стала прысаджваюся і я. Калі падрос брат Толя, то прысаджваліся ўдвух, а бывала, што і паасобку, як каму патрэбна на ўрокі. На маленькім століку зноўку яда, ужо



Вядро на восілцы і прыпек. Непрытульныя і абшарпаныя без гаспадароў. 2016 г.



Бацька з маленькім козлікам на руках і мы з Галяй. Як добра! 1980 г.

для нас: падрумянены камяк, яешня на сале з цыбуляю, кіслае малако, а для малодшанькага Толі – смятанка ў місачцы, бо ён пераборысты ў ядзе...

Рабіла нам маці часам галушкі з бульбы, заварвала іх свежым малаком. То гэта ўжо быў сапраўдны прысмак! Не адарвацца ад міскі! Але колькі старання тое ёй каштавала?! Зімою вельмі любілі смачную «бабку з картоплі», засмажаную салам з цыбуляй у гарачым прысаку...

Маці ўвіхаецца каля печы, прыглядаючы за намі. Ставіць на гатоўку ў жар новыя чыгункі. Бо ў абед прыедзе з работы бацька, мы вернемся са школы, ахвочыя паесці. Павячэраць таксама ніхто не забудзецца. Так у несупынным руху маці праводзіць зранку каля печы гадзіны са тры не меней, а то і болей, у залежнасці ад таго, які прыплод у хляве.

Нарэшце мы знікаем за дзвярыма. Шыбуем у школу. Бацька раней, яшчэ ў прыцемку, пабег на ферму. Сціхла гамонка ў хаце. Маці ледзьве прыбрала са стала міскі і скавараду, закрыла палатняным ручніком хлеб, талеркі, скрыначкі з сахарам і соллю, сыпанула зерня курам, ашмёткі бульбы і хлеба – качкам ці гусям, як з вуліцы закрычалі кабеты:

– Зіна, выходзь ужэ, пайшлі... Сёння картоплі палоць Льюк сказаў...

– От, няма вам спакою, не пасядзяць, пруцца на работу зрання, – прыгаворвае сама сабе маці, але спора прыхоплівае кошык, завязвае на галаву касынку і далучаецца да жанок на вуліцы.

Кабеты, хто з кошыкамі, хто з граблямі і гачкамі, кучкаю, весела перагаворваючыся, шпацыруюць да канюшні. Там грымяць вёдры, бранчыць у калодзежы ланцуг – дастаюць

ваду, наліваюць у карыта, каб было коням напіцца абедам ці ўвечары. Лаецца на жарабца Косцік Ігнатаў, вясковы конюх. Мужчыны запрагаюць падводы, крычаць на маладых коняў:

– Стой! Давай галаву, давай кажу! От гадасць, ніяк не хоча ў хамут!

– Ну да, а ты сам хіба ў хамут хочаш?! – пытаецца другі голас.

Смех, рогат. Брыгадзір Ільюк, заклапочаны і незадаволены тварам, пакрыквае на мужчын, піша прозвішчы тых, хто прыйшоў на работу, у «цятрадзь», як называюць яго сшытак вяскоўцы; мужчынскія галасы перамешваюцца з жаночымі і паціху сціхаюць. Людзі разыходзяцца, раз'язджаюцца на калгасныя работы. Маці прыстае да групкі жанчын, што ў прыяцельках з ёю. Яны кіруюцца на край бульбянога поля на праполку.

За хвілін пятнаццаць да першай гадзіны жанчыны шпарка пабягуць дадому, каб сустрэць кароў з пашы на абед і загнаць на двор. Бо калі не стрэнеш, пойдуць валачыцца па сваіх ці чужых сотках.

Абедзенны час у доме таксама шпаркі, нібыта на завадскім канвееры. Сустрэць карову, даць ёй напіцца настоянай зранку ў вёдрах каля студні, нехалоднай вады. Падаіць, малако працадзіць, апусціць у калодзеж. Накрыць на стол, дастаць чыгункі з ядою, разлажыць па талерках. Сарваць яшчэ што з агароду да стала, зрабіць поліўку з кіслым малаком і зялёнаю цыбуляй.

Бацька прыехаў на абед з работы і адразу бярэцца за вёдры з ядою свінням, нясе напой для цяляці на лужок за плотам, набірае вады для жывёлы на вечар...

Нарэшце яны садзяцца з маці за стол абедаць. Тут і мы заяўляемся са школы. Бацькі падымаюцца з-за стала, мы займаем іх месцы. Маці ставіць яду для нас, прыбірае каля печы, глядзіць на гадзіннік. Ёсць яшчэ колькі хвілін да выхаду на калгаснае поле. І яна, і бацька прылягаюць на паўгадзіны на канапы, бо на нагах з самага рання.



Наш калодзеж на надворку. Састарэлы і пахілены. Некалі тут брашчаў ланцуг, круціўся калаўротак, бруілася жыццё

Недзе каля трох па вуліцы зноўку выхінаюцца кабеты з кошыкамі ці граблямі. Маці падхопліваецца на іх гаворку, устае і бацька.

— Вася, ты карову выгані ў чатыры, не прапусці глядзі,— кажа мне маці, выходзячы з хаты. Бацька заводзіць матацыкл і кіруецца на мехдвор альбо на поле да камбайна.

Я саджуся за ўрокі, потым выганяю карову, зноў вучуся, пасля іду нарваць крапівы ці іншага зелля свінням, раблю што яшчэ. Непрыкметна наступае вечар. Вяртаюцца з работы жанчыны, прыязджае бацька. Сонца прынікае да небасхілу, сіняватая смуга ўсё шырэй захінае неба. На поплаве рыкаюць каровы, хочуць дадому. Званчэй галасы, чутней лопат матацыклаў і трактароў, скрып драўляных колаў на падводах.

Пакуль прыйдуць каровы, маці бяжыць на соткі альбо ў агарод выпалаць зелле, перабіць гачкаю грады, прыкапаць свежай бульбачкі, нарваць лапушыстых зялёных лістоў на бураках у чыгуны для скаціны на заўтрашні дзень. Бацька ўвіхаецца з касою на ўзмежках, а яшчэ паедзе на бабін хутар у Малаеды на канюшыну, а можа, на выдзелены калгасам кавалак сенакосу.



«Кветка» і маці. Еднасць і паразуменне. Здымак напачатку 1980-х

Гучна рыкаючы, пад покрыкі пастухоў вяртаецца статак. Наша карова ведае свой двор, сама заходзіць з вуліцы і адразу да студні, дзе вада ў вёдрах. Маці хваліць яе за гэта: «От малайчына, Кветка, сама прыйшла дадому... Ну йдзі, з'еш яшчэ батвы трохі, во я нарвала...» Карова ідзе да батвы, нетаропка жуе, потым па матчынаму загаду кіруецца ў хлеў, у стойню. Маці з вядром і намочанаю чыстаю хусцінкаю бяжыць за ёю, абцірае вымя, цыцкі, прысаджваецца на ўслончык, пачынае даіць.

Я за гэты час дастаю з калодзежа банку з адстоеным

абедзенным малаком і сцэджваю яго, трохі сіняватае, да жоўценькага вяршка, смятанкі, у шкельцы. Маці ўправілася з даеннем, ставіць вядро на лаўку перад ганкам, працэджвае свежае малако скрозь марлю ў другі посуд, налівае нам з братам па конаўцы. Малако цёплае, зверху буяе пенаю, патыхае лугавымі травамі. Брат аднекваецца: «Не хачу, надаела эта малако», а я выпіваю поўны кубак да дна. «Маладзец, сынок, – хваліць мяне маці і кажа бацьку: – Глянь, Коля, як абнадзіўся наш малы смятанаю... Малако адкідвае, ні п`е...» Бацька прыпыняецца каля нас: «Пастарайся, Толік, яно ж такое смачнае, выпі...»

Ужо ў прыцемках маці рыхтуе чыгуны на раніцу, ставіць невялікую яду на стол, корміць нас, бацьку. Вячэралі звычайна тым, што заставалася ад снедання ці абеду: бульбяным камяком з кубкам кіслага ці салодкага малака, акрайцам чорнага хлеба, талеркаю халоднага варыва.

– Коля, як паясі, то зачыні весніцы на вуліцу, курэй паглядзі, ці зайшлі ў падпаветку? Сыпані ім з мяшку. Адрынку зачыняй тожа. Сцямнела, спаць пара...

Такімі яны былі, тыя дні. У несупыннай кругаверці разам з бацькамі круціліся мы, дзеці. Вучыліся працы, догляду за жывёлай, шчыраванню на сотках. Любаваліся маленькімі парасятамі, дзівіліся на жаўтлявых куранят, назіралі за кошкай, што беражліва носіць за шкірку кацянятак...

А ці забыцца пра погляд каровы, калі народзіцца ў яе цялятка?! Бацька клікаў мяне ў стайню: «Пайшлі, пакажу малое...» Згледзеўшы нас, карова трохі насцярожваецца, але пачуўшы ласкавы бацькаў голас, супакойваецца, аблізвае цяля і глядзіць на нас вялікімі, мне здаецца, трохі вінаватымі, вачыма. Нібы гаворыць, бачыце, што зрабілася, цялятка, во, але ж выбачайце, пашкадуйце яго...

Так мы вучыліся дабрыні, пранікнёнасці, чалавечай чуллівасці. І заўжды мне было шкада, што мае дзеці не паспыталі гэтага, не пабачылі гэтых вачэй...

...З раніцы да вечара, амаль штодня, з невялікай розніцай паміж зімою і летам, вясной і восенню цякла рака нашага сялянскага побыту. Зімою рэзалі на сячкарні салому, а летам яе прывозілі з поля, зацягвалі на палаці; зімою штодзень даставалі з пограба картоплю і буракі, а вясною іх садзілі на сотках; летам гатавалі на зіму торф на балоце, касілі сена, жалі жыта, сушылі траву, абраблялі майданы калгасных дзялак, сеялі азімыя;

восенню капалі буракі і картоплі, заворвалі палі... А прысесці, перадыхнуць маглі толькі зімовым вечарам, прытуліўшыся да цёплай печкі ў хаце, ды і то не без работы, а з калаўротамі, прасніцамі, верацёнамі. Так і тое лічылася за дабрыню: у цяпле, за гаворкаю, без тузаніны і спешкі – чаго яшчэ патрэбна сялянскім працаўніцам, каб спачыць ад бясконцых пасяўных ды ўборачных?!

Былі святы – Вялікдзень і Каляды, Сёмуха і Тры каралі, вяселлі, народзіны, пахаванні, смуткі і радасці. Было нялёгкае, але бясхітраснае, жывое, несупыннае, як дзень і ноч, жыццё на сваёй зямлі. Аб ім і прадоўжым размову.



Мы былі беднымі, але такімі былі ўсе людзі

Мяшок мукі пад Вялікдзень

Баюся ў сваім споведу пра гісторыю сям'і і наш вясковы побыт не збіцца на мілагучнасці ды сантыменты. З часам юнацкія і дзіцячыя гады туманяцца флёрам салодкага смутку, акропліваюцца нябачнай слязінкай. Асабліва тыя часы, калі маладымі і моцнымі былі бацькі, ладзілася ў хаце, мажнела гаспадарка і так утульна ды цёпла спачувалася малому хлопчыку пасярод родных сцен. Усё тое зараз здаецца такім чыстым, цёплым і такім недасягальным...

Ды прачытваю раз за разам напісанае і не бачу, што я наўмысна адхіснуўся ад праўды. Не абмінаць жа рэаліі часу! А яны былі ў савецкім мінулым розныя і не толькі памазаныя чорнаю фарбай. На вачах пайшло лепшаць жыццё з прыходам да кіраўніцтва дзяржавай, СССР, у сярэдзіне 60-х гадоў Л.І. Брэжнева і А.М. Касыгіна. Гэты перыяд азначыўся прыкметнымі станоўчымі зменамі: дабрабытам людзей, спакоем у жыцці, нейкім задорам у працы. Бацькі ўсё часцей нядобрым словам паміналі свае маладыя гады на ўласніцкай гаспадарцы пры паляках. Маці казала:

– Каб вы ведалі, як было цяжка! Нічога ні купіць! Ні зарабіць таго злотага! Ад цямна да цямна пралі, сеялі, аралі, ткалі. Свету не бачылі за работаю. Душыліся на этай рабоце людзі.



«Дзе б вы былі, каб не савецкая ўласць...» Злева направа: Вася Гадун, стрыечны брат, Анатоль, родны брат, бацька. Пачатак 90-х.

Аніякіх дактароў, паміралі маладымі зусім. Па восем, па дзесяць чалавек на падлозе ў хатах спалі...

– Кажуць пры паляках лепей было! Вой-вой, ня верце нікому, хай яны спрындзяцца тыя палякі, як пры іх добра было... Пры цары, як матка казала, было лепей, а пры паляках нічога добрага ніхто ні бачыў! Нас там за людзей ні счыталі... Яны сябе ганарове трымалі, а з нас адныя кпіны ды смехі рабілі...

– Толькі свет угледзелі, як этыя калхозы ўтварылі. Разумны нехто прыдумаў іх... А хіба ж вы дзе вучыліся раней? Які інсцітут хто знаў тады? Вой-вой, няма пра што нават гаварыць... Не грашыце, дзеці, Богу!

Гэту тэму ахвотна падтрымліваў і бацька.

– Дажа асаднікі (*палякі-вайскоўцы, якіх польскі ўрад пасылаў на жыхарства ў пагранічныя раёны Заходняй Беларусі – Нясвіж, Маладзечна, Глыбокае – дзеля правядзення сваёй дзяржаўнай палітыкі*) не маглі сваіх дзяцей вывучыць. Бо навука дарагая дажа для іх была, а пра нас, сялян-беларусаў, і гаварыць няма чаго. Мо адзін на ўсю акругу, і то з самых багатых, дзе ў Варшаве вучыўся...

– Чарнабайчык, ужэ багацейшы тут сярод нас, свайго Колю вучыў, то бяз кашулі застаўся... Ды мо ці скончыў ён хоць дзесяць класаў пры паляках... Эта саветы дзяцей пачалі вучыць...

Засталася ў маёй памяці і размова з бацькамі ў гарбачоўскую «перастройку». Я ўжо быў сталым хлопцам, толькі скончыў у Маскве Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, абараніў дысертацыю па сацыялогіі, стаў кандыдатам навук. Пачаў нешта тлумачыць бацьку пра неабходнасць пераменаў у краіне. Ён слухаў, не перабіваў і потым спакойна выказаўся:

– Ніякага толку з этага Гарбачова ня будзе. Пусты ён чалавек. Ты паслухай, што ён гаворыць. Эта ж пустата адна! Меле й меле кожны дзень адно і тое. Нічога добрага ён не зробіць...

– І што б яны ні казалі на савецкую ўласць, а толькі благадара ёй вы, хлопцы, вывучыліся, паканчалі інсцітуты, а мы, сяляне, свет угледзелі...

Па-свойму тлумачыла палітычныя змены маці:

– Ты думаяш, Вася, што тут нешта перамяніцца, што гэты Сушчэвіч з гэтым Зельцыным (*так на сяле выгаворвалі прозвішчы Шушкевіча і Ельцына*), ці той Пазняк нешто зробяць лепей. Адна трасца, нічога лепей ні будзе, адно горш стане, як яны эту собствяннасць увядуць. Нагледзеліся мы на эту собствяннасць, хай яна праваліцца. Свету белаго ні бачылі за этай зямлёю – адно рабі й рабі, як чорны вол...

Так бацькі па-свойму разумелі палітычную сітуацыю напачатку ліхіх 90-х. Разумелі, зыходзячы з перажытага, з таго, што ведалі, што спачулі, як кажуць, спіною і мазалямі. Гэтым, дарэчы, якраз і адрозніваюцца думкі простых людзей ад навуковай мудрагелістасці. І думкам гэтым не адкажаш у праве на сваю праўду.

Мне добра помняцца тыя нашы размовы, бо яны, як здаецца, найлепшым чынам адлюстроўваюць эвалюцыю поглядаў вясковых людзей на палітыку і сваё жыццё. Тут, мабыць, варта трохі падрабязней пагаварыць пра адносіны вясковых людзей з уладай.

Першыя сталыя ўражанні бацькоў адносяцца да трыццатых-саракавых гадоў. Гэта перыяды польскага ўладання і нямецкай акупацыі ў Заходняй Беларусі. Пры паляках сяляне «усходніх крэсаў» займалі ніжэйшую прыступку грамадскай іерархіі: не мелі палітычных правоў, не галасавалі, рэдкія маглі даць дзецям больш чым чатырохгадовую адукацыю. Адчуваліся і наўмысна-пагардлівыя адносіны да тутэйшых людзей з боку польскіх уладаў, шляхты, касцёла. Несправядліва дзялілася зямля. Лепшыя надзелы належалі асаднікам, якія, па сутнасці, з'яўляліся польскімі каланістамі, валодалі вялікімі абшарамі. Увогуле, палякі складалі каля 90 працэнтаў буйных землеўладальнікаў Заходняй Беларусі.



Няўрымслівы шасцікласнік. 1965 г.

– Дзеці-то асаднікавы з нашымі ня дружылі,– працягвала польскую тэму маці.– Калі ў школу хадзілі ў Малаедах, то асаднікавыя адзеты былі далікатно, у палітках, чаравічках, ні то, што мы, з палатнянымі торбамі ды ў лапцях...

– А паненкі польскія адзяваліся, то ні зраўняць...! Мы, малымі, бегалі ў Наруцавічы ў парк паглядзець, як яны шпацыруюць там па дарожках з парасончыкамі ад сонца ды яшчэ з сабачкамі маленькімі... Нас блізка ні пускалі, ганялі адтуль, здалёк на тое адно мы пазіралі...

Бацька вучыўся ў польскай школе ў Даматканавічах. Хадзіў туды зусім яшчэ малым пасля хадатаўскай трохгодкі праз лес, кіламетраў сем ці болей, у завірухі і маразы, у дождж і ў буру. З тых гадоў прыпамінаў характэрны выпадак, якому быў сведкай. Польскі шляхціч, служывы чалавек, павучаў селяніна з Хадатавічаў, які да яго не так далікатна звярнуўся: «Ты ешчь хто?! Ты ешчь хам! Разумеш! Хам! Тваё мешча в стайні! Разумеш?..» Бацька нават казаў прозвішча таго нашага земляка, ды я забыўся.

Ды толькі, каб гэткімі папрокамі абышліся ўспаміны аб польскіх парадках. За вершык ці кніжку на роднай беларускай мове маглі забраць у пастарунак і збіць, як казалі, «на горкі яблык», у чорных сіняках выйдзеш... Не выкрасліць з гісторыі і факты безпадстаўнай жорсткасці з боку польскіх вайскоўцаў да безабаронных беларусаў.

Як бы хто з гісторыязнаўцаў не выкладаў свой погляд на гэты перыяд жыцця заходніх беларусаў, усё ж адзіным вытокам існасці з'яўляюцца ўражанні тых, хто жыў тады і спазнаў на сабе той лад. Бацька і маці сталелі ў тых варунках, бачылі, слухалі сваіх і чужых людзей. Праз усе нашы размовы, успаміны аб жыцці за польскім часам я пэўніўся, што яно не было салодкім ні для бацькоў, ні для дзядоў, ні для каго з тутэйшых.

Вельмі прыкра, што такая цывілізаваная і гістарычна-блізкая беларусам нацыя пакінула гэткі сумны след на беларускім полі. Крыўда на польскія ўлады за сваё гаротнае становішча штурхала беларускіх сялян і да бальшавіцкіх агітатараў, і ў камуністычныя ячэйкі, і да непрадбачлівых трагічных учынкаў. Прыпамінаў бацька пра хлопцаў з Якшычаў, клецкая вёска за Ардою, ён нават ведаў некаторых, што рашыліся перайсці граніцу, каб пазбавіцца польскага прыгнёту і патрапіць у «савецкае шчасце». Там іх адразу арыштавалі і праз

месяц расстралялі як польскіх шпіёнаў. Так пагінулі многія маладыя летуценнікі, што паверылі бальшавіцкай хлусні аб заможным і шчаслівым жыцці на Усходзе, за польскай пагранічнай паласой.

Калі дома заходзіла гаворка пра цяжкае жыццё пры паляках, то я прыводзіў бацькам адзін аргумент:

– Хай так – жылося нялёгка і цяжка. Але ж вас не раскулачвалі за лішняга каня ці авечку, не арыштоўвалі за тое, што маеце некалькі гектараў зямлі, не высылалі ў Сібір ці на Магадан малых і старых за адзін толькі «няправільны» погляд...



З дзецьмі Мішы Анцінага. Мішка (злева) і маленькі Коля (будучы доктар-афтальмолаг) на крэсле. 1958–1959 гг.

– Польская «дэфэнзіва» (*палітычная паліцыя*) садзіла падпольшчыкаў у турмы, арыштоўвала камуністаў, бунтаўшчыкоў, але ўжо такіх, якія сапраўды ваявалі з уладай... Але ж ніколі нікога не арыштавалі за тое, што ён мае жняярку з меднымі ўтулкамі ці лішняга каня альбо карову...

Бацькі сцішаліся. Пасля невялікай паўзы першаю ўступала маці.

– То не, так ня было, – прызнавалася яна. – У нашых, у маткі, заўсюды сала было круглы год і хлеб, і масло, і смятана. І авечак рэзалі. Кажухі выраблял бацька, умеў. З ядою ні галадалі, адзежы ня было, эта праўда...

– Цётка прысылала адзежу нам з Расіі, з Западнай Дзвіны, а мы ёй сало слалі. А прыехала к нам першы раз, як ужэ саветы прыйшлі, то вечарам пазанавешвала ўсе вокна пакрываламі і коўдрамі і пра Сталіна калі гаварыла, то не ў голас, а шаптала. Эта ж так яны былі перапуджаныя этым вар'ятам... І тут ня было дабра, а там яшчэ мо больш...

Бацька не адразу ўступаў у размову. Ён меў франтавыя ўражанні ад «сталінскіх сокалаў» са СМЕРШа (*контрвыведка НКУС на фронце*), а пасля вайны, калі дывізію перакінулі з Германіі ў чыстае поле пад Уладзімірам, досыць наглядзеўся на расейскае бязладдзе, галечу і варожасць да заходніх беларусаў.

– Да... Было страху... Што гаварыць, «чорны воран» (*гэтак нашыя людзі, сяляне, называлі чорныя энкавэдэшныя палутаркі-аўтазакі, што начамі знянацку забіралі ў турмы і высылкі гаспадарлівых сялян і мясцовую інтэлігенцыю пасля вядомага «вызваленчага» паходу ў Заходнюю Беларусь*) хапаў людзей па сёлах. І нашых з Бухаўшчыны, хоць і далёкая радня, а раскулачылі ўсіх падчыстую, дажа старых выслалі. Асаднікаў адразу Сталін саслаў... Во недавярак быў!

Маці дабаўляла:

– Іх зімою ссылалі, ужэ як бальшавікі прыйшлі. Дзяцей асаднікавых вельмі шкада. Маленькіх з хаты на мароз, на сані і павязлі недзе ў Сібір... За што ж маленькіх?! Што ўжэ яны кепскае зрабілі, тыя асаднікі, каб так ссылаць... Вар'ят некі ўбіўся ва ўласць, мучыў людзей...

Прыход бальшавікоў і вызваленне з-пад польскага ўладання нашы людзі спачатку прынялі з вялікай надзеяй. Думалі, атрымаюць зямлю, адменяць падаткі, стануць гаспадарамі на сваёй ніве. Бо столькі ўжо наслухаліся ад агітатараў пра заможнае жыццё на Усходзе. Ды і абрыдла пры паляках быць другасортнымі людзьмі. Але ж сумеліся ад новай улады з першых уражанняў. Худыя, замуленыя да крыві коні, вяроўкі замест скураных пастромкаў, галодныя, у палатняных абмотках замест ботаў салдаты, бязлітасныя расправы з палоннымі палякамі і багацейшымі людзьмі. Зямлі сяляне так і не пабачылі, падаткамі аблажылі яшчэ большымі – за кожную курыцу, за кожнае дрэўца ў садзе... А яшчэ «трупянелі», як самі казалі, начамі са страху, бо, не прывядзі Божа, спыніцца каля плоту энкавэдзісцкі хапун, «чорны воран»...

Калгас у Хадатавічах і суседніх сёлах пачалі засноўваць пасля вайны. Перад вайною не паспелі. Ды, можа, вайна лягчэй перажылася, чым гэты пераход да «заможнай калгаснай нівы».

– Усё забралі, анічога не давалі за работу, жыві, як хочаш. От як было, ні то, што зараз... – такімі словамі прыпаміналі пачатак калгаснай эпохі бацька і маці.

Гэта быў, бадай, самы цяжкі перыяд для нашых вясковых людзей. Захаваліся і ў маёй малечай памяці некаторыя адбіткі таго «калгаснага ззяння», пра якое маюцца радкі вядомага паэта: «Жыццё ў красках і букетах толькі Сталін змог нам даць...» Так іх цытаваў, на маё здзіўленне, калі-нікалі бацька, хоць і быў ён далёкі ад усялякай паэзіі. Відаць, недзе пачутыя, яны і яго, чалавека ад сахі і касы, здзівілі сваёй «абсалютнай

праўдай»! Тут свая непаўторная экзотыка і эвалюцыя! Таксама барацьба за выжыванне... А што рабіць?!

...Мне мо чатыры ці пяць гадоў. Мы з маці ў Малаедах, у бабы Волькі. Зімовы дзень. Нехта стукаецца ў хату. Заходзіць чалавек, якога я дагэтуль не бачыў. Перакрыўлены рот, касматае шчацінне, вялікія вывернутыя губы. Не гаворыць, а мыкае, як цяля, зразумець, чаго ён хоча, амаль немагчыма. Рубашка расшпілена, рукі парэпаныя, пад шчарбатымі кіпцюрамі чорная гразь. Праз дзіркі ў падраных гумавых ботах тырчаць голыя пальцы. Ён нешта стараецца вымавіць бабе. Маці шэпча мне, што просіць яды. Гэта Некрасівы, яны жывуць у сяле, у яго дзеці, жонка – адна галота...

Некрасівы... Пра яго гаварылі, што ў трыццаць дзявятым, калі рабавалі дамы асаднікаў і стайні ў пакінутым наруцаўскім памесці графа Чапскага, ён нагою спіхнуў з бочачкі з мёдам старую гаспадыню, бо яна хацела прыхаваць мёд ад наляцеўшых рабаўнікоў перад высылкай у сталінскі лагер...

...Позняя восень, пякучы няўтульны ранішні прымаразак. Мы, дзеці, коўзаемся каля цётчынага плоту па першых прымёрзшых лужынах. Але лядок слабы, трашчыць, пад ім хліпкая халодная гразь. Старая Якаўка, свякруха цёткі Ядзі, выходзіць з вядром да калодзежа. Яна босая, ідзе па самай гразі, па ледзяных шкельцах, нават не глядзіць пад ногі. Я ўздрыгваю, бо пранізліва ўяўляю, як ёй зараз холадна і балюча ў запэцканых па костачкі голых ступнях. Але яна не скардзіцца, толькі



Хата і надворак. Робяць калодзеж. Прыблізна 1962–1963 г.

раз-пораз дастае з гразі то адну, то другую нагу і стаіць, як качка, грэючы іх па чарзе...

...Нашы суседзі цераз вуліцу – цётка Люба і Аляксандр Базылёвы. Прыгнечаныя і збяднелыя, але прыстойныя і бяскрыўдныя людзі. Маці паслала мяне занесці ім хлеба. На двары пранізлівы холад, макрата і гразюка. Мо сярэдзіна лістапада. Шэрыя саламяныя стрэхі счарнелі ад дажджоў, усюды гразка, няма куды ступіць, каб не запэцкацца. Гаспадар вярнуўся з аўчарні, дзе ён вартаўніком. Мокры, у даўжэзным плашчы, нябрыты, з пракуранымі зубамі і жоўтымі ад самасаду пальцамі пачарнелых рук. Ён худы і ўвесь нейкі запаволены, нетаропкі. У хаце цемень. Каля печы стаяць вёдры з варывам для свіней. Падлога на кухні ў ямках, бо з гліны. Пад акном збіты з дошак стол, на ім алюміневы кубак, больш нічога. «Бяры, Аляксандр, картоплю ў печы, паеш...» – кажа яму цётка Люба. Ён дастае чыгунок, паволі абірае бульбу ад лупін, соліць і есць адну, без нічога, бо ні хлеба, ні алею, ні мяса, ні сала няма...

Першы калгас на вёсцы, дакладней, сельгасарцель, так у дакументах, утварылі на сходзе 4 жніўня 1950 года. Назвалі імя Заслонава. Старшынёй абралі Драгаўца Мікалая Якаўлевіча. Здаецца, гэта быў дваюрадны брат дзеда Андрэя. Такія нашы здагадкі з братам, спытацца няма ў каго. Рэвізійную камісію, як сведчаць архівы, узначаліў Каўшэль Міхаіл Васільевіч (Міша Анцін). На той час у вёсцы меліся 83 уласніцкія гаспадаркі, якім належала 324,9 гектара зямлі. Пражывала 355 жыхароў. Да ліпеня 1954 года вёска ўваходзіла у склад Быхаўшчынскага сельскага савета, а перад тым, пры паляках, у Ланьскую гміну Нясвіжскага павета Навагрудскага ваяводства. 28 сакавіка 1953 года адбыўся агульны сход членаў сельскагаспадарчых арцеляў «Вперед к коммунизму» (в. Казлы), імя Шверніка (в. Гусакі), імя К. Заслонава (в.Хадатавічы), «Политотделец» (вёскі Малаеды і Коханавічы). Было прынята рашэнне аб'яднаць арцелі ў адзін калгас імя Шверніка. З Хадатавіч у калгас уступілі спачатку толькі 114 чалавек. Такія звесткі пра калгасны пачатак сабраў у архівах наш зямляк Анатолій Паўлавіч Яраш з Казлоў.

Старшынёй прыслалі чалавека з раёна з нехарактэрным для нашых мясцін прозвішчам Галіеўскі. Казалі, што ён з Ленінграда, «з дваццаціпяцітысячнікаў». Гэта сталінскі набор рабочых-камуністаў для ўздыму сялянства. Чалавек, па ўспамінах, быў арыгінальны. Як толькі што – выхапіць



Чаго толькі не было на гэтых палях...

пісталет і крычыць на брыгадзіра: «Прыстралю, сволач, еслі сено не свезеш...»

Потым, здаецца, назначылі таксама чужынца па прозвішчу Лапуцька. Ён лётаў па вёсках на высокім рыжым жарабцы з фарсістым скураным трафейным сядлом. Я ледзь памятаю яго вобраз. Але людзі казалі, што чалавек шыбутны, незлабівы, мог прыслухацца да чужога гора і не прапускаў чарку гарэліцы на дурніцу.

Ніхто з сялян не ведаў, чаму так назвалі іх «калхоз» (*да сённяшняга дня ў сяле «калгас» называюць чамусьці «калхозам» — гэты русізм уеўся ў кроў і цела вясковых людзей. Мо па той прычыне, што калгасы прыйшлі з Расіі*) і хто такі Швернік. Потым, калі Шверніка ў Маскве скінулі, калгас стаў звацца «Дружба» (1961 г.). Пасля ўзбуйнення, калі «Дружбу» далучылі да Аношак, і дагэтуль — «Новае жыццё» (1976 г.).

Старшынёй «Дружбы» быў Станіслаў Вікенцьевіч Санько. Даволі разумны чалавек, добра ўзяўся за справу, падняў калгас. Але потым не заладзілася і пасля ўзбуйнення кіраўніком прызначылі Міхаіла Васільевіча Саляніка. У мінулым настаўнік, ён аказаўся клапатлівым гаспадаром. Адбудаваў вёску Аношкі, перарабіў фермы, правёў газ. Людзі зажылі вальней і заможней. Са слязьмі на вачах успаміналі мінулыя дні.

Пры Сталіне, ды і апасля яго, на калгасныя работы гналі, як на катаргу. Плацілі толькі па восені, пад Новы год. За дзесяткі месяцаў рабскай працы людзі атрымлівалі па пяць капеек на трудадзень. Гэта значыць, за поўны працоўны дзень, зранку

да вечара, толькі пяць капеек! Урэшце выходзіла мо рублёў дваццаць-трыццаць грошай і мяшкоў са два жыта. Ды яшчэ ці выходзіла... А трэба жыць, адзець і накарміць дзяцей, здабыць хлеб, вырасціць жывёліну!

Памятаю, як аднойчы на Дзяды маці наліла мне і бацьку ў міскі халоднай вады, накрышыла цыбулі, дабавіла солі, размяшала, адрэзала па тонкай лусце хлеба і сказала: «Сёння нічога больш няма, пасёрбайце хоць гэту яду...» Не ведаю чаму, але мне здалося такім смачным тое матчына гатаванне, што дагэтуль, калі прыпамінаю, глынаю слінку і адчуваю яго прысмак. Мо з голаду так здалося...

Мы былі беднымі. Але такімі былі ўсе людзі. Таму ніхто не жаліўся, бо бачылі, што суседу яшчэ цяжэй.

– Нічога ня было. Як мы жылі, нат ня ведаю,– часта казала маці.– Але як пераехалі ў сваю хату, от радаваліся... Ды мо другім яшчэ горш, чым нам, даводзілася...

З усяго «багацця» яна мела святочную сукенку і туфлі, што прыслаў з Германіі, з вайны, дзядзька Вечык, брат. У бацькі таксама нямецкі, перашыты кіцель мяккага сукна, гальштук нямецкі з тонкага шоўку. То ўжо не такія і бедныя на той час...

Ды галоўнае багацце сям'і – суладдзе мужа і жонкі, узаемная павага, дабрыня ў хаце. За бацькавай спіной было пакойна і маці, і нам, дзецям. Не ва ўсіх маіх равеснікаў пасля вайны мелася такое шчасце – жывы, поўны сілы бацька-франтавік, вяселы і працавіты, смелы і рашучы. Ён увесь час некуды спяшаўся: то на лён, то ў лес за дровамі, то на балота, то на соткі, то на канюшню. Па знаёмству з інжынерам раённай МТС (машынна-трактарнай станцыі) Валерыкам, так называлі таго чалавека, уладкаваўся механікам на ільнотрапальны агрэгат. Гэта была значная падзея ў сям'і. Механік агрэгата – то іншы статус, спецыяліст, не проста селянін за плугам. Па-другое, бацька станавіўся штатным работнікам машынна-трактарнай станцыі, а гэта якая-ніякая, але ж цвёрдая і штомесячная зарплата. Такога шчасця селяніну-калгасніку не снілася.

Помняцца першыя бацькавы дні на ільнотрапалцы. Эмтээсаўскі трактарчык чалябінскага завода на жалезных колах, гулка пыхкаючы, прыцягнуў на шырокі двор перад Сяргейкавым пляцам, што на ўзгорку, насупраць пераробленай з панскага зруба вясковай школкі, бачкавітыя, як жбаны на калёсах, прыспасобы з рамянямі, круцёлкамі, столікамі. Дзіва дзіўнае для вёскі. Каля гэтага «дзіва», ладзячы яго,

суткамі тупаюць запэцканыя, у прамасленым адзенні мужчыны. Мы, малышня, неадступна круцімся вакол, чакаючы жаданага пачатку.

Дні са два бацька наладжваў тэхніку, маці хвалявалася. Сам ён таксама перажываў, каб усё атрымалася, каб не страціць гэтую работу. Нарэшце залапатаў «чалябінец», выпускаючы хмары чорнага смярдзючага дыму, паплылі шырокія рамяні, закруціліся шківы і ўтулкі. Бацька закрычаў жанчынам на падачы: «Давайце!»– махнуў рукою. Яны шпарка пачалі раскладваць тонкім радком ільняныя снопікі і падаваць на транспарцёр. Машына несупынна заглынвала гэтую ільняную сцежку, фыркала ад натугі, з трэскам выпускала на людзей хмары пылу, перамешанага з перабітаю ільняною саломкай, кастрыцай па-вясковаму. Праз дзесяць хвілін людзей не пазнаць. І бацька, і жанчыны, што падаюць лён на транспарцёр, і тыя, што прымаюць чыстыя, сіняватага колеру палойкі,– усе нібыта замазаны шэрым тэатральным грымам. Толькі блішчаць вочы ды чырванеюць губы: пыл з-пад ільну, драбнюткі і ўедлівы, замураваў суцэльным шчыльным слоем адзежу, твары, рукі, вушы...

Бацька штодня прыходзіў дадому чорны, доўга адмываўся. Раніцай не мог разляпіць счырванелыя вочы. Ды ён ніколі пасля фронту не падаў духам. Заўжды бадзёры і «ў руху«, як казала



На сцяжынцы ад лесу скмеціў я бацьку з мяшком мукі пад Вялікдзень

маці. Праца ладзілася. Прыспела першая зарплата – палучка па-сельскаму. У хаце сабраліся адзначыць дагэтуль небывалую падзею. Палучка, жывыя грошы... Ажно патрэскваюць у бацькавых руках новенькія каляровыя паперкі. Ён з натхнёным выразам на твары працягнуў іх жонцы: «Бяры, Зіна, хавай...» Якраз завітаў інжынер з МТС (*машына-трактарная станцыя*) Валерык. Зазірнулі жанчыны з ільну. Маці зварыла бульбу, аднекуль узялася камса (*кілька па-сучаснаму*), паставілі на ўслончык бутэльку самагонкі. Задаволеныя выпівалі, гаманілі, спявалі песні. Валерык добра падпіў, ледзь паехаў дадому на ровары.

А дні мо праз два ці тры я скмеціў, што бацька нечакана ідзе з лесу па сцежцы ад Маланчынай хаты і нешта нясе на плячах. Я стрэў яго каля плоту, ён папытаў, дзе маці, і, калі зайшлі ў хату, то, неяк загадкава пазіраючы на нас, зняў з плячэй цяжкую торбу.

– Во, мукі ў Даматканавічах у магазіне купіў, першы сорт. На аладкі будзе, – сказаў між іншым і паглядзеў на маці.

– Мука?! Першы сорт, пытлёваная! Глянь, якая ж беленькая! Ды так тоненька змолата, – зайшлася яна ў радасці і здзіўленні. Адкрыла мяшок і пачала пальцамі пераціраць муку, нібыта правяраючы, ці праўда гэта, ці сапраўды муку купіў бацька. Пра такую, пытляваную, яна адно што чуткі слухала, а так дык мо і не бачыла ніколі такой вось – бялюткай, тонка перамолатай пшанічнай мукі! Няўжо пірагі спяком на Вялікдзень, няўжо пакаштуем не счарнелыя са ржаной, а светленькія ды тоненькія з пытляванай пшанічнай мукі аладачкі?!

Не забыцца мне да скону дзён пра гэты мяшок мукі, што нёс бацька на плячах з няблізкага месца, мо кіламетраў з пяць, з даматканаўскага магазіна. Бо не было радасці большай і дабрыні ў сям'і, як тады, напрадвесні, перад Вялікдзенем, калі надарыўся першы заробак у сваёй хаце.



Два медалі – дзве палавіны жыцця

«Механізацыя». Альбо фанарык з Масквы

З хадатаўскай ільнотрапалкі пачаўся, лічы што пажыццёвы, бацькаў звязак з калгаснай тэхнікай, ці, як казалі вясковыя людзі, з «механізацыяй».

– Дзе ты зараз, Коля, робіш?

– Як і рабіў – у механізацыі. То на ферме з апаратамі, то на камбайне...

Але тое было пасля, а спачатку гадоў пяць запар бацька кіраваў ільнотрапалкай ці, па-тутэйшаму, «цёр лён». Хаця сам ён нічога не цёр: цёрлі лён машыны, іх абслугоўвалі нястомныя вясковыя працаўніцы, а бацька адказваў і за машыны, і за жанчын. Праца небяспечная, цяжкая. Толькі не даглядзі – наматаецца палойка на вал ці шкіў, у імгненне задыміць, успыхне імклівым бягуткім агнём. Барані Божа, бо лён і агонь – смяротная сумесь, нездарма з ільну робяць порах.

Другая бяда, што стаяла зусім побач, гэта шківы, шэсцярні, транспарцёры і адкрытыя прывадныя рамяні ад матораў. Спецадзення не было. Адзін неахайны ці непрадбачлівы рух мог стаць смяротным і апошнім у жыцці. Цапане транспарцёр за адзежу, пацягне чалавека ў валы, шасцярні, паломіць косці і рукі; падвернешся пад рамяні – пашкамутаюць цела, пакуль хто дабяжыць, каб спыніць гэтую пузатую равучую пачвару.

Усялякі дзень бацька прыходзіў «са льну» сам не свой. То ледзь пажар не надарыўся, то жанчыну якую з-пад рамяня ледзьве ўхапілі. Ужо на такія дробязі, як пранізлівы пыл, што стаяў з раніцы да вечара, на бесперапынны грукат і стукат ільнотрапалак, на атрутлівы смярдзючы дым з-пад трактара, так і не глядзелі. Адхіналася гэта недзе назад, бо першае і галоўнае месца ў думках займала разуменне, што ёсць работа, ёсць цвёрды штомесячны заробак. Убарані адно, Божа, ад агню ды шыбеніцы пад рамянямі...

Гады праз два ільнотрапальныя машыны перавезлі з вёскі на цэнтральную сядзібу, у збіты з гліны новы хлевушок. У новым «доме» стала цішэй і лепей. Машыны круціліся ад электраматора, грукатлівы і курны «чалябінец» адправілі на іншыя патрэбы. Я часцяком бегаў з вёскі туды, на цэнтральную сядзібу, да бацькі, у прасторны і вялікі, як дзедава гумно, так мне здавалася, будынак. Альбо заходзіў «на трапалку», вяртаючыся з хлопцамі-сябрукамі са школы. Нам карцела пакоўзацца з ільняных скірдаў, кульнуцца ў ласкавыя кудзелі, нагуляцца ў хованкі між узгоркаў з кастрыцы ці зложаных для адпраўкі на ільнозавод светла-шэрых, нібы дзявочыя косы, перацёртых палоек.

Некалі тут гудзела ільнотрапалка, а мы куляліся са скірдаў з кастрыцы. 2016 г.

Ільнотрапальны агрэгат адносіўся да раённай МТС і абслугоўваў вызначаную яму начальствам тэрыторыю. Праз некаторы час эмтээсы ліквідавалі, тэхніку перадалі калгасам і саўгасам; прыйшлося і бацьку ўсталёўваць стасункі з калгасным начальствам. А пакуль тое надарылася,





ТЕЛЕГРАММА

УВАЖАЕМЫЙ

Николай Васильевич Друговец!

Минское областное управление сельского хозяйства поздравляет Вас, одного из лучших механизаторов МТС области с праздником 40-й годовщины Великой Октябрьской социалистической революции.

Желаем Вам здоровья и дальнейших успехов в работе.

Уверены, что в 1958 году Вы будете также в передовых рядах лучших механизаторов области.

Минское областное управление сельского хозяйства.

6 ноября 1957 года.

Министерство связи СССР

Урадавая тэлеграма-віншаванне лепшаму механізатару Мінскай вобласці М.В. Драгаўцу

ён з натхненнем, самаддана рабіў сваю справу. Ён і не мог іначай па натуры, па характару. Але ж не адкінуць і другое. Па сэрцу прыйшлося, што рупнасць яго бачаць і людзі, і начальнікі. Не абмінаюць добрым словам ды адзнакамі. За шчырую працу і высокія вынікі бацьку хвалілі, прылюдна ўзнагароджвалі граматамі абласнога выканкама і сельгасупраўлення, давалі прэміі. Спрыяла гэта яго настрою, лашчыла розум, бо калі яшчэ ў беларускага селяніна было такое, каб улада дзякавала яму за здатную працу, а не гнобіла да зямлі, не прыніжала ды не абірала да ніткі?!

У 1957 годзе выйшаў сапраўдны «зорны час»: бацьку прызналі пераможцам Усесаюзнага спаборніцтва і ўдастоілі звання «Удзельнік Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР». Была пры савецкай уладзе такая адзнака для працавітых людзей. Хто яе ўдастойваўся, то атрымліваў запрашэнне ў Маскву на Усесаюзную выставу. Пад такое запрашэнне рабілася спецыяльная праграма з падарункамі, экскурсіямі, сустрэчамі.

Маці ажно знямела ад такога бацькавага гонару. Збірала яго ў Маскву ды перажывала, як там яму будзе ў далёкім і чужым горадзе, да якога доўга ехаць па чыгунцы. Разам з маці неспакойна было за бацьку і мне. Ды толькі сам ён бадзёрыўся, падміргваў мне, пасмейваўся:

– Як-небудзь спраўлюся... Язык да Кіева давядзе, вучыў на фронце палітрук. Я ж праз Маскву дадому з арміі ехаў. Праўда, адно вакзал і бачыў...

Стаялі пахмурныя восеньскія дні на пачатку лістапада. Дождж перамяжаўся са снегам, туманам, з першымі замаразкамі. Бацька з вечара начысціў боты, маці дастала свежую бялізну, нядаўна пашытыя порткі-галіфэ і новую пацяжку. Зрання ўвесь дом быў на нагах; бацька ўвабраўся ва ўсё новае і пайшоў да канторы на машыну, на якой яго спецыяльна павезлі на чыгуначную станцыю ў Гарадзею на маскоўскі цягнік.



1957 год – бацьку ўдастоілі звання «Удзельнік Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР»


СВИДЕТЕЛЬСТВО

Тов. Друговец Николай Васильевич-машинист ТЛ-40 и КЛ-25 Несвижской МТС, Несвижского района, Минской области, Белорусской ССР

ЯВЛЯЕТСЯ УЧАСТНИКОМ ВСЕСОЮЗНОЙ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ ВЫСТАВКИ 1957 года и НАГРАЖДЕН МЕДАЛЬЮ УЧАСТНИКА ВСХВ

Главный комитет ВСХВ

Москва Октябрь 1957 г.

Г № 158509

Главный Комитет Всесоюзной Сельскохозяйственной Выставки СССР

З Масквы з залатым медалём ВДНХ

Мы нібыта асірацелі без яго ў хаце ды замерлі ў трывожным чаканні. Не ведаю нават, як дацярпеліся яго звароту з Масквы. Бо аніякай звестачкі: ці даехаў, ці сустрэлі, ці жывы хоць? Ужо не да ўзнагароды, хоць бы вярнуўся. Ды праз тыдзень дачакаліся. Бацька прыехаў узрушаны, задаволены, з падарункамі: цукеркамі, маскоўскімі баранкамі, а яшчэ прывёз мне ліхтарык кітайскага вырабу пад круглыя батарэйкі.

Майму гонару перад вясковай дзетварой не было граніц. Такога ліхтарыка ніхто не бачыў на вёсцы. Кожны дзень я з нецярпеннем чакаў ночы. На радасць яны ў лістападзе прыходзілі рана і былі вельмі цёмнымі. Як толькі чарнела прастора, я хапаў ліхтарык і з чарадою дзяцей мы гойсалі па вуліцы да немачы. Я дэманстраваў сябрукам святло слупам, у кропку, пад ногі. Асабліва цікава свяціць у неба, калі ідзе снег, ці нечаканым святлом палохаць кошак і сабак. Жартавалі і з людзьмі: свяцілі ў патушаныя вокны, у дзверы, калі іх адкрывалі, выходзячы поначы на двор. Я быў героем, бо меў ліхтарык, і яшчэ таму, што мой бацька пабываў ажно ў Маскве. Ні ў кога з дзяцей не было такога ганаровага бацькі.

Яно так мелася на самай справе. Бацька прыехаў з Масквы з залатым медалём ВДНХ. Добрая чутка аб ім неслася па акрузе. Яго запрашалі ў розныя месцы павучыць іншых, расказаць пра тэхнічныя ўдасканаленні, што прыдумаў на сваім агрэгаце. А ён быў спраўны да тэхнікі, як любіла пахваліцца маці,

кемлівы. Яшчэ за нейкі час да Масквы бацька ўдасканаліў на сваім агрэгаце заводскую прыспасобу для перахопу палоек на выхадзе з ільнотрапалкі. Палойкі захрасалі часта на выхадных барабанах, закручваліся ў клубок, ад трэння задымляліся і ўсхопліваліся агнём. Пажар штодня вісеў у паветры. Бацька разабраўся ў канструкцыі, перарабіў барабаны на свой розум — палойкі перасталі захрасаць. З гэтым удасканаленнем выйшла цікавая «маскоўская штучка». Ён часцяком распавядаў пра яе за сталом. Помнілася яна яму да канца дзён.

...На момант хачу адступіцца ад свайго аповеду. Сёння 16 чэрвеня 2009 года, аўторак. Цэлы дзень несупынна льецца дождж. Смуткуе неба. Разам з небам і я ў смутку, у роздуме. Сёння роўна тры гады, як памёр бацька. Я, бывае, падумаю, нешта даўно не бачыліся мы з ім, не гаварылі. Даўно ён не пытаўся ў мяне: «Ну што там у вас, у Мінску, чуваць?» Здрыгануся, адкрыю вочы, пагляджу навокал і вяртаюся ў рэчаіснасць. Бацька сышоў назаўсёды...

Каб можна было вярнуць хоць дзянёчак, хоць хвіліначку з тых нашых сустрэч, хоць на імгненне ўбачыць яго ласкавыя вочы, расказаць яму пра дзяцей, пра свае думкі і справы. Як бы іначай я даражыў тымі часінамі сёння...

Мо і пішу гэтыя радкі, бо вінавачуся, шкадую аб тым, чаго не вернеш. Мо паспакайнее душа, мо асмягне прысак у сэрцы, калі выкажуся, павінюся. Мо дзеці прачытаюць ды лепей зразумеюць свае гады, абачлівей будуць жыць...

Дык вось адносна «маскоўскай штучкі». Падчас размовы на ВДНХ са сваімі калегамі-«ільнотрапальшчыкамі» з іншых мясцін Савецкага Саюза, калі яны ўсе скардзіліся прысутным начальнікам сельскай гаспадаркі на канструктыўныя недаробкі агрэгатаў, бацька падняўся і расказаў, як яму ўдалося выправіць заторы палоек. Выступ адзначылі, выпісалі там жа на выставе прэмію. На другі дзень яго знайшоў маскоўскі інжынер, сказаў, што чуў пра яго ўдасканаленне і хоча больш падрабязна з гэтым удасканаленнем азнаёміцца. Бацька шчыра, гадзіны са дзве, расказваў, як і што ён перарабіў у заводскай канструкцыі. Масквіч падрабязна запісваў, замалёўваў нешта ў блакнот па бацькавым расказе.

Прайшоў час. Мо праз паўгода машыніст ільнотрапалкі з Якшычаў, недалёкая ад нас вёска, сустрэў бацьку:

— Заедзь, Коля, паглядзі. Палучылі новую машыну, дык ужэ па-другому зрабілі выпускны транспарцёр...

– Паехаў я – і праўда, на самам дзеле па-другому, – расказваў пасля бацька. – Але ж точна, як мая, што я таму маскоўскаму інжынеру паказаў. Ну, падумаў, маладзец, хваткі хлопец. Бачыш, адразу на завод пусціў ізабраценіе...

Бацька не здагадваўся, што хітраман-масквіч выдаў яго канструкцыю за сваю распрацоўку, атрымаў патэнтнае пасведчанне і вельмі добрыя грошы. Аб удалым удасканаленні нават пісалі ў сельгасчасопісе, здаецца, «Лён і канапля», выходзіў такі. Калі я даказваў, што яго «абвёў вакол пальца» гэты прайдоха-вынаходнік, бацька нават не гневаўся, а даволі спакойна зазначаў:

– Можа быць, але ж у праізводство запусціў... Нічога, хваткі хлопец...

– Так вы, папа, маглі палучыць шмат грошай за прапанову. Гэта ж вынаходніцтва...

– Не, якія ж грошы... Я на выстаўцы пабыў, то й добра...

Пазней я зразумеў, што ў бацькі думкі не магло быць, каб селянін, забіты чалавек з вёскі, атрымаў вялікія грошы, ды яшчэ ў самой Маскве за нейкую дробязь. Пераварыў ці пераставіў пару жалязяк на ільнотрапальным агрэгаце – і за гэта грошы?! Такіх пераробак кожны дзень ён і яго паплечнікі, сялянскія механізатары-самавучкі, дзясяткамі робяць...

Сапраўды, вясковыя «тэхнічныя людзі» былі кемлівымі ў сваёй справе. Усе яны выйшлі з аратых, ад спрадвечнай «сахі і касы» і з вялікай ахвотай узяліся за тэхніку – трактары, камбайны, станкі, сеялкі, веялкі, матацыклы, машыны. Да чаго ж заўзятыя да працы людзі! То забуяла ды расцвіла на новым улонні спажытая вякамі сялянская самаахвярнасць ды здатнасць. Першыя калгасныя механізатары, трактарысты, камбайнеры, токары, слесары трохі вучыліся, месяц-другі, на механізатарскіх курсах пры МТС у Нясвіжы, а то і ўвогуле былі самавучкамі. Пасля ў Клецку адкрылася сельскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча. Там сталі вучыць па году-два сельскіх хлопцаў на розныя тэхнічныя спецыяльнасці. Але тое было пазней. Пазней і тэхніка лепшала, удасканальвалася, станавілася больш прыхільнай да чалавека. Першынцы ж айчыннай індустрыялізацыі, асабліва трактары, камбайны, плугі, былі грувасткімі, цяжкімі, можна сказаць, нечалавечымі для працы на іх. Асабліва напачатку, у пяцідзясятых-шасцідзясятых гадах, калі толькі пачыналася



Тыя першынцы «Беларусы» зараз на пастаментах. Мінскі раён, вёска Крупіца, 2016 г.

вялікая механізацыя на сяле. Ды адолелі, упраглі іх у работу тыя першыя хлопцы-трактарысты, што падлеткамі вучыліся хадзіць з плугам за канём і трымаць у руках ляйчыну, а потым з радасцю ўзяліся за рычагі і калёсы.

...Перад вачыма Росцік Домчын, наш сусед. Калгас даверыў яму адзін з першых калёсных «Беларусоў», якія пачаў выпускаць Мінскі трактарны завод. Гэта ўжо была больш дасканалая тэхніка, безумоўна, лепшая ў параўнанні з грымучым і траскучым, на стальных калёсах «чалябінцам». Росцік самавіта паглядаў на вясковых людзей з высокага трактарнага сядзення, а мы, малыя, круціліся каля яго «Беларуса», калі ён прыязджаў на абед ці на начны спачынак.

Трактар без кабіны, таму і ў дождж, і ў снег, і ў вецер трактарыст цярпеў, мокнуў і мёрз да костачак. Росцік пад восень і ўзімку меў сіплы прастуджаны голас. Адзяваўся пухната: галава і шыя заматаны доўгім шарсцяным шалікам, шапка-вушанка завязана назад, за вушы, ватоўка блішчыць на сонцы, бо праелася наскрозь маслам, салідолам, саляркай. Яе ніхто ніколі не мыў і не чысціў, тканіна ўкарэла, стала падобнай на першы лядок у сцюжу.

Запусціць рухавік тагачаснага трактара, асабліва зімой, цэлая бяда. Спачатку трактарыст распальваў бензінавую паяльную лямпу, грэў картэр, каб растапіць застыўшае ў маторы масла, бо інакш не правернуцца поршні і каленвал; потым уключаў пускач. Пускач – гэта спецыяльны бензінавы міні-рухавічок для таго, каб завесці асноўны рухавік. Ён жудасна лапатаў. На ўсю ваколіцу разлятаўся рэзкі, пранізлівы, страляючы гук, нібыта які вар'ят ухапіў гармату і пачаў бесперапынна лупіць снарадамі; з трубы ў неба шугаў трапяткі чорны дым.

Мы гуртам, не адрываючы вачэй ад гэткага дзіва, назіралі за працэсам. Калі пускач пачынаў трашчаць драбней, без усхліпаў і задыхаў, Росцік, упёршыся, рэзкім штуршком рукі пераводзіў справа налева чорны рычаг. Адразу завіваўся новы, больш ціхі, падобны на гудзенне чмяля гук. Пачынаў круціцца асноўны рухавік. Пускач глушылі і давалі «пад хвост» рухавіку, газуючы «да кнопкі», каб ён «добра прасмаркаўся». Так гаварылі бывалыя трактарысты.



На гэтым калгасным мехдвары «закалялася сталь»...

Я не ўпамянуў яшчэ аб тым, што вечарам пасля работы з трактара трэба зліць ваду, бо ў мароз яна замерзне і парве рухавік. Гэта зараз у маторы заліваюць незамярзаючыя вадкасці, накшталт антыфрызу. Тады пра такія вынаходкі нічога не ведалі. Толькі армейскія хлопцы, якім давялося паслужыць у танкавых войсках, расказвалі, што там вада не замярзае ў маторах. Ды тое было падобна на казку, бо ў калгасе трактарысты і шафёры кожную зімовую раніцу распальвалі касцяркі і грэлі ваду ў вёдрах. Добра, калі дазвалялі паставіць трактар ці машыну дома, на надворку. Тады грэлі чыгуны з вадою ў печы і абыходзіліся без вогнішча. Мучыліся так кожны зімовы дзень. А зімы былі такія, што нос з хаты не высунеш, бо мароз трашчыць; дзверы не адчыніш на вуліцу — снегам занясло пад самую страху. Зіма сурова выпрабоўвала людзей.

Цяжэй за іншых даводзілася тым, хто працаваў на гусенічных трактарах. Рухавікі там былі здаравенныя, разагрэць і «даць яму жыццё» ў марозную раніцу — ой колькі трэба папацець! Затое на «гусянічніках» была кабіна, хоць і на дзірках, шчылінах, але ж кіроўца быў закрыты ад непагадзі ды сцюжы.

Кіраваць тымі «першынцамі» таксама няпроста. Каб павярнуць рулявое кола на «Беларусу», трэба добра напяцца, бо ніякай гідраўлікі не існавала. Гусенічныя ўпраўляліся рычагамі, як танкі, таксама трэба паўпірацца. Малым я падсаджваўся да нашага хадатаўскага, знакамітага ў наступныя гады трактарыста Васі Твароўскага, ардэнаносца, а тады яшчэ маладзенькага юнака, якога пасадзілі на «гусянічнік», і дзівіўся таму, як ён абедзвюма рукамі, з усяе сілы цягне на сябе то адну, то другую палку рычагоў, каб павярнуць трактар направа ці налева.

Машыны, трактары, камбайны часта ламаліся, рамантавалі іх на мехдвары, у халодных дзіравых боксах. Ніякага асфальту, непралазная гразь; абедалі лустай чорнага хлеба з кавалкам сала ды цыбулінай тут жа, ля трактара, разлажыўшы на гусеніцы загорнутую ў газету небагатую ссабойку.



Першыя камбайнеры. Бацька з будучым сватам Анатолем Максімавічам Гадуном (злева). Здымак пачатку 1960-х.

У мяне перад вачыма, як сказаў бы мой сябра, выдатны мастак Віктар Альшэўскі, стопрацэнтнае «ўражанне раўнавагі». Чорнымі, нібы абгарэлы смаляк, рукамі, трохі выцертымі аб такую ж прамасленую анучу, трактарыст Коля Сяргейкаў, седзячы на гусеніцы, бярэ з газеты кавалак белага, як рэпа, сала, густа абсыпанага шэрымі крупінкамі буйной солі, кладзе яго на чорны хлеб... Тут не да ветрыку з бярозкамі, тут іншы пейзаж: спраўнае палатно суровай і адначасова ў нечым радаснай барацьбы за жыццё. І ніхто не ківаў на крызісы, не скардзіўся, не зацінаўся ў суме ці роспачы. Бо ведалі — будзе лепей, к гэтаму ўсё ідзе.

У прамасленых ватоўках, кажухах, у кірзавых ботах і валёнках, з абветранымі чырвонымі тварамі, патрэсканымі рукамі, але бадзёрымі і не самотнымі засталіся ў маёй малечай памяці нашы хадатаўскія механізатары. Хачу назваць іх паімённа, па вясковых, неафіцыйных прозвішчах: блізкі бацькаў прыяцель, заўзяты майстар да любой справы ***Толя Максімаў***, а таксама ***Васіль Грышкаў, Аляксандр Грыб, Коля і Анцік Чарнабаевы, Коля Яўгеневў, Росцік Домчын, Іван Ёганаў, Віцік Ёзічкаў, Васіль Міхасеў, Толік Костусеў, Мішка Семачкаў, Пашка Уладкаў, Толік Багданаў, Васька Ёзічкаў, Васька Костусеў, Колік Ладымяраў, Вася Твароўскі, Коля Сяргейкаў...***

Са светлым сэрцам я прыпамінаю кожнага і дагэтуль дзіўлюся іх заўзятасці ў рабоце, вытрымцы, чалавечай сціпласці. Толькі золак займаецца, а ўжо затрашчаў на бураках на сваім «уладзімірцы» (*невялічкі калёсны трактарок з расійскага горада Уладзіміра*) Колік Ладымяраў (Гадун). Будзе ён трашчаць на ім да позняй ночы, пакуль месячык не ўзыйдзе і зоркі не загарацца. І так штодня, зімой і летам.

А якім здатным майстрам на ўсе рукі быў Толя Максімаў! Яны з бацькам асвайвалі першыя савецкія камбайны. Толя — камбайнерам, бацька — памочнікам. Гэта не тое, што зараз у кабіне з кандыцыянерам ды камп'ютарам, а тады — толькі казырок з парусіны над галавою ад сонца, ды рукі, абабітыя да крыві, бо то заб'ецца саломай матавіла, то парвуцца рамяні з ланцугамі.



Пасведчанне Драгаўцу М. В. аб прысваенні звання «Ударник коммунистического труда». Падпісаў старшыня калгаса С. В. Санько

...Бачу, як зараз, скамянелага ад холаду на плузе за трактарам у познюю восень Пашку Уладкавага. Былі ў той час на вялікіх плугах жалезныя сядзенні і рулявыя колы, каб апускаць і падымаць лемяхі падчас ворыва. Тых, хто гэта рабіў, называлі прыцэпшчыкамі. Гэта як памочнік трактарыста, але трактарыст у кабіне, а прыцэпшчык на плузе пад дажджом, снегам, пранізлівым ветрам трасецца на жалезным брусе ды круціць цяжкае жалезнае кола. Пашка, сам па сабе мажны і крэпкі хлопец, нібыта застыў, скукожыўся ад холаду, твар яго чырвона-сіні...

Ці яшчэ прыпамінак той пары. Ваколіцу ахоплівае цёмная сырая лістападаўская ноч. На полі за балотам то сцішаецца, то мацнее бясконцы трактарны рокат. Я ведаю, там Вася, сын Зіны Твароўскай, арэ іржышча. Цьмяна пабліскваe ў цемры адзінокая фара, трактар нетаропка, нібыта стары натруджаны конь, звыклы за жыццё да ўсялякіх няўдобіц, адмервае свае палосы. Я засынаю пад гэты далекі мурлыкасты рокат і прачынаюся таксама з ім. Цэлую ноч за жалезнымі рычагамі, без перапынкаў і перакусаў Вася араў ніву...

Дзіўлюся зараз, прыпамінаючы тыя калгасныя дні: работа была катаржная, рабілі ад цямна да цямна — не тое, што цяпер. Начамі аралі, валіліся ад спякоты і стомы на калгасных дзялках жанчыны, але ж не было смутку і журботы. Наадварот, было ўсеагульнае пачуццё прыўзнятасці і бадзёрасці. Людзі радаваліся самым простым рэчам: таму, што зранку бягуць на работу, што пасля работы паспелі падаіць карову і напаіць дзяцей малаком, што купілі бохан ці два хлеба, што атрымалі некалькі рублёў заробку... Хай сабе стомленыя, але з настроем, з добрым гумарам. У нядзелю збяруцца каля матацыкла на нашым двары, то бруяцца жарты, рогат, смешныя споведы.

Жыццё кіпела, поўнілася аптымізмам. Бо хоць і катаржная, хоць і бязлітасная была праца ў калгасе, але ж яна давала

магчымасць выжыць, зарабіць грошы, хай не такія вялікія, ды ўсё ж за іх можна адзець і пракарміць дзяцей, прыдбаць і зладзіць гаспадарку, патроху ўстаць на ногі, выпраміцца. Гэта, безумоўна, натхняла людзей.

Аглядаючыся на той час, бачу яшчэ адзін, мо самы першы, самы значны выток людскога аптымізму. Улада змагла даць людзям адчуванне надзейнасці, веру ў будучыню, упэўненасць у незваротным лепшанні іх долі. Калгасы атрымлівалі новую тэхніку, сялянам дазволілі трымаць асабісты падворак.

Помніцца, толькі падсохлі пасля веснавой паводкі дарогі, як на вёску завітала рухавая брыгада хлопцаў і маладых дзяўчат на трактарах і аўтамашынах. За колькі дзён яны спора паставілі чорныя прасмаленыя слупы; дзяўчаты прабеглі па хатах, развялі праводку, падвесілі лямпачкі. Ад цэнтральнай сядзібы калгаса да вёскі шпарка працягнулі правады, веерам раскінулі іх па фацыятах. Наступіў незабыўны вечар – зырка засвяціліся пасля цьмяных газнічак вясковыя вокны. «Во, эта так свет, фасолю можна сабраць на зямлі ўпоначы...» – узрушана гаварылі людзі. Якая то была радасць у хатах ад гэтага святла!

Амаль адначасова з электрычнасцю ў вёску пачаў ездзіць, як казалі «хадзіць», аўтобус з Нясвіжа: спачатку два разы на дзень, а потым і тры. Праз колькі гадоў адкрылі нават маршрут «Мінск – Хадатавічы», і моладзь з навакольных вёсак была задаволена, што не трэба тлуміцца ў чэргах у Нясвіжы, каб здабыць білет на сталічны рэйс, звычайна заўжды перапоўнены.

Цэнтр калгаса стаў будоўляй. Замест драўлянай школы ў Казлах выросла двухпавярховая, са сталовай і спартыўным залам, стадыёнам, сваім садам і вопытнай дзялянкай зямлі, з майстэрняй. Цагляная сучасная школа! У ёй мы спазналі лепшыя хвілінкі. Бацькі нашыя гэта бачылі. Таму і настрой іх поўніўся светлымі згадкамі, спадзяванкамі на добрую долю дзяцей, на спакойную будучыню.

Цэнтр калгаса стаў будоўляй. Новая школа



Жыццё імкліва мянялася. Можна сказаць, на вачах. Хоць бы такі яшчэ прыкметны момант. Калі бацька і маці

жаніліся, то паехалі распісвацца ў Казлоўскі сельскі савет на роварах. Так было ганаровей, чым ісці пехам. Бо ровар мелі толькі заможныя сем'і, некалькі на сяло, на сотню двароў. Пры Л.І. Брэжневе ровар стаў звычайным ці не на кожным надворку. Нават на работу (а калі такое было?!) беглі не пехатою, а хто на ровары, на матацыкле, у хуткім часе і на ўласнай машыне. Спяшаліся, ой як спяшаліся на гэты, стаўшы іх лёсам, калгасны мехдвор, на ферму ці ў поле.

Не абысці і такую вельмі істотную, на мой погляд, асаблівасць. Тыя пасляваенныя гады і пазнейшыя, недзе да канца 70-х, былі намнога больш справядлівымі і чыстымі ў сваім маральна-духоўным строі. Мясцовае начальства на кожным кроку адчувала патрабавальны, а часам і суровы партыйны позірк, спаўна аддавалася рабоце. Падман, крадзёж, хлусня строга караліся, мелі гучнае грамадскае абурэнне.

Падтрымліваліся ўзаемавыручка і ўзаемадапамога паміж людзьмі. Моладзь выхоўвалася на пачуццях прыязнасці да роднага краю, да сваёй Айчыны. Школьнікамі мы назубок ведалі ўсе дванаццаць прынцыпаў Маральнага кодэксу будаўніка камунізму, якія, па сутнасці, паўтаралі рэлігійныя хрысціянскія запаветы. Калі ты піянер ці камсамолец, то павінен строга кіравацца імі ў жыццёвых абставінах. У нас было трапяткое і высакароднае каханне, мы бралі за прыклад у жыцці высокія вобразы літаратуры і лепшых людзей сваёй эпохі. Іншым, узнёсла-здаровым, быў сам дух часу. У ім адметна чуўся водар патрыятызму, жаданне зрабіць нешта карыснае для сваёй краіны. Тая, мякка кажучы, неэтычнасць і неэстэтычнасць, што поўняць сёння тэлебачанне, кіно, радыё і газеты, былі проста немагчымымі і недапушчальнымі.

Аб тым, добра гэта было ці кепска, хай спрачаюцца іншыя. Я толькі апісваю тое, што бачыў, чуў і добра спазнаў. Тым больш, што не маю намеру маляваць ідыліі. Кожны час мае свае хібы. Я не стараюся абысці іх бокам ці не прыкмеціць поглядам. Ды не магу адступіць ад высновы: у тыя пасляваенныя, асабліва 60-70-я, гады дзяржава сапраўды хацела лепшай долі людзям, змагалася за гарманічнага чалавека, патрыёта і калектывіста. У паветры струменіў водар здаровых надзей і добрых спадзяванняў на заможную будучыню. Трэба сказаць, што далёка не апошняй была ў гэтым роля кіраўнікоў Савецкай Беларусі Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнкі, Кірыла Трафімавіча Мазурава, Пятра Міронавіча Машэрава,



Ул. Н. Дражын

Ціхана Якаўлевіча Кісялёва. Гэта былі разумныя і самаадданыя людзі. Край наш за невялікі прамежак часу непараўнальна змяніўся, ад сахі і лапцяў апынуўся ў шэрагу прамыслова і культурна развітых рэспублік. Пашчасціла нам, беларусам, на кіраўнікоў. Ды, думаецца, не выказалі мы ім за тое яшчэ пэўнай павагі і падзякі.

Не лішнім будзе ўспомніць і кіраўнікоў Нясвіжскага раёна, бо ва ўсе гады раён перадавы ў вобласці і рэспубліцы. На маёй памяці гучала прозвішча Кіма Фёдаравіча Сінічкіна. Потым Анатоля Мікалаевіча Бычака. Памятаюць людзі клапатлівую і адданую справе Марыю Мікалаеўну Худую.

Прыкметны след пакінуў пасля сябе Уладзімір Несцеравіч Дражын. Гэта быў перыяд індустрыялізацыі ў калгасах. Вёскі разбудаваліся, гаспадаркі сталі эканамічна моцнымі сельгасцэнтрамі. Уладзімір Несцеравіч прыязна ставіўся да людзей, падтрымліваў здольных кіраўнікоў і спецыялістаў.

Прадоўжыліся добрыя традыцыі і ў апошнія гады, калі раёнам кіраваў Іван Іванавіч Крупко.

Над такім «савецкім пазітывам» іранічна пасміхаліся «змагары за дэмакратыю» напачатку гарбачоўскага ператрусу. Але гэта праўда, я быў таму сведкай і на вуліцы, і ў сям'і. Так званы калгасны прыгон, рабская праца на дзяржаву, што перамыты тысячамі крытычных артыкулаў ды здзеклівымі прамоўцамі, тым не менш дазволілі нашым бацькам жыць лепей і багацей, чым жылі іх продкі, праліваючы пот на ўласніцкіх стужках-дзялянках. Механізатары ж лічыліся элітай вёскі, яны зараблялі большыя грошы, мелі не толькі сезонную, а пастаянную работу. Праўда была і ў тым, што і самі яны, пацёршыся каля тэхнікі, станавіліся больш кемлівымі, больш шырокага погляду людзьмі. Вякамі сялянская праца не ведала нічога акрамя сахі, лапаты, сякеры, сярпа, касы і сахара. А тут зусім іншы расклад, новы парадак, другое жыццё. Селяніна дапусцілі да навукі, далі яму ў рукі тэхніку, далі і свабоду: бяры трактар, працуй, зарабляй грошы...



Толя Максімаў і Зіна ці не першымі на сяле купілі сабе новенькі «Масквіч»

Гэтага – свабоды, даверу, дзяржаўнага клопату аб простых людзях – было, мо, і не так многа, але пасля сталінскага прыгону, голаду і страху і тое здавалася раем. Як імгненна перамянілася вёска! Заблішчэлі бляхаю дамы, павытыркаліся антэны над стрэхамі, на дварах з'явілася тэхніка. У працавітых ды заўзятых у хлявах па дзветры каровы, цялушкі, авечкі, свінні; на сотках бульба, буракі, сады і агароды. Вечарамі звінела сяло песнямі, буяла рознагалоссем дзіцячых гульняў і забаў.

Быў такі час у нашай гісторыі. Вялікая дзяржава, СССР, узяла першы спачынак ад рэвалюцыйных пратрусаў і войнаў. Суцішылася ваенная істэрыя, палепшыліся адносіны з Захадам, запрацавалі эканамічныя рэформы. Упершыню кіраўніцтва краіны рашылася не абдзіраць да ніткі, а паклапаціцца пра сялянства, пра самых прыгнечаных і абрынутых людзей, на чыіх плячах дзяржава вяршыла свае перамогі. Гэтыя шчаслівыя дзянёчкі пасля галадух і «чорных воранаў» добра адбіліся ў маёй памяці. Як той прамень святла, што рабілі мы кітайскім ліхтарыкам у цьмяную ноч, любуючыся ціхім кружэннем першых бялюткіх сняжынак над саламянымі стрэхамі.



Ад фальварка, дзе стаяла школа, застаўся толькі бярозавы гай

«За» і «Супраць»

Раздумваю над папярэдне напісаным і бачу неабходнасць прадоўжыць гаворку аб «трансфармацыі», як любяць выказвацца сёння вучоныя людзі, сялянскага розуму за гады савецкага ўладання. Ужо не адзін год мы жывём у самастойнай краіне, таму рэльефней і глыбей разуменне адметкаў. Я ўсё выразней адчуваю сярод людзей майго ўзросту і старэйшых за мяне не тое што настальгію, а ўсё больш частыя позіркі ў мінулы савецкі час, усё больш параўнанняў. Чуецца: «Пры камуністах было не так...», «Райкам, калі што, дык бараніў чалавека, а цяпер куды пойдзеш...», «І кватэры, і бальніцы, і тэлефон, і вада, і пуцёўкі бясплатна людзям абыходзіліся пры камуністах...»

Так, жыццё стала іншым, непараўнальна змяніліся яго істотныя, сістэмныя высновы. Ёсць вялікія здабыткі, ёсць і непараўнальныя страты. Калі скласці спіс плюсаў ды мінусаў савецкага ўладання, то могуць атрымацца цікавыя аналогіі. З аднаго боку, магутная дзяржава з ракетамі і атамам, з прыроднымі багаццямі і навукай, космасам і культурай, а з другога – бедныя людзі, прыгонная праца, закрытыя граніцы, адсталы, затурканы побыт... Аднак было ў гэтым побыце нешта, што цяпліла душу, змякчала прыкрыя нягоды ўладаў. У нашых мясцінах, дзе свежымі заставаліся ў памяці бацькоў польскія парадкі, адметнасць гэта вельмі кранала сялянскі розум.

Пра гэтую надзвычай важную частку тагачаснага вясковага побыту я крыху гаварыў у папярэднім раздзеле. Думаю, аднак, што сказаць трэба больш. Даволі прынцыповай яна ўяўляецца для разумення многіх «трансфармацый» і сённяшніх настальгій.

Я ўпамінаў раней пра неаднаразовыя гутаркі з бацькамі, калі Міхаіл Гарбачоў, тагачасны кіраўнік СССР, распачаў рэформы пад назвай «перабудова». У газетах, па радыё і тэлебачанні бясконца выступалі нейкія палінялыя людзі з жудасна-агрэсіўнай крытыкай камуністаў, урада, сваёй краіны. Слухаючы гэтыя знявагі, бацька, нечакана для мяне, бо я не адзін раз чуў, як ён абураўся і калгасным ладам, і «смершаўцамі» (*супрацоўнікамі органаў ваеннай контрразведкі ў вайну*), і расійскімі энкавэдзістамі пасля фронту, у арміі, выказаўся:

– За многае можна вінаваціць камуністаў, але за адно трэба пакланіцца ў ногі – за навуку дзеля сялянскіх дзяцей. Каб не савецкая ўласць, то ні ты, ні Толя, ні ўгледзелі б ніякіх універсіцетаў ніколі! Гной бы з хлява цягалі і за кабылаю хадзілі з раніцы да вечара... Дзе б вы былі, каб ня гэтая ўласць?!

Не аднойчы пра вучобу заводзіла гаворку маці.

– У школу то хадзілі пры паляках, ды сядзелі па тры-чатыры гады ў адным класе, бо ня было куды дзецям дзецца. Адзін настаўнік на ўсіх...

Для большасці сялянскіх дзяцей вучоба ва Усходніх Крэсах канчалася пачатковай трохгодкай. Была такая «клясова публічна вселюдна школа» і ў Хадатавічах. Захавалася бацькава пасведчанне аб вучобе ў гэтай школе ў 1934–1935 гадах. Цікавейшы дакумент! Калі не памыляюся, то ўжо ў трэцім класе ён вучыўся даволі шырокаму колу прадметаў. На першым месцы стаялі рэлігія, польская мова. Далей арыфметыка з геаметрыяй, прырода, геаграфія, гісторыя, малюнкі, спевы, ручная праца і фізкультура («руханкі»). Звяртае на сябе ўвагу запіс аб мовах: польская і руская, а ў дужках – украінская. Беларускай як бы і не было. Польская, руская, украінская... Ніякай Беларусі няма. Ёсць толькі Усходнія Крэсы...

– Па сёлах былі адно начальныя школкі, – працягваў гаворку бацька. – Далей вучыцца, значыць, у сямігодку трэба ісці. А яна ў Даматканавічах, сем кіламетраў туды зрання і сем назад пасля абеду. Гэта з Хадатавічаў, а з Малаедаў хадзілі ў Сноў. Тожа няблізкі свет. Папробуй восенню ў гразь ці зімою ў снег і мароз пахадзі! Дадому прыцягнешся пад вечар ні жывы, ні мёртвы...



II

- KLASOWA PUBLICZNA SZKOŁA POWSZECHNA
- КЛЯСОВА ПУБЛИЧНА ВСЕЛЮДНА ШКОЛА

im. —
ім.
w Chodatowicach (powiat: Nieśwież)
в (повіт: —)

Nr 5
Ч. —

Rok szkolny 1934/35
Шкільний рік

ŚWIADECTWO SZKOLNE
СВІДОЦТВО ШКІЛЬНЕ

Drugowicz Mikołaj
urodzony dnia 2 września 1925 r. w Chodatowicach
роджен дня р. в
(powiat: Nieśwież), religji (wyznania) prawosławne
(повіт: —), религії (віроісповідання) —
uczeń oddziału III (rocznik I)
учен відділу (річник)

otrzymuje za rok szkolny 1934/35 stopnie następujące:
дістає за шкільний рік слідуючі степені:

ze sprawowania się	bardzo dobry	з поведення	Bardzo dobry
religji		релігії	Dobry
języka polskiego	dobry	польської мови	Dobry
języka ruskiego (ukraińskiego)		руської (української) мови	Bardzo dobry
nauki: rachunków z geometrją	dobry	науки: рахунків з геометрією	Dobry
przyrody	dobry	природи	Dobry
geografji	dobry	географії	Bardzo dobry
historji		історії	Dobry
rysunków	dobry	рисунків	Dobry
z robót ręcznych	dobry	з ручних робіт	Dobry
śpiewu	dobry	співу	Dobry
ćwiczeń cielesnych	dobry	руханки	Dobry
robót kobiecych		жіночих робіт	Dobry

Drukarnia Państwowa Nr. 76501. 4. V.35.

Świadectwo szkolne (w języku polskim i ruskim) (ukraińskim) dla szkół powszechnych 1 i 2-klasowych (P. R. 3). Cena 8 gr.

Бацькава пасведчанне аб сканчэнні пачатковай «клясовай публічнай вселюднай» трохгодкі пры паляках 1934–1935 гг.

Пакутным, а часцей за ўсё недасягальным быў шлях у навуку для сялянскай моладзі.

– Кварціру зняць – бацькі ня мелі грошай. Вучылі дзяцей палякі, ды хто з багацейшых беларусаў.

– Мне то хацелася вучыцца. Мучыўся, але ж хадзіў праз лес кажны дзень у Даматканавічы ў сямігодку. Ды як вучыцца, калі маці адна. Петрык пакойны асабліва не стараўся, каб мяне вывучыць. Каб бацька быў жывы, другое дзела... А так – якая навука?! Чуць Богу душу не аддаў у адну зіму...



Liczba opuszczonych godzin szkolnych 3, z czego nie usprawiedliwiono 0/0
Число опущеных шкільних годин 3, з чого не оправдано

Liczba spóźnień 0/0, z czego nie usprawiedliwiono 0/0
Число спізнень 0/0, з чого не оправдано

Wynik ogólny dobry
Загальний вислід

W Chodatowiecach, dnia 15 czerwca 19 35 r.
У Ходатовічах, дня 15 червня 19 35 р.

Z. Górecki
Opiekun oddziału
Опікун відділу

Z. Górecki
Kierownik szkoły
Управитель школи

Skala stopni:
Скала степеней:

ze sprawowania się з поведення	bardzo dobry дуже добрий	dobry добрий	odpowiedni відповідний	nieodpowiedni невідповідний
z nauki przedmiotów з науки предметів	bardzo dobry дуже добрий	dobry добрий	dostateczny достаточний	niedostateczny недостаточний
wynik ogólny загальний вислід	bardzo dobry дуже добрий	dobry добрий	dostateczny достаточний	niedostateczny недостаточний

Пасведчанне. Зваротны бок

З хадатаўскага, бабы Наташы, хутара да Даматканавічаў трэба ісці кіламетры са два праз лес, потым кіламетр па ўскрайку і яшчэ кіламетры са тры цераз поле, ды з кіламетр па вёсцы. І так штодня к васьмі гадзінам раніцы. Час з летняга на зімовы не пераводзілі. Па-сучаснаму атрымліваецца, што паспець трэба на заняткі да сёмай гадзіны. Хлапчуком, толькі мінулася дзесяць гадоў, ён падымаўся ў пяць раніцы і скрозь цемру, зімовую завіруху, мароз ці восеньскую слоту, а бывала, як сам расказваў, што і пад воўчае скавытанне



МІНІСТЭРСТВА АСВЕТЫ БССР МИНИСТЕРСТВО ПРОСВЕЩЕНИЯ

ПАСВЕДЧАННЕ СВИДЕТЕЛЬСТВО

Гэтае пасведчанне выдадзена Драгаўцу Нікалаю Васілевічу (прозвішча, імя і імя па бацьку) нарадзіўшамуся ў 1925 годзе, у тым, што ён (яна) навучаўся ў сямігадовай школе сельскай моладзі в. Даматканавічы, Кіецкого р-на, Мінскай вобл. (вёскі, горада, раёна, вобласці) скончыў поўны курс гэтай школы і выявіў пры выдатных паводзінах наступныя веды:

па роднай мове і літаратурнаму чытанню	чатыры
па рускай мове і літаратурнаму чытанню	тры
па арыфметыцы	тры
па алгебры	чатыры
па геаметрыі	тры
па прыродазнаўству	чатыры
па гісторыі	чатыры
па Канстытуцыі СССР	чатыры
па геаграфіі	чатыры
па фізіцы	чатыры
па хіміі	тры
па замежнай мове (Нямецкай)	тры

№ 88223 „15" мая 1955 г.

Дырэктар школы Настаўнікі:

Настоящее свидетельство выдано Драговцу Николаю Васильевичу (фамилия, имя и отчество) родившемуся в 1925 году, в том, что он обучался в семилетней школе сельской молодёжи д. Доматкановичи, Кіецкого р-на, Минской обл. (села, города, района и области) окончил полный курс этой школы и обнаружил при отличном поведении следующие знания:

по родному языку и литературному чтению	четыре
по русскому языку и литературному чтению	три
по арифметике	три
по алгебре	четыре
по геометрии	три
по естествознанию	четыре
по истории	четыре
по Конституции СССР	четыре
по географии	четыре
по физике	четыре
по химии	три
по иностранному языку (Немецкому)	три

№ „15" мая 1955 г.

Директор школы Учителя:

АТ 02623. 18/III-55 г. Зак. 1542. г. Минск, тип. «Красный Печатник». Тираж 155 000

Сямігодка выратавала ад смерці

прабіраўся ў Даматканаўскую сямігодку. Адзін раз у мяцеліцу моцна стаміўся, прамок навылет ад поту, а ў школе астудзіўся. Імгненна падхапілася цяжкае запаленне лёгкіх.

– Думалі ўсе, што памру, – прыпамінаў бацька. – Качаўся ў гарачцы з нядзелю бяз памяці. Гаварыў абы што, але акрыяў, арганізм здаровы быў малады.

З тае хваробы ў бацькі засталіся адмеціны. Заўсёды, калі праходзіў рэнтген ці калі вопытныя дактары выслухоўвалі лёгкія, то пыталіся: відаць, дзядзька, ты моцна хварэў на запаленне ў маладосці?..

Праглі сялянскія дзеці вучобы, не выказаць словамі таго жадання. Бацька ўсё-ткі скончыў сямігодку ў саракавым годзе. Сямігодка і выратавала яго ад смерці на фронце, бо, як больш адукаванага, не адправілі ў пяхоту, а ўзялі ў артылерыю назіральнікам-карэкціроўшчыкам агню. Вясковыя хлопцы, што патрапілі ў пяхоту, бадай усе да аднаго паляглі, не вярнуліся дадому.

...Недзе перад летам па-гарадскому апрануты мужчына з партфелем у руках зайшоў на наш надворак на новым

паселішчы. Звычайна так выглядалі зборшчык падаткаў, што два разы ў год наведваўся ў хату «па нядоімку», а яшчэ следчы з Нясвіжа, што з чорнаю скураною сумкаю прыязджаў на ровары ў вёску, калі Васька Клаўдзікаў пырнуў нажом чалавека на танцах. Але на гэты раз да нас завітаўся не следчы і не падатковы інспектар, а настаўнік са школы. Бацькі ажно сумеліся, не ведаючы, як падалікатней абысціся з такім паважаным чалавекам. Настаўнік для іх, як і для ўсіх вясковых людзей, лічыўся чалавекам вышэйшага гатунку, фігурай недасягальнай і недатыкальнай. Вялося гэткае ад мінулага. У сялянскім розуме настаўнік — чалавек, прысланы «гасударствам» вучыць дзяцей; ён валодае навукамі, што для селяніна раўназначна валоданню таямніцамі; яму дзяржава плаціць вялікія грошы, ён прыстойна адзеты і забяспечаны, ён можа напісаць скаргу і абараніць безабароннага мужыка. Таму настаўніка паважалі, цанілі, слухалі і кланяліся ў пояс. Гэткія норавы я яшчэ крыху застаў.

Вось такі чалавек сам прыйшоў да нас у хату. Прысеў, дастаў ручку, адкрыў сшытак, спытаў у бацькоў, ці ведаюць яны, што ў верасні іх сын, Драгавец Васіль Мікалаевіч, павінен пайсці ў школу, у першы клас. А калі ведаюць, то трэба купіць яму буквар, сумку, яшчэ кніжкі, аловак, ручку з пяром, чарнільніцу... Хлопцу трэба таксама і адзецца для вучобы...

Бацькі з анямелымі тварамі слухалі настаўніка, яны і самі ведалі, што я пайду ў школу пад восень. Ды толькі не ў тым справа, а вось што не забыліся пра іх, сялян, прыпомнілі, прыслалі настаўніка ажно дадому — вось што найбольш цяпліла іх розум, поўніла прыемнымі думкамі. «Усё-ткі эта ўласць дзяцей вучыць, не тое, што палякі...»

Маці зазбіралася ў Нясвіж: трэба ж адзець хлопца... Ездзіла яшчэ да дзядзькі Вечыка ў Баранавічы, «каб памог якім рубельчыкам, ды мо ў Баранавічах яшчэ куплю што лепшае, вялікі ж горад...» З палатнянага скрутка былі вынуты беражліва прыхаваныя каляровыя палоскі савецкіх грошай. Іх было зусім няшмат, некалькі дваццаціпяцірублевак, здабытых катаржнаю працаю. Я таксама, нібы які скарб, разглядаў гэтыя фіялетавага колеру паперкі з партрэтам лысаватага дзядзькі ў кружочку; дзівіўся, як яны шапочуць, патрэскваючы ў бацькавых руках, і яшчэ ад іх ідзе зусім незнаёмы пах.

– Ну то што, Коля, я вазьму грошы...– нясмела вымавіла маці.

– Бяры, бяры! Трэба ж купляць хлопцу ўсё...

Яна вярнулася з паездак прыўзнятая. Купіла мне чаравікі, шкарпэткі, бялізну, а самае радаснае – гэта «бархатны касцюмчык». Бархатам на вёсцы называлі тое, што зараз вельветам. «Касцюмчык», куртачка і порткі мелі насычаны цёмна-зялёны колер, акуратна падыйшлі да маёй фігуры. Дарэчы, маці заўсёды купляла адзенне сабе, нам з братам, бацьку без усялякай прымеркі, «на вока». І аніразу не памылілася.

Да ўсяго набытага багацця была яшчэ куплена школьная фуражка колерам пад сівы попел, з чорным блішчастым казырком, чорнаю лентаю-палоскаю і залацістаю какардаю. Такія «форменкі» насілі гарадскія школьнікі, на вёсцы тое было ў навіну. Фуражка, касцюм і чаравікі зрабілі мяне непазнавальным. Бацькі жахнуліся з радасці ад майго выгляду: такая спрытная атрымалася карцінка.

Пазней, успамінаючы той першы збор у школу, маці не раз казала:

– Ня было раўні табе на сяле, так хораша я цябе прыбрала ў першы клас... Дзівіліся мы з бацькам, як ты стройненька пашыбаваў, такі харошы, праз Любін двор у Якубавічы, у школу...

Зразумела, чаму дзівіліся. Сялянскія дзеці ў пасляваенную галадуху не ведалі купленых у краме адзёжак. Насілі перашытыя вясковымі партніхамі бацькоўскія лахманы: палітко «з шынялка», куртачку ці камізэльку з бацькавага трафейнага пінжака, прынесенага ў салдацкай торбе з Германіі, кірзавыя ці гумовыя боты... А тут зусім па-гарадскому прыбралі хлопца – бацькі самі не чакалі такога відовішча. Таму і пераліваліся радасцю іх твары ад майго далікатнага і нечакана-урачыстага выгляду.

Некаторыя «гарушчыя», так казалі на зусім бедныя сем'і, выпраўлялі дзяцей у школу ў кірзавых ботах і фуфайках. Зараз такія «ўборы» можна пабачыць толькі ў кіно, калі паказваюць зняволеных людзей. Дый тое яшчэ добра. Здаралася, што наогул не пускалі дзяцей у школу, бо адзець няма чаго. Тады ў сям'ю ехалі дырэктар ці настаўнікі, хто з сельсавета, выпісвалі грошы, давалі якія рэчы, настойліва пераконвалі бацькоў вучыць дзяцей. Ні пры паляках, ні раней пры

расійскім цараванні такога не было, каб улады непакоіліся пра навуку мужыцкую, каб пад прымусам дзяцей у школу цягнулі.

...Яскрава помніцца першы ў жыцці школьны ранак. Уначы перад тым не спалася. Як жа, заўтра нарэшце ў школу, заўтра першае верасня! Залацяцца хата і двор пад цёплымі пранізлівымі промнямі ружовага сонейка. Ні ветрыку на вуліцы; пахне яешняю і бульбяным камяком у доме. Я бадзёра падхапіўся, хуценька паснедаў, і вось ён – момант найвялікшага шчасця: прыбіраюся ва ўсе свае новыя ўборы. Чаравічкі, касцюм, фуражка...



Пачатковец «у бархатным касцюмчыку» і фуражцы. З родным братам Анатолем (пасярэдзіне) і стрыечным Васілём. 1959 г.

Во, хлопцы загаманілі на вуліцы, ідуць на двор, як і было дамоўлена напярэдадні. Гэта старэйшыя за мяне вясковыя, мае сябрукі – Толік Вінкаў, Васька Костусеў, Лёнік Верчын, Мішка Мішаў. Я стромка выскачыў на двор і, не ведаючы, як трэба хадзіць у такіх адзежках, нібыта маладзенькі салдацік, выпрастаў рукі ўздоўж спіны, закрочыў амаль страявым за хлопцамі насустрач сваёй новай далі. Праз маленькае засмаленае вакенца на кухні бацька і маці пільна ўглядаліся мне ўслед...

Школка пачатковая, чатырохкласная, мясцілася ў будынку пана Смоліча ў Якубавічах. Зараз няма ўжо ні будынка, ні саміх Якубавічаў. Панскі маёнтак быў дабротным драўляным домам, як раней казалі, «у два канцы». Гэта значыць, дзяліўся на два процілеглыя ўваходы ці на адзін уваход, але на дзве роўныя палавіны. Так было і тут. За дзвярыма пачынаўся калідор, абапал якога меліся два ёмкія пакоі. У канцы калідора пару невялічкіх пакойчыкаў і выхад на гаспадарчы ўнутраны дворык. У пакойчыках жыла сям'я настаўнікаў Бурновічаў, муж і жонка, а ў вялікіх пакоях – класы для вучняў. З раніцы мы яшчэ чулі пах смажаніны з настаўніцкіх пакояў і ажно трымцелі ад жадання зазірнуць туды, у настаўніцкае жытло. Як яны там жывуць, гэтыя адукаваныя таямнічыя людзі?! Пэўна ж, у іх усё інакш, чым у нашых вясковых хатах: і ежа, і адзенне, і абутак; размовы, побыт, настаўніцкія дзеці... Настаўнік для нас, сялянскіх дзяцей, быў абсалютна



Першая пасляваенная школка ў будынку пана Смоліча. Хадатаўскія дзеці з настаўніцай Валянцінай Паклонскай. Прыблізна 1957–1958 гг. З сямейнага архіва М.М. Каўшаля

загадкавай з'явай. Як і ўсё іншае, што было за лесам і балотам, за купчастымі вязамі малаедаўскага хутара і дарогай на выселкі, на Нясвіж і Баранавічы, на Брэст і Мінск...

Памятаю, як я быў здзіўлены, калі настаўнікі, муж і жонка Бурновічы, садзілі бульбу на Чарнабайчыкавым пляцы, дзе яны здымалі пакой пасля пераезду пачатковай школы з Якубавічаў у нашыя Хадатавічы. Настаўнік сам ішоў за плугам, пакрыкваў на каня, а настаўніца ўслед за ім па баразне з кошыкам у руках. Нібыта аслупянелы, глядзеў я на гэта і не верыў сваім вачам. Сабраліся вясковыя: то адзін ідзе ды спыніцца, то другі. Потым некаторыя мужчыны падхапіліся памагаць, падыйшлі жанчыны. Але доўга не сціхалі размовы: як гэта атрымалася, што настаўнікі картоплю пачалі самі саджаць... Ніколі раней не было такога – ні пры паляках, ні пры рускіх. Настаўнік важней за пана лічыўся, а здаралася, што і паны перад ім шапку здымалі...

Мае першыя школьныя дні запамяталіся незвычайным хараством і ўрачыстасцю. Настаўнік Пятро Рудзешка строга рассадзіў нас за парты; яны хоць і заляпаны дзе-нідзе чарнілам, але бялеюць светлаю фарбай і здаюцца казачнымі. Пачынаецца ўрок. Настаўнік расказвае, калі на ўроку трэба падымаць руку. Потым тлумачыць першую тэму і задае пытанні. Мае

«калегі» ўцягваюць галовы ў плечы. Ён звяртаецца да Анціка Фросінага, падымае яго, паўтарае яму сваё пытанне. Анцік, здаровы хлопец з гарушчай нашай хадатаўскай сям'і, глядзіць на настаўніка, як каменны істукан на неба, чырванее ад напругі, круціць туды-сюды вачыма. А мне дык усё зразумела, чаго дапытваецца настаўнік, і я стромка выцягваю руку ўверх. Настаўнік слухае адказ, хваліць мяне. Ад радасці моцна б'ецца сэрца, хочацца падскочыць да неба ці ўзляцець на аблокі...

...Перапынак. Мы гуртам вывальваемся на двор. Цёплае сонейка, яшчэ зялёная ад лета трава абапал сцежак. А вакол школы галоўнае цуда — арэшнікавы гай, цэлы абсяг без канца і краю. Хутчэй туды: схавацца, даганяць адзін другога, весяліцца і набегацца да стомы за кароткія хвілі паміж урокамі.

Арэшнікавы гай пасадзіў пан Смоліч. Перад прыходам бальшавікоў ён аддаў сваю зямлю сялянам з Коханавічаў, а сам добраахвотнікам пайшоў у польскую армію, бо немцы ўжо рвалі Польшчу на кавалкі танкамі і руйнавалі самалётамі. На вайне згубіўся яго след. Праўда, у Нясвіжы засталіся дагэтуль пляменнік і радня. Кажуць, спраўныя людзі.

Дзядзька Сашык Твароўскі, у нядаўні мой прыезд да маці расказаў пра размову, што мелі яго бацька і хадатаўскія мужчыны з панам Смолічам. Яны наслухаліся казак пра заможнае жыццё сваіх суайчыннікаў за бальшавікамі ва Усходняй Беларусі, рашылі сказаць аб тым пану: «От дзе, паночку, людзі жывуць, ня тое, што мы тут...» Пан доўга павучаў сялян, тлумачыў настойліва: «Ня верце ні аднаму іх слову, бо можаце жыццё страціць, калі пойдзеце туды...»

...Мае шчаслівыя школьныя дзянькі аднак нечакана перарваліся. Праз месяц ці што пасля пачатку вучобы здарылася бяда. Забалела ў жываце. Спаквaля, а потым усё мацней. Паднялася тэмпература, я курчыўся ад болю, а бацькі не ведалі, што рабіць. Бо дактары ў Нясвіжы, далёка, хто давязе да іх. Так прайшоў адзін, другі дзень. Па вясковай спрадвечнай завядзёнцы думалі пройдзе, пабаліць ды перастане. Мо з'еў што нядобрае. Але боль нарастала, стан мой горшыўся.

«Трэба, Коля, дактароў, шукаць. Нічога ня будзе, корчыцца хлопяц з болю», — у роспачы казала маці. Бацька кінуўся на канюшню, ды Лаўрын, конюх, не даў каня, спаслаўшыся на тое, што трэба капаць картоплі. Засмучаны бацька палажыў мяне ў самаробную каляску, якую перад тым заслаў коўдрамі, і павёз у Даматканавічы да доктара Страцкевіча, якога трошкі ведаў.

І зараз у мяне перад вачыма тая наша вандроўка. Бацька моцна, абедзвюма рукамі, трымае жэрдку-аглоблю, на якой месціцца драўлянае карыта са мною, ляжачым пад коўдрай на саламяным сянніку. Ён упіраецца як толькі мае сілы, стромка коціць каляску па лясной дарозе. Я ляжу на спіне, вачыма да неба, і дзіўлюся, бо мо ў першы раз у такім стане назіраю, як вецер шугае вершаліны бяроз, як плывуць па небе аблокі, як сінеюць далёкія хвоі і дубы... Стракоча па лясной сцежцы самаробная каляска, абцяты жалем ды смуткам бацькаў твар...

Доктар Страцкевіч, толькі памацаўшы жывот, адразу зразумеў маю хваробу. «Апендыцыт, і ўжо запознены. Тэрмінова ў бальніцу, на аперацыю...» Зноў бацька, намагаючыся да салёнага поту, шпарка пацягнуў мяне праз лес. Дома, млоснага, пакінуў з маці і пабег шукаць што, каб адвезці ў бальніцу ў Нясвіж. На шчасце патрапіў на добрага чалавека, на Алеся Гапановіча з Гусакоў, калгаснага шафёра. Той збіраўся на сваім «газіку» ў Нясвіж за торфам. Шафёры тады – людзі важныя, перад імі гнуліся, бо машын толькі дзве ці тры на ўвесь калгас. Алесь Гапановіч, таксама франтавік, паслухаў бацьку. Яны давезлі мяне ў бальніцу непрытомнага. Хірург Мікалай Мікалаевіч Падгайскі адразу загадаў класці на аперацыйны стол, бо апендыцыт перайшоў у перытаніт, загноены адростак сляпой кішкі разарваўся, надзеі на выратаванне амаль не было.

Праз гады толькі я зразумеў, наколькі Гасподзь Бог аказаўся да мяне міласэрны. Бо пашанцавала, што якраз дзяжурыў у тую гадзіну ў бальніцы сам Падгайскі – майстар, нястомны выратавальнік людзей, шчыры і добры чалавек. Ён мог і не адважыцца на аперацыю – інфекцыя пранікла ў жывот. Але рашыўся, зрабіў дакладна сваю справу, спыніў інфекцыю. Колькі ўдзячных беларусаў засталіся жыць, дзякуючы цудоўнаму чалавеку, хірургу-майстру Мікалаю Мікалаевічу Падгайскаму! З хваляваннем прачытаў у кнізе «Памяць. Нясвіжскі раён» аб ім, удастоеным ордэна Леніна за сваю нястомную працу. Зараз шырока вядома імя прафесара-мікрахірурга Уладзіміра Мікалаевіча Падгайскага. Гэта сын нясвіжскага доктара Мікалая Падгайскага.

Два чалавекі, ***хірург Мікалай Падгайскі і шафёр Алесь Гапановіч,*** асвечаны вялікай пажыццёвай удзячнасцю майго сэрца. Яны даравалі мне жыццё, а маім гаротным бацькам надзею на будучыню.





Сям'я ўрачоў Падгайскіх з Нясвіжа. Хірург Мікалай Мікалаевіч і кардыёлаг Вольга Дзям'янаўна. Фота з кнігі «Памяць. Нясвіжскі раён».

Месяц ці нават паўтара я правёў у бальніцы. З тыдзень у паўпрытомным стане, а пасля амаль прывязаным да ложка, бо парываўся бегаць па калідоры. Бацькі знемаглі ад клопатаў. Толькі паўгода малодшаму брату, работа ў калгасе, свая гаспадарка, куры, свінні, карова. Каб даехаць да мяне ў бальніцу, трэба пехатою бегчы на сноўскі гасцінец пад Жанкавічы кіламетраў пяць, ды яшчэ ўбіцца ў аўтобус ці галасаваць «папутку», калі здарыцца. Стаяла восень, гразюка, лілі халодныя дажджы – ні дарог, ні машын. Як яны, бедныя, вытрывалі?! Згадзілася памагчы баба Наташа. Мо з месяц яна, пакінуўшы сваю гаспадарку, пражыла са мною ў палаце. Маці ўсе гады гаварыла: «Усё прашчаю Наташы, усе мае абіды і тое, што так нядобра да мяне адносіліся, калі маладою прыйшла да іх у хату, за адно – за тое, што яна цябе глядзела ў бальніцы...»

Дактары не раілі адпраўляць мяне ў школу пасля такога цяжкага выпрабавання. Трэба, каб загаілася рана, каб не разышоўся вялікі разрэз на жываце, бо ў школе дзеці сцерагчыся не будуць, а яшчэ трэба пехатою дабірацца да Якубавічаў, далекавата, а тут зіма набегла, завірухі, маразы. Не вагаючыся, бацька і маці згадзіліся з дактарамі.

Было нядобра, хацелася ў школу. Сумна аднаму без дзяцей. І тут адбылася неспадзёўка. За дзве ці тры нядзелі да аперацыі, што хадзіў у школу, я навучыўся складаць з літараў словы і пакрысе чытаць. З цікавасцю рабіў гэта і ў бальніцы, разбіраючы надпісы на скрыначках ад падарункаў, што прывозілі часам бацька ці маці. Дасюль у памяці маленькі завадны матацыкл, што купіў бацька, і прыгожая скрынка ад яго. Пасля бальніцы, калі вярнуліся дадому, стала зусім самотна, поўная адзінота. Сябры-таварышы ў школе. Маці і бацька на працы. Нудота, ды і толькі! На лячэнні і то было лепей. Ратуючыся ад смутку, стаў прыглядацца да кніжак. Забяруся на цёплы чэрань і чытаю да знямогі. Старонку, дзве, а пасля і дзясяткамі пайшло. Не адарвацца. Кніжкі сталі і ратаваннем, і захапленнем. У тым ліку школьныя падручнікі. Прайшоў іх па некалькі разоў. Маці завіталася да настаўнікаў

Бурновічаў, што кватаравалі ў Чарнабайчыкавай хаце – у іх мелася невялічкая бібліятэка. Кажа: перачытаў хлопец дома ўсе кніжкі, можа, вы што дасьце яму чытаць... Прыязныя былі людзі, адарылі яе цэлым стосам: казкі, розныя апавяданні, некалькі дзіцячых аповесцяў. Гэта было цудам. Мой свет напоўніўся захапляльнымі вобразамі і летуценнямі. Разам з кніжнымі героямі цярпеў пакуты, радасці, перамогі, вандраваў і трапляў у розныя прыгоды. Чытаў бясконца, нават начамі пад коўдрай, падсвечваючы фанарыкам. Пасля сам хадзіў на кватэру да настаўнікаў, хоць і саромеўся, але ж прасіў кніжак. Так праляцеў гэты нялёгкі і такі плённы год. З кніжкамі я болей не развітваўся.

Надышло новае лета, а з ім і навіна. Школу ў Якубавічах закрываюць, бо дзяцей зашмат з розных вёсак. Будзе школа пачатковая тут, у нашых Хадатавічах. Адразу, як скончыліся заняткі, хадатаўскія мужчыны пачалі разбіраць панскі дом і за тры месяцы перавезлі яго, паставілі на новую падмуроўку ў вёсцы. Да пачатку верасня ўсё было гатова, выкрашана і вымыта, нават печ зляпілі і калодзеж выкапалі. Трымцела ведаць, а хто ж нас будзе тут вучыць? Бурновічаў перавялі ў другое месца. Аказалася, што к нам прызначылі настаўніцу, якая яшчэ вучыла маю маці ў Малаедах, ***Яўгенію Уладзіміраўну Ліпскую***.

Чорнавалосая статная жанчына, яна прыехала ў нашыя Хадатавічы з дзвюма дзяўчынкамі-дашкалятамі і засялілася ў невялічкі пакойчык у новым школьным будынку. Туалет на вуліцы, вада з калодзежа, печ на дровах. Магазіна ў вёсцы няма, за хлебам трэба ісці ў Казлы, няблізка, кіламетры са тры... Такая доля ў тагачасных сельскіх настаўнікаў. Але нягледзячы на цяжкі побыт, Яўгенія Уладзіміраўна старалася навучыць нас усяму, што патрабавала праграма. Навука ў мяне пайшла добра, і я з задавальненнем хадзіў на заняткі. А некаторым трохі даставалася. Вясковыя дзеці былі забітыя, ніхто ў руках не трымаў кніжкі перад школай, бацькі ў вечным занятку, у бясконцай рабоце. На першых уроках многія паняцця не мелі, чаго ад іх дабіваецца настаўніца. А яшчэ шуткавалі, бывала, смяшылі адзін другога ці падначвалі тупейшых. Настаўніца не трывала, успыхвала як порах. Зрывалася на покрык, а калі-нікалі брала лінейку і лупіла па руках ці нават магла ўхапіць за вуха альбо за чупрыну. Гэта даходзіла да бацькоў, некаторыя хадзілі ў школу і сварыліся. Яна таксама перажывала, бо прасочваліся аб тым чуткі да яе начальства.

Злосць звычайна не мае літасці, асабліва сярод прыгнечаных і забітых людзей. У сяле «акрысіліся», як гаварыла маці, супраць Яўгеніі Уладзіміраўны, хоць яна была спраўным педагогам і неблагім чалавекам. Чамусьці ніхто не прымаў да ўвагі, што ў яе заўчасна памёр мужык, на руках засталося двое маленькіх дзяўчатак, што былі яшчэ дзеці ад першага замужства, што яна не мела ні свайго вугла, ні прытулку — пераводзілі штораз з вёскі ў вёску...

Мне і зараз вельмі прыкра ад гэтых думак пра Яўгенію Уладзіміраўну і пра яе лёс. Ужо даўно недзе жывуць сталымі людзьмі яе дзеці, блізняты Кіра і Каця, сын Жора, што скончыў Саратаўскі юрыдычны інстытут; стаіць абшарпаная і кінутая людзьмі наша школка ў Хадатавічах, няма і следу ад былога жыцця, а ў маім сэрцы жыве дакор. Бо і я, калі паступіў ва ўніверсітэт, стаў камсамольскім начальнікам, бываючы ў бацькоў, праходзіў міма настаўніцкага пакойчыка, сустракаўся мімаходзь з настаўніцай.

Ёсць рэчы ў жыцці, якія ніколі не вернеш, і будзеш шкадаваць аб сваіх учынках, і каяцца сам перад сабою — ды позна, нічога не зробіш. Здаецца, гэта так зразумела, але ж як цяжка даецца нашаму розуму.

Выбачайце мяне, паважаная мая першая настаўніца! Больш нічога зрабіць немагчыма, як толькі гэта — пасля смерці папрасіць у Вас прабачэння...

Чатыры пачатковыя класы я правучыўся ў Яўгеніі Уладзіміраўны Ліпскай. Цётка Ядзя, бацькава родная сястра, рабіла ў школе прыбіральніцаю, казалі па-вясковаму тэхнічкаю. І было мне там вельмі ўтульна. І настаўніца мяне не біла лінейкаю, і навука ішла лёгка ды з цікавасцю. А на другі год у школе сталі даваць дзецям на вялікім перапынку па конаўцы чаю і па аднаму салодкаму аўсянаму пячэніку. Якое гэта было замілаванне! Ніхто з нас гэтых пячэнікаў раней не каштаваў. Цётка Ядзя прынаровіцца і суне мне ў карман яшчэ адзін пячэнік неўпрыкметку, мо за таго, хто не прыйшоў у школу. Я берагу яго ўсе ўрокі, чую яго пах, чую, як ён грэе мне калена праз картовыя портачкі, і чакаю запаветнага моманту адламаць хоць драбнічку ды ў рот...

Наша настаўніца была матэматыкам, хоць вяла і ўсе астатнія прадметы, але па матэматыцы дала нам вельмі добрыя веды. Калі пасля чатырохгодкі я пайшоў у пяты клас у сярэднюю школу ў Казлы, то мая падрыхтоўка здзівіла настаўнікаў-прадметнікаў. Але то быў новы прыпынак на шляху ў вялікі сусвет.



Гэтыя таполі мы пасадзілі на сканчэнне школы вясной 1969 г.

Праз ноч – да навукі

Я так падрабязна расказваю пра вучобу, пра свае школьныя гады, бо лічу іх неад'емнай часткай агульнай дзеі, усяго тагачаснага жыцця. Упершыню за вякі існавання гэтай зямлі, на якой нараджаліся і паміралі пакаленні нашых продкаў, навука пастукалася ў сялянскія хаты. Ды пастукалася настойліва, спора, так усеабдымна, што прыйшлося прывыкаць, прымяркоўвацца да новых абставін. А як прымяркоўваліся – аб тым і кажу.

...Да Казлоўскай школы пехатою з Хадатавічаў – кіламетры са тры з гакам. Мясцілася школка ў драўляным доме на самым далёкім ад нас канцы, ажно пад Аношкі. Хадзілі сюды дзеці з Малаедаў, Коханавічаў, Аношак, Каменкі, Жанкавічаў, Гусакоў, Долкіндаў. Але далей за ўсіх было нам, хадатаўцам.

...Выходзілі з вёскі раніцай, гуртам, у цемры. Дзень восенню і ўзімку займаўся позна, гадзіннікі не пераводзілі, жылі па маскоўскім часе. На двары слота, гразь, зімою – мароз ці завіруха, а мы з жартамі, смехам, гаворкаю паўзём за навукай у школу. Старэйшыя хлопцы наперадзе, малышня ў канцы, бягом за імі, каб не адстаць. У самую непагадзь палілі факелы, бо не відаць дарогі, ды і страшна. То ваўкі завыюць, то бадзячая зграя сабак стрэнецца пасярод поля. Факелы рабілі загадзя: мяшалі попел з саляркаю, замочвалі ў гэтым месіве ільняную кудзелю, пакавалі яе ў бляшанку з-пад кансерваў, мацавалі

да высокай палкі, каб зручней трымаць. Адкуль пайшло такое вынаходніцтва – невядома. Нам яно перадалося ад старэйшых.

Папяловы факел доўга гарэў – відовішча неверагоднае сярод цемры і завірухі. Ды калі гарыць не адзін, а пяць ці шэсць! Скачуць, адбіваючыся на снежнай раўніне, палымяныя языкі, чорны дым загінаецца ў густую цемру. На сэрцы трохі жудасна ад бясконцай цёмнай ночы, велізарных ценяў, што дрыжаць і бягуць побач. Старажытным водгукам аддаецца ў сэрцы гэткая дзея. Страшна ад думкі, што згубіш сцежку, саступіш у глыбокі снег, застанешся адзін тут, пасярод воўчай ночы, мяцеліцы і нематы... Але страх адступае пад гоман, смех, імклівы поступ вясёлага гурта.

Да школы дабіраліся змакрэлыя ад поту, здымалі боты альбо валёнкі, пераабуваліся ў кеды. Пачынаўся школьны вулей. Дзяцей – не злічыць. Імпэт, жарты і бясконцы рух. А трэба ж яшчэ дайсці дадому пасля заняткаў. Зноў месім гразь ці снег, зноў шуткуем, але стараемся хутчэй дабрацца да смачнага абеда, які маці дастане ў чыгунках з печы...

Цікавае і шчаслівае было наша школьнае жыццё. Адгрымела вайна. Бацькі добра памяталі перажытае і радаваліся спакою, таму, што вучацца дзеці, што ўлада будуе школу і прысылае настаўнікаў, што нарэшце нейкі толк бачны ў гэтых калгасах. У новай Казлоўскай школе, куды мы перабраліся праз паўгода, шыкоўная спартыўная зала, шырокія калідоры, светлыя класы, стадыён, сталовая. Гэта зараз наша школка, калі праязджаю каля яе, здаецца мне зусім невялічкай і прыгнёнай, а тады яна бачылася ў нашых малечых вачах сапраўднай вялікай будынінай. Мясцілася яна, што было вельмі нам па сэрцы, бліжэй да Хадатавічаў, на пагорку перад вёскай Казлы, добра бачная адусюль. Пачалі хадзіць к нам яшчэ дзеці з Жылічаў, Еськавічаў, Затур'і. Мнагалюдна і весела стала ў новай школе. Дзятвы набіралася на цэлых два класы, як у гарадскіх – «А» і «Б». Сваім шостым «А» мы дайшлі да выпускнога балю.



Наша Казлоўская школа здавалася мне вялікай і раскошыстай. Здымак зроблены фотаапаратам «Змена» у 1967 г.

З цягам часу нашы вандроўкі да школы займелі некаторыя ўдасканаленні: старэйшыя хлопцы асвоілі повары, я дык нават «матароўку».



Настаўніцкі дом каля школы ў Казлах. 2016 г.

Так называлі веласіпед з маторам на раме – зараз такіх чамусьці не выпускаюць. Бацька недзе прыкупіў па таннай цане, спрабаваў сам ездзіць, ды кінуў, бо «матароўка» бесперапынна ламалася – маторчык стаяў на ёй даволі слабенькі. Але для мяне – дык адно захапленне. Бясконца яе ладзіў-пераладжваў і, здаралася, усё-ткі даязджаў да школы. Закапрызнічае, не заводзіцца матор – круціш нагамі, як звычайны ровар, хоць і са знямогай, але ж едзеш.

Я вучыўся лёгка. Мне падабалася, калі хвалілі настаўнікі, поўніўся «пяцёркамі» дзённік, а сам пакрысе ўсё бліжэй станавіўся да школьных «аўтарытэтаў». Увогуле, школьныя гады былі для мяне часам бясконцых адкрыццяў, сустрэч, падзей, узнёслых учынкаў. Школа дала свет, навучыла дабру, таварыскасці, разуменню прыроды, пачуццю радзімы. Ад сваіх хат мы, сялянскія дзеці, ступалі на школьны парог дзікімі звераняtамі, баязлівымі і закрытымі. Навакольны свет здаваўся нам адной вялікай прасторай небяспекі і пастаяннага суперніцтва. Мы раслі ў суровай канкурэнцыі, у бясконцых бойках паміж сабою, паміж сёламі, паміж гарадскімі і вясковымі; мы наносілі ўрон прыродзе, ганяліся з палкамі за вужамі і гадзюкамі, ламалі дрэвы, бурылі муравейнікі. Мы нічога не разумелі ў гэтым свеце і нічога не ведалі, акрамя



З дырэктарам Мар'янам Францавічам і яго жонкай Нінай Аркадзьеўнай Гутаровічамі ў іх доме ў Нясвіжы. 2004 г.

дзікунскіх інстынктаў. А выходзілі са школы прыстойнымі і культурнымі людзьмі, гатовымі адкрыць дзверы сталічных вучэбных устаноў, вытрываць сур'ёзныя жыццёвыя іспыты.

Толькі зараз, праз гады, я разумею, які вялікі патэнцыял заклалі ў маё сэрца і душу нашы настаўнікі. Мо гэта было шчасце, што дырэктарам у Казлоўскую школу прыехаў ***Мар'ян Францавіч Гутаровіч***. Чалавек асаблівай дабрыні, адказнасці і розуму. У школе не чулася крыку, злосці, муштры. Быў парадак, спакой, былі еднасць і сяброўства паміж настаўнікамі і вучнямі. Штодня з самай раніцы Мар'ян Францавіч абыйдзе кожны школьны куток. Загляне ў піянерскую, спартыўны зал, майстэрню, нечакана зойдзе на ўрок, пасядзіць хвіліну-другую. Стрэне на калідоры бегуна, прыпыніць, не крычыць, наадварот, пагладзіць па галаве, назаве па імені: «Міша, нешта ты разгуляўся сёння...» І ўсё, аніякага крыку, аніякай вывалачкі. «Бягун» адразу пачырванее ад сораму ды сцішана апусціць галаву. Дырэктар добра разумеў нас, вучняў. Ён сам выйшаў з беднай сям'і, перанёс у жыцці многае. Здаралася, што пакліча каго з вучняў у свой кабінет, дастане хлеб з салам ці кавалак пірага і кажа: «Вазьмі, з'еш, не саромейся, відаць, бацькі не пакармілі...» Такія настаўнікі даюць не толькі веды, а вучаць сэрцам і душою на ўсё жыццё.

Да мяне Мар'ян Францавіч ставіўся з вялікай прыхільнасцю, звяртаўся толькі па імені, ніколі не прайшоў, каб не спыніцца і не пагаварыць. Яго павага і зацікаўленасць нараджалі ў маім сэрцы вялікую ўдзячнасць, жаданне быць лепшым, быць першым вучнем у школе. І такое адчуванне было не ў мяне аднаго. Многія нашы выпускнікі, што сталі пасля прыкметнымі людзьмі, адчувалі яго прыхільнасць, падтрымку і ўвагу.



Здаецца, у сёмым ці восьмым класе

Не забудуся, як перажываў за мяне Мар'ян Францавіч, калі на выпускным экзамене па рускай мове я зрабіў прыкрую памылку і мог страціць вынік многіх гадоў выдатнай вучобы. А наперадзе экзамены ва ўніверсітэт, выдатнікам здаваць менш прадметаў. Разам з класным кіраўніком Уладзімірам Паўлавічам Аляксейчыкам яны

паклікалі мяне вечарам у школу, прымкнулі аднаго ў класе, і я перапісаў дыктант нанава. Зараз аб гэтым можна сказаць адкрыта. Але якую велізарную адказнасць браў на сябе дырэктар у той час! Браў, бо шкадаваў мяне, бачыў прыкрасць выпадку, які мог дорага мне каштаваць.

Жыццё дырэктарскай сям'і праходзіла на нашых вачах. Жыў Мар'ян Францавіч адразу за школьным плотам у чатырохкватэрным доме, які збудавалі для настаўнікаў адначасова са школай. З намі вучыліся яго дзеці: дачка Ліля і малодшы сын Гена. Жонка ***Ніна Аркадзьеўна*** вяла рускую мову і літаратуру. Спрытная, заўсёды акуратна і прыгожа адзетая. І зараз перад вачыма яе салатавы касцюмчык, туфелькі на высокіх абцасіках, што выстуквалі цакатуху па школьнай падлозе. Яна мучылася з намі, бо руская мова давалася цяжка, ніяк не лажылася на сэрца. Аднойчы прыехала камісія з раёна, прыйшлі ў наш клас на адкрыты ўрок па рускай літаратуры. Дзеці перапалохаліся ад важных гасцей, анямелі. Ніна Уладзіміраўна пачынае апытваць пра дамашняе заданне – ніхто не падымае рук, сядзяць з апушчанымі галовамі. Адзін я адказваю на яе пытанні, штораз цягнучы руку ўверх. Так і прайшоў урок, за які настаўніца была мне вельмі ўдзячная. Яна шмат сіл паклала, намагаючыся хоць трохі прыблізіць нас да вялікай рускай мовы і літаратуры. Давалася гэта цяжка, бо патрэбна вялікая трансфармацыя свядомасці, каб ад абшарпаных сялянскіх хат перанесціся ў далёкі свет салона мадам Шэрар у «Вайне і міры» ці зразумець жыццёвую рэальнасць Анегінскага Пецярбурга...

З настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Марыяй Якаўлеўнай Пракарына ў яе хаце ў вёсцы Аношкі



Зусім інакш складваліся адносіны з беларускай мовай і літаратурай. Тут усё было бліжэй. Вобразы і сімвалы «Новай зямлі» Якуба Коласа меліся ў кожным доме. І печ, і гаспадарка, і лес, з якога карміліся. А яшчэ споведы дзядоў і бабуль: пра жыццё пры паляках, пра панскія двары і прыгонную працу, пра паненак, што былі далікатна адзетыя ды з сабачкамі гулялі па ліпавых алеях у Наруцаўскім парку, пра тое, як строга глядзелі радзівілаўскія леснікі за ляснымі абшарамі: ні хвойку ссекчы, ні ягад, ні грыбоў без дазволу не сабраць...



ГРАМАТА

Нясвіжскі РАЁННЫ (ГАРАДСКІ)
АДДЗЕЛ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ
Мінскай ВОБЛАСЦІ

УЗНАГАРОДЖВАЕ

вучня Казлоўскай СШ
Драгаўца Васіля,
удзельніка раённага конкурсу
сачыненняў на тэму
„Беларусь мая родная".

Загадчык
рай(гар)ана

«6» жніўня 1968 г.

Але не дайшлі б да сэрца гэтыя вобразы, хоць яны і родныя і блізкія, каб не цудоўная іх зберагальніца, настаўніца беларускай мовы і літаратуры ***Марыя Якаўлеўна Пракарына***. Нібыта адзін захапляльны міг праляталі яе ўрокі – так зачаравана яна заводзіла нас у недасягальны свет кніжных герояў, даступна і зразумела тлумачыла сухія правілы пра суфіксы і прыстаўкі, вучыла тварыць і пісаць сачыненні. А яшчэ пільна назірала за намі і ў хуткім часе вельмі добра ведала, на што той ці іншы з нас здольны, якія мае магчымасці. Старалася спрыяць нашым задаткам, умела разгледзець іх на самых цёмных глыбінях нашай вясковай забітасці. Свет вобразаў і пачуццяў вясковых дзяцей неверагодна разнастайны, але мы саромеліся прызнацца, а тым больш публічна паказаць свае літаратурныя ці тэатральныя таленты.



Уладзімір Паўлавіч Аляксейчык

Марыя Якаўлеўна разумела і нашу сарамлівасць, і прыродную сялянскую далікатнасць, і вясковую нясмеласць. Мы чырванелі каля дошкі перад класам, саромеліся выказаць сваю думку, асабісты погляд на праблему; губляліся пры сустрэчах з нясвіжскімі ці сноўскімі гарадскімі вучнямі, хоць ні ў чым не былі горшымі за іх; нібыта агню, баяліся школьнай сцэны, тэатральнай пастаноўкі ці выступлення ў канцэрце. Настаўніца вучыла нас смеласці, заахвочвала. Зусім сур'ёзна давала нам індывідуальныя літаратурныя заданні. Аднаму напісаць сачыненне, другому скласці вершык, а потым перад усімі ў класе прачытаць яго. Хваліла за ўдалую рыфму, за цікавы вобраз. Паступова мы смялелі, раскрывалі свае творчыя задаткі, якіх так шмат у сялянскіх дзяцей.

Мне вельмі да спадобы было пісаць сачыненні на вольную тэму. Настаўніца зачытвала іх часта ў класе перад вучнямі, нават перад настаўнікамі, гаварыла пра мае здольнасці на бацькоўскіх сходах. Здаецца, у дзявятым класе я перамог спачатку ў школьным, а затым у раённым конкурсе на лепшае сачыненне пра сваю Радзіму. Атрымаў пахвальную грамату Мінскага абласнога камітэта народнай адукацыі. Гэта быў вялікі гонар для школы, для мяне і, вядома, для бацькоў. Калінікалі Марыя Якаўлеўна даручала мне рабіць даклады пра сучасную маладую беларускую паэзію і літаратуру. Прыходзілася перавярнуць літаратурныя часопісы, шмат прачытаць, затое шырылася эрудыцыя, набіраўся пэўны скарб ведаў.

...Напрадвесні, у 2004 годзе, я заехаў ў вёску Аношкі, дадому да Марыі Якаўлеўны. Прыпамінаючы школьны час, яна са смяшынкай прызналася:

– А ведаеш, Вася, калі ты рабіў свае літаратурныя агляды, то я шмат чаго сама не ведала з таго, што ты расказваў. Бо чытаць не паспявала новыя творы маладых аўтараў. Мы ж яшчэ дома гаспадарку трымалі. Прыбяжыш са школы, ды на сенажаць альбо да каровы. Не паспявала за навінкамі ў літаратуры. Вечарам ад работы вочы зліпаюцца. Дык я так уважліва цябе слухала, каб самой пра новае дазнацца, і так саромелася гэтага. Потым чытала, знаходзіла тое, пра што ты гаварыў. Але нікому не прызнавалася, во адно цяпер і кажу...

Мы шчыра смяяліся з гэтага настаўніцкага прызнання. Недзе праз год пасля той нашай апошняй сустрэчы Марыя Якаўлеўна памерла. Пахавалі яе на наруцаўскіх могілках каля мужа Міхаіла. Дзяцей у іх не было...

Уладзімір Паўлавіч Аляксейчык выкладаў нам матэматыку, быў нашым класным кіраўніком, займаў пасаду школьнага завуча – лічы, другі чалавек пасля дырэктара. З выгляду круглаваты, падобны на мячык на кароткіх ножках. Выдатны матэматык, ён меў цудоўны талент проста і зразумела патлумачыць самую складаную тэарэму ці алгебраічную формулу. І не дзіва, што такая няпростая навука захапляла і зачароўвала многіх у нашым класе. Урокі праходзілі з жартамі ды са смехам. Выпускнікі школы ўпэўнена здавалі матэматыку на ўступных экзаменах нават у Маскоўскім універсітэце. Але трэба прызнаць і тое, што некаторым сялянскім дзецям матэматыка не давалася, была для іх поўным тлумам. Паўлавіч да поту стараўся, злаваўся на ўроках, звяртаўся, бывала, у роспачы да мяне: «Вася, ну ты скажы яму (ці ёй), тут так усё проста, у мяне ўжо сіл не хапае...»

Яшчэ ў нашага класнага была дарагая для настаўніка асаблівасць характару: ён заўжды быў з намі на роўных, мы ніколі не адчувалі дыстанцыі «выкладчык – вучань». На перапынку Уладзімір Паўлавіч мог падкрасціся да нашага гурта, смешна прыгнуцца, каб не згледзелі, і знянацку ўшчыпнуць каго за бок. Той, каго шчыпалі, уздрыгваў, палохаўся, мы заходзіліся ад смеху, рагатаў з намі настаўнік. Можа, з вышыні цяперашніх паняццяў такі «прыём» класнага кіраўніка, ды яшчэ завуча, выглядае вельмі рызыкоўным, супярэчыць методыцы. Але мы існавалі ў сістэме простых ісцін і зразумелых пачуццяў. Ды, шуткуючы, настаўнік даволі тонка разумеў, з кім і ў які момант дарэчы будзе так пажартаваць.

Уменне спусціцца з п'едэсталу, стаць простым і зразумелым для сваіх выхаванцаў ядналі нас з Уладзімірам Паўлавічам вельмі моцна. Ён разумеў нашы самыя глыбокія пачуцці і юначыя памкненні: бачыў і наша першае каханне, ведаў, хто з хлопцаў праводзіў якую дзяўчыну пасля школьнага вечара, дзе хлопцы выпівалі віно і хто гэтае віно купіў. Да апошняй дробязі наш класны кіраўнік быў дасведчаны аб усіх нашых справах: і добрых, і кепскіх. Але пра апошнія ніколі не дакладваў дырэктару ці педсавету, не сарамаціў бацькоў за прыкрыя паводзіны дзяцей, бо разумеў, што ў нашым узросце і не такое

бывае. Разбіраўся з кожным паасобку і заўсёды ведаў час, калі патрэбна было запаліць перад самымі рызыкоўнымі «чырвоную лямпачку». Тады Паўлавіча было не пазнаць. Наліты крывёю твар, шалёным бляскам гараць пранізлівыя вочы: «Ты толькі яшчэ раз папробуй, натвары мне што! Раздаўлю, як пасленюю гадзіну...» І самыя заўзятыя забіякі, што толькі і ўмелі біцца ды лаяцца ці смаліць самакрутку ў школьным туалеце, прыцішана замаўкалі.

Так здарылася, што мы нячаста бачыліся з Уладзімірам Паўлавічам пасля сканчэння школы. Вельмі шкада! Ён так цікавіўся маім жыццём і маімі справамі. Пасля нашага развітання доўга яшчэ працаваў у школе, збудаваў свой дом, бо да гэтага жыў на кватэры ў Казлах, меў двух дачок, але ўжо колькі гадоў, як памёр. Я не паспеў наведаць яго перад смерцю.

Быў яшчэ ў нашую школьную пару такі незвычайны прадмет, як спевы. Мы вучыліся спяваць, разумець нотную грамату, трохі знаёміліся з творчасцю рускіх і беларускіх кампазітараў. Для нас, дзікаватых і недасведчаных дзяцей палёў і лясоў, спевы былі дзіўным заняткам, нечым накшталт таямнічага падарожжа ў краіну казак. На першы ўрок у клас зайшоў высокі чорнавалосы мужчына з гармонікам, як высветлілася, з баянам. Расказаў нешта пра ноты, нарысаваў на дошцы завухрыстую прыгожую пяцельку, якую назваў знак «соль», потым пачаў сам спяваць. Мы сядзелі разгубленыя і прыбітыя, чырванелі ад сораму, асабліва, калі настаўнік падымаў каго і прасіў праспяваць до-рэ-мі...

Дагэтуль аніякіх песень ніхто не ведаў, чулі на вяселлях, як спяваюць дарослыя, але самі практыкаваліся толькі ў гуканнях з лясным рэхам ды ў крыках на шырокім поплаве за вёскай, гойсаючы там цёплымі летнімі вечарамі. А тут спяваць, ды аднаму, перад усім класам! На цябе ўзіраюцца дзесяткі вачэй, чакаюць твайго сораму, чакаюць прыгоды, забавы... Ты дрыжыш ад страху, голас распаўзаецца, як мокрае цеста пад дажджом, з рота вылазяць сіпоты і хрыпоты, за партамі нарастае хіхіканне; цябе дражняць, паказваюць розныя грымасы...

Уладзімір Канстанцінавіч Камлач, настаўнік спеваў, дамогся, каб мы пераадолелі сорам недасведчанасці. Паступова спевы сталі прыемным, цікавым заняткам. І хоць веды па музыкальнай грамаце даваліся нам толькі першапачатковыя, але гэта

была ступенька да разумення таго, што свет вакол нас не канчаецца за даматканаўскім лесам. Спявалі мы, здаецца, толькі гады два ці тры, у старэйшых класах спеваў не было, але ў мяне не скончыліся адносіны з Уладзімірам Канстанцінавічам. Неяк ён аб'явіў нам, што будзе арганізаваны гурток па навучанню ігры на баяне і запрасіў мяне абавязкова запісацца. Набралася некалькі чалавек. Мы два ці тры разы на тыдзень заставаліся пасля ўрокаў у піянерскім пакоі і вучыліся разбірацца ў нотах і клавіятуры. Праз колькі заняткаў усе разбегліся, застаўся адзін я. Але Уладзімір Канстанцінавіч, мо таму, што адчуваў ці прыкмеціў маю прыхільнасць да музыкі, настойліва доўжыў нашы сустрэчы. Пасля ўрокаў ён паказваў мне новы матэрыял, я ішоў дадому, абедаў, рыхтаваў урокі і зноў вяртаўся ў школу. Браў баян, разбіраў ноты, практыкаваў рукі, выконваючы гамы ці невялічкія п'ескі, каб назаўтра паказаць вывучанае настаўніку.

...Вечарамі ў школе ціха і гулка. Цётка-старажыха адкрывае мне клас, я саджуся з баянам, падоўгу рыпаю на ім свае практыкаванні. Часам падыходзіць Уладзімір Канстанцінавіч, бо жыве з жонкай Марыяй Віктараўнай, таксама настаўніцай, і дзецьмі тут, побач, у настаўніцкім двухпавярховым доме. Паслухае, падкажа што і пойдзе. Праз гадзіну-паўтары я заношу баян у «піянерскую» – трэба бегчы дадому.

...Зіма. Адзін пасярод марознай празрыстай ночы. Ззяюць у вышыні зоркі, паскрыпвае пад нагамі снег. З-пад казлоўскіх хат чуюцца галасы, покрыкі на карову ці сабаку,



Наперадзе голае поле, дарога і я – адзін...

пазвоньваюць восілкі на вёдрах каля калодзежаў. Я подбегам кіруюся на сваю вёсачку. За спіною растае і зліваецца з серабрыстымі прыцемкамі школьны будынак, прамільгнулі калгасны клуб, кантора, трактарны гараж. Яшчэ колькі крокаў і мінецца падобны на пажарную каланчу стары млын, якім кіруе дзядзька Вацік Багдан, добры бацькаў сябар, прыяцель нашай сям'і. Але зараз млын акутаны цемрай, здаецца няўтульным і палахлівым. Наперадзе голае поле, дарога і я – адзіны на ўсю гэтую прастору...

...Плыве нада мною месячык, і так вакол ціха, так празрыста, што я выразна чую, як б'ецца кроў у скронях, настойліва пастуквае сэрца. Увесь я нібыта суцэльны кавалак са стромкіх пачуццяў, гарачай крыві, чароўных гукаў і радасных прадчуванняў. Чым бліжэй да лесу, да Высокай, дзе, кажуць, часцяком бадзяюцца каля авечай фермы воўчыя зграі, тым больш асалода руху і сілы. Але ж аднекуль з глыбіні цела непрыкметна паўзе стромкі недавер да гэтых прыцятых да зямлі стрэх і цьмяных ялін. Днём дык то і не лес: так сабе – кусты, падлесак, сасонкі ды бярозкі. А поначы – зусім інакш! Страх расце, як гурба адліжнага снегу пад лапатай. Адзін – ні палкі ў руках, ні каменя, але цвёрда кажу сабе: ідзі смела, не бойся, ты нічога ніколі не баяўся...

Адлягло ад сэрца. Родная вёсачка свеціцца агеньчыкамі

...Шпарчэй мільгаюць ногі, здаецца, не ідуць, а ляцяць над зямлёю, лёгка і строма. Зубчастым чорным шатром праступае на светлым месячным небасхіле змрочны абрыс высокаўскага лесу. Ды ўжо за спіною ён – цёмны лясны пагорак! Наперадзе родная вёсачка: свеціцца здалёк агеньчыкамі,



супакойвае ледзь чутнымі гукамі. Свой надворак! Цеплыня ў хаце ад прапаленай абедам печкі, смачна пахне смажанай бульбай. Маці і бацька, дачакаўшыся, перагаворваюцца: глянь, які ўпарты хлопец, мучыцца, а ходзіць на музыку...



Той самы баян, што купіў бацька ў Нясвіжы і прынёс на плячах дадому

Прахадзіў я на заняткі з баянам усю зіму: і ў маразы, і ў мяцеліцы, і ў адлігі. А пад вясну, калі разлілася навокал вада і хадзіць стала цяжка, Уладзімір Канстанцінавіч дазволіў мне ўзяць баян дадому, паўтараць вывучанае. Цягнуў баян на плячах па гразі, але з такім вялікім імпэтам ды ахвотай, што не пераказаць, бо так мілавалася сэрца ад карцінкі: сяду каля печы, прайдуся па кнопках, зайграю бацьку яго «Кіеўскі вальс», хай паслухаюць, парадуюцца, зразумеюць, што мяне кліча вечарамі ў школу, «за няблізкі свет»...

К таму часу я няблага вывучыў некалькі твораў: вальс «На сопках Маньчжурыі», «Кіеўскі вальс»; мог сам разбіраць прасцейшыя нотныя запісы, падбіраць мелодыі «на слых», які стаўся, як казаў настаўнік, абсалютна чыстым. Бацькі прыселі на канапе, сцішыліся. Я на крэсле бліжэй да печы. Расцягнуў баян, прайшоўся па кнопках, зайграў «Кіеўскі вальс». Наша хацінка напоўнілася гучнымі і моцнымі акордамі. І цуда! Звыклыя сцены, абраз у куце Маці Божай, нашы цьмяныя вакенцы, падушкі на ложках, стол пасярод хаты – усё нібы па ўзмаху чароўнай палачкі ў імгненне стала іншым, абралася вышыні і прыўзнятасці. Здаецца, не ў хаціне сялянскай мы сядзім, а пасярод царскіх пакояў... Гукі чароўнай музыкі змянілі звыклыя вобразы, здаецца, накрылі іх высакародным, тонкай работы, да гэтага незнаёмым і нябачаным вэлюмам...

Бацька і маці неяк сумеліся, не могуць нічога вымавіць. Яны хоць і «няграматныя», а музыку адчувалі сэрцам, асабліва бацька, ён меў чысты музычны слых. Здзіўленню не было канца. Потым у хату завіталі суседзі, цётка Ядзя, заходзіла і баба Наташа. Назаўтра я іграў дзяўчатам і хлопцам. А праз тыдзень, калі прыйшла пара адносіць баян у школу, яшчэ гразь не сышла, ды прасіў настаўнік вярнуць, бацька пайшоў пехатою на гасцінец, там падсеў на папутку і дабраўся да Нясвіжа. У «Культтаварах», так пры савецкім часе называліся сённяшнія



Вясковая знакамітасць. 1967 г.

ўнівермагі, купіў баян. Купіў, як казаў, «па дзяшоўцы», за дваццаць пяць рублёў, бо баян быў залежаны, яго ўцанілі. Бацька, шчаслівы, зноў на папутцы даехаў да казлоўскага гасцінца, ніякіх аўтобусаў не мелася, і ад гасцінца восем кіламетраў па размоклай, гразкай дарозе нёс баян на плячах дадому...

Так я стаў вясковай знакамітасцю, бо потым іграў на танцах; вечарамі — на нашых маладых зборышчах, іграў дома, калі прыходзілі госці, іграў бацьку, калі ён выпіваў чарку-другую гарэлкі ў мае студэнцкія прыезды і прасіў яшчэ, акрамя «Кіеўскага вальса», свае франтавыя «Хороши весной в саду цветочки...». Пазней, ва ўніверсітэце, калі на лета з'ехаў са штабам будатрадаў ва Уральскую вобласць Казахстана, навучыўся трохі на гітары, магу з задавальненнем паспяваць у кампаніі і не ўяўляю чалавечых адносін без музычнага кантэнту, як кажа сучасная моладзь. Я не стаў музыкантам, аднак, дзякуючы тым першым і кароткім заняткам, да якіх прыцягнуў мяне Уладзімір Канстанцінавіч Камлач, зрабіўся прыхільным да музыкі, палюбіў яе, адкрыў сабе хоць крышачку вялікага і чароўнага хараства. Мо і лёс мой сямейны так вызначыўся невыпадкова, бо жонка Галіна — прафесійны музыкант, выдатны піяніст, скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу фартэп'яна, дзе і працуе ўжо колькі год.

...На момант адводжу вочы ад камп'ютара. За вокнамі далёка распасцёрся неабсяжны небасхіл. Углядаюся туды, у яго сінеючы над гарадскімі пабудовамі ўскрай. Дзе яны, тыя нашы салодкія гадочкі, дзе мае аднакласнікі і школьныя сябры? От бы шугануць з імі па школьнаму калідору, пачуць хоць і суровы, але працяты лагодай голас класнага Уладзіміра Паўлавіча, стрэцца з дырэктарам Мар'янам Францавічам, наслухацца роднай мовы на ўроку Марыі Якаўлеўны... Няма іх. Адно школа непрытульна стаіць знямелая і пустая на тым казлоўскім пагорку.

Але ж быў іншы час, былі цікавыя, самавітыя людзі. Ткалася дзіўнае, поўнае хваляванняў і надзей, палатно жыцця: нітачка да нітачкі, вузельчык за вузельчыкам. Школьная пара на гэтым палатне адбілася расхіснутым цвяцістым узорам, што выткаўся адданасцю справе і сардэчнай шчырасцю нашых настаўнікаў. Яны былі прыстойнымі і адказнымі людзьмі.

Хай не здабылі славы і багацця, ды здабылі памяць і добрае слова ўдагонку пражытым гадам. Мо прачытаюць гэтыя радкі іх дзеці, унукі ды лягчэй ім стане на сэрцы ад удзячнай памяці пра бацькоў і блізкіх. Таму і пішу, хачу пакінуць гэтую памяць, аддзякаваць іх за навуку. За навуку не толькі тую, што была ў формулах і новых ведах, а за навуку жыць прыстойна сярод людзей, любіць свой край, разумець сваю зямлю...



Музыканты-самавукі. З сябрам Толікам Яўгеневым (злева)

У цудоўным тым шэрагу блізкіх настаўніцкіх імён не абмі- нуць гісторыка і грамадазнаўца ***Уладзіміра Іванавіча Новіка***. Цікавы суразмоўца, чалавек шырокіх поглядаў і ведаў. Чутна, бывала, як муха праляціць на яго ўроку – так змястоўна, у колерах, адкрываў ён перад намі звыклыя і сухія тэмы школьнай праграмы. Яшчэ Уладзімір Іванавіч меў вытанчаны густ акуратнасці і нейкай,



1965 год, 6-ы «А». Настаўнікі і дзеці. Другі рад, злева направа: Уладзімір Канстанцінавіч Камлач, Марыя Якаўлеўна Пракарына, Аляксандр Ксавер'евіч Шапавал, Мар'ян Францавіч Гутаровіч (дырэктар), Уладзімір Паўлавіч Аляксейчык (завуч), Ніна Фядотаўна Санько, Іосіф Фёдаравіч Майсеня, Ніна Аркадзьеўна Гутаровіч



Праз гады ў роднай школе з падарункамі – камп'ютарным абсталяваннем. Другі справа – Ул.К. Камлач, настаўнік спеваў, злева – В.Б. Рабко, настаўнік фізікі. в. Казлы, 2004 г.

толькі яму прысутнай чысціні. Заўсёды выгладжаны, адпрасаваны касцюм і кашуля, свежы гальштук, начышчаныя да бляску туфлі. Гэта была таксама навука, якой нас якраз не вучылі, але яна так спатрэбілася нам пазней, у будучыні.

А якім цудоўным чалавекам быў наш першы класны кіраўнік настаўнік геаграфіі ***Аляксандр Ксавер'евіч Шапавал***. Яго прыслалі ў нашу школу ажно з Гарадзеі, бо не маглі знайсці геаграфа паблізу. Каржакаваты, заўсёды бадзёры, з жартамі і дабрынёй у дапытлівых вачах, ён зрабіў геаграфію адным з самых любімых прадметаў. Вялікая карта на класнай дошцы, энергічным поступам з доўгай указкай у руцэ ўваходзіць Аляксандр Ксавер'евіч. Пасля кароткага апытання ён загадкава, прыцішаным голасам аб'яўляе: «Сёння мы з вамі зробім падарожжа ў адну з самых цікавых краін...» Пачынаецца захапляльны сеанс магіі. Паступова мы адчуваем сябе не ў класе, а ў кінатэатры, на фантастычным фільме, дзе індзейцы прабіраюцца праз зарослы лес, дзе крычаць птушкі, скачуць па дрэвах малпы, выследжваюць ахвяру жудасныя змеі... Неверагодныя хвіліны!

Аляксандр Ксавер'евіч меў уласную аўтамашыну – гарбаты «Масквіч-407». Па тым часе з'ява рэдкая. Але настаўнік не баяўся пасадзіць нас у кабіну і падарыць некалькі хвіляў шчасця: праехацца на сапраўднай легкавушцы, бо дагэтуль мы ездзілі толькі ў кузаве грузавіка. Не сыходзіць з памяці і наш летні турысцкі паход разам з настаўнікам на возера Свіцязь. За чатыры дні пабывалі ў лепшых мясцінах

Навагрудчыны. Ішлі пехатою, начавалі каля кастра ў палатках, самастойна варылі ежу, выстаўлялі начны дазор, спынялі папутныя машыны. Гэткаму цікаваму жыццю вучыў нас Аляксандр Ксавер'евіч; ён з рукзаком за плячыма і палкай у руцэ торыў па компасу маршрут, падбадзёрваў стомленых. Спраўныя то былі ўрокі.

Іосіф Фёдаравіч Майсеня – настаўнік англійскай мовы. З добрымі вачымі і неверагоднай вытрымкай, бо чаго толькі яму каштавала навучыць нас выгаворваць англійскае «эр»...

З замежнымі мовамі ў школе было ўсялякае. Выкладаліся дзве мовы – нямецкая і англійская. Але нямецкая нек сышла. Настаўнік перабраўся ў Сноўскую школу, кіламетраў сем ад нас, бо там яму было бліжэй да сваёй вёскі, здаецца, Тарэек. Настаўніка гэтага я добра памятаю. Высокі, прамы спіною, шыракаплечы мужчына ў галіфэ і хромавых ботах. Сізаватага колеру спінжак з адваротамі тонкага, можа й, нямецкага, сукна. Так казалі. Але найбольш памятны яго мажны белаваты твар з выразным, рэзка акрэсленым носам і сінімі вачыма. Завяршала постаць «бландзіністая» галава са светлымі валасамі, пастрыжанымі «палубоксам».

Прозвішча яго было Верамецкі. Хадзілі чуткі, што яго продкі былі з багатых. Так ці йнакш, але ён прыкметна адрозніваўся ад нашых мужчын-настаўнікаў: адзеннем, выглядам, звычкамі – хоць бы той жа скупаватасцю ў размовах. Трымаўся бокам ад усіх, быццам што хаваючы ў сваіх сініх вачах і вытанчанай несялянскай постаці. Раз я пачуў праз прыадкрытыя дзверы яго размову па-нямецку. Словы выляталі з рота, нібыта ўспыхвалі сухія запалкі: то з трэскам, то з кароткім постукам, як у дзятла на сухой елцы, то з выразным шыпеннем.

«Гергеча, як немцы ў вайну, – казалі ў сёлах. – То ён і сам чысты немяц». А мы, вучні, чуючы гэткія адозвы, у сваім недасведчаным разуменні па-за вочы называлі Верамецкага «фашыст». І мне таксама ён здаваўся падобным на кіпцюрастага арла, што бачыў у кніжках ці ў кіно. Асабліва, калі гэты адметны настаўнік стаяў на перапынках пасярод школьнага калідора і з вышыні свайго росту пільна ды строга аглядаў нашу таўкатню.

Ніякім фашыстам ён не быў, наадварот, быў на вайне, але, мо, за ўменне гаварыць па-нямецку, за падабенства постаццю на нямецкіх прышэльцаў, памяць аб якіх была яшчэ вельмі свежай пасярод тутэйшага люду, за некую унутраную

закрытасць і насцярожанасць, прыклеілася яму гэткая мянушка. Ды было ад чаго настаўніку насцярожвацца. Казалі, іх сям'ю правяралі энкавэдзісты у 1939-м на прыналежнасць да шляхецкіх засновак. Праверка абышлася, але сляды, відаць, пакінула. Мо таму й цураўся настаўнік гаварлівых стасункаў.

Калі звольніўся, яму доўга шукалі замену. Мы з уздымам запісваліся на англійскую і, на дзіва, ніхто з настаўнікаў гэтаму не пярэчыў. Ці то было зверху спушчана такое дазваленне, ці яшчэ што, ніхто не ведаў. На сяле казалі: ат, немцаў разбілі, то нашто ён патрэбен, эты нямецкі... Нагергеталіся за імі па вушы за чатыры гады...

Настаўнік англійскай мовы Іосіф Фёдаравіч Майсеня быў ужо іншы. Добры настроем, у харошым адпрасаваным касцюме з гальштукам, жвавы рухам, ён пераадольваў вялікія цяжкасці, каб прыхіліць нас, народжаных у хатах з глінянымі падлогамі, да англійскай фанетыкі. З жонкай, Аляксандрай Іосіфаўнай, і дзецьмі жыў каля школы ў настаўніцкім доміку. Неяк летняй парою Іосіф Фёдаравіч заехаў да нас у Хадатавічы, каб стрэцца са мною, пагаварыць. Я ўжо быў першым сакратаром Мінскага гарадскога камітэта камсамола, высокая на той час пасада, і настаўніку былі цікавымі мае погляды і думкі аб жыцці, аб моладзі, у тым ліку і аб будучым яго дзяцей, Анатоля і Людмілы. Прыемнай была наша сустрэча, як і ўвогуле былі прыемнымі ўражанні ад гэтай сям'і.

Углядаюся далей у партрэты школьных настаўнікаў. ***Валянцін Барысавіч Рабко***, малады фізік у акулярах з масіўнай аправай. Адразу стаў з намі, старшакласнікамі, на адну нагу. Цікава і зразумела тлумачыў самыя заблытаныя фізічныя з'явы, захапіў нас ідэяй школьнага радыё, стаў для кожнага добрым сябрам.

Іван Іванавіч Скробат, энергічны, мускулісты і рухавы, першы наш настаўнік фізкультуры. Нават у дождж выводзіў на стадыён і прымушаў да стомы «раз-два, рукі ў бок, ногі ўшыр...»

Вольга Іосіфаўна Лабажэвіч, настаўніца біялогіі і заалогіі; ***Ніна Фядотаўна Санько*** – гісторык, жонка старшыні калгаса; ***Галіна Аляксандраўна Ігнатчык*** – фізік...

Міхаіл Сямёнавіч Гаціла выкладаў чарчэнне – быў і такі прадмет у нашым раскладзе. Жылі яны з жонкай пад Нясвіжам, абое працавалі ў нашай школе, яна настаўніцай беларускай мовы. Кожную раніцу на вялікім чорным

матацыкле, у плашчах і шлемах на галаве, нібыта рымскія цэнтурыёны, прыязджалі на працу. Людзі надзвычай працавітыя, нават трохі памешаныя на гэтым. Трымалі сваю гаспадарку, некалькі кароў, свіней, штораніцы да школы беглі на касьбу, у поле, на соткі, на агарод. Здаралася, што на ўроку зморaны працоўнай раніцай настаўнік, прысеўшы ў цёплым класе на крэсла, не мог вытрываць. Вочы зліпаліся, галава падала на рукі – пакуль хто з нас маляваў на дошцы дэталь у розных праекцыях. Мы заціхалі, шыпелі таму, хто ля дошкі, каб не спыняўся, бубніў што-небудзь альбо проста чытаў тэкст з падручніка. Хвілін праз пятнаццаць-дваццаць Міхаіл Мікалаевіч прачынаўся, смешна круціў вачыма, стараючыся ўцяміць, на якім ён свеце, а зразумеўшы, тут жа ўваходзіў у ролю: «Ну што ж, няблага, няблага падрыхтаваліся...» Ставіў добрую адзнаку аднаму-другому, тлумачыў новую тэму, а пасля заняткаў хутчэй на свой чорны «Урал» і дадому, да кароў і свіней...

Не абысці і ўрокі працы, якія вёў ***Віктар Міхайлавіч Карловіч***. У школе мелася добра абсталяваная майстэрня. Там стаялі такарныя станкі па дрэву і па металу, наждакі, два рады слясарных ціскоў з наборам напільнікаў, рашпіляў, малаткоў і іншых інструментаў. У раскладзе нашы заняткі называліся «праца». Займаліся там толькі хлопцы; дзяўчаты, здаецца, вучыліся шытву ці медычнай справе.

Заняткі праходзілі насычана, сур'ёзна. Мы адзявалі чорныя халаты, рукавіцы, атрымлівалі персанальныя заданні. Вучыліся абыходзіцца напільнікамі, малаткамі, свідраваць дзіркі, правільна трымаць рукі, берагчы зрок. На першых уроках даволі працяглы час шнуравалі рашпілямі металічныя прамавугольнікі – да знямогі! Гэта настаўнік рабіў спецыяльна, каб рукі прывыклі да абыходжання з інструментам. Старэйшыя ганарліва паглядалі на нас, бо яны ўжо працавалі на станках, а гэта было самай вялікай марай. Мне чамусьці вельмі хацелася абтачыць драўлянае палена, адчуць незабыўны пах стружак і смалы, ператварыць яго ў што-небудзь прыгожае.

Праз год-два вучобы самі ўмелі зрабіць простыя накладкі на дзверы, карыстацца станкамі, вытачыць прасцейшыя дэталі з дрэва і металу. Навука гэтая вельмі спатрэбілася ў жыцці. Хоць і так мы былі здатныя да тэхнікі, бо набіраліся вопыту ад бацькоў, працуючых у калгаснай механізацыі,



Дарогамі і сцежачкамі беглі мы ад сваіх хатак у родную школу і ў сваю будучыню



але ж тое, чаму навучыў настаўнік працы, было зусім нялішнім. Я і зараз магу многае зрабіць дома сам, абыходжуся часта без слесара-сантэхніка, дзякуючы тым даўнім урокам працы.

Шмат якія здатныя вузельчыкі завязаліся ў школьную пару. Недзе ці не ў сёмым класе я з вялікім запалам узяўся за пазнанне фатаграфічнай справы. Толя, старэйшы сын Івана Іванавіча Ляпешкі з Нясвіжа, добра асвоіў фатаграфію, неяк пры сустрэчы даў мне першыя ўрокі, а пасля падараваў фотаапарат «Змена», бо яму купілі навейшы. З'явіўся фотакуток і ў школьным кабінеце фізікі. Я праседжваў там гадзінамі за цёмнымі вокнамі, праяўляў плёнкі, рабіў фотаздымкі. Браў дадому падручнікі па фотасправе. Здымаў сяброў, вёску, хату. Некаторыя з тых маіх здымкаў ёсць ў кнізе. Праглядаючы іх зараз, разумею, як бы многа я страціў з мінулага, каб іх не было.

Асобная тэма маёй школьнай пары – захапленне спортам. Малымі ў вёсцы мы пастаянна бавілі вольны час у гульнях ды забавах на паветры – у лесе ці на поплаве. Бегалі навыперадкі, гулялі ў «рускіх і немцаў» у пасляваенных акопах, навальвалі ся куча на кучу ў лапту на вясновым лузе, скакалі на лыжах з самаробнага трампліна, разганяючыся ад высокага магільнага пагорка, коўзаліся на замёрзшым балоце, «бралі з боем» снежныя траншэі, што пракопвалі зледзянелымі рукамі...

Але недзе з сёмага ці восьмага класа ўсё было адкінута назад: галоўным і найважнейшым стаў футбол. Так было паўсюдна, не толькі ў нашай вёсцы ці школе. Футбол накшталт эпідэміі захапіў наша юнацтва. Толькі знойдзецца вольная хвіліна – мы на поплаве: ганяем мячык да самай чорнай ночы. У нядзелю ці суботу – вёска на вёску, калгас на калгас. Перад тым самі раўнавалі поплаў, капалі штрафныя і варатарскія, ставілі вароты, складваліся па капеечцы і ездзілі на роварах у Нясвіж ці Клецк за мячыкамі...



Футбол і мячык – найпершыя! 1967 г.

Тыя хлопцы, хто спрытна гулялі ў футбол, былі самымі паважанымі. Слава іх ішла па ўсім раёне. Вялікім гонарам было ўвайсці ў зборную школы, ды яшчэ гуляць правым крайнім, як бразільцы Пеле ці Гарынча,

Малафееў ці Мустыгін з мінскага «Дынама».

Захапіліся мы футболам самааддана і адчайна. Хлопцы падабраліся вельмі ўдалыя. Лепшым і самым умелым быў сярод нас Толік Чурак з Гусакоў. Надзвычай гнуткі, стройны, бягучы і рэзкі, ён, без сумнення, стаў бы вядомым спартсменам, каб пайшоў па гэтым шляху. Але паехаў за рамантыкай у Данбас, у шахцёрскае вучылішча, і жыццё склалася па-іншаму... Добра гулялі Валодзя Чорны з Казлоў, Толік Невяроўскі з Гусакоў, Валодзя Бубен з Жанкавічаў, Вася Драчэнка і Коля Пасацкі з Аношак... Футбол збліжаў нас, рабіў адной сям'ёй, мы паўсюдна – і на танцах, і ў клубе, і на вечарынах у другіх вёсках – былі нібыта памечаныя пячаткаю. «Глядзіце, сам Чурак прыехаў з хлопцамі, вунь патанчыў з дзеўчынаю, шчаслівая...»



У футбол гулялі нават з цыгарэтай у роце

Былі ў нашым захапленні футболам і не вельмі добрыя адмеціны. Некаторыя засталіся на ўсё жыццё і з гадамі толькі мацней напамінаюць пра сябе. Неяк разбалеўся плячук пад лапаткаю, і хірург параіў зрабіць здымак шыйных пазванкоў. Якое ж было здзіўленне, калі ён яго пабачыў.

– У вас, паважаны спадар Васіль Мікалаевіч, многа часу назад была сур'ёзная траўма – надлом шыйнага пазванка. Што абыйшлося так, гэта ваша шчасце, але пастарайцеся прыпомніць: ці біліся аб што галавою ў дзяцінстве...

І я прыпомніў, як вучыўся біць па мячыку «цераз сябе» накшталт знакамітага Пеле. Гэта, калі мячык ляціць дзесьці на ўзроўні галавы і трэба ў акрабатычным перавароце цераз спіну падлавіць яго на ўдарную правую нагу. Для такога прыёму неабходны спецыяльныя трэніроўкі, каб падрыхтаваць мышцы, развіць іх сілу. Вядома ж, аб гэтым ніхто не думаў. Пасля чарговай спробы я няўдала ўпаў на галаву. Было млосна, галава балела і кружылася. Трохі адляжаўся на траве, тыдзень ці два пабольвала шыя, а потым пра тое забылася. Ды надышоў час, калі прыпомнілася. Шыя зараз патрэсквае, баіцца скразнякоў, часта прахопліваецца





Кніжка за перамогу ў спаборніцтвах па бегу

халодным ветрам. Падобна паводзіць сябе і правая нага, бо ёй таксама дасталося ад футбола. Падаў, біўся каленам аб зямлю; ступнёю як мага мацней лупіў па мячыку, атрымліваў па нагах падкаты і ўдары. З гадамі вытыркнуліся вены, пабольваюць суставы. Затое які гонар, якая павага: у старэйшых класах, дзявятым і дзясятым, я асноўны нападаючы зборнай школы, а таксама зборнай каманды нашага калгаса «Дружба»!

Была і другая небяспека, ды добра, што яна мінулася без свайго трагічнага следу. Лепшых і мацнейшых школьных футбалістаў калгасны фізрук, мелася раней такая пасада ў штаце амаль кожнай гаспадаркі, запрашаў гуляць за зборную каманду калгаса. Штогод праводзіліся раённыя першынствы па футболу, валейболу. Жыццё кіпела, моладзі было шмат. Калгас купляў форму, бутсы, гетры, выдзяляў машыну, звычайна грузавую, бо аўтобусаў не было. Плацілі яшчэ так званыя камандзіровачныя на харчаванне.

Гульні праводзіліся па нядзелях на працягу ліпеня і жніўня. Ехалі мы на гульню ўрачыста: у кузаў ставілі лаўкі, абапал бартоў утыкалі маладыя бярозкі. Атрыманыя камандзіровачныя грошы скідвалі ў кучу – такую завядзёнку ўстанавілі старэйшыя хлопцы, у асноўным нядаўнія армейцы (тады з арміі вярталіся моцнымі і спартыўнымі людзьмі). Куплялі скрынку ці дзве віна, пладова-ягаднага «чарніла», каўбасы на закуску. Куплёныя каўбасы былі ў той час вельмі смачнымі. Пасля гульні ўсёй камандай дзе-небудзь на паляне, пад прыгожымі дрэвамі, альбо і ў кузаве грузавіка «падводзілі вынікі» чарговага матча – пілі віно. Старэйшыя налівалі па поўнаму стакану і нам, вучням. Не выпіць перад такімі зухаватымі, аўтарытэтнымі людзьмі, значыцца, схібіць, паказацца слабым. Выпівалі. Ехалі з вецярком, з шумам і гамам у адкрытым кузаве. Выпівалі яшчэ па дарозе. Бывала, выпіваў і шафёр, машыну хістала ў бакі, але, як кажуць, Бог абносіў. Такія завядзёнкі вяліся не толькі ў нас. Так рабілася і ў іншых камандах. Здаралася, пераварочваліся машыны, калечыліся хлопцы. Ды што зробіш, няма маладосці без рызыковасці.



Апошні званок. З аднакласнікамі Іванам Карловічам і Георгіем Азарка. 1969 г.

Так ці інакш, але спорт займаў вельмі высокае месца ў школе. Акрамя футбола захапляліся баскетболам, валейболам, настольным тэнісам. Рэгулярна праводзілася першынство раёна сярод школ па лёгкай атлетыцы. Я бегаў за школу на 100 і 400 метраў. Аднойчы перад спаборніцтвамі нас дзён на пяць пакінулі ў школе трэніравацца: зладзілі спальны пакой, бясплатна кармілі ў сталоўцы. Так важна было для прэстыжу школы заняць прызавое месца на раённым першынстве.

Узімку на ўроках фізкультуры мы пастаянна надзявалі лыжы і кіламетраў пяць-сем разам з настаўнікам ***Апалінарыям Іосіфавічам Лабажэвічам*** да салёнага поту і задыху беглі лыжны крос. Пальцы на руках заходзіліся ад марозу, дыхання не хапала, бо трэба выканаць нарматыў. Ды не застацца апошняму, бо смяяцца будуць. Дзяўчаты ж таксама ідуць недалёка, па меньшаму кругу, уважліва наглядаюць, хто з хлопцаў лаўчэйшы, хто ідзе наперадзе.

Фізкультура для нас была найлепшымі хвілямі, а спартыўная зала цягнула да сябе магнітам. Ніколі потым я не пасаромеўся за сваю нязграбнасць у ніводнай спартыўнай кампаніі: у зборнай універсітэта па футболу, у камсамольскіх спартыўных гульнях, у акадэміі ў Маскве...

Мы выйшлі са школы гарманічнымі людзьмі. Нас навучылі спевам і працы, разуменню роднай зямлі і спорту, дакладным навукам; асабліва ж добра, што вучылі роднай беларускай мове, роднай літаратуры. Дзесяць школьных гадоў – нібыта светлыя каменьчыкі на чысцюткай ручаіне: дагэтуль звонка перастукваюцца ў сэрцы і роздумам, і гонарам, і смуткам. Гонарам, што былі спорымі ды здатнымі, а смуткам, што ніколі не вернуцца, не паўторацца.

Як не вярнуся і не сяду сам за школьную парту, не стрэну ў класе ці на школьным калідоры ***Свету Антановіч, Толіка Чурака, Васю Яраша, Ванду Багдановіч, Івана Карловіча, Галю Хоміч, Тамару Карачун, Сашу Палуянчыка, Марыю Багдановіч, Чэся Гапановіча, Толіка Невяроўскага, Лену Андрушкевіч, Георгія Азарку, Колю Пасацкага, Валодзю Бубена, Ларысу Гесь, Васю Драчэнка, Валіка Антановіча, Івана Вініцкага, Раю Акулік, Іру Гадун, Люду Бушук, Таню Матус, Валерыка Лабажэвіча…***

…Вось ён наступіў – выпускны баль. Наш стадыён, дзе мы да знямогі біліся ў футбол, займеў іншы выгляд – не пазнаць. Шырокі круг пасярод футбольнага поля абсаджаны маладымі, толькі што з лесу, бярозкамі са свежых дошак змайстраваны лаўкі для духавога аркестра. Адно сонейка пачало хіліцца да небасхілу, як школьны пляц стаў поўніцца людзьмі: настаўнікі, бацькі, вучні, моладзь з навакольных вёсак. Усюды кветкі, звонкі смех, прыўзнятыя размовы, прыгожыя твары, святочна адзетыя людзі. Ледзь чутны ветрык даносіць гаркаваты і салодкі пах вясны са школьных ліпаў і яблынь, з усяго навакольля. Ён кружыць галаву, абуджае сэрца, стромка кліча ў невядомыя далі. Хутчэй у круг, да сяброў і настаўнікаў, да жаданых і салодкіх дзявочых вуснаў. Грымнулі трубы. Па ўсёй акрузе, што шырока расхіснулася перад школьным пагоркам, разлілася да дрыжыкаў працятая смугою мелодыя развітальнага вальса…

Што там, удалечыні, за школай і вёскай?!



...Недзе а палове пятай я нетаропка вяртаўся з выпускнога балю. Крочыў і зацінаўся незнаёмымі дагэтуль думкамі, бо адчуваў, што я ўжо не такі, якім быў яшчэ некалькі гадзін назад. Трывога за будучыню, безабароннасць перад новым незнаёмым светам завярэдзіліся ў сэрцы. І разам з тым цвёрдая рашучасць пазмагацца, не саступіць, дасягнуць свайго.

Святлела неба, белаватым туманам зацінялася знаёмая дарога дадому. Уставала сонейка, абуджаліся птушкі, чуліся першыя галасы неабсяжнага прастору. Што чакае мяне там, удалечыні, за ляском і полем, за роднай школай і вёсачкай?..




Радавод

Радавод

Сям'я – вёска – школа; пасля школы зноў сям'я, бацька і маці – вёска, вяскоўцы, суседзі і, вядома ж, родныя, блізкія па гняздоўю, па кроўнаму радству людзі. У гэтым коле несупынна круцілася маленства, беглі дзянькі за дзянькамі, набываліся сталасць, разуменне свету і таго, як існаваць у гэтым свеце. Радавод, радня мелі вялікую значнасць. З роднымі абмяркоўвалі самыя падрабязныя падзеі побыту, жаліліся на крыўды, шукалі спагады, супакойвалі сэрцы, адагравaліся ў бядзе. Таму не абысці мне родных і блізкіх, бо не поўным будзе мой споведь пра тое наша жыццё без іх вобразаў, без іх імён.



Па суніцы з бабай Мар'яй. 1980 г.

Бацькава рука

На вёсцы ўсё навідавоку. Тут не схаваешся, як у гарадскіх мурах. Адзін аднаго ведаюць спрадвеку. Кожная сям'я, кожны род маюць вызначаную, строга асабістую біяграфію ў супольнай людской памяці. І цягнецца гэтая памяць, перадаецца праз гады і пакаленні, нанізваючы на сваё супляценне то новае харство, то новыя плямы.

– Яны ўсю жызнь бандзіцтвам займаліся, яшчэ бацька некалі расказваў пра іх сям'ю. Ты ж, Коля, помніш іх старэйшага...– заводзіла размову маці, калі дачувалася пра якое-небудзь здарэнне на вёсцы.

Альбо бацька выказваўся:

– З гэтага роду ўсе былі гарачыя. Кіпяць і кіпяць. Там усе нервы стрэплеш, а толку ніякага. Яшчэ дзед Андрэй пра іх гаварыў, матка казала...

Ці:

– Багданэ, то талковыя... Казалі, яшчэ дзед іхні даўно, за царом, вятрак меў, муку малолі...

У гарадах, дзе збіраюцца і жывуць разам невядомыя людзі, ніхто нічога не ведае нават пра сваіх суседзяў: адкуль яны, якая за імі цягнецца ўлётка, чым яны пазначыліся сярод людзей за сваю гісторыю. Срэбная павуцінка адтуль, з мінуўшчыны, зараз страчваецца, рвецца, ператвараючы нас ва ўмоўныя адзінкі,

а калі вобразней сказаць, то ў людзей з хусткаю на вачах. Гэта кепска, бо страчваецца адказнасць за годнасць прозвішча, за гонар свайго роду. Што з таго, што пра мяне дрэнна падумаюць, усё роўна ніхто мяне не ведае... Я тут, пасярод гэтых каменных джунгляў, чалавек-невідзімка... Часта якраз гэткімі словамі абумоўліваецца жыццёвая філасофія чалавека-маргінала.

Раней, пры аседлым жыцці, было інакш. Адмоўныя ці станоўчыя позвы, учынкі, адмеціны, нібы рассыпаныя гарошыны, цягнуліся за кожным вясковым чалавекам, за кожнай сялібай. У пакаленнях жылі і слава, і ганьба чалавечая. Пра маладога маглі казаць: глянь, які працавіты ды добры, нават не верыцца, што ён з «гэтых», бо з іх нічога добрага ніколі не выходзіла...

Зганьбіць свой род, сваю сям'ю, сваю фамілію лічылася ў сялянскім побыце апошняй справай. Не адкруціцца ад такой славы ніколі, будзе бегчы яна за табою і за тваім радаводам праз вякі. Адно толькі выйсце – з'ехаць куды ў чужы край, закруціцца, перамяшацца ды сцерціся з людской памяці назаўсёды.

– З Другаўцовых то ўсе былі да толку, чужога не возьмуць. Васіль, Коляў бацька, які харошы быў мужчына, акуратны, сталярку спраўна рабіў... Адабралі тут яго ўсе,– прамаўляліся на пасядзелках вясковыя людзі.– А братэ яго і сёстры?! Усе былі да толку. Па крыві ўсё йдзе, з пакаленняў...

Наша радня, як грыбочкі па лесе, купкамі рассыпалася па навакольных мясцінах. Аб тым я трохі расказаў на папярэдніх старонках. Бліжэй за іншых, вядома, былі тыя з родных, хто жылі побач і штодня церліся ў сваім радаводзе. Маё маленства ў Хадатавічах прайшло каля роднай бацькавай сястры цёткі Ядзі, яго роднага дзядзькі Сяргея, роднай цёткі Волькі Грудзінавай. Яшчэ блізкая радня – дваюрадны (стрыечны па-беларуску, але так у нас не гаварылі) брат Міша Анцін з жонкай Надзяй, якая таксама даводзілася нам раднёй і была маёй хроснай маці. Нікога з іх няма на свеце, але вобразы кожнага ясна і выразна трымаюцца ў маёй памяці. Я чую іх галасы, слухаю размовы, бачу твары: то на возе з саломаю, то з сахаром на плячах, то на лавачцы перад домам у нядзельку, то ў вакенцы, адкрытым на вуліцу ...

...Вось пратупаў на наш надворак святочным днём дзед ***Сяргей***. На вуліцы марозна і сонечна; скрыпнулі ў сенцах дзверы, пачулася сцішанае:

– Дзень добры ў хату...

– Заходзьце, дзядзька, ды во сюды бліжэй, прысаджвайцеся,– запрашае бацька.

Дзед Сяргей расшпільвае кажух, ставіць у вугал сваю палку-крывульку. Размова, звычайна, пачынаецца з якога выпадку ці нядаўняй навіны.

– Ішоў, бачыў каля Базылёвых санкі стаяць, кабыла запрэжаная. Хто там да іх прыехаў, садкуль...

– Эта ж з Нялепава яго, Мархеля, сястра. Першы раз, кажуць, у адведкі сабралася, як ён сюды ў прымы пайшоў,– удакладняе маці.

Я выходжу з кухні ці падымаюся з-за стала, дзе сядзеў за ўрокамі, вітаюся з дзедам Сяргеем.

– А Вася твой, Коля, от падобны да бацькі твайго Васіля. Ну ты, можа, не помніш, ты ж малы быў, як ён памёр, а я то добра яго помню... Такі харошы старэйшы брат быў для мяне...– гаворыць дзед Сяргей і прымаўкае...

Тут мне хочацца на імгненне прыпыніць свой аповед. Бо вельмі цікавай з вышыні сённяшняга побыту ўяўляецца сама з'ява такіх размоў і наведак блізкімі адзін другога. На вёсцы існавала няпісанае правіла: у нядзелю аніякай працы, бо Бог так наказаў, грэх за тое будзе перад Госпадам. Трэба ў царкву пайсці, памаліцца, родных і блізкіх праведаць. Але цэрквы панішчылі. У суседніх Даматканавічах, куды малым адзін раз брала мяне маці на Юр'я, царкву раскідалі пры Хрушчове. Раскідалі і пабурылі мясцовыя камунякі-актывісты, галота, «пакасць», як казала на іх маці. У Коханавічах царкву спалілі. Казалі, што ў гэтай агіднай справе актыўнічалі і нашы хадатаўскія «прыхлябацялі» – гэта ўжо па бацькавай класіфікацыі. Царкву ў Малеве, што на паўдарозе ў Нясвіж, дзе мяне хрысцілі, пабурылі, як і іншыя, таксама за хрушчоўскім часам. Таму адзіным месцам зберажэння веры заставалася ў людзей родная хацінка ды разуменне, што без Бога жыць нельга. Нават у самых бедных і гаротных сем'ях віселі на куце іконы пад ручнічкамі з вобразамі Маці Божай, сына яе Ісуса Хрыста. Раніцай у нядзелю і абавязкова па святах бацькі маліліся Госпаду перад іконай. Бацька на памяць прамаўляў «Отчэ наш, іжэ есі на небясах...»

Пасля набажэнства і снедання як абавязковы працяг святочнага дня пачыналіся адведкі да родных і блізкіх. Па нядзелях наведваліся ў асноўным да тых, хто жыў

непадалёку, у адным сяле. Радню, што была няблізка, наведвалі радзей, часцей за ўсё на Пакровы, Каляды ці Вялікдзень. Рыхтаваліся загадзя. Прыбіралі вазок альбо сані, укладвалі іх пахучым сенам, засцілалі прыгожым саматканым пакрывалам. Пакавалі належныя падарункі: качку, гусака, курыцу ці свіны кумпяк, дбайна прыхаваныя з восені яблыкі ці грушы, бутэлечку-другую жытняй самагоначкі. Помніцца, гасцявала ў Каляды на хадатаўскім хутары ў бабы Наташы яе сястра–цётка Марыля з-пад Клецка. Сані паставілі на вуліцы, каня распраглі, далі сена, уселіся за стол: патрохі выпівалі, смачна елі, вялі няспешную бяседу пра жыццё-быццё. Пасля хадзілі аглядаць гаспадарку. Завітвалі ў стойню да каровы, у свіныя загарадкі. Дзяліліся думкамі, колькі хто надойвае, а ці парасная сёлета свінаматка, ці ўдасца добра прадаць на базары парасят... Аглядалі палеткі, праходзіліся па гумне, зноў садзіліся за стол. Гаманілі пра радню, пра памерлых і пра жывых. Спявалі песні. Дадому ад'ехалі толькі назаўтра ў пакрытых квяцістымі ўборамі санях, вясёлыя ды разгавелыя...

Хадзілі вяскоўцы адзін да аднаго на размовы і пасядзелкі больш узімку, вясной не было калі, там кожная хвіля дарагая. У блізкія адведкі звычайна збіраліся на гадзіну ці дзве. Гутарылі пра справы гаспадарскія, пра здароў'е. Часам яшчэ прыходзілі хто з прыязных сем'яў ці суседзяў, завязвалася размова пра калгас, пра жыта і карову, пра жніво і картоплю. Мужчыны прыпаміналі вайну, фронт, немцаў і «нашых». Жанчыны ў сваім «бабскім» коле меркавалі пра дзяцей, пра цяжкую долю той, што пайшла за п'яніцу, аб тым, дзе купіць валёнкі ці спрасці пражу... Тэмы гэтыя ніколі не мяняліся. Адно што з гадамі абрасталі, як калодзеж мохам, большымі падрабязнасцямі, мо і прыдумкамі ды гумарам. Я дзівіўся таму напачатку, а пасля зразумеў, што так яно і павінна быць, бо людзі гаварылі пра тое, што ведалі і бачылі на гэтым свеце. Ніхто не адпачываў на курортах і не ездзіў падарожнічаць. У Нясвіж ці Клецк і то выбіраліся зрэдку ды маладзейшыя, а старыя так і не бачылі нічога, акрамя хлява ды поля.

Дзед Сяргей, пакуль быў пры сіле, ніколі не абмінаў нашу хату, нядзельным днём абавязкова заходзіў да нас, да нашага бацькі, свайго пляменніка. Справіўшы малітву і паснедаўшы, ён надзяваў выхадное: новы кажух, валёнкі, браў сваю нязменную палку-крывульку і паціху тупаў па марознай і снежнай вясковай вуліцы. Высокі, мажны і касцісты мужчына,

але падцяты, не распаўнелы. На вёсцы казалі, што яшчэ ад Андрэя ўсе Другаўцовы – прыгожыя, статныя, моцныя духам і целам людзі, з вялікім пачуццём далікатнасці і такту.

...За вокнамі зырка блішчыць пад сонцам снег. У хаце светла і хораша. Пахне аладкамі, хлебам, смажанай бульбай. Рахманым ручайком журчыць бяседа. Дзед Сяргей прысеў на крэсла, сціпла падцяў ногі, рукі далонямі, адна на другую, паклаў зверху на крывульку. Рукі доўгія, моцныя; далоні шырокія і шурпатыя. Мне здаецца, што яны стаміліся, і рукі, і далоні, бо так панура і сцішана павіслі на крывульцы. Дзед Сяргей, аднак, не дае ім спакою: то паложыць на калені, то зноў на палку-крывульку. Нібыта не ведае, куды іх дзець. Відаць, нязвыкла гэта, каб у селяніна рукі без працы нудзіліся...

Калі не было асаблівых навін, пачыналася размова з пагоды. Слова «надвор'е» ў нашых месцах не ўжывалі.

– Глянь, як падмарожвае, і хмары разышліся, выясніваецца, відаць, закуе мароз ноч'ю... Памяняецца пагода заўтра...

Пераходзілі на гаспадарку.

– Карова будзе цяліцца. А свіння, глянь, засталася непаросная... Каб трасца яе ўзяла, і да кныра вадзілі, грошы плацілі, а толку ніякага. Думалася, парасяты будуць. Сабе пакіну, а што прадам, а тут во што палучылася...

Далей пра калгас.

– Эта ж кажуць, што на той год дзялкі ўжэ па гектару будуць на кожную бабу даваць. Памерці трэба, каб абрабіць столькі. Усе жылы дастануць, а як палучку палучаць, то капейкі адны... Каб яго трасца ўзяла, хто гэта ўсё прыдумляе...

І, нарэшце, абавязкова пра палітыку і пра розныя страшэннасці.

– Кажуць, амэрыканцы прыдзіраюцца да Саветаў за нейкай Кубы. Глядзі, каб не ўспыхнула зноў вайна. То зараз ужэ будзе атам, ні то, што мы арцілерыю бачылі ды папробавалі. Тут нікому спасення не будзе, усё спаліць і паложыць. Во што навыдумлялі на чалавечую голаву! Хай бы што добрае прыдумалі, а ня гэты атам...

– А вот у Святым пісанні сказана, што патоп будзе, усё вадою залье, ніхто не выжыве. От дзе страх будзе! Падумаць, а? Каб столькі вады, што ўсю землю накрые... За грахі нашыя Бог такую кару пашле...

– А што?! Можа быць! Глянь, колькі дурняў кінулася цэркаў паліць у Коханавічах за капейкі! Яны табе што хочаш



Дзед Сяргей падчас вайны

зробяць! Толькі падбухтор яго, скажы, во, ты, маладзец, герой! І заб'юць, і раздзенуць самаго Хрыста Бога пустадомкі гэтыя. Ці мало іх вунь брэндаецца бяз дзела...

Тут павісала паўза, усе замаўкалі, нібыта вандравалі дзе ў сваіх думках. Потым хто таропка прамаўляў: «Глянь, засядзеліся, эта ж паўпершай, трэба йсці ўходжвацца, свіням даваць, карове сечкі падрэзаць...» Пачыналіся дружны пад'ём і адзяванне.

– Ну то ўсё, Коля, і я пайду. Пагаварылі трохі,– прыцішана казаў дзед Сяргей, выходзіў з хаты на ганак.

Гледзячы на яго жывога, мне здавалася, што такім быў мой родны дзед Васіль, заўчасна памёршы. Яны ж родныя браты! Таму так прыемна было бачыцца з дзедам Сяргеем, прыемна прыпамінаць яго праз гады. Нетаропкі і разважлівы, ён застаўся ў маёй памяці ў вобразе існага селяніна: у кашулі па-старадаўняму, з круглым стаячым каўнерыкам на два гузікі вышэй плячука, засяроджаны тварам, сумнаваты выглядам. Я раздумваю, бывае, пра гэты сум, углядаюся, нібыта гартаючы стары альбом з фотакарткамі, у твары нашых людзей і адкрываю для сябе важную адмеціну. Вясковыя сталыя гаспадары, асабліва мужчыны, такія, як дзед Сяргей, амаль ніколі не смяяліся. Са смехам на зубах заўсёды былі толькі балбатуны. Ды іх добра ведалі. А гаспадары нават і ў святы ці ў часы нетаропкай бяседы, ці на вяселлі, ці на радзінах былі стрыманыя, ведалі цану кожнаму свайму слову. Пра такіх казалі: не, дураты ў яго няма, абы што пляскаць языком не будзе... Дый само жыццё не давала ім зачэпак для весялосці. Заўжды ў думках пра гаспадарку: каб устаць раней і зрабіць паболей.

Дзеда Сяргея не ласціла жыццё. Маладзенькім паспытаў нямецкую газавую атаку пад Баранавічамі ў першую імперыялістычную. Ледзь выжыў. Пастаянна пасля пакашліваў. У другую вайну з немцамі зноў на фронт, у самае пекла, у пяхоту. Пад Кенігсбергам прастрэлілі калена. Шпіталь, перамога, дадому на палцы. Так і кульгаў пасля ўсё жыццё. Чалавек вялікай прыстойнасці. Ніколі ні з кім не пасварыўся, чарку гарэлкі мог выпіць толькі па вялікім святе. Хораша жыў з жонкай, бабай Мар'яй. Ад іх абоіх зыходзілі дабрыня і спакой, мудрая разважлівасць і паразуменне. Памёр дзед Сяргей напачатку

1988 года. Я вучыўся ў Маскве і даведаўся аб тым ужо пасля пахавання.

...Неяк у ліпені, праз год пасля нашага з Галяй вяселля, мы сабраліся ў радзівілаўскі замак у Нясвіжы. Перад тым заехалі да бацькоў, начавалі там, зранку рашылі пайсці ў лес па суніцы. Аб тым маці дамовілася і з Мар'яй Сяргеевай, як звалі яе на вёсцы. Прылучыліся да нас суседскія хлапчукі Юрка і Сяргей, сыны Анюты Росцікавай. Калі выходзілі паўз нашыя соткі, я зрабіў памятны здымак. Ён адзіны з вобразам Мар'і, а вось дзеда Сяргея я так ні разу і не сфатаграфаваў. У Мар'і на здымку добрая паўсмешка, спакой на твары, нетаропкасць у постаці. Маці заўжды з дабрынёй прыпамінае яе, бо на хадатаўскім хутары Мар'я дапамагала ёй перажыць недарэчнасці ў адносінах з бабай Наташай. Прытуляла да сябе, запрашала ў хату, карміла ды суцяшала...



Цётка Ядзя, дзядзька Коля, Вася і Валодзя (на крэсле) каля сваёй хаты пад бэзам. 1957–1958 гг.

З бацькавай радні самай блізкай і прыязнай да нас была яго родная сястра ***цётка Ядзя***. Яна з дзецьмі Васем і Валодзем, маімі дваюраднымі братамі, і мужам Мікалаем Андрэевым, жыла недалёка, праз чатыры хаты ад нас, за Чарнабаевым пляцам. Мы бачыліся штодня, бо цётка абавязкова наведвалася ў нашу хату. Заглядвала зранку, абедам на колькі хвілін па дарозе ў краму; вечарам, калі спакайней пасля работы, пасядзець, пагаварыць. І мужчынскія, і жаночыя, як бацька казаў, «бабскія» размовы праходзілі на маіх вачах. З маленства я іх чуў, слухаў, чым узрушаны людзі, чым пакрыўджаны, аб чым клапоцяцца.

Цётка Ядзя працавала некаторы час прыбіральніцай у школе, але школу праз колькі гадоў закрылі, і яна хадзіла разам з вясковымі жанчынамі на «брыгаду». Гэта значыць на самыя паўсядзённыя работы: летам – дзялкі, восенню – картоплі, зімою – тарфакрошка ці гной на палі. Мужык яе Коля, моцны і пруткі мужчына, на будаўніцтве, у полі з возам ці з плугам – дзе толькі прыдзецца, адно каб зарабіць рубельчык. Увішныя і працавітыя абое. Дзядзька Коля невядома калі спаў. Я толькі прадзіраю вочы, каб сабрацца ў школу,

а маці, чую, кажа бацьку на кухні: «Глянь, Коля Андрэяў ужэ з лесу йдзе з кошыкам, да дня за грыбамі пабег...»

Гэта была праўда, што не пайшоў, а пабег, бо ён сапраўды не хадзіў звычайнымі чалавечымі крокамі. Патрэба зрабіць як мага болей, паспець за дзень у мноства месцаў, бо клопатаў не злічыць, навучыла найбольш увішных сялянскіх працаўнікоў рухацца подбегам, накшталт спартоўцаў, што займаюцца спартыўнай хадзьбой. На вёсцы ў тыя часы, калі бацькі былі маладыя, павольна хадзілі хіба толькі старыя людзі альбо тыя, хто прыехаў да родных з горада. Іх адразу адзначалі: «Глянь ты, як гарадскія шпацыруюць па вуліцы. Што ні кажы, а ў горадзе на выгадзе жывуць... Ні то, што мы тут у калхозе, на дзялках...»

Калі ўжо зайшла размова пра такую цікавую акалічнасць вясковага побыту, то трэба прыпомніць, што яшчэ шпарчэй «спартыўная хадзьба» атрымлівалася ў дзядзькі Мішы Анцінага (Каўшаля). Я ніколі не бачыў, каб Коля Андрэеў ці Міша Анцін няспешна крочылі па вуліцы – заўжды спяшаючыся, подбегам, хутчэй, хутчэй... Так дорага каштавала для гэтых заўзятых мужчын кожная хвіля часу, так прагліся яны работы і заробку, каб утрымаць гаспадарку, дагледзець дзяцей.

Не разгіналася ад працы і цётка Ядзя. Сама па сабе сціплая і надзвычай сумленная, яна шчыра, «з рук сваіх», як казала маці, здабывала свой хлеб. Нікому не сказала кепскага слова, аніразу ні з кім не пасварылася, аддана клапацілася пра сваіх сыноў і ўнукаў. Мужык яе, Коля, моцна курыў. Садзіў на агародзе тытунь, сушыў яго, развешваючы над прыпекам шырокія, падобныя на лапуховыя лісты – радамі, шчыльна, адзін да аднаго. Памятаю, як узімку ён даставаў іх, ацінаючы хату пранізлівым тытунёвым пахам, круціў у трубкі, рэзаў на драбноту – рабіў табак для самакрутак. І такая то была для яго асалода – не перадаць словамі! Крышыць тытунь і, здаецца, ажно млее ад радасці, што зіма з табаком будзе. Ды з гадамі пачаў кашляць, асабліва начамі. «Устае, спаць ня можа, ажно заходзіцца з кашлю», – у роспачы спавядалася нам цётка.

Чарговым разам, калі на вёску прыехала машына з апаратурай для флюараграфіі і дзядзьку Колю прасвяцілі рэнтгенам, то, прагледзеўшы здымак, доктар вынес вердыкт, што трэба ехаць у Мінск – пляма на лёгкім. Я вучыўся якраз у Маскве, у Акадэміі. Яго палажылі ў Бараўляны, зрабілі аперацыю. Застаўшыся з адным лёгкім, ён страціў

былую моц і сілу, схуднеў, мучыўся, у хуткім часе памёр. Памёр даволі маладым, толькі перажыўшы шэсцьдзясят. На цётку звалілася гаспадарка, адзінота і смутак. Сыны, праўда, ужо стаялі на сваіх нагах. Жылі самастойна, дапамагалі матцы. Але я часцяком заўважаў у свае кароткія прыезды, што ўсё большаю тугою пакрываецца яе твар, што ўсё радзей усмешка кранае вусны, усё глыбей яна ахінаецца цяжкімі думамі. Таму заўжды хацелася чым парадаваць добрую і спагадлівую цётку Ядзю: ці словам падтрымкі, ці прыветнай сустрэчай.



Стрыечны брат Вася Гадун распісваецца з Ірынай. Май 1975 г.

Адзінай радасцю яе жыцця былі сыны ***Вася*** і ***Валодзя***, іх вучоба, уладкаванне, іх дзеці і сем'і. Асабліва ўнукі. Яна нудзілася за ўнукаў, мо, болей, чым за сваіх дзяцей. У мае прыезды на вёску да бацькоў цётка неяк сцішана, амаль саромеючыся, прасіла: «Васька, ты ж памажы там, мо, як Васінай Наташы...» А пасля прасіла за ўнука Толю, перажывала за малодшых Валодзевых унукаў.

Яе клопат аб дзецях меў адбітак незвычайнай шчымлівай самаадданасці. У маёй памяці выпадак, калі цётка была ў такой роспачы, што ўсім нам хацелася заплакаць ад жалю. Недзе ў сярэдзіне шасцідзясятых у магазінах з'явіліся зімовыя шапкі з трусінай футры. Попыт на іх стаўся неверагодны. Вясковыя жанчыны выстойвалі за імі неймаверныя чэргі ў Клецку і Нясвіжы. Лаўчэйшыя даставалі шапкі, як казалі, па блату, з-пад прылаўка. Адным словам, хто як мог. Намучылася і цётка Ядзя, але купіла футравую зімоўку свайму Васю, які быў, па-мойму, ужо ў восьмым ці дзявятым класе. Якраз надарылася ў школе навагодняя вечарына, куды Вася надзеў новую шапку. Павесіў на кручок у гардэробнай, а народу навалілася адусюль процьма: і старэйшыя з калгаса, і п'янаватыя, і зухаватыя, і незнаёмыя – якіх хочаш тады хапала, а тут на відавоку такая здатная шапка вісіць. Вядома, яе скралі ў агульнай мітусні.

Яшчэ прыцемкам, з самага рання, цётка прыбегла к нам з крыўдай і жалем. Голас яе дрыжэў, яна плакала, месцамі



Цётка Ядзя. Снежань 2002 г.

нават зрывалася на роспачны крык.

– Эта ж гляньце, што нарабілася! Якія ж гадасці, га! Новую шапку ў хлопца ўкралі ўчора на танцах... З голаю галавою дадому прышоў... За што ж такое наказанне?! Каб вас карбунка пабрала, гадасці такія...

Як маглі, бацька і маці супакойвалі і шкадавалі цётку Ядзю. Добра ведалі, чаго ёй каштавала гэтая шапка: і грошай сабраць, і купіць. Бацька казаў, што трэба заяўляць у міліцыю, але паступова роспач адступіла, засталіся толькі горкая крыўда ды прыкрасць на сэрцы ад бездапаможнасці. Колькі гэтых крыўдаў у сялянскім жыцці?!

Цётка Ядзя заўчасна памерла. У яе было слабае сэрца, падарванае хваробай валляка – так называлі на вёсцы шчытападобную залозу. Узімку 2003-га яна ў сваёй хаце памыла бялізну, упарылася. Выйшла на двор развесіць перамытае і захапіла прастуду. Пачалося запаленне лёгкіх. Самыя моцныя антыбіётыкі не дапамаглі. Я наведаўся да цёткі ў раённую бальніцу мо за тыдзень да яе смерці, прывёз прафесара Аляксандра Макарэвіча агледзець яе стан. Былі сыны,



Дваюрадныя браты. Анатоль Драгавец (злева) і Валодзя Гадун, малодшы сын цёткі Ядзі. 2000 г.

Вася і Валодзя, нявестка Іра. Цётка гаварыла нам, цяжка дыхаючы:

– Я, дзеткі, ня выжыву. Слабая, не магу ўжэ падняцца. А вы жывіце паміж сабою дружна, паддзержвайце адзін аднаго і Валодзю не забывайце...

У нас па тварах каціліся слёзы, а зрабіць мы нічога не маглі...

Мінуліся гады. Ужо цётчыны ўнукі, Васіны дзеці – Наташа і Толік, і Валодзевы – Таня і Сяргей, маюць свае сем'і, дзяцей – яе праўнукаў. Ніхто не збіўся з дарогі, ні сыны, ні ўнукі. Усе людзі талковыя, рупныя і сціплыя ў сваім жыцці. Вася скончыў сельгастэхнікум у Ляхавічах, быў шмат гадоў брыгадзірам у сваім калгасе. Зараз жыве ў Аношках на цэнтральнай сядзібе калгаса (акцыянернага таварыства) «Новае жыццё», кіламетрах у трох ад нашых Хадатавічаў. Акуратны гаспадар і спагадлівы да людзей, ён яшчэ мае тонкую душэўную чуллівасць. Добра разумее і цэніць нашу мову, гісторыю свайго роду, любіць наш край. Не забудуся, як цудоўна ён сказаў пра вёску на пяцідзесяцігадовых угодках Васіля, мужа Фані Сяргеевай, нашай дваюраднай цёткі:

– Хадатавічы, наша вёсачка, прытулілася тут між пагоркаў, як дзіця ў калысцы. Усіх яна нас узрасціла, дала сілы, паставіла на ногі...

...Гэтыя радкі пра Васю, свайго стрыечнага брата, я напісаў раней, пры першых занатоўках, калі толькі задумвалася кніжка. Перачытваю іх зараз у апошняй рэдакцыі, і сэрца заходзіцца ад жалю. Перад вачыма цьмяны восенькі вечар, 24 кастрычніка 2012 года, серада. Толькі што перагаварылі з братам пра вяселле яго дачкі, маёй пляменніцы Вольгі, якое мелася адбыцца ў суботу 27-га. А гадзіны праз дзве, толькі сабраўся да ночы, нечаканы званок ад Толі, Васінага сына.

– Памёр бацька, во, толькі маці пазваніла...



Вася прылёг на ложак, закрыў вочы і больш не адкрыў. Спынілася сэрца; яно ў яго перанесла шмат болю і страт. Цяжка перажыў заўчасную смерць бацькоў, былі няпростыя аперацыі, калі пакалечыў бервяном нагу на піларараме... Ён, увогуле, перажываў за ўсё, браў да сэрца. На вячэры пра Васю казалі, што такога добразычлівага, уважлівага чалавека цяжка знайсці ў нашым жыцці. Гэта цудоўны вобраз сапраўднага беларуса – разумнага, тонкага, чуллівага да людзей і прыроды, да нашага краю. Ды што зробіш, як ні прыкра, але адтуль не варочаюцца...

Валодзя, малодшы сын цёткі Ядзі, у Мінску, каторы год на заводзе халадзільнікаў «Атлант». Сціплы і прыстойны чалавек, адказны ў рабоце і ў жыцці.

То мае дваюрадныя браты па бацькавай руцэ.

З траюрадных – радні шмат, многіх адно толькі ведаю па радаводу, а так і не бачыліся аніразу. Гэта дзеці бацькавых дваюрадных сясцёр: Ніны ў Жылічах, Мані з Арды, Тані з Салаўёў; дачок дзядзькі Сяргея – Сашы з Аношак, Мані з Коханавічаў, яго сына Толі з Мінска; дачок цёткі Волькі Грудзінавай, а таксама цёткі Анці. Пра некаторых я ўпамінаў.

Мужчын сярод бацькавых дваюрадных пры яго жыцці засталося двое. Міша Анцін (Каўшэль) жыў з сям'ёй у вёсцы. Жылі яны, цётка Надзя, сыны Мішка і Коля, амаль што па-суседску, недалёкімі хатамі, таму і бачыліся штодня, гасцявалі на вяселлях і радзінах, цікавіліся справамі.

Другі бацькаў стрыечны брат ***Толя Сяргееў*** (сын дзеда Сяргея), з жонкай і дзецьмі, Святланай і Сашам, уладкаваўся ў Мінску слесарам-наладчыкам станкоў на падшыпнікавым заводзе. Ён маладзейшы за бацьку гады на чатыры. Спраўна, некалькі разоў у год, па святах, наведваўся з Мінска да дзеда Сяргея на вёску і заўжды завітваў на наш двор. Чарнявы, стройны, прыгожы тварам, ён вельмі любіў пабачыцца з нашымі. Маці накрывала на стол, даставала бутэлечку самагонкі, пачыналася шчырая сардэчная бяседа не на хвіліну, а на цэлыя гадзіны...

...Усё гэта ў мінулым, растварылася ў смузе зніклых дзянёчкаў. І так шкада тых сустрэч, якія так добра помняцца мне малому. Асабліва адна з іх на Першамай, пад белым квеценем вішань і сліў на нашым надворку. Дзядзька Толя вясёлы, у кашулі з закасанымі рукавамі, з маленькай дачкой Светай, далікатна, па-гарадскому адзетай, вітаецца

з бацькам: «Здароў, Коля! Даўно ня быў у вас...» Яны стаяць побач, гавораць і гавораць – маладыя, падцятыя, прыгожыя і моцныя. Як бы многа я аддаў за тое, каб вярнуцца, каб убачыць зноў іх такімі, а сябе малым, цікаўным і сарамлівым, як тады...

Дзядзька Толя памёр гадоў мо сем назад. Дзеці, Света і Саша, даўно дарослыя людзі. Саша многія гады працуе на «Гарызонце», сціплы і акуратны, як бацька. Прозвішча ў іх нашае – Драгавец. Больш і няма ў сталіцы людзей з такім прозвішчам.

Яшчэ часта да нас завітвала то пяшком, то на ровары дачка дзеда Сяргея, цётка Маня з Коханавічаў, дзе яна была замужам за Міцем Змітрыкавым. Вясёлая, добрая і вельмі прыязная жанчына. Вялікая працаўніца. Рана засталася без Міці, але падняла дзяцей. Дачка Саша жыве ў Мінску, скончыла факультэт журналістыкі БДУ, з мужам Мікалаем Бажко займаюцца выдавецкай дзейнасцю. Прыстойныя і сумленныя людзі.

Другая дачка дзеда Сяргея Саша пайшла замуж у Аношкі за Юрка, разумнага і талковага гаспадара. Яны доўгі час трымалі дзяржаўную краму – я згадваў пра гэта раней. Юрак часцяком наведваўся да нашых у Хадатавічы нядзельнымі днямі. Прысаджваліся на лавачку каля плоту, вялі нетаропкую бяседу. Прыемная ва ўсіх адносінах сям'я. Ды таксама нікога з іх няма на зямлі.

Яшчэ бліжэйшая да бацькі яго дваюрадная і самая малодшая ў сям'і дзеда Сяргея дачка – Фаня. Наша жыццё прайшло побач. Яна і мужык яе Васіль праведвалі нашых састарэлых бацькоў, за што мы з братам ім вельмі ўдзячны. Фаня старэйшая за мяне гадоў на дзесяць. Нейкі час пасля дзесяцігодкі рабіла ў бібліятэцы ў нашай Казлоўскай школе. Адкладвала для мяне цікавыя кніжкі, давала іх дадому, каб мог прачытаць, бо дадому браць не дазвалялі. Фаня цудоўна спявала маладзейшай, спявае яшчэ і зараз. На сяле толькі і гаварылі: «От, калі Фаня Другаўцова заспявае, то можна паслухаць, не тое, што другія...» Голас моцны, сапраўды народны. Каб вучылася яна музыцы і спевам, то, без сумнення, стала б слыннай і вядомай спявачкай. На саракавінах з дня смерці нашай маці, што прайшлі 8 лютага 2014 года ў Аношкаўскай сталоўцы, Фаня праспявала некалькі самотных і жаласлівых песень. Сардэчнае ёй дзякуй,

што клапацілася і начавала шмат дзён з нашай немагушчай ужо матуляй у яе апошнія дні і месяцы.

На самым пачатку вясковай вуліцы, дзе даматканаўская дарога стромка спускаецца ўніз ад пясчанага ўзгорка з могілкамі, стаіць добра адбудаваны пляц Івана Грудзінавага. За Івана пайшла некалі замуж родная сястра дзеда Васіля Волька. На яе так і казалі пасля – Волька Грудзінава. Іван Грудзіна быў цікавы чалавек. У першую вайну з немцамі – на перадавой, даслужыўся да малодшага унцера. Калі зачалася расійская смута, трапіў у рэвалюцыйны Петраград, слухаў на мітынгах Леніна, потым неяк выкараскаўся з гэтай ператрухі, вярнуўся дадому. Ажаніўся на Вольцы, адкрыў сваю невялічкую краму, таргаваў запалкамі, соллю, газай, паркалём, іншымі неабходнымі ў гаспадарцы рэчамі. Абжыліся, былі на сяле моцнай сям'ёй.

Мне ён помніцца даволі пажылым, з катарактай на вачах, амаль сляпым. Прыпыніліся неяк з бацькам каля іх плоту, зайшла гаворка пра палітыку. Дзядзька Іван вымавіў: «Ды што яны ўсё пра Леніна! Бачыў я этага Леніна, яго немцы ў вагоне ў Расею прывязлі, каб ён рэвалюцыю тут зрабіў. Паганцы, адно слова...» Мяне да сэрца ўразілі гэтыя словы. Кепскае пра Леніна я пачуў упершыню. Толькі прынялі ў піянеры, штодня чырвоны гальштук, Ленін – нешта незвычайнае, спасланае людзям з нябёсаў, і раптам... Словы дзядзькі Івана суправаджалі мяне доўгі час. Можа, нават сталі пажыццёвым вечным рухавіком, які не даваў супакоіцца розуму і патрабаваў несупыннага пошуку адказаў на многія далікатныя, калі можна так сказаць, пытанні нашага жыцця.

У Івана і Волькі былі тры дачкі, бацькавы дваюрадныя сёстры. ***Маня*** пайшла замуж за Мікалая Драчана, жыла ў Нясвіжы, ***Валя*** ў Міцькавічах. ***Зоня***, самая малодшая, засталася з бацькамі ў Хадатавічах, доўга не выходзіла замуж, а потым прыняла да сябе ў прымы Антона Бельчыка, здаецца, таксама з Міцькавічаў. Удваіх яны і павялі гаспадарку пасля смерці бацькоў. Зацятыя да працы, з рання да ночы ў рабоце: днём у калгасе, да дня і вечарам на сваіх вялікіх сотках, у сваім здатным садзе. Ды так і пражылі ўдваіх, бо не сталася дзяцей.

Цётку Зоню я сфатаграфаваў на памяць ў жніўні 2009 года. З дачкой Машай мы зайшлі да яе, ідучы на бацькаву магілу.



Цётка Зоня Грудзінава. 2009 г.

Ужо потым, у Мінску, углядаючыся ў фотаздымак, са здзіўленнем зазначыў для сябе, што цётка вельмі падобна да бацькі – нос, бровы, падбародак. Раней мне так не здавалася, ці мо проста не кідалася ў вочы.

Хат праз пяць уверх ад Грудзінавых, за Колі Грышкавага пляцам, пабудовы Мішы Анцінага. Дзядзька Міша (***Каўшэль Міхаіл Васільевіч***) з жонкай ***Надзяй*** (*у дзявоцтве Драгавец*) прыходзіліся нам «раднёй з дзвюх рук», як казалі ў сям'і. Ён – дваюрадны бацьку, а Надзя – траюрадная маці і ў радні бацьку. А яшчэ, калі нарадзіліся ў сем'ях дзеці, то нашага бацьку дзядзька Міша запрасіў быць хросным у сыноў Мішкі і Колі, а нашыя, у сваю чаргу, папрасілі цётку Надзю быць хроснай маці ў мяне і ў брата Толі. «Палепляно невядома як у нас з Мішавымі. Радня на радню мы з імі, не развязаць...» – казалі паміж сабою бацькі.

Дзядзька Міша і цётка Надзя пажанілася за немцамі 21 лютага 1944 года. Пажаніліся, бо йшла бяда: немцы забіралі дзяўчат у Германію, а сямейных не чапалі. Многія маладыя, што дружылі, хутчэй распісваліся, каб уратавацца ад няволі. Як і ўсё ў немцаў, рэгістрацыя праходзіла па строга азначаных правілах. У Нясвіжы пры падачы заявы доктар загадаў ім поўнасцю раздзецца і паасобку агледзеў маладых. Потым запатрабаваў, каб яны таксама кожны ўважліва паглядзелі адзін на аднаго голыя. І два тыдні на роздум: ці мала яшчэ якія думкі з'явяцца ў хлопца і дзеўчыны пасля такіх агледзін... Можа, й жаніцца расхочуць... Орднунг ёсць орднунг... Але рэгістрацыя адбылася. Мікалай Міхайлавіч Каўшэль, сын, хавае ў сваім архіве гэтае пасведчанне, выдадзенае акупацыйнымі ўладамі. Цікавы гістарычны факт і, вядома, сам дакумент.



Цётка Надзя, мая хросная маці, і дзядзька Міша з унукам Паўлам. 1979 г.

Мішавы, як па-вясковаму звалі іх селішча, мясціліся недалёка, таму і засталіся для мяне памятлівымі з маленства. Я ўпамінаў, як хадзіў па вуліцы дзядзька Міша,

Даведка аб шлюбе Міхаіла Каўшаля і Надзі Драгавец за немцамі



Metrykalny Urad
u Nraswiry
„21" lutaha 1944
Nr. 43

DAVIEDKA

Śćvierdžajecca, što lutaha dnia 21 1944 h.
zarehistravana šlub:
Hram. Kowšel Michas nacyjanal. biełarus
vieravyznańnie prawasłaunyj Chadatawicach 10.XI.1925
cyvilny stan kawaler
z hram. Drahawiec Nadzia nacyjanal. biełarus
vieravyznańnie prawasłaunaja narodž. Chadatawicach II 1925
cyv. stan obiancyona
Pieraškodaŭ da vykanańnia relibijnaha abradu šlubu nie spatykajecca.

Vorsteher des Standesamts
Адказны Metrykalnaha Uradu
Адказны Metrykalnaha Uradu

21 9



Отдел ЗАГС в Несвиже
21 февраля 1944 г.
№ 43

СПРАВКА

Настоящим подтверждается, что февраля месяца 21 дня 1944 г.зарегистрирован брак гражданина КОВШЕЛЯ Михаила, национальность белорус, вероисповедание: православное, родившегося в дер. Ходатовичи 10.XI.1923 г., семейное положение: холостой,

с гражданкой ДРАГАВЕЦ Надеждой, национальность белоруска, вероисповедание: православная, родившаяся в Ходатовичах I I. 1925 г., семейное положение: незамужем.

Препятствий для исполнения религиозного обряда не имеется.

Ответственный работник отдела ЗАГС /подпись/

Текст Справки с белорусского языка на русский переведён переводчиком Лучицем-Федорцом Иваном Ивановичем.

(Лучиц-Федорец Иван Иванович)

нібыта спартовец. Такім ён быў і ў жыцці. У пастаянным руху, у бясконцых справах, заўжды некуды спяшаючыся. Прыцемкамі зачыняў у хляве дзверы за кароваю і да дня, гэта значыць да ўзыходу сонца, зноў на нагах. Першым у сяле асвоіў пчалярства, меў вуллі, добры сад, соткі.

...У памяці сонечная ліпеньская выхадная нядзеля. Я забягаю да Мішавых хлопцаў, Колі і Мішкі, і першы раз бачу,

як дзядзька Міша ў каптуры і са смалакурняй у руках, а недалёка ад яго і цётка Надзя дастаюць з вулляў рамкі, аблепленыя пчоламі. Згледзеўшы мяне, цётка Надзя адразае акраец цёплых залацістых сотаў, кладзе на скібу белага хлеба і частуе. Як смачна! Мёд пахне травамі, лесам, лугам і салодкі, як нішто на свеце. Для мяне то першы ў жыцці мядовы смак на губах. Аніразу дагэтуль мёд не каштаваў. На гады адлажылася гэтае частаванне ад хроснай маці...



Коля Мішаў, зараз вядомы доктар Мікалай Міхайлавіч Каўшэль, з жонкай Ірынай. 2014 г.

А яшчэ добра помніцца, як дзядзька Міша расказваў розныя эпізоды свайго жыцця. Франтавыя, як казалі на франтавікоў на вёсцы, абавязкова гаварылі пра вайну, фронт і тое цуда, як ім удалося выжыць. Дзядзька Міша расказваў найцікавей за іншых. Ён меў на гэта адмысловы талент. Яго споведы нагадвалі тэатральную пастаноўку. Рукі, твар, нос, губы – усё прыходзіла ў рух, да гэтага яшчэ дабаўляліся непараўнальныя галасавыя інтанацыі, і ўрэшце перад вачыма слухачоў паўставала карціна, поўная хвалюючай рэчаіснасці.

– Пад Данцыгам, помню, цішына, немцаў ня відно, нашы йдуць валам, салдаты, цехніка. Усё, думаем, прарвалі фронт, мора ўжэ ўгледзелі... А немяц раптам з мора як лупянуў з арудзій, з караблёў! Ды не спыняецца, а лупіць і лупіць... То што там рабілася ў нас! Коні, вазы, салдаты, машыны – усё перавернута, гарыць, крыкі, раненыя, забітыя, ніхто не ведае, куды бегчы і дзе ратавацца... От, даў нам тагды немяц, так даў, што не маглі апомніцца, драпалі хто куды...



Дзядзька Міша Анцін (Каўшэль Міхаіл Васільевіч) у Германіі, 1946 г.

– Я дык у некі хлеў заскочыў, а ў іх хлявы цагляныя, харошыя, ні тое, што нашы гнілыя з сасонак. А там свіней немка карміла... То як лупянулі, так яна і ўпала

са страху ў сена. Так і я з ёю ў сена ляпнуўся, дый ляжым удваіх, адно вачыма лыпаем...

Гэты Данцыг з тых дзядзькавых успамінаў засеў у маёй памяці і не аднойчы прыпамінаўся пасля, асабліва, калі чыталіся якія мемуары савецкіх ваеначальнікаў ці калі чулася што пра гісторыю гэтага знакамітага горада, зараз польскага Гданьску.

Разам з дзядзькам Мішам і цёткай Надзяй, іх дзецьмі Колем і Мішкам прайшло маё дзяцінства, мае самыя непаўторныя дзянькі. Мішка быў старэйшы за нас, пасля школы з'ехаў у Мінск, уладкаваўся на завод імя Кірава токарам, стаў здатным спецыялістам. Працаваў там да самай перабудовы, пакуль трымаўся гэты знакаміты завод. Заўчасна памёр у 2011 годзе.

Коля вывучыўся на доктара-афтальмолага, займеў павагу і аўтарытэт, абараніў дысертацыю. Зараз галоўны ўрач паліклінікі Мінскага трактарнага завода. А ў мяне ў памяці, калі думаю пра наша сумеснае жыццё, адна фотакартка. Гэта, мабыць, адзін з найдаражэйшых экспанатаў у маім асабістым архіве.

...1957 год. Вясна. У сям'і Мішы Анцінага радзіны. Блізкія і радня сабраліся з нагоды з'яўлення на свет другога сына Колі. Пасядзелі за сталамі, выпілі, закусілі, выйшлі на вуліцу. А тут на ровары едзе праз вёску Вася Мядзвецкі, вядомы на ўсю акругу фатограф. Ён часцяком кіраваўся гэтым маршрутам, бо, казалі, недзе ў Мацылёўшчыне жыла яго радня.

«Стой, Вася, зайдзі ў хату, выпі чарку гарэлкі», – прыпынілі яго мужчыны. У той час на сяле чалавек з фотаапаратам – госць каштоўны. Ну а пасля як не сфатаграфавацца?! Выстраіліся па Васінай камандзе каля плоту. А ён прыладжваў трыногу, прыкручваў на яе камеру – майстар таемнай справы, важны чалавек... Тут адной чаркай не абыдзешся... Ды чакаць было не мулка. Ужо і настрой зладзіўся пасля першага заходу за радзінны стол. Але вось прыліп нарэшце Вася да сваёй трафейнай лейкі, закрычаў: «Сталі! Зараз птушка выскачыць, глядзіце!»

Хто з дасведчаных, а гэта франтавікі, якія спазналі ў Германіі падобныя прылады, усміхнуліся, бацька наш нават галаву ў бок скрывіў ад пацехі, бо дзюбнуў трохі самагоначкі. Іншыя, як дзед Сяргей, хто засяродзіўся, птушку чакаючы, хто проста весела глядзіць на фатографа Васю Мядзвецкага...



...Якая спагада, што рашыўся праехаць тады, вясновай суботай 1957 года, праз нашыя Хадатавічы Вася Мядзвецкі. Як цудоўна, што ён увогуле быў на свеце – гэты Вася! Праз дзясятак гадоў я стрэнуся з ім у рэдакцыі нясвіжскай раённай газеты «Чырвоны сцяг», дзе Вася Мядзвецкі будзе яшчэ доўга фотакарэспандэнтам. На рэдакцыйным «газіку» мы пабываем на фермах, на палях, у калгасных канторах, каля трактарыстаў. Будзем разам піць «чарніла» у нясвіжскай сталоўцы і слухаць яго красамоўныя споведы пра розныя прыгоды.

Але тады ў Хадатавічах я нічога аб гэтым не ведаў, а толькі дзівіўся з трохі цыганскага Васінага выгляду, з яго смуглага твару і пышнай, чорнай, як смала, шавялюры. Тая фатаграфія, што ён зрабіў на Коліных радзінах, адзіны адбітак нашага хадатаўскага радаводу. На ім увасобіўся далёкі, даўно перажыты час, вобразы і твары блізкіх, дарагіх мне людзей. Яны толькі адолелі вайну, толькі ўздыхнулі на поўныя грудзі. Яшчэ маладыя, моцныя, у сваіх лепшых гадах. Прыгледзімся да іх, як раяць нам у газетах, злева направа...

...Першая з левага боку Маня Сяргеева з Коханавічаў, бацькава дваюрадная сястра, яна ў надзеі на дзіця. Аб тым, што гэта будзе дачка Саша, яшчэ зусім невядома. Далей яе маці, баба Мар'я Сяргеева. На ўсіх здымках, што

захаваліся, яна ў хусцінцы, паркалёвым пінжаку-кофце, чаравіках са шнуркамі – так на вёсцы звычайна адзяваліся ў святы старэйшыя жанчыны. Каля яе за спіною дзед Сяргей. Наперадзе Міця Змітрыкаў, Манін муж, іх зяць. Далей Вася Пасацкі з Малаедаў, дваюрадны брат маці. Зоня Грудзінава і Антон Бельчык. Яна адзета па той модзе: туфелькі з белымі шкарпэткамі. Ззаду, паміж імі, Коля Андрэеў, муж бацькавай роднай сястры. А вось і бацька: галаву схіліў набок, чорныя густыя валасы захіснуты назад, гарэза на твары. Побач Ядзя, сястра, хударлявая і прытомленая, рукі на плечуках малога Васі. Вышэйшы хлапчук – Мішка Мішаў. За ім я, пастрыжаны нагола, як і ўсе трое хлапчукоў на здымку, падцяў левую руку ў кулак, стромка пазіраю ў аб'ектыў. За Мішкам – Маня, жонка Васі Пасацкага, каля яе наша маці, а за ёй настаўніца Валянціна Паклонская...

Углядаюся ў твары, у постаці. Нашчадкі ліцвінаў, што вытрывалі, выжылі, выстаялі ў гістарычных віхурах. А прыгледзішся – колькі адкрытасці, спакою, унутранай самадастатковасці. Мужчыны – то нібы і не сяляне, а сталыя гаспадары ў ліцвінскіх маёнтках ці фальварках. Жанчыны – то прыгожыя і дамавітыя, неабыякавыя да жыцця, з упэўненасцю і надзеяй на лепшае ў вачах. А маленькі Коля, з нагоды якога сабралася радня, вядомы зараз доктар, ляжыць недзе ў хаце ў калысцы і не ведае пра тое, што робіцца на вуліцы. Няма на фотакартцы дзядзькі Мішы і цёткі Надзі. Відаць, мітусяцца дзе ля сталоў ці мо пабеглі з вёдрамі да жывёліны, пакуль людзі забаўляюцца на вуліцы...



Цётка Маня (справа налева) дзядзька Антон, у шынялку, Паша, муж цёткі Мані. Здымак 1954-1955 гг.

Матчын бок

Паставіў кропку ў сваім сказе пра хадатаўскі бацькаў радавод, а сам думаю, што не ўсіх упамянуў, шмат каго назваў толькі ў пераліку па прозвішчу ды па месцу жыхарства. Так атрымліваецца, бо тыя з родных, хто параскідаліся па суседніх сёлах, само сабою аддаліліся. Бачыліся мы з імі зрэдку. Так і з матчынай раднёй. Не магу абысці нікога. Ды зноў жа першымі прыпамінаюцца і паўстаюць у думках тыя, каго добра ведаў, пры кім прайшло маленства, з кім бачыліся ці не штодня. Гэта яе браты і сястра — мае родныя дзядзькі і цётка з матчынага боку.

У бабы Волькі і дзеда Антося ў Малаедах было пяцёра дзяцей. Самы старэйшы Вечык (1925 г.н.), потым Зіна, наша маці (1928), пасля Антон (1931), Марыя і Лёнік (1936, 1944). То сям'я, якой яна і павінна быць па тым часе. З адным-двума дзеткамі на сваёй уласніцкай зямельцы не пражывеш, загадзя «аддасі Богу душу» — тут рукі да рук трэба скласці ды перамножыць, каб справіцца, здабыць хлеба на пражытак. У роднай кагорце ўсё лепей: і еднасць, і пранікнёнасць у справы, і душэўныя хваляванні адзін за другога. Маці казала: «У нашых нам лепей было. А ў іх там, у Хадатавічах, так Коля адзін на ўсю гаспадарку. Ядзя, сястра, то дзеўчынка ж зусім...»

Што ні кажы, а родныя бліжэй між сабою, чым стрыечныя. Разам цвярдзей ды больш пэўна стаяць ім на зямлі. Прыхільнасць, зладжаная пасярод дзяцей у малаедаўскай хаце пад бацькоўскім крылом, з гадамі не траціласа, не сціралася, хоць і павыляталі ўсе з гнязда. Не магу сцвярджаць, што дзядзькі і цётка часта завітваліся да нас у Хадатавічы – у кожнага былі свае справы, хоць жылі недалёка ад нас, праўда, у розных мясцінах. Але ж гэта быў блізкі круг, таму пры ўсякай нагодзе стараліся пабачыцца, забегчы хоць на хвілю ды абмовіцца слоўцам.

Мо часцей наведвалася да нас родная матчына сястра цётка ***Маня***. Па святах і ў нядзельныя дні дык абавязкова: прыязджалі з мужам Мікалаем на легкавушцы, на сінім савецкім «Масквічы». Яна жыла бліжэй за іншых, спачатку ў Малаедах, пасля ў Гарадзеі. Жыццё не было спагадлівым да цёткі Мані. Маладой і прыгожай яна закахалася ў вясковага гарманіста Пашу Зэлікавага. Паша, скуласты, плячысты, з шырокай белазубай усмешкай, быў нарасхват сярод навакольных дзяўчат. Асабліва, калі браў у рукі акардыён і разводзіў мяхі. Атрымлівалася спраўна. Кожную суботу ці нядзелю Паша іграў дзе-небудзь на танцах ці вяселлях.

Вясковая моладзь у тыя часы не ведала тэлевізараў і мексіканскіх серыялаў; не было ў паміне клубаў і дамоў культуры. Напрыканцы выхадных старэйшыя хлопцы збіраліся кучкаю і выносілі на суд прапанову: надышла пара нашаму сялу рабіць танцы. Бо мінулым святам гулялі ў Даматканавічах, яшчэ раней у Гусаках, трэба і самім справіць гулянкі, каб не было няёмка перад суседзямі. Скідваліся ў шапку па рублю, выбіралі ганцоў, якія садзіліся на ровары і ехалі наймаць музыкаў. Музыкі – гарманіст і барабаншчык. На вяселлі наймалі большыя спайкі. У Малаедах каля бабы Волькі жылі кустом у некалькі хат родныя браты Шантэркі. Дык яны спаркавалі з радні цэлы ансамбль, амаль што джаз-бэнд па-цяперашняму. Былі, акрамя акардэона і барабана, некалькі труб, скрыпка. «Ажно плакаць хочацца, як зайграюць», – казалі жанчыны.

Ніхто з вясковых музыкантаў нідзе не вучыўся. Свайму майстэрству яны звычайна вастрыліся ў такіх жа вясковых умельцаў, самавукаў. Бо былі здатныя да музыкі і прагу мелі да яе. Такіх талентаў ды майстроў «на ўсе лады» сярод сялянскай моладзі было шмат. Музыкі ж лічыліся за эліту. Іх добра ведалі

ў наваколлі. Яны заўжды былі пры грашах, хай сабе і невялікіх, але ж не з пустой кішэняй. На танцах, а гэта было абавязковым падтэкстам любога найму, музыкаў кармілі і, канешне ж, налівалі гарэлачкі, каб мелі настрой ды добра гралі. У каго былі «слабыя тармазы», як казаў бацька, то ўцягваліся, прывыкалі да такой бесклапотнай і смачнай жытухі. «Эта ж не за плугам хадзіць, сеў сабе на лавачцы ды рыпай на гармоніку...»



Цётка Маня з сынам Віктарам

Прывабіўся да гарэлкі і Пашка Зэлікаў. А як свяцілася шчасцем цётка Маня ў свае першыя гады замужніцтва! Мне помняцца іх твары, калі яны завіталі ў бабіну хату з сакавіцкага веснавога прымаразку: сонечныя, бадзёрыя ды натхнёныя. Але неўпрыкмет на змену ўзаемнай радасці падышлі непаразуменне і смутак. Былі ўжо дзеці, Толік і Віця, здольныя і таленавітыя. Ды не зладзілася сям'я. Разышлася цётка Маня з Пашам, пакаціліся дзеці самі па сабе. Праз колькі гадоў пайшла замуж за Колю Крупца з Гарадзеі. Спакойны, працавіты чалавек, даражыў ёю, бо Маня была віднай жанчынай. Жылі яны добра, але і тут умяшалася гарэлка. Коля рабіў трактарыстам у хіматрадзе, апрыскваў калгасныя пасевы рознымі ядамі. Пасля работы, па яго словах, галава, як бубен, нічога не варыць, надыхаешся гэтай гадасці за цэлы дзень да дурноты. Калі не выпіць, то здурэць можна. Так і ён зацягнуўся ў выпіўку. Заўчасна памёр, маладым, не дажыўшы нават да сямідзесяці. А перад тым разбіўся насмерць цётчын сын Толік. Ён застаўся пасля арміі ў Калінінградзе, там прыжаніўся, працаваў таксістам. Мчаўся пасля змены дадому, улабавую сутыкнуўся з грузавіком...

Цётчын лёс – тыповы прыклад таго, пра што людзі кажуць: «Як пачнецца, так і скончыцца...» Каб не развалілася ў яе сям'я, каб засталіся разам з Пашам-музыкантам, інакш бы пайшло жыццё ў іх саміх, у дзяцей. Каб, каб, каб...

...На нашым з Галяй вяселлі на другі дзень, калі ўсе – і сваякі, і суседзі, і моладзь – добра выспаліся, хто на сенавале ў хляве, хто на пярыне ў каго з радні, хто на падлозе ў прыяцельскіх хатах, і зноўку, весела гамонячы пра



Дзядзька Вечык у Германіі пасля Перамогі. 1945 г.

ўчарашнія прыгоды, сабраліся за вясельны стол, то частаванне пачалося нечакана. Жанчыны хуценька разнеслі па талерачках гарачыя, тонкія, як папера, залаціста-сонечныя аладачкі. Яны дыміліся ў растопленым, дамашнім ад кароўкі масельцы і, здавалася, самі імкнуліся на язык. Гэта было такім нечаканым, дзівосным сюрпрызам, пра які і зараз мне калі-нікалі ўзгадваюць сябры: «От, паўтарыць бы тое, Мікалаевіч!»

За аладачкамі ад рання ўвіхалася цётка Маня. Дзівіліся госці, каб столькіх людзей накарміць, а за стол з раніцы прысела чалавек пяцьдзясят, ды так спраўна, так смачна зладзіць тыя аладачкі...

Цётка Маня, Марыя, як звала яе маці, памерла марознай зімою 2009 года. Яе пахавалі на гарадзейскіх могілках. Яны добра відаць, калі павернеш з брэсцкай магістралі на Нясвіж. Там жа, у Гарадзеі, жыве малодшы сын цёткі Мані, мой двоюрадны брат Віктар Бутэвіч з жонкай Святланай. Добрая сям'я, прыгожыя, да толку, дзеці. Хай мае ўспаміны будуць данінай павагі цётцы Мані ад блізкіх і спагадлівых яе лёсу родных людзей.

Даўно няма ў жывых і дзядзькі Вечыка з Баранавічаў. Ён, як і наш бацька, з 1925 года, старэйшы з матчыных родных. Я заўжды дзівіўся, чаму яго так называлі – ***Вечык***, бо ў афіцыйных дакументах пісалася ***Шарапа Вячаслаў***

Антонавіч. На рабоце да яго звярталіся Слава, а вось бацькі і радня – Вечык. Такое часта бывала ў моўных звычках на сяле: Леакадзію звалі Лёдзя, Аляксандру – Шурка, Лёню – Лёдзікам... Цягнулася такое, мабыць, з далёкай даўніны, бо я ўпэўнены, што калі нарадзіўся дзядзька, то яго так і назвалі Вечык, а Славай і Вячаславам на расійскі лад яго нараклі, выпісваючы афіцыйныя спраўкі.

Дзядзька Вечык займае асаблівае месца ў жыцці, а дакладней, у выжыванні нашай сям'і. Я ўпамінаў аб гэтым раней. Ён адзіны з матчынай блізкай радні, хто змог падняцца вышэй астатніх па сацыяльнай лесвіцы – як-ніяк, а скончыць тэхнікум, займець хоць і невялічкую, але ж службовую пасаду і вырвацца з вечнага сялянскага палону, ад зямлі і плуга. У 44-м яго, васемнаццацігадовага, як і бацьку, забралі на вайну. Прытым забралі з хаты разам з дзедам Антосем, у адзін дзень – толькі дзеда ў абоз, кіраваць кабылаю, а сына ў парашутна-дэсантную брыгаду асобага прызначэння. Баба Волька ў адзін дзень засталася адна з трыма дзецьмі ў хаце. Уявіць толькі такое, дык дрыжыкі прайм аюць! А яна вытрывала, выжыла, дачакалася і мужа, і сына.

– Як гэта наша матка перажыла эту вайну? Не перастаю думаць усю жызнь... Эта ж я, Антон і Маня засталіся з ею адною ў самую галоту, – не аднойчы ў роспачы спавядалася маці за сямейным сталом.

– Ад жабракоў дзверы не зачыняліся... А яна нікога пустым не адправіла, хоць і самім было як цяжко...

– Ды што надумалася мо праз месяц, як Вечыка і бацьку забралі. Вечыка недзе ў Жабінку пад Брэсцям завязлі перад фронтам. Маці й кажа: ты, Зіна, старэйшая, паедзь з дзяўчатамі, там яшчэ былі нашы малаедаўскія хлопцы, да яго. Я сухароў насушу, сала дам – завязі яму, на пояздзе мо даберацеся. Яны ж там галадаюць...

– От, не панімала матка! Мы пакуль даехалі да этай Жабінкі на эшалонах з салдатнёю, то ў нас з мяшкоў галодныя салдацікі ўсе сухары павыцягвалі. Дзіркі парабілі ножыкамі, мы й ня чулі. Нек знайшлі там Вечыка ў часці, а мяшок ужэ пусты. Добра, што жывымі вярнуліся. Эта ж маглі і забіць, і згвалціць... Куды эта ў вайну пускаць дзеўчыну?!.



...і каля райкамаўскага будынку ў Баранавічах. 1960-я

Мне невядомы франтавыя шляхі дзядзькі Вечыка, бо не распытаўся ў свой час. З невялічкіх толькі бацькавых калі-нікалі выказванняў засталося, што пабываў дзядзька ў самых пякельных аперацыях. Іх дэсант у мароз і сцюжу закідвалі ў тыл, начамі па асобаму загаду засылалі на спецаперацыі. Пасля вайны, калі ён на фурманцы, што наняў, сышоўшы з поезда на станцыі Хвоева за Сноўю, заехаў на родны хутар, то ні баба Волька, ні дзед Антось не пазналі сына. З падводы саскочыў волат-красавец, падпяразаны шырокім афіцэрскім рамянём, з-пад пілоткі кучаравіліся шэрыя валасы, а грудзі завешаны ордэнамі і медалямі. Неяк на вясковых танцах Вечык, падвыпіўшы, запатрабаваў прынесці дошку і цвікі. Прылюдна, на спор, палажыў дошку на лаву, прыставіў здаровы цвік і, узмахнуўшы рукою, навылёт прабіў яе цвіком. Сілу і моц ён меў неймаверныя.

Як зараз, бачу яго шырокія крутыя плечы, магутныя рукі, кулакі, падобныя на чыгунныя гіры. Але пры гэтым дзядзька быў надзвычай добры і гумарны чалавек. Вельмі смешна абыходзіўся з дзяўчатамі. Пасля чаркі-другой пачынаў дуркаваць і шчыпаць іх за мяккія месцы. Маці з-за гэтага адчувала сябе няёмка, бо была ўжо, як сама казала, дзеўкаю, хадзіла з братам на моладзевыя вечарыны ці гулянкі.

— Нашыя (*маюцца на ўвазе бацькі*) ні маглі паняць, што з ім зрабілася пасля вайны, — расказвала маці. — Эта ж пойдзем на танцы, так ён усіх дзяўчат перапудзіць. Ніяк ня ўмеў з дзяўчатамі па-далікатнаму. Як ушчыпне катору, так да крыку даходзіць. А мне брыдко перад людзьмі, ні знаю, куды дзявацца. І матка на яго сварылася, і бацька цвічыў...

Дзядзька Вечык асеў у Баранавічах. Так злажыліся абставіны па рабоце. Атрымаў пасаду бухгалтара-рэвізора ў раённым упраўленні сельскай гаспадаркі. На гэтым месцы і пратрымаўся ўсе гады, нават пасля пенсіі яшчэ хадзіў туды. Мясцілася сельгасупраўленне на ніжнім паверсе ў галоўным баранавіцкім будынку — разам з гаркамам партыі і гарадскім саветам дэпутатаў. Калі мы з маці прыязджалі да Вечыка, то яна паказвала мне гэты будынак і гаварыла: «Бачыш, дзе Вечык сядзіць, адно начальства тут...» Пасля такіх слоў шэрыя гмах уяўляўся мне не проста будынкам, а нейкім важнецкім патаемным цэнтрам, куды маюць доступ толькі асобыя, амаль што міфалагічныя людзі. І сярод іх — наш дзядзька Вечык. Ад такіх думак спакайней станавілася на сэрцы, трохі

адступалі напружанасць і адзінота, якія абавязкова спасцігалі мяне ў гэтым чужым і небяспечным горадзе.

А ездзілі мы да дзядзькі часта. Ён жыў за мастом, праз чыгуначныя пуці, у сваім доме з агародам і садзікам. Дом дабротны, някепска ўладжаны і абстаўлены. Пасля нашай хадатаўскай хаціны з чыгунамі і вёдрамі, з глінянаю падлогай на кухні здаваўся мне шыкоўным жытлом, ці не палацам увогуле. Люстры пад столлю, серванты і канапы, паравое ацяпленне з трубамі і батарэямі, некалькі асобных пакояў, чорная вялізная радыёла, тэлевізар – усё гэта выразна адрознівалася ад нашага сціплага вясковага ўбрання. Дзядзька доўгі час не жаніўся, вёў халасцяцкае жыццё, таму маці ці хто іншыя з родных жанчын, калі прыязджалі, то перамывалі яму бялізну, прасавалі кашулі, чысцілі касцюмы, прыбіралі ў доме. За такі клопат Вечык заўсёды дзякаваў, і не толькі на словах. Памагаў родным грашыма, прадуктамі, адзеннем. Маці часта прыпамінала, як адзін раз прывезла дадому кіпу цэлых і зусім новых шкарпэтак, якія дзядзька не меў звычкі мыць, а скідваў у кучу і купляў шторaз новыя. Маці іх перамыла на рэчцы, высушыла і так была задаволена, што надоўга забяспечыла бацьку шкарпэткамі. Як ні дзіўна зараз такое слухаць, а ў той час, пасля ваеннага ліхалецця, нават шкарпэтка была ў радасць. Маці ўмела шыць, таму ў доме нічога не прападала. Падношаныя дзядзькавы паліто, касцюмы, порткі яна перарабляла то ў рабочае адзенне для бацькі, то ў якія дзіцячыя адзежкі для нас з братам.

Завітваў і сам дзядзька ў нашу хадатаўскую хату. Здаралася якая рэвізія ці праверка ў бліжнім к нашаму боку калгасе, то ён выпіша дошак, цвікоў, шыферу, зерня, мукі, як атрымліваецца, і на грузавым «газончыку» закіне к нам. Ведаў, што сястра з сям'ёю не шыкуюць, будуць рады любой помачы. У дзядзькавы прыезды ў хаце бурлілі радасць і ўздым: ён ніколі не прыязджаў з пустымі рукамі, мне і брату перападала на цукеркі, бацькам таксама. Маці хуценька наразала прыхаваную каўбасу, смажыла сала на скаварадзе, пякла яйкі. Вечык даставаў паўлітру «Маскоўскай», і яны з бацькам налівалі па поўнаму гранёнаму стакану. Выпівалі да палавіны першы раз, прыкусвалі, пачыналася размова. Дзядзька гаварыў трохі па-гарадскому, з рускімі словамі, і мне гэта было дзіўнавата, як і яго несялянскі выгляд: туфлі, вясёнка, шалік, капялюш. «Наш Бурміш мяста»,– казалі на яго бацькі, калі ён



Волька, жонка дзядзькі Вечыка, з сынам Алегам

неяк самавіта, па-панскі, адчыняў дзверы аўтамашыны, садзіўся ў кабіну. Адкуль узяўся такі выраз і што ён азначае, можна толькі здагадвацца. Відаць, пайшоў здаля, з часоў, калі бурмістр якога мястэчка ў Княстве Літоўскім завітваў да простага люду ў сваіх багатых уборах ды мажна і самавіта вылазіў з брычкі, чым і ўзбагаціў на вякі бедную на ўражанні сялянскую памяць.

Дзядзька Вечык, як я разумею зараз, быў для нашай сям'і, для сваіх бацькоў, для ўсіх родных моцнай апорай у тым нялёгкім жыцці. Першнаперш у матэрыяльным сэнсе. Але можа важней, хоць таго і не бачна было звонку, што ён сам па сабе ўвасабляў ужо іншы лад жыцця, іншую яго якасць, а значыцца, адкрываў для нас, родных і блізкіх, нейкую новую жыццёвую прастору. Стасункі з дзядзькам Вечыкам нават мяне, хлапчука, вывелі за традыцыйныя граніцы сялянскага самавызначэння. Яго размовы, побыт, гарадскі дом, горад Баранавічы – усё было ў навіну, спрыяла цікавасці і роздуму. Перад вачыма адхінаўся захапляльны і незнаёмы свет. Там, у дзядзькі ў Баранавічах, я ўпершыню патрапіў у гарадскі кінатэатр і быў неверагодна ўзрушаны прагледжаным кінафільмам «Дзеці капітана Гранта». Там жа я са здзіўленнем назіраў, калі мы праходзілі мост над чыгункай па дарозе к дзядзькаваму дому, як унізе коўзаюцца манеўровыя паязды, грукацяць саставы, перагаворваюцца дыспетчары, а дым з паравозных трубаў пахне зусім не так, як з комінаў у нашых Хадатавічах...

Там жа я ўпершыню спужаўся і адчуў горыч крыўды, калі мяне перахапілі ў завулку ля стадыёна гарадскія і вытраслі з карманаў капейкі, што даў дзядзька на марожанае. Гэта таксама быў урок – урок небяспекі, які насцярожыў розум, прымусіў яго думаць і заўжды ўлічваць такую акалічнасць чалавечага існавання.

Пасля гасцявання ў дзядзькі я вяртаўся на вёску з новым разуменнем рэчаіснасці, у якой мы жывём. Гэта давала мне вялікую перавагу перад маімі таварышамі. Толькі зараз я магу зрабіць такую выснову, а раней так не думалася, проста ў нейкіх абставінах – на ўроках, на танцах, у юнацкім хаўрусе і т.д. – я паспяваў хутчэй, разумеў глыбей сітуацыю і дзейнічаў смялей за іншых. За такія здольнасці паважаюць,

прызнаюць лідарам, важаком. Я адчуваў гэта, і не-не, а мільгала ў думках: от, які я здатны ды ўдалы! Вядома ж, здатны, вядома ж, удалы, ды толькі невядома якім быў бы, каб не баранавіцкія адкрыцці...



Дваюрадны брат Алег, старэйшы сын дзядзькі Вечыка, з жонкай Інай і немаўляткам

Яшчэ Баранавічы адбіліся ў памяці вобразам жонкі дзядзькі Вечыка — Вольгі, Олі, як звалі яе сярод радні. Яна шмат чаму паспрыяла ў маім спазнанні свету. Чалавек цікавы, спагадлівы і па-свойму вельмі далікатны. Мела вышэйшую адукацыю, скончыла інстытут у Маскве, працавала тавараведам на гандлёвай базе ў Баранавічах. Неяк у студэнцкі час дзён колькі летам я спачываў у дзядзькі. Цётка старанна мяне даглядала, мы прыемна з ёю гаварылі, яна непакоілася за лёс яшчэ малых сыноў — Алега і Андрэя. Тады я ўпершыню зазначыў для сябе, мо таму, што пасталеў, якая яна разважлівая, добразычлівая і спакойная жанчына. Адчувалася, што ёй не вельмі да спадобы сітуацыя, калі дзядзька на сваёй рэвізорскай рабоце часцяком «прымае за каўнер». Перажывала, што ён шмат курыць і кашляе начамі да нематы, бо і яго здароўе не вечнае. Доўгі час у мяне захоўвалася падараная цёткай Вольгай прыгожая трыкатажная кашуля ў палоску, у якой я фарсіў перад аднакурснікамі.

Жыццё, аднак, бывае вельмі жорсткім да добрых людзей. Гэта толькі апраўданне, калі кажуць, што Усявышні ў першую чаргу забірае на неба самых лепшых. Хай бы яны пажылі, лепшыя, на зямлі, пабылі даўжэй з намі, парадавалі блізкіх і родных. Так думаецца, калі выплываюць з памяці многія дарагія вобразы. І перш-наперш дзядзькі Вечыка і цёткі Волькі. Цётка памерла зусім маладой, не дажыла нават да сарака, у 1980 годзе. Рак — які несправядлівы прысуд лёсу! Хавалі яе спрыяльнай летняй парой, сярод кветак і пахаў, а мы ўсе плакалі.

Дзядзька застаўся з сынамі Алегам і Андрэем, пайшоў на пенсію, больш не жаніўся. Паступова і яго здароў'е пайшло ўніз, бо не мог адракціся ад курава, ад сваіх забойных «Казбека» ды «Беламорканала». Смактаў і смактаў іх адну за другою. Урэшце не вытрывала і яго магутнае цела. Дзядзька Вечык памёр 21 студзеня 1990 г. у баранавіцкай бальніцы



З дваюрадным братам Андрэем, малодшым сынам дзядькі Вечыка

з раку лёгкіх. Яшчэ не ў старыя гады – толькі 65, а завіталася да яго «цётка з касою». Не забудуся, як галасіла перад труною баба Волька, маці, якой на старасці давялося спазнаць такую бяду – пахаваць сына. Якая прыкрая гэта рэч – пахаванне родных, сяброў і наогул людзей: знаёмых і незнаёмых. Ды не абыдзешся, кожнага чакае сваё пахаванне...

Алег, старэйшы сын дзядькі Вечыка, мой дваюрадны брат, назваў сваіх дзяцей, сына і дачку, Славай і Волькай у памяць аб бацьках. Гэта вельмі здатная памяць, бо растуць спраўныя і разумныя дзеці, унукі добрых і спагадлівых людзей.

Сярэднім сярод дзяцей на малаедаўскім хутары быў ***Антон***. Баба Волька звала яго ***Тонік***. На долю Тоніка выпала застацца адзіным мужчынам у сям'і, калі ў 44-м дзеда Антося і старэйшага Вечыка забралі на вайну. Яму было толькі трынаццаць, а на ім гаспадарка і столькі цяжкіх мужчынскіх абавязкаў. Мо адтуль, з той юначай адказнасці, зачаліся яго незвычайная працавітасць і гаспадарская ўвішнасць. Мае першыя адбіткі вобраза дзядзькі Антона звязаны з пачаткам яго шафёрскай прафесіі. Шафёрскую справу дзядзька асвоіў у арміі. Служыў недзе пад Краснаярскам, у лютым холадзе. Дадому вярнуўся падцяты і тонкі, у шэраватым шынялку. Якраз старшыні нашага калгаса выдзелілі з раёна пад'езджаны легкавы «Масквіч». На яго і папрасіўся шафёрам Антон.

...Марозны студзеньскі вечар. На двор заязджае легкавушка. Дзядзька рашыў заначаваць у нас, бо на Малаеды няма дарогі – усё замецена снежнай бурай. Яны з бацькам зліваюць з машыны ваду, каб не замерзла і не парвала матор, а я кручуся каля іх уюном. Такая небыліца – на вёсцы легкавушку ніколі і не бачылі! Забыўся пра свае гулі і пра сваю хеўру, што таўчэцца на вуліцы, зайздросна пазіраючы на наш надворак. А я наўмысна перад імі то адчыняю дзверы і залажу на парэпаныя скураныя сядзенні, то кручу гладкія ручкі і націскаю кнопкі, то варочаю рулявое калясо, то ўключаю і выключаю радыё. Цікава, не адарвацца...

Дарослыя скончылі сваю справу і пайшлі за стол. Пасля чаркі ў хаце пайшла гамонка, паляцеў час. А я вырашыў



Дзядзька Антон падчас службы ў Краснаярску. 1953 г.

начаваць у кабіне. Нарэшце маці схамянулася: дзе ж хлопец, няўжо на вуліцы дагэтуль, ужо і дзеці не крычаць, разышліся...

...У кабіне ціха і загадкава. Толькі зоркі з цёмнай вышыні адсвечваюць вугельчыкамі скрозь заледзянелыя шкельцы. Мне здаецца, што я адзін на ўвесь белы свет. Мароз мацнее. Каб не змерзнуць, я скруціўся ў маленькі камяк. На шыбах легкавушкі паступова нарысаваліся квяцістыя ўзоры. Іх добра відаць у сталёвым бляску поўнага месяца, які вялізным мячыкам павіс на чорным небе...

Бацька з Антонам абышлі надворак, агледзелі вуліцу. У роспачы не ведалі, дзе шукаць падшыванца, ды дзядзька рашыў нечага зазірнуць у кабіну. Там і знайшлі амаль паўжывога, але супраціўляўся, не хацеў вылазіць. Потым, седзячы на печы, калі адыходзілі ад сцюжы прыхопленыя марозам пальцы, ледзь не плакаў.

Перад дзядзькам Антонам у хуткім часе паўстала дылема, якая паўставала перад многімі вясковымі хлопцамі, калі яны вярталіся дадому пасля арміі. Надыходзіў час заводзіць сям'ю, а дзе жыць, куды прывесці суджаную, калі акрамя бацькоўскай пахіленай хаціны з саламянай страхою і хлява з кароваю нічога няма. Няма і капейкі ў кармане, каб абзавесціся ўласным жытлом. На заробкі ў калгасе спадзяванкі не было. Адзіны выхад у беднай вясковай моладзі на той час – застацца на «сверхсрочную» ў арміі, але ж такое не ўсім прапаноўвалі, ці «завербавацца» на работу ў далёкія расійскія вобласці, дзе не хапала працоўных рук. Вярбоўшчыкі соўгаліся па вёсках чародамі, зманьвалі маладых рознымі казкамі пра смачную долю на чужыне. Камсамол даваў пуцёўкі на цаліну, клікалі на шахты ў Данбас, на лесараспрацоўкі ў Карэлію. Дзядзька выбраў Карэлію і з'ехаў туды гады на тры ці болей. Вярнуўся з сякімі-такімі грашыма, бо ўмеў іх зберагчы і не патраціць абы як. Ажаніўся, паставіў хату ў Снове, гарадскім пасёлку недалёка ад Малаедаў. Знайшоў работу шафёрам у ваенным шпіталі, які мясціўся там у былым палацы графа Пацкевіча. Туды ж уладкавалася медсястрою і жонка



Дваюрадны брат Васіль Шарапа (сын дзядзькі Антона) з жонкай Ірынай (справа) і дваюрадны брат Юра (сын дзядзькі Лёні) з жонкай Інай. 2001 г.

Марыя. Разам на адным месцы яны і даслужыліся да пенсіі, абзавяліся спраўнаю гаспадаркай, узрасцілі двух хлопцаў – Васю і Валодзю.

Мы хоць і жылі недалёка ад Снова, але нячаста сустракаліся з дзядзькавай сям'ёю. Бо ўсе былі пры пастаянным клопаце. Дзядзька Антон сярод сваіх родных вызначаўся асаблівай увішнасцю і заўзятасцю ў рабоце. Штодня, задоўга да прыходу ў свой шпіталь, ён паспяваў і накасіцца, і наарацца, і набаранавацца...

Адзін раз мы з маці засталіся на ноч у дзядзькі Антона, вяртаючыся з Баранавічаў. Здаецца, спазніліся на свой аўтобус, купілі білеты на сноўскі, у прыцемках даехалі і рашылі зайсці да дзядзькі на начлег. Раніцай цётка Марыя прыгатавала для мяне невядомы дагэтуль напой з таямнічай назвай «какао». Усё было ў навіну: і яго назва, і пах, і смак, і колер. Ды, відаць, з непрывычкі, а мо ад таго, што выпіў яго, вельмі салодкага, зашмат, пачаліся нудоты ў жываце. Я збялеў, маці перапудзілася, але ўсё неяк выправілася, і мы пашыбавалі пехатою напрасткі на Малаеды, кіламетраў сем, а пасля, перадыхнуўшы на бабіным хутары, на Хадатавічы. Такім малюнкам адбілася ў маёй памяці тое гасцяванне ў дзядзькі Антона.

Усё добра складвалася ў дзядзькавай сям'і: выраслі хлопцы, пажаніліся. Вася ажыўся ў Мінску, Валодзя дабудоўваў свой дом у Снове, недалёка ад бацькоў. Але каля дабра часта ходзіць гора. Здарылася непрадбачанае: Валодзя на пустой дарозе са Снова ў Жылічы перавярнуўся на машыне і загінуў. Мо лопнула калясо, мо яшчэ якая прычына, бо машына была не новая, толькі прыдбаная на другасным рынку ў Еўропе. Хлопец ён быў кемлівы і спраўны. Меў цікавыя звычкі і таленты. Любіў вазіцца з галубкамі – рэдкае ў наш час захапленне. Казалі, што гэта ў яго ад дзеда Антося. У Вовы засталася з жонкай Ларысай дачушка, мая крэсніца, Маша. Добра помніцца, як мы балявалі ў дзядзькі, калі яна нарадзілася. Гэта былі мае другія госці ў дзядзькавай хаце пасля «какао»...

Прабеглі, аднак, гадочкі, хрэсніца ўжо дарослая дзяўчына. Выраслі свае дзеці ў Васі, старэйшага сына дзядзькі

Антона. Ён, акурат як бацька, такі ж увішны і зацяты ў працы. Ды і дзеці ў яго цікавыя: дачка Арына – вядомая гімнастка, сын Антон вучыўся ў Амерыцы, вярнуўся, зараз памагае бацьку ў яго прадпрымальніцкіх справах. Але і тут смуга. Напярэдадні здачы ў друк майго аповеду прыйшла вестка, што памёр дзядзька Антон. Пайшоў у хлеў, узяўся за малаток... На 85-м годзе сэрца яго знасілася...



Дзядзька Лёнік. З вастраплечага хлапчука стаўся юнак-прыгажун. 1965 г.

Дайшла чарга і да самага маладзейшага, ды зараз ужо і адзінага майго малаедаўскага дзядзькі – ***Лёніка***. Так яго называюць нашы родныя. Яму пашчасціла нарадзіцца, калі прагналі немцаў і вярнуліся жывымі з вайны бацька, дзед Антось, і брат Вечык. Лёніка я ведаў лепш за іншых, бо ён толькі на сем гадоў старэйшы за мяне. Часцяком прыходзіў да нас у Хадатавічы і нават, як сам кажа, калыхаў мяне ў калысцы. Калі я падрос, мы заўжды дуркавалі пры сустрэчах, ды і пасля пастаянна сутыкаліся ў жыцці. Помняцца яго праводзіны ў армію і вяртанне дадому са службы. Яшчэ яго пісьмы з нязвыклага назвай прыбалтыйскага горада Прыскуле, альбо Прыекуле. Першы фотаздымак у ваеннай форме. Усё было незвычайным для мяне, незнаёмым, і таму так адкладвалася ў памяці.

Не забыцца пра яго вобраз, калі прыйшоў з арміі. Пачуўшы аб тым, мы з маці раніцаю хуценька пабеглі радасныя ў Малаеды пабачыцца. Было сонечна і цёпла. Лёнік якраз мыўся, чэрпаючы ваду з вядра і пырскаючы сабе на грудзі і спіну. То ледзь пазналі яго. З вастраплечага хлапчука праз тры гады стаўся юнак-прыгажун. Як у казцы! А калі выпрастаўся, надзеў на плечы кіцель, падперазаўся, то маці жахнулася – статны, высокі, вачэй не адарваць! Ён і на самай справе прыгажэйшы сярод братоў.

...Днямі, пасля Новага 2012 года, перад сканчэннем лютага, мы з дзядзькам Лёнем наведаліся да маці ў Хадатавічы. Ён ужо на пенсіі, цяжка хварэў апошні год, даймаюць суставы і сардэчная арытмія. Але палепшала, і я заехаў за ім на вуліцу Голубева. Дарогай гаварылі пра мінулае.

– Я не памятаю, ці была ў Малаедах пачатковая школа?

– Была. Да пятага класа я хадзіў у малаедаўскую школу. Адзін раз перад канікуламі гулялі ў футбол і прыняслі



Дваюрадная сястра Оля (дачка дзядзькі Лёніка) з сынам і маці Алай Шарапа. 2015 г.

мячык у клас. Я як лупянуў па ім, дык прама папаў у партрэт Сталіна, што вісеў на сцяне над дошкаю. А быў настаўнік, іх тут было некалькі братоў, дык ён данёс у Нясвіж, у энкавэдэ, што я разбіў партрэт Сталіна. Бацьку вызвалі туды праз пару дзён і, відаць, не толькі дапрашвалі, а яшчэ і збілі добра. Бо ён прыехаў, узяў аброць і так мяне адлупцаваў...

— А недзе праз год аб'явілі, што Сталін памёр. Я радасны прыбег дахаты і крычу: «Ура! Сталін памёр!». Бацька на мяне: «Маўчы, дурань!» — і зноў за аброць...

Баба Волька казала: «Лёнік вельмі спраўны да работы. За што ні возьмецца, усё палучаецца...» Дзядзька асвоіў шафёрскую справу. Першай яго машынай стаў грузавы «МАЗ-Зубр». Зараз такія толькі ў музеі аўтазавода засталіся. Вялікі, уражліва-магутны, з шырокімі коламі і серабрыстым зубрам на капоце перад кабінай — такой убачылася мне дзядзькава тэхніка, калі ён аднойчы завярнуў да нас на вёску з нейкага кар'ера. Потым у яго было шмат машын, але таго «зубра» не забыцца. Дзівіўся я тады малым, які, аднак, моцны і здаровы Лёнік, калі можа круціць такое вялізнае рулявое калясо...

Дзядзьку Лёніка не абмінулі яшчэ і мастацкія таленты. Ён нядрэнна малюе алоўкам, умее цікава, з густам расказаць пра свае прыгоды і назіранні. Заўжды вакол яго збіраецца кампанія, калі заходзіць якая размова. Каб трохі іншым бокам павярнулася яго жыццё ды яшчэ стрэўся на шляху няўрымслівы настаўнік, быць бы дзядзьку і мастаком, і вядомым літаратарам, бо таленту гэткага ў яго ўдосталь. Але заўчасна памёр бацька, дзед Антось, і замест думак пра вучобу давялося Лёніку думаць аб тым, дзе зарабіць на пражыццё, бо маці, баба Волька, не магла паслаць яго за навукай. Пасля арміі паступіў у Горкі Магілёўскай вобласці, у сельгасакадэмію, але праз два гады пакінуў навучанне, бо не хапала на тое сродкаў. Вярнуўся за баранку, працаваў, стараўся. Удала злажылася сям'я. Шчырая і заўзятая да ўсяго жонка Ала. Выраслі дзеці: Волька, дачка, вывучылася на доктара, жыве ў Данііі, атрымала права на прафесію; Юра, сын, у Мінску. Гэта мае дваюрадныя, па-літаратурнаму стрыечныя, сястра і брат.

Вось і падыходзіць да фіналу мой сповед пра блізкі радавод, пра родных дзядькоў і цётак з матчынага боку. Зараз

у гарадскім жыцці мы раз'яднаныя, рэдка бачымся нават з самымі блізкімі. Вясковае жыццё трымалася на цесных сувязях і ўзаемападтрымцы родных і блізкіх. Без спачувальнага слова, без таго, каб выгаварыць свае гаротныя думкі блізкай душы, каб параіцца, калі лепей саджаць бульбу ці запускаць карову перад ацёлам, як палячыць жывот ці кашаль у дзяцей, пасаліць сала ці агуркі і т.п., было не выжыць.

Радня давала адчуванне, што ты не адзін перад бядою, перад іспытамі лёсу, што цябе падтрымаюць у горы і паспрыяюць у здабытках. Кідаючыся адзін да аднаго, раскрываючы душу і сэрца ў споведах пра штодзённыя клопаты, родныя звяралі напрамкі сваіх дзеяў, планаў і мараў. Складвалася гэта многімі гадамі і пакаленнямі. І добра, і ясна мне бачна з вышынь сучасных, што найвышэй за ўсё берагла радня годнасць свайго роду, чысціню імёнаў продкаў сваіх. Аніхто не здрадзіў, не паклёпнічаў, не пісаў даносы, не падпальваў хату суседу, не браў чужое. Жылі і жывуць усе з працы сваіх рук і не мяшаюць жыць іншым людзям. Такая наша радня.



Вёска Казлы, дарога на Аношкі, возерка, за ім рэшткі былога парку графа Чапскага, лявей Малаеды, а яшчэ ўбок - зялёны ўзгорак, дзе стаяў некалі хутар дзеда Антося і бабы Волькі




Сям'я

Сям'я

На *здымку нас трое. За нашымі постацямі выразна праглядаюцца свежыя, праложаныя мохам, бярвенні нядаўна сабранага зруба. Мы, сям'я, каля сонечнай сцяны свайго дома. Бацька і маці адзеліся ў лепшае, што мелася з адзежы. Маці ў той самай чорнай сукенцы са светла-блакітнымі васількамі па ўсім полі, што прыслаў некалі з Германіі дзядзька Вечык. На плячах перашыты з мужчынскага касцюма станічак, альбо пінжачок па-літаратурнаму. Прыгладжаныя і падколатыя шпількамі, на вясковы лад, валасы; абцасікі са шкарпэткамі на нагах. Ясны і адкрыты позірк, падцяты стан, вытанчаныя абрысы твару.*

Бацька ў касцюме накшталт спартыўнага. «Мы былі такія бедныя, што некі спарціўны касцюм я прывязла Колю свайму ад Вечыка з Баранавіч. Так ён яго і хаваў на святы адно…» На нагах адшараваныя да бляску хромавыя боты. Сам чарнявы, схуднелы, выразна праступаюць шырокія і касцістыя плечы, моцныя рукі, стройная постаць. Вочы і твар стомленыя.

Я пасярэдзіне. Стаю на крэсле ў перашытых з паношанага дзядзькавага адзення святочных шараварах «а-ля Тарас Бульба» і ў такой жа перашытай вельветавай рубашцы. На нагах сандалікі, шкарпэткі. Сонейка свеціць у вочы, таму зажмурыўся, схіліў галаву, якая пастрыжана «на лыса». На твары патаемнае здзіўленне і чаканне канца гэтай працэдуры…



Праўда як існасць

З ноў і зноў углядаюся ў здымак. Не магу адарваць вачэй. Якія маладыя бацькі — прыгожыя, статныя, адкрытыя, поўныя сіл і жадання выжыць, выстаяць! За кожным бачыцца род, парода, гісторыя: твары, абрысы фігуры гарманічныя і выразныя, адшліфаваныя стагоддзямі працы на зямлі. Ад іх сыходзіць подых дабра, прыгажосці і спагады — усё, што здабыта, зберажона і вытанчана прыродай ў пакаленнях продкаў.

Я на момант уяўляю іх у гарадскім адзенні, трохі на амерыканскі манер, накшталт галівудскіх акцёраў, што на пасляваенных здымках. Бацьку — у капелюшы, у бастонавым касцюме, у дарагіх туфлях; маці — з прычоскай, з далікатнай сумачкай на руцэ, у спадніцы ў палоску... Ніхто б не паверыў, што гэта дзеці забітых і прыгнечаных сялян з нейкага зацярушанага балотнага краю. Бо парода і постаць тут не сялянскія, не прыгонныя, тут іншы малюнак, іншы стан душы і цела...

Даўно вядома, і гэта не сакрэт, што твар, постаць, манеры ці, як гаварылі на вёсцы, «ухваткі» (так, можа, і дакладней) найлепш выяўляюць характар, унутраны стан, дабрыню, злосць, хітрасць. Патрэбна толькі пільна ўгледзецца ў чалавека, прыкмеціць мноства яго асаблівасцяў ды злажыць іх у пэўным парадку. Воблік людзей, якія жывуць па справядлівасці, з працы рук сваіх, спагадлівыя да іншых

і душэўна адораныя, мае сваю непаўторную эстэтыку. Як і ў тых, хто жыве інакш. Толькі ў першым разе яна нясе ў сабе гармонію прыгажосці, духоўнай зладжанасці, а ў другім – замест гармоніі праступае дысгармонія зла, падману, недарэчнасці. Я пэўнюся высновай, што добры, адкрыты, разумны чалавек заўжды прыгожы тварам і постаццю, бо такія чалавечыя якасці не могуць мець брыдкі ці агідны вобраз.

Жыццё бацькоў, іх адносіны з людзьмі і паміж сабою пераконваюць мяне ў адмысловасці такога доказу. Зараз, калі сам выгадаваў дзяцей ды займеў нямала гадоў, я разумею, што маці і бацька былі не толькі прыгожай парай, але і хораша пражылі свае дні на зямлі.

...Напісаў гэтыя словы і спыніўся, перастаў цокаць па клавіятуры камп'ютара, бо думкі збіліся ў клубок, збэрсаліся – не ведаю, дзе згубіўся кончык выратавальнай нітачкі. Аб чым жа пісаць далей? Калі браўся за гэты раздзел пра бацькоў, пэўніўся тым, што радкі пабягуць адзін за адным. А тут во – раз і, як кажуць, заела, забуксавала «думак плынь...» У галаве мроіцца столькі эпізодаў, вобразаў, размоў, столькі ўсяго наплывае, навальваецца... Што выбраць найперш, што галоўнае, тое, на чым усё стаяла, на чым будавалася сям'я?! Як клубочак пачынаецца з першага вузельчыка, так і ў маіх выявах пра сям'ю патрэбна апора, першаснасць нейкай катэгорыі, ідэі...

Перабіраю, нібы шнурочкі ў далонях, адмеціны нашага сямейнага суладдзя. І павага, і разуменне, і працавітасць... Не, гэта не ўсё, гэта было наверсе, звонку. А што ў глыбіні, у аснове? Якім быў той «залаты», што кладуць гаспадары пад першы вугал, калі будуюць хату...

Быў такі «залаты»! Імя яму – праўда і чэснасць. Жыццё бацькоў, адносіны паміж імі і дзецьмі стаялі на моцным і трывалым звязку праўды. Маці і бацька жылі па праўдзе адзін перад адным. Яны па праўдзе ажаніліся, бо былі перакананыя ў сваіх пачуццях, па праўдзе нарадзілі дзяцей і па праўдзе лічылі гэта сэнсам свайго жыцця. Яны ніколі не хлусілі ні ў чым сабе і дзецям, не хлусілі суседзям і родным. Таму ўсё ў іх жыцці было ясным і зразумелым. Была непатрэбнай аніякая наўмыснасць ці тэатральнасць у адносінах паміж сабою і перад вёскай. Бацька ніколі не заклінаўся перад маці, што ён яе любіць, жыць без яе не можа, якая яна «зайчык», «коцік», «солнышко» і «кветачка»... Ды маці і не патрабавала ад яго такіх слоў. Бо яна ні разу за ўсё жыццё і ні пры якіх

абставінах не ўсумнілася, што Коля можа думаць інакш, ці што ён можа замяніць яе на другую.

— Што эта за бабы зараз пайшлі, некая рэўнасць у іх, каб не глянуў мужык нікуды за сталом, ні на адну жанчыну. Я дык ніколі пра эта не думала... Коля дзе ў гасцях, бывало, і вып'е, і гуляць, каго захоча возьме, ён любіў паскакаць, то я нават не гляджу, сяджу ды гавару з другімі...

— Адзін раз йшоў з Малаедаў ад бабы падвыпіўшы і ўгледзеў, што танцы ў клубе. Ускочыў туды і давай гуляць ды спяваць там, а мне сказалі нашы, хаттаўскія, што ён там чвэрыць... Ідзі, кажуць, Зіна, забірай яго... А я думаю, хай гуляе ды скача, адно, каб дадому дайшоў, ня ўпаў дзе на дарозе...

Вернасць, давер, клопат адзін пра другога — гэтыя паняцці ў бацькоўскім разуменні не патрабавалі аніякага тлумачэння ці доказу. Бо нашто тая сям'я, калі людзі сварацца, крыўдзяцца, не дбаюць адно пра другое. Гэта не па чалавечаму і не па Божаму закону. Рашылі стварыць сям'ю, пажаніліся, то і жывіце па-людскі. Тут і гаварыць няма пра што. Ясна без слоў. Па-другому нельга чалавеку. Толькі недавяркі кідаюць жонак і баламуцяць сем'і.

«Бываюць вар'яткі і жонкі, не павязе, бывае, і добраму мужчыне. Пападзецца якая — усе кішкі перагрызе...»

Але гэта выключэнне, гэта тое, што выпадае з розуму. У адносінах паміж бацькамі не назіралася аніякіх спецэфектаў, накшталт таго, што жонка хапаецца за цяжкае вядро, муж крычыць: не падымай, табе няможна, зараз я вазьму! А ў адказ чуецца: спраўлюся без вашай міласці...

Маці па нейкай спрадвечнай інтуіцыі ведала сваё месца і свае абавязкі ў сям'і. Бацька таксама. Калі патрабавалася дапамога, то ніхто нікога не папракаў: я вось тут адна пнуся, а ён нават не гляне ў той бок... Проста звярталіся адзін да аднаго: «Коля ці Зіна, ты падыдзі, памажы мне...», альбо: «Занясі вёдра свінням у хлеў, я іх не падыму, нарабілася з раніцы...» І ўсё станавілася на свае месцы, не траслася ад сварак хата, не плакалі знерваваныя дзеці. Калі бывалі ў каго з бацькоў памылкі ці промахі, то яны таксама вырашаліся простым і зразумелым спосабам.

«Эта ж глянь, Коля, я не падумала ды адкрыла загародку, а карова адразу й шмыгнула ў буракі. От, гадкая! Я ж не збягуся з ею, ідзі ты загані яе ў хлеў...»

Стараюся прыпомніць, ці пасварыліся калі бацькі, і акрамя аднаго-двух выпадкаў нічога не знаходжу болей

у памяці. Неяк у самы віхурны зімовы дзень бацька прыйшоў з Якубавічаў са сваёй ільнотрапалкі ўвесь аблеплены снегам. Я сядзеў на печы, чытаў кніжку, маці ўвіхалася з чыгунамі. У бацькі валёнкі, ватныя тоўстыя порткі, ватоўка, падпяразаная салдацкім рамянём, на галаве шапка-вушанка, завязаная шнуркамі на патыліцы. І шапка, і бровы, і ватоўка, і валёнкі ў рэштках снегу, бо за вакном то свішча, то гудзе шалёная завіруха. Ён усміхаецца, гледзячы на маё здзіўленне, нібыта гаворачы: во, бачыш, які я, але нічога, дайшоў... Мне стала шкада яго, і адначасова ў грудзях узнікла пачуццё гонару за бацьку, за яго моц і сілу. Але маці чамусьці завяла зусім іншую размову.

– Коля, пад кароваю зусім мокра, ужэ багна стаіць. Мужчыны ходзяць прыцемкамі да скірды, што за балотам, і бяруць салому на падсцілку. Пайшоў бы й ты набраў саломы...

– Хай ходзяць, а я не пайду, ні хачу, каб пляскалі потым па сяле, што і Другаўцоў браў са скірды.

– Ты заўсюды баішся: ні бурака калхознага не паднімеш, ні картопліны. Усе вунь цягнуць, як могуць. І буракі, і салому, і турнэпс цягаюць начамі...

Тут бацькаў твар напружыўся, вочы засвяціліся, бліскануліе маланкамі ў матчын бок.

– Хай ходзяць, Зіна, а я пражыву і без калхознага кошыка буракоў ці картоплі. Ты мяне не папінай, што я баюся. Ні ў тым дзело. Ты хіба ня ведаеш, што за гэты мяшок ці кошык цябе так збэсцяць, калі пападзешся, да цюрмы давядуць нізашто. Я ў арміі нагледзеўся на такія случаі, хапіла. Не збагацею я з гэтага кошыка, пражывём, як людзі... І ты мне болей так не гавары і не пасылай нікуды...

Бацька замаўчаў, маўчала, падцяўшы губы, і маці. Я цалкам быў за бацьку і нават не глядзеў на маці. А ён моўчкі паеў нешта з міскі, адзеўся ў сваю ватовую фуфайку.

– Пайду ў лес з саначкамі, насяку што пад карову...

За вокнамі непраглядная мешаніна са снегу і ветру. Як жа ён дабярэцца да лесу ды ці дойдзе потым дадому з дровамі і лапнікам на санках?! Са шчымлівымі думкамі ўглядаюся ў дзверы, што зачыніліся за бацькавай спіной. Нядобрая цішыня павісла ў хаце. Загрукатала каля печы маці. Цяжка і непаваротліва сыходзіў гэты віхурны дзень. Нарэшце бразнула клямка ў сенцах, бадзёра скрыпнулі палавіцы пад

моцным крокам. Бацька вярнуўся і, як ні ў чым не бывала, загаварыў і з маці, і са мною.

– Падкінуў пад карову, але ж яна яшчэ ня зусім мокрая была. Ну то зараз хай топчацца...

Бадай, гэта адзіны выпадак напружання ў сям'і, у адносінах паміж бацькамі. Характары ў іх – не аднолькавыя, хоць на першы погляд і падобныя. Маці больш спакайнейшая, весялейшая, гумарная. Больш кампрамісная, заўжды старалася згладзіць непаразуменні не толькі ў сям'і, а і з суседзямі, з раднёю, з вясковымі людзьмі. Бацька меў прынцыпы ў разуменні жыцця і выказваўся цвёрда ў патрэбны момант. Не цярпеў пустых размоў, няпраўды, хлусні, але заўжды прыслухоўваўся да матчыных слоў і рабіў так, як яна прасіла.

Ва ўсе часы існавалі ў людзей спакусы жыць не па праўдзе. Пры тым, бацькоўскім жыцці спакус гэтых таксама хапала. Побач калгаснае, недагледжанае, кінутае – як не ўзяць... А бацька не браў, для яго гэта было вырашана раз і назаўсёды. Калі што для сваіх тэхнічных праектаў, то толькі з дазволу інжынера ці механіка на мехдвары.

Маці любіла гасцей, стрэчы, пасядзелкі. Пагаварыць пра сваё жаночае да нас у хату нядзельнымі днямі заўжды збіраліся жанчыны. Я раней казаў пра тое. Размовы ў іх цяклі бясконцай плынню. То пра агарод, то пра жаночы лёс, то пра ягады ў лесе альбо пра якія здарэнні ў суседніх вёсках: дзе хто каго пакахаў, а дзе пабіліся мужык з жонкаю, а дзе развяліся... Бацька, бывала, не вытрымліваў і выгаворваў маці: «Абы што мелюць гэтыя бабы, як збяруцца. А ты любіш ім патураць, яны й ходзяць да нас, але ж няма чаго тут слухаць...»

Маці з жартаўлівай ноткаю адказвала: «От, Коля, ты менш прыслухоўвайся. Мы пагаворым, пасмяёмся ды разыдземся. Яны й так цябе ўжэ палохаюцца... Ты лепш ідзі да сваіх матацыклаў ці матораў, калі да мяне бабы збіраюцца...» На гэтым усё і вырашалася. Яна ніколі не лезла ў бацькавы справы, не мяшала яго стасункам. А ладзіў бацька са многімі, не цураўся людзей. З суседніх Жылічаў да нас часта наведваўся дзядзька Шпунт. Прозвішча сапраўднае ў яго было Гадун, а Шпунтам празвалі, відаць, за тэхнічнае ўмельства. Нетаропкі, разважлівы чалавек, выдатны токар, знаўца ўсялякай тэхнікі. Добры твар, уздоўж і ўпоперак перарэзаны, як ралля плугам, глыбокімі маршчынамі, зашмальцаваныя ватоўка і галіфэ, кірзавыя боты нават у гарачую летнюю пару,

жалезныя блішчастыя зубы на ўвесь рот. А яшчэ шырокія, парэпаныя ад жалеза і мазута далоні, пальцы і пазногці, наскрозь праетыя бензінам і саляркай. Дзядзька Шпунт у вайну памагаў партызанам, нарваўся на нямецкую засаду, быў паранены, ратаваўся на хутары ў бабы Наташы. Адтуль пайшло знаёмства з бацькам, стаўшае з цягам часу моцным сяброўствам, нягледзячы на розніцу ў гадах – мо на цэлы дзясятак дзядзька быў старэйшы.

Звычайна нядзеляю, пад абед, а вясной ці ўлетку то і пасярод тыдня моцна пыхкаў каля нашага плоту здаравенны чорны матацыкл, і праз імгненне бразгаталі пад вакном на кухні колы, мільгаў шэры цень. Адно па тэмбру гэтага пыхкання мы ведалі: прыехаў дзядзька Шпунт. Бацька сустракаў яго на надворку, і пасля невялікага прыслоў'я пра жыццё-быццё пачынаўся загадкавы, неверагодна цікавы для мяне творчы працэс. Усё круцілася вакол старога ваеннага матацыкла, які бацька недзе вымяняў на свайго «мінскага».

– Знаяш, Коля, я падумаў, нада ўсё-такі здымаць магнета, – пачынаў размову Шпунт. – Іскру не дае і ўсё, клямка...

– Але ж не праверыш, хоць і здымем. Каб запасное было, то другі разгавор...

Яны нетаропка меркавалі пра тое, чаму «ваенны» не заводзіцца. Бясконца яго разбіралі і збіралі, прыпамінаючы франтавую тэхніку, перагаворваліся: можа, справа ў свячах, а мо ў магнета... Падыходзілі яшчэ мужчыны з тэхнічнай падрыхтоўкай. Нарэшце матацыкл заводзіўся, сутрасаючы вёску жудасным лопатам. Бацька праязджаў на ім метраў сто, удагонку беглі дзеці і мужчыны, бо потым матацыкл глохнуў і яго натоўпам цягнулі да нашай хаты. Здаралася, што ў гэты час над вёскаю заходзілі на пасадку на баранавіцкі ваенны аэрадром стратэгічныя магутныя бамбардзіроўшчыкі, «бэкфаеры», як іх называлі на Захадзе. Там, у Баранавічах, служыў лётчыкам, камандзірам «бэкфаера» сын дзядзькі Шпунта Лёнік. Мужчыны паднімалі галовы ўверх і, звяртаючыся да дзядзькі, гаварылі: «Хай бы ваш Лёня павазіў нас на самалёце хоць раз, а то мы гэты корч то цягаем, то пхаем... Так і не праехаліся аніразу...» А мне дык у гэты момант хацелася аднаго: стаць такім жа пілотам «бэкфаера», ляцець над вёскай, глядзець на яе зверху і ківаць крылом нашым вясковым людзям... Узімку нават пачаў голым выбягаць на ганак і там, у мароз, абцірацца снегам, каб стаць лётчыкам... Бацька пасмейваўся, а маці жахалася...



Іван Мікалаевіч Драгавец (Кавальчук) на фронце ў 1944г.

Нядзельнымі днямі ці на святы наведваўся яшчэ да нас Іван Кавальчук. З бацькам яны разам раслі, разам прайшлі фронт, нешта агульнае было ў іх характарах. Меў ён нашу фамілію – Драгавец Іван Мікалаевіч. Гэта яго бацька Мікалай Якаўлевіч Драгавец быў першым старшынёй хадатаўскага калгаса імя Заслонава, а Кавальчуком празвалі, бо сям'я кавальскай справай займалася. На перадавой быў шафёрам, прарываўся на грузавіку праз балоты і снягі, скрозь бамбёжкі і міны – падвозіў патроны і снарады. За подзвігі ўдастоены медалі «За отвагу». Не растаўся з баранкаю і пасля вайны, уладкаваўся на аўтабазу ў Баранавічах, дзе і жыў. Была яшчэ ў яго адна адмеціна – меў Іван Кавальчук уласную легкавую «Победу». На той час вялікая справа. Купіў даезджаную, а давёў яе да бляску. Нашы казалі: «Яна ў яго, што лялька...». Спакойны, прыязны, нетаропкі ў размовах, невысокага росту і з асіплым пасля фронту голасам Іван Мікалаевіч даражыў раднёю. Раз ці два ў месяц, нядзелькаю, выбіраўся ў Лань да сястры Сашы, якая была там у замужніцтве за Захарам Петрачковым. Яны абое былі настаўнікамі. Пра Сашу гаварылі: «От, красівая...». Па дарозе ніколі не прамінаў Хадатавічы і нашу хату.



... і каля свайго амерыканскага «студабекера».



Аляксандра Мікалаеўна Петрачкова (Драгавец) і Захар Паўлавіч Петрачкоў

Я нат і зараз добра не ведаю, у якім мы былі радстве. Здаецца, Іван і наш бацька былі траюраднымі. А неяк Іван Мікалаевіч узяў мяне малога на «Пабедзе» з сабою ў Баранавічы. Дзень ці два я пабыў у яго, пасля ў Анціка Пасацкага, матчынага стрыечнага брата, а ў наступныя выхадныя ён зноў прывёз мяне дадому. Было гэта дзівам-дзіўным, бо адкрыў для сябе гарадскую кватэру, новае жыццё ды яшчэ на легкавушцы праехаў.

Калі першы раз выйшла гэтая кніжка, перамовіліся мы з братам, што ні слова няма ў ёй пра Івана Кавальчука. Сказалі пра тое Мішу Петрачковаму, малодшаму сыну цёткі Сашы з Лані, ён знайшоў цікавыя здымкі. Добра, што зрабілася такая дабаўка.

Нядзельным днём у Снове у радыёмайстра Івана. 1960–1962 гг.

Ездзіў яшчэ бацька часцяком у Сноў да радыёмайстра, здаецца, яго звалі Іванам. Быў Іван інвалід, з вайны вярнуўся без нагі і, каб выжыць, асвоіў рамонт рознай радыётэхнікі. Таксама чалавек спакойны і разважлівы. Неяк і мяне бацька ўзяў з сабою. То я не мог адарваць вачэй ад сцен, завешаных рознымі правадочкамі, катушкамі, іншай тэхнічнай драбнатою. У Івана бацька набыў першы сямейны скарб – радыёпрыёмнік «Родина». А я загарэўся мэтай сабраць уласны дэтэктарны радыёпрыёмнік. Недзе здабыў схему, штосьці прасіў у кабінеце фізікі ў школе, але зляпіў, спаяў і дэтэктар ажыў ледзь чутным голасам маскоўскага дыктара...



Інакш кажучы, бацькавы стасункі ніколі не былі простым баўленнем часу. Ён арганічна не мог падтрымліваць нават на кароткі час размовы ні аб чым, не цярпеў ляляканння, пералівання з пустога ў парожняе. Таму ніколі доўга

не затрымліваўся ў кампаніях, дзе мужчыны збіраліся «папляскаць», як сам казаў, языкамі ні пра што. Меліся на вёсцы і такія ўмельцы – майстры скарэдных гісторый, мацюгальнікі-смехуны. Звычайна гэткія зборышчы канчаліся скідкай «па рублю» і пасылкай у магазін за «чарнілам» малодшага «па званню». Бацька абавязкова знаходзіў прычыну, каб адарвацца ад такіх сходак і збегчы дадому, да справы. Не кажу ўжо пра тое, што ён пазбягаў усялякіх забіванняў «казла», гульняў у карты і таму падобных забаў.

Інакшы сэнс мелі на вёсцы рыбалка, паляванне, грыбы, ягады. Часта з гэтага карміліся. З рыбалкай у нашых мясцінах было не вельмі – ні азёр, ні рачулак, адны балоты. Паляваннем захапляліся многія, але бацька не быў ахвочы ні да рыбалкі, ні да палявання. Хаця ў маладыя гады меў двухстволку і хадзіў ў лес. Ды, відаць, ад продкаў такое не перадалося, не захапіла. Больш да зямлі, да тэхнікі. Як і маці – да агарода, да сваёй «швейкі-аршанкі», да несупынных сваіх клопатаў.

І яшчэ – як ні стараюся, а не магу ўявіць сабе іх, бацьку і маці, адпачываючымі дзе-небудзь на курорце, у санаторыі ці, тым больш, у гатэлі на «турэцкім» узбярэжжы. Гэта проста немагчыма! Сканалі б там праз дзень! «Як жа можна нічога не рабіць, бадзяцца без толку туды-сюды?! Эта ж хвароба адразу прычэпіцца, хіба розуму няма ў людзей?!»... Найлепшымі для спачыну былі для іх тыя хвілі, калі маглі спакойна заняцца сардэчнай справай. Маці з жанчынамі за шытвом і бяседамі, бацька ў майстэрні над чарговай тэхнічнай задумай. Калі наглядаю, як шчыруе каля камбайна ці ля трактара брат Толя, бачу перад вачыма бацьку. Анічога лепшага ў жыцці яму ў такія хвіліны не трэба: адно, каб ніхто нікуды ні клікаў, не адрываў па дробязях ад улюбёнага занятку.



Брат Анатоль. Малады інжынер калгаса «Новае жыццё». Пачатак 1990-х

Маці і бацька невядомым чынам арганічна дапаўнялі адзін аднаго. З безлічы іх звычак, поглядаў, асаблівасцяў, зусім непаўторных характараў ляпілася адзіная мазаіка сямейнага цэлага, дзе кожны выконваў толькі яму вызначаную і патрэбную

ролю. Маці – мяккая, кампрамісная, непрыкметная кіраўніца хатніх спраў; бацька – прыстойны сем'янін, цярплівы здабытчык цяжкага заробку, удумлівы гаспадар.

Зноўку задумваюся над пытаннем: а як гэта – жыць па праўдзе? Не красці, не падманваць, не жадаць зла суседу, не сварыцца з людзьмі, не хлусіць жонцы, дзецям? Жыццё вучыць, што нялёгка гэта, няпроста. На чэсных ды справядлівых ваду возяць... Углядаюся ў тыя дні і разумею, што бацькі ўвогуле не ўспрымалі сітуацыю, што чалавека можна падмануць, абкрасці, пазычыць грошы і не аддаць, абкруціць вакол пальца... Гэта было звыш іх разумення свету. На зямлі так жыць нельга, немагчыма. Таму не маглі надзівіцца, «што гэта робіцца на свеце», наглядаючы праз тэлевізар навіны «ранняга капіталізму». А «новы час» не затрымаўся, дайшоў і да іх. На вёскі панадзіліся спекулянты, гандляры лахам'ём, і шораз маці аддавала ім немалыя грошы за нікчэмны тавар, бо верыла іх агітацыі – «вой, якое ж харошае пакрывала ці свэтар і як вам да твару йдзе... Купіце, бо болей ня будзе, паследняе аддаём...» І яна купляла, бо верыла, што сапраўды харошае, што не могуць жа людзі вось так, у вочы, падманваць.

Потым пацягнуліся цыганкі, нахабна рваліся ў хаты да даверлівых вясковых людзей: адна загаворвае вочы, а другая шныряць па шуфлядах. Было такое і з нашымі, ды якраз брат заехаў, прагнаў зладзеек з дому. А ў яго цешчы ўсё ж скралі зберажоныя з пенсіі рубельчыкі... Як спераживаліся за гэта вясковыя людзі! Грошай шкада, але ж болей крыўды за абразу, за растаптаны давер. «І гавораць так хораша, і адзетыя добра, а глянь падманулі, зладзейкі, брыдота... От, які свет пайшоў...»



Бацькі і дзеці. Жыццё па праўдзе. 1993 г.

Перад Днём Перамогі так я і сам зашкадаваў бацькоў. Прыехаў, а маці кажа:

– Глянь, Вася, што нам прывязлі з Мінска, які прыбор. Сказаў гэты хлопец, што па заданню самаго прэзідзента прыехаў, бо ўсім франтавікам такое трэба для здароўя...

Я агледзеў «прыбор» і зразумеў, што «збагрылі» старым даверлівым людзям заляжалую, аднекуль завезеную ерунду: «устройства» для прагравання каленяў.

– І што, бясплатна аддаў, як падарунак? – пытаюся.

– Не, аддалі пачці дзве пенсіі, маю і бацькаву... Дарагая некая, але ж трэба купляць, бо ад прэзідзента... Ня можа быць, каб падмануў, высокі такі, культурна адзеты...

Дзве пенсіі – то ў разы чатыры болей, чым каштавала «устройства». Ды, каб не засмучаць бацькоў, пагадзіўся: так, дарагі, але добры прыбор, мо спатрэбіцца ў хаце...

Дык ці лёгка жыць па праўдзе?! Здараецца па жыцці, што праўда цяжка даецца і разораў шмат на яе шляху. І падманваюць, і ашукваюць болей тых, хто чэсны і прыстойны. Бо калі чэсны, прыстойны, то і даверлівы, «прастачок» адным словам. Але не зразумець тым, хто жыве не па праўдзе, якая гэта вышыня, якая свабода духа – жыць па праўдзе! – не апускаць твар, не туляцца людзей, не адварочваць у бок вочы... Нічога больш чыстага, бясхітраснага і прыстойнейшага, чым тое сямейнае суіснаванне, жыццё па праўдзе бацькоў і дзяцей у нашай вясковай хацінцы, я не зведаў, не збачыў.



Агульны пачатак

Прыпамінаю, услухваюся праз дзесяцігоддзі ў матчыны словы, у тыя размовы ў сям'і, раздумваю над перажытым. Нездарма, аднак, існуе памоўка, што шлюбы вяршацца на нябёсах, што Божая гэта справа – з'яднаць людзей у сямейную пару.

Вось зайшлі да нас нядзеляю вясковыя жанчыны, прыселі пагаварыць. Дзеляцца навінамі. Маці расказвае пра сваё.

– Эта ж якую палёгку Коля зрабіў, што сячкарню перавёў на матор. А то душыліся і я, і дзеці ўсю зіму, каб карове сечкі нарэзаць. Хлопцы яшчэ слабыя, ледзьве могуць пакруціць гэты дрын, я тожа не магу, падаю...

– А гляньце, паставіў матор, прыладзіў, то во, любата настала – адно салому падавай... Ён сам з работы прыдзе вечарам і за пятнаццаць мінут нарэжа поўную кадушку. Малайчына, што ні кажы...

Бацька недзе ў сенцах. Ён, хоць і здаецца, што прапусціў міма вушэй матчыны словы, ды ўсё ж яны яму прыемныя. Бо нешта грукаціць там, прыпавольваецца, не спяшыць па звычцы на двор...

Разумная жанчына зможа шмат чаго дасягнуць у сямейным жыцці, раскрываючы лепшыя якасці мужа,

заахвочваючы яго ўзнёслым словам ці пахвалою. Бо адна справа, калі робіцца нейкая карысць і да гэтага ўсе прывыклі, проста не прыкмячаюць яе, і зусім іншая, калі кожны здатны ўчынак адзначаецца, становіцца падзеяй, радасцю для сям'і. Маці якраз умела заўважыць дасягненні кожнага ў хаце і заахвоціць, падтрымаць у добрым спачыне.



Наша сячкарня. Сучасны выгляд

У памяці такі выпадак, характэрны для нашага з братам дзяцінства. Толькі ўзышлі буракі на дзялянцы за хлявом. Маці прасіла мяне, калі зраблю ўрокі, прайсці паміж радамі з гачкаю (так называлі ў нас матыгу), збіць зелле і трохі абгуртаваць зямлёю кволыя калівы. Мне заўжды цяжка пачаць якую справу, але, пачаўшы, ужо магу не разагнуцца, буду кпець і кпець над ёю. За буракі я ўзяўся пад унутраным прымусам, бо прыйшлося адлажыць у бок кніжку. Але прайшоў радок-другі і адчуў асалоду ад таго, што няблага атрымліваецца, што пасвяжэла галава. Не адрываючыся, гадзіны дзве-тры запар, увіхаўся на дзялянцы, пакуль не скончыў яе ўсю. Маці вярнулася з дзялак, адразу скмеціла маю работу.

— Сынок, няўжо ты ўвесь кусок абрабіў?! От маладзец, я б ніколі ні падумала, што ты за адзін раз усё зробіш! А ты вунь да канца прайшоў, як аблегчыў мне работу...

Надвячоркам прыехаў дадому бацька, маці стала расказваць яму пра мой удалы спачынак.

— Эта ж глянь, Коля, хлопец наш за адзін раз абрабіў усе буракі. Які настойчывы! Ды так акуратна ўсё палучаецца ў яго! Не падумала б нават, што за адзін раз столькі зробіць...

— Бачыш як! Маладзец! Помач нам падходзіць з табою. Добра, вельмі добра, што так...

Ад такіх слоў сэрца аблілося гарачай крывёю, і, бадай, на ўсё жыццё бацькоўская адзнака стала маім найпершым вытокам у дзеях і думках.

Часта бывала, што маці зусім непрыкметна, нібыта мімаходзь, то здзівіцца чаму-небудзь у нашых ці бацькавых справах, то папытаецца аб чым, але так, што ў гэтым здзіўленні і попыце абавязкова адзначыцца прыхаваная пахвала і адабрэнне твайго старання, зробленай работы.

— Хораша ты, Коля, зямлю ўскапаў ды граду зрабіў...



Маці маладая, да замужніцтва. 1948–1949 гг.

– Як мой Вася ўжэ акуратны ў цятрадзях, то пашукаць – мо на свеце німа такога! Кніжачкі ўсе абложыць газетамі, цятрадзі роўненькія, аніводнай плямы ад чарніла, нават каб і хацеў, то не знойдзеш! – гэтак, здаралася, маці ганарылася мною перад вясковымі жанчынамі.

– Толік то любы трактар, любы матацыкал, які ўжэ мо толькі е на свеце, параманціруя і паедзе на ім...

Аднойчы пачуеш такую адозву і ўжо не зможаш у другі раз не выканаць бацькоўскую просьбу ці выканаць яе абы як. Была ў такім падыходзе вялікая педагагічная мудрасць, што спавіталася ў прыстойных сялянскіх сем'ях за вякі штодзённага шчыравання на зямельцы-карміліцы. І не толькі мы з братам, дзеці, а і бацька, дарослы мужчына, франтавік, з большай ахвотай браўся за чарговую тэхнічную задуму пасля матчынай пахвалы.

Прыклад бацькоў пэўніць мяне ў тым, што ў аснове сямейнага плёну перш-наперш ляжыць паразуменне, еднасць мужа і жонкі, гарманічнасць іх суіснавання. Бацька цяжкай працай зарабляў у калгасе, кожную хвіліну аддаваўся гаспадарцы, аздабляў наш побыт самаробнымі тэхнічнымі прыладамі. Ды, як я зараз разумею, без умелага матчынага кіравання сямейнай эканомікай вынік яго намаганняў быў бы намнога меншы. Бо ён быў чалавек моманту, рэальнай справы, дзеі. А маці была палітыкам у сям'і. Ад яе сыходзіў дух агульнага пачатку, імпэту, погляду за гарызонт. Іх уменне слухаць адзін аднаго і прыслухоўвацца з'яўляліся асновай гармоніі і парадку ў сям'і. Прытым некаторыя звычкі і традыцыі складваліся інтуітыўна, па невыказанай двухбаковай згодзе. Так, грашыма ў доме заўжды распараджалася маці. Бацька, атрымаўшы заробак ці выручыўшы што з продажу жывёлы, акуратна прыносіў грошы дадому і аддаваў маці. Ён ніколі не прыхоўваў аніякіх заначак, не цікавіўся, куды і як яна патраціла зароблены, ніколі не патрабаваў аніякага дазволу ці папярэдняй згоды на матчыны траты. Быў абсалютна ўпэнены, што грошы маці траціць разумна, па неабходнасці, і заўжды адабраў яе прыдбанні.

Так і было. Маці ведала, што купіць бацьку і дзецям, у чым нас выправіць у школу, як бацьку адзецца ў клуб на Дзень Перамогі, дзе ляжаць яго чыстыя кашулі і шкарпэткі. Яна планавала дзень сённяшні і заўтрашні, вяла агарод, карміла і абмывала сям'ю, увіхалася каля жывёлы і птушак, адрабляла калгасны прыгон на дзялках: на бураках і бульбяніку, на ільне і сенажаці... Яе рукі не ведалі спакою, а ногі спачынку. У пяць гадзін падаіць карову – так пачынаўся кожны яе дзень, а дзявятай вечара паставіць у печ чыгуны з ядою для жывёлы – так канчаўся. Праца яе была непрыкметная і нягучная. Як само сабой зразумелым успрымалася ў сям'і, што на стале раніцай, у абед і вечарам – свежазгатаваная смачная ежа, што чыстая хата, што памытая ў кожнага бялізна. Ды маці і не прэтэндавала на гучныя пахвалы ці нават на простае «дзякуй». Яна, як і бацька, ціха, без лопату і крыку, несла свой сямейны крыж ад рання да вечара, ад вясны да зімы, ад маладосці да старасці. І ў яе, і ў бацькавым разуменні гэта аніякі не подзвіг і не дасягненне. Так паложана людзям: жанчыне сваё і мужчыне сваё. Так жылі бацькі і прадзеды. Гэта не падлягае сумневу. Інакш немагчыма. Бо калі будзе не так, то не будзе дабра, не будзе радасці і здабытку, а будуць бяда і гора.

Што значыцца матчына прысутнасць у сям'і, аднойчы мы добра адчулі з бацькам. Было тое ў пачатку мая 1958 года. Чаму так дакладна вызначаны час? Бо маці насіла ў жываце малодшага брата Толю, чакала свайго дня і перажывала, як жа дабрацца да радзільнага дома ў Нясвіжы. Цётка Стэпка, дваюрадная сястра, жыла ў Нясвіжы з дзядзькам Іванам, ведала пра тое і папрасіла знаёмага шафёра, што вазіў аполкі па вёсках, заехаць за Зінаю ў Хадатавічы і забраць да яе, у Нясвіж. Так надвячоркам, недзе пятага ці шостага мая, каля нашага плоту тармазнула машына, яе чакалі, і бацька падсадзіў маці ў кабіну. Яна толькі глянула ў наш бок...

«Аршанка»



Адны, калі з'ехала машына, мы моўчкі стаялі з бацькам на вуліцы.

– Ну то, ладна, пайшлі, Васька, у хату, – сказаў нарэшце бацька, схамянуўшыся ад здранцвення.

У хаце пачалося наогул непаразумелае. Нічога не клеілася, мы не ведалі, аб чым гаварыць, куды ісці, што рабіць. Нарэшце бацька, нібыта са сну, выказаўся: «Давай будзем гатаваць вячэру...» Ён запаліў керагаз, парэзаў на скавараду сала, паставіў на агонь. Потым узяўся драбніць бульбу, якую яшчэ загадзя абабрала маці. Падсмажыў. Мы моўчкі елі. Было нязвыкла, пуста ў хаце. Туга і адзінота панавалі ў нашых душах.

Ды прабеглі гэтыя хмурныя дзянькі. Вярнулася з Нясвіжа маці з малым брацікам, і забруілася зноўку вясновым перазвонам наша хацінка.

Матчын твар ніколі не быў сумны. Голас яе звінеў срэбрам, гаворка лілася, як светлая крынічка з вытокі. Словы, вобразы з яе вуснаў складаліся ў цудоўныя малюнкі, поўныя фарбаў і адценняў. Слухаць маці — поўнае замілаванне, бо яе споведы зіхацяць адмысловым гумарам, дакладнымі падмецінамі вясковага побыту, поўняцца смехам і жартамі. Не забудуся, як мы смяяліся, калі маці гаварыла пра Ельцына:

— Гэты Зельцын што ні дзень, то п'яны. Я ж бачу, адразу п'янага пазнаю, хоць і па целявізару, але пазнаю, бо нагледзелася на іх у сяле...

Да нас цягнуліся людзі. Вакол маці кружыліся вясковыя жанчыны, суседкі, радня. Мералі сукенкі, спадніцы, шылі, перашывалі. Яшчэ ў дзеўках, як сама казала, яна навучылася на партніху. Гэта яе ўмельства вельмі прыгадзілася ў скупыя і нялёгкія пасляваенныя гады.

— Нашыя (дзед і баба з Малаедаў) купілі мне швейную машынку, «Аршанку», як мы дом паставілі тут, у Хаттавічах. Сабрала матка грошай, япрука прадала, і бацька на санках прывёз да нас швейку. От я на ёй і папашыла! Якая добрая ўдалася машынка! Нават валёнкі і тыя палучаліся. Зараз такіх машынак ужэ не робяць...

То была праўда. Маленькі Толя ляжаў у калысцы, а маці, падхадзіўшыся па гаспадарцы, бралася за шытво. У хаце пастянна таўкліся вясковыя жанкі, хто з чым: адны — з купленымі недарагімі тканінамі на сукенку ці накідку, іншыя — з паношанымі старымі касцюмамі ці паліто для перашыўкі на дзіцячае адзенне. Днямі стаяў вясёлы гоман, жывая зычная гаворка, пераадзяванне, прымеркі... Маці заўжды ў добрым настроі, вясёлая і жартаўлівая, падхвальвала то адну, то другую жанчыну.

— Глянь, Ніна, як табе да твару гэты паркаль, добра, што ты яго купіла, умееш выбраць...

– Ой, нат ня ведаю, Зіна, што з гэтых лахманоў можна малому пашыць, – пыталася ў яе другая.

– Палучыцца добры фрэнчык, Шурка, паглядзіш, не перажывай... А можна валёнкі для твайго зрабіць, тожа будуць някепскія, лёгенькія...

У сваю чаргу жанчыны стараліся аддзякаваць маці за работу: хто рубельчык, хто два ці пяць у залежнасці ад заказу. А найчасцей дамаўляліся адрабіць за шытво, бо якія грошы вяліся ў сялянскіх хатах? Адраблялі па-рознаму: падбягалі на калгасныя дзялкі, на буракі ці на лён, збіраліся пад восень «капаць картоплі» на сотках пры хаце, калі бацька перахопіць каня і навыворвае плугам. Адной жанчыне тут не ўправіцца, толькі гуртам. То была значная падмога сям'і – і зароблены матчынай працай за «аршанкай» рубельчыкі, і працоўныя адробкі за пашытае.



З малаедаўскімі дзяўчатамі пасля вайны (злева, унізе)

Не ведалі стомы матчыны рукі ні днём, ні вечарам. Бо калі сыходзілі жанчыны з дому, то бралася маці за абшыванне нас, малых, і бацькі.

– Мне яшчэ матка гаварыла, як з Колям пажаніліся, глядзі, каб мужык твой чысты і не зашмальцаваны хадзіў, бо брыдка тое вельмі, калі жонка мужыка запусціць у чарнату. Бацька наш сам нічога ня ўмеў – ні памыць, ні пагладзіць. Як палажу яму чыстае, то адзене, а як не, то й будзе чорны хадзіць, бо ня ведаў нат дзе шкарпэткі ляжаць... Але ў мяне ён чысты хадзіў...

Абшытыя і абмытыя былі ў маці і мы з братам. Яна на вока ўмела перашыць нам са старога дзядзькавага касцюма якія штонікі, зрабіць палітко ці рубашкі з карманчыкамі навыпуск. Асаблівым яе «ноу-хау» былі валёначкі. Не такія, што прадаюць у крамах, збітыя з воўны, цяжкія і пруткія, а лёгкія, на тонкай падкладцы з ваты, перацягнутыя строгімі вертыкальнымі швамі. Звычайна найлепшым матэрыялам для такіх вырабаў служыў драп альбо сукно, што выкройвала яна са старога братавага паліто ці паношанай вясёнкі. Перакладала тканіну зваротным бокам наверх – атрымліваліся нібыта новыя з крамы.

Гэткія валёначкі вельмі прыдатныя, каб чалавеку ў гадах абуць іх у хаце зімовым часам, альбо, напяўшы галошы, пакарміць курэй ці выйсці з вядром да калодзежа.

Валёнкі матчыны вядуцца і ў маім пасагу. Хаваю я іх як дарагую памяць аб тым часе, калі маці была маладая ды ўвішная. Валёнкі яна кроіла без усялякіх прымерак, на вока. Паглядзіць – і рэжа тканіну. І выходзіла да ладу, акуратненька ды спрытненька. Так і жанчынам яна шыла без прымеркі, на вока: кіне востры погляд і паласуе на патрэбныя кавалкі тканіну. Ды не прыпомніць, каб хоць раз памылілася.

Пасведчанне аб вучобе ў вайну



ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ШКОЛА

ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ

Дадзена гэтае гр. Шарапе Зінаідзе
народжанай дня 9 студзеня 1931 года ў тым, што яна
скончыла у 1943/44 навучальным годзе Малаўскую Сямігадовую
Беларускую Народную Школу і пры выдатных паводзінах выявіла на-
ступныя веды:

па беларускай мове	выдатна
„ нямецкай мове	добра
„ матэматыцы	добра
„ фізыцы і хіміі	добра/добра
„ прыродазнаўству	добра
„ геаграфіі	добра
„ гісторыі і грамадазнаўству	добра/добра
„ ручной працы	выдатна
„ рысаваньні	добра
„ сьпевах	добра
„ фізычным узгадаваньні	добра

10 чэрвеня дня 1944 г.
№ 18
НЯСЬВІСКІ РАЁН
БАРАНАВІЦКАЕ АКРУГІ.

Кіраўнік Школы

Настаўнікі:

Дакладна мерала маці сваім праніклівым кемлівым позіркам не толькі тканіну, а многае па жыцці, хоць скончыла, як сама казала, «за немцамі» толькі чатыры класы Малаедаўскай школы. Я берагу атэстат-пасведчанне аб яе кароткім навучанні. Ён цікавы як сямейная рэліквія і як гістарычны факт, бо сведчыць аб тым, што пры немцах, у акупацыю, працавалі школы і дзеці вучыліся. Прадметы выкладаліся па-беларуску. Пасведчанне мае тагачасны дзяржаўны герб – гістарычную беларускую «Пагоню» і пячатку з такой жа выявай.

Чатыры класы – то ўся матчына навука. Да ўсяго астатняга ў жыцці яна даходзіла сваім розумам і той навукай, што дасталася ад бацькоў, ад дзеда Антося і бабы Волькі. Дзівіцца трэба з гэтай навукі, бо выкладалася яна без настаўнікаў і падручнікаў. Маці з першага погляду разумела чалавека, ведала, што яму сказаць, як з ім абысціся ў кожны жыццёвы момант. І не было выпадку, каб па яе віне здарылася сварка ў хаце ці на калгасных адробках, каб пачаўся лямант з суседкай, валтузня з дзецьмі ці з мужыком, чаго ўдосталь хапала ў вясковым побыце. Заўжды кампраміс: з брыгадзірам Ільюком Навічанчыным, які з рання перабіраў хату за хатай, выганяючы жанок на калгасны прыгон; з бацькам, які бясконца возіцца з тэхнікай замест таго, каб адрамантаваць плот; з дзецьмі, якія сваім футболам паламалі агурочнік; з падатковым інспектарам, якога калі не ўлагодзіць, то абложыць падаткам кожнае дрэўца і палічыць кожную курыцу; з участковым міліцыянтам, які, нібыта сабака, цікаваў за бацькавай самагонкай; з суседам, што знарок запусціў сваё цяля на наш прысадак...

А не дамажыся маці гэтага кампрамісу, што тады?! Бойка, лямант, сварка... Так і было ў некаторых хатах. Налапоча баба, пасварыцца без толку з людзьмі, падзудзіць свайго мужчыну – вось і канфлікт. За сякеры мужчыны хапаліся, забівалі альбо калечылі адзін другога. Потым турма, кроўная помста на ўсё жыццё.

Акрамя непрыкметнай дыпламатыі, што так ненаўмысна ўплятала маці ў нашыя адносіны з людзьмі, яна ад прыроды мела яшчэ цудоўнае пачуццё далікатнасці. Гэта няпраўда, што далікатнымі могуць быць толькі тыя, хто атрымаў вытанчанае выхаванне. Прыстойныя людзі без навукі, сваім розумам даходзілі да таго, што трэба быць



З унучкай Надзейкай. 2000 г.

вельмі абыходлівымі ў жыцці: не пакрыўдзіць чалавека словам, прывеціць незнаёмага, нараўне любіць і багатага і беднага. Такімі былі дзед Антось і баба Волька з Малаедаў, матчыны бацькі. Такой заставалася на ўсё жыццё і яна сама. Хто б ні заехаў, ні зайшоў да нас з навакольных вёсак, ды і са сваіх, вясковых, кожнаму адкрыты дзверы, будзе прыязная сустрэча. Ад малых гадоў помняцца мне за сталом у нашай хаце і фатограф Вася Мядзвецкі, якога за гонар мелі запрасіць многія гаспадары, і бацькавы сябры-механізатары, і брыгадзір Ільюк, і сусед-ветэрынар Сашык, і цётка Гэля з мужам сваім Колем Царуковым, і дзядзькі мае Вечык, Антон, Лёнік, і сястра цётка Маня з Мікалаем Крупцом, сваім мужам... Ды хіба пералічыш! Маці ўмела хуценька накрыць на стол, заўжды ў яе вялася прыхаваная бутэлечка. Акурат, як у бабы Волькі, калі яна сустракала зяця, нашага бацьку.

– Мяне й матка вучыла: ня трэба прысмакаў, парэж і пастаў на стол тое, што маеш, але сустрэнь, прымі чалавека, калі ў хату зайшоў...

Ужо пазней, падчас маёй вучобы ў Мінску, у бацькоўскім доме перабывалі многія мае студэнцкія сябры. Прымала маці дацэнта, загадчыка кафедры радыё і тэлебачання нашага факультэта журналістыкі і цудоўнага чалавека Мікалая Еўкавіча Дастанку, некалі студэнтамі Алега Манаева, вядомага зараз прафесара сацыялогіі, Дзіму Дзьякава, экс-старшыню парламента Малдовы, Валерыя Дранчука, паэта і грамадскага дзеяча...

Пасля сканчэння вучобы, у часы самастойнай працы, я наведваўся да бацькоў разам з Іванам Гаўрылавічам Чыгрынавым, слынным беларускім пісьменнікам, з прафесарам Аляксандрам Цімафеевічам Караткевічам, рэктарам Беларускага педагагічнага інстытута, былым партызанам і вядомым партыйным кіраўніком, з сябрамі па камсамольскай і журналісцкай працы. З усімі, не толькі з простымі, але і са знатнымі людзьмі маці і бацька знаходзілі паразуменне і тэмы для размоваў, накрывалі не багаты, але шчыры

сялянскі стол. Дагэтуль мае сябры прыпамінаюць тыя сустрэчы ў вёсцы Хадатавічы.

Аднойчы, гэта было падчас работы ў Савеце Міністраў, здаецца, летам 1993 года, пасля семінара кіруючых работнікаў, што праводзіўся на Нясвіжчыне, мы завіталі на вёску з прэм'ер-міністрам Вячаславам Кебічам і міністрам замежных спраў Пятром Краўчанкам. Бацькі трохі сумеліся: як жа сустрэць такіх знатных людзей?! Ды маці не разгубілася: па-свойму, па-сялянску – сала, памідоры, гуркі з агароду... На дарогу, пры развітанні, захіснула кожнаму па здатнаму кавалку сала таўшчынёю з далонь – не засаромелася, палажыла падарункі на сядзенні ў машыны. Праз дзень ці два Пётр Кузьміч Краўчанка выказаўся пры сустрэчы: такога сала я не каштаваў, вялікі дзякуй маці... Вячаслаў Францавіч таксама не змаўчаў: слухай, Вася, а нясвіжскае сала, аказваецца, знатнае, радзівілаўскае, што гаварыць... Падзякуй маці за падарунак...

Напісаў гэтыя радкі і падумалася: бацькі шмат каго прымалі ў сваёй хацінцы, а самі толькі адзін раз гасцінна пераначавалі ў Мінску ў маіх сяброў. Было наша з Галяй вяселле, і я папрасіў Іосіфа Сідаровіча, калегу і сябра, прыняць на ноч у сябе бацькоў, бо сам яшчэ не меў кватэры. Маці сумелася: а ці не спорцім мы людзям «настраенне», мы ж ні знаем, як там сябе вясці... Усё жыццё мучыліся вясковыя людзі перад гарадскім цывілізаваным побытам. «Ня знаям этых цырымоняў у кварцірах, можа, ня так што зробім, то абідзяцца на нас ды растрояцца людзі...».

Але Іосіф Міхайлавіч і яго жонка Ліля так цёпла і прыязна прынялі бацькоў, што яны запамятвалі гэта на ўсё жыццё.

«Якія ж харошыя людзі! Як нас хораша стрэлі! І спаць палажылі ва ўсё чыстае, і на стол усяго наставілі! Пашукаць, сынок, трэба такіх людзей. От, я рада, што ў цябе такі друг есць...».

Гэтак маці прыпамінала тое начаванне ў майго сябра. А яшчэ дабаўляла падчас вясковых гамонак з жанчынамі: «Не, ні кажыце, бабы... У горадзе тожа харашыя людзі есць. Пашукаць такіх трэба, як у майго Васі друг...». Удзячны і я за тую ноч Іосіфу Міхайлавічу і яго жонцы.

«Дзеці заўсёды хваляць бацькоў», – скажа тут мой чытач. Гэта, безумоўна, так. Але ж было б неяк вельмі нязграбна з майго боку, каб гэтыя запісы звяліся да наўмысных хвалебных панегірыкаў

родным ды блізкім. Мы жылі сярод людзей. Я бачыў розныя адносіны паміж імі. На многае нагледзеўся за пражытыя гады. І без сумневу пэўнюся перакананнем, што наша маці неяк інтуітыўна, падчас мо трохі лепей і чуллівей за іншых, разумела сутнасць жыцця. Што яно, жыццё, кароткае, што ў ім не месца крыўдам, што сэнс яго не толькі ў высокіх і багатых сценах, а ў спагадзе і помачы людзям, у іх удзячным слове ў адказ.

Заўжды чулася нам з братам у спіну матчынае: не крыўдзіце людзей, калі можаце – дапамагайце... Такімі і выраслі. Пра брата на ўсіх яго пасадах людзі казалі і кажуць толькі адно: залішне добры... Здаецца, і я нікому нічога ў жыцці не нашкодзіў, не пашкадаваў.

Ну а маці... То неверагодная дабрыня і чуллівасць да людзей. Вось толькі апошні выпадак. На сцюдзёныя зімовыя месяцы рашылася нарэшце пераехаць да брата ў Нясвіж. Пачалі збіраць сякія-такія рэчы. Бачым, няма добрага халата, сподняй адзежы. Пытаюся: мама, дзе гэта ўсё падзелася – я столькі прывозіў вам і халатаў, і сподняга; Галя мая вам перадавала мо дзясяткамі...

Маці трохі прыпускае галаву ўніз, я ведаю гэты яе прыём, нібыта саромеецца, потым адказвае:

– Вы не сварэцеся ўжэ на мяне, але параздавала бабам нашым у сяле. Галота такая ва ўсіх тут. Што маюць, то прап'юць некаторыя паследні рубельчык... Мне яно ўсё роўна не патрэбно...

Скралі свае, вясковыя...

Мы пасмейваемся з братам, бо знаёмы з такімі тлумачэннямі не ўпершыню.



Як і раней, маці радуецца кожнаму чалавеку, стараецца не выправіць без пачастунку нікога з хаты. Прыеду, а яна спяшаецца расказаць:

– Глянь, Вася, прыходзіў Коля Царукоў. Гэля (*стрыечная сястра*) з Даматканавіч прыслала. Яны качак трымаюць. Ногі ў яе баляць, але мне хоча прыслаць хоць што-небудзь. Ну дык хіба я выпраўлю яго пустым з хаты?! Ажно з Даматканавіч праз лес йшоў да мяне... Пачаставала, бутэлечку белай дала з сабою...

– Баюся адно, каб дайшоў дадому, ня ўпаў дзе ў лесе, бо трохі ж выпіць любіць... І што яны ў гэтай гарэлцы находзяць? Гарчэча адна, а ўсё роўна цягнуць...



«Нічога не шкадуйце і не загароджвайцяся, лепей з людзьмі пабуцце…»

Наведаўся я да маці і перад Новым 2012 годам. Як заўжды, яна шчыра ўзрадавалася майму прыезду, затупала каля пліты, пачала смажыць яешню на сале – традыцыйна сялянская гасцёўная яда. Мы з братам накрывалі на стол, вялі бяседу. На гэты раз і маці, і брат былі ўзрушаны. Уначы са двара злодзеі скралі скрутак дротавай агароджы, якую брат рыхтаваўся паставіць на плот. Скралі свае вясковыя выпівохі. Абы-што нарабілася зараз у нашых сёлах. Туляюцца без работы хлопцы-небаракі, п'юць гарэлку. Адныя – ні дзяцей, ні жонак. Каму зааруць соткі, паколюць дровы, пачысцяць двор, скосяць траву, загародзяць плот – ды ці мала работ на сядзібах? А ў вёсцы засталіся жанчыны немагушчыя. Плацяць ім з пенсіі за работу. А куды дзенешся?!

Брат Толя таксама браў іх на працу ў сельсавет, каб што зарабілі. Памагаў, адным словам. І вось такая ўдзячнасць: скралі агароджу.

Ужо праз дзень брату ўсё расказаў іх хаўруснік: пасеклі дрот на драбніцу, злажылі ў мяшок і здалі на прыёмны пункт. Потым купілі яшчык «чарніла», закускі, два дні пілі. Нічога новага, усё, як звычайна: укралі, прадалі, прапілі. Засталося напісаць заяву ў міліцыю – і хлопцам турма. Без варыянтаў, таму што не першы раз пападаюцца. Брат настроены рашуча, але слухае маці.

– Глянь, Вася, што я Толю кажу. Яны то п'яніцы. Але ж, глянь, пасадзяць – як тут мы бяз іх абыдземся?! Усім бабам тут на сяле пагібель будзе. Яны ж усю работу робяць...

– Чорт з ею ўжэ, з этай провалкаю. Ты ж, сынок, не пабяднеяш. Во тры дні прайшло, а ўжэ пра яе забыліся. Што з дурняў возьмеш! Яны вунь ходзяць, вочы апусціўшы, баяцца на двор зайсці... Няхай, сынок, ня трэба ў міліцыю заяўляць...

Брат супраціўляецца, прыводзіць маці свае доказы, ды я бачу, як патроху мякчэе, выпускае злосць, перастае нервавацца. Па матчынай волі і зрабілі: не сталі заяўляць, расказалі толькі вясковым пра агідную справу.

Такая наша маці. Заўжды саступіць, даруе, знойдзе кампраміс. Яна і зараз у свае восемдзесят шэсць, старэнькая і паслабелая, але такая ж бязмерна шчодрая і адкрытая. Што ні прывязу падчас адведак, тым, без сумневу, пачастуе суседак, вясковых жанчын і любога, хто зойдзе ў хату. Ад таго, што можа аддаць і аддае, салодзіцца сэрцам, грэецца душою, як і ў нашым маленстве, так і зараз, у сталыя гады. А толькі ўгледзіць унучак, ці маіх ці Толіных, то цягнецца рукамі да сваёй пацёртай кішэні, ціхутка вымае адтуль прыхаваную пенсію і неўпрыкметку ўложыць кожнай у руку. А нам з братам наказвае: нічога не шкадуйце і не загароджвайцяся, лепей з людзьмі пабуцце..... Бо прысмакі вашыя, калі залішнія, усё роўна прападуць, а ўборы, што не носіце, моль з'есць...



Сцяна механізатара

«Спраўны мужчына...»

Раней я ўзгадваў пра бацькавыя тэхнічныя таленты. Не кожны мужчына, нават і з механізатараў, быў здатны на такое. Бацька па натуры сваёй меў схільнасці да тэхнікі, добра разбіраўся ў ёй, але ж і сямейная павага да яго вынаходніцкіх праяў мела свой кошт, падвышала цану яго старанняў. Можа і пагэтаму ён пастаянна зачынаў новыя «праекты». З старога, кінутага ў металалом «дзвіжка» ад кінаперасоўкі (у тыя часы хоць і не было электрычнасці, а кіно на вёсках паказвалі рэгулярна з дапамагой «дзвіжка» – бензінавага матора-генератара, які прывозілі разам з усёй апаратурай на грузавой машыне), зрабіў піларараму, удосталь наразаў на зіму дроў. Сям'і палёгка выйшла, ды яшчэ якая! – бо кожную восень мучыліся саматугам з гэтымі дровамі: пілавалі ўручную на козлах і бацька, і мы, дзеці, і нават маці бралася. Потым узяўся за кормадрабілку. Карове, свінням ды птушкам пастаянна патрэбна зерне. Але даваць яго суцэльным – мала толку, трэба драбніць, тады будзе карысць. На манер калгаснай бацька зладзіў невялічкую драбілку і прыспасобіў да яе электраматор – таксама выйшла палёгка рукам. Не стала патрэбы штогод па колькі разоў вазіць мяшкі з зернем на перацёрку ў калгасны млын. Прыходзілі суседзі, каб здрабніць пшаніцу ці жыта.

Ды, бадай, самым здатным бацькавым дасягненнем стаў самаробны трактарок. Быў перыяд у калгасным летапісе, канец шасцідзясятых і да паловы сямідзясятых гадоў, калі на падтрымку калгасаў накіравалі вялікія дзяржаўныя грошы. Я гаварыў пра гэта на папярэдніх старонках. Ракою пацяклі на сяло трактары, камбайны, станкі, інструмент, запчасткі. Бензін быў дзешавейшы, чым вада. Здаралася, што па-гаспадарску гэтым багаццем распарадзіцца не маглі. Бо валілася цераз край і таму мала каштавала, а па-другое, часцяком не было парадку, бо калектыўная адказнасць, як гэта бывае, ёсць адсутнасць усялякай адказнасці. Яшчэ дыхтоўная тэхніка, трохі падламаныя трактар ці матор, бывала, раскурочваліся альбо і цалкам выкідваліся на сметнікі з-за якой дробязі. Каля калгасных гаражоў і майстэрняў вырасталі цэлыя пагоркі кінутых шасцерняў, дыскаў, колаў, рамянёў і іншага дабра, якое іржавела пад дажджом і снегам нікому непатрэбнае. Ідучы са школы, мы часцяком заходзілі на гэтыя могілкі жалеза, скручвалі сабе што-небудзь блішчастае.

Калгасныя механізатары, патомныя сяляне, з гаркатою пазіралі на такое бязладдзе, але ўзяць што на жалезных сметніках баяліся, бо ўлады нібыта не давалі дазволу. А з уладаю лепей не знацца – яшчэ свежымі былі сталінскія расправы за жытнёвыя каласкі. Ды ўсё ж патроху мацнеў подых вольнага ветрыку, адступалі ў нябыт сталінскія жудасці. Людзі адразу гэта спачулі, пакрысе што з выкінутага пачалі падбіраць ды складваць пад стрэхамі ў дварах.

Першым, здаецца, на вёсцы сабраў свой невялічкі трактарок Васіль Грышкаў. Потым яшчэ Толя Максімаў, Коля



Самаробны трактарок. І забава, і радасць. Лета 1981 г.

Чарнабаеў, Віцік Юзічкаў – заўзятыя аматары тэхнікі. Узяўся за трактар і бацька. Аснова – гэта рама. Ладзілі яе гуртам з дапамогай зварачнага апарата. Матор, калёсы, цягі, кабіну і ўсё астатняе сабралі па калгасах з выкінутага. Маці неўпрыкмет назірала за працэсам. Бацька да ночы корпаўся ў гаражы: варыў, свідраваў, пілаваў; ездзіў па майстэрнях, нешта выточваў са знаёмымі токарамі. Надышоў час «ікс». Трактарок запыхцеў ды са старцера – ніякага пускача і вяроўкі! – выдыхнуў цэлы жоран чорнага, як сажа, дыму і весела залапатаў. Бацька з пераможнай усмешкай агледзеў прысутных.

– Давай, давай, лапачы! Не спыняйся! – ці то да трактара, ці то да нас весела звярнуўся ён.

– Спраўны мужчына наш бацька! Усё ж такі дамогся! Гляньце, сам зрабіў трактар... – выказалася маці.

Потым назіралі за першай выяздкай са двара: бацька ўключаў пярэдні і задні ход, правяраў абароты, ціск масла ў шлангах гідраўлікі. Гэты трактарок шмат гадоў выручаў сям'ю, бо з коньмі станавілася ўсё тужэй, канюшню ўрэшце зусім закрылі. Усе работы вяршыліся на трактары: буракі, гной, картопля, ворыва, перавозка...

Гадоў праз дзесяць бацька зрабіў яшчэ адзін трактарок, ужо больш дасканалы, нават з кабінай, з большым наборам прычапных. Ды прыгледзеўся да яго дзядзька Тонік, матчын брат са Снова.

– Нашто вам два, прадайце адзін трактар мне. Во гэты, навейшы...

Бацька трохі скрыпеў, але маці яго паджухвала.

– Праўда, Коля, нашто яны два?! Хваціць нам і аднаго, першага, што ты зрабіў...

Урэшце так і адбылося – прадалі трактар у Сноў. А на двары і на полі шчыраваў той самы першынец. Шчыраваў безупынку доўгія гады. Пасля бацькавай смерці маці неяк вымавілася нам з братам, што трактарок хоча купіць Мішка Семачкаў.

– Так я думаю, хай купляе, а грошы вы патраціце на памятнік, калі будзеце прыкладаць бацьку. Ён яго зрабіў, гэты трактарчык, так хай ён яму будзе памяццю... А то саржавее без патрэбы...

Так і зрабілі. «Першынец» прадалі Мішку, а выручаныя грошы скарысталі на аплату помніка. Гэтым займаўся брат Толя, ён хораша ўпарадкаваў



З ваенным лётчыкам Віктарам Афанасьевічам Магдалёвым каля трактара. Пачатак 1980-х.



Калгасныя фермы – бацькавы гады

магілу. Атрымалася, што яшчэ пры жыцці бацька паклапаціўся пра сваю памяць.

Трэба зазначыць, бо гэта важна для разумення тых дзён, што сваімі «тэхнічнымі праектамі» бацька займаўся ў маленькія прамежкі часу паміж працай у калгасе і бясконцымі клопатамі па гаспадарцы. Распарадак кожнага дня быў падпарадкаваны суровай неабходнасці зарабіць грошы, а значыцца, ад рання бегчы на трактарны стан, калі быў пры камбайне; потым, калі перайшоў у механікі па абслугоўванню тэхабсталявання на жывёлагадоўчых фермах, на даржнікі.

Там, на фермах, бацька затрымаўся надоўга, да пенсіі. Штодня, зімою і ўлетку, у дождж і завіруху, у мароз і гразь, ён падымаўся а палове пятай і спяшаўся на ранішнюю дойку. Бо трэба, каб выцягвалі гной транспарцёры, круціліся кормараздатчыкі, паступала вада ў стойлы. Тэхніка недасканалая, грубая, часта лопаліся ўсялякія рамяні, трэскаліся ад марозу трубы, лямантавалі даяркі... Але бацька цярпеў, трымаў на фермах парадак: па тры разы на дзень, раніцай, абедам і ўвечары, без аніякіх водпускаў нёс гэтую нялёгкую вахту дзеля дабрабыту сям'і. Заробак свой на той час лічыў някепскім – 100 савецкіх рублёў плаціў яму калгас за гэтую катаржную працу. Простыя сяляне, хто хадзіў за канём ці з граблямі, зараблялі напалову менш. Калі прыраўняць, то сто рублёў мелі вагу недзе як сто пяцьдзясят-дзвесце долараў сёння. Маці беражліва складвала заробленыя рубельчыкі паміж саматканымі пакрываламі ў шафе, пералічваючы іх з кожнага прыбытку. Бо прадавалі яшчэ то цяля, то свінню ці япрука штогод. Здавалі трохі яблыкаў, збіралі ў лесе летам ягады і таксама здавалі нарыхтоўшчыкам, якія шморгаліся па вёсках чародамі.

Грошы траціліся беражліва. У краме куплялі муку, «газу» (*керасін*), адзежу, абутак. Ні пра каўбасы, ні пра іншыя прысмакі паняцця не мелі. Марылі набыць уласны матацыкл, асабліва «Іж» іжэўскага завода, з Расіі. Але ж нават калі



Сялянскі дэпутат

і грошы збярэш, то яшчэ «дастаць» яго трэба. Бо свабодна «Іжы» не стаяць – нарасхват. Памог дзядзька Юрак, муж бацькавай дваюраднай сястры, цёткі Сашы Сяргеевай. Ён загадваў крамай у Аношках, выпрасіў для нас адзін матацыкл. Радасць была неймаверная, калі прывёз бацька на грузавіку, у скрынцы, збітай з новенькіх дошак, светла-зялёнага прыгажуна «Іжа». Статус сям'і ў вачах аднавяскоўцаў адразу падрос: мы перайшлі ў катэгорыю «багацейшых». Такія матацыклы меліся ў лічаных адзінках пасярод вясковых людзей. «Ну во, акрыялі мы трохі»,– дзялілася маці радасцю з блізкімі.

Дастатак, безумоўна, цешыў бацькоў і нас, дзяцей. Ды не меншай была яшчэ душэўная задаволенасць. Меліся да таго важкія аргументы. Расла павага сярод людзей, чуўся аўтарытэт пасярод начальства, бегла добрая памоўка аб сям'і. Бацьку гадоў, мо, з дзесяць запар выбіралі ад вёскі дэпутатам Казлоўскага сельскага савета. На агульнакалгасных сходах, што звычайна праводзіліся пасля дажынак, пастаянна вылучалі ў склад праўлення калгаса «Дружба», а пасля «Новае жыццё». Ён адносіўся к гэтаму проста, без асаблівага ўздыму і фанабэрыстасці. Як і раней, калі не быў у дэпутацтве, стараўся дапамагчы, асабліва удовам, адзінокім ці састарэлым. Людзі завітвалі на наш надворак і за тым, каб выгаварыцца, аблегчыць смутак, знайсці шчырую параду ці падтрымку ў роспачы. Бо само па сабе сялянскае існаванне было нялёгкім, праходзіла хай у непрыкметнай, але жорсткай канкурэнцыі

Дэпутацкае пасведчанне


ДЕПУТАТСКОЕ УДОСТОВЕРЕНИЕ № 11

Товарищ Дрягавец Николай Васильевич

избран депутатом Козловского

сельского Совета народных депутатов

от избирательного округа № 11

Председатель исполнительного комитета

Секретарь исполнительного комитета

Дэпутат Дрягавец М. В

карыстаецца на тэрыторыі Казлоўскага сельсавета правам бясплатнага праезду на аўтамабільным і водным транспарце рэспубліканскага падпарадкавання і на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту (за выключэннем таксі).

Депутат Дрягавец Н.В

пользуется на территории Козловского сельсовета правом бесплатного проезда на автомобильном и водном транспорте республиканского подчинения и на всех видах городского пассажирского транспорта (за исключением такси).

за зямлю, за працу, за траву, за бульбу – ды, лічы, за ўсё, нават за паветра. Каб вытрываць, «не скаціцца ў канаву», патрабаваліся сіла, смеласць, моцная вытрымка. Слабых у тым вясковым жыцці, пра якое я расказваю, не лашчылі, а, наадварот, часцей паддзявалі ботам ды нахабна садзіліся на шыю. Гэта, як у дзіцячай зграі: слабейшага ўсе імкнуцца штурхнуць, а за слёзы яшчэ болей ганьбяць. Прыходзілася і бацьку стаяць за сям'ю, за дзяцей, за маці.

На фронт яго забралі маладзенькім падлеткам з тонкай шыяй і нязграбнай постаццю. Якія мы ў васямнаццаць гадоў?! Ёсць фота з пачатку той ваеннай пары, калі на яго толькі напялі салдацкую форму. Вялізныя боты, шырокае галіфэ і цесная, упрытык, гімнасцёрка. Аніякай выпраўкі, адны слёзы з такога салдата. А з арміі вярнуўся падцяты і жылісты мужчына. Неяк у новай хаце, гадоў, відаць, з дзесяць пасля вайны, нядзельнай раніцай бацька падхапіў мяне пад рукі, падняў да столі:

– Давай, Вася, хапайся за бэльку! Падцягвайся на руках! Паглядзім, хто з нас мацнейшы!

Разы са тры ці чатыры я падцягнуўся і кішкаю павіс на бэльцы. Бацька зняў мяне на падлогу.

– Зараз я папробую, мо, што палучыцца...

Ён адною рукою ўчапіўся за бэльку і пачаў падцягвацца ўверх-уніз. Якраз зайшоў дзед Сяргей, яшчэ нехта з мужчын, здаецца Анцік Вінцусеў, таксама франтавік. Дзівіліся яны, гледзячы на бацькавы выкрутасы.

– На перадавой было не да фізкультуры. А вот ужэ як вайна скончылася, прамялі нас аснавацельно. У Германіі, а потым ужэ ў Расіі, пад Уладзімірам. І страявая, і фізкультура...

– Жукаў прыязджаў да нас у часць страчацца з салдатамі, як яго ў дзепутаты ў Маскву выбіралі, то ў ахрану к яму падбіралі самых лоўкіх хлопцаў. Так і мяне тожа ў «Віліс» пасадзілі суправаджаць яго машыну з аўтаматам...

Колькі разоў спрабаваў я паўтарыць бацькава практыкаванне і ў школьныя, і ў студэнцкія, і ў сталыя гады, а нічога не атрымлівалася. Павісну на адной руцэ, а падцягнуцца не выходзіць – не тая загартоўка. От Маша, дачка, можа, і далей за дзеда пайшла, бо тое, як яна ўмее спраўляцца са сваім целам, займаючыся ёгай, здзіўляе і зачароўвае.

Характарам бацька быў справядлівы, сяброўскі і спагадлівы чалавек. Але калі бачыў падман, сутыкаўся са знявагай ці

абразай, то не цярпеў і хвіліны, рашуча і смела бараніў свой гонар, сям'ю, маёмасць і гаспадарку.

– Каб не Коля, то ў нас нічога б не палучылася. Але яго паваройваліся. Ён за мяне заступаўся і за сям'ю гарою стаяў усю жызню.

– Ніколі не забудуся, як Наташа на хутары выпраўляла мяне бярэмянную перабіраць картоплю калхозную. Ды яшчэ наказвала: прынясі што ў кошыку дадому. А брыгадзір, глянь, раднёю нібыто прыходзіўся, угледзеў, што палажыла ў кошык трохі картоплі, падскочыў, ды як саўгане мне ў плячук... Я пакацілася на зямлю перад усімі... І так мне стало брыдко, абідно, так пасарамаціў мяне перад людзьмі...

– А во, прыехаў Коля на выхадныя з Гарадзеі, я яму ўсё і расказала... Што тут нарабілася! Заяўляецца ў хату і гэты, што брыгадзірам быў. То Коля як ухапіў яго за каўнер, а той тожа крэпкі мужчына, але паляцеў цераз парог на вуліцу покатам... Я табе, кажа, пакажу, як над ею здзеквацца! Толькі папробуй яшчэ раз – жывым не застанешся!

– Бацька мяне бараніў, а то не выжыла б тут, у Хадатавічах. Нашыя ўжэ хацелі мяне забіраць. Праўда, матка мне казала: Зіна, Коля цябе адстойвае, у абіду ня дасць. Ён і не даваў... Праўда, ніколі не даваў у абіду. От, каб яшчэ пажыў хоць трошкі, а то адной так цяжка...

За бацькавай спіной утульна і зацішна было і нам з братам. У памяці такі выпадак. Мне каля пяці ці шасці гадоў. Лета, бацька на рабоце, маці на сотках. Домка, суседка цераз вуліцу, сабрала людзей на пабудову хлява. Мне няма асабліва куды падацца, цікавей за ўсё стукат сякер, размовы будаўнікоў, і я шморгаюся да іх, кручуся каля сабачай буды, перамаўляюся са здаровым домчыным Шарыкам. У чарговы мой візіт да хлява Шарык «абедаў» – Домка паставіла перад ім шырокую міску з ядой. Спатрэбілася ж якраз у гэты момант мне яго зачапіць. Сабака грозна рыкнуў, кінуўся на мяне. Працяў клыкамі нагу, паваліў на зямлю, пракусіў спіну каля пазваночніка і ашчэрыў сківіцы, каб ухапіць за горла. Прама перад вачыма я ўбачыў яго шалёныя вочы і адчуў гарачы подых смерці з шырокай зубастай пашчы.

Што я быў на імгненне ад смерці, нават і цяпер для мяне несумненна. Здаравенная псіна ў адзін момант перакусіла б мне гарляк. Не ведаю, якім чынам, абсалютна інтуітыўна, аднекуль з генетычных глыбінь дзіцячага розуму імгненна

Тут, дзе Домчын хлеў, кружыла мая смерць



знайшлося рашэнне ў адказ на смяротны выклік звера. Я з усяе сілы, як размыкаецца сцятая пружына, засадзіў у крывава-чырвоную сабачую пашчу свой маленькі, але прутkі кулак. Уваткнуў глыбока, па самае сутыкненне сабачых сківіц – так, што амаль уся рука аказалася ў пашчы звера, у самым гарляку, пасярод вышчараных зверху і знізу бела-жоўтых клыкоў. Гэта была адзіная і абсалютна правільная дзея ў той сітуацыі. Ніякім іншым чынам выратавацца было нельга. Пёс пачаў ікаць, задыхацца, сківіцы абмяклі, а я ўсё трымаў і трымаў кулак у яго гарляку, пакуль не падбеглі рабочыя, што абедалі на траўцы непадалёку. Акрываўленага, мяне адцягнулі ў бок; на гоман, адчуўшы нядобрае, прыбегла маці і ў роспачы загаласіла, згледзеўшы мой белы твар і крывавае цела. Раны былі глыбокія, бацька памчаўся за фельчарам. Мяне абмылі, вымазалі ёдам, абвязалі бінтамі.

Праз колькі дзён маці павяла мяне да шаптухі Ганны Якубчыкавай, каб «выгаварыла перапалох». Цётка Ганна ласкава агладзіла мой твар шаргаватымі далонямі, прытуліла да грудзей, нешта шаптала на вуха роўным голасам, абносіла соллю, прасіла сплюнуць тры разы... і вечарам я заснуў, а назаўтра сцішэла нага, памякчэла боль.

Прайшло многа гадоў. Я ехаў на машыне да бацькоў і за клубам, перад Высокай, згледзеў старэнькую цётку Ганну. Яна з палачкай паціху дэбала па сцежачцы збоч дарогі.

– Цётка Ганна, то сядайце ў машыну. Падвязу вас дадому...

– Так, няўжо эта Вася?!

– А я дак помню, цётка Ганна, як вы мяне выгаворвалі малого...

– Так і я помню, Васька. Такі ты быў перапуджаны тагды. Вой-вой... Ну то й дзякуй Богу, дзякуй Богу... Я ў кантору

хадзіла да прадсядацеля, каб саломы даў... А во ты спыніўся... Я дак ні разу на машыне ні ездзіла... Пяшком усю жызнь...

...Бацька не дараваў сабаку нападу на мяне. Месяцы мо праз чатыры, перад Новым годам, светлай марознай ноччу ён падпільнаваў Шарыка на ўскрайку сяла і трапным стрэлам скончыў яго баляванне на зямлі. Для гэтай аперацыі недзе пазычыў малакаліберку, каб не раскаціўся стрэл па ваколіцы і не віднеліся звонку крывавыя раны на сабачым целе. Куля там малая, праходзіць амаль без следу праз цела і сабачую поўсць. За сялом закапаў забітага сабаку ў снег. Домка, відаць, зразумела, чаму знік Шарык. Ды прамаўчала, бо цяжка сказаць, на чыім баку была праўда.

Ні маці, ні бацька ніколі не крычалі на нас, дзяцей. Больш хвалілі за любую карысную справу ці ўчынак. Нават у мае самыя «небяспечныя» буйныя падлеткавыя гады, калі пачаліся бойкі на танцах, выпіўкі «для смеласці» за вуглом ды познія вяртанні дадому са школьных вечароў ці клубных танцаў, бацька толькі прыгаворваў калі-нікалі: «Глядзі, Васька, ні лезь нікуды. Хай там другія п'юць і б'юцца, калі ім хочацца...»

Памятаю, у дзясятым класе, недзе перад выпускным, нас, некалькі «бравых» хлопцаў, запрасіў да сябе дадому малады фізік, толькі з інстытута, Валянцін Барысавіч Рабко. Ён неяк вельмі спора, ці не праз паўгода як прыехаў, ажаніўся на нашай мясцовай настаўніцы, распачаў будоўлю ўласнага дома, а з намі, старшакласнікамі, проста, па-хлапечаму, пасябраваў. Гэта было ў навіну, каб настаўнік так запанібрацкі сышоўся з вучнямі. Мы таксама палюбілі маладога і адукаванага фізіка. Выкладаў ён цікава і змястоўна. Тлумачыў складаныя рэчы зразумелым языком. Дый, увогуле, ён, яшчэ нядаўні студэнт, увасабляў сваімі манерамі, поглядамі, жартамі новы вобраз, стыль, подых незнаёмага часу, які мы тут, на сяле, дагэтуль не спачулі, але так праглі ім асалодзіцца.



Бацька, Мікалай Васільевіч Драгавец. 1975–1976 гг.

Таму запрашэнне пасядзець у Барысавіча падчас школьнай вечарыны было ўспрынята з уздымам. Закупілі, вядома, трохі «пладова-ягаднага». Засядзеліся амаль да раніцы, і дадому я прыплёўся п'янаваты ажно перад самым



Круглава



світанкам. Бацькі зрабілі выгляд, што нічога не чуюць. Скрозь сон, мо праз гадзіну, да мяне данеслася з кухні:

– Глянь, Коля, эта ж хлопец пад раніцу прыйшоў і, відаць, выпіўшы... Ня было такога ніколі... Я то ўсю ноч не спала, з боку на бок кідалася, а заснуць не магла ні мінюты. Усё роўна, як чула нешта нядобрае ...

За снеданнем я не мог глядзець бацькам у вочы. Яда не лезла ў рот. Было прыкра, што так усё атрымалася, што давялося ім панервавацца, што не выспаліся перад работай. Толькі вечарам маці між іншым выказалася: «Нешта вы там загулялі ўчора да рання. Глядзі, сынок, адно ня пі этай гарэлкі. Хай яна праваліцца! Які з яе толк...»

Ад бацькоў зыходзілі любоў, дабрыня, нястомны, схаваны глыбока ў сэрцы клопат аб нас. Адчуваючы гэта штодня, немагчыма вырасці чалавекам зачарсцвелым, няўдзячным, кепскім. Не забудуся, як у бацькі трасліся рукі, якой роспаччу быў ахоплены твар, калі ён лапатай параніў мне пальцы. Мы капалі торф на круглаўскім балоце. Мо аб тым варта сказаць і падрабязней, бо сама падзея – капанне торфу – па значнасці ў вясковым жыцці, як сяўба ці жніво.

Падхадзіўшыся з пасевамі і агародамі напрыканцы чэрвеня ці на пачатку ліпеня, усё сяло выходзіла на балота ў Круглава, што па жыліцкай дарозе. Перад тым мужчыны размячалі дзялянкі на кожную хату. Выходзілі поўнымі сем'ямі: і старыя, і малыя, бо торф да зімы, гэта як хлеб да стала – не абыдзешся без апалу ў сцюжу. Работа цяжкая. Спачатку трэба зрэзаць купіны, якія за сотні год праралі бясконцымі, пруткімі, нібы дрот, жыламі-каранямі ў балотную багну. Потым расчысціць пляцоўку, зняць старую, укаранелую траву і верхні слой дрыгвы. Толькі пасля адкрыецца чорна-смаляны, тлусты, як свежы здор, тарфяны пласт.

Калі чарнавата-шакаладныя тарпіны высахнуць, то стануць падобнымі да хлебных боханаў, будуць амаль бязважкімі ў руках. Але яны зусім іншыя, калі іх дастаюць з мокрай і хісткай паланіны. Зіхацяць пад сонцам, што адкормленыя чорныя рыбіны – кожная важыць не меней за паўвядра вады; наровяць выслізнуць з рук, бо мокрыя і тлустыя. Паклаўшы на насілкі сем-восем тарпін, жанкі і дзеці – гаспадар рэжа тарфяныя цаглiны ў яме і выкідае наверх – выносяць іх на бераг і там, на траве, складаюць «домікамі» для прасушкі. І рэзаць, і выкідаць торф з ямы наверх, а яма становіцца ўсё глыбейшай, стаяць даводзіцца

ў вадзе,— праца непасільнай цяжкасці. Асаблівая напруга — выбірацца з цяжэрнымі насілкамі па хісткай балотнай сцежачцы на бераг. У насілкі ўпрагаліся мы з маці. Я, амаль дзіця, але больш нікога няма ў сям'і. «Памагай, Васька, хоць патрохі, але будзем насіць з табою...» Непад'ёмныя насілкі хістаюць мяне, як вецер маладое дрэўца, водзяць у бакі, здаецца, вось-вось завалюся ў багну. Ногі таксама трымцяць, нібы напятыя струны, але іду, трымаюся стойка і цярпліва... Ды хіба я адзін такі?! Вунь усе з дзецьмі, усе пнуцца, як толькі могуць.

«На торп» жанкі прыхоўвалі ў хатах добрыя скібы сала, верчыкі засушанага мяса, а мужчыны загадзя вастрылі і кляпалі лапаты, разакі, майстравалі насілкі. Звонку гэта была вельмі прыгожая і незабыўная выява. Балота гудзіць, як той вулей, ад чалавечых размоў, покрыкаў, жартаў; здалёку свеціцца румянкавым полем ад белых жаночых касынак...

Сям'ёю выйшлі і мы на сваю дзялянку. Узяліся з бацькам за купіны. Я цягнуў купіну на сябе, а бацька вострай лапатай падразаў карані. І трэба ж здарыцца, што перад самым яго замахам я перахапіў рукою купіну ніжэй. Лязо лапаты, як брытва, чырканула па маіх пальцах. Здалося на момант, што іх апяклі кіпятком. Заструменілася кроў. Я ўскрыкнуў ад болю, а яшчэ больш ад таго, што спалохаўся. Бацька збялеў, кінуўся да мяне.

— Што, сынок, моцна я цябе зачапіў?! — не сваім голасам запытаўся ён. — Пакажы руку...

Пашанцавала, бо вострая лапата слізганула па скуры, косці засталіся цэлымі. Руку перавязалі белаю касынкаю, што зняла маці з галавы. Дзень быў канчаткова сапсаваны. Панурыя, мы пайшлі дадому. Бацька быў сам не свой. Не еў, не размаўляў, неяк сцішыўся і ўвагнуўся ў плечы. Ён разумеў, што мы на імгненне былі ад трагедыі. Каб трохі ніжэй прайшла лапата, пальцы паляцелі б у балота. На шчасце, абышлося. У руцэ пякло, а яшчэ болей пякло на сэрцы — шкадаваў бацьку і маці за іх знерваваны дзень ды заплаканыя вочы. Але што зробіш?!



Безназоўнае...

Так мы выхоўваліся ў сям'і. Прыклад бацькоў – у працы, у адносінах паміж сабою, з вяскоўцамі, з раднёй, ва ўсёй безлічы паўсядзённых спраў і сутыкненняў – быў для мяне і брата галоўнай кнігай жыцця.

Рабі прыстойна сваю справу, беражы сям'ю, дзяцей, жонку, забяспечвай і абараняй іх, з дабром ідзі да людзей, знай цану свайму слову – на гэтай філасофіі будавалі сваё жыццё бацькі, з такім разуменнем свету яны выправілі мяне і брата ў самастойны шлях. Ні бацька, ні маці ніколі спецыяльна не вучылі нас якой-небудзь навуцы паводзін, не тлумілі галовы бясконцымі парадамі ці перасцярогамі: гэта можна, а тое нельга... Адно прыпамінаю, што даволі часта, калі я ўжо «прабіўся ў начальства», як казалі на вёсцы, прыязджаў дадому, і мы падымалі за сталом па чарачцы, бацька, задаволены, вымаўляў:

– Я то мячтаў, каб вы вывучыліся. І мячта мая, можна сказаць, збылася. Давольны я этым, што сын выйшаў у людзі. Але, як казаў наш палітрук на фронце, разумны быў чалавек, чарнаваценькі такі яўрэйчык: какім бы ты умным ні был, а людзей слушать надо...

Гэтыя павучальныя словы аб тым, што людзей трэба слухаць, бацька, нібыта не наўмысна, але ва ўсе свае гады

часцяком прыпамінаў пры мне. Здавалася, што ён іх кажа так сабе, мімаходзь. Пазней дайшлі да мяне і сэнс саміх слоў, і разуменне таго, чаму ён паўтараў не аднойчы такую, здавалася б, простую і даволі ардынарную думку. Бацька, хоць і далёкі ад маіх спраў, але тонка і глыбока разумеў іх сутнасць, гэтак жа, як разумеў сутнасць майго характару: што магу «завесціся з паўабарота», што рэзка падчас прымаю рашэнні, што лезу поперак усіх у рызыкоўныя справы...

Жыццё складаецца з простых рэчаў: са слоў, што гаворым, з ацэнак, што выказваем, з учынкаў, што робім штодня. Пагарачыўся, паспяшаўся з рашэннем, адвёў вочы ў бок, калі патрэбна сказаць праўду, пагардліва выказаўся пра знаёмага, рассыпаў гарохам непатрэбныя словы... Вось і дзея, працэс, жыццё... Гэта флёр і небяспечная раманты-ка –верыць у прыгожае жыццё, якое існуе недзе. Самае цяжкае – навучыцца самаму простаму: жыць па-людскі пасярод людзей, жыць так, каб зручна было не толькі табе, а і тым, хто вакол цябе. Чым больш мне становіцца гадоў на гэтым свеце, тым часцей прыпамінаю гэтую бацькаву параду і наказваю аб тым сваім дзецям: якім бы разумным ні быў, а людзей слухаць трэба, прыслухоўвацца...

Не аднойчы заходзілі ў сям'і гаворкі пра каштоўнасці чалавечага жыцця, пра багатых ды бедных, пра вясковых і гарадскіх, пра паноў і шляхту. Трэба зазначыць, што ўвогуле гэтая тэма не сыходзіла з сялянскіх размоў, асабліва багацце і беднасць. Ніхто з простых вясковых людзей ніколі не адчуваў сябе багацеем, з пакаленняў толькі і марылі аб тым, каб пажыць хоць колькі часу па-панскі. Але мары гэткія так і заставаліся марамі, адкладваліся на туманныя далі – мо, калі Бог дасць, дзеці вывучацца ды пабагацеюць... А так карцела хоць разочак зазірнуць у панскія пакоі, хоць на імгненне пабачыць тое заможнае шляхетнае жыццё. Ды не атрымоўвалася... Адзін раз толькі хадатаўскія жанчыны і маці разам з імі «ўдастоіліся пашаны» пабываць у Радзівілаўскім замку ў Нясвіжы. Сена там спатрэбілася тэрмінова зграбці, дык калгас іх туды накіраваў на работу.

– От, паглядзелі мы на палац! Ой, там-то й будынак! Якім панам трэба ўжэ быць, каб так жыць... Унутры-то нам нічога не паказалі, нат не падпусцілі...



Удваіх. Ва ўсе гады. Здымак Віктара Альшэўскага, 2004 г.

Адно заставалася вясковаму люду: пераказваць у бяседах сваіх пачутыя дзе гісторыі пра панскае багатае жыццё. Гаварылі заўжды на гэтую тэму з ахвотай. Дзівам было, калі надарыўся паказ па тэлебачанні бразільскага серыяла «Богатые тоже плачут». Вёска на гэты час вымірала. Як прыварожаныя, людзі ўтароплівaліся ў тэлевізары. Упершыню ўгледзелі жыццё, быт, адносіны ў тых самых багатых недасягальных палацах...

Здавалася, што з пачаткам перабудовы савецкага ладу, калі дазволілі станавіцца багатымі, вясковыя людзі кінуцца самі і будуць штурхаць дзяцей у гэтую пагоню за здабыткамі. Але ж адбылося трохі інакш. Неяк у размове дома ў тыя дні я пры бацьках выказаўся брату: «Бяры, Толя, зямлю, станавіся ўласнікам, фермерам. Тэхніку ты знаеш, сельскае рамяство таксама...»

Размова доўжылася, а потым маці спакваля загаварыла, нібы ў роздуме, што багацце не робіць чалавека шчаслівым.

– У нашых, у Малаедах, была пры паляках эта собствяннасць. Што з яе толку, адно душыліся на ёй бяз канца, свету не бачылі. От, е што трохі, то й добра, хваціць і гэтага. Спажывіце толькі здаровыя. Атдыхніце лепей, у цэркаў схадзіце нядзелькаю...

Выказаўся і бацька.

– Трэба, сынок, жыць, як усе людзі жывуць. Нашто, каб з-за этай собствяннасці на вас пальцам паказвалі, завідавалі ды языком паласкалі...

Жыць, як людзі жывуць. Яшчэ адзін бацькаў запавет, па якому ён сам шчыра прайшоў зямною дарогаю. Бацьку заўжды засмучалі чужая сквапнасць, пагарда, жаданне выпендрыцца, паказаць сябе разумней за іншых. Можа,



«Паглядзелі мы на палац!»

такое пайшло і з фронта. Але больш пэўна, што перадалося па крыві, ад дзеда Васіля, ад прадзеда нашага Андрэя, ад тых самых Яські ды Сцяпана, што першымі афіцыйна азначыліся пасярод радзівілаўскіх людзей. На зямельцы-матухне ды пад сінімі нябёсамі станавіліся яны людзьмі – з пакалення ў пакаленне пранікаючыся і адкрываючы для сябе высакародны і гаючы дух зямлі і неба. Інакш чалавекам не станеш.

Неяк мы з братам ухапіліся за добрую, як нам падалося, задуму: збудаваць для бацькоў новы дом узамен іх састарэлай хацінкі, зляпанай са старога гумна на гібелым, амаль з пяску ды камення, фундаменце. Маці не аднойчы жалілася:

– Якія ж тут вакенцы! І шыбы ўсе пагнілі, абы з чаго ўсё рабілася... Ніхто рубельчыка бацьку не даў... А дзе ўзяць маця р'ялы бяз грошай? Ён, бедны, круціўся, як мог, з адных палак страху зляпіў...

У гэтай хацінцы выраслі мы з братам, было нам у ёй утульна і добра. Малады і крэпкі бацька падлатваў хатку, укрываў падмуроўку да зімніх халадоў, але з гадамі ўвіхацца каля хаты яму станавілася ўсё цяжэй. Хата паціху гібела, шкоды яе шырыліся і значыліся ўсё выразней. Ён і сам не аднойчы выказваўся за сталом пры сям'і: «Хата наша слабая, ветру баіцца, студзіцца завірухамі. Але нам, старыкам, сайдзёт...»

Так і цяклі дні ды месяцы, пакуль не рашыўся будавацца Толя. Ён жыў у калгасным трохпавярховым доме ў Аношках, на цэнтральнай сядзібе калгаса «Новае жыццё», дзе працаваў на розных пасадах – ад інжынера да намесніка старшыні. Яго кватэру мы называлі «шпакоўня». Бо яна мясцілася вышэй за іншыя, на трэцім паверсе, пад самай страхой. Брат, аднак, улаўчыўся яшчэ трымаць невялічкую гаспадарку ў калектыўным хлевушку, што належаў гэтай трохпавярхоўцы і стаяў метраў за пяцьдзясят ад пад'езда. Штодня тры разы, раніцай, абедам і ўвечары, яны з жонкай Тамарай бегалі туды-сюды па бетонных прыступках з вёдрамі да парсюка. Глядзець на гэты працэс збоку, свежымі вачыма, было цяжка, жахліва і самотна. У кожны свой прыезд да брата я жахаўся душою, калі ён порстка шугаваў па лесвічных пралётах з паўнюткімі і цяжкімі вёдрамі ў руках. Пасля цэкоўскіх і саўмінаўскіх кабінетаў такія сюжэты ўражвалі нават мяне, па сутнасці,



«Якія ж тут вакенцы! І шыбы пагнілі...»

генетычна вясковага чалавека. А што гаварыць пра далёкіх ад вясковага побыту людзей!

Памятаю скамянелыя твары амерыканскага фермера і яго жонкі, што гасцявалі ў брата на пачатку 90-х, падчас перабудовы. Тады ладзіліся адносіны з Амерыкай, і братаў швагер Вася Гадун, галоўны інжынер з суседняга саўгаса «Друцкаўшчызна», прабыў месяцы са тры ў амерыканскага фермера ў штаце Міссуры. Вучыўся, як трэба абыходзіцца з пшаніцай. У сваю чаргу рашыўся і фермер прыехаць да яго ў госці, паглядзець на невядомы край. Завіталі яны і да Толі ў Аношкі, у яго «шпакоўню». Калі зайшлі ў пад'езд і глянулі на пашэрпаныя сцены, абабітыя прыступкі, перакрыўленыя дзверы з пабітым шклом, на заляпаныя боты перад кожнай кватэрай, з якіх тырчэлі анучы, працятыя пахам французскага «ракфора», то неяк прымоўклі, сцішэлі, нібыта патрапілі ў дрымучы лес, дзе адна небяспека і шастаюць воўчыя зграі. Я і Галя, жонка, стаялі побач з імі і добра гэта ўсё бачылі.

Потым за багата накрытым сталом і праз колькі кілішкаў гарэлкі яны спакваля пацяплелі, пасмялелі і асцярожна запыталіся: ці ўсюды ў нас такія ўваходы ў дамы, бо, можа, гэта такі звычай: пад'езд заплямлены, а ў кватэры ідэальная чысціня... У іх, у Амерыцы, вельмі важна, каб быў чысты

пад'езд... Скажу яшчэ, калі ўжо прыпомнілася гэтая амерыканская сям'я, што сапраўдны шок яны спаткалі па дарозе ў стольны горад Кіеў, куды папрасіліся на экскурсію. На адным з прыпынкаў зайшлі ў дарожную прыбіральню – ад уражанняў ледзь не страцілі прытомнасць. Аб тым пазней расказаў нам швагер Вася...

Але я трохі адхіліўся ад свайго расказу. Мо і пасля амерыканцаў выйшла ў нас прынцыповая размова з братам: хопіць жыць у «шпакоўні», трэба ставіць сваю хату. Так зачалася добрая справа, а калі пра яе меркавалі, то падбегла яшчэ адна неблагая задума: а што калі заадно і бацькам новую хаціну паставіць? Хай невялічкую, але з цэглы, з высокай падмуроўкаю, свежаю падлогаю і дахам. Тым больш, што на сотках месца дастаткова. Задума гэтая нас захапіла, і мы, нават не гаворачы нічога бацькам, запрасілі з братам на вясковую сядзібу начальніка нясвіжскага ПМК, добрага беларуса і будаўніка, якога ведаў Толя, каб нагледзець месца для пляца. У нас чамусьці не было і долі сумневу ў бацькоўскай згодзе.

Мы хадзілі па сотках, мералі крокамі то ўлева, то ўправа. Бацька моўчкі назіраў за нашымі шчыраваннямі. Потым, калі ад'ехаў будаўнічы начальнік, ён, упарта гледзячы нам у вочы, запытаўся:

– Што эта вы, хлопцы, задумалі – хату новую ставіць? Не займайцеся ярундой! Нам з маткаю хваціць нашай старой хаты. Ня трэба тут аніякіх разгавораў і старанняў!

Пачалі нешта тлумачыць, што хатка будзе невялічкай, што хоць на старасці не трэба печ паліць штодня, зробім паравое ацяпленне ды кацёл з аўтаматыкай на салярцы паставім...

– Ну да, нам вы паставіце аўтамаціку, мы будзем жыць у новым доме, а людзі што скажуць?! Глядзець у наш бок перастануць, во што будзе! Скажуць, бачыш, дзеці ў начальстве, дык і бацькоў панамі зрабілі. І нашто нам такая жытка?! Мы тут пражылі вунь сколькі, а цяпер пад старасць ненавіснымі ўсім станем?!

– Не, такое палажэнне мне ня трэба... Дзякуй, сыночкі, вы й так аб нас забоціцяся, а дом не патрэбен. Абыдземся! Колькі нам ужэ засталося тут хадзіць?! От, Толя хай ставіць хату, яму трэба, у яго дзеці малыя... А нам і так сыдзе... Трэба жыць, як усе людзі жывуць...



З пляменніцамі Волькай і Таццянай. Май 1998 г.

– Гляньце, які вупар наш бацька, – гаварыла пасля размовы маці. – Яго не перапрэчыш, як упрэцца ва што, то нічога не дакажаш яму. Кажы ні кажы, плач ні плач...

Маці мо і хацела, каб збудавалі мы новую хацінку, ды сэрцам яна разумела бацькаву праўду. Таму і прыняла яго размову, не сказала яму слова папярок. Астылі і мы наконт новай хаты. Так пацэліў бацька сваімі словамі ў нашыя душы, што не толькі астудзіў гарачку «ламаць ды бурыць», а і прымусіў у роздуме сваім часцей звяртацца да вечных пытанняў чалавечага існавання на зямлі, пасярод людзей.

Хто ты, чалавек, навошта жывеш, навошта сварышся, злуешся, навошта корпаешся і бяжыш за прыбыткам ад раніцы да вечара, а не прыпомніш нават, ці аддаў ты што бліжняму, ці адарыў каго прыязнасцю і добрынёй... Спыніся, падымі галаву да неба ды зазірні сам сабе ў душу. Дзеля чаго ж усё-ткі жывеш на гэтым свеце?!

Прызнаюся, у апошнія гады мне бывае няёмка і нават сорамна перад людзьмі, калі прыязджаю да маці ў Хадатавічы. Сорамна за сваю звонку здатную машыну, за неблагі побыт і выгляд, за добрае адзенне і бялюткія чыстыя рукі ды пальчыкі... Бо ў людзей, што тут, на вёсцы, засталіся, што аддалі свае лепшыя гады дармовай працы на дзяржаву, у здабытку толькі пахіленыя хаткі, бязлітасная старасць ды надзея на невялічкую пенсію, што прынясе паштальёнка. І ўсплываюць у памяці бацькавы словы: трэба жыць, як усе людзі жывуць...

Так і робім, стараемся з братам жыць па бацькаваму запавету. Я сышоў з дзяржаўных пасад у 1994 годзе, пасля адстаўкі ўрада Вячаслава Кебіча. Брат Толя жыў каля бацькоў, у вёсцы Аношкі, заставаўся на дзяржаўнай службе. Доўгі час выбіраўся старшынёй сельскага савета ў Грыцькавічах, пасля старшынёй Нясвіжскага раённага савета дэпутатаў, Нясвіжскага сельсавета. Зараз – першы намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама, кіраўнік сельгаскамітэта. Жыве ў Нясвіжы.

Прыстойна і сціпла, так, як жылі бацька і маці, са свайго заробку. Не лезе ў начальства, не набіваецца ў «сябры» да важных асоб. Стараецца чэсна і з толкам рабіць сваю справу, дапамагае людзям, асабліва старым і немагушчым. Аніяк не можа прайсці каля чужой бяды. Не было выпадку, каб не прыпыніўся, праехаў міма, не падвёз чалавека па дарозе. Пакінуў аб сабе добры след у Грыцькавічах. Адбудаваў там дзіцячы садок, аздобіў могілкі, спрыяў, каб адкрылася закінутая старая царква. Мае падзяку за гэта ад уладыкі Філарэта, беларускага мітрапаліта.

Брат штодня поўны спраў і клопатаў, несупыннага руху. Калі маці засталася адна пасля смерці бацькі, Толя па колькі разоў на дзень завітваў да яе, абыходжваў, разганяў яе сум. Абавязкова тэлефанаваў мне, спавядаў пра маці.

– Глянь, Вася, Толя ўецца каля мяне, усё роўна як уюн які... Пашукаць такого хлопца трэба... Ня кожны так будзе матку глядзець,– з затоеным гонарам спавядалася мне штораз маці.

– Ён то па бацьку пайшоў. Ты ўжэ больш да навукі, а ён то да цехнікі от ахвочы. Сядзеў бы й сядзеў у гаражы каля гэтых мотораў ці каля трактара. І ўсё ўмее, за што не возьмецца, усё наладзіць, усё зробіць. Ох, спраўны! Маладзец! З ашуканцамі ці з п'яніцамі не звяжацца, не... Да толку... Дзякаваць Богу трэба за такога хлопца...

Сапраўды, брата не цягнуць ні дамы адпачынку, ні марскія далі. Свае выхадныя і адпускныя дзянькі ён з асалодай корпаецца каля тэхнікі. І па адукацыі – інжынер. Скончыў у Мінску Інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Адрабіў на розных інжынерных пасадах у калгасе «Новае жыццё» не адзін год. Таму і не дзіва, што сабраў сваімі рукамі з выкінутага на сметнік спрынжыноўку, сеялку, бульбакапалку. Калі вясна ці восень, саджаць ці капаць бульбу, жаць жыта, араць поле – на надворку чэргі людзей:

– Памажы, Толічак, коней няма, а тут во пагода стаіць... Можа пад'едзеш на трактары...

Нікому Толя не адкажа, не возьме ні рубельчыка за помач. Разгоніць, сажне, заарэ... Такое ў яго разуменне свету.



Брат Анатоль з жонкай Тамарай (справа). Злева Галя. 2014 г.

З братам у нас шчырыя адносіны. Я ведаю, што ён пры нагодзе падзеліцца са мною апошнім кавалкам, таксама, як і я з ім. Заўсёды мы стараемся дапамагаць адзін аднаму, часта бачыцца, меркаваць пра справы. У яго добрая сям'я. Дочкі, Вольга і Таццяна, скончылі вышэйшыя ўстановы, жывуць у Мінску; прыязная жонка Тамара з нашых Хадатавічаў, з працавітай прыстойнай сям'і. Ад кораня ўсё ідзе, ад кораня...

...Недзе ў красавіку 2006-га, за два месяцы да смерці, бацька, перамагаючы нямату, настойліва тупаў за мною з палачкай да веснічак, каб праводзіць на Мінск. Трохі шарэла. Імглістыя, напоўненыя маруслівым дажджом хмары чарадою плылі за лес, на Даматканавічы і Клецк. Бацька стаяў каля мяне прыгнуты, блёклы тварам, схуднелы. Некалі шырокія і моцныя далоні выглядалі недарэчнымі сухімі ашчэпкамі, праз якія нязвыкла вытыркнуліся пужлівай сінявою вугрыстыя жылы. Хвароба даймала яго, нястомнага ў працы, адданага сям'і, прыгожага і спраўнага ў свае, здаецца, зусім нядаўнія маладыя гады.

Я моцна абняў бацьку, прытуліўся да твару, пацалаваў у пабітую шчаціннем шчаку. Я так яго любіў, любіў заўжды і так шкадаваў у гэты момант, бо разумеў, што смерць кружыцца над яго галавой. Слёзы працялі мае вочы, шэрым туманам пакрыліся і зямля, і неба, і лес...

...Мы стаялі так мо з хвіліну ці болей, калі я пачуў яго словы: «Беражы сябе, сынок!» Голас быў яшчэ выразны, хоць і прабівалася глухаватая хрыпата. Ён ніколі не казаў мне такіх слоў раней. Бывала, папярэджваў, ведаючы мой



Бацька памёр. Вясковыя жанчыны на нашым надворку. Злева направа: Валя Баровікава, двоюрадная сястра маці, Аня Любіна, суседка, Маня, родная сястра маці, Фанька Базылёва, суседка



характар: «Не гарачыся...», калі зусім малакасосам, пасля першага курса, сабраўся ў Нарыльск са зборнаю шайкаю «дзікіх» вандроўнікаў за грашыма; «Не лезь першы...», «Не спяшайся...» А тут вось так: беражы сябе...

Сказаў і мо ўпершыню засяроджана і працягла паглядзеў на мяне, не адрываючы вачэй. Нібыта развітваўся і хацеў запамятаць, захаваць мой вобраз для той, незямной існасці, дзе ўжо мы ніколі болей не сустрэнемся. Сэрца маё здрыганулася, целам і душою я зразумеў, што гэта апошні бацькаў запавет мне на далейшы час. На жыццё без яго, без бацькі...

Праз два месяцы, ***16 чэрвеня 2006 года***, бацькі не стала. Ён памёр на нашых з братам руках у бальнічнай палаце, у Нясвіжы. Цёплым суботнім днём мы пахавалі яго на хадатаўскіх могілках. У тым самым радочку, акурат каля роднай сястры цёткі Ядзі. Праз мо дваццаць ці трыццаць метраў ад маці – бабы Наташы, ад бацькі – дзеда Васіля, і дзеда Андрэя, нашага з братам прадзеда. Ды куды ні кінь позіркам, то вакол усе свае, тутэйшыя людзі. І родныя, і суседзі, і прыяцелі... З кім аралі, спраўлялі народзіны і вяселлі, гаманілі каля калодзежа, ездзілі да млына, выганялі кароў, забівалі пад зімку япрука...

Недалёка ад нашых ляжаць цётка Надзя, мая хросная маці, і дзядзька Міша Анцін, вышэй – Валя Чарнабаева, убок – Коля Твароўскі, Анютка Сашыкава, Толя Максімаў. Яшчэ бліжэй Ярэнка Дзюбікава і Стась, яе брат. Трохі далей – Мішка Семачкаў, Васька Костусеў, Маруся Сяргейкава, Коля Яўгенеў... Ад лесу – Сцяпанчыкавы, Юзік і Жэнька, недалёка стары Чарнабай, бліжэй к дарозе – ляснік Пеця і Волька. У тым жа радочку дзед Сяргей і Мар'я... Ды і не злічыць! Усе яны тут, на могілках, зараз радня, паяднаныя навек брацця ды сёстры.

А праз сем гадоў пасля смерці бацькі, 1 студзеня 2014-га, лягла ў радок каля яго і маці. «Пара ўжэ мне да Колі перабіралась», – усё часцей выказвалася яна перад намі пасля яго сыходу. Сумна і адзінока стала ёй на зямлі. Як ні стараліся мы з братам яе суцешыць, ды не атрымлівалася. Мы разумелі, што ніхто і нішто не замесціць ёй у жыцці яе Колю. Хоць і радавалася нам, з ахвотай меркавала пра справы, клапацілася

Ізноў разам



ўнучкамі, а вочы ўсё роўна зацягнуты смугою. Нікуды не хацела з хаты. Толькі калі зусім абнемагла, пераехала, і то пад вялікім прымусам, да брата ў Нясвіж. У нашу апошнюю сустрэчу, калі толькі зайшоў да яе ў пакойчык, маці неяк дапытліва паглядзела на мяне і спытала:

– То як ты, сынок, як твае дзяла?

Дагэтуль, раней, нашы сустрэчы звычайна зачыналіся не з такога пытання. Пра справы маці пыталася пасля, ды і то мімаходзь, а найперш пра ўнучак, пра Галю, жонку.

– Усё добра, мама. Усё пакуль добра, усё ў парадку.

– Ну то й дзякуй Богу, сынок. Хай так і будзе...

Хай будзе ў цябе, сынок, усё добра па жыцці... Пазней да мяне дайшоў сэнс матчыных слоў. Што гэта быў яе наказ, яе найпершае пажаданне мне і маёй сям'і перад нашым канчатковым развітаннем...

Маці памерла ***31 снежня 2013 года***, за чатыры гадзіны да навагодніх свят. Пахавалі мы яе прылюдна; прылажылі магілу мноствам вянкоў і кветак. Сталі яны, бацька і маці, зноў разам, адзін каля аднаго, як і былі пры жыцці.

А мае дні пасля іх смерці то ўсё часцей перарываюцца, нібыта маланкай, нечаканым прыпамінкам. То пачую жывы голас маці: «Хай добра ўсё будзе ў цябе, сынок, дай Госпадзі...» І кажу сам сабе: усё пакуль добра, мама, усё добра...

То раптам жывы бацькаў голас: «Беражы сябе, сынок!». Беражы, бо на табе, сынок, брат, жонка, дзеці... Ты ж за мяне там, на зямлі, ты старэйшы. За табою наша сяло, хата, наш край і наша мова... А яшчэ за табою магілы. Даглядаць трэба, каб не зараслі травою ды не праваліліся ў зямную бездань...



Товарищ красноармеец
Дроговец Николай Васильевич

Приказом Верховного Главнокомандующего
Маршала Советского Союза товарища Сталина
от „12" марта 1945 г. № 300
за овладение городом и крепостью Кюстрин
всему личному составу нашего соединения, в
том числе и Вам, принимавшему участие в
боях, ОБ'ЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ.

Командир части _____ [подпись]

Мы в битвах решаем судьбу поколений,
Мы к славе отчизну свою поведем!



ВАЙНА



Вайна

Мо не зусім да месца гэтае страшнае слова пасярод даволі мірных загалоўкаў майго споведу. Але не абысці мне яго, гэтае слова. Бо ўсё наша вясковае жыццё было працята вайною – нібы гаркавым дымам, што доўга ўецца над згарэлым паселішчам, уядаецца ў цела, у адзежу, у паветра. Хоць народзіны мае прыходзяцца на шосты год пасля перамогі над Германіяй, але і маленства, і сталасць, ды і ўвогуле ўсе пражытыя з бацькамі гады патыхалі гаркатою вайны, былі звязаны ды перавіты яе нябачнымі павуцінамі.

Усё вакол: размовы, успаміны, перашытае на цывільны лад ваеннае адзенне, вайсковы здаравенны матацыкл на нашым надворку, схуднелыя, змораныя работай вясковыя хлопцы з асірацелых сем'яў, заклапочаная турботамі суседка Домка Базылёва, удава забітага на фронце, пакалечаныя па вёсках падлеткі падчас раскурочвання кінутых мін, гранат ці снарадаў – усё аддавала палынным попелам вайны. Вайна на той час была галоўнай падзеяй у жыцці нашых людзей: і тых, хто ваяваў, і тых, хто перажыў нямецкую акупацыю. Яна ніколі не пакідала бацькоў, яе дух вітаў у паветры, жыў штодня, пакуль жылі яны, яе сведкі. Не абмінула вайна і нас, унукаў і дзяцей франтавікоў, бо мы варыліся пасярод яе подыху. Таму аніяк не абысці і не аб'ехаць мне вайну…



Дадому вярнуўся не падлетак – мужчына

Медалі і цацкі

Першую палову ваеннага ліха бацька спазнаў малад-зенькім падшпаркам на хадатаўскім хутары пры лесе і партызанах. У дзевятнаццаць апынуўся на перада-вой, у самым пекле. Маці перажывала акупацыю з бацькамі на малаедаўскім хутары. Бачыла бежанцаў, пужалася парты-зан-куфэрнікаў, што забіралі палатно і збілі да смерці дзеда, таілася ад нямецкіх салдат, што «гергеталі» на прывалах у сяле. Больш за ўсё перажывалі з маткаю, каб не патрапіць пад нямецкую аблаву, калі хапалі моладзь на работы ў Германію. Адзін раз зранку схавалася ў канюшыне перад аблаваю, а сал-даты з паліцаямі скмецілі росны след, пайшлі па ім.

– Ну і перапудзілася, як штык на мяне наставілі. Мо й застрэлілі б, каб не Анцік Баровікаў, што якраз тутака быў у нас, ды па-нямецкі трохі ведаў. То загергетаў з імі, што я яшчэ малая, так адчапіліся...

Пасля таго выпадку бацькі за хабар недзе ва ўправе пад-высілі матчын год народзін з 1927 на 1931-ы і дабіліся спраўкі з пячаткаю. Так яна ўбераглася ад няволі. Праўда, пасля, праз гады, перад выхадам на пенсію прыйшлося зноў даказваць, што нарадзілася раней.

– Забяры ты, Вася, бацькаў касцюм з ордзенам, хай у цябе ён будзе,– наказала мне маці праз колькі дзён пасля бацькавага

пахавання.—І дакуманты яго забяры, каб не валяліся. Толя хай забярэ фатакартачкі. Я старая, магу згубіць іх...

...Бацькаў касцюм сцішана вісіць у шафе разам з маім выхадным адзеннем. Раней ён таксама вісеў у шафе ў бацькоўскім доме, і толькі адзін раз у год маці здымала касцюм з вешалкі і падавала бацьку, збіраючы яго на «сабранне вецеранаў» у калгасным клубе з нагоды свята Перамогі 9 мая. Па непрадказальнаму абавязку, нават не ведаю, якім чынам я адчуваю гэтую патрэбу, адчыняю шафу, спыняю на імгненне погляд на бацькавым касцюме. Касцюм сціплы, не шыкоўны, з недарагой тканіны, падобны да іншых, такіх жа, што звычайна надзявалі ў святы вясковыя мужчыны.

Шырэй рассоўваю дзверцы. Святло шырокім аблогам захінаецца ў прыцемкі шафы, і чырванаваты праменьчык адтуль, з глыбіні шафы, з адвароту на бацькавым пінжаку адбіваецца ў маіх вачах. То прыветна засвяціўся, нібы вітаючыся са мною, пяцікутны франтавы бацькаў ордэн Чырвонай Зоркі—яго найвышэйшая салдацкая ўзнагарода.

Бяруся за вешалку, вымаю касцюм з шафы, углядаюся ў пяцікутнік—чырвань трохі пацямнела ад часу. Выціраю яе мяккім паркалёвым абрэзкам. Ад маіх рухаў зашорхаўся кругляшык медаля «За отвагу», што прышпілены ўбок ад ордэна над левай кішэнню пінжака. Палоскі тканіны на медалёвай рэтардзе таксама прыцямнелі, зацерліся. Пацінай часу пакрыліся выбітыя на медалі выявы самалётаў у небе, магутнага танка, словы «За отвагу» і «СССР». Трохі свяжэй выглядае прышпіленая следам медалёўка «Ветеран труда», «СССР», юбілейны ордэн Айчыннай вайны II-й ступені...



І ордэн, і франтавыя медалі абуджаюць у мяне рой думак. Выплываюць вобразы, размовы, адметкі сышоўшага ў нябыт маленства. Бацькавы баявыя ўзнагароды—***ордэн Чырвонай Зоркі***, ***медалі «За отвагу»***, ***«За освобождение Варшавы»***, ***«За взятие Берлина»***, ***«За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.»*** — былі першымі цацкамі, бо іншых цацак у нас, дзяцей франтавікоў, не было.

– Вася, то от дастычны і ўпарты быў малы. Крычыць, бывало, ні знаю, што рабіць. Дам бацькавы мядалі, то адразу ўспакоіцца,– дзялілася з жанчынамі маці.

Да медалёў і ваенных бацькавых дакументаў цягнула мяне і ў больш сталыя гады. А малым – дык трымаў у руках, углядаўся ў іх выявы, у радкі сталінскіх падзяк і спрабаваў перанесціся туды, у незнаёмыя мясціны, на берагі шырокіх рэчак з нязвыклымі назвамі Вісла, Одэр, дзе грукочуць пушкі, рвуцца снарады, дзе напяліся ў траншэях перад атакай адважныя чырвонаармейцы, такія, як на сталінскай падзяцы,– рашучыя, са штыкамі наперавес...

Вайна магутным валам, нібыта страшэннае цунамі, перашабурсціла сялянскае жыццё, парэзала яго на кавалкі – да вайны, у вайну і пасля вайны. У малечыя мае гады, на пачатку пяцідзясятых, ад яе яшчэ не астылі ні людзі, ні зямля, ні паветра. Мучыліся на дзялянках без моцных мужчынскіх рук гаротныя жанчыны-ўдовы; на палях каля могілак мы, дзетвара, шукалі патроны, а ў балоце гранаты; у лесе гулялі ў «нашых» і «немцаў» у яшчэ свежых акопах. На святы ці ў госці бацька надзяваў святочны пінжак з нямецкага генеральскага кіцеля. Ён быў светлага, ледзь прыкметнага зеленавата-сізага адцення з тонкага і мяккага сукна. Кіцель, белая шаўковая сарочка, шаўковы, тонкага вырабу, з яркімі чырвона-салатнымі палоскамі гальштук былі яго ваеннымі трафеямі і святочным адзеннем у бедны і нішчымны пасляваенны час.

– Помніш, Коля, якія казармы ў немцаў, дзе часці ваенныя стаялі? Каменныя, з цэглы, сцены тоўстыя, кругом усё на бруку... Ні то, што ў нашых...

– Помню, як жа не помніць, бачыў... Адно й пажылі там, пасля пабеды, у Германіі. А потым нашу дзівізію расфарміравалі, нас пад Уладзімір за Масквою ў голае поле; а ўжэ восень, гразь, дождж, прымаразкі, а мы ў палатках, робім казармы, лес цягаем уручную, на дошкі пілуем тожа рукамі... От захапілі голаду і холаду...

– У немца парадак усюды, дамы стаяць, што муры, дарогі да толку, платы, усё акуратна так, да толку. Каровы такія, што мы ні бачылі нідзе...

– Але нашы йшлі, як пачалося ўжэ наступленне, то йдуць і йдуць, канца не відаць, як хмары на небе... Дзе ж там немцу справіцца! Задавілі немца аднымі людзьмі. Ён ужэ й страляць змогся...

– Не, даваў, яшчэ й як даваў! Сапраціўляўся немяц упарта! Колькі танкаў нашых падбілі этымі фаустамі (*фаўст-патрон – нямецкае супрацьтанкавае ружжо, актыўна прымянялася гітлераўцамі падчас абарончых баёў на тэрыторыі Германіі*)! Гарэлі, як свечкі... Але дзе ж ім справіцца ўжэ з такою сілаю. Пад Берлінам, як дала наша арцілерыя, то ляжаць пабітыя за этымі фаустамі маладыя хлопчыкі – дзеці, адно што ў ваеннае адзелі... Ня было каму ўжэ ў немца ваяваць...

За год да нямецкага нападу, у 1940-м, бацька скончыў навуку ў сямігадовай школе сельскай моладзі ў суседніх Даматканавічах Клецкага раёна. Пры выдатных паводзінах меў чацвёркі па алгебры, фізіцы, геаграфіі, Канстытуцыі СССР. Няблага вывучыўся і польскай мове, бо да прыходу саветаў школа мела польскі накірунак.

– Недарма ўсё ж такі я снег таптаў завірухамі праз лес у Даматканавічы, што пот градам каціўся па спіне. Каб не было школы, то прапаў бы на фронце...

Нясвіжскі раён быў вызвалены ад немцаў войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе жорсткіх баёў на працягу месяца, з 29 чэрвеня па 27 ліпеня 1944 года. Сам Нясвіж адбілі 2 ліпеня часці 65-й арміі пад камандаваннем вядомага ваеначальніка П.І. Батава. З ліпеня ў газеце «Праўда» з'явіўся загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І.В. Сталіна з падзякай войскам за выдатныя баявыя дзеянні па авалоданню Вілейкай, Стоўбцамі, Гарадзеяй, Нясвіжам. Але немцы агрызаліся, контратакавалі, і таму канчатковае вызваленне ўсяго раёна адбылося толькі ў канцы месяца. Гэта важна адзначыць, бо 24 ліпеня 1944 года бацька быў ужо на прызыўным пункце ў Нясвіжскім райваенкамаце. Значыцца, яшчэ не прагналі канчаткова немцаў, як пачалі падмятаць на фронт падчыстую.

Было гэта так. Дзядзька Сашык, наш сусед, падлетак у вайну, добра памятае мінулае і тыя вызваленчыя дні.

– Гляджу, раніцай з-пад жыта скачуць да нашага агарода трое конных. Прывязалі коней, пытаюцца: немцы есць? Ды не, кажу, паўцякалі яшчэ ўчора, вунь туды, на Баранавічы, і паказваю рукою... Бачу ў іх звёздачкі на пілотках. Селі на коняй і назад памчаліся, а потым ужэ пайшлі салдаты, машыны... А дні праз тры і страбкі паявіліся, з аружыям, забіраць на вайну...



Справка.
Дана настоящая гражданину
Барановицкой области Несвижс-
кого р-на Буховского с/совета
деревни Хадатавичи Другавец
Николаю Васильевичу о том, что
он действительно имел связь
с партизанами и не участо-
вал ни в каких немецких арга-
низациях при аккупации, а
занимался сельским хозяйством.
Что подтверждают партизаны
своей собственноручной подписью
бригады имени Ворошилова
отряд „Котовского" следующие:
1)
2). подпись Кузнецов.
собственноручною подпись
партизана Кузнецова удостоверяю
Нач. штаба
отр. Жданова

Спраўка ад партызанскага камандзіра

Страбкамі, не ведаю чаму, вясковыя людзі называлі ваенных, што займаліся мабілізацыяй на фронт мужчын прызыўнога ўзросту. Тых, хто падыходзіў пад гэты ранжыр, збівалі ў кучкі і ў суправаджэнні ўзброеных страбкаў адпраўлялі ў ваенкамат у Нясвіж. Адпраўлялі – гэта занадта мілагучна, на самай справе вялі пехатою пад спякотным сонцам. Карміліся сухарыкамі, што паклалі ў торбу гаротныя матулі ці жонкі. Пасля Нясвіжа зноў пешшу з асмяглымі

губамі на зборны пункт у Заямнава ў Стаўбцоўскім раёне, бліжэй да чыгункі.Там збіралі мабілізаваных для пагрузкі ў вагоны – і бацьку, і яго аднагодкаў, хадатаўскіх хлопцаў Мікалая Драчана, Мікалая Гадуна (Колю Іванавага), Яўгена Гадуна (Геніка Яўгеневага), іншых.

Яму не споўнілася нават дзевятнаццаці. За плячыма сіроцтва, непасільная праца на гаспадарцы і чатыры гады пад нямецкай акупацыяй. Хутар бабы Наташы мясціўся ўдалечыні ад вёскі, блізка да лесу, таму і стаў партызанскім прыстанішчам. Бацька паведамляў партызанам пра немцаў, папярэджваў аб засадах, перадаваў пакеты камандзірам атрадаў. Некалькі разоў сам пападаўся пад агонь нямецкіх кулямётчыкаў. Ды абнесла. Аб гэтай яго патрыятычнай дзейнасці захавалася даведка ад партызан атрада Катоўскага брыгады імя Варашылава.

«Справка. Дана настоящая… Другавец Николаю Васильевичу о том, что он действительно имел связь с партизанами и не участвовал ни в каких немецких организациях при оккупации, а занимался сельским хозяйством. Что подтверждают партизаны своей собственноручной подписью…»

Лісток з вучнёўскага сшытка, пацёрты і пажаўцелы ад часу,– рэдкая рэліквія. Почырк, правапіс, адбітак самаробнай партызанскай пячаткі – ад усяго патыхае нязвыклым, незнаёмым духам, прыкметамі самой гісторыі.

Хоць сам бацька аб тым і не казаў, але я разумею, што ў сваім неасэнсаваным, хутчэй інтуітыўным палітычным кірунку ён быў больш схільны да рамантызаванага ўсходняга бальшавіцкага вектара, чым да польскага, каланіяльную сутнасць якога спазналі ў крэсах. Што гэта так, сведчыць яшчэ і такі яго ўспамін. Калі яны, хлопцы-прызыўнікі, пехатою кіраваліся ў Нясвіж, у ваенкамат, некаторыя гаварылі: давай пойдзем не ў савецкую, а ў польскую армію (*фарміраваліся і такія часці*), то, можа, выратуемся ад пагібелі на фронце. Але бацька не пагадзіўся на такія прапановы. Ён свядома і цвёрда ішоў на вайну, бо пэўніўся адным: калі прыйшоў вораг, то з ім трэба змагацца. А многія па дарозе ў ваенкаматы разбягаліся, іх лавілі, пад вінтоўкамі прыводзілі, а каго і не прыводзілі на прызыўныя пункты.

Быў у яго ваеннай біяграфіі яшчэ адзін паказальны ў гэтым сэнсе выпадак. Калі пасля вучэбнай падрыхтоўкі ў запасным палку ў Калодзішчах пад Мінскам пагрузіліся

ў эшалон, то на чыгуначнай станцыі ў Баранавічах выйшла затрымка ці не на двое сутак. Да роднай хаты зусім блізка, сорак кіламетраў з гакам – што за адлегласць для маладога хлопца на той час?! Узводны, пажылы сібірак, што пасля ранення зноў кіраваўся на фронт, дазнаўшыся пра гэта ад бацькі, адвёў яго ўбок і, гледзячы ў вочы, нетаропка вымавіў:

– Жаль мне тебя, парень. Оттуда, куда нас везут, возвращаются немногие. А ты молодой, да и по характеру вижу справный. Даю тебе увольнительную на сутки. Завтра к 18.00 быть на месте.

– Если опоздаешь, – ён апусціў вочы, сцішыў голас, – шуметь не стану, потом доложу начальству. После... Попозже... Понял?! Решай!



Хадатаўскія хлопцы на прыступках ваенкамата ў Нясвіжы. Каго ўдалося пазнаць: уверсе злева Міша Анцін, ніжэй Коля Гарлеўскі і Мікалай Яўгеневіч Напарадзе, пасярод траіх, Колік Міхаськаў. Астатніх не ведаю. Мо згінулі на вайне… Здымак з сямейнага архіва М.М. Каўшаля

– Я па-быстраму сабраўся, Геніка Яўгеневаго за руку, мы ў адном эшалоне аказаліся з аднаго сяла, і бягом на Сноў, Малаеды. А ўжэ восень, дождж пачаўся, але беглі пачці ўсю дарогу. У дванаццаць ночы быў на хутары. Выспаўся, паеў, пагаварыў з маткаю – і назад у Баранавічы, на эшалон з пяхотаю... Я то думаў пра наш разгавор са ўзводным, але, думаю, не. Нічога з гэтага не палучыцца, уся страна ваюе з немцам. Ды як потым людзям у вочы глядзець будзеш?

Бацька паспеў, узводны не павёў брывом, быццам і не было тае размовы. Эшалон рушыў далей, на Брэст, на Варшаву...

Камандуючы 1-м Беларускім фронтам маршал К.К. Ракасоўскі ў сваёй кнізе «Солдатский долг» піша, што пасля разгрому немцаў падчас беларускай аперацыі, калі падышлі да Варшавы, у часцях катастрафічна не хапала людзей. Павыбівалі ў баях. Папаўненне ішло толькі з ліку тых, каго вярталі са шпіталяў. А напарадзе новыя жорсткія баі. Таму вымяталі з беларускіх вёсак зусім маладых, не пакідалі ў спакоі і старэйшых мужчын. Ваенкамат, зборны пункт, вучэбны лагер. Так бацька апынуўся ў Калодзішчах пад Мінскам у 143-м запасным стралковым палку. Вучоба

кароткая, паўтара месяца. У траншэях чакалі новых стралкоў, а прасцей кажучы, пехацінцаў. Пяхота – рабочы люд вайны. Жывымі з іх заставаліся адзінкі. 14 верасня 1944 года прынялі прысягу, праз колькі дзён пагрузіліся ў вагоны – і на фронт, у пекла вайны. На пачатку кастрычніка прыбылі ў рэзервны лагер для размеркавання ў вайсковыя часці. Тут і выручыла Даматканаўская сямігодка. На першым пастраенні прагучала каманда: «Кто окончил десять классов, выйти из строя... Кто окончил девять, восемь, семь...» Згодна адукаванасці знаходзілі ваеннае прымяненне.

– Нас, у каго было сем класаў і болей, адпраўлялі ў арцілерыю. Астальных у пяхоту. Нашыя хлопцы і мужчыны з Хадатавічаў, што папалі ў пяхоту, то ўсе, лічы, й прапалі, – казаў бацька.

– Я б даўно землю парыў, каб туды папаў. Такія баі былі з немцамі, што страшна ўспомніць, колькі людзей палягло... У арцілерыі ўсё-такі мы ззаду пяхоты вядзём агонь, ня зусім пад пулямі. А наша часць была асобая, арцілерыя прарыва, дальнабойная, цяжолая. Мы былі рэзервам глаўнага камандавання. Агонь вялі за кіламетар ці за два ад перадавой...

Свае першыя франтавыя іспыты бацька спасціг пад Варшавай, на Вісле і Одэры. Гэтыя назвы суправаджалі мяне з малых гадоў.

Я заўважыў, што нашы вясковыя мужчыны-франтавікі, якія прайшлі вайну радавымі салдатамі, не афіцэрамі, звычайна мала цікавіліся, у складзе якой арміі, корпуса, дывізіі яны ваявалі, у якіх удзельнічалі аперацыях, хто кіраваў гэтымі аперацыямі. Бацька таксама не вельмі шмат ведаў пра сваю часць і пра яе месца ў вайсковай дыспазіцыі. Гаварыў толькі пра Жукава, пра 1-ы Беларускі фронт і сваю артдывізію прарыву. Па наградных дакументах я знайшоў больш пэўныя звесткі, якія разам з пачутымі ўспамінамі дазволілі хоць прыблізна ўявіць тыя ваенныя падзеі, што выпалі на яго долю.

– У арцілерыі, канешне, было лягчэй, чым у пяхоце, на перадавой. Але даставалася і нам, асабліво карэкціроўшчыкам і целефаністам – адно, што ў атаку не падымаліся, як пяхота з акопаў...

Тэлефаністам якраз і быў прызначаны чырвонаармеец радавы Дроговец (*так пісалася прозвішча ў ваенных дакументах і сталінскіх падзяках*) у дывізіён мінамётнай брыгады. Наконт дывізіёна і брыгады я не знайшоў пэўных звестак, але,

здаецца, што гэта была 21-я цяжкая мінамётная брыгада, бо бацька заўжды гаварыў пра цяжкія мінамёты, а такая брыгада ў складзе дывізіі мелася толькі адна. Такім чынам, з невялікімі ўдакладненнямі месца яго франтавой прыпіскі можна азначыць: 21-я цяжкая мінамётная брыгада 14-й артылерыйскай дывізіі прарыва РГК (Рэзерва Галоўнага камандавання) 6-га артылерыйскага корпуса РГК 1-га Беларускага фронту. Дзейнічалі дывізія і корпус у залежнасці ад аператыўнай сітуацыі ў паласе дзвюх армій: 8-й гвардзейскай пад камандаваннем В.І. Чуйкова і 5-й ударнай арміі пад камандаваннем Н.Э. Берзарына. Гэта самыя слынныя баявыя генералы таго часу. Чуйкоў стаў вядомым яшчэ са Сталінградскай бітвы, Берзарын у маладым узросце прайшоў баі з японцамі на возеры Хасан і з першага дня ваяваў з немцамі.



«Давай связь!»

Франтавыя тэлефаністы – нераскрытая старонка гэтай нечалавечай вайны. Маршалы і ваеначальнікі ў мемуарах пішуць, як рыхтаваліся аперацыі, як дзейнічалі камандзіры, што патрабавала Стаўка, і толькі мімаходзь дзе зазначаць: тэлефаністы наладзілі сувязь ці сувязь прапала, але ў хуткім часе сувязісты зноў яе ўсталявалі... А як было на самай справе, у рэальнай баявой абстаноўцы?

«Наладзілі» – значыць, салдаты з вялікай і цяжкай катушкай дроту за плячыма, прыгнутыя да зямлі, з аўтаматам у руках начамі і днямі нястомна ішлі, беглі, паўзлі праз лес, балоты, пяскі, гразь, каб стрэцца з такім жа сваім паплечнікам-тэлефаністам з другой часці, звязаць правады і даць сувязь камандзірам.

«Сувязь прапала» – значыць, танкі ці машыны парвалі правады, альбо пакалашмацілі іх снарады ці міны. А што горш за ўсё – перарэзалі немцы і чакаюць рускага тэлефаніста, каб скруціць і зацягнуць у свае акопы, ці падсадзілі ў схованках снайпера. І зноў паўзуць пад агнём, шукаюць парывы бедалагі-тэлефаністы. Знойдуць і пад дажджом, пад снегам, у мароз зачышчаюць, звязваюць між сабою. А бывала, што аднаго за другім шлюць тэлефаністаў на парыў, а іх кладзе ў радок, як цаглінкі даміно, нямецкі снайпер.



«А як вас кармілі?»

Пад Варшаваю, калі ў студзені 1945 года пачалася Вісла-Одэрская аперацыя, наш бацька, маладзенькі 19-гадовы хлопец, уціснуўшыся ў каляіну, голымі пальцамі некалькі гадзін трымаў правады, бо падняць галаву было немагчыма, немцы контратакавалі. Ён ледзь трываў ад болю, але разумеў, што камандзіру, які кіраваў агнём мінамётнага дывізіёна, неабходна сувязь. Без яе, сувязі, немцы прарвуцца ўглыб, самнуць усіх: і яго, і дывізіён, і пехацінцаў, што заляглі за траншэйнымі насыпамі. Нямецкую контратаку адбілі. Другім разам цэлыя суткі прасядзеў у балоце, у макраце і гразі, карэкціруючы агонь мінамётнай брыгады, што падтрымлівала наступаючую пяхоту. Ды ці злічыш гэтыя дні?

— Чуць артабстрэл — правада рвуцца. Камандзір адразу: связісты, впярод! Бяжыш, а снарады то збоку, то наперадзе, то ззаду, а днём голаву не высунеш, бо снайпер зрэжа...

— Поначы адзін канец знойдзеш абарваны, а папробуй знайдзі яшчэ другі! Рукі акалеюць ад марозу і снегу, сам мокры, а связь давай. А не будзе связі, то й расстраляць могуць. Эта ж фронт. Прыказ! Да трох не гаварылі... Там не чыкаліся з чалавекам...

Баі пад Варшавай, на Вісле, на Одэры былі неверагодна жорсткімі. «Людзі гіблі, як мухі...» Я пытаўся малым:

— А як вы начавалі зімою, калі мароз...

— Як прыдзецца, — гаварыў ён, — у траншэі ямку прыкапаеш, шынялком прыкрыешся, падрэмлеш трохі. Лепей, калі ў зямлянцы, на лапах з хвойніку. Зменшчык на лініі, а сам трохі прыляжаш. Там і печку-буржуйку маглі распаліць ноччу, бо днём то немцы адразу дым засякуць, улупяць з мінамёта, а то і з арудзій...

— А як вас кармілі?

— А тожа як прыдзецца... Хаця, канешне, стараліся карміць, не скажу... Але ж мы, связісты, на лініях — гарачага ня часта даставалася. Кашу крупяную давалі, сто грамаў спірту перад атакай. Есці ўвесь час хацелася, адно ў Германіі пажывіліся ядою...

Ён і не здагадваўся, што ў баях на Вісле, за Варшаву, пры фарсіраванні Одэра, узяцці Кюстрына, захопе Берліна і Імперскай канцылярыі знаходзіўся ў самым пекле ваенных дзеянняў. 5-я ўдарная армія генерала Берзарына, у склад-зе якой у асноўным дзейнічала 14-я прарыўная артдывізія Рэзерва Галоўнага камандавання, да апошняга дня вай-ны была на цэнтральным напрамку кровапралітнай бітвы. Словы пра кровапралітную ўжыты недарма. Ад стратных лічбаў ахоплівае жах. На тэрыторыі Польшчы Савецкая армія страціла больш за два мільёны сто шэсцьдзясят тысяч салдат і афіцэраў; з іх прыблізна шэсцьсот тысяч забітымі. «Людзі гіблі, як мухі...»

— Немяц так заядло трымаўся, але дзе ж тут выдзяржыш такую сілу! Хаця даваў нам прыкурыць, ох даваў! Як мяне Бог абнёс, ня ведаю. Асобянно пад Варшаваю і на Одэры.

— А якая яна, гэта Польшча, як там людзі жылі?

— Як і наша Беларусь, такая ж бяднота ў хатах і разру-ха. Разбілі ўсё снарадамі і бомбамі. Палякам то дасталося ад немцаў. Я трохі мог па-польскі, бо вучылі за палякамі. Як забягу ў хату, загавару, то хоць картоплю дадуць, стараюцца пачаставаць. Адразу прыветлівей адносяцца. Варшаву немяц разбамбіў ушчэнт, адны фундаменты асталіся.

— А ці хацелася дадому з фронта?

— Яшчэ й як хацелася. Не то што дадому, а каб жывым застацца. Асобянно, як у Германію ўвайшлі, бачым, што капут немцу вот-вот. Абідно будзе, як заб'юць. Я то верыў, што выжыву. Асобянно, як галубок прыляцеў да мяне пад Варшаваю...



Божы Абярэг

Два выпадкі на фронце ўзрушылі бацькаву душу, сталі зместам яго жыццёвых роздумаў пра чалавечы лёс, пра самую існасць на зямлі, пра свет і неба. Адзін з іх — гэта гісторыя з галубком, што надарылася недзе ў канцы кастрычніка сорак чацвёртага пад Варшаваю, а другі — у сакавіку сорак пятага падчас бязлітасных і жорсткіх баёў за Одэр.

...Калі мы пераехалі з хутара ў збудаваную новую хату, бацька, яму было ўсяго пад трыццаць, з першых дзён на новым жытле завёў на гарышчы галубоў. Ён перавёз іх з хутара ад бабы Наташы, а вяліся там птушкі мо яшчэ ад дзеда Васіля. Нек яны перажылі вайну, дачакаліся бацьку з арміі. Галубоў дзве ці што пары, але яны былі здатныя, пародзістыя, дарагія. Я чуў іх буркаванне наверсе, над нашай столлю; зухаватым блазном, нягледзячы на бацькаву забарону, залазіў на гарышча. Галубы палохаліся, зляталі з сядалак, распраўлялі ў роспачы крылы...

Нядзельным днём, калі выпадала вольная хвіліна, бацька прыстаўляў да сцяны лесвіцу, падымаўся да вакенца ў фацыяце, адхінаў шкляны засовак. Спускаўся на зямлю і ледзь чутна нешта пасвістваў губамі. Галубкі адзін за адным вывальваліся з вакенца, лапаталі крыламі. Пачыналася

неверагодна прыгожае, хвалюючае відовішча. Спачатку яны ішлі кругамі вакол хаты, нібы самалёты на парадзе, паступова набіраючы вышыню. Потым пачыналі куляцца цераз галаву, як акрабаты ў цырку. Малюнкі гэтых акрабатычных выкрутасаў чаргаваліся з падлётамі і падскокамі, з імклівымі даганялкамі і нечаканымі разваротамі. Нарэшце наступаў прэм'ер-нумар. Вядучы і самы спрытны галубок, залажыўшы імклівы віраж, свечкай выхінаўся ў самую вышыню неба, пад аблокі — так, што ператвараўся ў ледзь бачную кропку. У нейкі момант, здавалася, ён застываў, нібы супыняўся ў высокім паветры, а потым камянем рынаўся ўніз, да зямлі. Праз імгненне зноўку пачыналася акрабатыка. Падаючы, галубок круціў сальта-мартале, завісаў на крылах, рабіў перавароты і кульбіты. Перад зямлёю выходзіў з піке і, апісаўшы роўную крывую, праносіўся са свістам над бацькавай галавой. Затым у неба выстрэльвалі другі, трэці, чацвёрты... Канчаўся прэм'ер-нумар тым, што галубы чацвёркаю, зрабіўшы кругавы пралёт вакол хаты, знікалі з відавоку ў далёкай прасторы.

Расчуленыя гледачы гэтага спектакля вохкалі і крэхкалі ад здзіўлення, а бацька, унутрана прыўзняты і замілаваны тварам, нечакана хмурнеў.

— Каб хоць шуляка не стрэлі дзе, а то не вернуцца... На скірды паляцелі, зярнят пашукаць... Пацешылі нас трохі...

Ён нервова ўглядаўся за гарызонт, кідаў позірк то ў адзін, то ў другі бок, потым, не сцярпеўшы, закладваў у рот два пальцы, надзімаў шчокі. Пранізлівы і гучны свіст глушыў вушы, рассякаючы прастору на часткі. Імгненне — і галубкі кропкамі выпадалі з-пад бялёсых хмарак, а потым імклівай чародкай кіраваліся да хаты, па чарзе пікіруючы на стрэху.

— Малайцы, вярнуліся... Дам я вам зярнят, пачастую за выкрутасы...

Бацька з міскай, даверху насыпанай зярнятамі, зноўку падымаўся па лесвіцы, праз вакенца ў фацыяце ставіў яе на столь, спускаўся. Галубы таропка саскоквалі са страхі і знікалі на гарышчы.

У сваім захапленні галубамі бацька не быў фанатам. Ён проста любіў іх, цешыўся іх майстэрствам, разуменнем, вернасцю. Гэта быў яго першы падручнік прыродазнаўства, узнёсласць маладой душы, спазнанне бясконцай мудрасці прыроды, яе хараства. Жыццё, аднак, прыглушае рамантыку маладосці, чарада паўсядзённых турбот захінае сваёй

бясконцасцю. Мо таму і сышла з бацькавых рук галубіная забава. Ды яшчэ трохі бурчала маці, што галубы шоргаюцца начамі па-над столлю, спаць не даюць; бацька перайшоў у механізацыю, камбайнерам – часу не стала; убіліся каты, падпільнавалі галубкоў, пакалечылі некаторых...

Так і скончылася, засталася для мяне светлым адбіткам на сэрцы ды цёплым, нібы агеньчык, успамінам перажытага гэтая галубіная ўлюбёнасць. Як і многае іншае ў жыцці, яна мела свой пачатак і свой канец. Здавалася б, аб чым тут гаварыць. Маленькі эпізод чалавечага жыцця – быў ды сплыў... Ды так мо выглядала гэта толькі звонку, для недасведчаных людзей, ды для нас з братам – малых ды гарэзлівых. У бацькавым поглядзе галубы займелі сэнс Божага знаку, невядомага і недасягальнага, што сыходзіць з неба да прыхільнага чалавека. Гэтая гісторыя настолькі прыгожая, наколькі і неверагодная.

Вось што надарылася пад Варшавай у сорак чацвёртым. Бацька да дробязей памятаў той дзень. На перадавой, калі пад раніцу прыехала кухня і салдаты прыселі з кацялкамі за кашай, то іх найлепшыя хвіліны, закружылася ў небе над імі птушачка. Здзівіліся, бо справа была напрыканцы кастрычніка – не тая пара, каб птушкам разлётвацца. Таму птушачку прыкмецілі, тым больш, што яна, апісваючы кругі, спускалася ўсё ніжэй.

Салдаты-франтавікі



– Глянь, Коля, эта ж галубок кружыцца і на цябе цэліцца, – не зводзячы з неба вачэй, здзіўлена прамовіўся Міша, зямляк з-пад Магілёва, такі ж, як і бацька, тэлефаніст.

– Няўжо галубок? У самам дзеле! Дык гэта ж мой! Глянь ты, што за праява!

Яно так і было. Галубок прыляцеў да яго, да свайго гаспадара, ні да каго іншага. І быў гэта іменна той самы, любімы яго белы паштавік. Ён, гэты бялюткі паштавік, кружыў над ім да самага Заямнава пад Стоўбцамі, куды на чыгуначную станцыю ішоў ён

з хлопцамі з Нясвіжа грузіцца ў эшалон...

— Ён, мой, пачтавік... Знайшоў мяне?! Ах ты пташачка, дарагая мая!

— Праява! Глянь, даляцеў! Ажно з сяла, з Хадатавічаў... Даляцеў... Дзіва якое...

Гэта было на самай справе дзіва. Галубок спусціўся на пажухлую траву каля бацькі, а потым, калі той разгублены і ашалелы ад такой дзеі ўхапіў яго ў далоні, падскочыў уверх і ўсеўся на бацькавым плечуку — так, як рабіў гэта там, на двары ў роднай хаце, калі яны былі разам... Усеўся ды заваркаваў задаволена...



Белы паштавік

Салдаты абступілі кругам і глядзелі, баючыся слова сказаць, каб не перапыніць нечаканае цуда, што надарылася ў іх абрыдлым жыцці. Потым схамяніліся, пачалі вытрасаць з кішэняў крошкі хлеба, нехта палажыў на далонь перад галубком кавалачак цукру. Голуб, аднак, нічога не каштаваў, толькі круціў галавою, азіраючы салдацкі гоман.

— Давайце, хлопцы, адыдземся, ня будзем мяшаць. Хай пташка з гаспадаром пабудзе...

Салдаты адступіліся. Бацька сабраў пачастунак з хлебных крошак і недаедзенай крупянкі на перавернуты кацялок, зняў галубка з пляча, падсадзіў да ежы. Пакруціўшы галавою, голуб застукаў дзюбаю па бляшанцы.

— Бачыце, як гаспадар палажыў, то й за яду ўзяўся, а з нашых рук нічога не браў...

— Але гляньце, хлопцы! Столькі ляцеў, праз сотні кіламетраў, каб знайсці роднага чалавека...

— Ну, Николай, то знак Божий... Значит, доживешь до победы, дойдешь до Берлина...

Салдаты ўзрушана меркавалі пра навіну, што ўтварылася на іх вачах. Голуб падчысціў гасцінцы і супакоена прысеў каля бацькі на разасланым шынялку. Было відаць, што птушка стамілася і зараз, разамлелая, ужо нікуды не паглядвала, не круціла галавою, наадварот, увабрала яе ў крылы і нібыта застыла ў салодкай знямозе.

Я апісваю дэталі гэтага здарэння так падрабязна паводле бацькавых успамінаў, пачутых мною колькі разоў. Памятаю, яшчэ пытаўся:

— Дык яго ж маглі забіць, там жа страляюць з аўтаматаў, з пушак?

– Да, вайна, фронт, ні пасядзіш. Што, думаю, рабіць з галубком? Кожную мінуту могуць даць прыказ: связісты, впярод! А тут галубок...

Рашыў так: хай спачне, пакармлю яшчэ раз і напішу пісьмо да сваіх. Маці то чытаць ня ўмела, а вот сястра Ядзя можа прачытае, яна ў школу хадзіла. Пару слоў, што жывы, здаровы... Прывяжу нітачкаю да ножкі і пушчу ў неба. Хай ляціць, нясе пісьмо дадому...

Галубок нібыта зразумеў, што ад яго патрабуюць. Залапатаў крыламі, зрабіў развітальны круг над салдацкім селішчам на невялічкай вышыні, потым стромка пайшоў у неба і знік, растварыўся пад цьмянымі аблокамі, што паўзлі чарадою адтуль, з-за салдацкіх спін, дзе засталіся іх хаты, лясы і палеткі і адкуль прыходзіў шторaз новы дзень гэтай бясконцай вайны...

Бацька чакаў пісьма з дому, ад сястры. Пісьмо прыйшло месяцы праз два, калі ўзялі Варшаву. Сястра пісала, што яны з маткаю вельмі занепакоены, ці жывы ён там, на фронце, бо прапаў яго любімы галубок-пачтавік. Некуды паляцеў і не вярнуўся. Матка забедавала, кажа, то нядобры знак, можа, забілі Колю на вайне...

Так бацька дазнаўся, што галубок не даляцеў, згінуў па дарозе дадому.

– Можа й замёрз, прымаразкі ўжэ пачаліся, дажджы халодныя, гадкая пагода стала, мы ў гразі качаліся ў акопах. Успамінаць ні хочацца, – казаў ён.

За Варшаву



Аднак нешта перамянілася ў бацькі на сэрцы пасля галубка. Ці заспакоіўся, ці мо ўпэўніўся, што перажывецца гэтая вайна. Абміне, абыдзе бокам смерць, міма праляціць куля. Бо недарма ж знайшоў яго галубок, не проста так. Не можа быць, каб тут не мелася нейкай таямніцы, нейкага Божага знаку. Чым больш ён над тым раздумваў, тым больш пэўніўся перакананнем, што галубка спаслаў яму сам Гасподзь, а значыцца, атульвае яго Божы абярог. Бо аніяк па-іншаму патлумачыць гэткую праяву – завітанне на фронт, праз сотні кіламетраў, скрозь непагадзь бялюткай і кволай птушачкі – нельга. То сам Гасподзь даў яму знак, што застанецца жыць, перасіліць смерць і бяду. З гэтым, схаваным у самых глыбокіх пачуццях адчуваннем Божага знаку, што спаслала яму неба, бацька ішоў далей па вайне. І весялей сталася на душы, пацвярдзелі ногі, лягчэй пераживаліся лютыя маразы ды кровапралітныя баі з немцамі за Віслу і Одэр.

...Углядаюся ў бацькавы франтавыя фотакарткі. Іх не так многа. Яны – адзіны адбітак яго маладых год. Бо да вайны аніякіх фотакартак не мелася. І толькі на гэтых, франтавых, я бачу яго маладзенькага. Па сутнасці, яшчэ хлапчук. Вясковы, сціплы і чысты. Але ж такі ўпэўнены, такі праўдзівы тварам. Здымкі недзе пад Берлінам ці Варшаваю. За сотні кіламетраў ззаду засталіся хацінка з плотам і бульбай, маці з малодшай сястрычкай Ядзяй, карова ў хляве і яго забава, захапленне юначага сэрца – галубкі на гняздовішчы пад страхою. Мо і праўда, што таго, хто шкадуе і любіць птушак, беражэ сам Божухна...

Вісла-Одэрская аперацыя савецкіх войск, як афіцыйна азначаюцца рашаючыя баі на польскай тэрыторыі, пачалася 14 студзеня 1945 года. На кожным кіламетры фронту, дзе намячалася прарваць абарону немцаў, наступаючымі савецкімі войскамі сканцэнтравана да 230-250 гармат і мінамётаў. Практыку масіраванага прымянення артылерыі распрацаваў і прымяніў у баявых умовах знакаміты сярод франтавікоў прафесіянал артылерыйскіх войск генерал-палкоўнік В.І. Казакоў. Ён камандаваў артылерыяй 1-га Беларускага фронту на заключным этапе вайны. Якраз пад яго аператыўным началлем дзейнічала 14-я дывізія прарыву Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

Бацька аб тым не ведаў, гэта я прачытаў у кнігах, што за дваццаць пяць мінут артпадрыхтоўкі на пазіцыі немцаў

было выпушчана каля паўмільёна снарадаў і мін. Сіла і моц наступаючых савецкіх войскаў крушылі самую адмысловую нямецкую абарону. Гэта была не тая адступаючая Чырвоная армія, што ў сорак першым.

– Строгасць была і парадак. Папробуй не выпалні прыказ – у штрафную роту пойдзеш, а то і пад расстрэл, – гаварыў бацька.

Наколькі мне давялося ўразумець, бацькавым месцазнаходжаннем быў так званы Мангушскі плацдарм пад Варшавай, з якога дзейнічала 5-я ўдарная армія і 14-я прарыўная артдывізія Рэзерва Стаўкі. Самае пекла! Перад войскамі ставілася задача фарсіраваць Віслу, вызваліць Варшаву і, не спыняючыся, імкліва выйсці да Познані, на Одэр, да польска-германскай мяжы. Меліся планы Жукава і Казакова на два варыянты артпадрыхтоўкі. Першы – на дзве з паловай гадзіны, і другі, скарочаны, віхурны – на дваццаць пяць хвілін, каб ашаламіць праціўніка.

– Як пачала работаць наша арцілерыя, то дзень стаў падобны на ноч ад дыму, што йшоў з арудзій. Гаварыць было нельга, ніхто нікога не чуў. Цераз дваццаць мінут каманда «Пяхота впярод! В атаку!».

Дакументы сведчаць, што ўжо на камандным пункце, аналізуючы першыя вынікі, Жукаў прыняў рашэнне на скарочаны варыянт. Затым артылерыя перайшла на агнявы вал, масіравана страляючы за дзвесце-пяцьсот метраў папарадзе наступаючай пяхоты.

– Пехацінцы пайшлі, а перад імі коціцца бура са снарадаў і мінаў. Такі агнявы вал рабілі нашы арцілерысты... Што смерч у полі! Во як біла арцілерыя!..

Прыём «агнявога вала» быў вяршыняй майстэрства франтавых артылерыстаў. У абароне праціўніка выразаліся цэлыя нішы, куды імкліва ўводзіліся танкавыя кліны з дэсантам пяхоты. Праз два дні баёў 5-я ўдарная фарсіравала Віслу і захапіла плацдармы на правым беразе.

«Товарищ красноармеец Дроговец Николай Васильевич! Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 16 января 1945 г. № 221 за прорыв обороны немцев на зап. берегу р. Вислы всему личному составу нашего соединения, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, ОБЪЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ...»



Товарищ красноармеец
Дроговец Николай Васильевич

Приказом Верховного Главнокомандующего
Маршала Советского Союза товарища Сталина
от „16" января 1945 г. № 221
за прорыв обороны немцев на зап. берегу р. Вислы
всему личному составу нашего соединения, в
том числе и Вам, принимавшему участие в
БЛАГОДАРНОСТЬ.

[подпись]

Мы в битвах решаем судьбу поколений,
Мы к славе отчизну свою поведем!

Падзяка І. Сталіна за мужнасць у баях на Вісле. 16 студзеня 1945 г.

Гэта была першая падзяка вялікага Сталіна дзевятнацацігадоваму беларускаму хлопцу за яго баявую мужнасць. 17 студзеня 1945 года савецкія войскі вызвалілі Варшаву, але артылерысты там асабліва не затрымаліся. 14-я прарыўная дывізія на амерыканскіх «студабеккерах» неадступна рушыла за танкавымі калонамі на Познань. За 23 дні баёў войскі пераадолелі 500 кіламетраў польскай зямлі і 31 студзеня выйшлі к Одэру, на польска-нямецкую граніцу.



Падзяка І. Сталіна чырвонаармейцу Драгаўцу М.В. за выдатныя дзеянні ў баях пры ўварванні ў Германію. 29 студзеня 1945 г.

– Сіла ў нас была такая, што немцы нічога не маглі зрабіць. Камандзіры талковыя, опытныя ўжэ франтавікі...

«Товарищ красноармеец Дроговец Николай Васильевич! Приказом Верховного... товарища Сталина от 29 января 1945 г. № 265 за отличные действия в боях при вторжении в Германию всему личному составу нашего соединения, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, ОБЪЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ...»

...Там, за Одэрам, нямецкая зямля. Дайшлі ўсё-такі! Прыжалі немца! Нарэшце... Нават самім не верылася. А колькі хлопцаў злажылі галовы, так і не дачакаўшыся запаветнага моманту – заступіць на германскае памежжа. А тут пашчасціла. Ды не забіты, не паранены. Мо і вайне канец надыдзе! Праз сотню кіламетраў за бурлівай воднай плынню, дзе садзіцца сонца, германская сталіца – сам Берлін. Здаецца, рукой падаць, але ж як далёка яшчэ да яго! Адна рака чаго каштуе!

Одра, Одэр... Магутны, імклівы і шырокі паток вады. Рака пачынаецца ў Мараўскіх гарах у Чэхіі, цячэ па землях Польшчы і Германіі. Гітлер загадаў зрабіць Одэр месцам, дзе скончыцца сіла савецкіх войскаў і наступіць паварот у вайне. Некалькі палос шчыльнай абароны, сцягнуты вялікія сілы і тэхніка, прыстрэлены кожны кавалачак зямлі заходняга берага. Наступленне прытармазілася. Цаною велізарных ахвяр перадавыя атрады 5-й ударнай і 8-й гвардзейскай армій на пачатку лютага ўсё ж захапілі на правым беразе Одэра чатыры невялічкія плацдармы. Цэнтральным сярод іх быў Кюстрынскі, бо за ім прамая дарога на сталіцу Трэцяга рэйха. На працягу паўтара месяца немцы штодня распачыналі ад васьмі да дзесяці контратак, каб скінуць байцоў у плынь ракі і заняць плацдармы. Нашы зубамі трымаліся за гэтыя кавалкі зямлі, дасылалі дапамогу дэсанту, ладзілі пераправы ў сцюдзёнай вадзе, назапашвалі тэхніку і боепрыпасы.

Бацька ніколі не мог пазбыцца тых уражлівых падзей. Сапёры па пояс у ледзяным струпе рукамі і сякерамі крэпяць бярвенні, чапляюць бэлькі, пераматваюць тросы. Налятаюць нямецкія штурмавікі, бомбамі разносяць ушчэнт тое, што зладзілі: пераломаныя бярвенні, дошкі, забітыя і параненыя людзі перамешваюцца з бурлівым патокам мутнай рудой вады, знікаюць у процьме...

На Одэры сатварылася сітуацыя, якая ў бацькавым разуменні непарыўна перапляталася з прылётам галубка пад Варшаву. У адзін з дзён, калі штурмавыя групы ўчапіліся за невялічкія кавалкі зямлі на нямецкім боку ракі, надвячоркам, камандзір батарэі Жабін загадаў рыхтавацца да пераправы на плацдарм групе карэкціроўкі і сувязі.

«Пойдут трое,– ён назваў прозвішчы,– Лопатин, Драговец, Гайдуков. Задача – окопаться, обеспечить связь и корректировку огня...»

Вісла-Одэрская аперацыя





Кюстрын. Старажытны нямецкі горад-крэпасць

– Мяне аж скаланула: усё, каюк, адтуль не варочаюцца... Пераправа прастрэльваецца да санціметра, самалёты бамбяць і б'юць з пулямётаў,– прыпамінаў бацька.– Але прыказ, нікуды не дзенешся, у чатыры часа з раніцы быць гатовымі да пагрузкі ў лодку...

– Будзь што будзе, думаю сабе. Яшчэ рашыў памаліцца дзе-небудзь у куточку. Адышоўся за некі ўзвышак, малітву прачытаў, пахрысціўся сам сабе і пайшоў у зямлянку, паспаць хоць трохі.

– А во, раніцай камандзір зноў нас пастроіў, ставіць задачу і мяне ўжэ не называе, а называе аднаго Даўгача. Два брата у нас былі, Даўгачы, з Гродзенскай абласці, харошыя хлопцы. Я думаю, памыліўся, а ён другі раз паўтарае: «Пойдут Лопатин, Довгач, Гайдуков... Готовьтесь к погрузке...»

Мост праз Одэр у ледзяной вадзе

– Усё, хлопцы на лодку і на той бераг. Акапаліся, далі связь – тут бамбёжка, самалёты нямецкія наляцелі. Іх, бедных, усіх трох прамым пападаннем немец і палажыў! Малодшы Даўгач там, на беразе Одэра, пахаваў старэйшага брата. Прысыпаў зямлёю ды заплакаў... Вайна, чаго там ня было... Але Гасподзь убярог мяне ад смерці...



Як кажуць у такіх выпадках, смерць зазірнула ў вочы, але абмінула, абышла. Гэтае сутарэнне на Одэры ў суровых



На лодку і на другі бераг

франтавых рэаліях, дзе жыццё радавога салдата не больш, чым статыстыка, ды яшчэ ў звязку з прылётам галубка, займела ў далейшым бацькавым разуменні сэнс ужо абсалютна несумнеўнага, існа Божага промыслу. Ва ўсе свае пасляфрантавыя гады бацька пэўніўся цвёрдай высновай, што ўбярог яго ад смерці сам Гасподзь. Ён пераканана зацвердзіўся ў непахіснай павазе да нашай праваслаўнай веры. Не стаў заўзятым вернікам, адмысловым артадоксам, але з вялікай схільнасцю на працягу жыцця ставіўся да Бога нашага Ісуса Хрыста. Прычым не шыкаваў, не дэманстраваў сваіх перакананняў – проста трымаў іх у сэрцы. Аднойчы толькі я пачуў ад яго, калі мясцовыя жанчыны клікалі запісацца ў баптысты: «Не, сваю веру я мяняць ні буду. Мяне Гасподзь ад смерці спас на фронце. Наша вера – так эта вера настаяшчая...»

Бацька – чалавек ад сахі, далёкі ад некіх містычных мрояў. Ён нічога ніколі не выдумляў пра сваё жыццё. Але яго франтавы лёс якраз праўдзіць выснову, што лёс існуе і што ён у кожнага свой, непаўторны, толькі яму аднаму запаведаны небам. Не проста так мы існуем на зямлі. Можа, сэнс жыцця кожнага з нас у тым і сутараецца, каб разабрацца, што ж і дзеля чаго творыцца вакол нас на зямлі і на небе.



Суконныя языкі

Сялянскія хлопцы, што акрамя плуга і касы нічога не бачылі, сутыкнуліся на вайне, у акопах, з нечаканымі сітуацыямі і акалічнасцямі. Не па гадах хутка сталелі, бо бачылі смерць на кожным кроку. Цясніліся ў зямлянках бок каля боку з рознымі людзьмі, а значыцца, з рознымі звычкамі, паводзінамі. Па-новаму ім адкрывалася жыццё, мянялася разуменне свету і часу.

– От я парадаваўся адзін раз, як стрэўся з нашымі хлопцамі. Пад Варшаваю стаялі. Пабег я за ядою з кацялкамі. Іду назад, а кругом салдаты касцяркі распальваюць, гоман, шум, кухні пад'ехалі, і раптам чую па-нашаму, па-беларускі, крычыць мне нехто: «Коля! Пастой! Эта ж мы, землякі твае!». І точно – глянуў, пазнаў хлопцаў сваіх з-за лесу. Так я абрадаваўся, што стрэўся з імі. Пагаварылі, распытваліся адзін пра аднаго...

Маючы ў памяці мноства перажытых ваенных эпізодаў, бацька часта прыпамінаў гэты – сустрэчу са сваімі хлопцамі. Нечым саладзіла тая стрэча яго душу, мабыць, ён і сам не разумеў, чым і чаму. Я спачатку па маладосці не прыдаваў асаблівага значэння гэтаму яго споведу. Так, эпізод з бясконцай франтавой хронікі... Колькі іх было на дарогах вайны! Пасля стаў задумвацца і зразумеў, што тут схаваны больш значны сэнс, нешта вельмі глыбіннае і важнае для чалавечай сутнасці.



З сябрамі - беларусамі ў Германіі. Бацька – пасарэдзіне

– У нас разныя былі людзі, адусюль. Некаторыя ніяк па-рускі гаварыць не маглі. Нашыя хлопцы, хто з беларусаў, тожа гаварыць добра ня ўмелі, саромеліся ды чырванелі, калі ў іх што пыталіся...

– А там жа ўсе разгаворы, асабліва ў камандзіраў, па-рускі. От палітрукі і мялі нашыя языкі, каб навучыць чаму-нібудзь. Пастроіць, бывало, палітрук нас і кажа: «Ну што маўчыце? Баіцеся слова сказаць... А ну, разамніце свае суконныя языкі. Навучу вас хоць трохі гаварыць па-рускі...»

– Асобянно яны стараліся пра Сталіна нам удзяўбці што ў голаву...

Тут ён на імгненне замаўкаў, а потым, расхінаючы тыя павучанні, цытаваў:

– Товарищ Сталин, настоящая фамилия Джугашвили Иосиф Виссарионович, родился в Грузии, в городе Гори 21 декабря 1879 года в семье сапожника... Бачыце, дагэтуль помню...

І пасмейваўся сам з таго...

...Ды як жа прыхільна было пачуць сярод чужых, незнаёмых людзей роднае слоўца! Пачуў – і пранізала як маланка імклівая думка: то свае, беларусы... І замілавалася сэрца, спачуўся ў душы родны дух – што тое гаючае цяпло ад прапаленай печы. Во, якая яе, матчынай мовы, незвычайная і магутная сіла! Як можа яна акрыліць, засалодзіць, абагрэць душу: то свае, яны не пакрыўдзяць, бо яны такія ж, як сам, вясковыя хлопцы...

– На фронце то да, разныя былі людзі. Камандзіры і начальнікі ў асноўным то рускія. Бывало, што яны да нас, западных беларусаў, адносіліся ня вельмі добра, з некай падазронасцю. Асобянно энкавэдзісты, смершаўцы разныя. Чуць што, дык – западэнцы, палякі, кулакі – знаям мы вас...

– Нам, хто з западнай, прыходзілася не соладко... Асабліво ў першыя месяцы, пакуль да нас прыглядаліся. Думалі, што ваяваць ня будзем, пабаімся пад пулямі галаву падняць...

Западэнцы... Вось вам і браты з Усходу, якіх так чакалі на заходніх землях. Безумоўна, прычынай недаверу да заходніх беларусаў была так званая адсутнасць класавай чысціні: жылі



З бацькоўскіх ваенных здымкаў. Афіцэры штаба 14-й артдывізіі прарыва РГК

заможней, мелі добрыя гаспадаркі, не зведалі энкавэдзісцкіх варанкоў і турмаў. Таму і настройвалі асабісты ды палітрукі вайсковую суполку на падазроныя адносіны. Мяркуючы па бацькавых выказваннях, яго непрыемна ўразіла на вайне такое стаўленне да заходніх беларусаў. Правільней, відаць, будзе сказаць — палітычны недавер з боку бальшавіцкай улады, які, безумоўна, праяўляўся праз канкрэтныя чалавечыя адносіны.

Была тут вялікая несправядлівасць для беларусаў. Яны бяспраўна жылі пад польскімі каланістамі, цярпелі пагарду і другасортнасць, горача спадзяваліся знайсці шчасце з братамі на Усходзе, а стрэлі падазронасць ды агідныя ярлыкі. Адным словам, цярпелі раней, давялося цярпець ізноў. Засмучала і тое, што, наогул, адносіны сярод рускіх былі больш агрэсіўнымі, жорсткімі і бязлітаснымі, чым тыя, да якіх прывыклі ў беларускіх вёсках. Мабыць, так адбілася на іх жыцці бальшавіцкае кіраванне.

— Пад Уладзімірам, куды нас адправілі з Германіі, тылавыя афіцэры ператраслі нашы чамаданы, пазабіралі ў хлопцаў многа чаго, што няслі дадому. У мяне адабралі эсэсаўскі кінжал, што падабраў у Берліне, як занялі Сілезскі вакзал...

Непрыемна ўражвалі такія адносіны пакладзістых беларускіх хлопцаў. «Галеча там адна ў Расіі, і людзі, як ваўкі, адзін да аднаго», — не раз гаварыў бацька. Такія высновы зрабіліся ў яго розуме пасля фронту і яшчэ двух гадоў катаржнай службы ў перафарміраванай артбрыгадзе пад Уладзімірам за Масквою.

Прамой наводкай па таўшчэзных крапасных сценах



Не хачу, каб здалося, што з вайны бацька вынес устойлівую непрыязнь да рускіх людзей. Гэта не так. Ён заўжды з павагай гаварыў пра рускую смеласць і адвагу, пра салдат-сібіракоў.

– Сібіракі прыходзілі з папаўненнем – харошыя хлопцы, дружаскія, харашо ваявалі...

Вельмі пахвальна адзываўся аб сваіх камандзірах.

– Закалку нам давалі настаяшчую... Паддзержвалі, памагалі, глядзелі за ўсімі. Вот як было, не тое, што зараз – здзекуюцца з салдат у арміі...

Прыпамінаў палітработнікаў.

– Прамялі нас там някепска...

Ды вернемся, аднак, на фронт. На правым беразе Одэра перад войскамі 5-й ударнай – горад Кюстрын. Запала ў бацькаву памяць на ўсё жыццё гэтае слова. Зараз мала каму вядомая назва. А ў сорак пятым? Не злічыць, колькі беларускіх хлопцаў палягло пад яго сценамі! Нямецкі старажытны горад-крэпасць, буйны чыгуначны і транспартны вузел, за ім менш чым праз сто кіламетраў Берлін. Два тыдні кровапралітных баёў днём і ноччу. Нарэшце, каб выбіць немцаў з таўшчэзных крапасных муроў, паставілі гарматы на прамую наводку, падцягнулі цяжкія мінамёты. Тэлефаністы і бацька ў самым пекле, пад прыцэльным бясконцым агнём.

Быў Кюстрын – стаў Косцшын...

– Як не забілі пад Кюстрыным, то не ведаю. Там нашых палажылі, то не сасчытаць...



«Товарищ красноармеец Дроговец Николай Васильевич! Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 12 марта 1945 г. № 300 за овладение городом и крепостью Кюстрин …Вам, принимавшему участие в боях, ОБЪЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ.

Командир части…»



Падзяка І. Сталіна за авалоданне горадам-крэпасцю Кюстрынам. 12 сакавіка 1945 г.

Я перацёр у руках карту Польшчы, але ж не знайду ніяк Кюстрын. Пасля вайны гэтыя нямецкія землі набылі польскую прыналежнасць – таму і няма Кюстрына. Ёсць горад Костшын-на-Одре (польск. Kostrzyn nad Odra), на польскім зараз беразе Одэра, недалёка ад Познані; уваходзіць у склад Любушскага ваяводства Гажуўскага павета. Гэта і ёсць той самы Кюстрын. Мае статус гарадской гміны. Займае плошчу 46,17 кв. км. Насельніцтва каля 20 тысяч чалавек...



Нашы пад Кюстрынам. Назаўсёды

З падзеннем Кюстрына стала зразумела, што зусім блізка Перамога. Уперад, на Берлін!

– Як жаж хацелася, каб не забілі ў канцы вайны! Вясна, во-во сады расцвітуць, а тут хлопцы гібнуць дзясяткамі ды сотнямі. От, думаю, абідно будзе не дажыць да пабеды...

Міша Анцін, дваюрадны бацькаў брат, які ваяваў на 3-м Беларускім фронце, успамінаў: «Пабеда зусім блізка, а немцы лупяць і лупяць... Нас у разведку шлюць, далажыць, дзе немцы, а мы ж маладзенькія, пабойваямся, дак і памірaць ні хочацца. Вайна, во, канчаецца. Так наш афіцэр нас у стог пасадзіць, а сам бярэ двух-трох опытных байцоў і на разведку к немцам. А мы сядзім, чакаем, што мышы ў саломе... Бярог нас, ніабстрэляных...". Пра гэта мне расказваў яго сын Мікалай Каўшэль, доктар-афтальмолаг.

...Асцярожна бяру ў рукі яшчэ адзін дарагі для мяне дакумент – Падзяку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за баі ў Берліне. Яна меней па памерах, чым папярэднія. Краі паперы пажаўцелі, на складках амаль працерліся. Углядаюся ў гэты лісток і ўяўляю сабе тыя бацькавы дні ў Берліне. Несупынны грукат снарадаў і мін, кінжальны і нечаканы агонь з кожнага вакна, неба ў дыме ад пажараў і пораху, заваленыя цэглай і камяніцай вуліцы, дамы ў руінным варыве, забітыя людзі – нашы і немцы...

«Товарищ красноармеец Дроговец Николай Васильевич! Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 23 апреля 1945 г. № 339 нашим войскам, прорвавшим оборону немцев и ворвавшимся в Берлин, в том числе и Вам, участнику этих боев, объявлена благодарность...»

5-я ударная армія прабівалася к Рэйхстагу на цэнтральным напрамку. Ісці навалам – аніякага толку, таму прымянялі раней апрабаваную пры штурмах гарадоў тактыку. Баі ў цесных гарадскіх кварталах вядуць штурмавыя групы: рота ці болей салдат-аўтаматчыкаў, узвод танкаў, некалькі лёгкіх гармат, саперы, мінамётчыкі, сувязісты. Асабліва здатнымі пры штурме будынкаў аказаліся цяжкія мінамёты.



Товарищ красноармеец
Дроговец Николай Васильевич
Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 23 апреля 1945 г. № 339 нашим войскам, прорвавшим оборону [illegible] городов и ворвавшимся в Берлин, в числе и Вам, участнику этих [illegible] объявлена благодарность.

Падзяка І. Сталіна за прарыў абароны Берліна. 23 красавіка 1945 г.

160-міліметровая міна, трапляючы зверху, прабівала перакрыцці, якія абрушваліся на абараняючых смяротным грузам.

...Мінамётная брыгада падтрымлівае салдат, штурмуючых нямецкі ўрадавы квартал. Карэкціроўшчыкі безупынна перадаюць разлікам, на колькі градусаў давярнуць прыцэлы ўлева, управа, назад, уперад, каб агонь цяжкіх мінамётаў быў трапны. Гэта небяспечная работа на вайне. Падчас мінамётнага абстрэлу немцы адразу стараліся вызначыць, дзе знаходзяцца карэкціроўшчыкі і сувязісты, каб у першую чаргу



Тыя самыя вежы Сілезскага вакзала

вывесці іх са строю. Бацьку запамяталіся вежы Сілезскага вакзала. Пасля таго, як іх штурмавая група заняла вакзал, ён суткі ці болей, седзячы там, карэкціраваў агонь дывізіёна па Рэйхстагу. Абараняліся немцы ў Берліне надзвычай жорстка. Сярод гарачыні несупыннага боя на яго вачах здарылася сітуацыя, якая ўразіла на доўгія гады.

– Бачу недзе перад абедам падымаюцца павольна так, па ступеньках, на самы верх стары і старая, немцы. Акуратно адзетыя, прыбраныя. Ледзьве йдуць, але стары памагае ёй, за руку паддзержвае. А я насупроць на сваім наблюдацельным пункце з біноклямі і целефонам на башні прымасціўся. Чаго, думаю, яны йдуць на самы верх?



Берлін. Бой у раёне Сілезскага вакзала



Знак Фердынанда Кайдзінга за поспехі ў скарочаным пісьме

– Зайшлі, сталі, потым падыйшлі да краю, і ён рэзка так пхнуў яе з плашчадкі. Яна й паляцела, а потым і ён сам за ею кінуўся ўніз. Насмерць разбіліся. Мы нічога ні панялі адразу. Пасля раздумаліся. Эта ж яны, відаць, так спераживаліся, што мы разбілі Германію. Відаць, прэданныя былі Гітлеру людзі, што так зрабілі...

У першыя дні Перамогі дывізія заставалася ў Берліне, і салдатам выпала пабываць у рэйхсканцылярыі, падземным бункеры фюрэра, а таксама ў Рэйхстагу, ля Брандэнбургскіх варот. Такія наведванні дазваляліся арганізавана для часцей, што бралі Берлін. Там, у бункеры, пад кіпамі раскіданай на падлозе паперы бацька скмеціў жаўтаваты металічны кругляшык, падобны на медаль, але без вушка, з выявай вусатага паважнага чалавека, падобнага звонку ці не на самога імператара. На адваротным баку надпісы па-нямецку.

– Я ўхапіў яго з падлогі ды ў кішэню непрыкметно. Думаю, калі залаты, то будзе хоць за што хату паставіць, як дадому вярнуся...

Неяк удалося яму выхаваць гэты кругляшык нават у тых пратрусах, што чакалі іх, франтавікоў, у галоднай і непрыязнай Расіі, за Уладзімірам. Аднак марам бацькавым не ўдалося збыцца, бо нямецкі знак, знойдзены ў бункеры Гітлера, аказаўся не залаты, а бронзавы. Ды, здаецца, аднак, што сам па сабе ён – каштоўнейшы гістарычны экспанат, рэдкая рэліквія. Калі Маша, старэйшая дачка, падчас вучобы ў Германіі дасканала авалодала нямецкай мовай, яны ўдваіх з сястрой Надзеяй, студэнткай нямецкага факультэта

Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, зрабілі дакладны пераклад надпісаў на знойдзеным знаку. Аказалася, што знакам узнагароджваліся «За пахвальныя дасягненні ў галіне навучання скарочанаму пісьму і паспяховую арганізатарскую працу ў саюзе стэнаграфістаў «Штольцэ-Шрэй». Выява паважнага чалавека мела па акружнасці надпіс «Франц Вільгельм Кайдзінг». Праз Інтэрнэт даведаліся, што гэта імя знакамітага немца, зачынальніка метада скарочанага пісьма «штольцэ-шрэй». Інакш кажучы, стэнаграфіі.

Гэты самы Кайдзінг нарадзіўся ў 1843-м, а памёр у 1928 годзе. У памяць аб ім, відаць, і быў усталяваны знак, якім узнагароджваліся тыя, хто дабіўся здатных вынікаў у скарочаным пісьме. Але чаму ён патрапіў у бункер Гітлера? Адказ на гэтае пытанне, здаецца, зразумелы. Фюрэра абслугоўвалі лепшыя стэнаграфісткі. Ён нават любіў весці з імі ўсялякія размовы за кавай падчас абеду ці на святочных вечарынах. Аб тым я прачытаў у кніжцы яго ад'ютанта «Застольныя размовы Гітлера». Можна меркаваць, што знак належаў камусьці са стэнаграфістак фюрэра і быў страчаны ў гарачцы апошніх гадзін перад капітуляцыяй.

Мо нумізматы ці збіральнікі гістарычных рэліквій маглі б зацікавіцца такім незвычайным экспанатам, даць за яго добрыя грошы, але мне здаецца, што найлепшым яго месцам будзе новы Музей Вялікай Айчыннай вайны, які пабудаваны на Камсамольскім возеры. Трымаць дома гэты цікавы трафей таксама можна – перадаваць ад унукаў унукам. Ды толькі неяк абмежавана ўсё гэта будзе выглядаць. У тым і каштоўнасць музейных рэчаў, што яны праз многія гады дазваляюць новым пакаленням уявіць часы вялікіх гістарычных ператрусаў, убачыць іх праз вобразы натуральных экспанатаў. Паспрабую звярнуцца ў музей. Так будзе лепей і для памяці пра бацьку.



«Работая телефонистом …»

…Перапынюся на хвіліну. Трэба выказацца. Бо дні са два не магу пазбыцца ад хвалюючых думак. Сёння 22 красавіка 2012 года, нядзеля. Ідзе цёплы дожджык, пад вакном зацвіў куст кізілу. Такое асаблівае дрэва: на іншых толькі набухаюць пупырышкі, а кізіл ужо аздобіўся шышачкамі жаўтлявага суквецця. Спачатку адцвіце і толькі пасля выпусціць лістоту. Штогод мяне дзівіць вясна. У маркотнай цеплыні стромка абуджаюцца невычэрпныя зямныя сілы. Вось-вось пырснуць зялёнымі лісточкамі кусты бэзу. Гудзяць ад напругі, калі прылажыць вуха, беластвольыя бярозы, поўнячы жыватворным сокам кожную галінку на вершалінах. Празрысты свет загадкавых далячынь напаўняе неба...

... Дапішу яшчэ колькі радкоў і патэлефаную маці. Прадзірліва зазвініць пашарпаны тэлефон на самаробным століку каля канапы ў пярэднім пакойчыку за сенямі, маці паволі патрусіць да яго хворымі нагамі, задыхаецца нават ад такога, з пакоя ў пакой, пераходу, але ўзрадавана спытае: «Гэта ты, сынок?» Так, скажу я, і распавядаю ёй сваю хвалюючую навіну...

Што атрымаў па электроннай пошце з Франкфурта ад свайго зяця Максіма пісьмо, да якога прыложаны дадатак — «***Наградной лист» на радавога Драгаўца Мікалая Васільевіча***

Векапомнае. З архіва



Все графы заполнять полностью

НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество Драговец Николай Васильевич
2. Звание рядовой 3. Должность, часть телефонист батареи управления 14 Артиллерийского Краснознаменной дивизии прорыва РГК
Представляется к медали "За отвагу"
4. Год рождения 1926 5. Национальность белорус 6. Партийность б/п
7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) 1-й Белорусский фронт 1944-45 гг.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне Не имеет
9. С какого времени в Красной Армии с 1944 г. 10. Каким РВК призван Невинским РВК Барановичской обл
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) Наград и отличий не имеет
12. Постоянный домашний адрес представляемого к награждению и адрес его семьи

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Рядовой Драговец Николай Васильевич, работая телефонистом батареи управления проявил себя умелым и [illegible] воином связистом. 2-го марта 1945 г. во время штурма города и крепости Кюстрин, Драговец не жалея своей жизни под огнем противника устранил 33 повреждения телефонной линии от 21-й бригады до НП командира дивизии.
10 марта во время бомбежки авиацией противника связь с НП 172 бригады была порвана во многих местах, на исправление повреждений был послан Драговец и за 10 минут он исправил 19 порывов. 2 марта с НП командира дивизии до ПНП, связь через р. Одер, вследствии артналета была порвана и здесь Драговец проявил инициативу, несмотря на то что р. Одер часто обстреливал противник. Он продолжал свое дело и в это время исправил связь с НП командира дивизии.
За проявленную отвагу и мужество рядового Драговец представляется к правительственной награде медали "За отвагу"

28 Марта 1945 г. Командир батареи управления 14 А дд
гв л-нт Шабин
Драговец награжденный медалью "За отвагу"
Командир (начальник)
" Марта 1945 г. Начальник штаба 14 А дд
подписал Шлохин

на прадстаўленне яго да ўрадавай узнагароды – медаля «***За отвагу***». Раней я прыблізна азначаў тыя акалічнасці, пры якіх была атрымана гэтая высокая салдацкая адзнака. Яны склаліся ў мяне з бацькавых прыпамінкаў і, вядома, мелі некаторыя недакладнасці, бо не хапіла яшчэ розуму, каб падрабязна распытацца і запісаць усё пра вайну ў жывога бацькі.

Ды якая ж навіна! Максім, ведаючы пра маю працу над кніжкай, знайшоў у Інтэрнэце сайт, на якім выкладаюцца дакументы ўзнагароджаных у вайну салдат і афіцэраў (цудоўнае зачынанне невядомых мне людзей, але якіх высакародна

памклівых!). І во, удача! З мільёнаў знайшоўся бацькаў ліст! У натуральным выглядзе, бачны нават дзірачкі ад шнуркоў, якімі ён прашыты ў архіўных тамах. Трохі парэпаная папера, але ўсё добра чытаецца, бо напісана ад рукі, разборлівым, пастаўленым почыркам. Уверсе анкетныя звесткі, у ніжняй палавіне кароткае апісанне асабістага баявога подзвіга, пячатка, подпісы камандзіраў. Не адарваць вачэй ад гэтага лісточка паперы! Узрушылася сэрца, замроіліся думкі ад гэтых рукапісных слоў:

«Рядовой Драговец Николай Васильевич, работая телефонистом батареи управления, проявил себя умелым и находчивым связистом. 2-го марта 1945 г. во время штурма города и крепости Кюстрин, т. Драговец не жалея своей жизни под огнём противника устранил 33 повреждения телефонной линии от 21-й бригады до НП командира дивизии.

10 марта во время бомбежки авиации противника связь с НП 172 бригады была порвана во многих местах, на исправление повреждений был послан т. Драговец и за 10 минут он исправил 19 порывов. 2 марта с НП командира дивизии до ПНП, связь через р. Одер, вследствии артналёта была порвана и здесь т. Драговец проявил инициативу, несмотря на то что р. Одер часто обстреливал противник. Он продолжал своё дело и вовремя исправил связь с ПНП командира дивизии.

За проявленную отвагу и мужество рядовой Драговец представляется к правительственной награде медали «За отвагу».

28 марта 1945 г. Командир батареи управления 14 АКДП гв. л-нт (подпись) /Жабин/

Достоин награждения медали «За отвагу».

« » марта 1945 г. Начальник штаба 14 АКДП

подполковник (подпись) /Илюхин/»

Я захаваў арфаграфію дакумента. Звяртае ўвагу, што прозвішча тут ужыта з буквай «а», хаця ў падзяцы за авалоданне крэпасцю Кюстрын з «о» – «красноармеец Дроговец». Ды гэта так, між іншым. Ці да гэтага там было?

Сувязь для камандзіра артдывізіі: 19 парываў за 10 мінут пад агнём!



Тым не менш у гэтай вялікай малатарні вайны, дзе малоліся лёсы мільёнаў людзей, існаваў і вытрымліваўся строгі парадак у арганізацыі дакументаабароту, дзякуючы якому сёння, праз шмат гадоў пасля тых падзей, удалося захаваць і знайсці такія дарагія для маці, для мяне

Шчыльнымі радочкамі...



Медалью "ЗА ОТВАГУ":

1. Младшего сержанта	БЫКОВА Михаила Никитивочиа	радиотелеграфиста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
2. Красноармейца	ВОЛОБУЕВА Дмитрия Степановича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
3. Красноармейца	ВЫСОТСКОГО Михаила Ивановича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
4. Красноармейца	ГИЛЬ Александра Андреевича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
5. Красноармейца	ГОЛУБКО Николая Владимировича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
6. Красноармейца	ГРУШЕВСКОГО Всеволода Евгеньевича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
7. Красноармейца	ГУСЬКО Николая Трофимовича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
8. Красноармейца	ДРАГОВЕЦ Николая Васильевича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
9. Красноармейца	ЖУК Ростислава Степановича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
10. Младшего сержанта	ЖУКОВА Александра Сергеевича	радиотелеграфиста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
11. Красноармейца	КАЗАНОВИЧ Василия Варфоломеевича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.
12. Гвардии красноармейца	КИСЕЛЕВА Константина Андриановича	телефониста батареи Управления 14 артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК.

і брата, для нашых дзяцей і будучых нашчадкаў звесткі пра зусім непрыкметнага на вайне радавога салдата. Многае стала больш дакладным, праяснілася. Бацька, успамінаю, сапраўды неяк нават ганарліва прамаўляў, што «нас у батарэю ўпраўлення дзівізіі, хлопцаў, адбіралі с абразаваннем, больш смякалістых ...» А чаму мне здалося раней, што яго месцам была 21-я мінамётная брыгада? Відаць, тэлефаністы батарэі кіравання былі замацаваны за брыгадамі і часцямі дывізіі, якія абслугоўвалі. Таму і гаварыў часцей пра брыгаду цяжкіх мінамётаў, успамінаючы вайну, ды і з узнагароднага ліста вынікае такі досвед.

...Сярод бягучых дзён і дробязных спраў а ці не штодня вяртаюся ў думках ці схільваюся позіркам да гэтых франтавых дакументаў. «Наградной лист»... То акуратным почыркам, то машынапісам, скупымі словамі і нязвыклымі для сённяшніх дзён зваротамі выкладаецца сутнасць справы. Літары

то саскокваюць убок, то напаўзаюць адна на другую; радкі, напісаныя ад рукі, таксама дзе-нідзе танчаць ці абрываюцца чарнільнымі плямкамі. Відаць, рыхтаваліся яны не ў цёплай хаце. Мо ў штабным бліндажы на сасновым століку, мо ў кузаве «студабекера», зацягнутага брызентавым пакрывалам і адагрэтага печкай-буржуйкай дзе-небудзь у варшаўскім прадмесці альбо на беразе Одэра...

Мне цікава тут усё: словы, надпісы, паметкі штабных начальнікаў, подпісы высокіх камандзіраў, зробленыя чырвонымі альбо сінімі карандашамі,– чамусьці была такая завядзёнка пры Сталіну.

Прыглядаюся да імён і прозвішчаў салдат і афіцэраў у спісах на ўзнагароды. Нібы магнітам цягне да іх мой позірк. Думаю, а раптам вось з гэтым чалавекам бацька быў разам у штурмавой



Батарэя ўпраўлення 14-й артдывізіі. Наўбург, 1945 г. Малым, я шукаў у салдацкім страі бацьку і знаходзіў



групе ў Берліне, а з гэтым сядзелі ў траншэі і расказвалі адзін аднаму пра жыццё ў сваіх сёлах, а гэты, можа, вучыў яго, як не патрапіць пад кулю снайпера...

Такія ж, як і бацька, тэлефаністы, радыётэлеграфісты батарэі ўпраўлення – радавыя салдаты, яфрэйтары і сяржанты – яго таварышы па акопах і бліндажах. Рабочы люд вайны. Цікаўлюся больш падрабязна, знаходжу на некаторых у Інтэрнэце ўзнагародныя лісты – дык хто з Навагрудчыны, хто з-пад Стаўбцоў ці з клецкай Сіняўкі... Землякі – Гіль, Жук, Мікалаюк, Галубко, Гусько... Шчыльнымі радочкамі, адзін за адным пайшлі маладзенькія беларусы на сцюдзёныя берагі Віслы і Одэра...

А хто ж камандзіры? Пераважна рускія прозвішчы. Бо лейтэнанты, капітаны, маёры і іх непасрэдныя начальнікі, генералы, рыхтаваліся ў ваенных установах на Усходзе. Узнагародны ліст на бацьку падпісаў камандзір батарэі кіравання 14-й АКДП РГК («*Артиллерийской Краснознамённой дивизии прорыва Резерва Главного Командования*» – такая поўная назва воінскай часці) гвардыі лейтэнант Жабін І.С. Гэта па яго загадах бацька з катушкай дроту за плячыма бег у ноч, сядзеў у балотах, змарожанымі рукамі звязваў парваныя правады і ціснуўся да зямлі ад нямецкіх кулямётаў пад Кюстрынам. Гэта ён, Жабін, выпадкова ці не памыліўся і назначыў Даўгача замест Драгаўца для пераправы на другі бок Одэра. Мо і не выпадкова, мо перадумаў за ноч, глянуўшы ў вочы маладзенькаму ды бясхітраснаму хлапчуку-беларусу... «Тебе же, парень, пожить бы еще на этом свете... А оттудова не возвращаются...» Што адтуль, з другога берага Одэра, яны не вернуцца, вопытны франтавік Жабін ведаў пэўна...



«Работая телефонистами, артиллеристами...»

Шукаю лейтэнанта Жабіна на тым жа сайце ў Інтэрнэце і — як добра! — таксама знаходжу яго ўзнагародны ліст.

«*Жабин Илья Семенович, гвардии старший лейтенант, командир батареи управления 14 Артиллерийской Краснознаменной дивизии прорыва РГК. Представляется к ордену Отечественной войны 2-й ст. Год рождения 1915, русский, член ВКП(б) с 1943. Карельский фронт 1944 г. 1-й Белорусский ф-т 1944-45 гг. В Красной Армии с 1939 года. Призван Кемеровским ГВК. Награжден орденом Красной звезды. Пр. кам-ра 14 АКДП № 07/14 от 16.03.45 г.*»…

Значыцца, было сібіраку лейтэнанту Жабіну ў сорак пятым трыццаць гадоў. А лягла на яго плечы цяжкая ноша. Бо, як пішуць у тым жа лісце:

«*…работая командиром батареи управления, во время овладения городом и крепостью Кюстрин, при прорыве сильно-укрепленной обороны противника на р. Одер, при овладении городом Берлин, находясь в боевых порядках своими смелыми, решительными и требовательными действиями воодушевлял личный состав на выполнение задач, поставленных Штабом Дивизии в результате чего батарея обеспечила точными разведданными о противнике и бесперебойной связью Управление огнём Дивизии.*

Наблюдательные пункты все время располагал в боевых порядках пехоты, откуда давал правильное положение нашей пехоты и противника и передавал целеуказание на открытие огня по целям ведущих огонь по нашим войскам.

Смелый, решительный, требовательный офицер…»

Стыль і пунктуацыя запісаў захаваны па арыгіналу. Нават з гэтых скупых радкоў, хоць і вельмі прыблізна, але можна ўявіць сабе тую непасільную ношу, што ўзваліла вайна на плечы лейтэнанта Жабіна, непасрэднага бацькавага камандзіра. Наладзіць бесперабойную сувязь, забяспечыць штаб разведданнымі, абсталяваць камандныя і назіральныя пункты; тэлефаністам і радыётэлеграфістам задачы паставіць, асабовы састаў накарміць і размясціць, штаб дывізіі забяспечыць транспартам і гаручым, а калі наступленне, то са сваімі назіральнымі пунктамі ў шарэнгах наступаючай пяхоты пад кінжальным агнём кулямётаў…

Як запісана ва ўзнагародным лісце: «…р*аботая командиром батареи Управления Дивизии к своим обязанностям относился добросовестно*». У бацькавай характарыстыцы таксама гэты непаўторны выраз: «…р*аботая телефонистом батареи управления…*» Бачыце, якая была работа — пасярод снарадаў, пад

бомбамі і кулямі шукаць парваныя правады, несупынна вязаць і вязаць іх паміж сабою, суткамі сядзець у балоце ці зноў бегчы наперад з катушкаю дроту за плячыма, пракладваючы новыя лініі сувязі. Не кожны захоча такой работы, нават за вялікія грошы... Тут і «раб на галерах» не пазайздросціць франтавому лейтэнанту, камандзіру батарэі, а тым больш радавому тэлефаністу.

А высокія камандзіры, генералы? Можа, ім на гэтай вайне было не так кепска, не так небяспечна? Шукаю звесткі пра генерала Бруханава Анатолія Іосіфавіча, камандзіра 14-й прарыўной артдывізіі. Гэта да яго камандных і назіральных пунктаў (а колькі іх змянілася на шляху ад Віслы да Берліна!) ладзіў правады тэлефоннай сувязі маладзенькі і старанны салдацік, радавы чырвонаармеец Мікалай Драгавец. Гэта яго, генерала Бруханава, подпіс стаіць на бацькавых падзяках ад імя Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Сталіна. Гэта пад кіраваннем генерала дывізія фарсіравала Віслу і Одэр, брала непрыступныя Кюстрын і Берлін.

Знаходжу ўзнагародны ліст на прадстаўленне генерала Бруханава А.І. да звання Героя Савецкага Саюза. Чытаю:

«*В ожесточённых боях при штурме Берлина, в тяжелых уличных боях, пренебрегая опасностью для жизни, тов. Брюханов постоянно находился в частях, организовывал штурмовые группы, неутомимо управляя огнём большой массы артиллерии...*

За исключительное умение в управлении огнём массы артиллерии, за личное мужество и отвагу, проявленную в боях и особенно по взятию гор. Берлина достоин Высшей правительственной награды присвоения звания «ГЕРОЙ СОВЕТСКОГО СОЮЗА».

КОМАНДИР 6 АКП РГК
ГВАРДИИ ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЕНАНТ АРТИЛЛЕРИИ
/РОЖАНОВИЧ/ подпись
6 мая 1945 г.»

Хто ж ён, гэты генерал, што так умела кіраваў вялікімі массамі артылерыі, праявіў надзвычайную адвагу і мужнасць, грэбуючы небяспекай, знаходзіўся ў шарэнгах наступаючых, сярод штурмавых груп? Чытаю анкетныя радкі: 1906 года нараджэння, значыцца, у сорак пятым было толькі 39! У Чырвонай Арміі з 1922-га, кадравы ваенны. З першых дзён на вайне з немцамі – Бранскі, Заходні і потым Першы Беларускі франты. У сорак першым кантужаны. Узнагароджаны трыма ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга,



Афіцэры 14-й артдывізіі падымаюць за Перамогу пасля Віслы перад Одэрам

Айчыннай вайны 1-й ступені і ордэнам Суворава 2-й ступені. Такія ўзнагароды сведчаць, што быў генерал сапраўдным баявым афіцэрам. Але нават у гэтай кагорце нямногія камандзіры мелі суворaўскую выяву на грудзях.

«*Орденом Суворова награждались командиры Красной Армии за выдающиеся успехи в деле управления войсками, отличную организацию боевых операций и проявленные при этом решительность и настойчивость в их проведении, в результате чего была достигнута победа в боях за Родину в Отечественной войне*».

Гэта вытрымка пра ордэн з энцыклапедычнай «Вікіпедыі». Там жа паведамляецца, што ордэна Суворава 2-й ступені ўдастоіліся ў Савецкім Саюзе ўсяго 2863 афіцэры. І сярод іх – трыццацідзевяцігадовы генерал Бруханаў А.І.

Генерал Бруханаў. Самы малады сярод генералаў-артылерыстаў

Прыпамінаюцца ў гэтай звязцы бацькавы выказванні пра дзеянні расійскіх войскаў у Чачні. Я не ўзгадваю аніякіх іншых матываў гэтай вайны – размова ў нас была толькі пра ваенную стратэгію і тактыку.



– Нашыя камандзіры на фронце, то не раўня этым маршалам, што салдацікаў палажылі. Нашы б, франтавыя, там ня так ваявалі, што людзей пабілі нізашто, – падсумаваў тады ён нашу размову.

Чамусьці мне здаецца, хоць бацька аб тым і не казаў, што думаў ён пры гэтым і пра лейтэнанта Жабіна, і пра камдзіва Бруханава.

Генералу Бруханаву Анатолію Іосіфавічу «Героя...» не далі. Не ведаю чаму, але камандуючы артылерыяй 5-й ударнай арміі генерал-маёр Касэнка надпісаў алоўкам на ўзнагародным лісце: «Достоин

награждения орденом Ленина». Відаць, адносіны сярод штабных і акопных генералаў былі таксама няпростыя. З прапановай аб узнагародзе ордэнам пагадзіўся і камандуючы 5-й ударнай арміі генерал-палкоўнік Берзарын. Так і скончыў вайну генерал Бруханаў з пачэсным ордэнам Леніна, але тыя, хто ведалі яго бліжэй, лічылі, што ён сапраўдны Герой вайны.

Засталося з гэтага ланцужка ваенных пасад і прозвішчаў дабрацца да самых вышынь і сказаць колькі слоў пра знакамітага камандарма 5-й ударнай – Берзарына. Пройдземся, так бы мовіць, ад салдата да маршала – ад «красноармейца Драговца» да камандуючага яго арміі генерал-палкоўніка Берзарына.

У гісторыю вайны, што засталася і жыве ў народнай памяці, ён, Берзарын, увайшоў і стаў вядомы людзям больш як першы камендант скоранага Берліна. Камендантам Берліна Мікалая Эраставіча Берзарына прызначыў сваім загадам маршал Жукаў. Ён ведаў камандарма па сумесных ваенных аперацыях. Камендантам Берзарын аказаўся чалавечным, клапатлівым пра галодных і зморaных вайной людзей, немцаў, жыхароў гэтага знявечанага і ўшчэнт разбітага гістарычнага горада. Нездарма нават пасля ўз'яднання абедзвюх частак Германіі і бурных парламенцкіх спрэчак немцы ўсё-ткі вырашылі захаваць бюст савецкага каменданта ў новай германскай сталіцы.

Падчас берлінскай аперацыі 5-я ўдарная за пяць дзён несупынных баёў пераадолела прадмесці сталіцы Трэцяга Рэйха і ўварвалася ў Берлін з усходняга боку, ад Кюстрына і Одэра. Далей перад арміяй паставілі задачу авалодаць цэнтральным кварталам, дзе мясціліся імперская канцылярыя са стаўкай Гітлера, урадавыя будынкі. Не кожнаму камандарму даверaць такое ў самыя апошнія дні і хвіліны вайны. Берзарын лічыўся майстрам наступальных аперацый.

З «Вікіпедыі»:

«Николай Эрастович Берзарин родился 1 апреля 1904 года в городе Санкт-Петербурге в семье рабочего. Николай, его брат и 4 сестры рано остались без родителей: отец умер в 1917 году, мать – в 1918 году.

В 1913 году он поступил на вечерние курсы в Петроградской начальной школе, закончил образование со специальностью «переплётчик». 14 октября 1918 года Берзарин добровольно вступил в Красную Армию…

…В Великую Отечественную войну Н. Э. Берзарин вступил командующим 27-й армией Прибалтийского Особого военного округа.

В марте 1943 года – тяжело ранен под Вязьмой.



Генерал Берзарын М.Э.

С мая 1944 года командовал 5-й ударной армией на 3-м Украинском фронте и на 1-м Белорусском фронте с октября 1944 года. Отличился в наступательных операциях Советских Вооружённых Сил: Ясско-Кишинёвской (его армия освободила Кишинёв), в Висло-Одерской (армия Берзарина прорвала немецкую оборону и обеспечила ввод в прорыв ударной группировки фронта – 2-й гвардейской танковой армии), в Берлинской операциях. На подступах к Берлину армия Берзарина наступала в составе главной ударной группировки фронта, а в штурме Берлина… вошла в берлинский район Марцан (нем. Marzahn) 21 апреля.

16 июня 1945 года Берзарин погиб в автокатастрофе на перекрёстке Шлоссштрассе и Вильгельмштрассе (ныне Ам-Тирпарк и Альфред-Ковальке-Штрассе) в берлинском районе Фридрихсфельде (нем. Friedrichsfelde)… Наперерез шла колонна советских грузовиков со стройматериалами. Мотоцикл генерала на скорости приблизился к перекрестку, и он, решив проскочить сквозь колонну, нажал на газ…»

Такія імёны, такія лёсы. Можа, каго і здзівіць, што, апавядаючы пра вайну ў бацькавым успрыманні і аб тым, як гэта адбілася на жыцці сям'і, я сышоў прыкметна ўбок і распавядаю пра людзей яму далёкіх, нават недасягальных з пункту гледжання ваеннай іерархіі. Мне і самому дзіўна такое маё нестрымальнае жаданне «вылезці з салдацкага акопа». Нешта карціць, нешта штурхае мяне даведацца больш пра іх, радавых і сяржантаў, лейтэнантаў і генералаў; пра іх думкі, мары, пра хвілі іх жыцця перад атакай, пра размовы і адносіны, пра сны і хваляванні.

Чаму так, нашто мне гэта патрэбна, што штурхае мяне і не дае спакою?! Трэба ж, нарэшце, адказаць сабе на гэтае пытанне. Імкнуся за нітачкай сваіх думак і разумею, што яны ўсе, радавыя і генералы, – блізкія мне людзі, бо мой бацька быў пасярод іх. Маладым, праўдзівым і чыстым. З імі і сярод іх ён гаварыў і смяяўся, марыў і хваляваўся, падымаўся пад кулі і спаў на шынялку ў прамёрзлым акопе. Гэта покліч крыві ў маіх грудзях, у сэрцы і ў жылах – адчуць іх, пакаленне пакутнікаў і герояў, даведацца паболей пра тыя іспыты, што ім дасталіся, уявіць хоць на імгненне іх на фронце, паміж жыццём і смерцю.

Я хачу адчуць стукат іх сэрцаў, настрой душы; хачу спаўна разабрацца, хоць і праз гады, у гэтай вайне, якой няма роўных па жудасці і бязлітаснасці і якой бацька і яго камандзіры аддалі лепшыя часіны свайго жыцця. А колькі тых, хто заплаціў жыццём?! Не злічыць, не наплакацца...

А колькі тых, у каго таксама мог быць такі ж бацька, як і ў мяне, ды не збылося...

«Работая» пехацінцамі, тэлефаністамі, камандзірамі рот і батарэй, дывізій і армій, яны звярнулі шыю самай вышкаленай, забяспечанай і падрыхтаванай ваеннай машыне ў свеце – нямецкай арміі. Яны, паўгалодныя, кепска ўзброеныя, кепска адзетыя, кепска забяспечаныя.

Мне патрапіліся падчас працы над гэтымі запісамі дзве кніжкі: адна пад назвай «*Война в белом аду. Немецкие парашютисты на Восточном фронте 1941-1945 гг.*» гісторыка-даследчыка Жака Мабіра, і другая – амерыканскага лейтэнанта Белтана Янгблада Купера «*Смертельные ловушки. Выживание американской бронетанковой дивизии во Второй мировой войне*». Гэта запіскі аб баявых дзеяннях войскаў ЗША па вызваленню ад немцаў Паўночнай Еўропы – з моманту высадкі ў Нармандыі і далей праз Бельгію, Францыю да Берліна. Кніга зроблена на аснове падрабязных ваенных запісаў. Аўтар быў афіцэрам службы забеспячэння і надзвычай кваліфікавана прадстаўляе чытачу структуру, тактыку, дзейнасць тылавых каманд, характар баявых аперацый амерыканцаў падчас іх наступу.

Асабліва цікавымі з'яўляюцца падрабязнасці, звязаныя з умовамі, у якіх утрымліваліся салдаты і афіцэры. Скажам, ежа, харчаванне салдат і афіцэраў. Сутачны баявы паёк амерыканца складаўся з банкі завакуіраванага амлету з вяндлінай, мясной тушонкі, фаршу з каўбасы натуральнай. Дабаўляліся кансерваваныя фрукты і гародніна, пячэнне з павышаным утрыманнем бялку, натуральны кофе фірмы «Нэстле» ў пакетах, шакаладныя пліткі і батончыкі, цыгарэты... Пайкі і прадуктовыя наборы розніліся ў залежнасці ад вайсковых аперацый. Ежа пакавалася ў спецыяльныя кантэйнеры, якія не размакалі ў вадзе. Адзенне ў вайскоўцаў толькі з высокаякаснай шарсцяной тканіны, скураныя высокія чаравікі, у кожнага спальныя мяшкі, сподняя бялізна. Пры памыцці на адпачынку ці ў палявых умовах выдавалася новая форма.

А вось вытрымка з кнігі пра нямецкіх парашутыстаў, якія аказаліся на фронце пад Смаленскам у сцюдзёную зіму 1942 года. Перад выхадам на заданне:

«*Кружка горячего кофе, еще одна, кипяток, кальвадос из Нормандии.*

— *Прекрасно, Шиммель,— говорит Виттиг.*

— *Наполните ваши фляги,— отвечает тот.*

— *Хорошая мысль,— одобряет командир резервной группы и советует своим людям повесить фляги на грудь под одежду*».

Уражвае тэхнічнае забеспячэнне амерыканскіх войск падчас наступу. Падбітыя танкі, пашкоджаныя машыны неадкладна рамантаваліся ці замяняліся новымі. За войскамі разгортваліся тэхнічна аснашчоныя рамонтныя базы з поўным наборам інструменту і запчастак. Праз акіян неадкладна дастаўлялася ўсё неабходнае для арміі. Наступальныя аперацыі праводзіліся толькі пасля масіраваных удараў артылерыі і авіяцыі. На бамбёжкі праціўніка падымаліся цэлыя армады самалётаў. Усё дакладна каардынавалася праз радыёсувязь і здабытыя разведданныя. Любы загад камандавання засноўваўся на разумных і лагічных высновах. Дзе не магла прайсці пяхота, дзейнічала артылерыя, амаль уся матарызаваная; а дзе супыняліся і траплялі пад агонь танкі, неадкладна выклікалі авіяцыю. Перад асабліва важнымі пунктамі праціўніка афіцэры і салдаты атрымлівалі падрабязныя карты, на якіх адзначаліся нават дамы бургамістра ці начальніка паліцыі, не кажучы пра ўсё астатняе. Дарэчы, пешых войскаў у амерыканцаў амаль не было. У асноўным матарызаваная пяхота. Любыя ваенныя дзеянні вяліся значнымі сіламі з абавязковым удзелам самаходак, танкаў, авіяцыі. Ніякіх вылазак у тылы пад небяспеку і кулі без надзвычайнай патрэбы...

У гэтай сувязі прыпамінаюцца ўспаміны майго знаёмага Анатоля Багамаза, рабочага-будаўніка. Яго бацька ваяваў мінамётчыкам у брыгадзе марской пяхоты. Дык найвялікшай радасцю было, што ўдалося на зімнія баі ў Прусіі здабыць кавалак кажуховай курткі збітага нямецкага лётчыка, уцяпліць сярэдзіну ды ўберагчыся ад абмаражэння. У палонных ці забітых здымалі боты, валёнкі і цёплую вопратку; асаблівым шыкам лічылася абабраць лётчыка ці афіцэра.

Бацька расказваў, як у Германіі пасля Перамогі, калі яны некалькі месяцаў стаялі ў Наўбургу, дзяўчаты-немкі на тэлефоннай станцыі пасмейваліся з яго ваеннага адзення:

Пайшоў за Перамогай – пра бацьку ў нясвіжскай раённай газеце, Т. Праль-Гуль. 2 ліпеня 2013 г.



1941-1944

ПАМЯТЬ

Ушел на Берлин. За Победой

Николай Васильевич Драговец родился в 1925 году в деревне Ходатовичи Козловского сельского Совета. В годы Великой Отечественной войны жил на оккупированной немцами территории, был партизанским связным. В июле 1944 года пошел на фронт. С боями дошел до Берлина.

Награжден орденом Красной Звезды, медалями "За отвагу", "За взятие Берлина", "За освобождение Варшавы", "За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945гг."

К сожалению, Николая Васильевича уже нет на этой земле, он ушел из жизни в 2006 году. Но остались его воспоминания о войне, которые хранит память его сыновей — Василия и Анатолия. Анатолий Николаевич поделился воспоминаниями с нами, и родился этот очерк...

вился на ночлег на небольшой лужайке, разжег костерок. А "обиженный" мужик проследил за ним — и

ну. Как такое возможно?! — удивился солдат. Взял голубя в руки, проговорив: "Какую же весточку ты мне

состав остановился. Сказали: надолго. Ребята спросили старшего сержанта, сибиряка:

— Может, ты нас пустишь ночью сбегать домой?

Тот их отпустил. Отпустил с целью, чтобы они остались. Пожалел, хотел от гибели сберечь: совсем ведь молодые, жизни не видели. А друзья прибежали в Ходатовичи к родителям и той же ночью возвратились в эшелон. Сержант только и сказал: "Я же вас отпустил, чтобы вы не приходили..."

Служил Николай Драговец телефонистом 14-й артиллерийской дивизии на I Белорусском фронте. Орден Красной Звезды получил за то, что на протяжении одного боя 33 раза выходил соединять телефонный кабель — бой был очень трудный, и его все время перебивало снарядами или осколками. Рядовой Драговец бесстрашно направлялся налаживать связь.

Очень тяжело пришлось нашим бойцам при подходе к Одеру. Фашисты старались не подпускать их к реке, с шестиствольного орудия так накрывали плацдарм, что выжить под таким обстрелом было просто невозможно. Связь то и дело прерывалась, и надо было порвать соли-

«Ніколай есть гут, монтур (мундзір) ніхт гут...» – і паказвалі пальцамі на гімнасцёрку. На першых фотаздымках з вайны, дзе яны, франтавікі, стаяць групкамі, у бацькі яўна не па размеру кірзавыя боты, занадта шырачэзнае галіфэ, а гімнасцёрка, наадварот, зусім упрыкараць, ледзь зашпіліліся гузікі на руках.

Такімі яны былі, нашы франтавыя бацькі, салдаты-пераможцы. Не падавалі ім ні кофе «Нестле», ні кальвадосу ў вымаражаныя траншэі. У сваёй прыкарочанай гімнасцёрцы дайшоў бацька да Берліна, дзе і ўважылі іх мо толькі бясплатнымі фотакарткамі нямецкія фатографы на памяць аб надзвычай «прыгодніцкім падарожжы» ў сталіцу Рэйха.



„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941—1945 гг."

УДОСТОВЕРЕНИЕ

За участие в Великой Отечественной войне

Красноармеец

Драговец

Николай Васильевич

указом Президиума Верховного Совета СССР от 9 мая 1945 года награжден медалью

„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941—1945 гг."

От имени Президиума Верховного Совета СССР медаль вручена

августа 1946 г.

Командир 8 пуш. арт. Витебской Краснознаменной дивизии РГК

(должность, военное звание и подпись лица,

М. П. св. полковник

вручившего медаль)

...І дайшоў

P. S. Так канчаўся гэты раздзел у папярэднім выданні кніжкі. Усялякі раз, калі перагортваў старонкі, разумеў прыхаваную тут недасказанасць. Нічога не напісана пра абставіны ўзнагароджання бацькі ордэнам Чырвонай Зоркі (Красной Звезды). А гэта высокая адзнака. Уручалася толькі за асабіста праяўлены баявы подзвіг. Уважлівы чытач, можа, прыкмеціў такое непаразуменне, ды змаўчаў. Не было аніякіх звестак пра ордэн: як, калі, за што?...

Бацька ўпамінаў пра балота за Одэрам, дзе ён прасядзеў ці не суткі ў акружэнні нямецкіх аўтаматчыкаў, трымаючы у руках тэлефонныя правады, і быў там перад смерцю. Распытацца, а тым болей запісаць яго прыпамінкі не хапала розуму. На ўзнагародных сайтах, калі пісалася кніга, знайшліся звесткі пра медаль «За адвагу», а пра ордэн – нічога. Але шукаў, не спыняўся. Чарговым разам адкрыў сайт «podvignaroda.ru» і, цуда!, убачыў радкі пра ордэн. Не спыняецца высакародная праца, адкрываюцца сакрытыя старонкі воінскай мужнасці!



НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество Дроговец Николай Васильевич
2. Звание красноармеец 3. Должность, часть телефонист батареи управления 14-й арт. краснознаменной дивизии прорыва
Представляется к Ордену „Красная звезда".
4. Год рождения 1926 г. 5. Национальность белорусс 6. Партийность чл. ВЛКСМ. с 1945 г. № 32461644
7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) 1-ый Белорусский фронт 1944-1945 гг.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне не имеет
9. С какого времени в Красной Армии с октября 1944 года 10. Каким РВК призван Несвижским РВК Барановской области
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) медаль „За отвагу" приказ по 14-й див. № 07 2/н от 13 апреля
12. Постоянный домашний адрес представляемого к награждению и адрес его семьи

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Во время подготовки к расширению плацдарма и прорыву обороны немцев на левом берегу р. Одера тов. Дроговец работал линейным надсмотрщиком по линии связи от НП до НП дивизии. 14 апреля под артобстрелом пр-ка связь была повреждена, тов. Дроговец не успел свой жизни под огнем артиллерии пр-ка исправил связь в 44 местах и было восстановлено ее. В р-не Карлсдорф ж. Дроговец под артиллерийским и оружейным огнем пр-ка 17 апреля в 6 час обеспечил связью НП с НП дивизии. В ночь на 22 апреля т. Дроговец в д. Жеков под огнем пр-ка сумел пропустить связь через болото на НП 6 гв. бригад, благодаря чего связь работала бесперебойно. 27 апреля в тяжелых условиях 2-х батальонов тов. Дроговец обеспечил связью НП 24 бригады, несмотря на огонь пр-ка и автоматные очереди, кроме связи и они работали бесперебойно. 29 апреля т. Дроговец со своими товарищами доставил телеграмму быстро раненому сержанту, который находился на неприятельской территории, на обратном пути Дроговец заметил немецких автоматчиков, он подкрался к ним и гранатой, заставил замолчать навсегда интервентов нагадяев. За проявленную отвагу и мужество тов. Дроговец представляется к правительственной награде ордену „Красная звезда"

Командир батареи управления 14 КАДН
гв. ст. л-т Х. Усовых
"12" мая 1945 г.

Достоин награждения орденом „Красная звезда"
Командир (начальник) штаба 14 гв. КАДН
"14" мая 1945 г.



Ордэн Чырвонай Зоркі – баявая салдацкая ўзнагарода

Зноўку, як і ў той, першы раз, усхваляваўся, засвяціўся радасцю, не магу наглядзецца, не магу адарваць вачэй ад гэтых радкоў...

Вось тэкст з узнагароднага ліста, як ён напісаны ў арыгінале.

Наградной лист

Во-время подготовки к расширению плацдарма и прорыва обороны на левом берегу р. Одера тов. Дроговец работал линейным надсмотрщиком по линии связи от НП до ПНП дивизии. 14 апреля под артобстрелом пр-ка связь была повреждена, тов. Дроговец не жалея своей жизни под огнём артиллерии пр-ка исправил связь в 34 местах и во время восстановил ее. В районе Карлехорс т. Дроговец под артиллерийским и оружейным огнём пр-ка 17 апреля в срок обеспечил связью ПНП с НП дивизии. В ночь на 22 апреля т. Дроговец в д. Хенов под огнём пр-ка сумел протощить связь через болото на НП 6 гв. бригады, врезультате чего связь работала бесперебойно. 27 апреля в трудных условиях г. Берлина тов. Дроговец обеспечил связью НП 24 бригады, несмотря на огонь пр-ка и автоматные очереди, провел связь и она работала бесперебойно. 29 апреля т. Дроговец со своими товарищами доставил перевязочные бинты раненому сержанту, который находился на немецкой территории, на обратном пути Дроговец заметил немецких автоматчиков, он подкрался к ним и гранатой, заставил замолчать навсегда гитлеровских негодяев. За проявленную отвагу и мужество тов. Дроговец представляется к правительственной награде ордену «Красная звезда».

Командир батареи управления 14 АКДП
гв.ст. л-т (Жабин)
12 мая 1945 г.

Достоин награждения орденом «Красная звезда»
Начальник штаба 14 АКДП подполковник (Илюхин)
14 мая 1945 г.



«В лагерь захотел?!»

Пра гэтыя здымкі хочацца сказаць асобна. З цягам часу яны сталі мо адзінай для мяне памяццю пра бацьку і яго маладосць. Знасіўся і некуды прапаў яго пінжак з генеральскага сукна, таксама як і шаўковы гальштук, пакрыліся пацінай і прыцямнелі баявы ордэн і медалі, саржавелі ў яго паплечнікаў-франтавікоў прынесеныя з Германіі гадзіннікі і сякеры, не іграюць, бо растрэсліся, трафейныя акардэоны, а фотакарткі жывуць сваім жыццём у альбоме і шораз адкрываюць для мяне, калі ўглядаюся, усё новыя рысы ды рысачкі ў дарагім вобразе.

Вось яны ў першыя дні пасля Перамогі, адмытыя і пасвяжэлыя, у начышчаных ботах ды новых шынялках. Вось ён асобна, седзячы на крэсле. Добра відаць, што фуражка з чырвонай зоркай малаватая. А побач другі здымак — поўная супрацьлегласць папярэдняму. Бацька ў капелюшы, у цывільным, у палоску, двухбортным пінжаку, з-пад якога выглядае светлы каўнерык шаўковай сарочкі і шыкоўны шаўковы гальштук.

Здымкі, відаць, зроблены з перапынкам мо ў тыдзень ці два, бо тварам бацька амаль аднолькавы як на першым, так і на другім. Розніца толькі ў тым, што на апошнім трохі адраслі валасы пасля зусім «лысай» прычоскі на першым. Галоўнае



19-гадовы пераможац, з медалём «За отвагу». Берлін, май 1945 г.

адрозненне, аднак, у вобразах. Немец-фатограф прыадзеў маладога рускага салдаціка ў дарагі і модны касцюм. Тут чытаецца глыбокая сутнасць. Салдацік рускі не проста салдацік, ён – пераможца, а значыцца, гаспадар, прадстаўнік новай улады, у нечым нават пан, паночак. Не ведаю, ці думаў так той немец-фатограф, але трансфармацыя з пераадзяваннем мае шматзначны падтэкст: так, вы пераможцы, але ж ці скарыстаецеся вы перамогай, станеце гаспадарамі ды панамі, ці толькі на момант, на дзесяць хвілін далі вам гэты заможны касцюм...

Не хачу паддавацца спакусе доўжыць свой роздум, бо вынікі яго добра вядомы. Спынюся на вобразе – колькі ўжо гадоў дзівіць мяне бацькаў выгляд на гэтым далёкім здымку. Ці не багаты камерсант альбо знакаміты артыст на ім?! Упэўнены выгляд, вытанчаныя абрысы твару, разумны пранікнёны погляд... Няўжо гэта толькі радавы салдацік, затурканы сялянскі юнак...

Помніцца, вясковыя людзі пыталіся ў маці:

– Зіна, а што эта за мужчына такі красівы ў вас на фатакартачцы. Мо багатыр які ці арціст?!

«Эта ж Коля мой у Германіі...»



– Эта ж Коля мой малады ў вайну ў Германіі. У нямецкі касцюм пераадзеўся і сфатаграфіраваўся...

– Глянь, які красівы! Ні за што не паверыла, каб хто другі сказаў...

– Красівы быў. Праўда, от красівы... – адказвала маці і пачынала ў каторы раз пераказваць гісторыю са сваіх маладых часін.

– Эта ж як ён зайшоў да нашых у хату ўпоначы, мяне праводзіў першы раз з танцаў у Малаедах і загаварыў адно, то матка адразу пазнала. Кажа: эта ж Васіля Другаўцоваго з Хадатавічаў сын, бо гаворыць, як Васіль. То ты з ім дружы, яны добрыя людзі...

– Пасля фронту, – які ён быў стройны,

валасы чарнявыя, плечы шырокія – я адразу ў яго ўлюбілася. Ён і зараз, паглядзі, які спрытны мужчына...

– Праўда, Зіна, ён і зараз у цябе красівы, мо за ўсіх мужчын на сяле...

– От былі красівыя, як прыйшлі з вайны! Спраўныя, падцятыя... А спявалі як хорашо! То слухаў бы й слухаў... Эта ж яны там на вайне так навучыліся спяваць... А гуляць у танцы пойдуць, то цэлы вечар ні нагуляюцца – і кракавяк, і абэрак, і падыспань некую... Як інцярэсно было, як яны вярнуліся...

Пазней, калі здымак перабраўся ў мой мінскі пакойчык, пра мужчыну ў капелюшы падобным чынам пыталіся ўжо мае сябры ці знаёмыя. А для мяне гэты вобраз бацькі ў шыкоўным касцюме стаў вобразам няздзейсненай мары яго пакалення. Бо пры іншым жыцці і ў іншай краіне за тое, што яны зрабілі, чаго дамагліся ў нечалавечай па жорсткасці вайне, яны заслугоўвалі не такіх касцюмаў. Пры іх здольнасцях, пры іх працавітасці і мужнасці, стойкасці і цярплівасці, ды каб паспрыяла яшчэ хоць трохі ім дзяржава – зямелькай, лесам, цэглай, тэхнікай, свабодай, – то патанала б у багацці сёння і сама дзяржава, і яны, франтавікі. Аглядалі б абсягі сваіх палёў і цагляныя фальваркі, ды не пад саламянымі дахамі... Ды пакурвалі б сабе тоўстыя цыгары, ды вандравалі па свеце ў чысцюткім і дарагім адзенні, як іх франтавыя паплечнікі з Амерыкі, Германіі, Англіі...

Захапляльная вандроўка ў Берлін



А дасталася ім, і то нямногім, адна радасць – вярнуцца жывымі дадому. І адна толькі вандроўка надарылася ў бацькавым жыцці. Ды і тая без рэстаранаў «всё включено», не на шыкоўным лайнеры з прыхільнымі праваднічкамі, а пасярод гразі і снегу, пехатою, праз сцюдзёныя рэкі і балоты; з начоўкамі не ў гатэлях, а ў прыкапанай пасярод марознага поля ямцы-цяплушцы; не з вячэрамі ва ўтульных шале пад ласкавую музычку белага раяля, а з міскай ахаладзелай крупянкі на цэлы дзень, а то і без яе, ды пад музычку «скрыпача» – нямецкай «кацюшы»...

Але і з такога пакутніцкага падарожжа на Берлін яны вярнуліся ўдзячнымі лёсу людзьмі. Дома, у згаладнелых хатах,



Камінская Валянціна Цімафееўна – франтавы доктар, лейтэнант. 1945 г.

прыстасоўвалі да карысці здабытыя на вайне трафеі. Нямецкі генеральскі кіцель бацька перашыў на цывільны фрэнч і сватаўся ў ім да маці; бацькаў сябра, муж маёй настаўніцы беларускай мовы Марыі Якаўлеўны, Міша Пракарынаў з Аношак, прынёс на плячах у салдацкім мяшку механізм ад настольнага вялікага гадзінніка, прырабіў да яго шкафік і паставіў у хаце, як найлепшы гатунак; марскі пехацінец Андрэй Багамаз вярнуўся з шыкоўным акардыёнам, прадаў яго тэатральным людзям і купіў за гэтыя грошы карову. У кватэры маёй цешчы, прафесара Валянціны Цімафееўны Камінскай, якая прайшла вайну доктарам у зенітным палку, амаль уся мэбля была трафейная. Дагэтуль на дачы спраўна служыць нам круглы нямецкі стол, а на сцяне ў дубовай раме вісіць пісаны маслам нацюрморт – забіты на паляванні цецярук вісне галавою ўніз з хрусталёвай вазы, напоўненай жаўтаватым спелым вінаградам, светла-румянымі абрыкосамі і чырванаватымі смачнымі яблыкамі...

Можа сам Рафаэль ці Брэйгель, часам думаю я. А пасля дзіўлюся наіўным спадзяванкам: тым, хто сядзеў у акопах, Рафаэль і Брэйгель не патрапяцца... Калі толькі падробка якога-небудзь мастака-аматара... А найчасцей сякера, фанарык ці кавалак тканіны на сукенку альбо спінжак. І тое добра – не з пустымі рукамі вярнуўся ў хату...

Толькі забітыя на гэтай вайне не атрымалі нічога. Замест трафейных «сувеніраў» у іх хаты прынеслі пісьмы-пахаванкі. А самі яны засталіся навекі ў чужой зямлі. Колькі ведаю пра

Бацькаў трафей, фанарык нямецкага салдата, няблага паслужыў на гаспадрцы





гэту вайну і не спыняюся дзівіцца ў сваёй самоце: якая ж дарагая яе цана, каму і навошта яна спатрэбілася?! За Берлін палягло каля 360 тысяч нашых салдат, каля 80 тысяч смяротна параненых. За некалькі дзён да перамогі, пасярод квецені садоў, адолеўшы сотні кіламетраў франтавых дарог, маладыя і прыгожыя, яны засталіся ў гэтым смяротным марыве на чужой зямлі. Няма нават дакладных лічбаў пагінуўшых і параненых. Амаль ва ўсіх дакументах і даследаваннях ужываецца слова «каля...»

Бацька, канешне, нарадзіўся пад шчаслівай зоркай, бо вярнуцца з такой забойнай малатарні жывым, не скалечаным — проста цуд, сапраўдны Божы промысел, неабдымнае шчасце. Малым, гледзячы на пакуты вясковых удоў, што засталіся асірацелымі з дзецьмі, я ўпотай прамаўляўся сам з сабою: як добра, што ў мяне ёсць бацька, як мне за ім утульна паводзіцца ў жыцці...

Дык каму ж і навошта спатрэбілася гэтая страшная вайна?! Колькі ўжо разоў я звяртаюся ў думках да гэтага пытання...

Прыпамінаецца сустрэча з франтавіком, прафесарам медыцыны Іванам Пятровічам Данілавым. Вырашыў Іван Пятровіч у свае сталыя гады разабрацца ў перажытых гістарычных праявах. Ды не па падручніках, а з таго, што сам пабачыў і перажыў, дапаўняючы бачанае дакументальнымі фактамі і архіўнай статыстыкай. Чалавек заўзяты і акуратны, ён дасканала ўзяўся за такую нялёгкую працу. Атрымаліся ў І.П. Данілава змястоўныя кніжкі. Вось некаторыя: «Записки западного белоруса», «Неудобная история», «Забытые уроки истории».

Мяне пазнаёміў з ім яго вучань прафесар А.Э. Макарэвіч.

Мы гаварылі пра вайну і палітыку, пра тое, як магла б развівацца гісторыя пры іншых абставінах. Я спытаў Івана Пятровіча: а ці здарылася гэтая страшная вайна з немцамі, калі б не Кастрычніцкая рэвалюцыя сямнаццатага года?! Сам я ў пошуках адказу на гэтае пытанне даўно прыйшоў да пэўных перакананняў. Але ж цікава даведацца пра думку дасведчанага і разумнага чалавека. Іван Пятровіч падняў акуляры і, памаўчаўшы, гледзячы недзе паўз мяне, прагаварыў:

— Надзвычай важнае пытанне для разумення гісторыі. Якраз тут і схаваны ключ да наступных падзей. Фашызм і Гітлер парадзіліся татальным наступам бальшавізму, як яго



Кніжка-пасведчанне да ордэна Чырвонай Зоркі

супрацьвагі. Адбылося, як заўжды ў прыродзе. Не было б рэвалюцыі – не было б і гэтай жудаснай вайны з Германіяй. Усё было б інакш...

Так выказаўся дасведчаны і адукаваны чалавек. Як дорага заплаціла Расія, ды і ўсе мы, за гэты 1917 год! А мо і не толькі за 17-ы, мо і за 14-ы ці яшчэ за што?!

Аднак, сцвярджаюць вялікія філосафы, калі ўзняцца над ахвярамі і пакутамі, то войны неабходны людзям, каб ачысціцца духам, прайсці праз смерць, каб стаць лепшымі і міласэрнымі, навучыцца даражыць кожным спакойным днём. Ды гэта, калі глядзець з вялікай вышыні, а ў жыцці з вайны вяртаецца паламанае пакаленне, як пішуць, страчанае, з парушанай псіхалогіяй.

Кім жа прыйшлі з вайны нашы бацькі – шчасліўцамі, азлабёнымі забойцамі, зламанымі душэўна людзьмі, недарэчнымі ахвярамі апантаных палітычных вар'ятаў? Ды не. Хадатаўскія мужчыны-франтавікі адрозніваліся ад іншых, можа, толькі адным – непамернай працавітасцю, увішнасцю, гаспадарлівай акуратнасцю і прыстойнасцю. Адным словам, нябачнай, але прысутнай, моцнай і нястомнай прагай жыць, забудавацца, узрасціць дзяцей. Можа, і спадзяваліся, што калі вернуцца з фронта з ордэнамі і медалямі, то выйдзе ім якая палёгка, уважыць іх дзяржава і таварыш Сталін. Ды якая палёгка, калі вакол разруха з галадухай і чорны энкавэдзісцкі «воран» напагатове?!

Дзівіцца трэба, як яны пасля перажытых «прыгод» на фронце ды зноўку, дома, патрапіўшы ў «прыгоды калгаснага раю», змагаліся за жыццё і сваю будучыню. Вось хлапечы лёс бацькавага аднагодкі і прыяцеля Мікалая Іванавіча Гадуна (Коля Іванаў). У трынаццаць застаўся без маці, памерла. Бацька, Іван Іосіфавіч (Іван Пятрушчыкаў), за палякамі, з мазаля свайго, вучыць сына ў Лані, у сямігодцы, а потым у Клецку, дзе была васьмігодка.

У 1944-м забралі на фронт. Прайшоў Варшаву, Одэр, Берлін. Як адукаванага, зрабілі сяржантам. За такі гонар дабавілі тры гады службы. Вярнуўся дадому толькі ў 1950 г. Ідзе ў калгас, а вечарамі ездзіць на ровары ў Клецак у школу рабочай

моладзі. За дзясятак кіламетраў, штодня. Заканчвае школу з залатым медалём і праз год паступае на гістарычны факультэт БДУ імя Леніна. Атрымлівае дыплом «с отличием» за ўніверсітэт, працуе настаўнікам у вясковай школе, праз тры гады паступае ў аспірантуру БДУ. Пасля аспірантуры – выкладчык Магілёўскага педінстытута імя Куляшова. З 1973-га па 1985 г. сакратар партыйнай арганізацыі інстытута, паважаны ў калектыве чалавек.



Іван Іосіфавіч Гадун (Іван Пятрушчыкаў) з дзецьмі. Мікалай пасярэдзіне. Здымак прыблізна 1930 г.

Моцныя людзі. Такімі яны былі пасля іспыту пад кулямі. Дый розум іншы займелі. Праглі навукі. Патроху вывучыліся Мікалай Драчан і Геня Яўгеняў. Хацеў і бацька вучыцца. Але зацягнула гаспадарка. «Што ж я тут адна з дзеўчынкаю (сястра Ядзя) буду рабіць без цябе,» – казала маці, баба Наташа.

З усіх ганаровых почасцей, што дасталіся бацьку, застаўся ў яго памяці адзін выпадак. Калі паехаў пасля дэмабілізацыі ў ваенкамат у Нясвіж станавіцца на ваенны ўлік з блішчастымі ўзнагародамі на грудзях, то стрэчны міліцыянер выцягнуўся перад ім у струнку, нават узяў пад казырок. Бясплатным білетам на праезд па Савецкім Саюзе, што прыкладваўся да ордэна Чырвонай Зоркі, бацька не скарыстаўся аніразу. Не было часу на падарожжы. Лепей бы далі цэменту на падмуроўку ці лесу на зруб для хаты.



Ужо не хлапчук… Мікалай Іванавіч Гадун з ордэнам і медалём «За адвагу» пасля вайны ў Германіі

Як стромка, засела ў памяці размова з Колем Гарлеўскім, трохі старэйшым за бацьку нашым вясковым чалавекам, таксама франтавіком. Мы стрэліся на вуліцы, калі я на райкамаўскай «Волзе» прыехаў да бацькоў падчас працы



Мікалай Драчан з Хадатавіч, як і бацька, тэлефаніст на фронце. Побач, у адной батарэі, яны прайшлі вайну. Пасля працаваў аграномам

ў сталічным Кастрычніцкім раённым камітэце камсамола Мінска. Першы сакратар, што гаварыць, малады і ўдалы прадстаўнік уладных колаў! А ён, хваравіты выглядам, з запаленымі пачырванелымі вачыма, у прапыленых і стаптаных кірзачах, у заношанай сарочцы з працёртым каўняром, вымавіўся пра ўладу:

– Што яны, Васька, адно гавораць пра нас, франтавых? Нічога яны нам ні памагаюць, язык камі плешчуць...

Соромна неяк стала мне і за «Волгу», і за сваю высокую пасаду ды ўдалую кар'еру. Сапраўды, сам бачыў, што параднай таўкатні і радаснага крыку вакол Перамогі штогод падымаюцца цэлыя віхуры, а ці даходзіць хоць які ветрык да пераможцаў? Недзе толькі з сярэдзіны 70-х бацька стаў атрымліваць на свята Перамогі 9 мая віншавальную паштоўку з пажаданнямі моцнага здароўя ад удзячных нашчадкаў. У юбілейныя гады прывозілі ветэранам-франтавікам з ваенкамата памятныя медалі. Пазней пачалі запрашаць на святочныя мерапрыемствы ў калгасны клуб. Адорвалі «дарагімі» падарункамі: таннай кашуляй ці спартовымі штанамі, пачакам цукру, кавы ці чаю, кавалкам варанай каўбасы. І то за калгасныя грошы, не за дзяржаўныя выдаткі. Пры Брэжневе толькі франтавікам дабавілі грошай да пенсіі, зрабілі ільготы пры аплаце камунальных паслуг. Бацька тым быў вельмі задаволены:

– Ну во, падумалі й пра нас...

Але дажылі да добрай, па вясковых мерках, пенсіі нямногія. Час няўмольна прыбірае былых салдат у свае цьмяныя пакоі. Ды і не ўмелі яны дамагацца таго, што заслужылі, не па душы было ім стукацца ў дзверы начальніцкіх кабінетаў за ільготамі. Бацька аніразу не звярнуўся за франтавымі спагадамі да старшыні калгаса ці ў сельсавет, не прасіўся ў шпіталь ветэранаў вайны, не дабіваўся ў дактароў танных лекаў. Бо лічыў, што ён не зрабіў нічога надзвычайнага. Ваяваў разам з усімі хлопцамі супраць захопнікаў. І рабіў гэта так, як быў прывучаны рабіць любую сялянскую справу: араць зямлю ці касіць сенажаць – сумленна, так, каб людзі не пасмяяліся, бо людзі ўсё бачаць і разумеюць. Сам жа, бывала, пасмейваўся, слухаючы


ПРИ УТЕРЕ НЕ ВОЗОБНОВЛЯЕТСЯ.

РАЗОВЫЙ БИЛЕТ
К ОРДЕНСКОЙ КНИЖКЕ

№

Для бесплатного проезда по ж.-д. и водным путям сообщения

От ст. / прист. .....

До ст. / прист. .....

Через узловые станции .....

.....

Действителен в течение ..... г.

для проезда только самого награжденного с обязательным пред'явлением орденской книжки

Мягкий вагон, каюта I кл., курьерский и скорый поезда

ТУДА — Для компостера

ОБРАТНО — Для компостера

Праязныя дакументы да ордэна Чырвонай Зоркі

вельмі балбатлівых і ахвочых расказваць пра свае подзвігі ветэранаў:

– Мо сядзеў за нашыма спінамі на якім складзе, а бачыш, як менціць языком...

Вайна адкрыла ім вочы на многае. І на людзей, і на ўладу, і на звыклую рэчаіснасць. Яна зрабіла іх мудрэйшымі, пашырыла свет перад затурканымі беларускімі хлопцамі. І тым самым дабавіла ў іх жыццёвы погляд трохі суму і зайздрасці. Бо зразумелі многія сваю забітасць, безабароннасць перад уладай, беспрасветную сваю долю. Убачылі, што


Награжден орденом — № ордена

Имеет право, начиная с Мая 1945

на получение орденских денежных выдач и на другие льготы и преимущества, согласно „Общему положению об орденах Союза ССР".

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР

19 .. г.

В № 139671

ИЗВЛЕЧЕНИЯ

из „Общего положения об орденах Союза ССР" (утверждено постановлением ЦИК и СНК Союза ССР от 7 мая 1936 г.).

1. Орден Союза ССР является высшей наградой за особые заслуги в области социалистического строительства и обороны Союза ССР.

3. Орденами Союза ССР могут награждаться как отдельные граждане, так и войсковые соединения и воинские части Рабоче-Крестьянской Красной Армии, предприятия, учреждения и организации.

4. Награжденные орденом Союза ССР могут быть за новые заслуги повторно награждены тем же или другим орденом Союза ССР.

10. Награжденные орденом Союза ССР пользуются лично правом бесплатного про-

3

За ордэн прызначаліся грашовыя выплаты



ёсць на зямлі лепшыя парадкі, не горшыя людзі, чалавечыя адносіны паміж людзьмі і ўладай. Бацька хоць і не выказваўся прама, але я добра памятаю частыя яго словы па той ці іншай нагодзе:

– Не, от у немца парадак быў, не тое, што тут у нас; нашы людзі так не жылі і не жывуць – якія дамы, хлявы каменныя, каровы, свінні – пародзістыя, заглядзенне! Але і строгасць там была, там бы нашыя п'яніцы не разгуляліся, у мамент прыпынілі б...

– Нашыя то салдаты перад амэрыканскімі, хоць мы і гарэлку разам з імі пілі, але выглядалі так скупавата. У тых абмундзіраванне харошае, сукно, бацінкі жоўтыя, новыя, на «вілісах» – такія хлопцы, што ого-го!

– А ў нашых гімнасцёрачкі засціраныя, залатаныя, боты разбітыя... Цехніка амэрыканская тожа новая, сільная, да толку... Але хлопцы-амэрыканцы, як і нашы, тожа любілі выпіць..

Франтавікі многае пераасэнсавалі ў сваім поглядзе на свет пасля вайны. Пэўна і мой лёс, як і брата, таксама вызначыўся гэтым новым, прынесеным з вайны бацькавым разуменнем жыцця і яго каштоўнасцей. Аб тым я выказваўся на папярэдніх старонках майго споведу.

Дык кім жа яны ўсё-ткі вярнуліся з вайны? Пакутнікамі, пераможцамі... Нават не ведаю, ці маю я права на такое пытанне. Бо лепей спытацца ў саміх франтавікоў – у бацькі, у камандзіра яго батарэі Жабіна, у камандзіра дывізіі Бруханава, у камандарма Берзарына, у камандуючага 1-м Беларускім фронтам, самога маршала Жукава... Спытацца не для тэлебачання перад камерамі, не для інтэрв'ю карэспандэнту газеты з мікрафонам, а так, па шчырасці, як расказваюць толькі сваім. Не магу прадбачыць, што сказалі б яны мне, калі б такое здарылася. Добра толькі ведаю бацькаў адказ, хоць і не пытаўся ў яго ніколі аб тым.

«Настрадаліся мы нямало. Ніхто не верыў, што мы пабядзім немца. А мы пабядзілі!»

Недзе ў падсвядомасці ў мяне з'яўляецца прадчуванне, што з вуснаў многіх франтавікоў, нават і вышэй азначаных,

я пачуў бы падобныя словы. Бо ні крыўды, ні дробязная хлусня, ні папрокі зайздроснікаў не маглі пахіснуць цвёрдага разумення здзейсненай імі вялікай справы. Яны перамаглі немцаў. І ўсё, як кажуць, кропка. Болей гаварыць нічога не трэба. І як бы прыдзірліва ні разбіралі стратэгію і тактыку вайны сённяшнія даследчыкі, як бы ні склаўся лёс маршала Жукава, генерала Бруханава, лейтэнанта Жабіна і ўсіх, хто быў там, перад ворагам, у іх назаўжды засталося тое, што перакрэсліць і адабраць не пад сілу нікому – Перамога. Праз кроў, ахвяры, здраду, памылкі, паражэнні, але Перамога. Перад імі, пераможцамі, хочацца толькі аднаго: проста схіліць галаву. Гэта павага не па пратаколу. Яна ад нечага, што не вызначаецца словам, а толькі непадуладнай інтуіцыяй. Самай высокай адзнакай чалавека ў вясковым разуменні было пачуць: Вінак, Коля, Петрык ці Міша – ён на фронце быў, «награджённы». З ім можна мець справу. Сур'ёзны, значыцца, чалавек, не вецер у полі.

Дарэчы, пра «награджённы». На сяле не вельмі добра разбіраліся ва ўзнагародах: які там у каго ордэн: «Красного знамени» ці «Красной звезды», альбо якая там медаль: «За взятие Берлина» ці «За освобождение Варшавы»... Галоўным лічыўся сам факт – «награждзённы» ці «ненаграждзённы».

Звычайна, нашых сялянскіх хлопцаў запісвалі ў франтавы люд простымі салдатамі, радавымі, без лычак і нашывак. З вайны прыходзілі ў працёртых гімнасцёрках ды паношаных, падпаленых шынялках. Ведаю з бацькавых слоў, з прачытанага ды пачутага, што там, на перадавой, у акопах, салдаты ні пра якія ўзнагароды не думалі. Гэта больш непакоіла тых, хто пры штабе, у палітаддзеле. А ў сялянскіх хлопцаў адна спадзяванка – выжыць, вярнуцца дадому на сваіх нагах, з рукамі, з непрабітай галавой, з вачыма. Бо калека плуг не падыме, каня не зацугліць, а ў хаце галота...

Вярнуцца жывым і «награждзённым» – асобы статус. На вайне былі многія, але не многія прыходзілі з медалём «За адвагу» і ордэнам Чырвонай Зоркі на грудзях у аднаго чалавека. Высокія і пачэсныя то былі ўзнагароды.

«Гэта, брат, не ў абозе кабылаю камандаваць», – казаў Міхаіл Мікалаевіч Кадэбскі, загадчык сельскагаспадарчага аддзела нясвіжскай раённай газеты «Чырвоны сцяг», з якім я стрэўся падчас маёй там нядоўгай працы. Абодва франтавікі,

яны з бацькам разам пачыналі ў друкарні. Міхаіл Мікалаевіч прайшоў Сталінград, вярнуўся бязрукім, зведаў такога ліха, што глядзеў на пасляваеннае жыццё, на некія там рэдакцыйныя праблемы і наганяі, як на вясёлыя забавы. І гаварыў мне за чаркай падчас нашых камандзіровак у калгасы: «Бацька твой не абы-што...».

Не сакрэт і другое. Была ў кожнага свая вайна. Хто ў абозе, у тыле, у санузводе, пры штабе, пры пахавальнай камандзе... Чулася часам: ён то на вайне шморгаўся ззаду з кабылаю, але начапляў некіх значкоў... Ніякі ён ні награждённы...

...Я часам здымаю з паліцы знойдзены праз інтэрнэт бацькаў узнагародны ліст, раздумваю над радкамі: «...19 порывов за десять минут...» і прыпамінаю адзін выпадак. Мы гаварылі пра вайну з даўно знаёмым мне чалавекам, трохі старэйшым за мяне. Я быў ўпэўнены, што яго бацька ваяваў, бо гэта неяк вынікала з нашых гаворак. Спытаў: а дзе ён ваяваў? Бачу чалавек скамечыўся, нешта муляе губамі, потым, нібы баючыся, вымавіў: «Знаяш, яго не забралі. Ён якраз пераехаў да цёткі ў Мінск і ўстроіўся на жалезную дарогу правадніком...». Да мяне дайшло, што чалавек схаваўся ад вайны, уцёк у другую мясціну, адсядзеўся, потым ціхенька прыстроіўся на паяздах, а тут і вайна скончылася... Ды ці адзін ён быў такі...

Можа, толькі зараз, у сталыя гады, я зразумеў бацьку. Зразумеў і адчуў усю яго сялянскую даверлівасць, яго наіўную патрыятычную сумленнасць. Ён абсалютна верыў у тое, што жыцця не шкадуючы трэба бараніць радзіму і сваю зямлю. Бег у пекла, пад кулі, міны і шукаў там, пасярод гэтага гібельнага смерчу, перабітыя правады тэлефоннай сувязі, выдзіраў іх з гразі і снегу, звязваў задубелымі, скрываўленымі пальцамі... За хвілі, за секунды – каб хутчэй, хутчэй прайшлі па іх словы каманды!

Мо над ім і тады, на Одэры, хто пасмейваўся: чаго ты лезеш у пекла, заскоч у варонку ды прытварыся аглушаным... Зараз дык пасмяяліся б у адкрытую: дурань, пра сябе найперш думай... А ён бег, бо йнакш не мог. Не мог падманваць, хлусіць, хавацца за чужую спіну. І на вайне, і пасля вайны – ва ўсё сваё жыццё. Такая кроў... Такі генетычны код...

Гэтае разуменне сваёй крыві, што прыйшло да мяне праз роздум над радкамі бацькавых ўзнагародных лістоў, перавярнула ў некім сэнсе мой позірк на самога сябе, на брата, на ўсе тыя пратрусы і паваротьі, што сталіся на пройдзенай дарозе.

Пасля дзяржаўных пасад, як і многія ў той час, бо трэба было неяк жыць, я кінуўся ў так званы бізнес, думаў пра вялікі гандаль. І ў мяне нічога не выйшла. Пазычаў грошы, а мяне дурылі, грошы не вярталі. Гэта было ясна з самага пачатку, што падмануць, не вернуць. І я гэта ведаў, а ўсё роўна пазычаў. Пазычаў, бо ніколі не змагу ўцяміць, як гэта можна: пазычыць і не аддаць...

Азіраюся на той кусочак жыцця з сумнавата-гаркавым пылам на губах. Шкада дарэмна страчанага часу і таго, што не прыслухаўся, не пачуў далёкі голас. Па крыві, як бацька, як брат, я ніколі не буду ні бізнесменам, ні гандляром, бо род наш спрадвеку мазалямі лашчыў зямлю-зямельку. А яе не абвядзеш вакол пальца – з зямелькай трэба па-чэснаму, сумленна, з адкрытай душой, падману яна не церпіць. Таму ў сучасным разуменні я чалавек адышоўшага часу, фігура нават карыкатурная ў сваім даверы і наіўнасці. Такім быў і бацька, калі лез пад міны і снарады. Такімі былі дзед і прадзед, калі сеялі жыта ў полі. Так выконвае свае абавязкі на дзяржаўнай службе брат: з шасці раніцы да позняй гадзіны за сціплую зарплату. Такая кроў... Такі генетычны код...

Бацька яшчэ даслужваў два гады, да 1947-га, «срочную» пад Уладзімірам у Расіі. Гэта былі цяжкія для яго дні. Непрыемней за франтавыя. Бо непараўнальна агідней за ваенную небяспеку былі прыдзіркі жаўтаротых афіцэрыкаў і энкавэдзістаў, маладых сталінскіх сокалаў, якія «пораху яшчэ не панюхалі», а дарваўшыся да камандавання, пачалі «дрочыць» франтавых байцоў «согласно Уставу». Страявая на марозе да дурноты ды непасільныя работы на лесапавале і будоўлі.

– Папробуй ты яму не падчыніся?! Адразу крычыць: пасажу, сволач!

Іх выкінулі з Германіі ў чыстае поле, дзе стаялі дзіравыя хлявы. Кармёжкі аніякай – збіралі прамёрзлую бульбу на выкапанках. Неяк бацька заскочыў у машыну, што прывязла хлеб, хацеў з галадухі змесці ў далонь крошкі, што натрусіліся на падлогу ў кузаве пасля выгрузкі буханак, бо цярпець голад немагчыма. Тут яго і падлавіў энкавэдзіст.

– Знаеш, что за это положено? – закрычаў. – В лагерь захотел?!

Адвёў у сваю каморку, загаварыў лагодней.

– Ладно, я не буду шуметь, только давай ты – мне, я – тебе...

Пачаў падбухторваць бацьку стаць сэксотам, паведамляць яму пра размовы пасярод салдацкай кучкі.

– Я сказаў, што нагаворваць яму нічога ні буду, а за крошкі хлеба, што збіраў у кузаве, хай дакладвае начальству. Няўжо, думаю, пасадзяць яны мяне за эта з медалём «За отвагу» і ордзенам Краснай звязды...

– Тады ён дастае пісталет, тыркае мне пад сківіцу і крычыць: застрелю, сволочь... Ну і страляй, кажу, не спужаеш, ні такіх пабачыў... Але, глянь, адчапіўся пасля таго ад мяне, як і не было нічога. Усё-такі ардзяна памаглі, а то пасадзілі б, як піць даць...

Прыстойнасць заставалася для бацькі непахісным прынцыпам паводзін ва ўсіх жыццёвых ператрусах. Ён ніколі не паквапіўся на чужое, нікому не зайздросціў, нікога і нічога не палохаўся. Мне здаецца, што адсюль, з прыстойнасці, зыходзілі яго моц, сіла і нейкая толькі яму вядомая праўда жыцця. У самых небяспечных сітуацыях бацька, як кажуць, не дрэйфіў, напружваўся, перамагаў бяду. Так было, калі бараніў гонар маці, ратаваў мяне ад апендыцыту, выгнаў з хаты міліцыянтаў, што шукалі гарэлку...

У маёй памяці – страшны выпадак на ферме. Рамантуючы транспарцёр, бацька расперазаўся, а калі націснуў на кнопку ўключальніка, ланцуг захапіў фуфайку і разам з ёю імкліва пацягнуў яго да зубчатых валоў. Да смерці заставалася імгненне. Напяўшыся, ён са страшнай сілай рвануў фуфайку на сябе – так, што яна разляцелася на кавалкі. Такімі яны былі, гэтыя «франтавыя», як казала на іх маці.

...Але ж які лёс: у 1973 годзе, летам, я сустрэнуся з унукам генерала Берзарына Мікалаем Курцавым на Дзясятым сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне. Мы аказаліся разам у складзе савецкай дэлегацыі: я – ад студэнтаў Беларусі, ён, дзесяцікласнік, – ад школьнікаў Масквы. Яго дзед – камандарм, першы камендант Берліна; мой бацька – радавы салдат, тэлефаніст у падначаленай яму арміі. Ці мог хто з іх тады, на дымных вуліцах Берліна, нават падумаць, што сын радавога і ўнук камандуючага пойдуць у шарэнзе, адзін ля аднаго, па знакамітай берлінскай вуліцы Унтэр-дэн-Ліндэн, пад сцягам СССР, дзяржавы, якую яны абодва так самаахвярна баранілі і ўзвысілі здабытай Перамогай.

...Мы з Колем гулялі па Берліну, фатаграфаваліся ля Брандэнбургскіх варот. Я расказваў яму, што мой бацька, як і яго дзед, дайшоў да Берліна, быў тут ля варот, але радавым салдатам. У Колі быў чысты позірк і адкрыты твар. Ён рыхтаваўся пасля школы стаць ваенным, паступіць у элітнае Маскоўскае вышэйшае вучылішча імя Вярхоўнага Савета РСФСР. Але на той час ні я, ні Коля нічога не ведалі аб тым, як перакрыжаваліся шляхі нашых блізкіх...

...А ў той фестывальны дзень я рашыў напісаць бацькам у свае Хадатавічы пісьмо з Берліна. Яны так ганарыліся, што я ўдастоіўся гэткай высокай почасці быць на Дзясятым



Пад сцягам СССР, які нясе на адкрыцці фестывалю знакаміты беларус Аляксандр Мядзведзь



Коля Курцаў размаўляе з кіраўніком савецкага камсамола Я.М. Цяжэльнікавым (справа). Я – пасярэдзіне. Дзясяты сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Берліне (ГДР). Жнівень 1973 г.

сусветным фестывалі адзіным прадстаўніком беларускіх студэнтаў.

«Дарагія мае! Усё тут у Берліне вельмі цікава. Аб тым падрабязна раскажу пазней, калі вярнуся дадому. Але найбольш радуюся і задаволены тым, што пабачыў Сілезскі вакзал, пабыў ля Рэйхстага, ля Брандэнбургскіх варот – там, дзе быў ты, папа, у сорак пятым. Ледзь стрымаўся, каб не заплакаць, як прадставіў цябе тут маладзенькага...»




СНОУ
КЛЕЦК 14



Паміж тутэйшых

Паміж тутэйшых

Апошнім часам лаўлю сябе на думцы, што дзе б ні стрэўся зараз са сваімі хадатаўскімі людзьмі – ці ў Мінску, ці на вясковай вуліцы, ці яшчэ дзе, – усе яны мне цяпер як родныя ды самыя блізкія. Хоць па радству, можа, далёкія, можа, зусім не родныя. Так перамяніўся мой розум, маё стаўленне да нашага мінулага жыцця, да нашых людзей.

За вякі ў сялянскім асяроддзі склаліся стойкія погляды на многія рэчы. Прыжылася і свая няпісаная градацыя ў адносінах паміж вяскоўцамі. У першую чаргу людзі кучкаваліся па роднаснаму падзелу, паміж раднёй. З роднымі пастаянна перамаўляліся, наведваліся, суперажываліся адзін за аднаго. Затым былі прыяцельскія, душэўныя стасункі. Вядома ж, і суседскія. Хоць здаралася, што і з суседзямі не заўсёды ладзілася справа. Нарэшце, вясковыя, агульныя – усе паміж сабою знаёмыя, добра ведаюць адзін аднаго, але ніхто нікому, як кажуць, у душу не лезе. Кожны сам па сабе вядзе гаспадарку, кіруе сядзібай, забяспечвае сям'ю. Калі хто хварэў, паміраў ці трапляў у бяду, то найболей гаравалі па родных і блізкіх, сумавалі па прыяцелях і добрых суседзях, і, як звычайную навіну ў чарадзе падзей, успрымалі тое пасярод астатніх. Ды хоць быў падзел у адносінах, але ж было і адчуванне адзінай суполкі пасярод вяскоўцаў: што «ён з нашае вёскі» – вызначала многае ў адносінах. Хто бліжэй, а хто далей жыве, але ж усе свае, перавязаныя ў пакаленнях, знаёмыя не першы дзень. Тутэйшыя людзі...



Дарогай ад могілак

Я завітваўся на выхадныя да бацькоў і з замілаваннем услухваўся ў смех і рогат на вуліцы, у цікавыя ды кур'ёзныя «байкі» хлопцаў і старэйшых мужчын, у то вясёлыя, то самотныя гісторыі, што няспешна цяклі ў жаночых гуртах. Нядзелькаю працаваць нельга, грэшна перад Богам. Мужчыны купкаваліся каля чыйго дому на лавачцы; хлопцы збіраліся кругам то каля крамы, то каля плоту; жанчыны любілі прысесці на травічку, падаслаўшы пад сябе старую хустку ці дзяружку.

Зараз на той самай вясковай вуліцы мяне страчае глухая цішыня, змярцвелы подых безнадзейнасці. Пранізліва шыбеюць цьмянымі вокнамі асірацелыя хаты, недарэчна звісаюць пахіленыя веснічкі, нежывым духам аддаюць парослыя крапівою ды бур'яном двары, прагнутыя стрэхі на хлявах, расхрыстаныя платы абапал пляцоў. Ва ўсім самотная няўтульнасць, роспач і вострае, як стромка, пытанне, што нематой рвецца да галавы і сэрца ад гэтых выбітых ваканіц, нікому не патрэбных калодзежаў, хлевушкоў ды падпаветак. Што ж тут нарабілася, куды падзеліся людзі, чаму кінулі свае гаспадаркі, усё сваё нажытае ды палітае потам?! Няма амаль нікога з тых, што стаялі, гаманілі, смяяліся, аралі ды касілі...

Сышлі. Час забраў іх аднаго за адным на могілкі – туды, дзе і наш бацька, і наша маці. А дзеці, унукі? Дзеці і ўнукі



Глухая цішыня на вясковай вуліцы

разбегліся па свеце за лепшай доляй: хто ў Нясвіжы, у Клецку, у Мінску, а хто і ў Амерыцы ці ў Германіі...

Але ж нам, мне і брату, так мулка на свеце без знаёмых з маленства твараў, размоў ды жартаў, сустрэч ды расстанняў. Неяк адзінока нам, няўтульна самім па сабе, нібыта парвалася вяроўка, што трымала нашу лодачку пры беразе, і коўзаецца яна, лодачка, непрытульная, як той паўшы з дрэва на водную плынь зялёны лісточак. Хочам зладзіць, змацаваць яе з зямелькай, на якой раслі, сталелі, ды нешта не вяжацца, не стасуецца. Адно і робім, калі здасца вольная хвілінка, дык едзем, мкнёмся праз пустую вясковую вуліцу туды, на пясчаную выспу ў канцы сяла. Ведаў, што надыдзе такі час, але ж не думаў, што вось так абміну родную хату, толькі гляну на яе і паеду далей, туды, на могілкі. Там зараз наша святліца, там страчаемся з бацькамі, з суседзямі, з тымі, хто жыў блізка, а хто і далёка, у канцы сяла...

Ці першы раз заглядаюся ў знаёмыя партрэты на плітах, чытаю прозвішчы, прыпамінаю галасы, размовы, твары. І разумею, што не толькі маці і бацька, цётка Ядзя і дзядька Коля, Міша Анцін і цётка Надзя, дзед Сяргей і баба Мар'я, а ўсе нашы хадатаўскія людзі, усе яны мне сёння сваякі ды радня. Няма ўжо аніякай градацыі, аніякага падзелу на добрых і кепскіх, сваіх і чужых, на прыяцеляў і непрыяцеляў.

Штораз, калі тэлефануе брат Толя і кажа пра чарговую смерць на вёсцы, я сутаргаюся ад суму і жальбы. У маім штотыднёвіку запісы: памёр Лёнік Верчын, Ільюк Навічанчын, Аня Любіна, Толік Костусеў, Мішка Семачкаў, Анюта Сашыкава, Маруся Сяргейкава, Колік Ладымяраў, Васька Костусеў,

Маня і Іра Ёганавы, Васіль Домчын і Ніна Ладымярава, Вася Твароўскі... Лічы ды не пералічы ўсіх. А кожнае імя – адбітак, вобраз, постаць, адным словам, жыццё. Бо адзін дух, адна зямля...

...Паволі кіруюся ў той канец могілкаў, што ад вёскі, дзе старыя замшэлыя помнікі – некаторыя зацягнуты зямлёй, параслі мохам, лішайнікам. Няма каму даглядаць. Спыняюся ля магілы дзеда Васіля. У які раз зацінаюся позіркам на гранітным крыжы і пастаменце. «Прылажыў» дзеда родны брат Сяргей – і яго, і бацьку іх, Андрэя, нашага прадзеда. Помнікі з граніту, дарагія. Адной каровай дзед Сяргей не абышоўся, каб сплаціць за іх пры паляках. На крыжы і помніку выбоіны ад куль. У вайну, казаў бацька, так «весяліліся» на могілках, навэдзкаўжыся самагонкі, «лясныя брацця». Добра, што мы з братам упарадкавалі ўсе нашыя магілы: і на хадатаўскіх, і на наруцаўскіх (малаедаўскіх) могілках, – думаю я, аступаючыся паміж агароджаў.

За дзедавай магілай – старая разложыстая сасна; скрозь галіны – распрасцёртая далячынь над полем і вясковымі прысадамі, недарэчная, паросла быллём яміна, пакаты спуск ніжэй – да сажалкі, адкуль некалі выхіналася рачулка Дунай. Дзе вялізная яміна, была роўнядзь, прытулак нашых забаў. Яе звярэдзілі, бралі чвыр на дарогі. Тут мы ладзілі Купалле. Якое то было цікавае відовішча! За тыдзень



За дзедавай магілай – старая сасна і далячынь



Купалле. Амаль як у Хадатавічах

пачыналі трымцець чаканнем агню. Са старэйшымі хлопцамі секлі цэлыя параконкі ядлоўцу, звозілі іх сюды, у кучу, бо ядловец дае добры дым, гарыць, як порах, бягуча, шапатліва; сцягвалі старыя шыны, бо завіваюцца чорнымі слупамі; рыхтавалі розныя «бухалкі», каб кідаць у агонь і палохаць дзяўчат. Ішло суперніцтва паміж вёскамі – у каго большае вогнішча, магутней дымны слуп, даўжэй гарыць...

...Ліпень, цёплы прыцемак, ці не ўся вёска тут, на пагорку, што азначаны гэтай старою сасной. Прыйшло Купала, вялікая прыгода.

– Запальвай! Пара!

Бензінам ці саляркаю з бутэлькі на хмызняк, чыркнуць запалкай, адскочыць убок – пагрозліва зашапацела, зашугала полымя. Зацяўся да неба чорны дым. Праз хвілю бачым – пайшлі слупамі дымы з-пад Гусакоў, Коханавічаў, Казлоў... Насцярожаная затоенасць, што была са страху перад вялікім агнём, пераходзіць у скокі, даганялкі, крыкі, смех, звон і агульны тлум. Тут і старэйшыя,

Хата Косціка Ігнатавага



і бацькі – глядзяць на моладзь, цікуюць за сваімі, трохі баязліва ўзіраюцца на агромністае вогнішча. Ды пакрысе разыходзяцца па хатах, бо ведаюць, што трэба ў гэтую ноч быць «начыку». Адгудзяць гулі-скокі, і пойдзе маладая ватага шуткаваць, рабіць шкоду. У каго здымуць весніцы – аднясуць на чужы двор, у каго залезуць на стрэху і шклом закрыюць комін, скруцяць калёсы з воза – падменяць суседскімі, прымкнуць клямку з надворку, каб раніцай гаспадар павалэндаўся, адчыняючы дзверы ў сенях...

Днём вясковыя будуць да ўпаду смяяцца і рагатаць, пераказваючы ў дзясяты раз, як Аляксандр у купінах на балоце знайшоў весніцы, а Янак паўдня не мог уцяміць, чаму дым з печы ідзе на хату... Хто не ўпільнаваў дворышча, доўга валтузіліся, каб разабрацца, дзе што аказалася. Але не гневаліся асабліва на жартаўнікоў, бо такая завядзёнка на Купалу...

...Сыходжу з могілак, кіруюся ад пагорка на вясковую вуліцу. Сажалка перад Грудзінавым садам талеркаю ўпінаецца ў пахілены драцяны плот. Некалі здатны і распасцёрты сад дзічэе, недарэчна раскарачыліся старыя пачарнелыя яблыні. Супраць сада, па правым боку, пляц Косціка Ігнатавага. Хата даўно непрытульная, расхрыстаныя ваканіцы цьмяна і безнадзейна ўзіраюцца на пабітую каляінамі дарогу. За імі Піліпавы пабудовы, таксама пустыя. Праз плот яшчэ больш-менш здатная хата Зоні Грудзінавай. Вокны, дзверы пакуль цэлыя. Веснічкі, плот, хлевушок з паленіцай дроў ля сцяны. Во, выйдзе зараз на двор сама Зоня, набярэ паленцаў аберуч, каб печ распаліць... Ды не выйдзе. Дарэмна чакаць. Цётка Зоня,



Хадатаўскія жанчыны. Злева направа Ліля Дзюбікава, Ніна Чарнабаева, Таня Алёшава, Аня Грышкава

састарэлая, гады са два як перабралася да роднай сястры Валі ў Хрыпкава.

Насупраць Грудзінавых і Лёдзі Лаўрынавай крыжуюцца дзве дарогі: да вясковай прымкнулася старая, цяпер ледзь азначаная вугрыстымі шнуркамі і падзёртая спранжыноўкамі, што вяла наўпрасткі, праз лес, на Даматканавічы і Клецк. Таму тут, на скрыжаванні, нібыта невялічкая плошча ўтварылася. На гэтай «плошчы» стары Яніслаўскі «караў» некалі сваю хахлуху. Пазней я раскажу пра гэта. Хата Яніслаўскага, даўно закінутая, амаль што ўрасла ў зямлю. Бур'яном зарос надворак, не пазнаць ні сцежку, ні гародчык.

Далей Дзюбікавы. Добра помню іх. Высокі, жылісты, танкаваты тварам сам Дзюбік, масцеравы, здатны цясляр. З сякераю, запхнутаю пад зашмальцаваную папругу на фуфайцы, шырока і шпарка ідзе з мужчынамі пад Ільюкову, брыгадзіраву хату, бо там распачалі будыніну вясковай крамы. Не адзін зруб паставіў, не знаў спакою за работаю. Малодшая іх, Ярэнка, удалася прыгажуняй. Мо з гэтай прыгажосці і сышла заўчасна са свету. Круціліся каля яе хлопцы, а дзе гандля, кажуць, то няма дабра. Гарэлка збіла з толку, прапала, згінула Ярэнка і яе красата, хоць дзядзька Дзюбік ніколі да гарэлкі асабліва не прыхільваўся.

Бачу ў веснічках Лілю Дзюбікаву. Родная сястра Ярэнчына, старэйшая ў іх сям'і. Састарэлася цётка Ліля, кепска бачыць, але мяне пазнала:

— Ты, Вася, так не мяняешся, не старэяш, некі адзінакавы ўвесь час...

Помніцца цётка Ліля маладзенькай ды вясёлай у нашай хаце, калі хадзіла да маці вучыцца шыць. Шуткавалі яны маладымі, кіпела смехам ды жартамі наша хата.

— От, Вася, я цябе добра помню маленькага. Нек пад восень купіла табе Зіна, матка твая, рызінавыя боцікі. Новыя, дык яны блішчастыя. Мы гамонім у хаце, Іллюк, брыгадзір, зайшоў, і ні бачым, што ты ногу падняў і трымаяш перад намі, каб на боцікі новыя паглядзелі. Такі ты быў давольны этымі боцікамі. Зіна потым кажа: гляньце вы на хлопца, нагу перад вамі выставіў, бачыце, які спрытны...

У памяці праводзіны ў армію іх сына Валодзі. Якраз я прыехаў дадому. Мы сядзелі на покуці каля маленькага шчупленькага Валодзі, і бацька пасля першай чаркі паляпваў яго па плячах: «Мы, брат, пад пулямі армію прахадзілі...



Сялянская справа

Во як было... Адслужыш, нічога, толькі не лезь асабліво наперад...»

Цётка Ліля была замужам за Колем Твароўскім. Спраўны мужчына. Калі ўзгадваю яго, выплываюць з мінулага цікавейшыя адбіткі. Бацька клікаў Колю забіваць «япрука» (*вяпрука*, *кабана па-літаратурнаму*). Справа гэтая мела асаблівы сэнс у сялянскім жыцці. Добра выкармлены вяпрук – надзейная спадзеўка на выжыванне сям'і, на прыстойную яду ў суровыя зімы, у цяжкія работы. З яго і сала – найпершы сялянскі дэлікатэс, і каўбаса на Вялікдзень, і костачка ў крупнік, і «здор» (*нутраны тлушч*) на аладкі, і «дрыгва» (*халадзец*) на Каляды, і салцісон, і вантрабянка...

Выкарміць здатнага вяпрука – цяжкая, несупынная праца з раніцы да вечара, але і гонар для гаспадыні. Таму, калі з першымі добрымі прымаразкамі і сняжком падступаўся час «калоць», па-вясковаму вызначэнню, вяпрука, было гэта спавіта некай унутранай урачыстасцю, прыўзнятасцю ў хаце. Чысціліся лавы, сталы і шкафчыкі, вымываліся вёдры, тазікі, міскі, вастрыліся нажы. Бацька акуратна тачыў швайку – стальны, вузкі, завостраны на канцы прэнт. Рыхтаваў салому, каб вяпрука асмаліць. Пазней сталі карыстацца паяльнымі лямпамі, але дзед Антось лямпу не прызнаваў. Ну і ці не важней за ўсё – каго паклікаць калоць, бо аднаму не ўправіцца, дый закалоць спраўна мог не кожны мужчына. А трэба спраўна, каб не разлілася кроў, не папсавалася сала, каб не мучыць жывёліну. Цэлая навука тут, бо япрук яшчэ з вечара насцярожваўся, напружана рохкаў, нібыта падслухаў размовы гаспадароў ды спачуў некі збой у зладжаным рытме. А гэта кепска, бо калі «свінча» знерваванае, то і сала з яго можа быць не вельмі ўдалым. Тонка выстройвалася ўсё ў гаспадарцы. Як і Шарык ля буды – таксама загадзя пачынаў круціцца і енчыць, чакаючы вялікага тлуму.

Забівалі вяпрука хто як. Некаторыя, паляўнічыя, стралялі ў вуха. Бывала глушылі абухом па галаве, потым калолі швайкай. Майстэрства – з аднаго разу патрапіць швайкай у сэрца, каб не мучыўся, адразу сканаў. Якраз так і быў злоўчаны рабіць гэтую векавую сялянскую справу дзядзька Коля Твароўскі. Кабан у яго не мучыўся. А пры няўдалай рабоце свінні раўлі і скавыталі на ўсё сяло, вырываліся з загарадзі,

Коля Твароўскі



нават калечылі людзей. У тым жыцці, як кажуць, была свая «азбука» і былі ў ёй свае знаўцы...

...Во, бачу мужчыны пайшлі за хлеў, туды, дзе падпаветка і хлевушок. І я туды, але ззаду. Прыпыняюцца, нягучна перамаўляючыся. Бацька дае вяпруку скарыначку хлеба, пачэсвае за вушамі...

...Месца, дзе прайшла швайка, затыкаюць драўляным калочкам. Вяпрука закульваюць на санкі, цягнуць па сняжку ад загарадзі на надворак – смаліць. Мне трохі свярбела пад сэрцам, калі мужчыны яго забівалі, але ўсё сыходзіць, як зачынаецца смаленне. Бацька і Коля пакуюць салому снапкамі, падпальваюць, з агністымі факеламі вытупваюцца абапал вяпрука.

Цвірчыць падсмаленае шчацінне, скуголіць Шарык на ланцугу – хоча сюды, да нас; пляцецца гамонка, завіхаецца дым у белавата-шэрую высь. На вуліцы калымнулася падвода жалезнымі абручамі па прымёрзлых, прыцярушаных тонкім сняжком камянях, пратупацелі капыты. Закрычаў певень у Домкі. Я падымаю вочы ў той бок – знямелыя, чорныя, растапыраныя слівы, пахілены плот, саламяная страха, трохі выбеленая сыраватым інеем, кудлатыя шэрыя хмары ўдалечыні то напярэймы, то ланцугом, то навыперадкі паўзуць і паўзуць за край зямлі... Дым ад саломы гаркаватым ценем вярэдзіць вочы, стрэмкай занізвае маю памяць...

...Абсмаленага да чарнаты падымаюць вяпрука на шырокую лаву, жыватом уніз, падпіраюць паленцамі з бакоў, каб не перакуліўся, не ўпаў на зямлю. Маці бярэцца за жбан, пускае на спіну струменьчык вады, а бацька шырокім і кароткім зломкам ад касы саскрабае чорную смаль са скуры. Праз колькі хвілін вяпрук ляжыць на лаве жаўтлява-свяжуткі, нават прыгожы. Мне здаецца, што ён вельмі задаволены, як усё склалася, – такі ў яго выраз на лычы...

...Памылі. Абцерлі чыстымі ручнікамі. Невялічкі перадых перад галоўнай дзеяй: вяпрука трэба «разабраць» – зноў жа майстэрская справа. Дзядзька Коля бярэцца за блішчасты востры нож. На стале растуць кіпы з акуратных прамавугольных кавалкаў сала. Ад іх струменяцца ўвысь ледзь бачныя

клубочкі цёплай пары. Завіхаюцца жанчыны. Тут яны наперадзе мужчын. На падмогу да маці прыходзіла цётка Ядзя ці нават баба Волька з Малаедаў. Упарадкаваць сала, мяса, вымыць кішкі, зрабіць каўбасы, ператапіць здор, сабраць кроў... Будуць яны круціцца і бацька з імі да самай ночы. Але перад тым будзе перапынак, бо дзядзька Коля ці хто другі, хто калоў ды разбіраў вяпрука, сваю справу скончылі, і патрэбна гэта адзначыць. Такі парадак. Шырокая скаварада сквірчыць свежым салам, мяскам, кухня захіснута пахамі каляндры, цыбулі, часнаку, смачнага печыва. Ды прысаджваюцца за стол, дзе стаіць прыткнутая газетнай затычкай бутэлька самагонкі, з мутнаватым, прыпацелым з холаду шклом. Мяне прыладжваюць паміж сабою, даюць на акрайцы чорнага хлеба смачную скварку. Дарослыя гавораць пра кабана, што харошы, выкармлены, але ўсё палучылася з ім як мае быць...

– То выпівайце, мужчынкі, каб жылося ды і ў вас вялося! – неяк бадзёрыста кажа баба Волька і сама прыгубляе трохі з чаркі...

Пад канец разбору я ўспамінаю пра вельмі важную для мяне справу. Падбягаю да бацькі: «А пухір зробім?!» Бацька глядзіць са смяшынкай, кажа:

– Так ужэ адлажыў табе твой пухір. Потым перамну яго попелам...

Мелася і, відаць, здаўна, у вясковых хатах такая забава. Мачавы пузыр з кабана мялі ў попеле, мылі, падвешвалі на печы на прасушку. Калі высыхаў, надзімалі паветрам, завязвалі. Атрымліваўся амаль што мячык. Але з адмецінай. Ён стукацеў, нібыта старыя, выпетраныя на печы, косці. Толькі дакранешся – шоргат і трэск. З гэтым шуткавалі. І завадатарамі былі дарослыя, каб пасмяяцца, а дзецям – дык то салодкая забава. Прынаджвалі сабаку, за хвост мацавалі гэты надзьмуты мячык з высушанага мачавіка – «пухір» па-нашаму, па-вясковаму. Толькі адпускалі, як пухір пачынаў грукацець па зямлі за хвастом. Сабака кранаўся розумам ад страху, на шалёнай скорасці імчаў па вуліцы праз усю вёску – куды вочы глядзяць. Стрэчныя бабы ці мужчыны шугаліся ў бакі; перапуджаныя, выгаворваліся:

– Гляньце, сабака Антосяў здурэў... Эта ж пухір прывязалі дурні...

Але жарты з пухіром былі наперадзе. А на другі дзень, як закалолі вяпрука, маці раскладвала «дзялянкі», значыцца,



Бацька, Толя Максімаў (Гадун), яго жонка Зінаіда Іосіфаўна (па цэнтру) і госці з Мінска. Злева – Станіслава Цімафееўна Бялушчанка (родная цётка Галі) і Праскоўя Трыфанаўна Камінская (бабуля Галі па маці). Справа – дваюрадны брат Галі Аляксандр Бялушчанка. Хадатавічы. Верасень 1977 г.

гасцінцы са свежага сала, мяса, каўбасы. Бабе Вольцы і дзеду Антосю ў Малаеды, бабе Наташы і Петрыку, цётцы Ядзі, яшчэ каму з блізкай радні, суседзям. Такі парадак. Калі яны заколюць, то аддзякуюць такім жа чынам – прышлюць нам дзялянку. Абавязкова...

...Аднак замілаваўся я ўспамінамі і былымі дзеямі. Дый як імі не замілавацца? Але ж во, абмінуў ужо колькі хат! Чую бразнула восілка на надворку ў Зіны Толевай (Іосіфаўны), братавай цешчы. Шчыруе з венікам каля калодзежа. Парадак, як і некалі, у маладыя гады. Двор падмецены, сцежачкі чысцюткія. За плотам статны певень балбоча на чародку курэй. Іосіфаўна просіць мяне, каб узяў дадому яек. Добра нясуцца куры сёлета. Увішная жанчына, як і мужык яе, Толя Максімаў. Звонкагалосая ды вясёлая была некалі! Прыгнулі гады, але і зараз вочы вострыя, прыемныя.

– От, Васячка, кепска мне бяз вашай маці, бяз Зіны. Я ж заходзіла да яе часто, часто. Дак пагаворымо, пасядзімо. Хай бы ж яна яшчэ пажыла. Як жа добро было... Папраўдзе кажу...

За Максімавымі – спраўная хата Васіля Грышкавага. Заўзяты да працы быў чалавек, шмат гадоў камбайнерам



Валя Чарнабаева

у калгасе. І хата, і пабудовы выглядаюць дагледжанымі. Глядзіць за ўсім сын Толік, што адзін жыве тут па суседству з Іосіфаўнай.

Іду далей. Ледзьве дыхае ўжо хатка Івана Сяльвестарава. Даўно, пры маім маленстве яшчэ, сыйшоў са свету, а хатулька трымаецца. Насупраць надворак Грыбавых. Пуста. Перад вачыма яго некаліжні гаспадар, дзядька Грыб: вечна зашмальцаваны, у кірзачах зімой і летам, твар – адны косці, абцягнутыя скурай, і вялікія, закарэлыя далоні ў чорных ад мазуту трэшчынах... А вочы мяккія, добрыя...

За Грыбавымі – Васіліна. Высокая, мажная жанчына. Хадзіла трохі прыгнуўшыся. Ад плячэй віслі долу, нібы стамлёныя вяроўкі, яе натруджаныя моцныя рукі. Не пайшла замуж, адна трымала гаспадарку, спакойная, незлабівая. Прынесла зранку дроў, каб распаліць печ, адно разагнулася, як зрабіўся параліч. Упала пад прыпек і памерла. Перад абедам спахваціліся суседзі: дзе ж Васіліна, ні відно нешто...

Цераз плот гаспадарка роднай нашай цёткі Ядзі. Былая гаспадарка. Калі быў жывы Вася, сын, абрабляў соткі, прыглядваў за пабудовамі. Не стала яго, няма каму займацца пляцам, бо Валодзя, другі сын, у Мінску, далекавата, не наездзішся...

Гібее і пляц дзядзькі Мішы Анцінага цераз дарогу. А колькі старання ён некалі паклаў, каб падняць новы зруб, аздобіць садок, у якім звінелі пчолкі, важка калываліся ружова-залацістыя чарэшні, чырвона-чорныя вішні...

Росцік Домчын і Анюта - нашы суседзі



Жывым духам, то і добра, патыхае ад пабудоў Валі Чарнабаевай. Дачка Ніна з сям'ёй ды ўнукамі агледзела бацькоўскую вотчыну. Кветкі, агарод і двор аздоблены, а прыемней за ўсё дык чалавечыя галасы на вуліцы. Цётка Валя Чарнабаева падымала малых дзяцей, бо мужык Васіль разбіўся на матацыкле. Працавітая, прыемная жанчына. Недзе ў мяне ляжаць звязаныя ею шкарпэткі



«Не перажывайце моцно, як мы памром з бацькам...» 2006 г.

і станічак з авечай воўны, да чаго яна была здатнай умеліцай.

Далей пустыя хаты старых Чарнабаевых, Любіных, Анціка Базылёвага, Сашыка Твароўскага... Нядаўна, здаецца, тупаў дзядзька Сашык па сцежцы на вуліцу ў наш бок, да маці, апіраючыся на крывульку...

Каля бацькоўскага жытла чую голас суседкі Анюты Росцікавай. Нешта выгаворвае яна курам і зухаватаму з чорна-чырвона-жаўтлявымі пералівамі пеўню, што грабуцца ў градах. Маці казала:

– Мы з Анютаю з аднаго сяла, з Малаедаў. Яна добрая. Эта ж падумаць, колькі дзён, мо два месяцы, начавала са мною, як Коля памёр... Я баялася адна. А яна хату кідала, да мяне йшла... От якая! Ні кожная так зрабіла б...

Цётка Анюта зараз адна ў хаце. Дзеці разбегліся па свеце. Тамара, старэйшая, пайшла замуж за кубінца, калі той вучыўся ў Мінску на афіцэра. Ён і звёз яе ў такую далеч, на Кубу. Юрак у Пецярбургу. Добра, што Галя ў Нясвіжы, дык штораз у маці – клапоціцца.

Захінаецца наша вуліца далей, у жыліцкі бок, дзе ўлетку садзілася сонца і туманіліся пацяжэўшым к вечару пылам хаты, што курыўся ў ружаватых промнях услед за неторопкімі наетымі каровамі, ідучымі з пашы. Абмінеш мо з пяць пустых хат, пакуль стрэнеш чалавека. Так мала засталося тых, што доўжылі нашу хадатаўскую лінію. А стрэнешся, пагаворыш, то абальецца сэрца радасным кіпенем. Бо са сваім, хадатаўскім, вясковым чалавекам стрэўся. Як раней з бацькам ці з маці, з роднай бабуляй ці з дзедам... Усё меней іх – хадатаўскіх, малаедаўскіх, гусакоўскіх, коханаўскіх... – на свеце. А з кожнай смерцю адлятае ў небыццё кавалак і свайго асабістага жыцця. Чалавек жыве, пакуль ёсць людзі, якіх ён ведаў і якія ведалі яго. Пасля іх сыходу ў вечнасць – ты незнаёмец на гэтым свеце. Нікому нецікавы, лішні чалавек...

...Пара прыпыніць хаду. Во яны, родныя веснічкі і вароты з дзвюх палавін, да якіх так бадзёра, подбегам, мкнуўся некалі бацька, каб расчыніць, учуўшы за колькі хат маю машыну. Ды што ж гэта такое нарабілася са мною, што ці

ледзь не сілаю прымушаю сябе зайсці на роднае дворышча?! Углядаюся ў надворак, дзе за кожным куточкам прыпамінкі ды вобразы, і не ўцямлю: нібыта ўсё, як і раней, а ўсё інакш – маўкліва, глуха, без цяпла, без токаў крыві. Не стрэне бацька, не заступіць на ганачак маці з такім жаданым, такім шчырым і суцешным водбліскам на твары. Не кінецца пад ногі бацькаў «любімчык» Шарык...

З Шарыкам увогуле неверагодная гісторыя. Толя, брат, падабраў яго, кінутае сабачанё, недзе ў Грыцькавічах і прывёз дадому ў Хадатавічы. На дзіва бацька з ахвотай узяўся пешчыць малое, хоць хваробы даймалі. Карміў толькі сам, ніхто болей, навязваў, вечарамі спускаў на бягункі. Шарык строга сцярог надворак, а раніцай паслушна прыходзіў па бацькаваму загаду на ланцуг да буды. Пасля пахавання, пад вечар, Шарык, як толькі адвязалі ашыйнік, лётам кінуўся на могілкі. Тры дні і ночы ляжаў, не сыходзячы, на свежым чвыры над бацькавай труною. Брат клікаў яго дадому, насіў ежу, ваду. Не дакрануўся ні да міскі, ні да вады, а на чацвёрты дзень прапаў, знік назаўсёды, як і яго гаспадар... А мы думаем, яны нічога не разумеюць...



Той самы Шарык

Ды што жаліцца, што каламуціць душу?! Як гаварыла маці:

– Вы не перажывайце моцно, як мы памром з бацькам. На гэтум свет стаіць. Так было і так будзе... Ня мы першыя...

Так яно і ёсць – на гэтым свет стаіць. Колькі ні перажывай, колькі ні думай, а нічога не вернеш назад. Не ў чыёй пакуль моцы змяніць законы прыроды. Дзякуй Богу, што спажылі свае гады. А прыпомніць ды разважыцца ў думках – то другая справа...



Наш сусед – дзядзька Сашык Твароўскі

Людзі і хаты

Так выйшла, што на маім вяку спажылося дзве вёскі. Малым я застаў хутары, аб чым распавёў на папярэдніх старонках, а школьныя гады прайшлі ў вясковым асяроддзі. Ды памяць настойліва вяртае мяне туды, на хутарскія мясціны. Была ў гэтым хутарскім жыцці свая адмеціна. Неяк інакш там спачуваў сябе чалавек. Свая зямелька наўкол, свой поплаў, канюшына, гумно, свіран, хата, лужок з сажалкай... Неяк ямчэй там жылося, паважней. Які ты ў вёсцы гаспадар? Так, адно слова. Ні зямлі той, ні гумна, ні поплава. Прысядзібны ўчастак абкарнаны, усім пароўну, не разгонішся. Бацька штогод мучыўся, абворваючы яблыні ды грушы, калі саджалі ці капалі бульбачку. Бо і садок хочацца мець, і бульбу сваю, і буракі карове, а зямелькі пры сядзібе ў абрэз.

А яшчэ хутары – гэта свая асаблівая эстэтыка. Катэгорыі прыгожага там паўсюдна, вакол, іх не трэба шукаць пад лупай. Кінешся позіркам удалячынь – бясконцы ланцужок цьмяна-зубчастых барэльефаў раскінуўся ўкругавую, як бачыць вока. Шырокія зялёныя прысады з магутнымі вольнымі дрэвамі, блішчастыя вочкі сажалак ды лужкоў, перавітыя шнурочкамі скошанага сена, стрэхі гумнаў, як выразаныя з картону геаметрычныя фігуры... Не нагледзішся!

У больш заможных – мажнейшы і хутар: з поплавам, свірнам, ліпавай алеяй, вербамі ці ясенямі абапал лужка. У бяднейшых – проста хатка з хлевушком, але абавязкова садзік, вішні паўз соткі, маліна за тыльным бокам, калодзеж. Прыпамінаюцца некалі чытаныя запісы напалеонаўскіх афіцэраў, што рушылі на Расію праз нашыя мясціны: усё тут фальваркі ды памесці, адно на адным...

Апошні фальварак, які хапіў я трохі сваім малечым позіркам, быў пана Смоліча. У панскай будыніне мясцілася наша пачатковая школа, я ўпамінаў аб тым, мо таму яна і засталася некранутай. Аб Смолічы дагэтуль цягнецца добрая памяць. Наш сусед, васьмідзесяцігадовы Сашык Твароўскі, ветэрынар, дасведчаны чалавек, пасвіў у пана каровы. Расказаў мне нядаўна, як пан прыахвочваў вясковую моладзь на работы падчас жніва.

– Вечарам, кажа, я для вас наймаю музыкаў і зраблю танцы бясплатна, акрамя таго што заплачу, дам яшчэ трохі закускі, па чарцы гарэлкі...

З ахвотай беглі да яго маладыя ў наймы. Цалюткі дзень у полі, з ног падаюць, а чакаюць не дачакаюцца вечара – аж трымцелі, каб патанчыць на арэшнікавай гаёўцы. Пан аніразу не падмануў. Заплоціць за работу ды яшчэ гарманіста нойме, каб павесяліліся хлопцы з дзяўчатамі да ўпаду.



Смоліч Іосіф Аляксандравіч, пан, на сваім фальварку ў Якубавічах. Здымак прыкладна 1934-35 гг.

Даведаўшыся пра маю працу над кнігай, азваўся з Нясвіжа Г. І. Смоліч, сваяк пана Смоліча. Знайшлася фотакартка. Цікавейшы дакумент. Пан, Смоліч Іосіф Аляксандравіч, зняты ў сваім якубаўскім фальварку ў Хадатавічах. Адразу бачна, які каларытны і шляхетны мужчына. Вусы, трубка ў роце, дабротная адзежа, чаравікі. За спіною віднеюцца незнаёмыя для нашых мясцін сажанцы, а збоку галубіны домік. Пан ахвочы быў да гэтай забавы, славіўся ў акрузе рэдкімі відамі галубоў. Яшчэ заядлы любіцель прэферансу. Аб яго захапленні картамі

хадзілі легенды. Дый статус у пана быў не абы-які. Яго жонка даводзілася роднай пляменніцай самому Пілсудскаму. Калі ён памёр у маі 1935 года, то за ёй прысылалі ў Нясвіж самалёт з Варшавы, каб забраць на пахавіны. Доўгая памяць засталася у нашых людзей пра пана Смоліча, чалавека цікавага і адметнага.

Панскі фальварак меў арэхавы лясок, невялічкі бярозавы гай, здатны дом у два канцы. У параўнанні з харомамі сучасных заможных людзей панскія пабудовы выглядалі вельмі сціпла, але там было тое, чаго няма ў сённяшнім новабудзе. Ад хутара сыходзіў дух парадку і гармоніі, вольнасці, шырыні і вышыні, якіх не ўбачыць і не адчуць пасярод сціснутых платамі, вуліцамі, завулкамі, суседзямі харомаў сённяшняга новабуда. Часам думаеш: няўжо зямлі ў нас мала, ці яшчэ што, каб так перамяшаліся, вокны ў вокны, такія здатныя будыніны?

Аб хутарах, матчынай і бацькавай вотчынах у Малаедах і Хадатавічах, я гаварыў раней. Не сыходзяць яны з маіх думак. Ды і як ім сысці, калі там зачалося разуменне сваёй зямлі, тутэйшых сваіх людзей? Ці не ўсе мы, беларусы, выйшлі з хат, з гэтых хутарскіх мясцін, вёсачак ды мястэчак? На хутары бабы Наташы, трохі падросшым, я пачаў услухвацца ў наваколле, углядацца пад небасхіл. Мне хацелася зазірнуць за край лесу, за пагоркі і суседскія прысады і дазнацца: а што ж там, за імі?! Я пачаў разумець, што не адны мы тут, на гэтай зямельцы.



Прастора. Але без хутароў

...Бабін хутар на невялічкім пагорку – таму так добра аглядаць прастору. За нашым плотам, што прыкрывае агарод, сцяною зялёны лес – блізка, мо не будзе і паўсотні метраў. Да елак і хвоек бяжыць пратаптаная сцежачка. За намі, там, дзе заходзіць сонца, Адамаў хутар. Далей пагорак, нічога не ўгледзіш, ды я ведаю: там, за пагоркам, схавалася віхлястая, калі глядзець з горачкі, вёска з трохі незразумелаю назваю – Арда. Яна здаецца мне чужой і закрытай, бо прама па пагорку праходзіць лінія ўмоўнай мяжы паміж нашым, Нясвіжскім, і чужым, Клецкім, раёнамі. Так гавораць у хаце. Потым яшчэ я дазнаюся ад бацькоў, што ў Ардзе акрамя беларусаў жывуць людзі, пра якіх кажуць, што яны татары, засталіся там жыць з даўніх часоў. У іх свае могілкі, а на магілах няма крыжоў.

У Адамавых нехта корпаецца на сотках, відаць, цётка Маня капае картоплю. За соткамі ходзіць статак кароў. Чуюцца покрыкі пастухоў.

– Куды лезяш?! От, гадкая карова... Каб ты спрындзілася, не ўпыніць, га...

Я не ведаю, чый гэта голас. Гукі самыя розныя далятаюць да мяне адусюль. На сажалцы, што паміж бабай Наташай і дзедам Сяргеем, закрэкалі дзікія качкі, забрахаў Пецін сабака, загагэкалі гусі. Бразнула восілка на Адамавым калодзежы. Зайшла набраць вады суседка Агатка. Адамавы прыходзяцца нам раднёю. Пазней, калі мы пераедзем у сваю хату на вёску, здарыцца гучная гісторыя са старым Адамам, бацькам цёткі Мані.



...Сцюдзёнай зімой пасярод марознага сонечнага дня на надворак нечакана заехалі санкі, запрэжаныя канём, і бацька, саскочыўшы з іх, адразу кінуўся ў хату па маці. На санках сядзеў закутаны ў лахманы чалавек. Бацька вярнуўся, пачаў памагаць яму злезці. Гэта скамянелы дзед Адам у рызманах, ледзь жывы і цяжка дыхаючы.

Дзед Адам апошнім часам жыў у сваёй хаце з дачкой Маняй, траюраднай бацькавай сястрой. Калі яна пайшла замуж за Мацака (так празвалі на сяле Сямёна Трафімчыка), бо першы яе мужык памёр, то па нейкай прычыне яны рашылі пазбавіцца ад старога бацькі. Марозным віхурным днём дзеда закінулі ў кузаў грузавога калгаснага «газіка» і павезлі ў другую вёску да яго, здаецца, сястры. Яна, як пабачыла змарожанага Адама, самлела, а дарослыя дзеці закрылі перад дзедам дзверы. Аб тым дазнаўся наш бацька і, нават не пытаючыся нічога ў маці, пераняў у полі гэты бядовы грузавік, пасадзіў дзеда Адама ў санкі, прывёз дадому.

Я пазіраў, як дзеда перанеслі на печ. Там маці паслала яму коўдру, дала паесці. Дзед зусім немагушчы, аброслы збітай у хмызы барадою, пад носам замерзлі саплянкі, ад цела непрыемна пахне. Калі стары адагрэўся і паспаў, маці запарыла ў парніку цэбар гарачай вады, паставіла дзеда ў ночвы, абмыла, абцерла. Узяла бацькаву машынку і пастрыгла. Зноўку яго падсадзілі на печ, каб грэўся ды спачываў. Дзед нясцерпна і зацяжна кашляў, хрыпла і цяжка дыхаў. Для мяне то было зусім нечаканае відовішча, удосталь споўненае шчымлівых думак. Дзед праляжаў на печы да вясны, а потым, дачуўшыся пра асуджальныя размовы вясковых людзей, яго ўсё-ткі забрала родная сястра...

Направа, за Адамавымі, у далечыні віднеюцца стрэхі Ладымяравых пабудоў. Там жывуць дзядзька Ладымяр, яго браты – іхнія пляцы размясціліся кустом на ўскрайку Круглаўскага балота. Прагны да працы чалавек, паважны і нетаропкі. Аб ім у памяці такая карцінка. Зімоваю вуліцаю паўз нашых хат крочыць дзядзька Ладымяр, абвешаны кошыкамі з ног да галавы. У руках яшчэ самаробныя граблі. Усё гэта свежае, чыстае, як памыты рушнічок. Ніхто на вёсцы не плёў за зіму столькі кашоў і не рабіў столькі грабляў, як Ладымяр. Па вясне ён вазамі вазіў зробленае на продаж у Сноў, на базар.

Самаробствам – кошыкамі, граблямі, бярозавымі венікамі – займаліся зімовымі вечарамі многія мужчыны.



Самаробны кошык – падарунак Колі Сяргейкавага

Акрамя механізатараў, бо тыя і зімою былі пры трактарах. Рэзалі ў лесе арэшнік, ядловец, іву, бярозавае вецце. Клалі на печ, сушылі, паласавалі на доўгія гнуткія стужкі. Глядзець на гэта было незабыўнай асалодай. Коля Андрэеў, муж бацькавай сястры цёткі Ядзі, займаў у хаце пасля вячэры ўсю кухню, раскладваў свежыя пахучыя палоскі, надраныя з гнуткіх арэшын і ялаўчын. Раўняў, гнуў, перавязваў. Спрытна і лоўка хадзілі яго рукі. Малыя – я, Мішка і Коля Мішавы, Валодзя і Вася, цётчыны дзеці, прымасціўшыся хто на ўслонку, хто каля прыпека ці на лаве, збоку ад старэйшых, якія наведваліся на пасядзелкі, цікавалі за працэсам. Вось дзядзька імкліва перахапіў падзёртай на стужкі ялаўчынай сагнутыя арэхавыя пруткі, такія ж прыладзіў з бакоў – атрымалася супляценне з бялюткімі, пахнучымі саладжавай смолкаю паскамі, нападобак школьнага глобуса, што прыносіў і ставіў на стол наш настаўнік геаграфіі Аляксандр Ксавер'евіч Шапавал, толькі паболей. Уюцца, адна да адной прыбаўляюцца стужачкі-ялаўчынкі. Яшчэ, яшчэ... На вачах творыцца вобраз, выява рэчы, прадмета. Праз хвілю няма ўжо і цені ад таго, што было падобкам глобуса момант назад. А стаўся перад намі здатны кошык...

Дзядзька Коля за гэтай справай гаманіў з кім у хаце, натхнёна зацягваўся самакруткай са свайго самаробнага тытуню. Тытунь вісеў шэргамі пад столлю над прыпекам і меў самае ганаровае месца ў дзядзькавым разуменні жыццёвых каштоўнасцей. Там жа, над прыпекам, ляжалі акуратна надзёртыя з раённай газеты «Чырвоны сцяг» загатоўкі для самакрутак. Было ўтульна, цёпла і вельмі лагодна ўсё гэта бачыць, адчуваць, любавацца...

Напрадвесні яшчэ цьмяным ранкам мужчыны запрагалі каня і, аздобіўшы падводу альбо і дзве цэлаю гарою чысцюткіх ды бялюткіх грабель, кошыкаў, бочак, цэбраў, кубельцаў, карзін ці яшчэ чаго, бралі кірунак на Сноў, на кірмаш. Вярталіся дадому разамлелыя, прыняўшы чарку-другую па дарозе і прыкусіўшы гарадскою смачнаю каўбасой. Чамусьці яна называлася «кракаўская». У глыбокіх карманах іх портак, звычайна перашытых з ваенных галіфэ, тужыліся



Ляснік Пётр Іванчын (Кірылавіч). 1967–1968 гг.

рубельчыкі ды медзякі. Хоць і не надта цяжка яны адцягвалі карманы, але ж які-ніякі, а прыбытак...

...Соладка, соладка мне пахадзіць, патаптацца сцежачкамі свайго маленства. Так хочацца прыпомніць паболей вясковых людзей. Бо што ні чалавек, то майстар, ці з плугам, ці з сякерай. Чаго толькі яны не ўмелі – страху з саломы зрабіць, печ з гліны збіць, калодзеж выкапаць, роды ў каровы прыняць, жыта пасеяць, труну на смерць загадзя змайстраваць... Але ж акрамя гэтых сялянскіх здольнасцей, усе ды кожны такія адметныя, непадобныя ў звычках, шматколерныя ў паводзінах...

...Паперадзе бабінага хутара, у бок могілак, адкуль падымаецца сонца, хаты дзеда Сяргея і лесніка Кірылавіча, Іванчына ці Пеці, як кажуць вясковыя. Так разабралі на часткі яго прозвішча – Іванчын Петр Кірылавіч. Паміж хатамі, за збітымі з жэрдак весніцамі і плотам, невялічкі, парослы травою выган для гусей і качак, некалькі высокіх бялявых бяроз. Пад бярозамі танчылі маладымі бацька з маці на вяселлі Сашы Сяргеевай, калі яна выходзіла замуж за Юрка з Аношак.

Кірылавіч – важны чалавек пасярод навакольных вёсак. Ляснік, ахоўнік дзяржаўнага лесу. Ён родам з Расіі, франтавік. Пасля вайны не паехаў у свой край, бо была там галадуха. Хадзіў па сёлах, наймаўся цесляром да людзей. Так патрапіў у нашы Хадатавічы, стрэў тутэйшую Вольку Драчанову. Мужыка яе забілі на вайне, засталася з дзвюма дзеўчынкамі. Таму і прыняла яго без лішняга роздуму. Уладкаваўся пры нечай дапамозе лесніком. Хату таксама паставіў пры лесе. У лесе і праводзіў час з рання да вечара. Разы са тры – на золку, у абед і ўвечары – ён штодня, нягледзячы на слоту, мароз ці завіруху, нібыта швейцарскі гадзіннік, дакладна выконваў свае дзяржаўныя абавязкі. Нават залішне стараўся. Казалі, што падстрэліў за хвойку мужчыну з Даматканавічаў, ледзь не сеў у турму за гэта.

І манерамі, і гутаркай, і мовай Кірылавіч прыкметна адрозніваўся ад нашых мужчын, беларусаў. Нетаропкая важнецкая паходка, гучны, на расійскі манер, говар,

начальніцкі, засяроджана-непрыступны выгляд, сурова-асуджальны позірк. Здаралася, мужчыны падгледзяць, што ён дома, па сотках поўзае, ды ў лес з сякераю. Толькі завальяць хвойку ці яліну, лапы пакуль абсякуць, а за спіною нечакана расхіснецца арэшнікавы куст – і сам Кірылавіч, нібыта з-пад зямлі вырас, нячутна і бязмоўна. Шырокі, перарэзаны глыбокімі маршчынамі твар, строгі погляд, фуражка, леснічоўская форма. На правым плечуку стрэльба, на левым – скураная, пацямнелая і пацёртая сумка на доўгім паску з чыстымі бланкамі пратаколаў. Тут затрасуцца нават тыя, хто і зухам хадзіў ды ваўкоў не баяўся. Бо Кірылавіч – гэта сама неадступная і грозная выява дзяржаўнай улады.

– Так, значит, своевольничаем, рубим государственное. Вот составим протокол, а там уголовное дело...

Пры такой пагрозе ды пры добрым яшчэ памятку сталінскай пары небараку-секача кідала ў халодны пот, і заставалася яму толькі адно: трымцець, як асінавы ліст, ды прасіць Кірылавіча змілосцівіцца над ім, небаракам. Кірылавічу такое да спадобы. То яго найлепшы мядовы час. Ён шчоўкае блішчастым замком, адхінае скураную сумку, раскладвае на яе роўным баку лісты з друкаванымі чорнымі літарамі: «Протокол задержания». Бярэцца за самапіску, запраўленую чарнілам. Паперы, сумка, рускія словы, а Кірылавіч гаварыў з выразным окаючым акцэнтам, самапіска даводзяць правінцаў да калацення. Яны прасіліся і жаліліся на жыццё, кляліся, што больш такое аніколі не паўторыцца. Задаволіўшы сваё прагнае ўлады нутро, Пеця адступаўся, але паволі. Нарэшце выносіў свой вердыкт, прыгаворваючы:

– Ты бы лучше меня спросил, где рубить, я бы тебе покозал...

Была і ў мяне падобная гісторыя з Кірылавічам. Мы паміралі тады ад футбольнай эпідэміі, кожная вёска ладзіла футбольныя пляцоўкі на паплавах і выганах. Задумаў я падбухторыць хлопцаў на такі здатны крок, і сам, першы, пайшоў у лес секчы елкі на футбольныя вароты. Выбраў стройную ды раўнюткую, зухавата паваліў на зямлю і раптам адчуў, што я тут не адзін на праталіне. Азірнуўся, а на мяне строга глядзіць Кірылавіч. То я і самлеў ад страху і перапуду. Кірылавіч добра ведаў і прыязна адносіўся да бацькі, часта бываў у нас – любілі яны пагаварыць пра «франтавыя дзяла». Мы хадзілі



Хаты. І пачатак, і адлік. 2015 г.

ў школу разам з яго малодшай дачкой Валей. Я добра вучыўся, аб гэтым ведаў і Кірылавіч. Бывала гаварыў бацьку:

«Твой парень, Коля, молодец, способный...» І вось такая непрыемная нагода з гэтымі варотамі. Неяк не ўцямілася, што шкоду раблю, за сякеру ўзяўшыся. Думаў, гэта ж для ўсіх, не для сябе. Так і прызнаўся Кірылавічу: вароты футбольныя рашылі паставіць...

– Ты, Вася, должен мне сказать об этом. Зачем зеленую ростущую срубил? Она живая! Нехорошо. Пойдем, я тебе для ворот покожу сухие, которых не жалко. Да и для роботы они лучше...

Душа мая вярнулася да цела. На другі дзень я сабраў хеўру «будаўнікоў», падахвочаны дазволам ссекчы на вароты сухастой, і дні за тры мы зладзілі футбольнае поле. З радасці першым нядзельным днём прынялі каманду коханаўскіх хлопцаў і ўшчэнт ім прайгралі.

Кірылавіч быў шырокай касці, каржакаваты, строгі тварам. Гаварыў нетаропка, хрыплаватым прастуджаным голасам. Урэзалася ў памяць вясковая вечарына ў Домчынай хаце. Здаецца, з нагоды 8 Сакавіка сабраліся жанкі і мужчыны ў Домкі. Мы круціліся там жа, слухаючы размовы ды жарты. Калі падвыпілі, Кірылавіч нечакана выйшаў пасярод хаты, падбачэніўся, шапку кінуў долу, падцяў рукі пад бакі і пеўнем пайшоў укругавую, прытупваючы наглянцаванымі кірзавымі ботамі. А потым завёўся частушкамі. Дагэтуль помніцца:

– Если б не было часов,
не ходили б стрелки,
если б не было парней,
не гуляли б девки...
Эх!..

«Любіць ён павыпендрывацца, – казалі вясковыя. – Хлебам не кармі, а дай пафарсіць, начальнічкам пахадзіць па сяле...»

...За пабудовамі ды прысадамі дзеда Сяргея і лесніка Кірылавіча чубам віднеецца Навічанчын хутар. Адтуль выйшлі брыгадзір Ільюк, яго сястра Наста, жартаўлівая і вясёлая кабета. Яна не пайшла замуж, жыла адна каля брата, але ніколі не была самотнай ці тужлівай. Голас мела зычны, выразны. Бывала, зойдзе да нас уранні і абавязкова раскажа нешта смешнае. Пра самыя простыя рэчы, пра якія ў звычайнай сітуацыі і не падумаеш смяяцца, а ў яе споведзі сапраўды смешна.

– Эта жа падумаць, Зіна, сёння прачынаюся, хачу абуцца, а валёнкаў няма пад ложкам, – чую я скрозь ранішнюю дрымоту. – Што за халера, туды-сюды, а няма. І знаяш, што аказалася – кот, каб на яго карбунка напала, зацягнуў іх у другі канец хаты. Я ўжэ перапудзілася ні на жартачкі... Папраўдзе кажу... Дзе ж валёнкі падзеліся? Мо чорт які ўбіўся ў хату? Во што робіцца, Зіна, га!

Пры гэтым яна пачынала смяяцца такім натуральным, непадробным смехам, што нельга ўстрымацца, застацца сур'ёзным.



Вотчына брыгадзіра Ільюка



Брыгадзір Ільюк з жонкай Зоняю

– Эта ж падумаць, кот які падкі... А мне ўжэ чаго ні надумалася: і пра чорта, і пра бандзітаў...

І заходзілася ад смеху. Праз хвіліну рагаталі ў хаце ўсе: маці, бацька і калі хто быў яшчэ. Маці прыгаворвала:

– От, Наста, умеяш ты насмяшыць, от умеяш... Як арцістка ты...

Пры другім жыццёвым раскладзе з Насты сапраўды выйшла б вялікая артыстка. Прырода надзяліла яе вясёлым характарам, моцным і прыгожым голасам, здольнасцю бачыць смешнае ў звычайным і ўмець пазабавіць людзей, адхіліць ад самотных думак.

Наста, яе брат Ільюк выраслі без бацькі. Бацьку, мусіць, забілі на вайне. Я памятаю толькі саму Навічанку, пажылую, затурканую работай жанчыну. Ільюк пасля арміі, адтарабаніўшы тры гады ў забайкальскіх марозных прасторах, хадзіў у ваеннай форме і фуражцы, якую падпярэзваў, апускаючы стужку-паясок з аколыша над брылём пад ніжнюю сківіцу. Было гэта недзе ў 57-58-м гадах, я быў зусім падшыванцам, але дагэтуль помніцца тая фуражка. Потым на доўгія гады ён стаў брыгадзірам у нашых Хадатавічах. Зранння бег на нарад у кантору – кіламетры са тры, на цэнтральную сядзібу ў Казлах, потым, да васьмі, вяртаўся на вясковую канюшню, дзе яго ўжо чакалі людзі, што прыйшлі на работу. Пачынаўся гоман з мітуснёю.

– Анцік, ты запрагай Лысую і давай за саломаю пад Разалічаў. Так, Коля Андрэяў! Дзе ты, Коля?! Ага, тут! Добра. Паедзеш з Анюсем вазіць картоплі на бурты. А вы, хлопцы, буртаваць пад Высокую збірайцеся. Туды бабы пойдуць з кошыкамі. Салому падвязуць, хваціць на сёння...

Фыркалі коні, рыпелі даўно нямазаныя дзёгцем колы, смяяліся жанчыны, падсаджваючыся на падводы, крычалі ў ваколіцах пеўні, далятаў сабачы брэх з-пад хат. Гуртоўня раз'язджалася-разыходзілася. Наступала цішыня. Вышылася сонца. Выцершы пот з ілба і адхінуўшы з вачэй казырок зацёртай шапкі-пяцівуголкі, Ільюк паварочваў да сваёй хаты паснедаць ды крыху спачыць. Потым зноў



Такім быў млын на Быкове. Колькі там усяго перамалолася!

«ногі ў рукі» і на бурты, у поле, на картоплі, да людзей.

Самая непрыемная пара пачыналася ў брыгадзіра з вясны. Жанчынам наразалі «дзялкі» – абшары цукровых буракоў, ільну. Яшчэ трэба садзіць бульбу, потым загатоўка сена для калгаснага статка, потым уборка, жніво. А ў людзей, акрамя калгаснага прыгону, свае клопаты. Дома работы не раздыхацца. Не зробіш яе, застанешся, як казалі, «на бабах», бо з калгаснага заробку «ногі выцягнеш». На брыгадзіра ціснуў старшыня: давай людзей – там не скасілі, не зааралі, не давезлі, а людзі, асабліва жанкі, намагаліся выкруціцца ад работ на брыгадзе, каб дома з агародамі ўправіцца. Ад дзялак то не схаваешся, а на цякучку, як казалі, на брыгаду, «то хай яна праваліцца, трасца яе ня возьме, этую калхозную процьму». Каля васьмі раніцы Ільюк абыходзіў вёску, завітваючы ці не на кожны надворак і ў кожную хату і, то просячы, то пагражаючы, зваў жанчын на працу.

– Зіна, ты сёння абязацельна пайдзі на работу, нікога няма сёння. Давай, збірайся і нікакіх разгавораў! Глядзі, Зіна, а то плоха будзе, напішу дакладную ў кантору, вызываць будуць, сарамаціць... Давай нямедлянно, збірайся...

Вусны падцятыя, твар сярдзіты, вочы калючкамі. Словы так і страляюць з языка. Маці пачынае што-небудзь прыдумляць, каб адбіцца ад прыгону, але брыгадзір не адступаецца, суровее тварам. Тады маці рэзка мяняе тактыку: пачынае ласкава, як тая ліса-хітрунія, упрошваць брыгадзіра-мучыцеля.

– Ой, Льючок, даражэнькі ты мой, ну што ты раскрычаўся? Нямашака ні мінюты свабоднай. Каб ты ведаў, як ногі сёння балелі ноч'ю. Я лепей табе ці Зоні што пашыю, яна вунь прыносіла мацеру. Ды зайдзі ты ў хату, што мы на вуліцы гаворым. Прысядзь, нахадзіўся ўжэ з раніцы...

Калі сітуацыя цярпела, Ільюк заходзіў на кухню, прысаджваўся да стала. Там яшчэ стаяла не астылая з раніцы яечня з салам. У дадатак да яечні маці непрыкметна выхопвала з палічкі пад сталом бутэлечку, налівала брыгадзіру гранёную стограмоўку самагонкі.

– Выпі ды закусі ты, Іллюк! Як-небудзь яно будзе, абыдзецца; вунь трохі бабаў сабралася на вуліцы, зробяць яны тую работу, а я ўжэ пабуду дома сёння, пашыю што, на сотках работы пройма...

– Ладна, Зіна, сёння пабудзь... Глядзі, не падвядзі мяне – заўтра абязацельна пайдзі на работу... Што тут у цябе, засталося што-небудзь? – пытаўся ён і вачыма паказваў на стограмоўку.

– Самагоначка... Харошая, свая, ты ня думай, абы чаго я не трымаю...

Ільюк падносіў чарку да носа і порстка цягнуў у сябе паветра, нібыта прынюхваўся, смакаваў пахі іржанога подыху, што сыходзілі ад празрыстага наліву ў чарцы. Потым, закінуўшы галаву назад, перакуляў чарку ў рот. Але выпіваў не адразу, а глыточкамі – так, што яго валляк вытыркаўся на горле і коўзаўся туды-сюды, то ўзад, то ўперад, як мне здавалася, нават са скрыпам. Я палохаўся ад такога відовішча, пад адзежынай прабягалі мурашкі, а здаралася, што ўздрыгваў усім целам. Ільюк моўчкі прыкусваў. Маці пыталася:

– То можа яшчэ адну?

– Не, Зіна, хваціць, дзялоў па вушы...

Лагодны тварам падхопліваўся з крэсла, нацягваў на вочы кепку-пяцівуголку, папраўляў на ёй кароценькі брылёк і, абцёршы рот далонню рукі, бадзёра шыбаваў праз двор на вуліцу, каб зноў абрынуцца ў бясконцы варунак калгаснай трасянкі. Ён застаўся ў памяці незлабівым і прыемным чалавекам, не зрабіўшы за доўгія гады свайго брыгадзірства нікому нічога кепскага. Пасада яго была нялёгкая. Паміж молатам і накавальняй, паміж канторай з панам-старшынёй і гаротнымі людзьмі, што б'юцца за жыццё ад рання да рання.

Да мяне Ільюк адносіўся прыязна. Здаецца, я быў у восьмым ці дзявятым класе, калі ён заехаў да нас, папрасіў мяне рашыць задачу. Выйшла распараджэнне зверху, каб брыгадзіры ды іншыя кіруючыя работнікі ніжэйшага звяна мелі сярэднюю адукацыю. Ільюк не давучыўся з-за вайны, таму яго загрэблі ў вячэрнюю школу. Задачкі былі простыя,



З Галяй ля старога камбайна на бацькоўскім селішчы. 2015 г.

я рашыў іх у момант і яму, і Колю Грышкаваму, брыгадзіру будаўнікоў. Яны падзівіліся, а калі назаўтра на экзаменах атрымалі пяцёркі ды пахвалу настаўніка, то адразу паехалі ў сельмаг, закупілі бутэлек пяць яблычнага «чарніла», каўбас, кансерваў і к нам на двор – мяне дзякаваць. Можна ўявіць сабе малюнак: здаровыя дзядзькі, а Коля Грышкаў быў поўны і мажны чалавек, Ільюк таксама немаленькага росту, запрашаюць вучня, хударлявага хлопца, на гулянку-цацанку з «чарнілам» ды закускамі. Маці за галаву ўзялася! Гэта ж трэба, каб мясцовае «начальства» прыбыло за хлопцам на матацыкле з каляскай! Якая важная нагода здарылася?! А яны ўсадзілі мяне, як ганаровага госця, у каляску і на вачах у людзей павязлі ў лясок на выпіўку. Як не аднекваўся, а прыйшлося трохі пацягнуць «чарнільца». Кіроўцы ж былі добра падпітыя, бо, відаць, скарысталіся нагодай, каб і самім адзначыць поспех. Маці расказвала пра гэта бацьку і жахалася: «Падумаць, да чаго дайшлі, глянь, хлопцу віно давалі, дурні! Патрэбна ім эта вучоба, рабіць няма чаго начальнікам...»

З надыходам «перастройкі» пачало ламацца калгаснае ўсталяванне, мяняліся старшыні, усё стала інакш і ў знакамітай нашай «Новай жызні». Ільюк адышоў ад спраў, корпаўся на агародзе з жонкай Зоняю – сыны выраслі ды разбегліся. Заўжды ветліва махаў мне рукою, калі я праязджаў на машыне, кіруючыся да бацькоў. Хату яго не абмінуць, бо стаіць на самым вуглу ад гасцінца з-пад Высокай. Памёр яшчэ не ў старыя гады. Здаецца, была вясна. Якраз я прыехаў дадому і змог развітацца з брыгадзірам Ільюком. У труну каля галавы родныя палажылі новенькую кепку-пяцівуголку, каб і на тым свеце ён змог прыкрыцца ад сонца ды пайсці па справах...

Хочацца на хвіліну перапыніцца і сказаць колькі слоў пра такую з'яву вясковага побыту, як гарэлка і выпіўкі, калі ўжо зайшла гаворка пра гэты выпадак з «чарнілам». Самагонку,

ці самаробную гарэлку, рабілі ў сялянскіх хатах, мабыць, усё жыццё. Добра ўмела гэта баба Волька з Малаедаў, наша маці таксама. Жыта прарошчавалі, дабаўлялі дрожжы, залівалі гарачай вадой, ставілі ў закуток каля печы, каб забуяла ды забурліла. «Расчыніла жыта» ці «паставіла брагу» – так нашы жанчыны называлі гэтую дзею. За «палякамі» гарэлка была надта дарагая, селяніну недаступная. Дый потым, пры «саветах», таксама не для калгаснага заробку. А вяселлі ды радзіны не адменіш. Таму гналі сваю, але, помніцца, п'яных пры маім маленстве на вуліцы не было. Сорам за гэта і грэх былі вялікія. Дзед Антось дык мо раз ці два ў год мог падняць кілішак, хоць самагонка ў бабы Волькі вялася.

Распуста з гарэлкай пачалася, як перасталі хадзіць у цэрквы, бо зруйнавалі пры Хрушчове, адмянілі грэх перад Богам. Франтавікі яшчэ прынеслі з акопаў звычку да франтавых «ста грамаў». Трохі лепшала жыццё, паяўляліся заначкі ў карманах. Навалам пайшло на паліцы ў крамы таннае «пладова-ягаднае», у асноўным яблычнае, віно, «чарніла». Стала прасцей абрабіць соткі ці прывезці дроў – за ўсё можна разлічыцца бутэлькай самагонкі альбо «чарніла». Таму гналі самагонку сёламі, і было гэта звычайнай справай. Масцеравыя вясковыя людзі кляпалі здатныя «парнікі» – так называўся самагонны апарат; мелі на іх добры попыт і неблагую капейку. Дыхтоўныя парнікі рабіў Толя Максімаў. Недзе ў кладоўцы на нашым хадатаўскім селішчы захаваўся яшчэ парнік яго работы. З тоўстай бляхі, круглы, на ножках, зверху цэбар, куды залівалі брагу, важкая, на вінтах, накрыва з адтулінай пад трубку, знізу топка для паліва. Вышэйшы шык – парнік з нержавейкі! Былі і такія, хоць і дорага каштавалі. Улетку, калі не палілі печы, у парніках гатавалі корм свінням, карове: запарвалі буракі, картоплі, батву, бо з цэбра, які перакульваецца, зручна разліваць прыгатаванае ў вёдры.

А самагонку гналі хто для чаго. Некаторыя на продаж і, каб менш траціцца на жыта, падмешвалі ў брагу цукар, буракі, нават курыны памёт для моцы. Самагонка выходзіла цяжкая, атрутная, казалі «сахарная» – брала за сэрца, дурманіла галаву. Такіх ведалі, абгаворвалі за вочы, не любілі. Але што зробіш – розныя людзі жывуць побач. Былі і такія – гналі сабе, каб напіцца. Гаспадарлівыя гналі пра запас, каб вялася на святы ці на госці, ці каб разлічыцца за помач альбо наймы.



Самагонку гналі ў вёсках, мабыць, ва ўсе часы

Нашыя таксама гналі гарэлку. Маці «рашчыняла» брагу толькі з жыта. Самагонка выходзіла чыстая, ад яе не балела галава. Гналі больш зімою. Бацька яшчэ зранку паглядаў на комін – куды вецер хіліць дым. Калі на вуліцу, то не вельмі добра, бо будзе чутна брага. А па вуліцы – хто не ідзе?! І ўчастковы можа цягацца да дзяўчат на вячоркі. Згледзіць – бяда будзе. Ці начальнічкі з калхоза, бывае, швэндаюцца. Знойдуцца і свае, ахвочыя пад'ялдыкнуць, нацкаваць на цябе сабак...

...Ды вось парнік на кухні. Бацька майструе дымаход, залівае брагу ў цэбар, падпальвае дровы ў топцы. Я тапчуся побач, падсабляю нешта бацьку, а болей дык цікую за ўсім. Во ён прыціснуў рэйкай на вінтах накрыву, уставіў у дзірку канец трубкі, якая далей злучаецца з трубкамі-кольцамі ў драўлянай кадушцы і вытыркаецца з гэтай кадушкі ўнізе. Гэты ніжні канец бацька абвязвае ільняной палоечкай-пяцелькай, падстаўляе пад яе на ўслонку пусты графін – «балён» па-вясковаму. Налівае халодную, толькі з калодзежа, ваду ў кадушку – па самы край. Яшчэ размочвае муку, робіць мякіш, абмазвае шчыльна па акружнасці накрыву на цэбры і месцы, дзе стыкуюцца трубкі. Здаецца, можна перапыніцца і чакаць, пакуль разгарацца дровы, забурліць ды закрэкча брага. Мы прысаджваемся перад парнікам, бацька трохі расчыняе дзверцы на топцы, бо ад залішняга агню брага «папрэ ў трубкі». За вокнамі цемра, мароз, скавыча завіруха, а тут, на нашай кухні, цёпла і так лагодна. Пахне хлебам ад падсохшага мякіша, патрэскваюць дровы і, як ніколі, утульна мне быць каля бацькі, наглядаць за ім, за яго рухам. Завохкаў цэбар, затрымцеў сухапарнік. Усё! Зачалося! – пабегла пара, ахаладзілася ў калодзезнай вадзе, закапалі па нітцы-пяцельцы першыя срэбныя кропелькі.

– Ну, во, пайшло лякарства, – кажа бацька.

Кроплі пабеглі жвавым ручайком, зацвірчэлі ў шырокім шкляным балёне. Бацька падстаўляе лыжку пад пяцельку – затым да рота: смакуе празрыстую вадкасць, што аддае пранізлівым, гаркавата-хлебным, з водгукам дыму, пахам. Трохі ўсміхаючыся, паглядае на мяне, гаворыць:

– Моцная халера... Настаяшчы пяршак...

Маці выходзіць з суседняга пакойчыка, пачуўшы галасы.

– Харошая, Зіна, палучылася. Добру ты брагу зрабіла. На ўсе сто!

– От, вельмі ні хвалі, Коля, а то напробуешся тут першаку, да ложка ня дойдзеш...

– Глянь, во! Праўду кажу...

Бацька бярэ кавалак газеты, макае ў самагонку, чыркае запалкай. Папера імгненна ўсхопліваецца сінім порсткім агнём.

– Бачыш, як гарыць! Чысты спірт...

Яшчэ трохі яны перамаўляюцца паміж сабою, а потым мы з маці ідзём да ложкаў, спаць. Бацька будзе ці не да раніцы шчыраваць каля парніка, пакуль не выціснецца апошняя кропля з трубкі. Потым разбярэ гэтую канструкцыю, перанясе ў кладоўку за гараж. Схавае пад ложак у цёмны вугал пузаты шкляны балён з самагонкай і пабяжыць на фермы. Самагонка месяцамі будзе выстойвацца пад ложкам і толькі па патрэбе – ці калі заедзе дзядзька Вечык, ці калі трэба да каго на вяселле ісці з карзінаю, бо не пойдзеш з пустымі рукамі, ці на радзіны, ці калі торп прывязуць з Нясвіжа – яе даставалі, налівалі ў пустую паўлітроўку, прыкаркоўваючы затычкай з раённай газеты...

...Блукаю я сцяжынкамі сваёй памяці, кіруюся далей, за Навічанчыну хату, патрапляю на прыгожы абшар з высокімі прысадамі на ўскрайку поплава, за балотам, бліжэй да лесу. Як асобны востраў, некалькі пабудоў – паселішча братоў Гарлеўскіх. Выглядаюць невялічкім мястэчкам: сядзібы і дзялянкі з прысадамі акуратна абгароджаны жэрдкамі, добра бачны з вёскі. Раніцай улетку патанаюць у светлай імжы, што парыцца над балотам, вечарамі абуджаюцца рыкамі кароў, бразганнем вёдзер, мужчынскімі і жаночымі галасамі.

Браты, Васіль і Коля Гарлеўскія, будуць змушаны раскалашмаціць гэты прыгожы, аздоблены ў пакаленнях куточак іх жыцця і пераехаць на вясковую вуліцу, усяго праз сто метраў, але ж у сацыялістычны калектыў. Васіль дык і памёр праз некалькі гадоў пасля пераезду, а Коля трываў далей. Але пачаў прыкладвацца да бутэлькі. Ажаніўся на жанчыне з Даматканавічаў. У нас яе называлі Джайджыха. Яна мела сына, казалі, завяла ад некага, бо афіцыйнага мужа не было. Сын той вывучыўся на афіцэра і служыў далёка, пад кітайскай граніцай.

Лёс Джайджыхі пакутлівы. Адно, што цягнулася, нібы праклён, гісторыя з сынам, прыдбаным без замужніцтва. На вёсцы такое лічылася ганебнай справай. А другое, што і Коля быў не лепшы мужык: падвыпіўшы, чапляўся біцца, выганяў з хаты. Сумесных дзяцей не было. «Гаруе яна за ім», – казалі вясковыя жанчыны.



З Мішкам Семачкавым (злева). Старэйшы і даўні хадатаўскі род. 2007 г.

Калі-нікалі Джайджыха наведвалася да нашых. Маці прыязна запрашала:

– Праходзь, Маня, у хату, прысядзь, пагаворым трохі...

З сінякамі на твары, растрэсеная, у кірзавых ботах, у нязменнай зашмальцаванай ватоўцы, яна, саромеючыся, спаквaля заступала на парог. Гаварыла прастуджаным хрыплым голасам. Гучна, моцна. Я з непрывычкі ўздымаў галаву, прыслухоўваўся. Думаў: во, я і не знаў, што Джайджыха завецца Маняй, а то ўсе Джайджыха ды Джайджыха...

Коля, яе мужык, франтавік, заўжды, узімку ці летам, хадзіў у кірзачах, падраным на рукавах пінжаку і рубашцы, зашпіленай на ўсе гузікі да самага горла. Чалавек ён быў неблагі, але калі вып'е, то здаралася ўсялякае. «Любяць этыя франтавыя гарэлачку смактаць, што яна ім далася, гарчэча адна», – не раз прамаўляла маці.

Франтавікі, праўда, выпівалі. Ад акопаў і франтавых ста грамаў цягнулася надбаная звычка. Мог і бацька выпіць. Але ж ніколі не дакранаўся да гарэлкі працоўным днём ці проста так, без якой нагоды – абы выпіць... І яшчэ адна адмеціна: франтавікі мелі прыстойнасць, пачуццё сарамлівасці за свае паводзіны. Гэта пасля маладзейшыя за іх, ужо без аніякіх тармазоў у галаве, маглі валяцца п'янымі пад плотам ці ў крапіве. Тыя ж, хто перажыў вайну, больш адказна ставіліся да жыцця, бо паспыталі гора і пакутаў. Ды і пасля вайны нічога добрага яны не збачылі. Хрушчоў адабраў прывілеі – даплаты за ордэны і медалі. З акопаў і зноўку ў «мірны бой», як пісалі ў газетах. А на самай справе – у цяжкую і беспрасветную работу на прагорклых пажарышчах, парослых бур'янамі палетках.



«Вы, хлопчык, чый будзяце?..»

Адносіны ўладаў да людзей у тыя пасляваенныя сталінскія гады былі жорсткімі, працятымі духам абыякавасці і бесчалавечнай «душылаўкі». Як адбітак часу, перад вачыма наша жанчына – старая Маланка. Заўжды ў роспачы, у бядноце і ў горы. Я ўпамінаў пра Маланчын хутарок, што прытуліўся пры невялічкім балотцы Моху. З нашага надворка віднеліся толькі страха і комін Маланчынай хаткі «на курыных ножках». Калі над ёю завіваўся сіняваты дымок летнім ранкам ці зімовым вечарам, то здавалася, што і лес там, удалечыні, не такі пануры, і ваўкі не такія страшныя. Весялей рабілася на сэрцы.

Жылі ў хатцы на «курыных ножках» Янка і Маланка. Бяскрыўдныя, гаротныя людзі. Хадзілі босымі да самай зімы. Янка, Яначак, як казалі на яго ў вёсцы, невялічкага росту, слабенькі целам, парослы рэдкім шчаціннем чалавечак з добрым і крыху жаласлівым позіркам глыбокіх вачэй. Усякае лета ён пасвіў кароў, наймаючыся да людзей. Малым мне выпала пабыць з ім цэлы дзень каля статку, калі набегла калейка. Зрання, а пятай гадзіне, карову выгнаў бацька. Маці шкадавала мяне будзіць.

«Гойсаў учора недзе цэлы вечар, няхай ужэ паспіць. Як падыму, пакуль паснедае, пайду да цябе, пушчу на работу,

а потым Вася прыйдзе, мяне падменіць»,— чуў я спрасоння матчын голас.

Мо пад дзевяць я прыбег на поплаў за Разалічавым плянам і могілкамі, пусціў маці дадому. Статак пацягнуўся на зялёныя разлогі пад Якубавічы, там, дзе прастора і стары велічны дуб. Мы дыбалі за каровамі абапал статку, а калі сышліся, Яначка, прыжмурыўшыся, пільнавата глянуў на мяне:

— Вы, хлопчык, чый будзяце?

— Дык Другаўцоваго Колі, маці ж, во, была тут.

— Так-так, а я й не падумаў нешто. Добра, што Коляў хлопчык...

Маленькі, больш падобны на падлетка, чым на старога чалавека, ён упарта тупаў за каровамі, кіруючы іх то пугаю, то глухаватым нямоцным покрыкам. Калі сонца паднялося над галовамі, а каровы прыляглі, мы прыселі перакусіць на мяккія, парослыя мураванкаю купіны. Яначак пасыпаў лусту хлеба буйной соллю і патроху, няспешна, адкусваў ад яе невялічкія кавалкі. Запіў гэты перакус вадою з бутэлькі. Потым пачаў рабіць самакрутку. З запазухі дастаў зашмальцаваны кісет самасаду, акуратна насыпаў крышыва ў прамавугольны лісточак, вырваны з газеты. Скруціў у трубачку і, паслюнявіўшы, заклеіў пальцамі.



Са сваімі хадатаўскімі хлопцамі. Злева Васька Костусеў, справа Толік Багданоў. 2008 г.



Тут пахаваны Маланчын Яначка

Упершыню я пабачыў, як прыпаліць самакрутку крэсівам. Яначак прыгнуўся з самакруткаю ў роце да левай рукі, у якой трымаў шэры, выгнуты пласцінаю камень, а правай рэзка шмаргануў па ім жалезным куском – пасыпаліся чародкаю іскры. Ён жывенька пацягнуў к сабе паветра – цыгарэта закурылася. Стары адкінуўся, выпрастаў спіну, ужо нетаропка зацягнуўся, выдыхнуў хмарку сізага дыму. Наступіў разамлелы супакой.

– А ў вас, хлопчык, есьцяка свісток ці няма? – загаварыў Яначка.

– Быў, але згубіўся.

– А вы ўмеяце самі яго зрабіць?

– Хлопцы навучылі. Васька Костусяў добра робіць.

– А во такі свісток, як у мяне, мо й ня бачылі...

Так са мною, малым, ніхто раней не гаварыў. Вельмі ўразіла гэтае «вы». Ён, старэнькі, затурканы жыццём, прыгнуты да зямлі чалавечак, паважліва, бяз аніякай азлаблівасці ці насмешкі, звяртаецца да мяне, хлапчука, на «вы»?!

– Зараз пакажу. Во, паглядзеце...

Яначка дастаў з кармана незайздросную, як напачатку здалося, арэхавую палачку. Прыгледзеўся пільней – бачу, яна акуратна аздоблена, дзе-нідзе пасечана на шчылінкі-рыскі ды кружочкі. Калі прыклаў яе да вуснаў, палачка ажыла, залілася пераліўным свістам-пошчыкам, потым заціўкала рознымі птушачкамі і нарэшце засумавала, нібы зязюля ў лесе. У вёсцы ведалі, што Яначка мае скрыпку, умее на ёй добра іграць. Маладзейшым калі быў, то яго запрашалі на розныя гулі, вяселлі і радзіны. Дык ён і на дудачцы-свістульцы самаробнай улаўчыўся – і так прыгожа, мілагучна!

То была мая першая і апошняя з ім сустрэча. Бо я быў яшчэ малы хлапчук, падшыванец па-вясковаму, і ў мяне наперадзе было вялікае жыццё, а ён быў старэнькі, слабы здароўем, і ў яго не было наперадзе аніякага вялікага жыцця. Ды адкуль яму быць, таму жыццю і таму здароўю, пры той бядноце і спазнаным за жыццё пакутніцтве?!

Яначка памёр сцішана, непрыкметна. Маланка засталася ў лясной хатачцы з Маняй, дачкой. Як яны выжывалі, аднаму Богу вядома. Вясковыя ўдовы хоць што зараблялі

на калгасных дзялках, на фермах, на ўборцы, палучалі выплаты за пагінуўшых. Маланка ж наадрэз адмовілася ўступаць у калгас. Хто толькі з ёю ні гаварыў, як толькі ні агітавалі – не хачу, не пайду і ўсё тут. Вясковыя дзівіліся. Ды не болей таго, бо кожны думаў пра свае справы – пагавораць ды пабеглі. А жыла гэтая гаротная кабета ў голадзе і холадзе. Аніякай дапамогі ніадкуль. Мясцовыя прыслужнікі яшчэ і соткі хацелі абрэзаць. Бацька пайшоў у сельсавет.

– Што ж вы робіце? Не па-людскі гэта. Яна ў вайну парцізан хавала ад немцаў, картоплю паслеўнюю аддавала, ад дзяцей адымала. Я ведаю, што за чалавек раняны ў яе адлежваўся, магу напісаць, каб прыехаў, ня даў у абіду. Ён зараз начальнікам у Мінску.

Бацькавы словы трохі дзейнічалі. На нейкі час пра Маланку забываліся, не чапалі. Агарод ды невялічкі бульбяны палетак каля хаты былі адзіным яе пракормам.

– Картопля на Маланчыным хутары, то як арэхі. Лес кругом, усе сокі выцягвае,– гаварыў бацька.

Партызаны пры нямецкай акупацыі зрабілі ў яе хаце перавалак, бо з-пад лесу праглядаліся вёска і наваколле. Наведваўся туды і бацька, паведамляў партызанам пра нямецкія засады. Нагледзеўся заадно на Маланчын цяжкі лёс і шкадаваў яе, гаротную, забітую жанчыну.



Некалі там, пад лесам, курыўся комін Маланчынай хаткі

Маланка чула бацькаву прыязнасць, таму і хілілася да нашай сям'і, завітвала вечарамі. Паспачувацца пра свае клопаты, шчымліва выгаварыцца пра сваіх дачушак Таню і Маню, пажаліцца на бядняцкую «жытку»... Гэтыя размовы, як і самі наведванні ў нашу хату, былі для яе адзінай светлай палоскай пасярод бясконцай роспачы ды штодзённых турбот. Яна ніколі нічога не прасіла: ні хлеба, ні адзення, ні помачы абрабіць соткі. Проста спавядалася пра свае думкі, выгаворвалася пра балячкі і супакойвалася сэрцам, астывала душою. Бо ў гэтым свеце нікому не была цікавай ні яе доля, ні яе сям'я, ні яе турботы. Дык хоць выказацца, перакінуцца словам з добразычлівым чалавекам і то шчасце для небаракі, адзінокай ды абрынутай жанчыны. Бедных і затурканых на сяле таксама, як і ўсюды, бальшыня людзей абыходзіла мімаходзь. Бацька і маці былі іншымі. Спачувалі, пры кожным выпадку прагліся дапамагчы, даць што з яды, з адзежы.

...Чуўся постук палкай па вушаку ў сенях і хрыпаты, грубы, прастудны голас:

– Коля, ты дома, то адчыні дзверы...

Бацька выходзіў, націскаў на язычок, каб адскочыла жалезная зашчаўка, ці вымаў затычку з прабоя. Адхінаў дзвярыную палавіцу, прытрымліваючы яе за клямку, пакуль старая прасоўвалася ў сенцы з намарожанага ганка.

– Праходзь, цётка, праходзь, тут усе свае, чужых няма... Ня бойся...

Маланка запаволена, па чарзе падымаючы ногі, заступае цераз парог на кухню, жмурыцца ад электрычнай лямпачкі. Я прымасціўся, адграючыся на печы пасля соўгання на санках, цікую зверху. Мне тут, на гліняным цёплым чэрані, добра, як бывае добра чалавеку, што разамлее з марозу на лаве перад прыпекам у цёплым закірмушку. Маланка акідвае позіркам нашы выбеленыя сцены, прыкмячае мяне, углядаецца ў мой твар. Галава закручана вялікай шэрай хусткаю, твар перарэзаны глыбокімі маршчынамі, ручаінамі слязяцца чырвоныя вочы, вусны запалі. Яна цяжка дыхае, абапіраецца на палку. На плячах заношаная ватоўка. Пацёртая шырокая спадніца стромка звісае над абцягамі настылых гумавых ботаў з дзіркамі на вялікіх пальцах.

– Садзецеся, цётка. Во сюды,– маці прыстаўляе пад яе невялічкі ўслончык.

– Глянь, Коля, пачталь'ёнка прынясла ў канвэрце... Мо зноў прыслалі пісьмо – трасцу іх ведае... Мо ўжэ на падатак... Недавяркі... Што ім ад мяне трэба?!

Яна гаворыць павольна і гучна, нібы грукоча засовамі, з хрыпам уцягвае і выдыхае паветра. Мне яе вельмі шкада, і я рады, што бацька хоча ёй памагчы. Маці налівае ў міску капусты з чыгунка, кладзе кавалачак мяса і падносіць Маланцы.

– Паешце, цётка.

– Трэба йці ў калхоз, ня будуць чапляцца, – гаворыць бацька.

– Не, Коля, ні пайду ў калхоз, – сіпатым голасам грукоча старая.

– Усе людзі, гляньце, уступілі, зарабляюць, ходзяць на работу. Бяруць коняй калхозных, соткі робяць – лягчэй жыць так!

– Ай, колькі тут мне засталося яшчэ жыць, Коля?! То абыдуся бяз іх калхоза...

Яна прымаўкае.

– Яно то так, але ж нек прывыкаюць людзі й да калхоза, – уступае ў гаворку маці. – Вунь, Паўлюковы ўвайшлі, дык лепей сталі трохі жыць.



Такімі мы былі з братам у 1967 г.

– Зіна, яны мяне абідзелі за вайну. Парцізанаў прымала-прымала, а слова нат не сказалі за тое, адно абдзіраюць кожны год падаткамі.

Гутарка прыціхае. Маланка не кранаецца яды. Цераз маўклівы прамежак бярэцца за палку, збіраючыся падняцца з услона. Кажа:

– Пара дадому, пакуль зацягнуся па гразі к сабе ў лес... От, як пасажу яшчэ вясною картоплі, то пражыву як бяз іх калхоза...

– Ня бойся, цётка, пасадзім... – супакойвае бацька.

– А што, Юзічкавы яшчэ не выаралі картаплянік, я чула...

– Можа быць. Стары захварэў, а бабы ня могуць. Казалі, паправіўся, то выаруць. А нашчот вясны – не перажывай! Памагу табе, цётка. Як свае пачну, то й твае пасадзім. Не прападзём...

– Дзякуй, Колік, табе. То пайду ўжэ...

– Пачакай! Паспееш дадому. Во, паеш! Зіна ж паставіла ў місцы гарачае, капусту. На холад добра паесці, цяплей будзе...

Маланка не можа рашыцца. Яна ўпрогаладзь, як і заўсёды. Але саромеецца.

– Не, Коля, ні буду, ні хачу...

– От, цётка! Яшчэ чаго надумалася – саромецца тут! Я, во, з табою паем тожа. Давай і мне, Зіна, капусты...

Старая ўсё-ткі бярэцца за лыжку, за кавалак хлеба, які надкусвае і павольна пераможвае шчарбатым ротам. Я спераживаўся за тое, што яна адказвалася ад яды, бо так хацелася, каб гэтая незлабівая гаротніца паела капусты. Мне палагоднела, гаючая хваля перакацілася па сэрцы. Ледзь прыкметным румянкам аздобіліся і запалыя шчокі ў старой, прысохлі ручаіны пад чырвонымі вачніцамі.

– Дзякуй, дзеткі, вам... Глянь, накармілі старую. Як у гасцях пабыла! Дай вам Божа здароўячка ды ўсяго лепшага...

От яна, асаблівасць прыстойнай сялянскай душы! Будзе ў роспачы, у бядноце, а ніколі не пераступіць рысу ўнутранага дазволу, каб нешта папрасіць, хай нават і ў блізкага ці добра знаёмага чалавека. Лічылася, што звяртацца з просьбамі аб помачы магчыма толькі да радні, яшчэ калі-нікалі да суседзяў. Але ніколі не перабольшваць з папрашаннямі, бо ў кожнага сваіх дзірак хапае. Дробныя пазыкі, накшталт газы, свярдзёлка, цвікоў, солі, вяроўкі ды ці мала яшчэ чаго,



нечакана вытыркнуўшагася на гаспадарцы, меліся часцяком – ды і з імі стараліся не мазоліць асабліва вочы.

З вялікай перасцярогай ставіліся на сяле да грашовых пазык: ці пазычаць самім ці даваць грошы ў доўг. Калі і здаралася такое, то ўжо ў самых родных, брата ці сястры, і ціхенька, нягучна, бо не вельмі ўтульная гэта справа – грошы прасіць. Грашовая пазыка стаяла на мяжы ганьбы, ад яе магла вытрусіцца нядобрая пагалоска. Няўдалы, значыцца, гаспадар ці гаспадыня, што ў іх рубельчык не трымаецца ў хаце...

...Цьмяным і дрыготкім восеньскім надвячоркам разарваў на кавалкі вечаровую імжу пранізлівы плач. Ён абрынуўся на надворак з-пад лесу, ад Маланчынага хутара, скрозь счарнелы ад бясконцага дажджу наш вішняк за хлявом. Галасіла старая Маланка – вуздрыгам, немачным крыкам, выцінаючы працятыя жальбой і крыўдаю горкія словы. Гэты плач захіснуў абвіслыя з макраты саламяныя стрэхі, непрытульную вуліцу, прыгнутыя хаты і ўсё на свеце. Маланка галасіла па старэйшай дачушцы Тані. Яна захварэла ангінаю, памерла маладзенькаю. Можа, калі што і трымала Маланку ў яе гаротным жыцці на гэтым свеце, то дачушкі Таня і Маня. Яна галасіла і пыталася ў Бога і людзей, чаму такая яе доля. Гэты яе шчымлівы, бяссільны і такі адзінокі ў халоднай цьмянай прасторы пакутлівы плач навылет працяў маю душу і сэрца. Скамянелым застыў на ганку. Бразнулі дзверы, выйшлі з хаты бацька і маці.

– Галосіць, бедная, па Тані... – прыбітым голасам вымавіўся бацька.

– Яна так кожны год у гэты дзень плача... – цяжка ўздыхнула маці, выцерла канцом хустачкі памакрэлыя вочы.

Мы стаялі пад дажджом, завалэнджаныя гэтым безнадзейным плачам абрынутай жанчыны, і страцілі пачуццё часу, не маглі сысці з цэментавых прыступак. Ніколі яшчэ дагэтуль не чуў я большага смутку ў сваім сэрцы, ніколі яно не сціскалася так ад жалю і нематы, ад няздольнасці паправіць бяду, абысці гора, дапамагчы...

Маці расказвала, што калі не стала Маланкі, прыязджаў нядзельным днём з Баранавічаў ці нават з Мінска статны, добра адзеты мужчына. Праходзіўся па Маланчынай вотчыне, дзе хілілася долу пакінутая хатка, завітаўся на вёску, пытаўся ў жанчын:

– А Меланья давно умерла? Где сейчас её дочь? С кем она живёт? Меланью тут обижали в колхозе...

Гаварылі, важны пракурорскі начальнік, і што Маланка выхадзіла яго раненага пры адступленні ў вайну.

На месцы Маланчынага хутара зараз невялікая вугрыстая праталіна з подступамі падлеску сям-там. Калі б ні заступаў я на роднае дворышча – і пры бацьках, і пасля іх, – міжволі кідаюся позіркам за выгрудак, дзе добра падняўся хвойнік і куды ходзяць нашы, селавыя людзі за лахачамі на балота – у Мох...

– Дзе быў?

– У Мосе, на балоце, лахачы пачарнелі ўжэ...

Не забыцца мне Маланкі і старога Яначкі. Не забыцца і пра гэтае «вы» да мяне, сямігадовага хлапчука. Прыгнутыя жыццём людзі, – а якія чуллівыя сэрцы, здатныя таленты, якая далікатнасць! Вось табе і «затурканыя беларусы»! А мо і ліцвіны – далікатныя ды прыстойныя... Дзе ж яны сёння, сярод процьмы дыпламаваных ды адукаваных?! Ці ёсьцяка?..

Далікатнасць пасярод вясковага люду – з'ява надзвычай цікавая. Хочацца пра яе пагаварыць, бо гэтая найлепшая з чалавечых прыкмет выразна азначана ў сялянскім коле.

Дзядзька Сашык Твароўскі, што раней расказваў мне пра пана Смоліча, штодня тупаціць па надворку да нас, да маці, каб разагнаць яе адзіноту, пагаварыць. Не прапусціць і мяне, калі прыязджаю на бацькаўшчыну. Слухаю яго з ахвотаю.

– А ты знаяш, Вася, на сяле адно два чалавекі, Яначка Маланчын і стары Базыль, Фанькі Базылёвай бацька, малых называлі на «вы» – от былі далікатныя людзі!

На вёсцы не ўжывалі слова «культура». А калі гаварылі пра каго «культурны чалавек», то мелася на ўвазе, што гэта той, хто добра адзеты, жыве ў горадзе, а значыцца, размаўляе па-руску, і галоўнае – мае якую навуку за плячыма. Так павялося здаўна, так разумелася слова «культурны» ў вясковым тлумачэнні – ва ўсякім разе ў нашых мясцінах. Самі вясковыя людзі ніколі не адносілі сябе ці сваіх знаёмых да культурных. Пра абыходлівых і прыязных людзей гаварылі «далікатны чалавек». Ды вымаўлялі гэтае слова на нейкім замілаванні, нават з прыдыхам, таксама далікатна і сцішана.

У класічным разуменні, калі зазірнуць у слоўнікі, далікатнасць ёсць абыходлівасць, тонкасць, ласкавасць, добразычлівасць. Лічыцца, што такія якасці даюцца здатным розумам і вытанчаным выхаваннем. Адкуль жа яны ў простых сялян, якія не канчалі аніякіх вучэльняў?! Дзед

Сяргей, пра якога я расказваў, ніколі не зайшоў у нашу хату, да свайго роднага пляменніка, нашага бацькі, не пастукаўшы ў дзверы. Ён і мяне, як паступіў ва ўніверсітэт у Мінск, называў на «вы»: «То як, Васька, вы там маецеся... Жывіце адно здаровенькія, хай будзе добра...»

А як бывае няёмка ў мае прыезды дадому, калі сустракаю старэнькую, пад дзевяноста гадоў, цётку Фаньку Базылёву, дачку таго самага старога Базыля, і яна пры размове спытаецца: «Вы то да сваіх, Васька, едзеця, даўно не прыязджалі...» Ці выкажацца: «Я то з вашай мамай і з татам вашым заўсюды добра была...» Яна памятае мяне падшыванцам басаногім, а на «ты» не можа звярнуцца нават у свае дзевяноста.

Назіраючы ўжо каторы год гарадское жыццё, сталічныя звычкі ды «штучкі», я задумваюся над гэтым сялянскім феноменам. Прыпамінаю размовы і сваё колішняе знаёмства з філосафам Васілём Васільевічам Грыніным, дацэнтам, выкладчыкам Беларускага політэхнічнага інстытута. Чалавек ён быў каларытны, сакавіты, асабліва калі «пад чаркай».

— Здесь, друзья, вот как все происходит...— зачынаў маналог Васіль Васільевіч, абсалютна не беручы да вушэй тое, аб чым мовілі субяседнікі толькі што. Праз невялічкі ўступ абавязковай тэмай станавілася яго асалоджаная «трудовическая культура».

Так было і ў Хадатавічах, куды мы, я і Галя, наведаліся з ім і яго жонкай, Арыяднай Барысаўнай Ладыгінай, прафесарам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Наведаліся на іх уласнай машыне, новенькіх «Жыгулях», якімі здатна запраўляла гаспадыня, з аднае толькі нагоды — паказаць бацькам нашае немаўлятка, з год толькі, дачушку Машу.

Пасля самагоначкі бацька павёў сталічнага вучонага чалавека на агледзіны. Прысталі ў канцы сотак на поплаве перад балотам. Васіль Васільевіч зморшчыў лоб, пацягнуў носам паветра, прыўзняў галаву, асвяціўся тварам і вымавіў:

— Так вот что я вам скажу, братцы! Вся проблема здесь лежит в отношениях между ним, отцом-тружеником (ён ткнуў бацьку пальцам у грудзі), и землёй, на которой он трудится. Тут возникает, понимаете ли, особый вид культуры...

Ён гаманіў, углядаўся паўз вершаліны, што нерухома стаялі сцяною за балотам, і лунаў ужо недзе далёка ад нас. Бацька знайшоў адзіны выхад:

– Хлопцы, давайце яшчэ па чарцы, а то чорт яго ведае, што заўтра будзе...

Гэты прыпамінак заўжды кліча добрую ўсмешку на мае вусны. Калі ж казаць усур'ёз, то Васіль Васільевіч у сваіх навуковых працах прыйшоў да высновы, што, акрамя базісных для чалавечай дзейнасці, па Марксу, сувязяў паміж сродкамі вытворчасці і вытворчымі сіламі, паміж чалавекам і аб'ектамі яго працы нараджаюцца ў тым ліку і духоўныя адносіны. У выніку іх сутварэння ўзнікае асобы від працоўных («*труженических*», *па В.В. Грыніну*) адносін, на базе якіх фарміруецца асобны від трудавой («*труженической*») культуры. За гэткую трактоўку марксізма яго доўга не выпускалі на абарону доктарскай дысертацыі, і толькі гады за два да смерці Васіль Васільевіч усё-ткі яе абараніў.

Я пэўнюся перакананнем, што філосаф Грынін у сваіх тэарэтычных пасылах не быў рэвізіяністам марксісцкіх пастулатаў, а толькі зыходзіў з чалавечай гісторыі, якая так ці інакш, а заўжды стаяла і стаіць на адносінах паміж чалавекам і зямлёй. Зямля-зямелька нясе ў сабе вялікую маральна-эстэтычную супольнасць. Першая кветка, квёлыя парасткі жыта, птушаняты ў гняздзе, залацістая хмарка і цёплы дождж, сонейка ў ружовым блакіце, важкі колас пшаніцы... – што гэта, як не выявы прыгажосці, чысціні і духоўнасці?! Здабываючы на зямлі хлеб надзённы, чалавек агортваецца паклонам да зямных праяў: да птушак і кветак, да дрэў і хмарак, да сонейка і неба... Чалавек і прырода вечна, на працягу ўсёй сваёй гісторыі, так бы мовіць, вучацца ўзаемнай павазе. Гаспадар ведае: не спаважыш, не схіліш галаву перад зямелькаю – не адорыць яна багаццем...

Вялася ў сялянскім побыце непрапісаная існасць: далікатны чалавек – то і дбайны гаспадар. Адно з адным тут ідзе, ды адно другое паганяе. Чалавек, далікатны ў паводзінах, такі ж далікатны ў сваёй працы, у адносінах да сваёй сям'і, да зямелькі-карміліцы. І наадварот. Чулася ж недарма ад вясковых людзей: «Што ў гэтага злыдня вырасце – ён, вунь, чалавека заб'е нізашто альбо хату спаліць суседу. Адно й думае, каб ты да раніцы не дажыў...»

Здатнасць у працы і прыстойнасць, душэўнае харство стаяць побач, перавязаны паміж сабою, як тыя сіямскія блізняты. Прыстойныя гаспадары, паважаныя на вёсцы сем'і, дзеці і жанчыны з гэтых, не абавязкова заможных, сем'яў



«Інструментарый» сялянскай арыстакратыі

вызначаліся прыродным тактам, ад нараджэння прысутным пачуццём павагі да старэйшых, да незнаёмых людзей, да людзей увогуле. Была ў супярэчлівым сялянскім коле гэткая радзюжка адмысловых людзей. Я б ахрысціў іх нават так – сялянская арыстакратыя! Яна, сялянская арыстакратыя, нябачна, але моцна трымала ў руках вясковы побыт, не даючы яму скаціцца ва ўлонне жорсткасці і дзікунства. Рознымі тое адбывалася шляхамі, ды мо найперш ладам жыцця, паводзінамі ў розных сутыкненнях, асабістым прыкладам.

– Глянь, а Петрык у цэркаў паехаў... Трэбуло й нам збірацца...

– А восека Іванавы хлопцы на танцах не мацюкаюцца дый гарэлку не смокчуць за вуглом...

– Вінак ужэ с хлопцамі авёс з рання малоцяць, а нашы спяць вунь, як снапэ... Тут дзень займецца во-во...

– Жабракі хадзілі, так стары Вінцусь ім хлеба й сала даў з сабою...

Азіраюся туды, назад, на нашу вясковую вуліцу, і перад вачыма яны, нашы гаспадары: Грудзінавы, Максімавы, Грышкавы, Сцяпанчыкавы, Лабажэвічавы, Вінкавы, Пятрушчыкавы, Ладымяравы, Тамашуковы, Семачкавы, Уладкавы, Вінцусевы... Ні ў кога не было выслана саломкаю жыццё, а захавалі ж і прыстойнасць, і чалавечую годнасць. У Івана Пятрушчыкавага ў сям'і за палякамі ў хаце мясціліся ці не дваццаць чалавек – брацця, сёстры, жонкі, дзеці... Аддзяліцца не маглі, таму і мясціліся. Маці не раз жахалася:

Перад вачыма нашы гаспадары – Пятрушчыкавы, Лабажэвічавы, Вінкавы, Ладымяравы, Тамашуковы, Уладкавы, Вінцусевы, Сцяпанчыкавы…



«Паняцця ні маю, як яны там ужываліся адзін з адным і дзе спаць лажыліся...» Ды ніводнай сваркі, ні крыку, ні енку, бо слова бацькі было законам: кожны пры справе, усе ў адну спулку, у кожнага сваё месца і роля. Таму і выжылі, выстаялі, дзеці ў людзі выйшлі...

Гэткія прыклады і дзеі, што пуцяводныя зоркі для тых, хто вырашаў, як дзень пражыць, ці думаў, на якім падмурку жыццё будаваць, з каго прыклад браць, на каго раўняцца. З пакаленняў перадаваліся ў адметных сем'ях статусныя, непахісныя законы сялянскага побыту.

«Мужык у хаце – гэта Бог у хаце. Будзеш служыць – будзеш і жыць!»

Так вучыла сваіх дачок жонка Юзіка Сцяпанчыкавага Жэнька. Па пашпарту іх прозвішча Лабажэвіч, гісторыя сям'і цягнецца з першасных вясковых упамінкаў. Людзі працавітыя, добразычлівыя. Пра матчыны павучанні мне распавяла малодшая дачка Валя, настаўніца беларускай мовы і літаратуры. У самой Валі моцная сям'я, прыстойныя дзеці – не сцерлася, «працуе» мацярынская навука!

Далікатнасць у адным коле стаяла са спагадлівасцю, імкненнем ачоліць другога добрым слоўцам, адзяліць кавалачкам хлеба.

...Амаль штодня завітвала да нас у хату Фрося Чарнабаева. Жылі яны бедна. Мужык яе Антось, чудакаваты збіральнік рознага лам'я, гаспадаркай не займаўся, час траціў на паляванні і сабак, якіх вялося ў яго цэлыя стайні, як у заможнага пана. Хатку сваю ён зляпіў з драўляных аполкаў. Усялякую зіму людзі гаварылі: няўжо яны не змарозяцца



Цётка Жэнька (Лабажэвіч Яўгенія Аляксееўна) з унучкай Вольгай і праўнучкай Жэнечкай. 1988 г.

ў такім жытле – буды ў сабак і то лепшыя. Фрося хадзіла прыпухлая з галадухі і ад сінякоў, што рэгулярна атрымлівала ад свайго Антося. Па немаведама адкуль спачатай завядзёнцы лічылася, асабліва ў расхрыстаных бядняцкіх хатах, што лупцаваць бабу трэба рэгулярна, а калі пад чаркай – так абавязкова. Мусіць, гэткім чынам даказвалі сваю значнасць ці даўбакаватыя ў рабоце, ці звяглівыя і наравістыя па натуры. Антось, праўда, не падходзіў ні да першых, ні да другіх. Ён меў сваё уласнае прадстаўленне аб тым, якім павінен быць гаспадар у доме. Грады, поле, картопля – не мужчынская справа. Хай баба корпаецца ў зямлі. А мужчына, гаспадар – то найперш здатны паляўнічы з адмысловымі, на выбар, стрэльбамі,ародзістымі сабакамі і, канешне ж, з паляваннямі, ды не абы якімі, а фацэтнымі, шумлівымі, на зайздрасць усяму сялу. Яго побыт быў нейкай неўразумелай спробай жыць па-панскі, а на справе выходзіў фарс, з'едлівая карыкатура: і смешная, і бядовая. Антося прымалі за дзівака, асабліва калі ён праходжваўся па сяле з накручанымі пад завіўку валасамі, у адваксаваных ботах і сватаўся да жанчын у суседнія вёскі, як спраўны польскі шляхціч.

– Гляньце, скарынкі хлеба німа на стале, а ён сватаецца пры жывой жонцы...

Дзівіліся, як увогуле яны з Фросяй выжываюць: ні каровы, ні цяляці, ні парасяці... Якую бульбіну, калі ёсць, то і тую сабакам звараць. Худы, падцяты, а ўсё ж не затурканы, незлабівы да вакольных людзей, з усмешкай ды гумарнымі паляўнічымі гісторыямі, якіх у яго было безліч, – такім пражыў свае гады Антось Чарнабаеў. Паслухаць бы мне тыя гісторыі ды іх бяседы з бацькам на мой цяперашні розум! Во дзе была б асалода...

На наш надворак Антось заходзіў кожную нядзелю, бывала і вечарамі. Углядаўся ў бацькаву тэхніку ды прымяркоўваўся да перагавораў.

– Колькі ты хочаш, Коля, за матацыкал?

– Я табе, Антось, затак яго аддам. Надаеў мне гэты зломак...

Антось цягнуў ламачыну дадому, дзе ў яго за дзіравым

плотам валяліся мо дзесяткі гэтакіх зломкаў з усяго свету. Так было і з ружжамі. Знаходзіў ён іх паўсюдна, топчучы сцежкі па навакольных вёсках, абмінаючы палеткі і сенажаці, дзе пацелі, шчыруючы, селавыя людзі. Нікога не падвёў. Калі не адразу, то пасля, але абавязкова сплочваў за свае здабыткі. Маці нават паўтарала шораз: «Але ж які чалавек Антось! Глянь, прынёс бацьку за гэты нямецкі зломак дваццаць пяць рублёў... Дзе ён іх узяў?! Немалыя ж грошы...»

Затое былі ў Антося, як у запраўдашняга пана, і равары, і матацыклы, і ружжы на любы густ, і стайня падцятых, худых, з вугрыстымі рабрынамі, гончых. І жонка Фрося. Нічога, што трохі прыбітая, згаладнелая. Але ж дзябёлая, шырокая ў крыжах, грудастая – не раўня якой-небудзь квёлай курыцы. Баба што трэба, як у пана...

Не забыцца, як вучыў мяне мужчынскай навуцы дзядзька Антось. Неяк улетку падчас канікул, мо ў класе сёмым ці восьмым, я шпарка рушыў дадому з-пад кароўніка ад бацькі. За Якубчыкавым пляцам віхлястая сцежка занырнула ў жытнёвае поле, абвітае лагодным мядовым водарам, што несупынна струменіўся ад наліўных спеючых каласоў. Цыркаў на небе жаўрук, пераліваўся жаўтлява-бялёсымі хвалямі жытнёвы абшар, залацістая цеплыня разлілася паўсюль і здавалася бясконцай. Не хацелася адрывацца ад яе. Я запаволіў крок, каб наглядзецца гэтай ласкавасцю, надыхацца мядовымі пахамі шапатлівых жытнёвых сцяблін, што вытыркнуліся ў неба сваімі вусатымі мяккімі асцюкамі. Праз колькі крокаў паказалася спіна. Дзядзька Антось стаяў на сцежцы і пазіраў, як бягуць і бягуць валаватыя хвалі над жытнёвым морам.



Антось Чарнабай. Помнік на магіле

– Во, йдзі сюды, пакажу табе гняздо... Там яечкі есьцяка. Мо другая кладка. Бачыш, шэранькія... Во, яе...

Ён паказаў на птушачку, што ашчаперылася трывожным піскам над нашымі галовамі.

– Давай, пойдзем, а то перажывае вунь як...

Мы пайшлі нетаропка па сцежцы ў бок сяла. Антось распытваў мяне пра школу. Потым неспадзеўкі павярнуў на другое.

– Ты ўжэ падрос. От, як будзеш жаніцца, то бяры бабу, каб не худая была. Трэба, каб было за што ўзяцца ў бабы. Як карова ялавіца пасля зімы, каб падобна... Каля такой тык і пагрэешся, кроў забегае...

Я то і не ўцяміў асабліва, што ён меў мне нараіць. Неяк пасля толькі выплыла гэтая размова. Калі-нікалі ўспамінаецца пры розных стасунках ды кранае ўсмешкаю мае вусны.



Чаго толькі не збачыў на сваім вяку дуб Якуб…

...Фрося, баязліва аглядаючыся, заходзіла к нам, звычайна пад абед, калі ўсе сядзелі за сталом. Маці адразу: «Праходзь, Фрося, ня бойся, садзіся во тут, пасядзі...»

Фрося нек квёла, ніякавата, спачатку жыватом наперад, а потым ужо ўсёй постаццю, заступала за парог з сенцаў. Жывот мяшком тырчэў над каленямі, бо балела перабітая спіна, і яна хадзіла не так, як усе людзі, а перагінаючы спіну назад. Твар, што надуты мячык, пайшоў плямамі, вочы бегаюць па вуглах, з боку ў бок. Рукі парэпаныя ад гразі і холаду.

Ёй няёмка і боязна. Не ведае, што сказаць, толькі мармыча нешта сабе пад нос. Бліскавіцай кідаецца позіркам на стол з талеркамі. Галодная. Маці бярэ аладку, зверху кладзе на яе скварку, на місачцы падае Фросі. Тая прысела пад пячоркамі на вузенькі дашчаты акраец, што вытыркаецца з печы. Маці кажа:

– Паеш, Фрося, з намі. Не бойся нікога тут. Мы паямо, і ты з намі.

Фрося сцішана з'ядае накладзенае, апускае на калені чыстую талерачку.

– Дай яшчэ што, мо камяка з кіслым малаком,– уступае бацька.

Ніколі, нават у самыя цяжкія для сям'і дні, маці не выправіла Фросю з хаты ні з чым...



Цені

...От, каб чалавечы розум толькі і вызначаўся дабрынёй ды шчырасцю, выточваўся на строгім царкоўным слове, на прыстойнасці і парадку – якое, без хмурынкі, сталася б жыццё на зямлі! Але ці магчыма гэта? Кажучы пра далікатнасць, як вытанчаную асаблівасць сялянскай культуры, я далёкі ад рамантызацыі вясковага побыту. У роўнай частцы са светлай мелася ў ім зваротная старана. Нараўне з дабрынёй і даверлівасцю адносіны ў суполцы вызначаліся супярэчлівасцю і жорсткасцю. Бо само жыццё было такім. Што ні крок, то несупынныя змаганне і барацьба. За соткі – каб абрабіць ды зберагчы ад пустазелля. За картоплю – каб не з'еў каларадскі жук. За куранят – каб не схапіў шуляк. За курэй – каб не ўбіўся тхор. За сена – каб паспець дзе накасіць карове. За торф – каб накапаць на зіму. За рубельчык – каб зарабіць, дзяцей выправіць у школу, купіць кніжкі, чаравікі...

Ды пустазелле ці каларадскі жук – бяда не бяда, бо яны, як хмары ці дождж, – нікуды не дзенешся. Цяжэй, чым жук з пустазеллем, пераносілася тое, што ішло ад людзей. На маіх вачах то былі сутычкі і крыўды за курэй ці гусей, якія, «от, пламета, ліха іх матары...», зайшлі на суседскія пасевы і падзяўблі насенне на агародзе, то за карову, што забегла

Страшна ў цемры на могілках



ў буракі і нарабіла патраву, «трасца на яе, ніколі не наесца, усё ёй мала...», то за цяля, што прывязаў сусед перад нашым плотам, дзе бацька бярог траву на сена, «от ужэ завідушчы, ня дай ты божа...», то за каня з плугам, якога нехта забраў, хоць на тое была дамова з брыгадзірам, «каб яго карбунка ўзяла ...»

Такое здаралася. Ды нек пераварвалася, перакручвалася без асаблівых наступстваў. Тут заўжды была мяжа. Мера нейкага інтуітыўнага дазволу. Мо таму, што сутыкненні на бытавым узроўні мелі розныя вытокі. Часам яны былі выпадковымі – не дагледзеў чалавек за скацінаю, што тут зробіш, бывае. За гэта асабліва не гневаліся. Больш крыўднымі і зневажальнымі былі выпадкі, калі такое рабілася наўмысна. Каб нашкодзіць, каб спецыяльна падставіць падножку, пад'ялдыкнуць, зрабіць пакасць больш удаламу ці заможнаму. Тут ужо не абыходзілася без «высокага градуса». І сваркі, і праклёны: «Каб ты спухла...», «Каб ты спрындзіўся, недавярак...», «Каб ты да раніцы не дажыў, пакасць...» А то і за калы браліся мужчыны, асабліва перакуліўшы чарку-другую...

...Калі пайсці ад Маланчынага хутара краем лясного Моха, то ўтыкнешся ў пагорак, выйдзеш на клецкую дарогу, што выгінаецца ад могілак і хаваецца ў лясным гушчары. Наўпрост за дарогай зараз голае поле, а раней мясціліся хаты, і звалася гэтае месца Сяўковам. Сюды мы цягаліся цёмнымі восеньскімі вечарамі да Мішкі Піліпавага гуляць у карты, шашкі ці даміно. З сяла ў Сяўкова інакш не патрапіш – толькі

па клецкай дарозе, паўз могілкі і Разалічаву хату. Было страшна. Ад могілак, з непраглядной як сажа цемры, вецер даносіць жудасны скрып распярэзлых старых бярэзін – хіба вар'ят цягае пілу па ржавым жалезе. Змрочна, без адзінага агеньчыка працінаецца на хмурым небасхіле Разалічава будыніна. Ідзеш і не ведаеш, а раптам пільнуе цябе за вуглом у цемры стары Разаліч, стромка ўглядаецца ў постаці на дарозе, а потым як закрычыць страшным енкам – напалохае да смерці!

Разаліча баяліся дзеці, абыходзілі і дарослыя. Ён хадзіў, апіраючыся на крывульку – нагу прастрэлілі на фронце. Крывульку пры любым выпадку падымаў уверх і пагрозліва трос: «Я-ць-це пакажу!..» Ні з кім асабліва не знаўся, жыў з жонкаю і трыма дзецьмі асабняком на могілках. Туды вясковыя стараліся не хадзіць. Бо нават калі па дарозе хто куды ішоў ці ехаў, то выбягалі мурзатыя, з дзікаватымі вачымі Разалічавы дзеці і крычалі што-небудзь агіднае. Бывала, і сам стары бег за імі, трос услед падарожніку крывулькай. Часцяком з пагорка ад могілак ляцелі на вёску ці моцная лаянка, ці крыкі. То Разалічы сварыліся паміж сабою альбо з кім з вясковых.

Асабліва зухаватай на лаянкі і сутычкі была Разалічава жонка – Каця. Стрэнецца дзе з жанкамі, пачынае да іх чапляцца па ўсялякай дробязі. Мела яна іншыя непрыстойныя звычкі. Аб гэтым ведалі людзі і стараліся не весці з ёю аніякіх спраў. Аднак наша маці па сваёй даверлівасці паступіла не так. Зачаравалася яе салодкімі спевамі пра тое, як лоўка яна выраблае пражу, а гаварыць Разалічыха ўмела здатна, і аддала ёй у работу цэлы мяшок воўны, каб вымыла, вычасала яе на кудзелю пад пражу. За грошы, зразумела. Тыдзень праходзіць, другі – ад Разалічаў ні слыху. Прайшоў месяц. Маці стрэла яе на вуліцы, пытае:

– Калі ж ты, Каця, аддасі пражу?

– Якая там пража! Абы што мне дала, ды яшчэ чапляешся. Я выкінула яе на смецце...

Прыйшлося ў самоце расказваць бацьку.

– Ну ты дадумалася, Зіна! Аддала каму воўну?! Яна табе наробіць! Ой-ёй! Знайшлася работніца... Ладна, я разбяруся сам з імі...

На ранку бацька выгнаў карову, вярнуўся к сабе ў майстэрню, палажыў за пазуху пад фуфайку здаровы гаечны



Галя збірае суніцы пад Мохам. 1980 г.

ключ і пашыбаваў на могілкі да Разалічавай хаты. Маці прыкмеціла, сумелася не на жарты: заб'юць яшчэ бацьку нізашто гэтыя бандзіты... Пабегла, знерваваная, да Ядзі, бацькавай сястры. Удваіх выйшлі за хлеў на край сотак, цікавалі за могілкамі. Праз колькі часу згледзелі, што ён выйшаў з-пад счарнелай саламянай страхі, што ледзь віднелася за расхрыстанымі бярэзінамі. Маці пабегла дадому. Бацька зайшоў на надворак з мяшком воўны за плячыма.

– На, Зіна, і болей ты з імі не цацкайся!

– Хоць не біліся там з табою?! Перапудзіліся мы з Ядзяю...

– Хай бы папробавалі! Ні такіх бачыў! У дзвярах па клямцы грукнуў, так зразу адчынілі. Зайшоў у хату, кажу, давай воўну. Яна й запела: во, бяры, Колічак, я ня ўспела вычасаць... Спалохалася, ажно калацілася. Стары Іван з вугла не рыпнуўся. Дзеці адно з печы вачыма блішчалі. Сядзелі ўсе, як мышы...

– От, я дурная! Навука на ўсю жызню...

Як з'ява «прыхапіць чужое на дурніцу» існавала звеку ў сялянскай чарадзе. Нават калі і набытак ва ўсіх быў амаль што аднолькавы – печ з гліны, самаробны ўслонак са сталом, палаці каля печкі, ікона на куце... Здавалася б, што тут красці? Але ж кралі: прыхаваны да сенакосу кавалак сала, новы кажух, кудзелю, ніткі, а найлепш дык палатно, што бераглося ў вярчах у куфэрках на пасаг для дачушкі. Запускалі скаціну на суседскія патравы, выводзілі тайком карову са стайні, адбівалі коней з гурта ў начныя выпасы...

Не магу абысці ў гэтай звязцы вытрымку з архіўнай спраўкі. Абавязковай павіннасцю сялян у радзівілаўскія часы, дый ва ўсе астатнія, разам з гвалтамі, адробкамі, здачай дзякла, жыта і аўса, мёда і нітак, гусей, курэй, яек, выплатай чыншу з'яўлялася яшчэ неабходнасць *«еженедельно стражу нести по очереди (4 раза в год) и ночную стражу по очереди»*. Нельга, відаць, было жыць без стражы – раскрадуць гаспадаркі і фальваркі.

У вайну не кралі – прыходзілі бандыты ці «партызаны-куфэрнікі» і забіралі, што хацелі, што бачылі. Але ж мне

помніцца час, пяцідзясятыя-шасцідзясятыя гады, калі хаты не замыкаліся: так, на прышчэпку, на драўляны калочак... Мо прычынай было і тое, што зладзеяў добра ведалі ў вясковай суполцы. Калі здараўся крадзёж, то вёска адразу вызначала яго «творцу». Казалі: «Тут бяз Ваські Клаўдзікавага не абышлося...» Такіх Васькаў зналі і прымалі за прыкрую непазбежнасць зямнога побыту. А хаты, ідучы на поле, у лес ці на сенажаць, так і пакідалі адно прымкнутымі на калочак з вяровачкай.

Замыкацца, купляць замкі сталі пазней, калі патроху абзавяліся скарбам: шафамі, матацыкламі, раварамі, радыёламі, тэлевізарамі. Як прыбагацелі, пачалі ўтойвацца, бо пачаўся яшчэ сякі-такі крадзёж з калгасаў – напачатку невялічкі, а потым дык і паболей. Змянілася разуменне супольнага жыцця, іншымі сталі яго ўмовы. Пабурылі цэрквы, пайшло буяць п'янае бражніцтва. Саслабела паняцце граха перад Богам і Божай карай за нядобрыя, злыя справы. «Прыхапіць чужое на дурніцу» стала нормай. Змяніўся і падман, набыўшы свае «постіндустрыяльныя формы». Не сыходзіць з галавы гісторыя пра аднаго зухаватага камбайнера-перадавіка. Пераказваю яе так, як і пачуў, «у арыгінале».

– Эта ж сёння што мне мой расказаў. Помніш, кажа, летам жнём мы жыта, адзін за адным ходзім кругамі, і камбайны ў нас адзінакавыя. Я ні атстаю ні на мінюту, а ў яго бункер скарэй набіраецца, чым у мяне. Ён ужэ высыпаў, а я ўсё кругі рэжу. А лічаць па бункерах. Во, пагналі яго камбайн у капіталку, бункер знялі, дак там другое дно абнаружылася. Яно было прыварано зверху, так у яго й выходзіло скарэй. І прэмію, і награды палучаў. От, як яно робіцца...

Зладзеяў не любілі. Стараліся асабліва з імі не знацца, як казаў бацька, не мець з імі «ніякіх дзялоў». За тымі, што крадуць, прыглядвалі і ў хаце, і на надворку.

– Эта ж яна адно ў хату зайшла – пастаялі, пагаварылі, потым бачу нешто куранят меней стало. Было пяць, а стало тры. Эта ж глянь, у карманы засунула, што я й ні скмеціла! Я то ведаю, яна ж любіць красці...

– Потым пытаюся: чаму ты так зрабіла, мы тут свае ўсе. Кажа: я сама ня ведаю, ні магу, каб што ў карман ні палажыць чужое...

Гэтак спавядалася мне наша суседка. І крадзяжы, і абгаворы, і лаянкі, безумоўна, каламуцілі сялянскае жыццё. Але найбольш яго азмрочвалі зайздрасць, помслівасць,



Змрочна, няўтульна на Сяўковай выспе

бандыцкая наўмыснасць і зласлівасць. Тое, што ідзе з глыбінь цемрашальства, выцінаецца з затоенай звярынай прыроды чалавека. З пакаленняў цягнулася за гэткімі: «Ён жа падпаліў Сымонаву хату яшчэ пры паляках...», альбо «Дык яго ж бацька забіў чалавека на танцах у Малаедах пасля вайны...», «Гэтыя са швайкаю ходзяць, помслівыя і гадкія, адно слова – бандзіты...»

Былі такія людзі. Забойцы ад прыроды. Цягаліся па вечарынах са швайкамі за пазухай ці з кастэтам у кармане. На могілках вясковых помнікі з надпісамі: «Погиб от руки бандита», як у бацькі Сашыка Твароўскага. Так, дарэчы, пагінуў на вечарыне і муж матчынай стрыечнай сястры цёткі Валі з Малаедаў. Прайшоў фронт, малады, смелы, а з неспадзёўкі атрымаў пад сэрца вострую швайку ад мясцовага забойцы. Асірацелі двое дзетак. Яшчэ з помсты ці зласлівасці злыдні падпальвалі пабудовы. Усялякага хапала. Прыпамінаю, як уздрыгвала вёска ад споведаў пра ліхадзеяў, што ездзілі па могілках, адкопвалі начамі нядаўнія магілы і здзіралі з пакойнікаў чаравікі, порткі, фрэнчы, каб сабе забраць альбо прадаць. Казалі, што было некалькі выпадкаў, калі адзежу пазнавалі, падымалі труну, пэўнячыся, і бачылі голага мерцвяка...

Злыдні не маюць літасці, не ведаюць граніц у сваёй нечалавечнасці. У вайну, недзе ў першы год нямецкай акупацыі, калі не сціхлі яшчэ ручайкі бежанцаў і ваенных акружэнцаў, што імкнуліся на Усход, забрылі на вясковыя хутары

трое дзетак. Добра адзетыя, у чаравічках, але змучаныя і галодныя. «Часікі на ручках у іх яшчэ былі», – казалі кабеты. Колькі дзён людзі кармілі дзяцей, прымалі на ноч. Ды потым дзетак не стала. Знайшлі іх голымі на гаёўцы, без адзежы, забітымі. «За адзежу гарадскую застрэлілі дзяцей... Во, якія людзі...» – хадзілі памоўкі па хатах. Дзяцей пахавалі ў палатне, што далі вясковыя жанчыны.

Пасля прыязджалі ваенныя, афіцэры, можа, бацькі альбо родныя, дапытваліся пра дзяцей: ці бачылі, ці ведаюць, дзе яны маглі прапасці. Дакладных сведкаў не было, але людзі ведалі, хто забіў дзяцей. Дый потым, калі судзілі нейкага партызанскага бандыта, як гаварылі, «з васточнікаў», за здзекі над людзьмі, прайшлі аб тым чуткі. Бачылі і гарадское дзіцячае адзенне, пінжачок і часікі, на некаторых вясковых. Ведаў аб тым і наш бацька. Расказвала яму пра забойства Маланка – было гэта каля яе хаты, навідавоку.

За гэткімі дзеямі ўжо пачынаўся другі адлік. Такое пераходзіла мяжу, стаяла папярок Божага слова. Такіх лепей абмінуць на вуліцы, абысці вечарам каля плоту, бо ў злыдня няма сэрца, няма нічога, акрамя дзікіх пачварных інстынктаў. У вайну, увогуле, адкрыліся многія таямніцы пасярод тутэйшага люду. Адны з першымі павесткамі пайшлі ваяваць з немцамі, другія прыхаваліся ў неразбярысе ад мабілізацыі ды лоўка прымасціліся пасярод сваіх і чужых, пакуль тыя, прыстойныя і чэсныя, гібелі ў акопах.

– Во, як Лаўрын, у нас тут быў, загатаўліваў для парцізан япрукоў, – расказваў на нашым надворку памятлівы на мінулае дзядзька Сашык.

– Як яны загатаўлівалі – прыязджалі з аўтаматам ці вінтоўкаю і забіралі... Так і загатаўлівалі... Патыліца, вунь, вывальвалася за каўнер...

Прыпамінаю таго Лаўрына падчас, калі ён быў конюхам. Чырвоны твар. Насунутая на лоб авечая шапка, даўжэзны кажух, тоўсты жывот... Малымі ўзімку мы бегалі на канюшню ў конскія стайні збіраць свінням конскі кал. Па сялянскай навуцы лічылася, што гэта добрая дабаўка да свінячай ежы, мукі і картоплі – паляпшае апетыт. Сапраўды, свінні ахвотна паядалі такі «мусс-кактэйль». Мы смела і рызыкоўна лазілі з вёдрамі пасярод конскіх ног, выхопліваючы з-пад капыт цёплыя, зеленавата-цьмяныя, як бульбіны з пару, бліскучыя круглякі, што выпадалі з-пад хваста. Лаўрын

лаяўся і праганяў нас з канюшні брыдкімі словамі. Пасля конюхам стаў Косцік, яго родны брат. Нам наступіла палёгка, бо ён не гневаўся, гаварыў: «Збірайце, колькі хочаце».

Косцік запамятаўся болей. Каларытны чалавек. Штодня расхрыстаны, бліскаў голымі, парослымі хмызом грудзьмі з-пад заношанай фуфайкі. Не прамінаў, ранкамі заходзіў з канюшні да нас, прасіў гарэлкі: «Зіна, мо нальеш сто грам. Нешто смажыць у роце. Я каня вам пакіну заўтрачы». Служыў у польскай кавалерыі, трапіў у палон, быў парабкам у нямецкага памешчыка. Пра яго не скажаш нічога кепскага. І ён, і Лаўрын да пераезда ў сяло кучкаваліся пляцамі на Сяўковай выспе перад лесам. Было там змрочна, няўтульна. З-пад Даматканавічаў на соткі наступаў цьмяны, насуплены бор; з другога боку, ад вёскі, пужліва і пранізліва рыпелі раскарачаныя старыя бярэзіны на могілках. Мы, дзеці, баяліся там яшчэ аднаго іх брата, аднавокага Піліпа; чалавек ён быў незлабівы, але пахмылы, маўклівы. Не хадзілі туды і па суніцы. Бо як і людзі, мясціны таксама маюць свой дух, свой твар. Казалі на людзей: «Крый, Божа, ад такога чалавека», а на мясціны: «Ня дай Божа туды хадзіць...»

Я пераказваю тое, што чуў і спазнаў пасярод вясковага калавароту. Была і такая вясковая рэчаіснасць, далёкая ад кветачак і сонейка. Ды ў тых жа самых «заходніх крэсах». Але ж і яе не абысці, не прамінуць. Хацелася б, канешне, спісаць няёмкія рысы ў характары нашых людзей на «бальшавіцкую заразу». Але ж не спішаш, бо не стыкуецца, не звязваецца. «Заразу» не адкінеш, калі мясцовыя дурні, падбухтораныя палітычнымі актывістамі, бурылі цэрквы і ламалі начамі крыжы на дарогах. Але ў верасні 1939-га, у першыя дні прыходу Чырвонай арміі, розум нашых, тутэйшых, людзей яшчэ не быў моцна запалонены «чырвонай» агітацыяй. А што рабілі, што чвэрылі?! У момант кінуліся рабаваць гаспадарку графа Чапскага ў Наруцавічах. Як расказвала маці, аб тым я, здаецца, упамінаў, цягнулі мяшкі з сырнымі боханамі, хто як мог — сэрцы рваліся, падалі і паміралі пад гэтымі мяшкамі! Разабралі на дурніцу галандскіх кароў, а потым не ведалі, як пазбавіцца ад малака — каровы давалі «па цэбру» за дойку. Праз месяц-другі кароўкі змарнелі, бо за імі глядзець трэба не горш, чым за панскімі паненкамі. І нават лепшыя гаспадары, што атрымалі ад новай улады «галандак» у падарунак,



Высылка.
Малюнак з Інтэрнэта

не справіліся: не па Сеньку шапка выйшла...

Разруха ў галовах нашых людзей цягнецца здаля. Дзікунства, жорсткасць, зламысласць да багацейшага паўзуць спрадвеку. Карані ў гэтых слоў глыбокія, спавіліся ў вечнай бядноце і прыгоне, а, значыцца, у вечнай канкурэнцыі за выжыванне. А, можа, і патрэбна, каб так было, можа, такі закон прыроды, што без гэтай штодзённай барацьбы і змагання выродзіцца чалавечы род, саступіць перад жыццёвай каламуццю, змарнее. Калі прыняць гэткую выснову за безумоўную, то і вось яно — гатовае апраўданне крыві, знявагі, шматлікіх злачынстваў. Ды ці патрэбна яго такім прымаць? Але ў жыцця свае законы.

Помніцца, як мы біліся з даматканаўскімі хлопцамі. Пачыналася гэта ўлетку, калі на сотках уладжваліся з бульбай, з агародамі, а сенакосы яшчэ не падыходзілі. Звычайна ў нядзелю наша маладая ватага займала пазіцыі на могілкавых выгрудках ад лесу. Адтуль, з лясной гушчыні, мы чакалі варожага нападу на вёску. Малышня збірала на полі каменні і зносіла ў кучкі пад акопы, старэйшыя рыхтавалі палкі і стругалі галоўкі з запалак у трубкі самапалаў — самаробных наганаў. Гэта на асобны выпадак.

Наступаў час ікс, з-пад хваёвых прысадак ад Маланкі паказваліся постаці ворагаў — даматканаўскіх хлопцаў. Яны смела, у адкрытую, не туляючыся, ішлі на нашы пясчаныя выгрудкі. Сэрцы ў нас, малых, заміралі ад трывогі і страху.

На гэтым полі мы баранілі вёску ад даматканаўскіх хлопцаў



– Падпускаем бліжэй і камянямі! Па камандзе толькі! – крычаў хто са старэйшых наперадзе ў акопах.

Праз хвіліну ў паветры пачынаўся «палёт чмялёў». Яны па нас, мы па іх! Град камянёў сыпаўся да першай разбітай галавы. Бо калі раздаваўся гвалт параненага, іхняга ці нашага, то праціўнік траціў вайсковы дух і спешваўся ў лясок за Маланку. Нашыя вылазілі з акопаў, пачыналася атака з палкамі і самапаламі ў руках. Гналіся за даматканаўскімі да гаёўкі, дзе яны знікалі ў гушчары. Крычалі ўслед ім агідныя словы. З гарачымі тварамі, успацелымі спінамі буйна адзначалі перамогу – стралялі з самапалаў па хвойках, барукаліся адзін з адным, гулялі ў даганялкі. Часам праціўнік вяртаўся, бойка зноўку разгаралася...

Барацьба за ўсё і з усім вызначалі сутнасць тагачаснага побыту. Даходзіла да смешнага і непаразумелага. Я доўга не мог уцяміць сабе некаторых даволі дзікаватых і непрыстойных праяў у паводзінах нашых людзей. Мяшалася там усё, як у сячкарні сена з саломаю, шыварат-навыварат – і смех і грэх.

Выбіраюцца нядзельным ці буднім днём нашы жанчыны аўтобусам у Нясвіж прыкупіць тое-сёе ў гарадскіх крамах. Бяруць часцяком з сабою і нас, дзяцей, каб купляць не на вока, а з прымеркаю. Пахадзілі, прыкупілі, што знайшлі, абедзенным рэйсам збіраемся на аўтастанцыі дадому. Падрульвае аўтобусік, невялічкі «пазік». Зачынаецца таўкатня перад дзверцамі. Толькі расчыніць іх шафёр, як нашы

вясковыя бабы, гэтак жа, як і чужыя, адпіхваючы адна другую, шыюцца ў аўтобус – адно локці мігцяць. Бо месцаў, каб усесціся, усім не стае, а прысесці хочацца, нахадзіліся па гарадскім бруку. Але ж і папіхацца са сваімі суседкамі неяк не да твару. Праўда, таўкатнёю займаюцца не ўсе. Некаторыя моўчкі стаяць і чакаюць. Мне дык брыдка глядзець на такую валтузню. Перасварацца, думаю, потым бабы паміж сабою, гаварыць перастануць адна з другою на гады. Але сыходзіла гэтая таўкатня, і нібыта не было яе, калі прыязджалі да вёскі, разыходзіліся па хатах. Усё роўна, як так паложана, павінна быць: папіхай адну другую, займай лепшае месца...

Дзівіла мяне тут найболей, што спіхваюць у бакі жанчыны адна другую – свае, з аднаго сяла, не тое, што чужыя, нязнаныя. Дайшло пазней, што не ў навіну гэта – так было спрадвеку. У розных толькі варыяцыях, у залежнасці ад часу і абставін. Свае цкавалі сваіх пры паляках – даносілі ў пастарункі пра тых, хто піша вершыкі і чытае газеты; удавалі немцам тых, да каго заглядвалі партызаны і хто прыюціў у гумне, на сене ці саломе, параненых акружэнцаў; уціналі энкавэдзістам тых, у каго медныя ўтулкі на жняярцы ці чые дзеці мячыкам разбілі партрэт вялікага Сталіна... Свае, вясковыя, і забівалі, і кралі, і чвэрылі ганебныя справы над сваімі, такімі ж самымі вясковымі ды суседскімі людзьмі.

А ці хіба інакш зараз, калі ўсё перамяшалася ды перакруцілася?! Мо горай яшчэ, чым раней. Бо ў вясковай суполцы такіх людзей ведалі, з пакаленняў цягнулася за імі нядобрая ляйчына. Была ў іх свая Божая кара – з імі стараліся не знацца, абысці. Іх не клікалі па-суседскі ў госці, не хадзілі да іх на вячоркі, не ўступалі без патрэбы ў размовы. Яны былі асобныя, абрынутыя на адзіноту. Страшная кара! Неяк яны дзічэлі ў сваёй асобнасці: ці зміралі заўчасна, ці куды з'язджалі ў чужыя землі... Цяпер жа нават пра суседа на адной пляцоўцы нічога не ведаеш – хто ён, які чалавек? Чвэр, што хочаш – аніякіх ляйчын...

Раздумваючы сёння над тым часам, разумею, што ён быў наскрозь працяты феадальна-калектыўнымі высновамі ў паводзінах і поглядах сялянскага люду. У бойках паміж сабою мы, дзетвара, вастрылі сваю смеласць і адвагу, змагаліся за прызнанне ў калектыве, бо гора таму малайцу, якога не прызнае суполка – прападзе ў кпінах... Калі змагаліся



Мінскія госці на гарбузах. 2000 г.

з чужымі, вёска на вёску, то баранілі свае абсягі, бо, не дай Божа, чужынцы стануць гаспадарамі на вясковай вуліцы ці на танцах. І хай кожны гаспадар на сваім полі, камандзір і галава на сваім дварышчы, у сям'і, але абавязкова член суполкі, сяла, паселішча з яго няпісанымі правіламі і маральнымі нормамі. Відаць, ішло такое з даўніны, калі род і племя толькі рука аб руку маглі абараніцца, выжыць, прахарчавацца. Па сутнасці, такая завядзёнка мела патэнцыйна станоўчы вынік. Бо ўсе тутэйшыя былі змушаны пастаянна аглядацца на калектыў, на вёску, на суседзяў, родных і блізкіх, на думку гаспадарлівых і прыстойных. Стараліся не высоўвацца без патрэбы. Не насмяшыць людзей, каб пасля не перагаворвалі па хатах, не тыркалі пальцам у спіну: глядзі, маўляў, які дурань пайшоў па вуліцы...

Думка суполкі, большасці была законам і правам, асуджэннем і прызнаннем. За бацькавым наказам «жыць, як усе людзі жывуць» таксама выразна чуецца мараль калектыўнасці. Бо калі жыць не так, як жывуць людзі вакол цябе, то, значыцца, выбіцца з лінейкі, стаць іншым, не такім, як усе, не сваім – чужым! Забойцы, падпальшчыкі, злыдні – усе тыя, што аказваліся па-за нормамі вясковай маралі, аказваліся адрэзанымі на выспе. Яны нібыта жылі пасярод людзей і не жылі, выміралі, сыходзілі ў нябыт.

Гэтыя ланцугі калектыўнай маралі былі збаўленнем і рабствам адначасова. Збаўленнем, бо ўзвышалі чалавека над яго генетычнай прагнасцю, хцівасцю і дзікунствам. Рабствам, бо ў нечым стрымлівалі яго волю, памкненні к лепшаму, невядомаму. Вясковая мараль строга судзіла зайздрасць, помслівасць, варожасць, недагляд за бацькамі і гэтак жа нядобразычліва ставілася да багацейшых, больш удалых у жыцці людзей. Яна была бязлітаснай да слабых і няздольных, да не сваіх, прышлых, людзей; адначасова, здаралася, падымала наверх жорсткіх і зацятых. У ёй перапляталіся месцамі канец і пачатак, дабро і зло, прыстойнасць і несправядлівасць.

Не забыцца пра старога Яніслаўскага. Ён хваліўся, што паходзіў са шляхты, з паляцкага роду. А быў, як і ўсе, збяднелы, адно што фанабэрыўся сваім нібыта польскім паходжаннем. У вайну служыў у польскім войску. Ды савецкая ўлада па недарэчнасці не лічыла польскіх жаўнераў за ветэранаў. Жыў бедна, але любіў пакрасамоўнічаць пра палітыку і высокія тэмы. Забыўся пра свайго сына, які ледзь не памёр з голаду недзе ў Карагандзе, куды запісаўся па вярбоўцы. Яшчэ меў агідную звычку: мяняў жонак і здзекаваўся з іх. Штогод новая, а ні з адною не ўжыўся, усе паўцякалі. Напрадвесні прывёў к сабе чарговую кабету. Гаварылі, хахлуха, з Украіны. Паўнаватая, з прыгожымі светлымі косамі за плячыма.

...Летнім днём, калі пад абед прыгналі з пашы кароў і на гадзіну ці дзве стомлена затаілася вясковая вуліца,



За плотам – чужое жыццё



Брат з хлопцамі рамантуюць рухавік ад камбайна. 2007 г.

парвалі спякотную маркоту нечаканыя крыкі ды пранізлівы жаночы плач.

– Яніслаўскі сваю хахлуху ў калодзезі хоча ўтапіць... Павалок за косы, як авечку... Божачкі! Што эта робіцца! Бяжым ратаваць, а то бяда будзе! – гаманілі перапуджаныя жанчыны.

Пайшла за ўсімі маці, памчаліся туды і мы, малыя. Пад плотам ля Грудзінавай хаты кругам стаялі людзі, а пасярод Яніслаўскі махаў кулаком над галавой ляжачай у пыле на дарозе жанчыны.

– Я табе пакажу, псякрэў! – крычаў ён. – У калодзезь цябе, курва!

– За што ён яе? – пыталіся людзі.

– Кажуць, заглядзелася на некага мужчыну, што ехаў надоечы на ровары...

Жанчыну адбілі і выратавалі, але не вельмі шкадавалі. Чаго яна спуталася з ім, адкуль узялася – з няблізкага свету сюды прыперлася... Хіба там мужчын няма? Чаго бадзяцца па сёлах?!

Тут, здаецца, схавана нейкая выснова з маіх споведаў пра сялянскі побыт, пра яго светлыя і цьмяныя бакі. Я расказваў

пра дасціпную настаўніцу Яўгенію Уладзіміраўну Ліпскую, якая не ўсім прыйшлася да спадобы на вёсцы. «Залішне ўжэ яна чапляецца да дзяцей. Як могуць, так вучацца... Што тут зробіш...» Настаўніца, здаралася, у роспачы стукала каго з малых па чарапку сагнутым пальцам, а сялянам не падабалася такая педагогіка. У той жа час яны даравалі і праходзілі міма выкрутасаў, што тварылі свае, тутэйшыя. Пабіў Антось Чарнабаеў сваю Фросю ці Яніслаўскі сваю «хахлуху», забралі Грыбавы матчыну пенсію і пілі віно, пакуль не скончыліся грошы,—то нічога, што з іх возьмеш, такія яны людзі... Хай жывуць, як жывуць... Адно, каб пажару не нарабілі...

Інакш кажучы, нашы вясковыя людзі, як бачыцца мне гэта зараз, з вышынь часу, мелі на многія з'явы жыцця свой погляд, часам не такі просты, не падуладны вонкавай логіцы ці прынятым стэрэатыпам. Гэты погляд быў настолькі змястоўны, наколькі глыбока ці шырока прасціралася сялянскае разуменне свету. Адным словам, жылі і паводзілі сябе так, як разумелі сваё існаванне на зямлі і самое жыццё. Разуменне гэтае вельмі часта было вузенькім, як тая палоска зямлі, на якой у знямозе тапталіся вякамі.

Сацыёлагі цвердзяць, што толькі 10-15 працэнтаў людзей у грамадстве складаюць яго эліту, а значыць, увасабляюць сапраўды высакародныя чалавечыя якасці. Бальшыня, ад 60-ці да 70-ці працэнтаў, кіруецца звычайнымі інстынктамі выжывання і ў залежнасці ад сітуацыі выбірае так званы прыстасавальніцкі тып паводзін. Астатнія—грамадскае дно, нематываваная група, «быдла», горшыя за жывёлін, гатовы на самыя агідныя ўчынкі.

Ці падходзіць такая арыфметыка пад наша сяло? Я перабраў па хацінах нашы хадатаўскія сем'і, і ў мяне выйшла інакш. Атрымаў вынікі, якія не стасуюцца з даказанымі сацыялагічнымі мадэлямі. Пераважная большасць нашых хадатаўскіх сем'яў усё ж такі апынулася ў маіх падліках паміж першай і другой прыступкамі сацыялагічнай лесвіцы. Ці не наўмысна я раблю такі доказ?! Не, не наўмысна. Старыя людзі яшчэ ўпаміналі, што мясціны нашыя спакайней і цішэй за іншыя. Ды і пазней, параўноўваючы свае назіранні за прадстаўнікамі розных краёў, і не толькі ў Беларусі, я ўсё больш пэўніўся высновамі, што тут у нас, на Нясвіжчыне, Клеччыне, Навагрудчыне, трохі іначай, мо, лагодней, без сякераў і панажоўшчыны, жывуць людзі.



Чаму ж яно так выйшла, што лагодней на заходніх ад Мінска «крэсах»? Важкая прычына, на мой погляд, якую не абысці і не аб'ехаць, была і ёсць ўсё-ткі так званая «трудовическая» культура, якая вякамі ішла побач з сялянскім людам. Дзякуючы ёй, выплавіўся і адфармаваўся значны адсотак прыстойных людзей. Не абавязкова багатых, нават бедных, затурканых жыццём, а тым не менш высакародных і чуллівых. Таму і непакояцца разумныя людзі пра страту гэтых стасункаў, пра раз'яднанне чалавека і зямлі, пра выміранне вёсак. Перастаў кланяцца зямельцы чалавек — пайшлі пасярод чалавечага кола непрыстойнасці, ахінулася нематою ў гарадскіх мураванках душа беларуса-ліцвіна. Па-кніжнаму кажучы, адбываецца страта «нацыянальнай самабытнасці і дэградацыя духоўных нацыянальных высноў»...

Гэта так, не паспрачаешся. Ды чую я ў адказ на такую маю выснову даволі абгрунтаваны покліч: а што, хіба ў іншых мясцінах людзі не працавалі, з зямлёю не зналіся, абышла, абмінула іх тая ж «трудовическая культура»?! Насамрэч так выходзіць, што не самы цвёрды доказ маёй думкі атрымаўся.

Мо больш пераканаўчым будзе той факт, што не так глыбока зачапіў нашых людзей сталінскі тэрор і раскулачванне. Хоць і панішчылі ды забралі ў ГУЛАГ бальшавіцкія інквізітары нямала заходніх беларусаў, але ж не столькі, як ва ўсходніх землях. Карацейшым трохі выйшла іх панаванне ў Заходняй Беларусі, таму і захавалася танюсенькая плеўка, як тая смятанка на малацэ, гаспадарлівых і прыстойных людзей.

Не адкінуць у бок і гісторыю «заходніх крэсаў» — той жа Нясвіжчыны. Былое адметным шнарам выцялася на сялянскім розуме. Часы пад каралевай Бонай, пад уладаннямі Радзівілаў, пад польскай залежнасцю хоць і далёкія, ды не прайшлі мімаходзь. Адбіліся яны ў генетычнай памяці нашых людзей. Хай не заўжды добрым словам прыпаміналася жыццё пад палякамі, але ж цікавалі ўсё-ткі здаля за паненкамі, што шпацыравалі, зацінаючыся ад сонца парасончыкамі, у Наруцаўскім ці Нясвіжскім парку; вучыліся, пераймалі нешта, бо тое была іншая рэчаіснасць, якая неўпрыкмет, пакрысе ды мяняла розум, адбівалася засечынамі ў свядомасці. Гэтыя засечыны, рысы і рысачкі, што адрозніваюць «культурны і інтэлектуальны ўзровень», я назіраў раней, сутыкаюся з імі на вёсцы — да вялікай радасці! — яшчэ і сёння, аб чым і распавёў на папярэдніх старонках. Такая яна, прыемная адмеціна, і нашых зямель, і нашай вёсачкі.



«Культурная камунікацыя»

Часам задумваюся, як сфармавалася, вытачылася пачуццё меры, прыстойнасці, узаемаразумення паміж вясковымі людзьмі. Ва ўсе свае гады вяртаюся да гэтай уражлівай з'явы: наколькі далікатнымі, стрыманымі ў пачуццях і ў пэўным сэнсе высокакультурнымі, без дыпломаў і атэстатаў, былі нашы вясковыя гаспадарлівыя людзі. Не раз упамінаў аб тым і на старонках кнігі. Але ж застаецца без адказу яшчэ адно пытанне: як, увогуле, яны разумелі жыццё, яго сэнс, яго духоўны бок, тое, што па-сучаснаму азначаюць тэрмінам «культурная камунікацыя»? Як тут усё складалася?

Можа здацца, што пытанне гэтае наўмыснае, прыдуманае. «Культурнае асяроддзе» селяніна – гачка ды каса, печ ды хлеў, трактар ды камбайн... Сапраўды, калі азірнуцца на той пасляваенны час, цэрквы панішчылі, клубы яшчэ не збудавалі, бібліятэк на вёсках таксама не ведалі і не чулі... Дык чым жа, якім духам і сэнсам, акрамя работы, жылі людзі, як яны мералі, што добра, а што кепска, як «можна» і як «няможна»? Дзе і ў чым была тая мерка?

Раздумваюся, углядаюся ў перажытыя гады, услухоўваюся ў іх подых і разумею, што карані тут глыбокія, ідуць яны з самых нетраў векавога змагання за жыццё. Але, як і ўсё ў сялянскім побыце, яны ні ад кога не схаваны, навідавоку, добра бачны ў сваёй прастаце і мудрасці. Адно прыглядзіся пільней.



«Культурнае асяроддзе»: печ ды вілы…

... Чую раніцай у хаце матчын голас:

– Эта ж падумаць, людзі сёння перагаворвалі каля кароў, як Клаўдзікаў Васька на кабылу лаяўся і хвастаў лейцамі... От, брыдота... Нашыя некалі на хутары каня, як дзіця малое, лашчылі...

– Што ты дурню раскажаш..., – уступае ў размову бацька. – Не сваё, калхознае... Дакаціліся з гэтымі пустабрэхамі... Вунь, Сяргей, калхозную кабылу на сотках, як возьме, то, як сваю, і гладзіць, і поіць...

– То хіба зраўняяш Сяргея і Клаўдзікаваго... Эта ж гаспадар настаяшчы..., – кажа маці.

Размова на момант прыціхае, але праз паўхвіліны зноўку ўспыхвае.

– Прыходзіла Ядзя, пакуль ты быў за хлявом, казала, цяля ні стала з вядра малако і картоплю таўчоную есці...

– Можа, што з жалудкам. Малыя, яны далікатныя на жалудак...

– Відаць, нешто есць. Сказала, хай заварыць румянку ў чыгуне, дасць цёплага, як астыне. Мяне матка вучыла...

Вось так, у развагах, адкрываючыся ў думках і сумненнях, вясковыя людзі рабіліся адзін для аднаго дарадцамі, суддзямі, лекарамі, настаўнікамі. Без калектыўных меркаванняў ці без таго, як самі казалі, «пагаварыць трэба», не ўявіць той сялянскі побыт. То сапраўды была «камунікацыя»! Яна цякла, як рака, і круцілася, як млын, ад рання да вечара. У гэтых «камунікацыйных» жорнах малоліся ды перамолваліся гаспадарка і палітыка, надвор'е і ўраджай, лес і поле, шулякі і кураняты... – уся агромністая разнастайнасць навакольнай рэчаіснасці. Адначасова выточваліся, фармаваліся непахісныя нормы і правілы супольнага жыцця, іх этычны кантэкст, тое самае «можна» і «няможна». Самі праз сябе,



...самаробны куфэрак

...сякач



адзін праз другога людзі зямлі, натуральныя людзі, цвердзілі і адкрывалі духоўныя скарбы, меру ўсіх рэчаў і жыццёвы сэнс. Ды поўнілі яго па зярнятку кожны сваім разуменнем, сваім здабытым на зямлі вопытам. Запаведвалі гэтае разуменне дзеткам і ўнукам, перадаючы ў пасаг разам са зберажонымі ў шуфлядах палатнянымі скруткамі. Адзін каля аднаго, побач, разам. Гэтак жа, як кветка ў лузе не расце адна, як сасонка ў лесе не лашчыцца пад сонейкам без сваіх сябровак... Так яно йшло ды круцілася гадамі і стагоддзямі.

У тых, майго часу, нашых Хадатавічах не было дня, каб людзі не перамовіліся словам адзін з другім, не зайшлі ў хату, не прыселі пагаварыць. І пра чалавека, калі выказваліся, найперш пачыналі з пытання: а ці адкрыты ён для размовы?

– Анцікава Саша, як стрэнецца, то заўсюды пагаворыць, пагаворыць! Усё раскажа...

– От, маладзец, бо Анцік то пахмылы... Маўчыць і маўчыць цэлы дзень... Адно, як вып'е, тагды ўжэ не спыніць, але ні разабраць што...

– Чулі, Чарнабаява Саша з арміі мужыка прывязла, ні пабаялася, за васточніка вышла... Але, кажуць, гаваркі, прыветлівы...

Вось што важна ў чалавеку: ці гаваркі, ці прыветлівы. Бо гэта – размовы, стрэчы, пасядзелкі, наведванні – і ёсць смак жыцця, яго дух, тое, чым цешыліся, асалоджваліся сяляне ў невялічкіх прамежках паміж турботамі пра хлеб ды дах над галавой. Аніякай наўмыснасці, аніякай кніжнасці, аніякіх павучанняў з тэатральнай сцэны. Вядома, ніхто з вясковых не называў свае стасункі камунікацыяй, як і не ведаў нічога пра некае духоўнае багацце. Гэта, як дзень і ноч, як раніца ці вечар, звыкла і неабходна – сабрацца на вячоркі, зайсці ў хату, наведацца да родных, пагаманіць на вуліцы... Абы-што будзе без гэтага...

– Некі інцярэсны сёння дзень – ніхто ў хату не зайшоў з раніцы?! Пазміралі людзі ці хвароба на навалілася..., – ні то з гумарам, ні то ўсур'ёз скардзілася цераз плот Наста Ільюкова, брыгадзірава сястра.

– Праўда! І к нам ніхто ні зайшоў... От, да чаго дажыліся... – уступала ў размову маці.

Гаварылі і скардзіліся недарма. Бо калі не заходзяць, значыцца, абыходзяць, не хочуць знацца. І няма большай кары, чым гэткая – застацца наводшыбе, без размоў, без людзей, без адносін. Хай і з багаццем. Хай і ў поўнай хаце. Хай і з вялікім абшарам зямлі...

Янка Брыль, наш беларускі пісьменнік, неяк выказаўся пра сваё старэчае існаванне: «...Хоць бы адна сабака за дзень пазваніла...». Некалькімі словамі, але як вобразна і ўсеабдымна! І здаецца мне, што не толькі гэта пра старасць. Адзінота ў старасці, безумоўна, страшная рэч. Але ж тут ёсць некая паслядоўнасць, бо старасць так ці йнакш, заўжды канчаецца адзінотай. А вось адзінота па жыцці, у сваім асяродку, калі з табою не хочуць знацца, не хочуць бачыцца і гаварыць... От, бяда дык бяда! Крый Божа ад такога ліха, як казалі старыя людзі.

Іншая справа, і гэта, мабыць, меў на ўвазе пісьменнік, што быў час, калі тэлефон трынькаў і трынькаў, а зараз, во, маўчыць цэлымі днямі... Мо, не наўмысна, ды турзануў Янка Брыль сваімі словамі яшчэ за адну восілку. Гляньце, якое яно, гарадское жыццё – столькі людзей наўкол, столькі было сяброў і знаёмых, а тэлефон маўчыць, не кажучы, каб хто пастукаўся ў дзверы. І думай: вокам не акінуць гарадскую «культурную палітру», тыя ж самыя «магчымасці духоўнага ўзбагачэння», – гэта вам не гачка ды плуг, не печ ды хлеў, – але ж ці спрыяюць яны душэўнай спагадзе?!



...самаробныя санкі ды прасніца

Мне часам здаецца, што тут, у горадзе, пасярод муроў ды шумлівых вуліц з супермаркетамі, мы ўжо й не людзі, а некія бязлікія постаці. Таўчомся у натоўпе, каб паспець на работу, шугаемся міма ў крамах, нібыта абыходзім тэлеграфныя слупы... Людзі-постаці. Адна за другою. Ні погляду, ні размовы, ні вачэй...

...прымус



Хто яны? Садкуль? Што шукаюць? Чым заклапочаны? Ніхто нічога ні пра кога не ведае... Адно, што бягом, хутчэй і хутчэй... За кватэрай, за грашыма, за работай... Не жыццё. Вечны спрынт. І так адзінока на сэрцы ў гэтым людскім моры... І мкнешся туды, у мінулае, дзе былі Ядзя і Коля, Мішавы і Грыбавы, Семачкавы і Якубчыкавы, Грудзінавы і Сяльвестаравы, Базылёвы і Сяргейкавы... Таксама людзі. Не радня, не блізкія, але з вачыма, імем, гісторыяй, суседствам, супольніцтвам у пакаленнях. Не чужыя, не абыякавыя людзі... І так утульна паміж іх, так салодка... Што б ні спаткалася – смуга, гора, радасць, – усё з імі, разам, адно на ўсіх... Прысядуць каля хаты на лавачцы, пастукаюцца ў дзверы, выслухаюць твой боль... А што трэба чалавеку ў жалі ці роспачы, як ні тое, каб выгаварыцца каму ды пачуць спачувальнае слоўца...

Тыя нашыя людзі нічога не ведалі пра фэйсбукі і твітэры, прэм'еры з бенефісамі, яны толькі здагадваліся, што недзе ёсць нешта высокае і недасягальнае, але барані Божа, каб стрэліся на вуліцы са сваім альбо чужым і не павіталіся, не перамовіліся словам, прайшлі міма ляжачага на зямлі. А захварэў чалавек, немагушчы стаў пад старасць, то як жа не наведацца да яго?! Помніцца, паступіў ва ўніверсітэт, прыехаў дадому, бацька кажа: «Моцно хварэе дзед Сяргей, у бальніцы ў Нясвіжы ляжаў, пойдзем да іх, трэба табе яго адведаць...».

...кошык для сечкі



«А што «цені» ці тыя, хто на другім баку вясковага жыцця? – спытае мяне ў гэтым месцы дасціпны чытач. – Няўжо ўсе былі такімі прыязнымі ды спачувальнымі?». Не ўсе. Пра тых, хто жыў па правілах

«ценяў», я не вяду гаворку. Такія людзі былі і будуць, але яны ніколі не былі ў вясковым жыцці на першым плане. Яны заўжды ў меншасці, ззаду. Агульны настрой вызначалі людзі сумлення, працы і прыстойнасці. Звязка з роднымі вытокамі, са сваёй зямлёй была для іх найвялікшай жыццёвай каштоўнасцю.

Заселі ў памяці перамовы з бацькамі наконт пераезду да мяне ў Мінск, калі яны занемаглі.

– Вася, што ты, сынок, кажаш?! Як жаж мы будзем там у цябе жыць? Ніводзін чалавек у хату ні зойдзе...

– Мы з Галяй будзем каля вас...

– То вам на работу трэба бегчы, а мы з бацькам, што слупы будзем сядзець і глядзець адно на другое бяз людзей...



...лямпа і фанар

Нікуды яны не паехалі з роднай хаты, ад сваіх людзей. Колькі мы іх з братам ні прасілі, ні агітавалі. Такая моц і сіла роднага месца, каштоўнасць сваяцтва, суседства, свайго чалавека, звычак і правіл жыцця ў тутэйшым асяроддзі. Не раз чулася ў вясковых размовах: «Дай мне, Божа, памерці ў сваёй хаце, а не ў чужых людзях». Вось яно, сялянскае шчасце! Паміж сваіх – ты чалавек, асоба, а не проста травінка пад нагою, на якую, калі й наступяць, то не скмецяць.

Трафейны здабытак – нямецкая нарэзка для хлеба, сыра, каўбасы

Паглядзіце на селяніна пасярод чужых, асабліва пасярод гарадскіх людзей! Сядзіць, як мыла з'еўшы. Увагнуўся ў плечы, муляе яму каўнер пінжака, бо не прывык да яго, баіцца слова выціснуць з сябе, бо гавораць усе па-руску. Відэлец не ведае куды тыркнуць. Толькі й марыць, каб скарэй уцячы з такіх гасцёў на свой надворак... Там, на надворку, на лавачцы ці каля плоту абсалютна зваротная карціна. І каўнер расшпілены, і душа спявае, і жарты з прыцмокамі ды прыскокамі адно і льюцца.



На лавачцы летам, у нядзельку...



...Нядзеля. На нашым надворку невялікі збор. Бацька прысеў на ганку, маці, цётка Ядзя і Зіна Толева на лавачцы. Падышлі мужчыны – Коля Сяргейкаў, Толя Максімаў. Пераказваюць, смеючыся, як Васька Костусеў «свінча калоў» у Веркі Марцінчыкавай. Нешта там «ня так палучылася», кабан сарваўся ў бягункі, то дзень шукалі. На сярэдзіне гэтых успамінаў зазірнуў на двор Васіль Домчын. «Мусіць, Васіль трохі пад мухай...» – перашэптваюцца жанчыны на лавачцы.

– Слухай, Коля, – кажа ён. – А праўда, папробуй ты злаві перапуджанае свінча... Ня так эта просто...

Закурвае «Казбек», рубашка расшпілена, рукавы закасаны па локці. Перакладвае папяросу ў левую руку, адводзіць яе ў бок, а правай пачынае памагаць сабе ў размове, крэмзаючы паветра.

– Тут, хлопцы, сабака трэба. Аўчарка ўзяла б адразу. Коля, не паверыш, што за сабака! Во, пад провалакаю на ўчэньях салдата выцягне ў мамент...

Васіль згінаецца, распраўляе ўшыркі рукі і плячукі, паказваючы, як паўзе аўчарка пад провалкаю, дробнымі крокамі набліжаецца да жанчын. І раптам – хап за ногі Зіну Толеву! Тая звонка ўскрыквае, напалоханая.

– То хіба ты ўжэ здурэў, Васіль, га?! – накідваюцца на яго жанчыны.

– Васіль то да, зная пра сабакаў... Ён пад Масквою ў сабачай камандзе служыў...

– Хлопцы, там сабак у нас было, як свіней у калхозі... Ферма настаяшчая... А знаяш, як іх кармілі?! Строго па распісанью... І вітаміны, браттымой, пастаянно... У Нясвіжы ў бальніцы людзей так ні кормяць, як там сабак...

– Але ж і сабакі, я табе скажу! Пад танк кідаецца з мінаю на спіне... Гаранцію даю, хлопцы... Сабакі, браттымой, о-го-го!

Ці яшчэ сцэна. Мужчыны каля плоту заходзяцца са смеху.

– Так яны, значыць, сала парэзалі, цыбулю. Разлілі гарэлку ў стаканы. Давай чокнемся, друг дарагі! Выпілі і глядзяць адзін на аднаго, вочы вытрашчылі...

Расказвае вядомы на сяле майстар камічных гісторый Сашык Твароўскі. Расказвае пра тое, як наша маці наліла Грыбу і Колю Грышкаваму ў бутэльку замест самагонкі вады з вядра.

Мужчыны познім вечарам выпівалі, гарэлка скончылася, а ім яшчэ захацелася. Рашылі пастукацца ўначы да нас. Бацька спаў. Маці ўстала, кажа, няма ў мяне самагонкі. Яны, не, давай, не можа быць, каб не было... Маці спалохалася, што разбудзяць бацьку, які гэтага не сцерпіць. Пачнецца заваруха. Наліла вады, адно каб выправіць з хаты...

Я чуў пра гэта. Маці раніцай расказала бацьку за снеданнем. Але не прапускаю ні слова.

– Слухай, – пытаецца Грыб у Колі, нешто ў мяне зусім слабая, – таемным, прыцішаным голасам прадаўжае дзядзька



... і на вуліцы ўзімку

Сашык. – Знаяш, і ў мяне тожа зусім слабая, кажа яму Коля... Слухай, а можа, гэта вада, – зноў пытаецца Грыб. – Мусіць, вада, – гаворыць Коля. Так што рабіць нам цяпер, га?! Эта ж ваду наліла Смалянка! Эта жа так над намі наздзеквалася...

Непадалёку, пад плотам на лавачцы, жанчыны. Прыслухваюцца.

– От, маладзец Зіна, што правучыла! Дадумаліся швэндацца начамі, – пазнаю я голас Анюты Росцікавай.

– Дак казалі, што Грыб вызверыўся яшчэ на Зіну, што няма гарэлкі... Трэсьні, а давай, бо яму захацелася...

– Гляньця, бабы, на этага Грыба! Высах, што трэска, ледзьве ногі цягне ў кірзачах... Во як ходзіць...

Анюта ўстае і, калываючыся качкай, праходзіцца па кругу. Жаночы гурт ахоплівае звонкі рогат.

– Але ўмее Анюта расказаць...

А Сашык далей весяліць мужчын. Ён адзін выступае ў дзвюх ролях, паказваючы гэты дыялог.

– Ну, Грыб і кажа, трэба йсці біцца. Аддубасіць так, каб запомніла... А сам, як пленны немяц, худы, адно галава тырчыць з-за стала... Але падбухторвае... А Коля Грышкаў здаровы, поўны, як стог, сядзіць за сталом, гаворыць Грыбу, не, апасно йсці, у Другаўцоваго руж'ё есць. Як улупіць, то пакоцімся, што зайцэ з лесу...

Мужчыны заходзяцца смехам. Рагочам і мы, малыя, што прыбіліся да мужчынскага гурта...

Такія суполкі, калі людзі сыходзіліся ў вольную хвіліну на вуліцы ці ў хаце, кожны раз станавіліся незабыўнай тэатральнай пастаноўкай – шчырай, таленавітай, з арыгінальным і непадробным акцёрскім майстэрствам. Гэта ў чужых людзях душа вясковага чалавека скручвалася ў сухі лісток. А чаго перад сваімі саромецца, не быць такім, як ёсць, як хочацца?! Ды не паказаць схаваныя пад куфайкай ці кажухом таленты, якія так і трымцяць, так і рвуцца на волю са шчодрай сялянскай душы! Яна ў селяніна, чалавека натуральнага, часта знемагае ад нявыказанасці, бо сарамлівая, далікатная, зашпіленая на ўсе гузікі. Дзе ж ёй, беднай, разысціся, як не падчас вячорак ці фэсту, вяселля ці маёўкі, у мужчынскім коле альбо ў жаночых пасядзелках?!

У сваёй акцёрскай здатнасці, таленце, назіральнасці вясковыя людзі не саступалі ні артыстам, ні спевакам. Зачынаецца вяселле на сяле. Парадак такі. Радня жаніха і нявесты збіраюцца напачатку па сваіх хатах. Звычайна ў суботу па абедзе,



Без вяселля – не жыццё! . Пад шлюбам дачка Лена цёткі Сашы і дзядзькі Юрка з Аношак (яны справа). Злева – дзед Сяргей і Мар'я

надвечар. Але ж падходзіць час, пара маладому выбірацца за суджанай. Рыхтуецца квяцісты вазок ці санкі, і жаніх з дружкамі пускаюцца ў дарогу. У блізкую, калі дзяўчына са свайго сяла, і далей, калі з другога. А там хлопцы не дрэмлюць: як гэта ты, сякі-такі, прыехаў тут забіраць нашу прыгажуню... Не, брат, так справы не пойдуць! Дзёрзкая ватага становіцца на шляху, каня ўхопліваюць за аброць... Стоп, даражэнькія! Во, бачыце, стол пасярод дарогі! Яго не абмінеш! Стаўце перапой: гарэлку, закускі, альбо і грошы... Колькі?! Гэта, як дагаворыцеся, як старгуецеся...

Малады з дружкамі пра перапой ведаюць і, каб не зганьбіцца, бяруць з сабою ў вазок «дыплямата-перагаворшчыка». Меліся ў сёлах такія мужчыны ці жанчыны: «філёзафы», гаваруны-казачнікі. Здатны «перагаворшык» абвядзе вакол пальца ватагу, адкупіцца бутэлькай і кружком каўбасы. Але «перапойшчыкі» таксама не прастакі – выстаўляюць на пераговы свайго ўмельца- «дыплямата», каб сарваць з маладога паболей гарэлкі і закускі...

Патрапіўся мне рэдкі здымак. Толю Максімавага, маладога жаніха з нашых Хадатавіч, перапынілі перад суседнімі Коханавічамі, куды ён з дружкамі прыехаў за сваёю Зінаю. Перапой! Перагаворы з мясцовымі коханаўскімі хлопцамі вядзе наш Сяргейка. Чалавек гумарны, задзірысты на слоўца,



Перапой. Перагарадзілі дарогу ў Коханавічах маладому Толю Максімаваму з Хадатавіч. Перамовы вядзе Сяргейка (перад сталом у шапцы). Злева ад маладога Ільюк, справа Наста, яго сястра, далей Валодзя Грышкаў, Саша Сяргея Другаўцовага, Саша Міхасява, Наташа Данільчыкава (каго ўдалося пазнаць)

салодкі на размову. Ад коханаўскіх – мажны і высокі мужчына, бачны толькі са спіны. Мы, дзетвара, круцімся ўюнамі, цікуем за дыялогам:

– Што ты, дзядзька, сабе думаеш?! За адну бутэльку самагонкі, каб мы вам такую дзеўчыну аддалі, га! Рабацяшчую, красівую! Паглядзі ты на яе косы, га! Гэта ж, як у бярозкі вясною!

– То праўда, хлопцы. Дзеўчына ваша на ўсе сто! Ужэ калі наш Толя за яе зачапіўся, то, відаць, адным словам дзеўчына... Але і наш хлопяц, то пашукаць, ні нойдзяця! Глянь! Высокі, стройны! Чуб густы, валасэ мяккія, белаватыя, што лён... Эта знаяш, мяккі харакцерам... Яна за ім будзе, што заяц пад кажухом! І ў цяпле, і ў дабрэ... За такога хлопца вы нам бутэльку стаўця! Во, як далжно быць!

– Слухай, хлопяц-то да, харошы! Знаям, бацька з вайны не прышоў, ён адзін гаспадарку цягне... Але, каб ты ведаў, што за дзеўчына, наша Зіна! Як заспявае, так кашулю здымеш і мне аддасі... Пяць бутэлек стаўця на стол!

– Ну, браце, ты загнуў, га! Пяць бутэлек! Так мы зараз, во, развернямся і цераз Высокую, з другога боку ў сяло ўедзем, пакуль вы тут таргуецеся... Не гнявіця бога, хлопцы, пускайця коняй. Во, ладна, дзве бутэлькі стаўлю...

– Не-не! Задзёшаво ні аддамо! Праўда, хлопцы! Ні аддамо! Давай, калі ўжэ вы такія, стаў локаць на стол! Паборамся! Есьцяка ў вас хто смелы? Паложыш маю руку, тры бутэлькі! Я палажу – пяць бутэляк, каўбасы і салцісон!

– Ну, хлопчыкі, паночкі вы мае родненькія! Мы ж тут суседзейкі блізкія! Я ж з тваім бацькам, Міхаська, на танцы

ў Малаеды разам хадзілі! Дык што ж мы тут, родненькія, барукацца адзін з адным будзем, га?! А то й за калэ яшчэ ўхвацімся, мо!? Плямаў наробім!? Абдымеся, хлопчыкі, ды па чарачцы і хай тая жаба здохне, што выпаўзла з гразі... Тры бутэлькі стаўлю, во! Ільюк, налівай па стакану хлопцам!

Хлопцы, праўда, асмяглі губамі, не дачакаюцца канца перамоваў. Таму Сяргейкава «па стакану» ім да спадобы, а ласкавасць яго дык мёдам на язык... На стол са звонам пад гоман і ўсклікі выстаўляюцца гарэлка, віно, каўбасы. Ватага раступаецца. Шлях адкрыты ...

Потым будуць плакаць бацькі, праводзячы дачушку ў чужое сяло, але дружна, раднёю, паедуць за маладым. Там іх стрэне сват, перавязаны вышываным рушніком... Будуць сыпацца жыта і ячмень, біцца чаркі... Будзе гармонік з барабанам, полька, кракавяк... Само сабою, будзе каравай... А ў адзін момант жанчыны за сталом, асаладзіўшыся прысмакамі і віном, штурхнуць адна другую: «Фаня, давай, не сцясняйся...». Фаня павядзе вачыма, нібыта пытаючыся дазволу ў прысутных, адкіне назад галаву, быццам задумаецца на момант, а потым зачне густым, зыклівым, працятым некай недасягальнай векавечнай сялянскай смугою голасам:

«Зялёная вішня з-пад кораня ўзыйшла,
Аддала мяне мама, дзе я непрывычна.
Ты думаеш, мама, што я тут пірую...»



Вяселле на надворку ў Янака Багдановага на Быкове. Па цэнтру брыгадзір Ільюк з жонкай, справа Санько С.В., старшыня калгаса «Дружба». Сам Янак стаіць злева



Радыёпрыёмнік – талерка «Рэкорд-8»

І замрэ, ашаломіцца хата, узмакрэюць вокны і вочы тых, хто там, на надворку топчацца пад імі, цікуючы праз фіранкі за гасцяваннем, і тых, хто тут, у хаце, на лавах прыгубіў з чаркі і адчуў свабоду, разамлеў душою...

І сцішацца, прымоўкнуць мужчыны. І пабяжыць слёзка па жаночых тварах. Але прасохне слязінка, ціўкне, што тая мышка з пад прыпека, скрыпачка, і новай хваляю разыдуцца ўшыркі смех і гоман...

Дзе ж вы, тыя вяселлі?! Куды падзеліся...

А якімі цікаўнымі былі людзі! Як прагліся даведацца пра сусвет, пра тое, што там у Нясвіжы, ці ў далёкіх Мінску і Маскве. Да нематы хацелася ім узняцца над звыклым полем ды вясковымі стрэхамі. «От, там, то паглядзець есць на што! Палацы этыя ў Крамлі! Начальства зноў, як пры цары жыве... Адно й шпацыруюць ды ходзяць на канцэрты...».

Мара зазірнуць у таямніцы, што крыюцца недзе ў далёкім бязмежжы і даступны толькі багатым ды вучоным, журчэла самотаю ў сялянскім розуме. І калі гэты свет трошкі прыадкрыў перад імі дзверы ды запрасіў зазірнуць у вузенькую шчыліну, то перавярнулася жыццё сялянскае. Пра гэты пераварот забыліся, а першай шчылінкай у сусвет стала радыё, што прыйшло ў хаты. Слова нават не выгаворвалі. «Радзіва, гляньце, прыдумалі некае! Эта ж трэба... Але разумныя людзі есць на свеце...»

Пачалося з чорных талерак у вуглах, якія шыпелі, трашчалі – каб выслухаць слова, прыкладваліся да талеркі вухам. А прадоўжылася больш здатнымі ўстройствамі. Я ўпамінаў, што бацька, ці не першы на сяле, прывёз са Снові прыёмнік на батарэях з прыгожай назвай «Родина». Немаленькая, грунтоўная скрынка, у прыгожым драўляным аздабленні, з пластмасавымі ручкамі, мігценнем агеньчыкаў і, галоўнае, з добрым гучаннем, выразнымі словамі і музыкай. «Родина» заняла найлепшае месца ў хаце: пасярод «чыстай палавіны», на шкафчыку.

Дзверы ў нас з таго дня адно і круціліся. Вечарамі, у будзённыя дні, прыходзілі свае, вясковыя, а нядзеляю, днём,

дабаўляліся знаёмыя ці радня з суседніх сёлаў. Свае дык пераступалі парог і заглядвалі на кухню ці ў «чыстую комнату», а чужыя, з другіх вёсак, то стукаліся і пыталіся: «Можно да вас?!». Маці ці бацька гаварылі: «Заходзьця, не сцясняйцеся! Ня стойця ў сенях!». Рассядаліся, хто на лаве, хто каля печкі, хто, сагнуўшыся, каля стала, каб лепей было чуваць; мы, малыя, на падлозе.

Заміралі, амаль не дыхалі, калі бацька шчоўкаў ручкаю, зялёным агеньчыкам залівалася лямпачка, і то ціўкалі, то папісквалі з яшчыка розныя гукі, а потым вырываўся на прастору адмыслова сталёвы голас знакамітага маскоўскага дыктара Юрыя Левітана: «Передаём важное правительственное сообщение...». Тут, як казалі, усё, амба! Мурашкі беглі па спіне. Мужчыны ўздрыгвалі, хто-небудзь сцішана пытаўся: «Няўжо вайна!? Можа, амэрыканцы паперлі...». Жанчыны хрысціліся, прыгаворвалі: «Ня дай, Божа! Зберажы і памілуй...». А голас з «Родины» упэўнена і неадступна гучаў далей: «Сегодня... в Советском Союзе произведен успешный запуск в космос искусственного спутника Земли...». Растамляліся твары, успыхвала гамонка: «Глянь, у некі космас палезлі... Што яны там шукаюць...».

Зусім лагоднелі, як зачыналіся спевы. Часта спявалі па радыё вядомыя ў той час беларускія пявунні, здаецца, Марыя Адамейка і Ганна Аўдзеенка. Спявалі цудоўна! Асабліва народныя песні.

Потым сталася на радыё неверагодна цікавая рэч – «Тэатр ля мікрафона». Пачалі перадаваць радыёспектаклі і радыёпастаноўкі. І зараз перад вачыма тыя вечары ў хаце.

...Звіняць цымбалы, чуецца голас Ілы Кургана, знакамітага беларускага дыктара: «Пачынаем радыётрансляцыю спектакля «Лявоніха на арбіце»... Аўтар Андрэй Макаёнак... У ролях... артысты тэатра імя Янкі Купалы... Ржэцкая, Платонаў, Рахленка, Глебаў, Макарава...».



Знакаміты «ВЭФ» рыжскага радыёзавода

Зачынаецца пастаноўка. Мілагучна, з непадробным вясковым каларытам і харaством разліваецца па хаце наша цудоўная беларуская мова. Нібы срэбная, чыстая крынічанька сыходзіць з-пад зямнога сэрца, ды зачароўвае, супакойвае тут усіх. Хата змерла.



Радыёпрыёмнікі савецкага часу

Ціш, муха не праляціць. Раптам нястрымны як выбух, смех, зноў цішыня. Ды не надоўга. Ужо грымотны смех, усклікі: «Ну, дае баба прыкурыць!», «Глянь, як наша Клаўдзя! – Па праўдзі, Клаўдзя!» Гэта пра гераіню п'есы Лявоніху. З другога канца дабаўляюць: «От, каб ты, Анцік, на такую нарваўся! Чарку б за кіломятар абходзіў».

Мо адначасова з радыё ці трохі пазней прыйшло на вёску яшчэ адно дзіва – кіно. Пра кіно расказвалі франтавікі; паказвалі салдатам у зацішныя дні паміж баямі. Але ж гэта было недзе, а тут, во, кіно ў нашым сяле!

Недзе пад зімку пранеслася пагалоска, што ў Любінай хаце, цераз дарогу ад нас, вечарам будзе палітінфармацыя, а потым кіно. І малышня, і старэйшыя хлопцы задоўга да вечара круціліся каля цёткі Любы, чакаючы новых звестак. Дзень ледзь поўз. Бацька прыехаў на трактары абедаць, сказаў мне: «Вечарам будзе Нябоська пра паліціку расказваць у Любы, і кіно пакажуць. «Максім Перапяліца» называецца. Так вазьму цябе».

...Любіна хата набіта людзьмі, што селядцамі ў бочцы. Лавы састаўлены радамі. Сяджу сціснуты паміж бацькам і Колем Андрэевым, цётчыным мужам. Ён заядлы курыльшчык, смокча тоўстую цыгарку, скручаную з газеты. Кураць і другія мужчыны, дыхаць няма моцы, над галовамі плывуць палойкі шэрага туману. Незнаёмыя хлопцы спраўна расстаўляюць па вуглах вялікія чорныя скрынкі, цягнуць скруткі правадоў пад сценамі і праз дзверы на вуліцу. Паміж вокнамі вешаюць шырокую белую прасціну. Заходзіць падцяты мужчына ў чорным касцюме, з партфелем і доўгім белаватым скруткам у правай руцэ. Гэта настаўнік гісторыі з Казлоўскай школы. Нябоська яго прозвішча.

– Так, мужчыны, адкройця окна! Праветрым, надымілі...



Першыя кінаапараты з бабінамі

Пакуль гэта робіцца, ён спрытна развешвае на белай прасціне прамавугольную карту, падбітую зверху і знізу драўлянымі палічкамі. На карце добра бачны два круглыя шары ў каляровых плямах. Бярэцца за тонкую ўказку.

– Перад вамі, таварышчы, паліцічаская карта міра. Вот правае палушарые, відзіця на нём розавым цветам – эта Савецкі Саюз, самое большое і магушчественнае гасударство міра...

– А вот тут Амэрыка, на левом полушарii, вот сераватым цветам, відзіця, насколька она меньше. Но она грозіт нам атомной бомбай...

Мужчыны на лавах адклікаюцца на словы лектара.

– Глянь ты, меньшая, а лезе з атамам да нас...

– Яны багатыя і цяхнічаскі развітыя, – уступае бацька. – На фронце іх «студабекяры» цягалі нашу арцілерыю...

Лектар гаворыць складна, слізгае ўказкаю па карце. Я не адрываю ад яго вачэй, выхоплівaю незнаёмыя словы, бо ніколі іх не чуў дагэтуль.

– Зараз, таварышчы, самая сложная абстаноўка, канешне, у Афрыцы. Страдаюць нашы друзья в Конга. В цюрме находзіцца народны герой Патрыс Лумумба... За яго асвабаждзенне борацца Савецкі Саюз...

Мне таксама шкада Патрыса Лумумбу. Хочацца пазмагацца за яго вызваленне з усім савецкім народам. Пальцы на руках пругка сціскаюцца ў кулакі, але лектар Нябоська весялейшым голасам заканчвае палітінфармацыю:

– Наша страна, таварышчы, успешна развіваецца, яўляецца самай сільнай у міры. Ваш труд, таварышчы, нужан нашай стране... Спасібо вам за ваш труд.

З радоў чуецца нямоцны покрык:

– Так што з трудаднямі будзя? Хоць рубель які дабавяць ці не?!

Нябоська ўглядаецца ў рады:

– Жызнь, таварышчы, становіцца всё лучша. Для вас сейчас будзе бясплатна паказана вясёлае кіно «Максім Перапяліца»...

Ён скруціў карту, хуценька нырнуў за печ, накінуў паліто – і ў дзверы. За вакном, на Любіным надворку, рыпнулі санкі,



пачуўся покрык на каня Косціка Ігнатава, нашага конюха.

– Глянь, як змыўся з хаты... Ужэ й след прастыў, – сказаў дзядзька Коля і палез у куфайку за самасадам. Але затарахцеў дзвіжок, і ён не стаў круціць цыгарку, а, як і ўсе, упіўся вачыма ў белую прасціну. Хлопцы, што раней разматвалі правады, мітусіліся каля кінаапарата.

– Давай бабіну, – крыкнуў старшы з іх другому. Лоўка ўхапіў шырокую хрумсткую ленту і запусціў яе паміж незлічонымі бліскучымі ролікамі. – Выключайця лямпачку!

Апарат зашаргацеў, з чорных скрынак пачуўся моцны грукат і трэск, але загучала музыка, паплылі словы... Праз хвілін дзесяць уключылі святло і было так шкада варочацца садтуль, з белай прасціны, з такога цудоўнага відовішча сюды, на лавы, у звыклую хату.

– Мяняем бабіну, – патлумачыў кінамеханік. – Праз мінуту пойдзе далей...

Стужку на тых праекцыйных апаратах мянялі разоў пяць за гадзіну. Дый стужкі, што порах, успыхвалі агнём, як наматаюцца на ролікі. Людзі гінулі ў пажарах.

Дні са два ці мо тыдзень трызніў я прыгодамі вясёлага Максіма Перапяліцы з папулярнай кінакамедыі. З яе і пачалася наша вясковая кінаэпапея. Штораз гэта станавілася незабыўным святам, якога чакалі ўсе: і дзеці, і дарослыя, і пажылыя людзі. Напачатку кіно паказвалі ў Якубавічах, у будынку пана Смоліча, дзе мясцілася пачатковая школка. Потым у вёсцы, калі будынак перавезлі ў сяло.

...Вестка, што заўтра будзе кіно, прыходзіла раз ці два ў месяц. Якое кіно, аб чым – ніхто не ведаў, і ў тым, як зараз кажуць, была інтрыга, таямніца. З раніцы пачыналася трымценне: можа, пра вайну, пра нашых і немцаў?! То гэта вышэйшы гатунак. К вечару дазнаваліся ўсё-такі пра назву. На гэты раз

некі «Ціхі Дон». Незразумелая назва. Што такое «Дон» і чаму ён ціхі... Але кажуць пра вайну, вельмі «інцярэсна», значыць, трэба туды патрапіць. Ды толькі адна загваздка – дзе знайсці рубель на білет? На ўваходзе «кіншчык», так мы называлі кінамеханіка, прадае білеты, пільнуе, не праскочыш.

...Яшчэ каровы не прыгналі з пашы, а з-пад школы на ўсю ваколіцу панесліся песні. Гэта кінамеханік выставіў на траву чорныя скрынкі-узмацняльнікі, запусціў пласцінкі. Трываць немагчыма! Бацька не прыехаў з «калхоза», маці разводзіць рукамі: «Глянь, сынок, эта ж ні рубельчыка ў хаце німа... Што ж рабіць?! То, можа, вазьмі яйца з-пад курыцы, ды дай кіншчыку... Няўжо ні пусціць за яйца... У магазіне бяруць яйца, грошы выплочваюць...».

Я саромеюся ісці з яйкамі пад школу, баюся, што будуць з мяне кпіны рабіць старэйшыя хлопцы, але выручае Толік Яўгенеў, мой сябра. Ён з яйкамі ў карманах забягае за мною на двор, кажа: гусакоўскія давалі яйца, кіншчык іх пускаў. Бяру з матчыных рук па яйку ў абодва карманы, прытрымліваю, каб не боўталіся, рукамі. Порткі аттапырыліся, але трымаюцца. Мы порстка шыбуем з Толікам у Якубавічы. «Кіншчык» кінуў на нас вокам, расшпіліў сумку, што вісела цераз шыю на грудзях, засунуў туды яйкі, а нам ледзь кіўнуў галавою ў бок калідора. Уладкоўваемся на падлозе паміж радамі. Школьны клас паўнюткі людзей. На высокім стале новая апаратура. Бабіны вялікія, стужка стала вузенькай і мяняецца толькі адзін раз за сеанс.

Вось ён, «Ціхі Дон». Казакі на конях з шашкамі імчацца прама на нас з белага вялікага экрана. Хочацца схавацца, закрычаць. Жанчыны войкаюць, мужчыны ўскрыкваюць. Рвуцца снарады, коні падаюць забітыя, казакі страляюць з вінтовак. Побач са мною расчырванелы Дэмух з Малаедаў ускоквае з месца, махае рукою, крычыць: «Што вы робіця, такога каня палажылі!».

Некалькі дзён пасля кіно на вёсцы толькі й гаворкі пра Грыгорыя і Аксінню. Чаго толькі не дадумвалі вострыя на слова вясковыя людзі?! То казалі: «Глянь, гэты стары, бацька Грышкін, точ-у-точ Яўхім Яўстратаў з Коханавіч... Строгі, строгі...». Альбо: «Ну Лёдзя Лаўрынава, гляньця, выкапаная Аксіння ў кіно гэтым...».

Такая цікавая асаблівасць успрымання вясковымі людзьмі мастацкіх вобразаў. Яны не лічылі іх за некіх



Кінапраектар «Украіна»

абагуленых прататыпаў, а прымалі за рэальных асобаў, як прымалі за праўду ўсё тое, што дзеецца на экране: смерць людзей, гібель коней, стрэлы, кроў, пажары... Моцна з-за гэтага ўзрушваліся, перажывалі ды накладалі ўсё убачанае і пачутае на сваё вясковае жыццё. Накладалі вобразна, з каларытным гумарам, вострым вокам... Не забыцца, колькі новых мянушак сталася на вёсках пасля мексіканскага серыялу «Богатые тоже плачут». З'явіліся свае фазэнды, арэйры, паулы, марыанны... Я прыязджаў да бацькоў і не мог насмяяцца, калі чуў: «Гляньця, Арэйра каня запрог і папёр на Міцькавічы... Чаго ён туды намыліўся?». Наш Арэйра, вядомы як Васька ці Мішка, у зашморганай ватоўцы, счарнелай за дзесяцігоддзі вязанай спартовай шапачцы і з цыгаркай у шчарбатым роце стаяў з лейцамі пасярод воза і хваляваўся не за Марыанну, а каб хутчэй закупіцца «чарнілам» у суседняй лаўцы...

...Потым «кіншчыкам» стаў Алік, высокі, светлавалосы і прыгожы хлопец з Малаедаў. Яго сям'я добра ставілася да бабы Волькі і дзеда Антося, Алік ведаў маці, таму я стаў яго сябрам і атрымаў поўнае дазваленне, каб, не баючыся, свабодна прашмыгнуць на сеанс. Падабалася круціцца з хлопцамі каля Аліка перад пачаткам. Ён згружаў з машыны апаратуру ў вялікіх чорных корабах, ладкаваў на школьным двары скрынкі-дынамікі, разблытваў скруткі правадоў. Наставала чарга «заводзіць дзвіжок», які звычайна быў «наравісты», доўга пырхаў, чмыхаў. Алік са злосцю круціў ручку шківа, нарэшце спыняўся, казаў: «Не, нічога не будзе! Трэба зліваць бензін. Мусіць, у Казлах солі сыпанулі... Дзетвара, маць іх... А, мо, й ні дзетвара, там усялякія боўтаюцца».

Мы прасілі Аліка прывозіць ваенныя фільмы, а дарослыя, асабліва жанчыны, «пра любоў». Ваенных фільмаў хапала, і мы, падшпаркі, разам з нашымі байцамі білі немцаў, ненавідзелі іх усім сваім трапяткім сэрцам. Не прапускалі, канешне, міма вушэй і размовы, што вяліся ў дарослых гуртах пасля фільмаў пра каханне. Помніцца, як з прысмакам старэйшыя

хлопцы перагаворвалі словы нямецкага афіцэра, што фліртаваў на экране з рускай дзяўчынай, смакатліва прапаноўваючы ёй: «Лена, Лена, покажи колено...». Пра жаночае калена на вёсцы нават у думках не мроілася... А цікавасць да гэтай тэмы была і ў дарослых, і ў нас, падлеткаў...

З цягам часу кіно з вёскі сышло ў клуб, які збудавалі ў цэнтры калгаса. Там паставілі новую стацыянарную апаратуру.

Алік з'ехаў, падаўся ў маракі, «кіншчыкам» стаў Валодзя, сур'ёзны і сталы мужчына, здаецца, з Каменкі за Аношкамі. Ён дазваляў мне зазірнуць у апаратную, паслухаць, як стракоча ўстаноўка, паглядзець, як запраўляецца плёнка. Гэта гонар і давер. Я ў той час пачаў дасылаць невялічкія заметкі ў нясвіжскую раённую газету «Чырвоны сцяг». Іх друкавалі. Людзі чыталі, перагаворвалі. Напісаў і пра Валодзю, што ён акуратна адносіцца да справы, карыстаецца павагай. Вядома, атрымаў ад яго «недрукаваны пропуск» ва ўсе куткі.

Клуб цягнуў к сабе магнітам. Днём працавала бібліятэка, увечары дзяўчаты і хлопцы збіраліся на рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці. Да свят рыхтаваліся канцэрты, з якімі выступалі не толькі ў сябе, а і ў суседніх калгасах. Адтуль прыязджала к нам іх самадзейнасць. Праводзіліся раённыя агляды і конкурсы самадзейных артыстаў у Нясвіжы. На ўсю рэспубліку грымела слава мужчынскага хора з Лані.

...Не так даўно з братам мы праехаліся на машыне праз Лань. Захацелася паглядзець на гэтую знакамітую вёску – якая яна



Кіно ў полі

зараз? Ціш і пустата на вуліцы, ні жывінкі не бачна ў крэпкіх, некалі адмыслова збудаваных хатах. Гібеюць без чалавека Дом культуры, крама... Дзе-нідзе стрэнецца каля плота адзінокая састарэлая постаць ды праводзіць цябе самотным і безнадзейным позіркам запалых вачэй...

...Мо найлепшым часам было ў нашым клубе, як прыехаў дырэктарам маладзенькі выпускнік культасветвучылішча Валодзя Жылінскі. Не сцерлася – дагэтуль памятаю яго прозвішча. Невялічкі ростам, худзенькі, але спрытны і падцяты, ён хутка праславіўся на ўсю акругу. У клубную самадзейнасць пацягнуліся нават пажылыя жанчыны з мужчынамі. Склаўся хор, ставіліся невялічкія гумарыстычныя спектаклі, дзяўчаты выконвалі вакальныя нумары пад баян і акардэон. Хораша спявала Фаня, малодшая дачка дзеда Сяргея. Сам Валодзя стаў завадатарам ва ўсіх напрамках. Ён умеў танчыць, круціць акрабатыку, іграць на баяне, пацяшаць людзей байкамі і камедыйнымі сцэнкамі.

Каронным яго нумарам быў выступ з так званай ідэалагічнай прыправай, якая тады лічылася неабходнай нават у калгаснай самадзейнасці. Вось як гэта выглядала. Зачыналася крыклівая і гучная замежная музыка, пад якую рассоўваліся ў бакі занавескі, на сцэну выскокваў у вастраносых туфлях, раскляшоных (вузкіх у калене і шырокіх унізе) портках, квяцістай рубашцы Валодзя. Вульгарна крыўляўся, падаў, нібыта п'яны, усхопліваўся, танчыў твіст. Танчыў майстэрскі, захапляльна. Потым зноўку недарэчна турзаўся ў такт такой жа недарэчнай музыкі. Нарэшце музычны грукат заціхаў, Валодзя падыходзіў да краю сцэны, вытрымліваў паўхвіліны і, праніклівa гледзячы некуды па-над галовамі людзей, што той Левітан, узнёсла вымаўляў:

– Товарищи иностранцы, не коверкайте наши танцы!..

Потым зноў паўхвіліны і:

– Э-эх, яблочко, да куда котишься...

Порсценька выбягаў баяніст, магутныя акорды заліхвацкага «Яблочка», марацкага скока, запаланялі сцэну. Валодзя вынырваў з-за кулісы ў паласатым нацельніку і бесказырцы, йшоў упрысядкі, адбіваў абцасамі, круціўся юлою. Пасля «Крыжачок», полька... Пачынаўся сапраўдны тлум. Людзі бясконца пляскалі ў далоні, бушавалі, не маглі супакоіцца...

Яшчэ была ў той час добрая завядзёнка, відаць, па рашэнню партыйных органаў: на сяло часта прыязджалі прафесійныя артысты з Мінска. Помніцца, як былі ўражаны людзі

выступам цыркавых майстроў. «Утрупянелі мы ажно, як гэты чалавек па вяроўцы хадзіў... Вяроўка матляецца, ну во-во ўпадзе, грукняцца аб падлогу, то дальбог разаб'ецца, думаем... Перавалнаваліся, то хай яно затане...», – спавядалася жанчынам на вуліцы наша суседка Анютка Сашыкава.

Не пераказаць і захапленне вяскоўцаў, калі наведваліся ў клуб спевакі сталічнага опернага тэатра. У памяці канцэрт Тамары Ніжнікавай і Віктара Чарнабаева. Зачаравалі яны людзей. Віктар Чарнабаеў раскошыста, з гумарам праспяваў вясёлую песню пра старога халасцяка: «Людзі кажуць жаніцеся, а я і не думаю...». І пачалося. У нашых Хадатавічах жыў каларытны, цікавы дзядзька Антось Чарнабаеў. Хадзіў сватацца да жанчыны ў суседнія Жылічы, хоць меў сваю жонку. Я ўпамінаў пра гэта раней. Дык вось, калі спявак Віктар Чарнабаеў так пацешыў людзей вясёлай песняй, то пайшла па вёсцы памоўка, што яны сваякі з нашым Антосем, бо прозвішчы падобныя; што і песня гэтая пра яго, і прыехаў знакаміты артыст к нам у клуб спецыяльна, каб дзядзьку Антося пасарамаціць...

«Ні выкруціцца Антось пасля этай песні... Прыдзяцца жаніцца... – Ну да. Жаніцца?! А Фросю куды ён дзене?», – гадалі пры стрэчах вяскоўцы.

«Во як, і смех, і грэх... Але ж, глянь, прыехаў у такую далеч эты чалавек... Няўжо радня, га!? Паглядзі ты, што робіцца...»

Песня і прозвішчы склаліся ў адно абсалютна выпадкова, аніякай радні не было ў паміне, але жарты ды смехі на гэты конт доўга яшчэ церушыліся ў вясковым калавароце.

Засвяціўся на гады наш клуб у маім сэрцы яшчэ адной памятлівай сустрэчай. Сустрэчай са знакамітымі беларускімі пісьменнікамі. Для мяне яна займела асаблівы сэнс. Я добра ведаў па-за вочы нашых пісьменнікаў, асалоджваўся іх творамі. І вось гэтыя людзі, жывыя, сядзяць перада мною, прыветліва вядуць бяседу... Здалося, што яны сышлі з неба, бо няўжо вось так, на самой справе, можна слухаць жывога Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Янку Брыля, нашага нясвіжскага паэта Паўлюка Пранузу?!

Ці ж думалася мне, маладзенькаму вясковаму хлапчуку, у той памятлівы дзень, што праз гады я не раз адкрыю для сябе гэтых цікавых і у поўным сэнсе вялікіх людзей. У школе рабселькораў пры нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» зачалося знаёмства з Паўлюком Пранузай, франтавіком,

шчырым і прыемным чалавекам. Свеціцца ў памяці стрэча, калі ён, вядомы паэт, запрасіў мяне, падшпарка, у свой сад у Нясвіжы і адорваў смачнымі яблыкамі. Не забыцца і пра размовы з Максімам Танкам у санаторыі «Нясвіж» у радзівілаўскім замку.

А колькі стромкіх пачуццяў дало чытанне аповесці Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды»! Не ведаю, ці дараваў бы я сабе, калі б не прачытаў, не спазнаў сілу і дух гэтай таленавітай кніжкі. Так выйшла, што мы аказаліся жыхарамі ў адным доме. Янка Брыль жыў у суседнім пад'ездзе. Апошнія гады адзін, без жонкі. Я часта бачыў яго з вакна – высокага, худога, у пацёртай ясёнцы і скасабочаных чаравіках. Выходзіў праводзіць дачку ці прайсціся паміж пісьменствам. Сівыя скамечаныя валасы з-пад памятай шапкі, пароспы шчаціннем твар, але і ў такім выглядзе ды ў такіх пражытых гадах, а ўсё роўна, нават здалёку, моц, парода, нязломны дух. Круты лоб, адкрыты позірк, стромкая прамая постаць... Такі, як і яго прататып Алесь Руневіч у рамане «Птушкі і гнёзды».

Вялікі пісьменнік, вялікі чалавек. Шкадую, што аніразу не падышоў, не пагаварыў. Генетычная вясковая сарамлівасць шкодзіць мне ва ўсе гады. Калі быў сакратаром ЦК камсамола Беларусі, давялося выступаць на пісьменніцкім зборы, здаецца,



Хатка ніякая, а ваканіцы і вуглы адмысловыя. І абавязкова кветачкі

з нагоды прэмій маладым літаратарам. Янка Брыль пасля запытаўся, садкуль я родам.

– З Нясвіжчыны...

– Во-во, я так і падумаў! Па мове вашай пазнаў, што вы, відаць, недзе з нашых краёў... Я ж таксама там, недалёка, на Навагрудчыне гадаваўся...



Вытыркнуліся антэны

...А ў той дзень у клубе незвычайным і ўражлівым было ўсё: іх гаворка, жарты, словы, вобразы, цеплыня, прыязнасць і, ўвогуле, некае новае стаўленне да свету – мяккае, глыбокае, інтэлігентнае... Адна сустрэча, а напружыўся, перавярнуўся розум. Цэлы рой думак пра чалавечае месца пасярод людзей, пра будучы свой выбар разварушыла яна ў галаве. Ці не на ўсё жыццё нават...

Не абыйсці ў маіх прыпамінках і прыход тэлебачання ў вясковыя хаты. Гэта самы адметны і, мо, самы сумны этап «культурнай камунікацыі». Як радыё і кіно, тэлевізар у хаце таксама стаў цудам – напачатку, калі іх было адзін-два на сяло. Але потым іх стала шмат, ці не над кожнай страхой вытыркнуліся павукі-антэны. І, можа, супярэчлівым здасца каму маё меркаванне, але тэлебачанне, гэтае вялікае дасягненне тэхнікі, паступова раз'яднала людзей на сяле. Перасталі хадзіць у клуб, бо можна паглядзець кіно дома, перасталі збірацца на вячоркі, менш заходзіць адзін да аднаго, бо праседжвалі вечары перад уласным экранам. Не стала песень ды гамонкі на вуліцах, забыліся пра польку і кракавяк у клубе, разваліўся хор, з'ехаў Валодзя Жылінскі, распалася самадзейнасць... Прыйшлі з экрана чужыя танцы і песні. Знік векавы дух, сышоў на ніц. Мы й не скмецілі...



Паэт Паўлюк Прануза з Нясвіжа

...Пішу і сам сабе задаю пытанне, нават з папрокам: ці толькі тэлевізар у тым вінаваты? І разумею, што глыбей тут



усё. Дарэмна спісваць на тэлевізар. Можа, ён у чым і вінаваты, гэта так, але дух сышоў і жыццё панікла вясковае, відаць, з іншай прычыны. Людзі разбегліся з сяла, зніклі, што тыя зорачкі з неба пад раніцу. Моладзь кінула бацькоўскія хаты ды падалася на гарадскі брук і ў чужыя абшары... Не жыць таму месцу, садкуль сыходзяць дзеці і ўнукі...

А ў маёй памяці жыве ды грэе душу «культурная камунікацыя», што была, калі быў народ. Думаю аб тым ды радуюся, што сталася яна такая ў самыя ўразлівыя падлеткавыя гады. Колькі чаго яшчэ хочацца прыпомніць! Вяселлі, радзіны, адправіны ў армію... А купаллі, танцы, маёўкі?! Усё рознае і ўсё у адным клубку – сплеценае, перавязанае, не раздзяліць – жывое жыццё народа...

Мо, калі другім разам, як казалі нашы людзі, здасца прыпомніць ды напісаць... Толькі ці будзе ён, гэты другі раз?! Ці падорыць яго нам лёс?! А прапусціць маёўку, не пакінуць пра яе ні слова?! Гэта ж які каларыт, якія фарбы, які цудоўны адбітак таго натуральнага зямнога жыцця! Не, не дарую сабе. Таму зноў бяруся за пісанне. Не адарвацца мне ад гэтай сышоўшай, але жывой, пакуль жывы сам, «культурнай камунікацыі»...



Маёўка

...Калі бярозкі аздабляліся добрым лісцем, пругка падымаліся травы, цеплыня і сонейка лагодзілі зямлю і чалавечае цела, поўнячы іх дабрынёй і спакоем, бо ўжо стрэлі Вялікдзень, пасадзілі картоплі, выгналі на пашу кароў, то недзе пад канец мая ці на самым пачатку чэрвеня знекуль сыходзіла думка, што пара рабіць маёўку. Моладзь трымціць, хоча паскакаць, патанчыць пасля халоднай зімы, пасля цяжкай работы на сотках. Дый старэйшыя не адкажуцца перадыхнуць, пасядзець вечарок у спачыне, пагаманіць, разысціся ў жартах, прыняўшы чарку-другую, як казалі, «за каўнер».

– То што? Давай у гэту нядзелю будзем рабіць! Гусакоўцы, мусіць, будуць на тым тыдні, даматканаўцы ўжэ зрабілі... А мы во цяпер – пакуль не перахапілі... Што тут думаць?!

Згода. А калі так, то трэба не падупасці, каб не кпілі пасля, не гаварылі абы-што па сёлах. Перш-наперш, музыкі: гармонік з барабанам малавата, хоць і таней абыдзецца. Але ж калі здатна рабіць, мо збяром грошы, то трэба браць хлопцаў са скрыпкай, а калі ўжо зусім фарсова, то яшчэ і з трубамі – хай суседзі пачэшуць галовы... Згода. Меркавалі, куды кінуцца за музыкамі.

– Давайця міцькаўскіх, Васіля Іванаваго з акардзіёнам, добра граюць, учатырох становяцца...



Чаканне маёўкі. Прастора застыла

– Граюць то да, хораша, але ж бяз скрыпкі...

Гаварылі яшчэ пра Шантэркаў з суседніх Малаедаў, пра Пашку Зэлікавага, які «на акардзіёне нямецкім так дае, што пяты гараць», ды зрэшты, калі ўжо рабіць з гонарам, сыходзілі-ся на адным. Трэба ехаць пад Лань, у Кіркаўшчыну, па Івана Буглая – музыка дык музыка, як возьме смык, то заходзяцца людзі: і плачуць, і скачуць...

– Нідзёшаво абыдзецца, дарагаватыя яны, па паўтара рубля будзям у шапку кідаць з чалавека, але ўрэжуць – лес загудзе...

Больш за іншых клалі грошай на музыкантаў сталыя хлопцы, пасля арміі, дзецюкі, як на іх казалі, – ім надыходзіла пара жонак займець. З дзяўчат грошай не бралі, з нас, падшпаркаў, калі хто можа, то па рублю.

– Трэба, хлопцы, ні буксаваць, а ехаць, задатак даваць, а то пяроймуць хрыпкаўскія. І пра коханаўскіх казалі, што тожа збіраюцца...

Толік Костусяў і Мішка Семачкаў, крэпкія хлопцы, забіраюць ў кішэню з шапкі сабраныя рублі, падкачваюць калёсы ў роварах, драўлянымі прышчэпкамі ад бялізны падцінаюць шырокія клёшы на правай назе, каб не заматаліся пад ланцуг, на «звёздачку», бяруцца за рулявыя крывулькі.

– Так вы шукайце самога Івана, ён у іх старшы, з ім адразу й гаварыця...

– Слухай, Мішка, ты яго хату знаяш? Не?! Дак я табе скажу! Як уедзяця ў Кіркаўшчыну, то за гэтым, што з Даматканавіч там у прымах, кірпаты такі, ты яго знаяш, дак праз дзве хаты й Буглаі. Яны там кустом з братам...

– Да знойдзям! Я садтуль лес вазіў на машыне...

Было тое недзе з раніцы ў суботу. Хлопцы прутка ціснулі на педалі, кіруючыся ў бок могілкаў, на Хрыпкава і Міцькавічы. Іх прыгнутыя спіны хутка знікалі за павароткаю. Вуліца пусцела і адразу заціналася глухою цішынёй. Бывае такое ў вясковых днях. Часцей абедам, улетку, калі людзі, на скорую руку перакусіўшы, падаюць на канапу ці на ложак, каб ухапіць хоць кароценькі спачынак паміж світанкам і вечарам. Ні курыца не закудахча, ні карова не рыкне, ні вядро не бразне – нібыта змерла ўсё...

І зараз так стала. Але ж і нятак. Было ў гэтай цішыні некае напружанне. Здавалася, што яно, як тая маланка, але нябачна і нячутна, лётае і скача па стрэхах, зрубах, сцежках, дрэвах... Можа, так віравалі ў сваім саладжавым чаканні чалавечыя памкненні, што да смагі праглі хоць якога вольнага вечарочка, хоць якога свята. Каб адзецца ў лепшае, няношанае, пабыць з людзьмі, пасмяяцца і нагаварыцца, дый проста пастаяць у спакоі, паміж гэтай несупыннай работай і гэтымі бясконцымі, падобнымі адзін на аднаго, днямі.

– То што, яшчэ ні прыехалі? – пытаўся хто-небудзь на вуліцы.

– Не, няма... Знаяш, можа і ні палучыцца. Маглі наняць з другіх сёлаў. Маёўкі ў многіх... – чулася ў адказ.

– Ранавата яшчэ ім назад. Няблізкі свет эта Кіркаўшчына... Пад абед прыедуць. Можа, палучыцца... – уступаў хто яшчэ.

Так і выходзіла. Пад абед Мішка і Толік паважна ехалі праз сяло, але ўжо з таго, хрыпкаўскага боку, прыпыняючыся то каля аднаго, то каля другога плоту, і ўсе ведалі, нават тыя, на другім канцы вёскі, куды не дашалясцелі калёсы найматых, што маёўка будзе, і што заўтра ўсім, і дзецюкам, і падшпаркам, трэба брацца за работу, «рабіць место» пад танцы.

«Место» будзе на поплаве каля канюшні. Поплаў там роўны, не вугрысты, не падзёрты кратамі. За поплавам метраў праз трыццаць наша балота. З гэтага, ад канюшні, боку купіны разыходзяцца кругам, адкрываючы чарнява-сталёвую роўнядзь вады. Яе раз-пораз бароздзяць качкі, пакідаючы вуглаватыя стромкія валкі, сутрасаюць жвавыя карасікі, падскокваючы над гладдзю і расхінаючы раўнюткія кругавыя хвалі. Надвячоркам у прыбярэжным вадзяным травастоі збяруцца кірпатыя жабы, распачнецца іх стройны, аглушальна-неабдымны канцэрт.

Але нядзельнай раніцай над балотам ціха, мо, ціўкнуць дзе-нідзе бакасы над купінай ці раптам лапатне крыламі па вадзе качка. Мы не глядзім у той бок, бо наш клопат іншы. Лёнік Верчын, Мішка Піліпаў запрагаюць каня, Шкілета, такая ў яго клічка. Яго трымае за аброць Анюсь. Анюсь называе каня па-свойму, Сяржантам. На вёсцы ведаюць чаму так. Некалі Анюсь расказваў: «Гэты конь, як сяржант-хахол у арміі, высачэзны і худы, што драбіна... Заганяў нас, ледзьве выжылі... Хахлэ ў арміі сплош сяржанты... За лычку павесіцца... Адно дай пакамандаваць...».

Тады яшчэ Толік Костусяў дабавіў: «Я ў Мінску служыў і то хахол сяржантам быў... Нашы не, самі не лезуць, ня хочуць,



Пранік. Прыспасоба, каб адбіць бялізну і разгладзіць ільняное пасля высыхання, асабліва перад маёўкай

а хахлы, праўда, лезуць у начальнікі, як вужы ў балото...».

Анюсь і сам немаленькага росту, высокі і падцяты. На галаве зацёртая пяцівуголка, у роце папяроска, якую ён перакідае на губах з боку ў бок.

– Запрагайце параконку, бо ярунду вы там возьмяце на гэты вазок. Вазком не абаб'ешся. Вунь, які круг палучаяцца..., – кажа ён хлопцам.

– Параконку хай бяруць Костусявы, а мы са Шкілетам паедзям... – гаворыць яму Лёнік.

Косцік, наш хадатаўскі конюх, крэхча, нешта бурчыць пад нос, бо трэба з поплава, куды адно пусцілі спутаных коней, забраць яшчэ двух на параконку. Але маёўка, нічога не папішаш...

– Параконку ні дам! Рыжую бярыця... Хваціць падводы...

Толік і Васька Костусевы, родныя браты, цугляць Рыжую. Яны паедуць за бярозкамі ў Мох, пад Маланчыну хату, а нам наказваюць ехаць у Высокую – там беразняк густы, вышэй за чалавека, якраз падыходзіць на абсадку. Дый лясок у Высокай калгасны, а дзе Маланка – лясгас, там Пеця стражнікам пільнуе. Таму нас, падшпаркаў, адпраўляюць туды, дзе менш нагляду, у Высокую, а Толік і Васька, яны старэйшыя, Толік нат пасля арміі, паедуць секчы на больш рысковую дзялянку.

Пара. Заскокваем у воз, хто на перадок, хто на сярэдзіну. Мішка Піліпаў бярэцца за лейцы, ляпае Шкілета па спіне, тузае левую ляйчыну, кіруючыся на самаробны масточак, зроблены з калодзежнай трубы праз глыбакаваты роў, што дзеліць сяло і канюшню. Роў вырылі гадоў дзесяць назад, у меліярацыю, велічэзным плугам два счэпленыя адзін з адным агромістыя сталёвыя трактары. Ён зарастае хмызам, зацягваецца травой і смеццем.

Перад масточкам драўляныя колы, абцягнутыя жалезнымі абручамі, дрыгацяць на каменнях, пранізліва рыпяць змучаным піскам. «Восі сухія, дзёгця німа... Гаварылі, база закрылася ў Нясвіжы...», – кажа Анюсь, папраўляючы сваю пяцівуголку на галаве і заклапочана глядзячы ўдаль, за вясковыя стрэхі. Потым кідаецца позіркам у мой бок.

– Не сядзі на жэрдцы, бо ляпняшся аб землю... Садзіся на дошкі...



Маёўка будзе каля балота

Мы крапчэй лепімся рукамі за драбіны абапал воза, тулімся адзін да аднаго спінамі. Але выехалі на засценак, на поплаў, пакаціліся цішэй і лягчэй.

Бярозкі сякуцца лёгка. Зносім, пакуем іх шырока, стогам. Калі досыць, уладкоўваемся самі зверху стажка, пасярод пахучай лістоты. Моўчкі, бо стаміліся, аглядаем з воза знаёмыя палеткі, хлявы і хаціны, што раскінуліся абшарам ад могілак да школкі-чатырохгодкі перад Сяргейкавым пляцам.

Дакалывалі да поплава. Хлопцы з сякерамі і лапатамі зачакаліся, трымцяць работы. Вярнуліся і Костусевы – Толік з Васькам. Разгружаем вазы. Бярозкі кіпамі складваем на траве. Анюсь заматаў лейцы за драбіну, ухапіў Рыжую за аброць, крыкнуў: «Ану, давай дадому!», – і пацягнуў на канюшны двор, ідучы сам папарадзе. Ужо без покрыку за імі жвава затупаў і наш Шкілет-Сяржант, высокі, худэзны і стары.

Мы ж бяромся за абсадку. Мішка Семачкаў меціць на вока шырокі круг – надалей ад балота, бліжэй да канюшні. Гэта самае роўнае месца, бо штодня, пад вечар, мы турзаемся тут у футбол, у даганялкі ці накідваемся адны на адных кучаю, барукаемся да знямогі. Але зараз – ніякіх гуляў. Па шнурку капаем ямкі, тыркаем у іх прамастоем бярозкі, падбіваем клінамі, трамбуем зямлёю з абодвух бакоў, каб не хісталіся. Коля Тамашукоў, Стась Дзюбікаў, Пашка Уладкаў пілуюць аполкі, што даў з канюшні брыгадзір Ільюк. Ён і зараз тут: «Глядзеця, каб не сцібрылі мне доскі... Будзе тады канцэрт...».

Хлопцы выбіраюць лепшыя, стукацяць малаткамі, шнуруюць нажоўкамі – робяць лаўкі; больш шырокую і доўгую – для музыкаў, і штук пяць карацейшых – для старых, што прыдуць паглядзець на відовішча. Усім нам тут, у гэтым віруючым разгалосым гурце, нек хораша. Нек да спадобы вось так, плячук к плячуку, капаць, секчы, пілаваць дошкі, забіваць цвікі, гучна перамаўляцца і рагатаць, падначваючы адзін аднаго задзірыстым слоўцам ці добрым жартам. А па-над усім – дык саладзіцца чаканнем таго, што будзе ўвечары.

Каля паловы трэцяй, а мо і ў тры гадзіны мы бяромся за граблі, падбіраем лішняе, вымятаем стружкі і секаніну і пад канец, прыпыніўшыся, гуртам аглядаем сваю работу. Не пазнаць

Дзе тыя маёўкі, дзе тая маладосць далёкіх 1950-ых…



…музыкант з Малаедаў



…маладзенькія Антон, родны матчын брат (злева) і Ванік, стрыечны (справа)

поплава! Зялёны гай вырас пасярод пустой прасторы. Кружком, тулячыся адна к адной, выстраіліся роўныя бярозкі – нібыта маладзенькія дзяўчаткі ў далікатных зялёненькіх сукенках. Акуратнымі прамежкамі прыляпіліся да іх жаўтлявыя лавачкі, збітыя са свежых аполкаў. Глядзець, не наглядзецца на такое харство! Разыходзімся. Недзе пад шэсць прыедуць музыкі. Трэба памыцца, прыбрацца ў лепшае і, як толькі грымнуць, зноў сюды, у апантаны салодкі вір.

Ды ўрэшце прысела сонейка за Фаньчыну грушу, ледзь сінеючая прастора захінулася над стрэхамі. Але на кожным надворку вушы натапыраны. Каб не прапусціць, пачуць самы першы, самы свяжуткі, не запалонены розгаласам, смехам, рыкам, піскам ці скрыпам гэты, такі доўгачаканы, такі нячасты тут, пасярод поля ды лесу, агародаў ды хлявоў, стромкі, як грымоты, і прывабны, як цёплы ліпавы мёд, музычны роскат...

Дачакаліся! Грымнулі трубы, зайшоўся акардыён, заціўкала скрыпка, вухнуў барабан, шаляснулі медзьвяным ляскатам талеркі. Ажыла прастора, загудзела галасамі, застукацела восілкамі на вёдрах, клямкамі на дзвярах, весніцамі на падпаветках.

– Йграюць, прыехалі, пашлі скарэй, выходзь... – крычаць мне хлопцы з вуліцы, на хаду зашпільваючы рубашкі і падцягваючы папружкі на новых портках. – Прыехалі, мы й не замецілі...

Вылятаю з надворка, маці наказвае ўслед: «Прыбяжы



…Ніна Мядзвецкая, стрыечная сястра маці



…Фаіна Булат, будучы доктар

хоць малака кубак выпі, як падаю карову. Ты ж ні еў з абеда». Ды якое тут малако, калі сэрца трапечацца, а ногі дрыжаць, што на вуголлях. У весніцах сутыкаюся з дзядзькамі Ванікам і Вацікам з Малаедаў, якія, прытрымліваючы ровары, абмінаюць наш плот. Абодва ў касцюмах, на галаве новыя шапкі-пяцівуголкі з невялічкімі брылікамі-казыркамі. Ванік і Вацік – дзецюкі, як кажа на іх маці, халасцякі, адным словам. Жаніцца ім пара. Таму і прыехалі на маёўку. Паставяць у нас ровары і пойдуць танчыць. Вацік заляцаецца да Ніны, дачкі Зіны Твароўскай. «Можа ў іх што звяжацца, – гаварыла маці перад маёўкаю. – Хай бы, някепская яна дзеўчына». Маці дбае пра хлопцаў, бо яны ж радня, дваюрадныя браты, ад дзядзькі Антося пайшлі, што ў Малаедах.

– Даставай, Коля, балён, налі хлопцам гарэлкі. Я парэзала мяса вэнджанага, сала. На стале стаіць. Пачастуямся... – чую я матчын голас.

Бацька паспеў пабрыцца трафейнай, у слановых тронках са свастыкай, брытвай, якую перад тым пацягнуў на папрузе, пераадзеўся ў чыстую кашулю і порткі, з прыязным тварам запрашае гасцей у хату.

– Праходзьця, хлопцы, садзецеся за стол! Зіна карову падоіць, тожа прыдзя...

Што будзе далей, я добра ведаю. Ён пойдзе за шафу, дастане з пад ложка мутнаваты балён, здыме з паліцы перад печкай гранёныя стаканы. Скажа:

– Давайце, пакуль што, па кілішку нальём ды пацягням... З дарогі трэба прамачыць... Паспеяце яшчэ на танцы...

Ванік і Вацік з ахвотай згаджаюцца на такі распарадак, нетаропка ўладкоўваюцца на шырокай лаве. Мне ж карціць скарэй вырвацца на волю. Таму, павітаўшыся ды прытармазіўшы на хвілінку, пакуль яны зайшлі ў хату, зайцам выскокваю на вуліцу.

Наш бярозавы круг трымціць і віруе. Шумлівымі чародкамі шастае малышня. Гучна перагаворваюцца музыканты, адладжваючы інструменты. Каля іх купкай сабраліся мужчыны, што чакаюць кароў з пашы, і падначваюць Косціка, конюха, які ўжо трохі прыхмялеў:

– Бяры, Косцік, Зіну Міхасяву, ды рвані гапака якога...

– Нашто гапака?! Ужэ лепш мазурыка ці абэрка... Ён жа ж у палякаў у арміі быў, то, мо, налаўчыўся там, у паноў...

– Ха! Так ён і немцаў прайшоў! У пляну бавару германскаму шыю гнуў... Мо, й па-нямецкі ўмее, то хай паскача, як немцы...

Зіна, пажылая, затурканая жанчына з сукаватай палкай у руцэ, у куфайцы, доўгай абвіслай спадніцы і гумавых ботах, якія яна не здымае ні летам, ні зімою, стаіць насуперак, на другім канцы, нічога не чуе і ніяк не ўцяміць, чаго мужчыны ўглядаюцца ў яе бок і шчэрацца ад смеху...

– Вунь, даматканаўскія ўжэ едуць! – закрычалі дзеці, і ўсе, хто стаяў ці сядзеў, павярнуліся вачыма ў бок лесу. Адтуль, абмінаючы занядбалую хацінку гэтай самай Зіны, што таропіцца вачыма то на мужчын, то на музыкаў, выкаціўся з ляснога гушчара на шырокую ўтаптаную сцежку віхлясты і жвавы ланцужок з шэрымі постацямі на роварах.

– Нашы тожа йдуць! – зноў крыкнулі з дзіцячага гурта, і твары прысутных павярнуліся ў супрацьлеглы бок, да вёскі. Поплава, што было пустым, заквяцілася каляровымі сукенкамі, рубашкамі і спінжакамі. З пад хат то купкамі, то парамі, то па аднаму з розных канцоў пацягнуліся хлопцы і дзяўчаты. Старэйшыя падыдуць пазней, як падояць кароў, уходзяцца з чыгунамі.

Музыканты адыгралі факстрот і вальс. Мне карціць стаць бліжэй да іх, услухацца, углядзецца ў іх пальцы, у іх рукі, што спараджаюць такі чароўны і таямнічы сусвет гукаў і рытмаў. Ад іх трымціць цела, некуды рвецца сэрца. Але зараз музыканты не граюць, закурылі, перамаўляюцца. Акардыяніст, скуласты, з шырокім ротам і ўсмешкай на твары, адной рукой абапёрся на акардыён, другую, з цыгарэтай, адхіснуў у бок, каб дым не віўся ў вочы, і расказвае таму, які грае на трубе.

– Карову выганяў у абед, то як смальнула капытам па загародцы, думаў разляціцца. От, каб шаснула па назе, то ўсё, капут, былі б мне сёння танцы...

– Ну да, былі б на ўсе сто!

Гэты, з трубою, яго брат, і завуць яго Адась. У яго шырокі пласкаваты твар, круглы нос. Калі глядзець спераду, то здаецца, што круглая бульбіна лепіцца пасярод скаварады. За вочы на Адася кажуць Шуфель.

– Быў бы і факстрот, і полька, – Адась загыкаў, голас яго разляцеўся ва ўсе бакі, як у глыбокім пограбе – нават цяжка зразумець, адкуль ён сыходзіць.

Барабаншчык Федзя ляпнуў меднымі талеркамі, прыспусціў галаву і, упёршыся вачыма ў нашы твары, зайшоўся ад смеху, аскаліўшы жаўтаватыя зубы. Нібы хацеў сказаць нам: бачыце, што робіцца на свеце... Усе, і музыканты, і мы побач з імі, зарагаталі.

– Яць-це пакажу зараз факстрот... Хваціць курыць! – акардыяніст шпуляе акурак за спіну, папраўляе на плячуках рамяні акардыёна. – Давай, хлопцы...

Але старэйшы і галоўны ў суполцы Іван Буглай кладзе скрыпку ў раскрыты футляр, прычыняе яго на зашчэпку, кажа:

– То, ладна, Лёнік, не спяшайся, здымай папругі... Давайце прыкусім, пакуль людзі збіраюцца, і на губы што возьмем...

Яго ахвотна падтрымліваюць, жвавенька складваюць інструменты, выходзяць за бярозавы круг. Толік Костусеў вядзе музыкаў пад загарадзь ля канюшні. Там на невялічкім услончыку, прыпёртым да жэрдак, стаяць дзве ці тры талеркі з салам і мясам, хлеб, гранёныя чаркі, прыткнутая высокай затычкай з газеты бутэлька самагонкі. Толік пакідае музыкаў адных, вяртаецца да хлопцаў. Калі музыканты перакусваюць, іх не трэба чапаць і не трэба стаяць каля іх. Такі парадак.

Людзей большае. Даматканаўскія саставілі повары ў козлы, сталі кругам, пакурваюць, пасмейваюцца між сабою. Ды неяк напружана. Мы прыглядаемся, ці прыехаў Толя Пулішаў, бо з ім на танцах мінулым разам схапіўся наш Колік Косцікаў, і ці не паб'юцца яны сёння. Але бачым, што нашы, Коля Домчын, Мішка Семачкаў, Пашка Уладкаў, Коля Тамашукоў, армейцы, аўтарытэтныя хлопцы, падыходзяць да даматканаўскіх, па-сяброўску вітаюцца. Тыя спакайнеюць, весялей аглядаюцца. З даматканаўскімі ў нашых бывае ўсялякае, але яны не такія задзірыстыя, як казлоўскія ці гусакоўскія. Тых



Коля Домчын. Лоўкі, спрытны і смелы. Фота сярэдзіны 60-х

яшчэ няма, але явяцца, не абмінуць. Ды мо абыдзецца, не паб'юцца, бо нашыя не хочуць, каб спорцілі маёўку калатухай. Яшчэ яны паваройваюцца Коліка Домчынага. Ён толькі з арміі. Моцны і лоўкі ў бойцы. Няма раўні. Гэта ведаюць. У вёсках пра ўсіх усё ведаюць. Ведаюць і пра Коліка, што ніхто з хлопцаў не здатны так круціць «сонца» на турніку, як ён. Турнік сам паставіў на надворку. Збяруцца хлопцы ў нядзелю, просяць, Коля, пакажы... «Сонца» ў той час круцілі многія пасля арміі, але Коля круціў даўжэй і спрытней. І смелы. Нікога не баіцца, нат у адзіночку...

Вярнуліся музыканты. Трохі разамлелыя, супакоеныя, дагаворваючы пачатую там, каля жэрдак, размову.

– Ты, Лёнік, так на карову не кажы: хай яна спрындзіцца ці затане...

– Эт, да! Як ты без каровы пражывеш?! Сам спрындзішся... Не, брат, абы-чаго ляпаць языком ні трэба...

– Помніш, Адась, як старая Стападурыха гаварыла? Ад слова тожа сіла йдзе... Скажаш кепска і стане кепска... Ты кажы добра, то й будзе добра...

Яны рассаджваюцца на лаве, бяруцца за інструменты. Акардыяніст фасова, з прыўзмахам, закідвае за плечы рамяні акардыёна, папраўляе густы чуб, зацягваецца скамечанай у гармонік цыгарэтай, што дастаў з пачка з вялікімі літарамі «Казбек». Пачак засоўвае ў карман за пазуху, пад фрэнч. Іван, іх старшы, не садзіцца, стаў збоку, трошкі наперадзе. Прымасціў на плечуку скрыпку, падняў смык. Рэзнулі факстрот. Дзетвара кінулася ў даганялкі між бярозкамі. Але большасць дзяўчат і хлопцаў не рашаюцца, стаяць купкамі.

– Так яны, во, так будуць таптацца, пакуль не развідніцца, – кажа на хлопцаў, падзадорваючы іх, Валя Колі Грышкавага. – Аня, пашлі з табою!

Бярэ за руку Аню Любіну, выходзяць на круг. Танчаць.

– Глянь ты, да чаго дайшло? Дзяўчаты адна з аднэю гуляюць, а гэтыя смалакуркі, во, стаяць як даўбакі!

Гэта падвыпіўшы Васіль Домчын, жанаты мужчына, але любіцель усялякіх ігрышчаў і весялун, падначвае хлопцаў. Тыя саромеюцца, ды ўсё ж раскатурхваюцца. Папіхаючы адзін другога, выходзяць у круг да Ані і Валі, разбіваюць пару.





Васіль Домчын. Маладзенькі ў арміі. Сталы мужчына. І праз гады пасля маёўкі, у 2006-м, на пахавінах нашага бацькі. Жыццё, жыццё…

– Во, пашло дзела, – смяецца задаволены Васіль. Паварочваецца да бацькі.

– Да як яны гуляюць?! Глядзі, Коля, ледзь варушацца, што слізнякі якія...

Бацька з малаедаўскімі хлопцамі-сваякамі стаіць каля жанчын на лавачцы.

– Давай пакажам ім, як гуляць нада па-настаяшчаму... Я то помню, як ты, Коля, пасля фронту даваў дразда на танцах... От, то былі хлопцы...

Васіль, што той дзяцел, круціць галавою, прыглядаецца да жанчын, бярэ за руку Зіну Толеву.

– Гляньця, сваю не бярэ, а Зіну цягне, – гавораць бабы.

Ніна Ладымярава, Васілёва жонка, стаіць збоку.

– Хай скача! Я ні хачу...

Потым дабаўляе:

– Ідзі, Зіна, ні бойся! Ты ж любіш пагуляць...

Зіна смяецца, аднекваецца звонкім пругкім голасам, але выходзіць на круг, цягне за сабою яшчэ жанок і мужчын.

– То йдзеця й вы. Паскачам трохі...

– Хлопцы, урэжця кракавяк! – крычыць Васіль музыкам. – А потым, мо, падыспань... Давайця! Рэжця! Э-э-х!

Круг большае. Танцоры становяцца радамі, насупраць адзін аднаго, бяруцца за рукі. Крок улева, крок управа, паварот, ізноў за рукі... Дабаўляюцца яшчэ пары. Праз браму-калідор, калі рукі ўверсе, праходзяцца, прытупваючы ў такт, заднія, злучаюцца ў канцы з пярэднімі, зноў бяруцца за рукі. Ланцужок пераліваецца, бурліць, даўжэе.

– Заглядзэнне адно! Як хораша гуляюць! – замілавана прамаўляюцца старэйшыя кабеты, што ўселіся пад бярозкамі на лавачках. – Мы тожа гэтак у кракавяк станавіліся пры паляках...



Пачалося…

– Усякся было... Калі маладыя былі, от гуляць хацеласё..., – пазнаю я голас Надзі Мішавай. – Але ж за работаю свету ні бачылі пры этых паляках...

– Я то ўсё думаю, як эта нашыя маткі выдержвалі эта ўсё..., – уступае ў размову цётка Ядзя. – Цэлымі днямі эта работа... Няма канца-краю... А вечарамі кудзеля ці кросны... Калі яны адно спаць лажыліся...

– Папраўдзі, Ядзя... Праява, калі яны й спалі... Не, мы так ужэ ні робім..., – гэта Наста Навічанчына. – На брыгаду пойдзеш, дак правалындаешся трохі, паляжыш дзе каля картопель, а потым скарэй за сваю работу дадому...

Размовы на лавачках цякуць няспешнымі ручаямі, а ў крузе гарачэе. Васіль Домчын не мае стомы, здаецца, салодзіцца ўсім целам. То прыгнецца, праходзячы разварот, то захіне правую руку за паясніцу і прысядзе, а леваю кружыць чарговую жанчыну, то прытопне і прыстукне хромавым ботам па зялёнай траве ў такт барабана...

– Васіль пеўнем ходзіць. От, лоўкі да танцаў...

– Але ж з ім боязно гуляць... Як зойдзе што яму ў голаву, то й мацаць начне за клубэ, альбо шчыпацца... Бабы ажно енчаць...

– Эта-то праўда... Любіць ён этыя фокусы... – чуецца з жаночай суполкі.

Потым ігралі падыспань, зноў кракавяк, рэзалі польку. Дзяўчаты, каторыя маладзейшыя, прасілі «летку-енку», якраз яна ўваходзіла ў моду. Ляпіліся рукамі адно за другое, за паясніцы, і «паравозікам» скакалі ўперад, выкідваючы ногі ўлева-управа. Не ўсе патраплялі пад музыку, некаторыя спатыкаліся. У ланцужок масціліся захмялелыя мужчыны, блазнавалі, збіваючы агульны рытм, але маладыя чапляліся зноўку за паясніцы, рабілі новую чародку абы не спыняцца, танчыць і спрытна нагамі – ўлева-управа...

– Гляньце, бабы, як хораша скача Колі Грышкаваго Валя. Дзе яна так навучылася...

– Папраўдзі, хораша скача. Эта ж нядаўна ў пяску сядзелі Ярэнка Дзюбікава з Аняю Любінай... А начупэрыліся, то ні пазнаць...

– Так і Зоня Ёганава, Маруся Каліноўская, Саша Тамашукова... От, вылюднялі дзяўчата...

– Дзеўкі ўжэ... Калі яно й зрабіласё... Бяжыць час, то ні згледзяць...

Потым вальсы. Мужчыны, што былі на вайне, прасілі «На сопках Маньчжурыі», «Кіеўскі вальс», «Амурскія волны». Некаторыя кружыліся ў хараводзе з дзецьмі ці прытопвалі, трымаючы малое на руках.



Нашы людзі: Жэнька, Васіліна Андрэева, Верка Марцінчыкава, Зінка Дзюбікава

– Гляньце, бабы, эта ж вунь Жэнька Юзіка Сцяпанчыкавага з Фенінымі дзяўчатамі ў куточку прытуліліся. А я думаю, што эта за людзі прышлі сюды ды стаяць..., – чуецца ад лавачак.

– Так і я думаю, мо, чужыя, саромеюцца... – пазнаю голас Зінкі Дзюбікавай. Каля яе на лаве Васіліна, Наста Льюкова, Люба Базылёва, Сашка Косцікава.

– Феніны дзяўчата от да толку растуць, хоць і сіраты... Каб вы ведалі, якія рабацяшчыя...

– Эта ж і ў Віціка Юзічкаваго тожа... От, дзяўчата харошыя, пашукаць...

– Фені то Юзік памагае, як Васіль памёр... Хапіла Феня гора з трыма дзецьмі...

– Юзік з мазаля жыве, а Фені помач робіць... Дзеці, бачыш, у горы, а харошыя... У другіх і багаство, а толку німа...

– Жэнька, йдзі к нам! Мы падсунямся...

Жэнька, хударлявая невысокая жанчына з адкрытым прыязным позіркам, ні то саромеючыся, ні то вінуючыся, падыходзіць з дзяўчатамі да лавачкі, уступае ў размову.

– Ні трэба адсоўвацца! Я стоячы каля вас пабуду. Скоро Валя мая прыбяжыць. Гляньця, эта ж я вас ні пазнала здаля... Думаю, мо чужыя бабы прышлі...

– Дык і мы цябе ні пазналі...

– Але якая слявяда Міцька Разалічаў! – доўжаць размову жанчыны. – Эта ж нажлуктаўся, убіўся, во, ў танцы, боўтаецца пасярод людзей. Яшчэ й прычэпіцца да каго...

Міцька і Ванька Разалічавы маюць на сяле сваю славу. Ахвочыя да гарэлкі і да бойкі. Міцька навэдзкаўся самагонкі, таўчэцца паміж парамі, наўмысна папіхае дзяўчат.



Малады Юзік Сцяпанчыкаў у ваенным

– Пашка, марськані ты этаго масляка, каб покатам паляцеў адгэтуль! – крычыць з купкі мужчын Сашык Твароўскі. – Адно танцы порціць людзям...

Пашка, здаровы і плячысты хлопец, робіць памагатым у Сяргея Тамашуковага, нашага хадатаўскага каваля. Малымі, мы прыходзілі ў кузню глядзець, як Пашка лупіць здаравенным молатам па зыркаму, што ранішняе сонца, жалезу. Зараз, пачуўшы Сашыка, ён прыпыняе танец, бярэ Міцьку адной рукою за каўнер і шпыняе на траву за бярозкамі.

– Нявадзіць дурню..., – гавораць жанчыны

– Не, з Пашкам ён ні разгуляецца... Не...

...Захіналася ноч. Я са сваімі дружкамі Толікам Багдановым і Толікам Яўгеневым скмецілі ў прыцямнелым закутку маладзенькіх дзяўчатак з суседніх Жылічаў і прымеркавалі патанчыць з імі. Але саромеліся сваіх матак, бо яны цікавалі, каго хто з нас выбраў. Яшчэ раней, як маці прышла сюды з цёткай Ядзяй, яна паклікала мяне і наказала: «Вася, вазьмі пагуляць Марыю Ваціка Багдановаго, як прыдзя. Харошая яна дзеўчына. Яны добро з намі...».

Каб не патрапіць на матчыны вочы, перабраліся на другую палову пляцоўкі, у бок канюшні, дзе даўжэй цьмяныя прасцягі ад бярозак. Толік Багданоў збегаў пад калодзеж, прынёс прыхаваную бутэльку «чарніла». Затуліўшыся пад лістоту, мы па чарзе глытаем саладкавата-гаркавае віно. Няпростая гэта справа – запрасіць дзяўчыну на танец... А запрасіць трэба, бо што гэта за жыццё хлапечае, маладое без дзявочых рук, без дзявочага стану...

Пашка Уладкаў. 60-тыя



Музыканты яшчэ раз перакусілі, прынялі па чарцы і з новым пыхам узяліся за граннё.

– Во, наяраюць! На ўсе сто! Хадатаўцы сёння ўсіх аб'ехалі з музыкаю! – чую я голас дзядзькі Ваніка.

...Мяняліся пары, круціліся абцасы, вытрынькавалі стройныя дзявочыя ножкі, завіваліся шырокія хлапечыя, на манер марацкіх, клёшы. Дзетвара шугала па бярозаваму кругу, турзалася між танцорамі. Падвыпіўшыя мужчыны з тых, што любяць «пацягнуць», валэндаліся па людзях,



Баль у хаце І.І.Ляпешкі ў Нясвіжы. 1980-1981гг.

ад адных да другіх, да знямогі праглі нешта доўга і нудна расказваць, але тыя, каму яны расказвалі, нешта расказвалі яшчэ другім, і ніхто нікога не слухаў, і гэта было для ўсіх добра... Некаторыя некуды йшлі з невыразнымі вачыма, але йшлі чамусьці абавязкова праз кола, папінаючы танцораў, збіваючы іх з пылу, потым йшлі назад, зноў праз кола і зноў папінаючы тых, хто танчыў...

Ды ніхто ні на кога не глядзеў, не спакушаўся на злосць ці крыўду, бо ўсе ведалі, што так было заўжды, што так і павінна быць у такім калавароце. Хай робіцца што робіцца, абы танчыць, танчыць да зняможлівай асалоды, радуючыся, што нарэшце тая, яго, пра якую ўжо колькі дзён думалася, кружыцца з ім



Госці ў хаце, па-вясковаму. Васіль Домчын налівае чаркі



Толік Янкаў (Гадун Анатолій Вікенцьевіч) з Аняй Любінай і Марыяй Твароўскай

у кракавяку, прытопвае ў абэраку, завіхаецца ў польцы-пацярусе... Смяецца і кладзе рукі на плечы, прыціскаецца да грудзей, казыча мяккімі ільнянымі валасамі... І ўсё вакол так добра, так спрыяльна, як ніколі не было раней. Не было пасярод плугоў і баронаў, прычэпаў і трактараў, пасярод гэтай бясконцай сялянскай кругаверці... Адзін зіхатлівы месячык зверху, суцішна і заспакоена ўглядаўся ў людскую мешаніну і, здавалася, бярог гэтыя салад-жавыя хвілі сялянскай радасці, захінаючы празрыстым срэбным пакрывалам шумлівае шматлюддзе, звонкую рознагалосіцу і гэтыя вальсы з полькамі...

...Васіль Домчын, нагуляўшыся да ўпаду, даказваў жанчынам на лавачцы, што ў кракавяку пары йдуць нятак... Круціў галавою, рукамі рассякаў паветра. Жанчыны жахаліся ад яго ў бакі, прыгаворваючы: «Эта ж саўгане яшчэ па носі, сіняк будзе... Давай адсунямся на край... Майначыць пачаў...».

Анцік Любін прысеў каля музыкаў, мармытаў то пранізліва-тонкім, то густым, булькаючым голасам неразборлівыя словы. Часам паднімаў галаву, глядзеў прытуманеным тварам на суседа хвілю-другую, потым нек квёла цягнуў рукі, стараючыся таго абняць за шыю, пацалаваць, але той шугаўся ўбок. Анцік усё роўна яго любіў, вочы вільгатнелі, па шчоках цяклі слёзы. Ён гаварыў сам з сабой, некага шкадаваў, нечаму радаваўся. Здавалася, што хоча заспяваць, бо пачынаў ці то галасіць, ці то скуголіць, а потым ціха смяяцца. Мо, успамінаў цёплыя дзянёчкі ды стрэчы. Але галава зноў падала ўніз...

Коля Яўгеневыбраў мяне ў нашым гурце, моцна ўхапіў за локці, тыцкаўся губамі да майго вуха і расчулена гаварыў: «Васька, мы ж радня... Панімаеш, га?! Радня мы, Васька...» – і заліваўся слязьмі. Я не ведаў, што мне рабіць, бо было шкада Коліка, а яшчэ больш шкада, што марнуецца час. Хацелася вырвацца, можа, прышлі з Быкова дзяўчаты і Марыя з імі, мо пайду праводзіць яе дадому...

...Пад раніцу, недзе ў палове чацвёртай, музыканты злажылі ў футляры інструменты, прывязалі іх вяроўкамі да багажнікаў, закінулі цераз рамы ногі і неўпрыкметку зніклі за чарнабаевым узгоркам. Непрытульная ціш апанавала наш бярозавы круг.



Ніна Ладымярава

Лістота на дрэўцах панікла долу, дый самі яны здаліся мне, як кінуў позіркам з-пад Міхаськавай хаты, разгубленымі, самотнымі, не падобнымі на прынаражоных дзяўчатак, як здаліся напачатку, а болей падобнымі на тых, ад якіх нечакана адракліся хлопцы падчас вясёлага танца.

Я запэцкаў новыя туфлі і порткі дарожным пылам, што стаў цяжкім і ліпкім пад раніцу, пакуль шыбаваў дадому ад жыліцкіх прысадаў, грэў змерзлыя рукі ў карманах і ўпершыню адчуў, што нясцерпна хачу спаць. Ля канюшні, мо, Алёш ці Федзя намагаліся зацягнуць асіплымі галасамі песню, збіваліся, зачыналі ізноў. Ніна Ладымярава стрэла каля весніц Васіля і павяла на ганак. У Насты Навічанчынай скробся кіпцюрамі ў дзверы кот, мяўкаў, прасіўся ў цёплую хату. На скрыжаванні каля Ільюковага плоту, трымаючыся за штакеціны, гойдаліся адзін супроць другога Коля Яўгеневіч і Стась Дзюбікаў...

...Уставала над балотам сонейка, залаціла неба і зямлю, грэла мае схаладнелыя вусны ды ласкава, нібы маці, гладзіла твар, абдымала за плечы. Зачынаўся новы дзень пасля нядзелькі. Дзе-нідзе парыпвалі дзверы, брашчалі восілкі на вёдрах, званчэлі галасы на дварах. Вёска абуджалася ад маёўкі. У хатах з самага рання, шкадуючы сваю моладзь, стараліся не гаманіць, не стукацець дзвярыма: «Хай паспіць! Пад раніцу прыцягнуўся...». Тыя ж з сямейных, у каго не было падмены, прыляглі на дзве-тры гадзіны і, турзаючы адзін аднаго, у муках падымаліся дзе-небудзь а пятай, адно, каб запаліць печ, падаіць і выгнаць у статак карову, паставіць чыгуны свіням. І зноў да ложка – хоць на хвілю, але прылажыць галаву да падушкі, бо агульная немата ў целе. Але ж уставалі: «Каб ён трэснуў гэты калхоз, нікуды ад яго ні дзецца... Во, й пасля танцаў трэба бегчы на работу... Няма спасення...».

Адно пад вечар, калі трохі агледзеліся, спачыўшы дзе-небудзь за дзвярыма на ферме ці на траўцы абапал дарогі на дзялках, так і закарцелася да сваіх, у той самы гурт, пацешыцца прыпамінкамі ды навінамі. Спачатку цішэй, а пасля і з добрым зыкам загалёкалі на вуліцы галасы ўчарашніх



Нашы людзі. Таня Карцоўская, Саша Косціка Ігнатавага, Таня Дземянова, Волька Дземянова (маці Тані), Наташа Мельнікава, Жэнька, Валя з дзецьмі. На свята, каля хаты.

танцораў і спевакоў. Больш за іншых сабралася ў гурт каля вясковай крамы, насупраць Ільюковай хаты. Напачатку хлопцы памаладзей, потым і мужчыны. На колькі хвілін далучаліся да сходкі цікаўныя кабеты, што ішлі «у магазін» ці куды да «сваіх». Салодкім ручаём лілася размова. Сакрэтаў за ўчарашні вечар у кожнага – цэлая кішэня. Дык не насіць жа іх за пазухай!

– Слухай, а ты бачыў, калі даматканаўскія паехалі? Мусіць, адзін ровар згубіў ці мо хто схаваў, бо нешто яны шукалі каля Грудзінавых ажно дадня...

– Нешто там у іх нарабіласё, праўда...

– Казлоўскія то мыліліся пабіцца з імі, але пабаяліся нашых...

– Знаяш, калі Толік Янкаў дадому прышоў?! Васілёк Міхасяў у Круглаве каровы пасвіў, бачыў, як ён ішоў... Восім ужэ стукнуло...

– Казалі, ажно пад Сноў, у Тарэйкі, за дзесяць кілометраў дзеўчыну праводзіў...

– От Пашка мадзгануў Разалічаваму па шыі, то кубарам паляцеў з круга...

– Ну, Васіль Домчын даваў, умора... У бабаў адно лыткі трасліся...

– А на масквічку паглядзеў? Валя Пецява прывяла... Але, відаць, кручаная дзеўка... Адразу ўчапілася за этаго, Колю Мікіцісянаго, што з Нарыльска прыехаў...

– Учапілася, бо грошы знюхала...

– Якія грошы!? Былі ды сплылі... Казалі, яго абабрала там некая...

– Не, ні так усё! Мне іхняя Лёдзя, расказвала, што ён яе ў Нарыльску этум знайшоў і распісаўся з ею... Усё, як паложана. Ён сам ні абманшчык, харошы хлопяц, у бацьку, у Федара ўдаўся...

– Я тожа чуў. Казалі, на вар'ятку, на васточніцу нарваўся, свет прайшла... Выцаганіла з яго грошы і збегла з ваенным недзе ў Ташкент ці што...

– Эта таўставаты такі? Я й не пазнаў яго. Ён даўно там,

на Севяры этум... Грошай нагроб мяшок... То, мо, не ўсе выцыганіла... Мо й на масквічку хваціць...

– Па-праўдзі, добро выглядае, сыты, як пан некалі... Але, глянь, кажуць нервянны стаў...

– Станеш нервянным, столькі грошай страціць...

– А бачылі, як Грыб падлімоніўся і пафарсіць рашыў?! На матацыкле прыехаў ноч'ю, то чуць эту сваю «Панонію» у роў не ўвэдзгаў...

– Мусіць, пажэняцца Васька Костусяў з Іраю, бо гуляць ён яе цягнуў увесь вечар...

– Глянь, казлоўскіх дзяўчат некія хлопцы ўжэ пад самы канец, адкуль яны адно ўзяліся, на мацыклеты пасаджалі і памчалі дадому...

– Ведаеш ты, дадому... Можа, й не дадому...

– Можа, й у стог дзе заехалі...

– Хлопцы, дзе б эта піва найці?! Смажыць у роце! Як у немца пад Масквою...

– Давайце з'ездзім у Казлы ці ў Даматканавічы. Казалі, што туды сёння прывязлі піва і гарэлку...

– Льюк ідзе!

Брыгадзір Ільюк, трохі расперазаны і пакамечаны тварам, перабіў размову.

– Знаяце што, хлопцы! Трэба, пака туды-сюды, разабраць плашчадку. Бярыце коняй. Бярозкі пад могілкі ў кучу. Хай сохнуць, на Купало спалім. Сядзэнні тожа разабраць. Доскі ў канюшню...

Ён прымоўк. Рукою ўхапіўся за казырок пяцівуголкі, перасунуў шапку на патыліцу. Пацёр шыю, глянуў, зморшчыўшы лоб, некуды за стрэхі і змякчэлым голасам дабавіў:

– Паедуць за півам, хай возьмуць бутэльку белай. Што тое піва, мне дак «Маскоўская» лепей... Цесць прыедзе нанач... Вазьмеця, во, грошы...

Дастаў з кішэні змятыя рублі, пачаў разгладжваць.

– Глянь, траячка завалялася! Хваціць і на калбасу. Нітку кракаўскай у Казлах Зіна Сідарава хай паложыць...

...Так і зрабілася. Так і пайшло далей тое жыццё.

Спіс, якога няма





Спіс, якога няма

Брат мой Анатоль, зведаўшы пра маю працу над кніжкай, знайшоў у сельсавеце спіс жыхароў нашых Хадатавічаў у найлепшы для іх час – калі сяло поўнілася людзьмі, звінела дзіцячым гоманам, гудзела на палетках. Парадаваўся я такому падарунку. Хацелася назваць пайменна нашых хадатаўскіх людзей, нікога не забыцца, успомніць. Пашанцавала, што такі спіс знайшоўся. Пэўнюся надзеяй, што не толькі я, а многія, хто пайшоў па свеце ад хадатаўскага кораня, са шчырай цікавасцю будуць углядацца ў прозвішчы ды імёны сваіх родных, суседзяў, аднавяскоўцаў. Адным словам, у карані свае, у мінулыя свае вытокі.

Спіс сам па сабе – нічога вызначальнага, пералік прозвішчаў. Ды прозвішчаў няблага – 321 чалавек! Гэта на перыяд 1961-1963 гадоў – часы майго маленства. Цікава, як у розныя гістарычныя часы мянялася колькасць вясковых людзей. Па перапісах: 1792 год, уладанне Радзівілаў – 29 сем'яў; 1796 г. – 159 жыхароў; 1814 г. – 88; 1897 г. – 164; 1909 г. – 211; 1921 г. – 277. Дарэчы, найбольш мнагалюдна было ў вёсцы перад вайной. У 1940 годзе ў Хадатавічах пражывалі 324 жыхары! У 2001-м – 161 чалавек. Зараз – пералічыш на пальцах...

Углядаюся ў гэты, маіх гадоў, спіс. Ён для мяне жывы, ачалавечаны. Нашы, хадатаўскія людзі, апошні вянок з гістарычных вытокаў, суквецце пакаленняў, што аралі, сеялі, расцілі дзяцей, цягнучы нітачкі ў будучыню. Чытаць спіс – тое ж самае, што глядзець бясконцую і захапляльную кінастужку. За кожным прозвішчам – твар, вобраз, голас, сядзіба, стрэчы і размовы...

То быў росквіт, кульмінацыя ладу жыцця, што віўся стагоддзямі, мяняўся формамі, але непарушна стаяў на зямлі, на хлебе і чалавеку. Гэта яго Эверэст, найвышэйшая адмецына. Мінуліся вясковыя вёсны, як мінаюцца яны ва ўсяго, што дзеецца на свеце. Але ў гэта так не хочацца верыць! Няўжо страцім сваю адметнасць, сваю беларускасць, сваю гаючую, як крынічанька, непаўторную і цудоўную мову?! Не павінна такое здарыцца аніколі!

Я не хачу займацца папрокамі ці шукаць вінаватых у тым, што вымірaюць вёскі, а з імі вымірaюць наша ідэнтычнасць, наша этнічная культура. Гісторыя пляцецца сваімі варункамі, перамены – закон жыцця. Шкада толькі, што перамены пры ўсёй

іх гістарычнай вартасці нясуць у сабе і непараўнальныя страты.

Чытаю афіцыйныя прозвішчы ў спісе і разумею, што не ўспрымаю іх у такім выглядзе; напружана думаю хвілю ці болей, а хто ж гэта, якая, чыя сям'я. Бо акрамя прозвішчаў, што існавалі ў пашпартах ды метрыках, у кожнага былі прозвішчы неафіцыйныя, вясковыя. Як і ў іншых беларускіх сёлах, людзей у нас надзялялі сваімі вызначэннямі, якія склаліся няведама калі і цягнуцца здаўна. Гэтыя неафіцыйныя імёны і прозвішчы стаялі наперадзе афіцыйных. Здаралася, што людзі жылі па суседству, а не ведалі ды і не цікавіліся асабліва прозвішчам афіцыйным, бо ў пашпартах «фамілii» як бы для ўлады, а не для штодзённага ўжытку.

Калі прыгледзецца, то высновай неафіцыйнага прозвішча часцей за што іншае станавіліся імёны альбо прозвішчы старэйшын роду, гаспадароў. На сям'ю казалі Грудзінавы, Семачкавы, Дземяновы, Юзічкавы, Базылёвы, бо некалі гаспадарамі былі Антон Грудзіна, Семка, Дзямян, Юзік, Базыль. Але цвёрдых правіл не існавала. Маімі вясковымі прыяцелямі былі Толік Багданоў і Толя Яўгеневў, ды абодва мелі прозвішча Гадун. Васька Юзічкаў і Валя Сцяпанчыкава былі Лабажэвічы; Таня Дземянова – Твароўская; Ліля Мельнікава – Чычко; Маланка была Каўшэль Малання Саверaўна. На суседку казалі Аня Любіна. Хоць быў і бацька – Аляксандр, але ж яна была Любіна, па маці. Чаму так, можна толькі здагадвацца. Мо па старшынству ў сям'і ішла такая градацыя, а мо як прасцей выказаць словам.

Так ці інакш, але засталася доўгая памяць, хоць самі тыя гаспадары ды старэйшыны роду даўно сышлі, а дагэтуль жывуць іх імёны – засталіся, як таблічка, фірменны знак, брэнд па-сучаснаму, з яго добрым ці кепскім набыткам. Таму і на спісе, каб занава не думаць, хто ж гэта такі, я дзе-нідзе надпісаў супроць некаторых вясковыя брэнды-прозвішчы.

Цікава яшчэ сказаць у дадатак, што так званыя вясковыя сямейныя брэнды часам перамяжаліся з мянушкамі, гумарнымі ці трохі іранічнымі позвамі. За Васілём Домчыным прыклеілася неафіцыйнае імя Гаранція, бо, перакуліўшы чарку, ён у размовах часта паўтараў гэтае слова. «Праўда, Коля, гаранцію табе даю...» Анціка Любінага называлі Гагарын. Падвыпіўшы, хоць здаралася гэта нячаста, ён шугаўся па сяле, нешта мармытаў сабе пад нос неразборлівае, нібы той касманаўт. Івана Акуліка, даўно памёр, трактарыст, празвалі Ёган. Ён любіў

выгаварыцца пад чаркай: я не Іван, я па-нямецку Йоган. Так і пацягнулася. Жонку Маню празвалі Ёганча. На дачку Іру казалі Іра Ёганава. На нашых казалі Другаўцовы. Коля Другаўцоў – на бацьку. Хоць у пашпарце пісалася Драгавец. За маткаю, я ўжо ўпамінаў, спачатку прыклеілася мянушка Смалянка, Зіна Смалянчына, бо яна прыйшла ў Хадатавічы з малаедаўскіх Смалякоў. Потым, праўда, Смалянка адклеілася. Казалі ўжо Зіна Колява, Другаўцоваго Колі Зіна.

Брэнд, мянушка – як партыйная ці службовая характарыстыка, толькі ў іншай, цікавай ды скарочанай, форме. Яны тонка характарызавалі звычкі, асаблівасці чалавека, яго характар, унутраны стан. Толькі дзіву даешся, наколькі ўдала ды змястоўна, з гумарам ці тонкай іроніяй вызначалі вяскоўцы сваімі брэндамі адзін аднаго. Вострыя на вока ды спраўныя на слова былі нашы людзі. Ад прыроды, ад зямлі ішоў іх талент, вілася вытанчонасць адчуванняў, кемлівасць розуму. У яднанні з зямлёй і сіла наша чалавечая, і моц, і стойкасць. Адарвешся ад яе, ад роднай зямелькі, дык і страціш сілу, згубіш сэнс жыцця. Можа, многае і знойдзеш у чужым краі, ды ці задаволішся, засалодзішся?!

Вось ён перада мною – «Спіс жыхароў в. Хадатавічы (1961-1963 гг.)». Усе мы тут разам, і жывыя і мёртвыя. І з прозвішчамі, і з мянушкамі. Дык то толькі адзін спіс з многіх. А колькіх няма: прапалі, згарэлі, растварыліся ў гісторыі. А з імі прапалі людзі, згубіліся цэлыя пакаленні. Добра, што захаваўся хоць гэты. Штораз я звяртаюся да яго позіркам ці бяру ў рукі, нешта шукаю: чый год народзін, нечае імя па бацьку, прозвішча тых з радні, што жылі пад ардзянскім бокам альбо каля Сцяпанчыкавых, ці каля Івана Пятрушчыкавага...

Гадуны, Твароўскія, Каўшалі, Лабажэвічы, Чычко, Чэўжыкі, Грудзіны, Чарнабаі, Грыбы, Акулікі, Гесі, Дзюбы, Драгаўцы, Каліноўскія, Іванчын, Мархель, Бельчык, Яніслаўскі, Салата, Трафімчык, Мазур... Нашы хадатаўскія сем'і і людзі. Найболей дык Гадуноў, Твароўскіх, Каўшалёў, Лабажэвічаў... З даўніны яны тут, з самых пачаткаў. Ды растрэслася, развязалася гэтая векавая суполка, як венік у неахайнага гаспадара. Расцерушыліся па свеце этнічныя хадатаўскія беларусы. Толькі і згледзіш каго з малечай звязкі падчас Радуніцы на могілках. Хто здаля, а хто зблізку едуць, каб спыніцца, пастаяць перад бацькоўскімі магіламі. А згледзіш, то не заўсёды і пазнаеш, бо іншымі мы становімся на чужой старонцы. І гаворым не так, і радуемся іначай.

Вось такі ён, спіс. Нібыта ёсць, а нібыта і няма яго...

СПИСОК
жителей д. Ходатовичи (1961-1963г.г.)

1. Окулик Алекс. Казимирович 1911
2. Окулик Нина Васильевна 1922
3. -/-/- Георгий Алекс 1943
4. -/-/ Тамара Алекс. 1947
5. -/-/- Александр Алекс. 1955
6. Тваровская Зинаида Иосиф. 1914
7. -/-/- Анна Васильевна 1939
8. -/-/- Василий Вас. 1942
9. Тваровская Ксения Фом. 1898
10. -/-/- Нина Конст. 1938
11. Годун Александр Яковлевич 1901
12. -/-/ Анна Павловна 1907
13. -/-/- Василий Алекс. 1934
14. -/-/ Мария Алекс. 1938
15. -/-/- Николай Алекс. 1943
16. -/-/- Михаил Алекс. 1949
17. Годун София Юльяновна 1911
18. -/-/- Мария Петровна 1941
19. -/-/- Александра Петровна 1945
20. -/-/- Нина Петровна 1947
21. -/-/- Анатолий Петрович 1950
22. -/-/- Василий Павлович 1917
23. Дюба Зинаида Сергеевна 1912
24. -/-/- Николай Альбертович 1942
25. Ковшель Анна Андреевна 1897
26. -/-/- София Ивановна 1926
27. Ковшель Александр Иванович 1919
28. -/-/- Надежда Васильевна 1923
29. -/-/- Татьяна Александровна 1944
30. -/-/- Александра Александровна 1948
31. Парейко Михаил Петрович 1939
32. -/-/- Ольга Трофимовна 1939
33. -/-/- Валентина Михайловна 1961
34. Творовский Владимир Романович 1909
35. -/-/- Зинаида Дементьевна 1908
36. -/-/- Павел Владимирович 1939
37. Лобажевич Кирилл Степанович 1893
38. -/-/- Серафима Лукьяновна 1898
39. Лобажевич Иосиф Васильевич 1901
40. -/-/- Анна Ивановна 1919
41. -/-/- Александра Иосиф. 1934
42. -/-/- Виктор Иосиф. 1936
43. -/-/- Василий Иосиф 1951
44. Лобажевич Вера Васильевна 1919
45. Гадун Нина Ивановна 1920
46. Гадун Петр Иванович 1912
47. -/-/ Феофания Юльян. 1944
48. -/-/- Александра Петровна 1950
49. -/-/- Татьяна Алекс. 1928
50. -/-/ Валентин Петрович 1962
51. -/-/- Анатолий Петрович 1962
52. Чичко Василий Иванович 1908
53. -/-/- Наталья Александр 1908
54. -/-/- Нина Васильевна 1941
55. -/-/- Лилия Васильевна 1945
56. Тваровский Демьян Антон. 1903
57. -/-/- Ольга Алексеевна 1908
58. -/-/- Мария Демьян. 1936
59. -/-/- Татьяна Демьян. 1943
60. Гадун Наталия Викентьевна 1924
61. -/-/- Анна Алексеевна 1885
62. Ковшель Анна Ильинична 1923
63. -/-/- Алексей Михайлович 1944
64. Гадун Анна Иосифовна 1909
65. -/-/- Татьяна Константиновна 1931
66. -/-/- Анатолий Констант. 1941
67. -/-/- Василий Констант. 1947
68 Гадун Мария Антоновна 1887
69 -/-/- София Михайловна 1920
70 Лобажевич Мария Михайловна 1922
71 -/-/- Лидия Петровна 1943
72. Гадун Григорий Николаевич 1902
73. -/-/- Ольга Ильинична 1908
74. -/-/- Виктор Григорьевич 1941
75. -/-/- Владимир Григ. 1943
76. Гадун Наталья Юльяновна 1933
77. -/-/- Антон Юльянович 1936
78. -/-/- Виктория Демьяновна 1883
79. Гадун Янина Федоровна 1925
80. Гадун Антон Федорович 1913
81. -/-/- Ольга Михайловна 1917
82. -/-/- Кристина Антоновна 1945
83. -/-/- Валентина Антоновна 1949
84. Чевжик Константин Антонович 1904
85. -/-/- Вера Ивановна 1914
86. -/-/- Иван Констант. 1938
87. -/-/- Николай Констант. 1940
88. -/-/- Софья Констант. 1948
89. -/-/- Алина Констант. 1953
90. Гадун Иван Иосифович 1898
91. -/-/- Василиса Федоровна 1911
92. -/-/- Ольга Ивановна 1944
93. -/-/- Нина Ивановна 1950
94. -/-/- Галина Ивановна 1951
95. -/-/-/ Виктор Иванович 1955
96. Гадун Вера Николаевна 1914
97. -/-/- Леонид Андреевич 1945
98. Гадун Николай Иванович 1884
99. -/-/- Мария Андреевна 1891
100. Гадун Владимир Иванович 1896
101. -/-/- Мария Яковлевна 1903
102. -/-/- Николай Владимирович 1938
103. -/-/- Феофания Васильевна 1940
104. -/-/- Ирина Николаевна 1960
105. Трафимчик Семен Лукьянович 1910
106. -/-/- Мария Адамовна 1911
107. -/-/- Владимир Семенович 1933
108. -/-/- Николай Семенович 1937
109. Драговец Адам Антонович 1879
110. Грудина Агафия Николаевна 1889
111. Гадун Петр Иосифович 1903
112. -/-/- Наталия Леонтьевна 1903
113. Лабожевич Василий Антонович 1920
114. -/-/- Феофания Никодимовна 1930
115. -/-/- Ирина Васильевна 1950
116. -/-/- Леонида Васильевна 1952
117. -/-/- Василий Васильевич 1954
118. Лабожевич Иосиф Антонович 1920
119. -/-/- Евгения Алексеевна 1920
120. -/-/- Мария Иосифовна 1944
121. -/-/- Татьяна Иосифовна 1947
122. -/-/- Валентина Иосифовна 1956
123. Гадун Лидия Николаевна 1912
124. -/-/- Гадун Ирина Алекс. 1939
125. -/-/- Наталья Александровна 1942
126. Лобажевич Виктор Иосифович 1936
127. -/-/- Александра Викторовна 1962

128. Гадун Александр Иванович 1880
129. -/-/- Елена Николаевна 1892
130. Гадун Александра Степановна 1907
131. -/-/- Татьяна Максимовна 1943
132. Гадун Семен Юльянович 100
133. -/-/- Анна Игнатьевна 1907
134. -/-/- Татьяна Семеновна 1929
135. -/-/- надежда Семеновна 1933
136. -/-/- Любовь Семеновна 1936
137. -/-/- Михаил Семенович 141
138. Гадун Сергей Антонович 1911
139. -/-/- Александра Васильевна 1908
140. -/-/- Николай Сергеевич 1936
141. -/-/- Мария Сергеевна 1946
142. Драговец Сергей Алексеевич 1905
143. Гадун Мария Иосифовна 1906
144. Драговец Феофания Сергеевна 1942
145. Тваровский Федор Никодимович 1930
146. -/-/- Наталия Сергеевна 1931
147. -/-/- София Федоровна 1957
148. Тваровская Анна Никодимовна 1925
149. Гадун Викентий Иванович 1919
150. -/-/- Нина Лаврентьевна 1907
151. -/-/- Виктор Викентьевич 1939
152. -/-/- Галина Викентьевна 1941
153. -/-/- Анатолий Викентьевич 1949
154. Драчан Ольга Ивановна 1916
155. -/-/- Татьяна Антоновна 1942
156. -/-/- Валентина Петровна 1948
157. Иванчин Петр Кириллович 1913
158. Гадун Мария Семеновна 1888
159. -/-/- Анастасия Алекс. 1925
160. Ковшель Антон Андреевич 1890

161. -/-/- Мария Федоровна 1893
162. Ковшель Николай Антонович 1922
163. Ковшель Василий Антонович 1919
164. -/-/- Татьяна Юльяновна 1917
165. Лобажевич Зинаида Алексеевна 1904
166. Лабожевич Михаил Алексеевич 1899
167. -/-/- Евгения Федоровна 1904
168. -/-/- Наталия Михайловна 1926
169. -/-/- Александра Михайловна 1929
170. -/-/- Василий Михайлович 1933
171. -/-/- Нина Михайловна 1946
172. Ковшель Иван Лукьянович 1881
173. -/-/- Молания Савельевна 1900
174. -/-/- Мария Ивановна 1944
175. Лабожевич Николай Васильевич 1881
176. -/-/- София Николаевна 1927
177. -/-/- Татьяна Николаевна 1930
178. Лабожевич Сергей Николаевич 1918
179. -/-/- Нина Андреевна 1918
180. -/-/- Лидия Сергеевна 1941
181. -/-/- Николай Сергеевич 1943
182. -/-/- Александра Сергеевна 1947
183. Гадун Николай Михайлович 1916
184. -/-/- Надежда Антоновна 1922
185. -/-/- Николай Николаевич 1948
186. Гадун Антон Викентьевич 1920
187. -/-/- Александра Никодимовна 1923
188. -/-/- Николай Антонович 1954
189. Гадун Илья Александрович 1930
190. -/-/- София Ивановна 1939
191. -/-/- Михаил Ильич 1962
192. Лабожевич Александр Николаевич 1892
193. -/-/- Александра Николаевна 1892

194. -/-/- Екатерина Александровна 1945
195. Ковшель Феофания Васильевна 1922
196. Мархель Казимир Викентьевич 1920
197. -/-/- Лилия Николаевна 1944
198. Окулик Иван Казимирович 1920
199. -/-/- Мария Александровна 1918
200. -/-/- София Ивановна 1948
201. -/-/- Ирина Ивановна 1949
202. -/-/- Николай Иванович 1952
203. Ковшель Домна Николаевна 1915
204. -/-/- Ростислав Антонович 1940
205. -/-/- Николай Антонович 1943
206. -/-/- Анна Николаевна 1944
207. -/-/- Тамара Николаевна 1962
208. Тваровский Антон Иванович 1923
209. -/-/- Мария Антоновна 1925
210. -/-/- Мария Антоновна 1947
211. -/-/- Лариса Антоновна 1951
212. Драговец Николай Васильевич 1925
213. -/-/- Зинаида Антоновна 1930
214. -/-/- Василий Николаевич 1952
215. -/-/- Анатолий Николаевич 1958
216. Ковшель Александр Васильевич 1905
217. -/-/- Любовь Максимовна 1900
218 -/-/- Михаил Александрович 1939
219. -/-/- Анна Александровна 1947
220. Тваровский Александр Петрович 1931
221. -/-/- Анна Иосифовна 1934
222. -/-/- Владимир Александрович 1958
223. -/-/- Ирина Александровна 1963
224. Чернобай Надежда Васильевна 1908
225. -/-/- Мария Антоновна 1931
226. -/-/- Николай Антонович 1936

227. -/-/- Нина Антоновна 1941
228. -/-/- Александра Антоновна 1939
229. -/-/- Татьяна Александровна 1944
230. Чернобай Антон Павлович 1908
231. Ярославская Ефросиния Сидоровна 1914
232. Чернобай Анатолий Антонович 1948
233. -/-/- Василий Антонович 1933
234. -/-/-/- Валентина Федоровна 1936
235. -/-/- Нина Васильевна 1959
236. -/-/- Виктор Васильевич 1962
237. Гадун Николай Андреевич 1927
238. -/-/- Ядвига Васильевна 1929
239. -/-/- Василий Николаевич 1953
240. -/-/- Владимир Николаевич 1956
241. Ковшель Михаил Васильевич 1922
242. -/-/- Надежда Ивановна 1925
243. -/-/- Михаил Михайлович 1948
244. -/-/- Николай Михайлович 1957
245. Гадун Мария Яковлевна 1887
246. -/-/- Василина Андреевна 1925
247. Драговец Евгений Николаевич 1902
248. Гриб Александр Иванович 1930
249. -/-/- Мария Михайловна 1935
250. -/-/- Михаил Александрович 1957
251. -/-/- София Александровна 1960
252. Гадун Николай Григорьевич 1929
253. -/-/- Нина Ивановна 1930
254. -/-/- Валентина Николаевна 1949
255. -/-/- Ирина Николаевна 1955
256. Гадун Иван Сельвестрович 1894
257. -/-/- Анна Васильевна 1895
258. -/-/- Ольга Сельвестровна 1899
259. -/-/- Мария Ивановна 1938

260. Гадун Василий Нригорьевич 1931
261. -/-/- Мария Максимовна 1933
262. -/-/- Тамара Васильевна 1956
263. -/-/- Анна Васильевна 1958
264. -/-/- Анатолий Васильевич 1960
265. Гадун Антон Максимович 1930
266. -/-/- Зинаида Иосифовна 1938
267. -/-/- Василий Антонович 1958
268. -/-/- Тамара Антоновна 1959
269. Тваровский Николай Никодимович 1933
270. -/-/- Лилия Ивановна 1937
271. -/-/- Владимир Николаевич 1961
272. Салата Николай Павлович 1936
273. -/-/- Леонида Лаврентьевна 1936
274. -/-/- Анатолий Николаевич 1958
275. -/-/- Павел Николаевич 1960
276. Янишлавский Иосиф Иосифович 1906
277. -/-/- Станислава Иосифовна 1945
278. Грудина Иван Антонович 1895
279. -/-/- Ольга Александровна 1903
280. Бельчик Антон Васильевич 1928
281. -/-/- София Ивановна 1931
282. Мазур Иван Адамович 1918
283. -/-/- Екатерина Васильевна 1918
284. -/-/- Иван Иванович 1947
285. -/-/- Екатерина Ивановна 1950
286. -/-/- Дмитрий Иванович 1956
287. Дюба Иван Феликсович 1915
288. -/-/- Наталия Александровна 1910
289. -/-/- Станислав Иванович 1940
290. -/-/- Ирина Ивановна 1946

291. Гадун Николай Евгеньевич 1910
292. -/-/- Надежда Александровна 1918
293. -/-/- Николай Николаевич 1947
294. -/-/- Анатолий Николаевич 1950
295. -/-/- Тамара Николаевна 1952
296 -/-/- Ульяна Андреевна 1881
297. Тваровская Анна Никитьевна 1906
298. -/-/- Владимир Петрович 1936
299. -/-/- Николай Петрович 1945
300. Калиновская Евгения Викентьевна 1912
301. Гесь Филипп Игнатьевич 1919
302. Калиновский Виктор Иванович 1942
303. -/-/- Василий Филиппович 1954
304. -/-/- Михаил Филиппович 1951
305 Гесь Константин Игнатьевич 1913
306. -/-/-/- Александра Андреевна 1911
307. -/-/- Николай Константинович 1946
308. Гесь Сергей Игнатьевич 1911
309. -/-/- Наталия Ильинична 1910
310. -/-/- Ядвига Сергеевна 1939
311. -/-/- Валентина Сергеевна 1944
312. Гесь Надежда Игнатьевна 1915
313. -/-/- Андрей Николаевич 1902
314. Гесь Лаврентий Игнатьевич 1903
315. -/-/- Елена Яковлевна 1905
316. -/-/- Константин Лаврентьевич 1940
317. Дреко Астап Степанович 1934
318. -/-/- Елена Семеновна 1932
319. -/-/- Владимир Степанович 1959
320. -/-/- Степан Степанович 1960
321. -/-/- Татьяна Степановна 1962





Замест кропкі

Замест кропкі

Здаецца, надышла пара ставіць кропку. На гады расцягнулася мая праца над гэтым споведам. Пачынаў першыя занатоўкі ў студзені 2010-га, а наблізіўся да кропкі во, у чэрвені 2016-га. Былі перапынкі, многае перапісвалася, перадумвалася, дапаўнялася. Былі пошукі дакументаў, перабор архіваў, фотаздымкаў. Усё, што знайшлося, лягло ў плынь задуманага. І, вядома, былі справы. А калі іх няма?! Трэба жыць і зарабляць на жыццё – ёсць сям'я, дзеці, ёсць патрэбы.

Калі пісаліся першыя абзацы, была жывая маці. І ўвогуле было шмат чаго не так, як зараз. Быў жывы стрыечны брат Вася ў Аношках, бегалі ў дзяўчатах родныя пляменніцы Волька і Таццяна, былі жывымі дзядзька Антон у Снове, мае школьныя таварышы Васька Костусеў, Васька Юзічкаў на вёсцы...

Брат Вася ў Аношках нечакана памёр, не дажыў нават да 59-ці. Яго чуллівае сэрца было вельмі безабаронным, вельмі спераживалася за ўсё, што страчаецца нам па жыцці. Смерць брата Васі, добрага чалавека і свядомага беларуса, стала для мяне вялікай стратай.

У пляменніцы Волькі зараз бегае па кватэры маленькі Жэнік, сынок, а ў калысцы гушкаецца дзяўчынка-немаўлятка. Пайшла замуж і другая пляменніца Таццяна, гадуе маленькую дачушку. Мая старэйшая дачка Марыя скончыла Дармштацкі тэхнічны ўніверсітэт у Германіі, атрымала дыплом інфарматыка; малодшая Надзея – Беларускі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт у Мінску...

Неяк нечакана захінаюцца мае думкі на гэтым месцы. Прыпамінаюцца матчыны словы пра мяне малога.

– От, сынок, як я цябе ражала, пачаліся схваткі ўжэ, так бацька запрог кабылу і павёз мяне ў Нясвіж. А зіма ўжэ пачыналася, хмурно, холадно. Думаю сама сабе, як жа ж хоць даехаць да бальніцы ды нарадзіць гэтае сваё дзіцятка...

– А ўжэ калі ты радзіўся, так купалі цябе ў ночвах, матка мяне вучыла. Памыям цябе і ў палатно льняное закутаем, я пакармлю – ты і спіш... Малака ў мяне было столькі, што сцэджвала з грудзей, і мы цябе ў ім купалі. Не ведала,

што рабіць з гэтым малаком. Потым грудзі ўсхапіліся, на аперацыю вазіў бацька ў Сноў...

– А пойдзем жыта жаць, так дзяцей паложым у цянёк пад капу на коўдзерко. Я ў бінцік хлеба свайго мяккага закручу, як у соску, дам табе. Мяне матка навучыла. Ты яго смокчаш і спіш сабе так салодко пад снапамі. А я сярпом махаю, увіхаюся, бо жаць трэба скарэй, пакуль пагода стаіць, а з цябе вачэй не звожу...



Дзве маці. Зінаіда Антонаўна і Валянціна Цімафееўна

Так яны, нашы маткі, людзі з бядноты, нас нараджалі, лашчылі ды атойвалі. Закутвалі ў палатно, купалі ў малацэ, бераглі для нас смачную скарыначку хлеба, бралі за руку і вялі за сабою на жніво, у поле, на лён ці буракі, на калгасную дзялку, каб памагалі, вучыліся працы, не выраслі гультаямі, абібокамі. Нічога яны не чулі ні пра Дармштат і Франкфурт, не бачылі Маскву і Мінск. Адно што падхапіўшыся ўначы ці ранкам, гледзячы на нас, салодка спячых у ложку пад коўдрам, маліліся, каб спаслаў Божа дзіцяці вывучыцца, выбіцца ў людзі.

Як жа хацелася мне ў тыя малечыя гады ў сваіх патаемных мроях, каб спраўдзіліся гэтыя бацькоўскія надзеі, каб паступіць, вывучыцца, «выбіцца ў людзі». Стараўся ў школе, «трудзіўся» да знямогі з маткаю на дзялках, пасвіў кароў, капаў і садзіў бульбу, палоў грады, касіў траву, растрасаў гной на полі, рэзаў сечку на сячкарні, круцячы да задыху друкам вялікае сталёвае кола, ездзіў на падводах за сенам і саломаю, цягаў з маці на насілках цяжкія, набрынялыя вадою тарпавіны з балотнай багны...

Ды ці я адзін?! Чаго мы толькі не ўмелі, сялянскія дзеці?! З малых гадоў упраўляліся і з трактарам, і з канём. І ў навуках не былі апошнімі, прыкметнымі людзьмі станавіліся ў сваіх кірунках.

З таго часу, як купала мяне маці ў малацэ, мінула больш за шэсцьдзясят вёснаў. Другім стаў свет, па-другому сталі жыць людзі. Азірнешся назад, аб нечым пашкадуеш, а нечаму парадуешся, аблашчышся цеплынёй ад таго, што гэта было, сталася на тваім шляху.

Мо найбольшая зараз уцеха на маім сэрцы дык ад таго, што пасаладзіліся маці і бацька пры жыцці нашымі з братам

добрымі справамі, нашымі сем'ямі, пазабавіліся, пагушкалі ўнучак на руках. Не было шчаслівейшых людзей на зямлі, чым яны, калі я здаў на пяцёркі ўсе чатыры ўступныя экзамены на факультэт журналістыкі і быў залічаны студэнтам першага курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна. Адзіны момант такога бацькоўскага шчасця, калі ён надараецца на тваіх вачах, пэўніць душу перакананнем, што нешта і ты зрабіў на сваім вяку, што мо праз цябе Божа адзначыў бацьку і маці за іх прыстойна пражытае цяжкае жыццё.

Потым радаваліся бацька і маці майму «чырвонаму дыплому» пры сканчэнні ўніверсітэта; ганарыліся тым, што на чацвёртым курсе ўдастоіўся гонару прадстаўляць студэнцкую моладзь Беларусі на Дзясятым сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне. Бацька не адыходзіў ад тэлевізара, хоць лета на двары і работы процьма. Глядзеў рэпартажы з Берліна. Некалькі разоў збачыў мяне падчас інтэрв'ю ды шматлікіх стасункаў. Які то быў уздым у нашай вясковай хацінцы!

Пэўніліся лагодай бацькоўскія сэрцы за мае высокія пасады на камсамольскай і партыйнай рабоце, бо не так проста вясковаму хлопцу стаць першым сакратаром сталічнага Мінскага гарадскога камітэта камсамола, сакратаром ЦК камсамола Беларусі, узначаліць партыйны камітэт буйнога прадпрыемства – станкабудаўнічага вытворчага аб'яднання імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Добрыя весткі ляцелі ў бацькоўскі дом з Масквы, дзе вучыўся ў аспірантуры ў Акадэміі пры ЦК КПСС, абараніў дысертацыю па сацыялогіі. І пасля, калі быў прызначаны галоўным рэдактарам усесаюзнага часопіса для моладзі «Парус». Калі па запрашэнню старшыні беларускага ўрада Вячаслава Кебіча стварыў і ўзначаліў Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязей Савета Міністраў у няпростыя часы «перастройкі», калі быў прызначаны Урадавым сакратаром. Ізноў углядаліся бацькі ў тэлеэкран, у фотаздымкі, на якіх сын вітаецца з Папай Рымскім Іаанам Паўлам Другім, кіраўніком Кітая Цзян Цзе-Мінам, прэзідэнтам Польшчы Лехам Валенсай... І гонар бацькам за высокія пасады сына, ды не меней смутку і непаразумення. Бо пачалася валтузня паміж палітычнымі групоўкамі, паклёпы на ўрад, брудныя выдумкі на кіруючых работнікаў, на мяне таксама. Непрыгожая і непрыемная сталася сітуацыя.



Рым. Ватыкан. Поціск рукі Папы Рымскага Іаана Паўла Другога. Красавік 1992 г.

«Кідай ты, сынок, гэтую грызню... Пажыві сабе спакойненька хоць трохі... А то ўсё ў цябе дзяла і дзяла... Няма канца краю...»

Як бы ні завівалася праз гады мая дарога, і на вострых вуглах яе, і на спакойнай роўнай прамаце заўжды бацькі былі перад вачыма. Іх вобразы, як Божы знак, перасцерагалі мяне ад жыццёвых спакусаў, сарамацілі за грэшныя дзеі, дапамагалі ў роспачы. Божы Знак... Божы Абярог...

...Гэтай восенню ў празрысты і сцішаны нядзельны дзень паехалі з братам з Нясвіжа на нашы Хадатавічы кругам, не па сноўскай шашы, а праз Альбу на Аліхоўку, Карцэвічы, далей на Хрыпкава, Міцькавічы, куды маладым бацька патрапляў на танцы. Завярнулі на Быхаўшчыну – адкуль баба Наташа. Ад былой вялікай вёскі некалькі сапрэлых пабудоў, здзічэлыя прысады, зарослая бізунамі сажалка.

– Давай паедзем на Жылічы па старой даматканаўскай дарозе, – папрасіў я брата.

Затрымцелася мне праехацца тым бокам, што зачынаецца перад Даматканавічамі, адразу за нашым лесам. Абмінулі старыя хаты, пабудовы цёткі Гэлі на самым вуголлі, і во – узлесак удалечыні, той самы «маяк» (драўляная трынога, пастаўленая некалі ваеннымі) і раўнюткае поле...

– Помніш, можа, тут цэркаў была, во, на гэтым полі. Нашы сюды хадзілі, хадатаўскія... – і брат павёў рукою ў бок лесу.



Дом шлюбу ў Мінску. Праз пяць хвілін – муж і жонка. Верасень 1977 г.

– Аб чым ты кажаш?! Як не помніць! Раскажу табе...

...Не пазнаць наш надворак пасля панурай і шэрай разводзіцы. Адно замілаванне тут ласкавым майскім дзяньком! Ярка-зялёная травічка аздобіла сцежачкі, лашчацца ў бялюткім кіпені слівы і вішні, гаючы ветрык абдзімае вусны... І бясконцае, да неабсяжнасці, распаволенае сонейка вакол – залаціць хату, сад, вуліцу, грэе рукі і скроні.

Яшчэ ўзнёсла на сэрцы ад таго, што сёння «Юр'я», свята, і я першы раз пайду ў «цэркаў», туды, за лес, у даматкanаўскі бок. Маці сказала, і я, засынаючы, колькі дзён шчымліва думаю, як тое будзе – у «цэркві».

– Прыбірайся, Васька, у новы касцюмчык, чаравічкі новыя абувай, – кажа яна, падцінаючы валасы на галаве.

Я ўзіраюся і мо першы раз бачу маму не такой, як штодня, а памаладзелай, прыгожай, па-святочнаму адзетай. Сцежачкай ад хлява выходзім на поплаў перад нашым балотам. Там жанчыны, цётка Ядзя. Па кладачцы цераз канаву к лесу.

На даматканаўскім боку, як перайшлі гаёўку, адразу прыкмячаю ўводдалі выбітак крыжа над срабрыстым купалам пасярод роўнага зялёнага поплава. Што крок, то бліжэй – чуем шоргат, бачым рух, чалавечы вір, вазкі з сенам, ровары ў кучы. Людзі хораша адзеты, вітаюцца, гамоняць, але неяк спагадліва, сцішана, няспешна. Потым, ужо ў самой царкве, чакаючы прычасця, я знямела азіраю іконы, слухаю бацюшку і стаю роўненька, як салдацік, выпрастаўшы ручкі абапал ног. Адчуваю ўсім целам Божы дух, Божы позірк. Даступаемся да стала са срэбным посудам. Бацюшка нешта кажа нам, падносіць да маіх вуснаў на срэбнай лыжачцы некалькі запаветных, доўгачаканых



Дзеці, Маша і Надзея, у маленстве. 1993 г. Фота М. Амельчанкі

кропелек салодкага, на жыццё памятлівага, царкоўнага віна...

– Але ж глянь – адно поле, перадзёртае спранжыноўкамі, – адрываючыся ад свайго здранцвення, кажу я брату. – Як і не было тут ніколі тае цэркаўкі...

...Але ж была. І тыя крыжы над купалам, і срэбная лыжачка, і салодкія кроплі на вуснах адбіліся ў малечай галаве некім большым, дасціпнейшым поглядам на свет. З вузельчыка, што спавіўся падчас той вандроўкі, саткалася ў сэрцы мая пажыццёвая далікатнасць перад небам і зямлёй, і толькі мне зразумелая, бясконцая самапакутная раздумлівасць аб чалавечым месцы ў гэтым жыцці, аб адказнасці перад Богам. Аб адказнасці за ўсё і перад усімі.



Маша падчас вяселля. Ліпень 2001 г.

І перад бацькамі найперш. Бо яны, бацькі, ёсць Божы вобраз на зямлі для кожнага. Заўжды, і ў маладыя, і ў сталыя гады, хацелася парадаваць бацькоў адзнакамі, поспехамі, дасягненнямі. Не тое, што гэта было самамэтай – аб тым не думалася. Хутчэй было ў падсвядомасці, запаведана па крыві, па клетачках, што перадаліся з глыбінь. З таго самага покуця ў нашай хацінцы, дзе ікона Божай мацеры. Усе нашыя гады Божая маці ўглядалася ў нашу сям'ю...



Выпускны баль у Надзеі. Чэрвень 2007 г.



Ля бацькоў. З братам

...Цікалі часікі, мяняліся пасады, захапляла работа, радавалі новыя шляхі, сустрэчы, уражанні. Абапал са службовай вілася другая, мо, болей важная для бацькоў з іх разуменнем свету дарога. У жніўні 1977 года ў прыадкрытыя веснічкі запрасіў я на бацькоўскі надворак прыгожую і стройную дзяўчыну-весялуху. Выпускніца Беларускай кансерваторыі, дыхтоўная піяністка, на той час аспірантка філасофскага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава, Галя, мая будучая жонка. Бацькі трохі сумеліся: ці панаравіцца ёй тут, на сяле – у нас і хата слабенькая, і ў хаце не так хораша...

Але адшугала здатным балем, дні на тры, гулкае вяселле. Зрабілася сям'я. Блізкім і дарагім чалавекам стала для ўсіх Галіна маці, Валянціна Цімафееўна Камінская. Вядомы спецыяліст па гінекалогіі, прафесар медыцынскага інстытута ў Мінску. А яшчэ прыстойнейшы чалавек. Сімвал свайго пакутнага і самаахвярнага пакалення. Маладзенькай засталася сіратой. Бацьку, рабочага млынкамбіната, арыштавалі ў 1937-м за нібыта польскі шпіянаж. Расстралялі праз тры месяцы пасля арышту па прыгавору «тройкі». Асірацелая дзяўчынка праз цяжкія намаганні скончыла школу, паступіла ў медыцынскі інстытут у Уфе. А тут вайна. Пасля кароткіх курсаў атрымала прызначэнне ваенным доктарам у зенітна-артылерыйскі полк. Паспытала ўсе «чары» франтавога ліха: бамбёжкі, акопы, смерці на руках, перад вачыма.

Нягледзячы на розніцу ў «тытулах», паміж цешчай і бацькамі склаліся прыгожыя і шчырыя адносіны. «Цімафееўну» прызналі на вёсцы.

«Гляньце, яна ж і пагаворыць, і раскажа. Гаваркая, як і нашы бабы, хоць прафесар...» – казалі жанчыны.

Стала нас болей. Нарадзіліся нашы з Галяй дзяўчаткі. Выпала бацьку і маці шчасце ўзяць на рукі першую, а пасля і другую ўнучку. К таму часу і брат скончыў Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі, вярнуўся ў калгас інжынерам. Ажаніўся, займеў сваю сям'ю, дзетак.

Здаецца, усё гэта, аб чым зараз пішу, перад вачыма. Здаецца, во, нядаўна ж яшчэ з малымі вазіліся, у садок, у школу хадзілі... Не згледзелі, як прабегла. Пасля рыхтавалі святочныя ўборы старэйшай Машы на выпускны баль, ганарыліся яе залатым медалём за гімназію, яе матэматычным трыумфам ва ўніверсітэце, яе прыгожым вяселлем з Максімам...

Адно за адным бяжыць, ды завіваецца, як тыя сцежачкі ды дарожанькі. Колькі ўжо гадоў, як Галя, жонка, працуе дацэнтам ў Акадэміі музыкі. Узнагароджана знакам Міністэрства культуры рэспублікі за плённую педагагічную дзейнасць.

Адшумеў і раскошысты выпускны баль у малодшай Надзеі ў Палацы Рэспублікі... Яшчэ імгненне – і ўніверсітэт за спіною...

Здаецца, і блізка ўсё, што ў мінулым, а як кінеш позіркам на сябе ў люстэрка, так і сумеешся – як жа далёка тое было! Тое, калі каціласа шчаслівым колам па зямлі спакойная бацькоўская дарога, калі ўсе яшчэ былі разам, калі страчаліся ды гасцявалі.

А пасярод думак маіх ды гучаць матчыны словы:

– От, сынок, якая, глянь, абідная эта жызнь! Трудзіліся, рабілі, як дурныя, усе годы... І глянь, не скмецілі, як набегла эта старасць. Дзеці паднялісь, унучкі, во, падраслі, пенсію даюць нам старым, адно парадавацца ды пажыць, а тут паміраць трэба...

– Не шкадуйце адно сабе нічога, бо праляціць эта жызнь, ні скмеціце... Адзявайцеся хораша, у госці хадзіце да людзей, дабра ўсім жалайце... Лішняе, што есьцяка, то лепей аддайце каму, бо валяцца будзе ды замінаць... Не патрэбна чалавеку лішняе, адно мяшае яно яму...

– Нядзелькаю дык лепей у цэркаў пайсці, чым работу рабіць. Не пераробіш эту работу...

– Дзякуйце Богу за дзетак і ўнукаў ды радуйцеся...



P. S. Так і прыпомніліся матчыны словы, зайшліся з радасці ды абняліся з Галяй, калі затрымцеў тэлефон і даляцела вясціначка з нямецкага Франкфурта, што 11 чэрвеня 2016 года сынок нарадзіўся ў нашай Машы, здаровенькі ды ўдаленькі. Павесялелі нашыя дні, унучак наш Мірасладзік сонечным праменьчыкам азалаціў іх. Чакаем стрэчы з ім, паглядзець на яго хочацца, на руках пагушкаць… Вырасце, возьме ў рукі гэтую кніжку, даведаецца пра род свой, пра зямлю нашу беларускую, асалодзіцца матчынай мовай. Значыць, жыць яна будзе, мова наша, не памрэ… Ды колькі яшчэ ўсяго наперадзе!..

Малітва





Дзякуй табе, Божа, што здалося мне жыць на зямлі.
Ступаць нагамі па цёплай раллі і па халоднай расе, асалоджвацца пахамі сенакосу і водарам лесу, бачыць кветкі і дождж, радугу і бялёсыя хмаркі, квітнеючы сад і птушак у небе, чуць ветрык на твары і лашчыцца пад сонейкам, любавацца хвалямі жыта ў полі і зялёным лугам пасля веснавога павадку…

Дзякуй табе, Божа, што я нарадзіўся ў вёсачцы-калысачцы, прыгожай і ўтульнай, пасярод поля і лесу, луга і балотца, могілак і дарог;
на той самай зямельцы, дзе вякамі шчыравалі мае родныя, хадзілі сцежачкамі продкі, ліцвіны-беларусы…

Дзякуй табе, Божа, за любых бацькоў, што паднялі нас з братам на ногі, навучылі дабру і спачуванню, прыстойнасці і павазе, старанню і вытрымцы ў жыцці. З працы рук сваіх здабывалі яны, як і ўвесь наш род, свой хлеб на зямлі. Змагаліся за жыццё, не паддаліся спакусам, светлымі вобразамі засталіся ў памяці дзяцей і ўнукаў, блізкіх і далёкіх людзей…

Дзякуй табе, Божа, за тое, што давялося палашчыцца на руках у дзеда і бабулі, знацца з раднёю, мець вялікую гісторыю на сваёй зямлі. Дзякуй за вытокі, за Бацькаўшчыну, за зберажоныя магілы продкаў. Да іх нікне душа, ад іх жывіцца сілаю сэрца,
а розум вучыцца цярпенню і нескаронасці перад нядолямі…

Дзякуй табе, Божа, за сям'ю, за маю жонку і дзяцей, за брата, за тое, што так многа добрых, шчырых і прыстойных людзей стрэлася мне на жыццёвай дарозе. Што такімі ўзнёслымі, цікавымі і захапляльнымі былі мае гады ў вучобе і працы, у сустрэчах і здабытках…

Яшчэ прашу цябе, Божа: даруй мне грахі мае. Даруй тыя дзеі, калі быў неразумны і зняважыў, мо, калі чалавека ці дрэва, птушку ці пчолку. Даруй маю недасведчанасць і слабасць, няўдумлівасць і паспешнасць. Даруй маё зазнайства і ганарлівасць, што здараліся ў жыцці. І ніспашлі мне, Божа, супакой за тое, што даруеш мяне…

Дзякуй табе, Божа, за ўсё…

Дадатак

Архіўныя спраўкі

Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі»

вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск
тэл. (017) 286 75 23, тэл./факс 286 75 22
Р/р 3632923160066 ГАПЕРУ ААТ «Белінвестбанк»,
код 739, УНП 100074551

Департамент по архивам и делопроизводству
Министерства юстиции Республики Беларусь

Государственное учреждение
«Национальный исторический архив Беларуси»

ул. Кропоткина, 55, 220002, г. Минск
тел. (017) 286 75 23, тел./факс 286 75 22
Р/с 3632923160066 ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк»,
код 739, УНП 100074551

10.06.2008 № 04-06/120

На № _____ ад _____

Драговцу В.Н.
пр. Машерова, 78-22
г. Минск

АРХИВНАЯ СПРАВКА
(о наличии сведений)

В архивных фондах «Князья Радзивиллы», «Минская казенная палата», «Минская духовная консистория», «Минское губернское по крестьянским делам присутствие» имеются следующие сведения, относящиеся к генеалогии лиц по фамилии Друговец (Драговец), проживавших в деревне Ходатовичи Слуцкого уезда Минской губернии, за 1697-1933 гг.:

Инвентарь имений Рибовской волости Клецкой ординации кн. Радзивилла, составленный при отдаче ее в аренду новогрудскому подсудку Яну Вольскому, 16 апреля 1697 г., где значится:
Дер. Ходатовичи, 24 волоки.
№2 Ян Друговец, ¼ приемной волоки.
№8 Ян Друговец москаль, 1 сын, 1 вол, 1 конь, ¼ приемной волоки.
№10 Ясько Друговец, 2 вола, 1 конь, есть дворный вол, ½ тяглой волоки, ¼ приемной волоки.

В это время в имение входили следующие деревни: Жиличи, Ходатовичи, Севково, Задворье, Лысков. Из 24 волок, принадлежавших крестьянам деревни Ходатовичи, считалось тяглых 8 ½ (с них крестьяне платили чинш по 1 злотому 20 грошей с волоки), приемных 9 (по 10 злотых с волоки), боярских 3 (по 20 злотых с волоки), с вольных (1 ½) и пустых (2) волок чинш не брали. Всего с деревни поступало чинша 164 зл. 5 гр., дзякла – 8 ½ бочек жита, 8 ½ бочек овса, 8 ½ гусей, 17 куриц, 85 яиц.

В деревне числилось 20 дымов (дворов), сыновей у крестьян – 19, волов - 32, коней – 14, волов дворных (т.е. принадлежащих помещику) – 6, потратили волов (?) – 3.

Повинности в этой деревне такие же, как в Жиличах. Крестьяне платили чинш на праздник Святого Мартина. Дзякло измеряли бочками виленской меры. Мужчины и женщины должны были работать (с инвентарем как прикажут) зимой и летом с волоки по 6 дней в неделю, с

2

½ волоки – по 3 дня, с 1/3 волоки - по 2 дня, с ¼ волоки одну неделю - по 2 дня, другую – по 1 дню. Как крестьяне с женщинами, так и бояре должны нести стражу еженедельно по очереди во дворе Рибовском, также и ночную охрану по очереди во всей волости. Один раз в год с каждого дыма должны отправлять в Вильню подводу на расстояние до 10 миль (или более, если необходимо). Также мед половичный должен поставляться во двор как от крестьян, так и от бояр (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1499, лл. 5-6.

Реестр уплаты дзякла, дани и чинша по имениям Грибовской волости Клецкой ординации кн. Радзивилла за 1797 г., где сказано:
Деревня Ходатовичи.
Амель Друговец, количество земли: ¾ волоки, дзякло: 2 осьмины жита и 2 осьмины овса, дань: ¼ гуся, 1 курица, 5 яиц, 1 моток, чинш: 5 злотых 25 грошей.
Степан Друговец, количество земли: 1 волока, размер дзякла и дани такие же, чинш: 8 зл. 12 гр. (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1606, лл. 7об.-8.

Ревизская сказка крестьян д. Ходатовичи Слуцкого уезда Минской губернии помещика тайного советника и кавалера кн. Иосифа Мартинова сына кн. Радзивилла за 1811 г., где сказано:

№11 Майсей Пилипов Гадун, в 1795 – 10*, в 1811 – 40		
его брат Андрей	20*	31
его сын Тодор	новорожд.	4
Иван Амельянов Друговя	40, в 1804 умер	
Племянник Миколай Антонов	30, переведен 1801 года	

* Так в документе.

№12 Степан Михайлов Другавец	60, в 1803 умер	
его сын Игнат	30	46
Игнатовы дети: Роман	новорожд.	16
Томаш	новорожд.	12

Ф. 333, оп. 9, д. 264, л. 1166об.

Описание крестьянского скота по имениям Грибовской волости Клецкой ординации кн. Радзивиллов. Составлено 5 июля 1812 г., где сказано:

Дер. Ходатовичи.
№10 Игнат Другавец, рабочие кони: в хозяйстве 1, молодые кони: 1,

3

рабочие волы: в хозяйстве 1, в обозе российском 2, яловник: 1 корова, 1 телка, 1 бык, овцы: старых 7, молодых 8, свиньи – 2 (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1606, л. 41.

Ревизская сказка крестьян д. Ходатовичи им. Грибовщизна Слуцкого у. помещика кн. Людвига Михайлова сына Радзивилла, ордината клецкого и давид-городокского, командора стволовицкого и кавалера, за 1816 г., где сказано:

№12 Игнат Степанов Драговец, в 1811 – 46, в 1814 г. умер		
его сыновья: 1) Роман	16, в 1816 – 21	
2) Томаш	12	17
Романа жена Олеся		20
Романа сестра Федора		9

Ф. 333, оп. 9, д. 237, лл. 43об.-44.

Ревизская сказка им. Грибовщизна Слуцкого у. помещиков кн. Радзивиллов, ординатов клецких, находившаяся с 1811 г. в закладном владении ранее каштеляна Обуховича, а в настоящее время его наследницы Софии Михайловой, урожденной Обухович, графини Чапской, за 1834 г., где сказано:

№9 Роман Игнатов Друговец, в 1816 – 21, в 1834 – 39		
его жена Олеся		38
его сын Иван	новорожд.	17 ½
его дочь Антоля		2
Томаш Игнатов Друговец	17	35
Томаша жена Леося		35

Ф. 333, оп. 9, д. 575, лл. 122об.-123.

Инвентарь фольварка Грибовщизна Клецкой ординации кн. Радзивилла за 1835 г., где сказано:

Имение Рибовщизна, а сейчас Грибовщизна, расположено в Клецкой парафии Слуцкого повета Минской губернии вблизи частного тракта, идущего из Клецка в Малев, Своятичи и Снов. Почвы хорошие: черноземные и глеистые, сенокосы мурожные. Камней на вапну и глины на кирпич нет.

Имение находилось на расстоянии от губернского города Минска – 17 миль, от поветового города Слуцка – 10, от торгового Клецка – 1, от Несвижа, Ляхович и имения Радзивиллмонты – 2, от пристани на реке Неман в Столпцах – 6, от Мошуковской пущи – 4 мили.

Указанный фольварок граничил с востока с имением Минкевичи помещика Обуховича (дер. Сцепуржицы), с юга – с им. Новоселки Обуховича, с запада – с татарской околицей Орды, околицей Якшицы и

4

дер. Домотковичи, ранее принадлежавшей монахам доминиканам, а ныне – казне, с севера – с землями дер. Ходатовичи и Севково, принадлежащими к этому же фольварку. О границах до настоящего времени никаких споров не было.

В состав имения в это время входили собственно помещичий фольварок Грибовщина, в котором были следующие постройки: дом управляющего, салка, два свирана, обора, колодец, два гумна, и деревни: Якшицы (36 дворов, 107 муж. и 102 жен. душ, из них работников - 78), Ходатовичи (18 дворов, 46 муж. и 49 жен., работников – 40), Севково (5 дворов, 8 муж. 7 жен., работников – 8).

В деревне Ходатовичи была корчма, деревянная, старая, требующая переделки, размером 22 ½ длины и 8 ½ ширины, драницами крытая, крыша соломенная, внутри станция с коморой, в ней печь крестовая глиняная, окон с мелким стеклом 4, пола нет, рядом гумно и хлев, тоже деревянные, старые. Арендатор – Лейба Овсеевич.

Дер. Ходатовичи.

№9, пляц тяглый №8, Роман Игнатов Друговец, 45 лет, жена Алена 42, сын Янко 17, дочь Антоля 4, брат Томаш 42, жена Левося 40.

Имущество крестьян: хата добрая, гумно и хлев старые, в семействе 3 муж. и 4 жен., работников – 4, скот: 1 конь рабочий, 2 вола собственных, 1 корова, 1 бык, 5 овец, 1 свинья, количество земли: оседлой - ½ волоки, приемной – ½ волоки. Повинности – 3 дня в неделю, гвалты: пахота – 6 дней, пешие – 32 дня, дзякло – 2 осьмины жита и 2 осьмины овса, плата за медицинский комитет – 22 ½ коп., чинш – 1 руб. 26 коп. серебром.

В деревне проживали крестьяне по фамилиям Пильневич, Кипець, Полуянчик (десятник), Ковшель, Сидор, Гадун, Лабазевич, Найдзен, Тарабура, Лосовский и др. Войтом деревни был Степан Николаевич Агеевич.

Общие повинности крестьян имения: еженедельно каждый хозяин должен отработать 3 дня с чем двор прикажет, ежегодно гвалтов в год 6 с упряжью, одна дорога (поездка) в Минск и одна в Слуцк, шарварков для владельца – 4, а по указанию администрации (ремонт построек, дорог, гребель, мостов и т.д.) – 8, на огородах по очереди весной по 4 дня каждый хозяин отработать должен, дзякла как в инвентаре написано, жито и овес осенью отдать должны, чинш оплачивать как в инвентаре указано осенью (в день Св. Мартина). Еженедельно стражу нести по очереди (4 раза в год) и ночную охрану по очереди, также платить государственные подати, в т.ч. за сдачу рекрут и сельский магазин содержать под заведыванием владельца.

Также в пользу владельца вносились: мед от пчел крестьянских, нити неводовые (фунтовый моток) с каждого двора, за давнишнюю дань (гуси, куры, яйца и др.) и на медицинский комитет по 22 ½ коп. Войты от повинностей и оплаты чинша, а сотники и десятники от одного дня

5

работы в неделю согласно давних обычаев освобождаются. На облавы пешие либо с возами по приказу владельца или администрации выходить должны (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1512, лл. 2-3об., 8об.-9, 9об.-10, 10об.-11.

Инвентарь фольварка Грибовщизна Клецкой ординации кн. Радзивилла за 1841 г., где указаны следующие сведения:
Дер. Ходатовичи.
№7, пляц тяглый №6, Роман Игнатов Друговец, 51 год, жена Алеся 40, сын Янко 23, жена Зося 20, дочь Антоля 10 калека.
Имущество крестьян: хата новая, скот: 1 конь рабочий, 2 вола собственных, 3 овцы, количество земли: оседлой - ½ волоки, приемной – ½ волоки. В семействе: 2 муж. и 3 жен., 3 работника, повинности – 3 дня в неделю, гвалты: пахота – 6 дней, пешие – 36 дней, дзякло – 2 осьмины жита и 2 осьмины овса, плата за медицинский комитет – 22 ½ коп., чинш – 1 руб. 26 коп. серебром (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1519, лл. 9об.-10.

№9, пляц тяглый №8, Томаш Игнатов Друговец, 48 лет, жена Леося 48, кутинк Марцин Гадун 25, жена Виктося 18.
Имущество крестьян: хата старая, гумно доброе, хлев старый, в семействе 2 муж. и 2 жен., работников – 3, скот: 1 конь рабочий, 3 овцы, количество земли: оседлой - ½ волоки, приемной – ½ волоки. Повинности – 3 дня в неделю, гвалты: пахота – 6 дней, пешие – 36 дней, дзякло – 2 осьмины жита и 2 осьмины овса, плата за медицинский комитет – 22 ½ коп., чинш – 1 руб. 26 коп. серебром (перевод с польск. яз.).
Ф. 694, оп. 2, д. 1519, лл. 10об.-11.

Ревизская сказка крестьян д. Ходатовичи Слуцкого у., принадлежавшей к им. Грибовщизна Слуцкого у. помещика генерал-майора свиты Его Императорского Величества кн. Льва Людвигова Радзивилла за 1850 г., где сказано:

№7 Иван Романов Друговец, с №9 сей деревни, в 1850 –		34
его жена Зося Иванова		35
его сыновья: Андрей	в 1834 – новорожд.	7
Антон	новорожд.	5
Гришко Степанов Годун	29, в 1844 умер	
Андрей Филиппов Годун	54, в 1836 умер	
№9 Томаш Игнатов Друговец	35	51
его жена Леося Демянова		51
его сын Базыль	новорожд.	13

6

его брат Роман 39, в 1845 умер
Романа сын Иван в 1834 – 17 ½, переведен в №7 сей деревни
Ф. 333, оп. 9, д. 484, лл. 482об.-483.

Ревизская сказка крестьян д. Ходатовичи Слуцкого у., принадлежавшей к им. Грибовщизна Клецкой ординации помещика генерал-адъютанта Его Императорского Величества кн. Льва Людвигова Радзивилла, за 1858 г., где сказано:
По 9-й ревизии №7, по 10-ревизии №4
Янко Романов Друговец, в 1850 – 34, в 1858 – 41
Его жена Зося Иванова 42
Его дочь Аудоця 4
Его сыновья: 1) Андрей 7 14
2) Антось 5 12
Томаш Игнатов Друговец, переведен по 9 переписи с №9, в 1858 – 58
Его жена Леося Демянова 58
Его сын Базыль 20

По 9-й ревизии №9
Томаш Игнатов Друговец, в 1850 – 51, переведены в №4
Его сын Базыль 13
Ф. 333, оп. 9, д. 1053, лл. 143об.-144.

Уставная грамота им. Грибовщизна Слуцкого у., принадлежавшего помещику кн. Льву Людвигову Радзивиллу, за 1862 г. К грамоте прилагается именной список крестьян имения, где сказано:
Д. Ходатовичи.
№3 Янко Романов Друговец, количество земли: усадебной 1 разряда 600 саж., пахотной 8 дес. 1800 саж., сенокосной 1 дес., итого 10 дес. Повинности инвентарные годовые: пригонов мужских – 162 дней в год, сгонов мужских 10 и женских 10 в год, ежегодный оброк 48 ½ коп.; назначаемые временно по положению: издельные летние – мужских с упряжью 88 и пеших 5, женских 6, издельные зимние – мужских с упряжью 57 и пеших 4, женских 3 дня. Денежные повинности: 48 ½ коп. в год. Постоянный оброк – 24 руб. 9 ½ коп.
№5 Томаш Игнатов Драговец, количество земли и размер повинностей такие же.
Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, лл. 80об.-81.

Протокол дополнительной поверочной комиссии Слуцкого у. о поверке размера денежных повинностей крестьян селений Якшицы и Ходатовичи, принадлежавших к им. Грибовщизна помещика кн. Льва Людвигова Радзивилла от 31 августа 1864 г., где сказано:

7

«Затем опрошены крестьяне, помещик и добросовестные:

1. О качестве земли крестьяне обеих деревень показали, что почва их земель глеистая, сеют всякий хлеб, высевая бочку … в дер. Ходатовичах собирают с 6 осьмин 12 коп, т.е. 4 зерна… сенокосы болотные и на каждый двор накашивают по два воза, т.е. 80 пудов сена. Добросовестные подтвердили показание крестьян, а поверенный от помещика показал, что почва земли в обеих деревнях чернозем, требующий удобрения, крестьяне сеют пшеницу, рожь, овес, ячмень, гречу, в среднем урожае в обеих деревнях в 7 зерен. Сенокосы обеих деревень луговые, и каждый хозяин накашивает … в дер. Ходатовичах по 8 возов (считая 20 пудов в возе).

2. Относительно причин, могущих служить к повышению или понижению разряда участков, крестьяне и добросовестные отозвались, что … в дер. Ходатовичах чрезполосностей нет, часть сенокоса в пяти верстах от деревни, на полях есть много кустов, некоторые крестьяне отозвались, что есть песчаные места. Выгон в дер. Ходатовичах есть, но его мало и он покрыт кустарником. Поверенный от помещика показал, что … при деревне Ходатовичах есть выгон в исключительном пользовании крестьян и кроме того последние пасут свой скот по зарослям и лесам помещичьим, прилегающим к деревне.

4. Крестьяне изъявили желание выкупить все находящееся в их пользовании количество земли. Поверочная комиссия, обозрев все крестьянские угодья, нашла, что почва земли в обеих деревнях глинистая … песчаных мест в дер. Ходатовичах не оказалось, сенокосы в обеих деревнях мурожные, но как они, так и пахотные поля в конце шнуров в обеих деревнях частью покрыты кустарником, удобным для корчевания. Половина сенокоса деревни Ходатович находится отдельно в 5-и верстах от усадеб, при деревне Новодворки помещика Обуховича … в Ходатовичах, хотя и есть выгон, в исключительном пользовании крестьян, но по показанию последних в недостаточном количестве, так как состоит отчасти из топкого болота, в котором тонет скотина, ежели попадется в такое место».

По рассмотрении всех собранных сведений поверочная комиссия пришла к следующему заключению:

«1. Почва на крестьянских землях обеих деревень Якшицы и Ходатовичи глинистая, преобладающий хлеб рожь со средним урожаем в 5 зерен. Сенокосы мурожные и на одну десятину кашки, приходится в первой деревне до 20-ти пудов, а в последней до 16 пудов. Поэтому крестьянские участки должны быть причислены по обеим деревням к седьмому основному разряду.

2. А так как крестьяне обеих деревень не имеют пастбища в исключительном своем пользовании, то все участки их понижаются в 8-й разряд; по причине необходимости корчевания кустарников в конце

8

полей, а равно нахождения кустарников в значительном количестве на сенокосах обеих деревень, все участки … понижаются в следующий девятый разряд, с понижением его еще на десять копеек… по дер. Ходатовичи по причине нахождения половины сенокосов в 5-ти верстах расстояния от деревни.

3. Согласно такому разряду ежегодный выкупной платеж за десятину земли устанавливается в обеих деревнях в семьдесят коп., а за участок … в деревне Ходатовичи за участок в 14 дес. – 9 р. 80 коп.

4. Затем общее количество удобной земли составляет: … в дер. Ходатовичах: усадебной 6 дес. 1920 саж., пахотной 135 дес. 336 саж., сенокосной 26 дес. 144 саж., итого 168 дес.».

После составления выкупного акта поверочная комиссия предъявила его крестьянам и поверенному помещика. Крестьяне «остались оценкою комиссии и действиями ее довольны … Поверенный же от помещика объявил неудовольствие на низкую будто бы оценку».

Указанный протокол подписали поверенный от помещика Карл Бржостовский, а «за крестьян Якшицкого и Ходатовицкого сельских обществ уполномоченные от них Иван Романов Драговец и Иосиф Андреев Ленковец, а за них как и добросовестных … как неграмотных по их личной просьбе расписался клецкий волостной писарь В. Бржозовский».

Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, лл. 11-14об.

Выкупной акт д. Якшицы и Ходатовичи им. Грибовщизна Слуцкого у. помещика кн. Радзивилла от 16 сентября 1866 г.

Поверочная комиссия, произведя поверку повинностей крестьян в указанном имении, постановила произвести выкуп на ледующих основаниях: «1) Имение состоит из двух селений, принадлежащих к Якшицкому и Ходатовичскому сельским обществам… 2) По уставной грамоте значится в имении 35 дворов, в том числе крестьян, владеющих полными участками 35 и огородников нет». Ревизских душ мужского пола в имении 138, в том числе крестьян 128, батраков 10 и дворовых нет.

По выкупному акту приобретали землю в собственность: а) 138 ревизских мужского пола душ, б) дворов домохозяев, владевших полевыми участками 40 и огородник 1, итого 41. По уставной грамоте в пользование крестьян было отведено земли: а) усадебной и пустопорожней в черте селения 8 дес. 1800 саж., б) пахотной 289 дес., в) сенокосной 52 дес. 600 саж., итого 350 дес., сверх того выгона 33 дес.

«4) Выкупается крестьянами согласно их желанию надел а именно:

А. Земель, обложенных повинностью: усадебной 19 дес. 811 саж., пахотной 390 дес. 1592 саж., сенокосной 88 дес. 1247 саж.

Б. Земель, необложенных повинностью: выгона в общем пользовании крестьян 3 дес. 965 саж., пастбищ в исключительном пользовании

9

крестьян 10 дес. 2367 саж., пастбищ в общем пользовании с помещиком

73 дес. 420 саж., зарослей 17 дес. 2388 саж., неудобной земли 5 дес. 1354 саж.». Всего в крестьянском наделе насчитывалось 609 дес. 1544 саж. земли.

«6) По уставной грамоте за пользование землею было положено оброка 1054 р. 20 коп. в год. За силою именного Высочайшего указа Правительствующему Сенату 6 марта 1863 г. оброк сей понижен на 20%, а именно до 851 р. 87 ½ коп. При поверке повинности означенный оброк … по уважениям, изложенным в протоколе комиссии, уменьшен до 384 р. 88 ¾ коп. С вновь наделенных годовой оброк 13 руб. 89 ¼ коп. и затем составляет 398 руб. 78 коп. в год.

7) По капитализации окончательно определенной годовой денежной повинности 398 руб. 78 коп. из 6%, капитальная ценность выкупаемой земли…» составила 6646 руб. 33 1/3 коп.

«8) Сколько именно выкупается каждым крестьянским двором земли, как велик означенный с двора оброк … и капитальная ценность участка, означено в прилагаемом у сего именном списке хозяев крестьянских дворов».

Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, лл. 1-2.

Именной список крестьян-хозяев, выкупавших землю в им. Грибовщина Слуцкого у., 1866 г., где сказано:

№3 Иван Романов Друговец, выкупается земли: усадебной 1492 3/12 саж., пахотной 10 дес. 99 саж., сенокосной 2 дес. 209. 9/12 саж., всего 12 дес. 1801 саж. Годовой оброк, который крестьяне платили до составления выкупного акта, - 24 руб. 9 ½ коп., оброк окончательно определенный или будущий ежегодный выкупной платеж – 10 руб. 20 коп., капитальная стоимость земли по капитализации последнего оброка из 6% или выкупная ссуда – 170 руб.

№5 Фома Игнатьев Драговец, размер выкупаемой земли и платежей такие же.

Всего крестьянами д. Ходатовичи (14 дворов) выкупалось земли: 7 дес. 1837 саж. усадебной, 123 дес. 1188 саж. пахотной, 25 дес. 117 саж. сенокосной, итого 156 дес. 742 саж. Общая стоимость земли или выкупная ссуда составила 2084 руб. 37 ½ коп.

Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, лл. 3-6об.

Мирской приговор крестьян собственников д. Ходатовичи Слуцкого у. об избрании уполномоченных от общества для получения из Минского губернского по крестьянским делам присутствия данной на надельную землю. 10 января 1904 г.

Уполномоченными были избраны Василий Яковлев Ковшель и

10

Василий Васильев Лобажевич. Приговор среди прочих подписал Андрей Друговец. За неграмотных крестьян расписался Василий Лобажевич.
Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, лл. 255-255об.

Мирской приговор крестьян собственников д. Ходатовичи Слуцкого у. в ознакомлении с постановлением Минского губернского по крестьянским делам присутствия от 24 февраля 1909 г. об определении в натуре границ крестьянских сервитутных земель. 27 мая 1909 г.

Указанный приговор среди прочих подписал Андрей Друговец. За неграмотных крестьян расписался Иван Годун.
Ф. 1595, оп. 2, д. 2394, л. 278.

Выписи из метрических книг Малевской церкви о родившихся за 1920, 1923, 1930-1933 гг., где сказано:
№36 25 марта 1920 г. граждане дер. Ходатовичи Антон Андреевич Кавшель и София Васильева Друговец были восприемниками при крещении Ольги, дочери Никодима Фаддеева Творовского и его жены Софии Фоминой.
Ф. 136, оп. 34, д. 375, лл. 12об.-13.

№29 9 мая 1920 г. граждане дер. Ходатовичи Михаил Яковлев Друговец и Антонина Андреева Друговец, девица, были восприемниками при крещении Бориса, сына Евгения Викентьева Годуна и его жены Ульяны Андреевой.
Ф. 136, оп. 34, д. 375, лл. 13об.-14.

№43 18 июня 1920 г. граждане дер. Ходатовичи Адам Антонов Друговец и Елена Александрова Наумович были восприемниками при крещении Надежды, дочери Константина Адамова Творовского и его жены Агафии Степановой.
Ф. 136, оп. 34, д. 375, лл. 16об.-17.

№62 20 ноября 1920 г. граждане дер. Ходатовичи Николай Яковлев Дроговец и Анна Иванова Годун были восприемниками при крещении Ивана, сына Кирилла Стефанова Наумовича и его жены Глафиры Лукиной.
Ф. 136, оп. 34, д. 375, лл. 25об.-26.

№10 16 февраля 1923 г. граждане дер. Ходатовичи Николай Яковлев Друговец и Анна Иванова Годун были восприемниками при крещении Николая, сына Кирилла Степанова Лабажевича и его жены Глафиры Лукиной.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 10об.-11.

11

№30 6 апреля 1923 г. граждане дер. Ходатовичи Александр Николаев Лобажевич и София Васильева Друговец были восприемниками при крещении Александры, дочери Никодима Фомина Творовского и его жены Софии Фоминой.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 33об.-34.

№8 11 января 1930 г. граждане дер. Ходатовичи Михаил Яковлев Драговец и София Иулианова Годун были восприемниками при крещении Татьяны, дочери Константина Павлова Годуна и его жены Софьи Ивановой урожд. Годун.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 4об.-5.

№52 8 ноября 1930 г. граждане дер. Ходатовичи София Васильева Друговец и Александр Николаев Лобажевич были восприемниками при крещении Фаддея, сына Никодима Фаддеева Творовского и его жены Софии Фоминой урожд. Буйко.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 28об.-29.

№55 10 октября 1930 г. родился, 29 ноября крещен ребенок по имени Владимир. Родители: граждане дер. Ходатовичи Василий Лукин Кавшель, родился 1894 г. 7-9/IV, и его жена Антонина Андреева урожд. Друговец, родилась 1896 г. 31/I, оба православные.
Восприемники: граждане дер. Ходатовичи Сергей Андреев Друговец и Ольга Андреева Грудина.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 29об.-30.

№6 15 января 1931 г. родился, 24 января крещен ребенок по имени Татьяна. Родители: дер. Ходатовичи гражданин Сергей Андреев Друговец, 1905 г. 13/IX, и его законная жена Марианна Иосифова урожд. Гадун, 1906 г. 17/II, оба православного вероисповедания.
Восприемники: той же деревни граждане Петр Иосифов Годун и Анна Никитина Творовская.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 35об.-36.

№40 14 июня 1931 г. родился, 27 июня крещен ребенок по имени Валентина. Родители: дер. Ходатовичи граждане Иван Антонов Грудина, родился 1896 г. 27/II, и его законная жена Ольга Андреева урожд. Друговец, род. 1903 г. 20/II, оба православные.
Восприемники: той же деревни граждане Сергей Андреев Друговец и Мария Антонова Годун.
Дописано: III-ВН №308074 от 18.12.85.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 55об.-56.

12

№32 9 июня 1932 г. граждане дер. Ходатовичи Николай Яковлев Драговец и Евгения Николаева Драговец были восприемниками при крещении Александра, сына Петра Иосифова Годуна и его жены Наталии Леонтьевой урожд. Бельской.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 91об.-92.

№6 1 января 1933 г. родился, 2 января крещен ребенок по имени Владимир. Родители: дер. Ходатовичи Семен Лукин Трофимчик, родился 1910 г., и его жена Мария Адамова Друговец, родилась 1911 г., оба православные.
Восприемники: той же деревни Арсений Иванов Гадун и София Васильева Друговец.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 128об.-129.

№6 2 января 1933 г. родился, 20 января крещен ребенок по имени Мария. Родители: дер. Ходатовичи обыватели Михаил Яковлев Друговец, родился 1904 г. 20/IX, и его жена Евгения Николаева урожд. Гадун, родилась 1902 г. 28/VIII, оба православного вероисповедания.
Восприемники: той же деревни Владимир Иванов Гадун, Ольга Иванова Гадун.
Дописано: IV-ВН 313640 от 16.V.84 г.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 128об.-129.

№24 6 мая 1933 г. граждане дер. Ходатовичи Александр Васильев Ковшель и Мариамна Иосифова Друговец были восприемниками при крещении Василия, сына Ивана Иосифова Годуна и его жены Наталий Васильевой урожд. Ковшель.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 135об.-136.

№32 9 июля 1933 г. граждане дер. Ходатовичи Александр Николаев Лабожевич и София Васильева Друговец были восприемниками при крещении Николая, сына Никодима Фаддеева Творовского и его жены Софии Фоминой урожд. Буйко.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 138об.-139.

№43 8 ноября 1933 г. родился, 25 ноября крещен ребенок по имени Мария. Родители: граждане дер. Ходатовичи Сергий Андреев Друговец, родился 1905 г. 13/XI, и его жена Мариамна Иосифова урожд. Гадун, родилась 1906 г. 17/II, оба православного вероисповедания
Дописано: III-ВН №317874 от 10.VI.81 г.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 143об.-144.

13

Одновременно сообщаем, что при просмотре описей и дел архивных фондов «Минский губернский для рассмотрения и составления инвентарей помещичьих имений комитет», «Минское губернское рекрутское присутствие», «Минская губернская земская управа», «Минское губернское по воинской повинности присутствие», «Минская губернская землеустроительная комиссия», «Минская губернская чертежная», «Слуцкое уездное рекрутское присутствие», «Слуцкое уездное по крестьянским делам присутствие», «Слуцкое уездное полицейское управление», «Слуцкое уездное по воинской повинности присутствие», «Слуцкая уездная землеустроительная комиссия», «Слуцкое уездное казначейство», «Податной инспектор Слуцкого уезда», в т.ч. сохранившихся метрических книг Малевской церкви за 1920-1923, 1930-1935 гг. и т.д. других сведений, относящихся к генеалогии лиц по фамилии Друговец (Драговец), проживавших в дер. Ходатовичи Слуцкого уезда Минской губернии в 19 – нач. 20 вв., не обнаружено.

Метрических книг Малевской церкви, к приходу которой относились жители д. Ходатовичи Слуцкого у., за 1850-1919 гг. в архиве на хранении не имеется (не сохранились).

Директор архива А.К. Голубович

Рыбчонок С.А. 286 76 90

Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі»

вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск
тэл. (017) 286 75 23, тэл./факс 286 75 22
Р/р 3632923160066 ГАПЕРУ ААТ «Белінвестбанк»,
код 739, УНП 100074551

Департамент по архивам и делопроизводству
Министерства юстиции Республики Беларусь

Государственное учреждение
«Национальный исторический архив Беларуси»

ул. Кропоткина, 55, 220002, г. Минск
тел. (017) 286 75 23, тел./факс 286 75 22
Р/с 3632923160066 ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк»,
код 739, УНП 100074551

10.06.2008 №04-06/121

На № _____ ад _____

Драговцу В.Н.
пр. Машерова, 78-22
г. Минск

АРХИВНАЯ СПРАВКА
(о наличии сведений)

В архивных фондах «Минская духовная консистория», «Минская казенная палата», «Минское губернское по крестьянским делам присутствие», «Новогрудское уездное по рекрутской повинности присутствие» имеются следующие сведения, относящиеся к генеалогии лиц по фамилии Посацкие, проживавших в деревне Малоеды Сновской волости Новогрудского уезда Минской губернии, за 1811-1934 гг.:

Ревизская сказка крестьян д. Оношки Новогрудского уезда Минской губернии, принадлежавшей к имению Наруцевичи помещика Михаила Осипова сына Обуховича, за 1811 г., где сказано:

№2 Леон Семенов Посатцкий, в 1795 – 70 лет, в 1800 г. умер		
Его сын Мартын	23, в 1811 – 39	
Его брат Павел	46	52*
Его братанич Григорий	вновь рожден	8

* Так в документе.
Ф. 333, оп. 9, д. 258, л. 4об.

Ревизская сказка им. Наруцевичи Новогрудского у. помещицы Фабианны урожденной Обухович графини Чапской за 1834 г.:

В 1834 г. в состав имения входили следующие деревни: Грицы, Кмиты, Каменка, Козлы, Малоеды, Оношки и Сонгалы. Всего в имении числилось 992 ревизских души, в т.ч. 497 мужского и 485 женского пола. Владелицей имения считалась Фабианна Обухович, которая состояла в браке за графом Каролем Чапским, почетным блюстителем минской губернской гимназии. Управляющим имения был Игнатий Свирский.

Д. Оношки.	
№1 Матвей Леонов Пасацкий, в 1816 – 44, в 1834 – 61	
его жена Маряна	60
Матвея дочери: Катерина	17

Зак. 1005.

2

Виктося		13
Матвея сын Григор	в 1816 – 13	в 1834 – 30
Григора жена Розалия		25
Григора сын Франц	новорожд.	2
Григора дочь Анна		½
Матвея брат Павел	57, в 1826 умер	
Павла сын Павел	13	20*

* Так в документе.

№2 Игнатий Иосифов Хомич	41, в 1832 умер	
его жена Магдалена		50
Игнатия сын Мартин	14	31
Мартина жена Каролина		18
Мартина сыновья: Семен	новорожд.	10
Леон	новорожд.	5
Мартина дочь Доминися		½
Игнатия второй сын Фома	12	27
Фомы жена Анна		20
Фомы дочь Фабиянна		1/12
Мартина шурин		
Иван Павлов Пасацкий	новорожд.	13

Ф. 333, оп. 9, д. 323, лл. 363об.-364.

Ревизская сказка крестьян д. Оношки Новогрудского у., принадлежавшей к им. Наруцевичи помещика графа Игнатия Карловича Чапского, за 1850 г., где сказано:

№2 Матвей Леонов Пасацкий, в 1834 – 62, в 1846 умер		
его жена Марися Василева		в 1850 – 77 лет
Матвея сын Гришко	31	47
Гришки жена Розалия Францова		41
Гришки сыновья: Франц	2	18
Лукаш	новорожд.	11
Миколай	новорожд.	8
Гришки дочери: Гануля		17
Марцеся		14
Матвея братанич Павел Павлов	20, отдан в рекруты в 1836	

Ф. 333, оп. 9, д. 432, лл. 88об.-89.

№3 Мартин Игнатов Хомич	32	48
Мартина жена Каруся Леонова		46
Мартина дочери: Ева		14
Улияна		9
Марцеся		1

3

Мартина сыновья: 1. Сымон 10, переведен в д. Козлы в 1847 г.
2. Леон в 1834 – 5 в 1850 – 21
Леона жена Дорота Матфеева 23
Леона сын Фадей новорожд. 2
Мартина 3) сын Базыль новорожд. 8
Мартина Игнатова брат Фома 27, в 1835 умер
Мартина Игнатова шурин
Иван Павлов Посацкий 13, переведен в д. Малоеды в №2 в 1845 г.
Ф. 333, оп. 9, д. 432, лл. 88об.-89.

Ревизская сказка крестьян д. Малоеды Новогрудского у., принадлежавшей к им. Наруцевичи помещика графа Игнатия Карловича Чапского, за 1850 г., где сказано:
№2 Игнат Хведоров Боровик, в 1834 – 53, в 1838 умер
Игната жена Марцеся Василева в 1850 – 58
Игната сыновья: Максим 15 31
Миколай 12, в 1842 умер
Игната брат Иван 24 40
Ивана жена Тереса Иванова 41
Ивана сыновья: Антон 3, в 1836 умер
Степан новородж. 11
Ивана дочери: Евуся 14
Гануля 5
Игната Хведорова зять
Иван Павлов Пасацкий, переведен с №3 д. Оношек в 1845, в 1850 - 29
Ивана жена Юстына Игнатова 23
Ивана сын Кндрат новорожд. 2
Ивана дочь Антоля ½
Ф. 333, оп. 9, д. 432, лл. 105об.-106.

Ревизская сказка крестьян д. Оношки Новогрудского у., принадлежавшей к им. Наруцевичи помещика графа Игнатия Карловича Чапского, за 1858 г., где сказано:
По 9-й ревизии №2, по 10-й ревизии №2
Григорий Матфеев Пасацкий, в 1850 – 47, в 1858 – 55 лет
Его жена Розалия Францева 49
Григория дочь Марцеся 22
Григория 1) сын Франц 18 26
Франца жена Виктося Гарасимова 28
Франца сын Стасько новорожд. 2
Гришки 2) сын Лукаш 11 19
3) сын Николай 8 16

4

Ф. 333, оп. 9, д. 1114, лл. 25об.-26.

Ревизская сказка крестьян д. Малоеды Новогрудского у., принадлежавшей к им. Наруцевичи помещика графа Игнатия Карловича Чапского, за 1858 г., где сказано:

По 9-й ревизии №2, по 10-й ревизии №2

Иван Феодоров Боровик, в 1850 – 40, в 1852 – умер

Его жена Тереся Иванова в 1858 – 49

Его сын Степан 11 19

Максим Игнатьев Боровик 31, в 1855 умер

Иван Павлов Пасацкий 29 37

Ивана Павлова жена Юстына Игнатьева 32

Ивана Павлова дочь Антоля 9

Ивана Павлова сыновья: Кондрат 2 10

Адам новор. 3

Трофим новор. ½

Ф. 333, оп. 9, д. 1114, лл. 51об.-52.

Геометрический инвентарь к подробному плану участкам и паям тяглых земель д. Оношки им. Наруцевичи Новогрудского у. помещика И.К.Чапского за 1860 г., где сказано:

№2 У Григория Матвеева Пасацкого:

Усадебной земли – под строением и огородами: пай №2, ширина участка – 12 саж., количество земли под строением 0,23 дес., под огородом 0,43 дес.

Пахотной земли: смена 1-я (лит. А), в т.ч. 1 участок в урочище Навозы – пай №22, ширина участка 12 саж., 3,46 дес. пахотной хорошей и 0,75 дес. сенокосной луговой; 2 участок в уроч. Чверци – пай №42, ширина 5 саж., 0,56 дес. пахотной хорошей и 0,13 дес. сенокосной луговой. Смена 2-я (лит. Б), в т.ч. 1 участок в уроч. Шнуры – пай №80, ширина 12 саж. 5 футов, 5,47 дес. пахотной посредственной и 0,21 дес. сенокосной луговой; 2 участок в уроч. Яловое – пай №100, ширина 17 саж. 5 футов, 0,34 дес. пахотной посредственной.

Сенокосной: 1 участок в уроч. Под Озерко – пай №120, ширина 5 саж. ½ фута, 0,27 дес. болотной; 2 участок в уроч. Ровчуки – пай №133, ширина 9 саж. 6 футов, 0,39 дес. болотной.

Итого земли: усадебной – 0,66 дес., в т.ч. 0,23 дес. под строением и 0,43 дес. под огородом; пахотной – 9,83 дес., в т.ч. хорошей 4,02 дес. и 5,81 дес. посредственной; сенокоса – 1,75 дес., в т.ч. 1,09 дес. луговой и 0,66 дес. болотной; неудобной земли нет, всего – 12,24 дес.

Ф. 333, оп. 3, д. 797, л. 1об.

Геометрический инвентарь к подробному плану участкам и паям тяглых земель д. Малоеды им. Наруцевичи Новогрудского у. помещика

5

И.К.Чапского за 1860 г., где сказано:
№2 У Яськи Павлова Пасацкого:

Усадебной земли – под строением и огородами: пай №2, ширина участка – 16 саж. и 2 ½ футов, количество земли под строением 0,23 дес., под огородом 0,43 дес.

Пахотной земли: смена 1-я (лит. А), в т.ч. 1 участок в уроч. Навозы – пай №16, ширина 16 саж. 2 ½ футов, 2,23 дес. пахотной хорошей и 0,30 дес. сенокосной луговой; 2 участок в уроч. Хвощево – пай №30, ширина 11 саж. 3 фута, 1,32 дес. пахотной хорошей и 0,06 дес. сенокосной луговой; 3 участок там же – пай №45, ширина – 11 саж. 5 футов, 1,35 дес. пахотной хорошей и 0,06 дес. сенокосной луговой; 4 участок там же – пай №59, ширина 9 саж. 2 фута, 0,21 дес. пахотной посредственной; 5 участок в уроч. Под Бровар – пай №73, ширина 7 саж. 3 фута, 0,1 дес. пахотной хорошей. Смена 2-я (лит. Б), в т.ч. 1 участок в уроч. Павловщизна – пай №88, ширина 11 саж. 2 ½ фута, 2,27 дес. пахотной посредственной; 2 участок там же – пай №102, ширина 15 саж. 4 фута, 0,46 дес. пахотной посредственной; 3 участок в уроч. Кулаково – пай №117, ширина 19 саж. 1 фут, 0,84 дес. пахотной посредственной; 4 участок там же – пай №131, ширина 10 саж., 0,23 дес. пахотной посредственной; 5 участок там же – пай №145, ширина 12 саж. 1 фут, 0,42 дес. пахотной посредственной.

Сенокосной: 1 участок в уроч. Придатки – пай №159, ширина 9 саж., 0,08 дес. луговой; 2 участок там же – пай №173, ширина 9 саж. 3 фута, 0,09 дес. луговой; 3 участок в уроч. Павловщизна – пай №187, ширина 7 саж, 0,14 дес. луговой; 4 участок в уроч. Под Броваром – пай №202, ширина 9 саж. 2 фута, 0,52 дес. луговой; 5 участок в уроч. Хвощево – пай №214, ширина 18 саж. 5 футов, 0,22 дес. луговой; 6 участок в уроч. Залегли – пай №228, ширина 8 саж., 0,14 дес. луговой.

Итого земли: усадебной – 0,66 дес., в т.ч. 0,23 дес. под строением и 0,43 дес. под огородом; пахотной – 9,43 дес., в т.ч. хорошей 5 дес. и 4,43 дес. посредственной; сенокоса – 1,61 дес., весь луговой; неудобной земли нет, всего – 11,70 дес.
Ф. 333, оп. 3, д. 797, л. 19об.

Общественный приговор крестьян собственников Наруцевичской волости Новогрудского у. о сдаче в рекруты от 30 декабря 1865 г., где сказано:

«… во исполнение Высочайшего Манифеста Его Императорского Величества от 14 минувшего Октября о сборе с 1000 душ по 5 рекрут приговорили:

1) Рекрут в нынешний набор сдавать, применяясь к очередному порядку по числу работников в семействе...

3) В нашей волости считается ревизских душ 632, то на основании 52 ст. Рекрутского устава нам следует поставить 3 рекрут и 160 частей,

6

что вместе с долговыми частями 952 от бывшего набора составит 4 рекрут и 112 частей в долгу к будущему набору.

4) Рекрут следующих с нашего участка взять и представить из нижеозначенных семейств: …

б) Второго рекрута взять из семейства Франца Пасадзкого. Семейство сие по ревизским сказкам записано при деревне Оношки под №2. С семейства сего следует к поставке рекрут в нынешний набор, потому что высшаго пред ним семейства не находится. К представлению же в рекруты сие семейство по силе Рекрутского устава назначило само Николая Григорьева Пасадзкого. Лета рекрута двадцать четыре по ревизским сказкам».

Приговор среди прочих крестьян собственников подписали: крестьянин д. Оношки Франц Пасадзкий, д. Малоеды Иван Пасадзкий.
Ф. 1231, оп. 1, д. 50, лл. 476-481об.

Объявление поверенного крестьян собственников Наруцевичской волости Новогрудского у. Акулика в Новогрудское уездное рекрутское присутствие с представлением ведомости рекрут, следуемых к сдаче с общества по раскладке. 19 января 1866 г., где значится
№2. Дер. Оношек рекрут Николай Григорьев Пасацкий, 24 года, православного вероисповедания, при освидетельствовании в присутствии оказался рост – 2 аршина 4 2/8 вершка.
Ф. 1231, оп. 1, д. 50, лл. 472об.-473.

Журнал заседания Минского губернского по крестьянским делам присутствия об утверждении отграничения крестьянской земли Супроновского и Оношковского сельских обществ Новогрудского у. от помещичьих земель. 30 января 1882 г.

Поскольку помещик и крестьяне не пришли к согласию в размежевании земель, размежевание было проведено установленным порядком и утверждено мировым посредником 29 июля 1874 г. Тогда же оно было объявлено владельцу имения Наруцевичи графу Игнатию Чапскому и уполномоченным от крестьянам, которые «от подписи документов отграничения отказались, не объяснив причину отказа».

По выкупному акту во владении крестьян д. Малоеды находилось 165 дес. 2160 саж. удобной земли, после отграничения им принадлежали 177 дес. 1206 саж. Настоящим постановлением вышеуказанное размежевание было утверждено окончательно.
Ф. 242, оп. 1, д. 206, лл. 60-61об.

Выписи из метрических книг Малевской церкви Слуцкого уезда о родившихся за 1931-1934 гг., где сказано:
№7 1 января 1931 г. родился, 25 января окрещен ребенок по имени

7

Евгения. Родители: деревни Аношек граждане Антоний Фомин Посацкий, родился 1902 год, и его законная жена Ольга Осипова урожденная Акулич, 26 лет, оба православного вероисповедания.
Восприемники: деревни …* Александр Василиев Фомич и Александра Николаева Фомич.
* Название деревни в документе не указано.
Ф. 136, оп. 34, д. 499, лл. 36об.-37.

№25 30 марта 1934 г. родился, 15 июля крещен ребенок по имени София. Родители: граждане дер. Оношки Антоний Иванов Посацкий, 1895 г. 1/XII, и его жена Варвара Константиновна урожд. Михалик 1900 г., оба православного вероисповедания.
Восприемники: города Несвижа гражд. Иосиф Иванов Стрелковский и имения Свитязи София Петрова Тить.
Ф. 136, оп. 34, д. 498, лл. 156об.-157.

Одновременно сообщаем, что при просмотре описей и дел архивных фондов «Минский губернский для рассмотрения и составления инвентарей помещичьих имений комитет», «Минское губернское рекрутское присутствие», «Минская губернская земская управа», «Минское губернское по воинской повинности присутствие», «Минская губернская землеустроительная комиссия», «Минская губернская чертежная», «Новогрудское уездное по крестьянским делам присутствие», «Новогрудское уездное полицейское управление», «Новогрудская уездная землеустроительная комиссия», «Податной инспектор Новогрудского уезда» других сведений, относящихся к генеалогии лиц по фамилии Посацкие, проживавших в дер. Малоеды Новогрудского уезда Минской губернии в 19 – нач. 20 вв., не обнаружено.

Метрических книг Сновских церкви и костела, к приходам которых относились жители д. Оношки и Малоеды Новогрудского у., за 1850-1920 гг. в архиве на хранении не имеется (не сохранились).

Директор архива А.К. Голубович

Рыбчонок С.А. 286 76 90

Змест

Думкі ў калядную ноч 20

Вёска 30

Блуканні па дрэву 46

Хутары 64

- Хадатавічы. Дзед Васіль 65
- Баба Наташа. Петрык 73
- Малаеды. Баба Волька 80
- Дзед Антось. Смалякі 91

Адмеціны 102

- Дзень. Ад раніцы да вечара 103
- Мяшок мукі пад Вялікдзень 117
- «Механізацыя». Альбо фанарык з Масквы 129
- «За» і «Супраць» 144
- Праз ноч – да навукі 158

Радавод 186

- Бацькава рука 187
- Матчын бок 207

Сям'я 224

- Праўда як існасць 225
- Агульны пачатак 236
- «Спраўны мужчына...» 249
- Безназоўнае... 262

Вайна 276

Медалі і цацкі 277
Божы Абярэг 288
Суконныя языкі 301
«Работая телефонистом …» 311
«В лагерь захотел?!» 327

Паміж тутэйшых 346

Дарогай ад могілак 347
Людзі і хаты 360
«Вы, хлопчык, чый будзяце?..» 378
Цені 395
«Культурная камунікацыя» 412
Маёўка 437

Спіс, якога няма 458

Замест кропкі 466

Малітва 476

Дадатак 478

Літаратурна-мастацкае выданне

Васіль Драгавец

Запозненае прызнанне

Біяграфічны сповед



Друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі

Падпісана да друку 17.01.2017. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 33,48. Ул.-выд. арк. 23,2. Тыраж 30 экз. Заказ 5.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013. Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.